63.3(4Бл)
П15

ПАМЯЦЬ



63.3(4Б
П15

ПАМЯЦЬ

ДУБРОВЕНСКІ РАЁН

У 2-х КНІГАХ

Кніга 1

1365 чз.

АРШАНСКАЯ
гарадская ЦБС
4

МІНСК
"ПАЛІГРАФАФАРМЛЕННЕ"
1997

УДК 947.67
ББК 63.3(4Беп)
П15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

А. Я. ГАЎРУЦІКАЎ, Р. П. КАХНОЎСКАЯ, Ф. С. КУЛАКОЎ, М. А. ЛЯШЧЫНСКІ,
А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

М. А. ЛЯШЧЫНСКІ (старшыня камісіі), Л. М. АКУНЯВЕЦ, А. Я. ГАЎРУЦІКАЎ,
Р. П. КАХНОЎСКАЯ, Ф. С. КУЛАКОЎ, М. І. МІХАЛЬЧАНКА, І. П. ХОЛАДАВА,
М. А. ШКАДАЎ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ
ХРОНІК ПАМЯЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст)

Укладальнікі: А. Я. ГАЎРУЦІКАЎ, Р. П. КАХНОЎСКАЯ

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985—6351—02—02

© Выдавецтва "Паліграфафармленне", 1997

Герб Дуброўны.

Старажытнае гарадзішча каля в. Вежкі.

IX—V тысячагоддзі да н. э.	Першабытная стаянка старажытнага чалавека эпохі мезаліту каля в. Чыжоўка.
882 г.	Смаленск далучаны да Кіеўскай Русі.
1116 г.	Да Смаленскага княства далучаны Орша, Копысь і частка Дубровеншчыны.
1258, 1259, 1274, 1275, 1287 гг.	Набегі татар на землі Беларусі.
1333, 1339 гг.	Напад татар на Смаленск.

Троіцкая царква ў Дуброўне.

1386 г.	**Страта Смаленскам сваёй незалежнасці на карысць Вялікага княства Літоўскага.**
1393 г.	**У грамаце князя Дзмітрыя Сямёнавіча ўпамінаецца «зямля пустая дубровенская».**
XV ст.	**Заснаванне замка ў м. Дуброўна.**
1514 г.	**Летапіснае ўпамінанне Дуброўны як горада.**
1534 г., верасень	**Сёлы і прадмесці Дуброўны спалены мастакоўскім войскам.**

Дуброўна. Выгляд з вышыні.

1535—1536 гг.	**Знішчэнне агнём паселішчаў вакол Дуброўны маскоўскім войскам.**
1535, 1562, 1563, 1580 гг.	**Дуброўна спалена маскоўскімі войскамі.**
1601—1602 гг.	**Масавы паморак жыхароў Дубровеншчыны.**
Пачатак XVIII ст.	**Працавала паперня ў Дуброўне.**
1654 г., 17 кастрычніка	**Па загаду цара Аляксея Міхайлавіча спалены замак ў Дуброўне, навакольныя вёскі, многія жыхары ўзяты ў палон.**
1706 г., 25 студзеня	**У Дуброўну прыбыў Пётр I, правёў пасяджэнне Ваеннага Савета.**

Ваколіцы Дуброўны.

1711 г., май	З гэтага часу ўласнікам Дуброўны выступае князь Аляксандр Меншыкаў.
1722 г.	У Дуброўне мешчанінам Пілатам пабудавана першая каменная царква.
1722 г.	Дубровеншчына ўключана ў склад Расійскай імперыі.
1777 г.	Дуброўна стала іменавацца мястэчкам.
1782 г., лістапад	Канцлер А.Сапега прадаў Дубровенскае графства князю Р.Пацёмкіну.
Сярэдзіна 80-х гг.	У Дуброўне заснаваны гадзіннікавая, пазументная і суконная фабрыкі.

Дубровеншчына.

1791 г.	Дубровенскае графства набыў князь К.Любамірскі.
1793—1861 гг.	У Дуброўне дзейнічала суконна-талесная мануфактура.
1800 г., чэрвень	Дубровенскае графства наведаў паэт і сенатар Г.Дзяржавін.
Пачатак 19 ст.	У мястэчку Ляды дзейнічала друкарня.
1812 г., 1 жніўня	Імператар Францыі Напалеон спыніўся на начлег каля в. Расасна.
1812 г., з 6 на 7 лістапада	Пры адступленні Напалеон начаваў у маёнтку Любамірскіх у Дуброўне.

Каля помніка вызваліцелям Дуброўны.

1812 г.,лістапад	**Кутузаў адпачываў у вёсцы Ланенка.**
Пачатак XIX ст.	**У Дуброўне дзейнічала прыходскае вучылішча.**
1836 г.	**Указ аб ўвядзенні выкладання толькі на рускай мове ў навучальных установах Беларусі.**
1847 г.	**У Дуброўне 4 талесныя фабрыкі.**
1852 г.	**У Дуброўне заснавана яўрэйскае вучылішча.**
1869 г.	**Адкрыта Баеўскае народнае вучылішча.**

Помнік юным падпольшчыкам Асінторфа.

1897 г.	У Дуброўне — 1161 двор, 1247 жылых дамоў, 8057 жыхары.
1905 г.	Масавыя забастоўкі рабочых і сялян ў Дуброўне, Лядах і інш. вёсках.
1905 г.	У Дуброўне пабудавана фабрыка «Дняпроўская мануфактура».
1917 г., лістапад	У Дуброўне ўстаноўлена савецкая ўлада.
1918 г., май	У Дуброўне, Лядах узніклі ячэйкі РКП(б).

Помнік санінструктару — Герою Савецкага Саюза Ганне Нікандравай ў Дуброўне.

1924 г., 7 сакавіка	**Дуброўна і павет перададзены ў склад Беларусі.**
1924 г., 17 ліпеня	**Утвораны Дубровенскі раён.**
1930 г., 8 лістапада	**Пуск першай чаргі электрычнай станцыі — БелДРЭС.**
1930—1932 гг.	**Калектывізацыя. Масавыя арышты сялян і суды над імі.**
1933 г.	**У Дубровенскім раёне пражывала 714 чалавек.**
1937—1938 гг.	**Масавыя арышты «ворагаў народа» і суды над імі.**

Фальклорны ансамбль "Крыніца".

1939—1940 гг.	У савецка-фінляндскай вайне загінулі 115 ураджэнцаў Дубровеншчыны.
1941 г.	У Дубровенскім раёне пражывала 45 чалавек.
1941 г., 16 ліпеня	Акупацыя Дубровенскага раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
1941 г.,жнівень	Пачатак актыўных дзеянняў падпольных груп патрыётаў Дубровеншчыны.
1942 г, 2 красавіка	Масавыя расстрэлы яўрэяў каля мястэчка Ляды.
1942 г., снежань	Расстраляны 12 членаў Новатухінскага падполля.

На родных палетках.

1943 г., 8 кастрычніка	Вызваленне войскамі 30-й гвардзейскай дывізіі мястэчка Ляды.
1944 г., 26 чэрвеня	Вызваленне Дубровеншчыны войскамі 11-й і 31-й армій.
1945 г., 1 студзеня	У раёне пражывала 34 чалавекі.
1950 г.	150 калгасаў узбуйнены ў 43.
1966 г.	Адкрыццё манумента ў гонар герояў Асінторфскага камсамольскага падполля.

Бруіцца святая крыніца.

1979 г.	У раёне пражывала 28 323 чалавекі, у Дуброўне 7805.
1989 г.	У раёне пражывала 25 235 чалавек, у Дуброўне 9650.
1990 г.	Зарэгістраваны першы ў раёне фермер.
1993 г.	Святкаванне 600-годдзя горада Дуброўна.
1993 г., 25 лістапада	Створана раённая арганізацыя Сялянскай партыі.
1994 г., 23 лістапада	Створана арганізацыя Аграрна-дэмакратычнай партыі.

ДА ЧЫТАЧА

Дуброўна. Дубровеншчына... Відаць, ад магутных беларускіх дуброў паходзіць гэта назва. Чуецца ў ёй і спакой, і сіла, і вечнасць існавання. Хоць спакою гэты цудоўны край не ведаў ніколі. Геаграфічнае становішча вызначыла яму нялёгкі лёс. Бойкія дарогі з Усходу на Захад і з Поўначы на Поўдзень на вякі нібы раскрыжавалі Дубровеншчыну.

Шлях «з варагаў у грэкі», што праходзіў па Дняпры, памежжа Беларуска-Літоўскага гаспадарства і Маскоўскага княства, а затым Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы, бясконцыя войны паміж імі назаўсёды пакінулі свой адбітак на твары краю.

Дубровенская зямля на працягу вякоў была арэнай жорсткіх бітваў. Многае ўжо сцерлася з народнай памяці, а многае яшчэ жыве ў ёй як напамінак нашчадкам пра няшчасце іх прашчураў.

Глыбокі след разбурэнняў пакінула на Дубровеншчыне французска-расійская вайна 1812 года. Па сённяшні дзень краваточаць раны зямлі і яе насяленцаў ад апошняй вайны. Менавіта Дубровеншчына стала арэнай крывавага супрацьборства мнагатысячных войскаў Савецкай дзяржавы і фашысцкай Германіі. На працягу дзевяці месяцаў тут пралягаў фронт, баі на якім не спыняліся ні днём, ні ноччу. Зніклі з твару зямлі вёскі, палеткі і лясы ператварыліся ў глыбока эшаланіраваныя лініі абароны з абодвух бакоў. Палі былі засеяны мінамі, ад якіх яны не пазбавіліся і па сёння. Адсюль пачалася знакамітая Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».

Гістарычным падзеям на Дубровеншчыне і іх удзельнікам прысвячаецца гэта кніга. Адначасна яна асвятляе далёкае мінулае краю, апавядае пра культуру народа, эканамічнае развіццё раёна, яго рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі. Яна ўвекавечвае подзвіг і трагедыю народа, у ёй змешчаны спісы воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў Дубровеншчыны, што загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Увекавечваюцца ў кнізе і тыя грамадзяне, што пацярпелі ад беспадстаўных рэпрэсій у савецкі час.

Над стварэннем кнігі некалькі гадоў натхнёна працавалі мясцовыя краязнаўцы, многія навукоўцы, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк. Ім удалося сабраць шмат унікальных дакументаў, мноства публікацый са старых кніг і перыядычнага друку, цікавыя ўспаміны старажылаў Дубровеншчыны, яе абаронцаў і вызваліцеляў ад фашысцкай акупацыі. Тут жа — звесткі пра людзей, якія сваёй працай, талентам ці ратнымі подзвігамі праславілі родны край.

Заўвага. Памяці абаронцаў і вызваліцеляў Дубровеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвячаецца кніга 2-я Хронікі Памяці, якая змяшчае імёны тых, хто загінуў у баях і пахаваны ў Дубровенскім раёне. Для зручнасці карыстання яна выдадзена на рускай мове — мове міжнацыянальных зносін.

1365
ЛЕНСКАЯ
городская ЦБС



Дубровенскі раён размешчаны на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці. Утвораны 17 ліпеня 1924 года. Плошча 1,3 тыс. км². Населеных пунктаў 150, у тым ліку горад Дуброўна (цэнтр раёна) і гарадскі пасёлак Асінторф. 10 сельскіх саветаў: Баеўскі, Валякоўскі, Дабрынскі, Зарубскі, Засценкаўскі, Кляноўскі, Малабахаўскі, Маласавінскі, Пірагоўскі, Рэдзькаўскі і Асінторфскі пасялковы савет. На 1.1.1995 г. ў раёне пражывала 24 300 чал.; у Дуброўне — 9800, у Асінторфе — 1700.

Паўднёвая частка раёна ў межах спадзістахвалістага Смаленскага ўзвышша. На поўначы плоская з забалочанымі ўчасткамі і асобнымі марэннымі ўзгоркамі Лучоская нізіна. 43% тэрыторыі раёна на вышыні больш за 200 м, 38% на вышыні 180—200 м. Карысныя выкапні: 31 радовішча торфу з агульнымі запасамі 10,6 млн. т (найбольшае Асінаўскае балота, Шчэрбінскі мох), 4 радовішчы глін і суглінкаў з запасамі 8,8 млн. м³ (Макараўскае, Асінторфскае, Валькаўшчынскае, Рэдзькаўскае); 3 радовішчы пяскоў з запасамі 2 млн. м³ (Стражаўскае, Дубровенскае 1-е, Дняпроўскае). Сярэдняя тэмпература студзеня — 8 °С, ліпеня +17,8 °С. Ападкаў 618 мм у год. Вегетатыўны перыяд 184 суткі. Працякае буйнейшая водная артэрыя Беларусі — рака Дняпро з прытокамі Мярэя, Расасенка, Дубровенка. На поўначы вытак р. Вярхіта (бас. Зах. Дзвіны). Азёр два, найбольшае — Казённае возера. Пад сельгасугоддзямі занята 62,6% тэрыторыі, у тым ліку пад ворывам — 46,8%.

Сярэдні бал банітэту сельгасугоддзяў 38, найвышэйшы 46, найніжэйшы 29. Пад лесам занята 17% плошчы раёна. Асноўныя землекарыстальнікі — 13 калгасаў і 7 саўгасаў.

Выдаецца раённая газета «Дняпроўская праўда».

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Ад каменнага да бронзавага веку

Археолагі ў гісторыі развіцця чалавецтва вылучаюць некалькі важных этапаў — каменны, бронзавы і жалезны вякі. Каменны век складаецца з палеаліту (II мільёны — XI тысяч гадоў назад), мезаліту (XI — VII тысяч гадоў назад), неаліту (VII — IV тысячы гадоў назад). Палеалітычных помнікаў на тэрыторыі раёна да гэтага часу не знойдзена. Магчыма тут адыгралі сваю ролю два фактары. Першы фактар — прыроднае асяроддзе. Як вядома, гэта тэрыторыя двойчы пакрывалася ледавіком у час дняпроўскага (320 — 115 тысяч гадоў назад) і валдайскага (105 — 14 тысяч гадоў назад). Даследаванні беларускіх геолагаў паказалі, што ў ледавіковы час было даволі суровае асяроддзе. Клімат быў рэзкакантынентальны, халодны і сухі. У перыяд максімальнага распаўсюджвання ледавіковага покрыва, якое ўяўляла сабой шматмятровыя тоўшчы лёду, раёны, што ляжалі на поўдзень, ператварыліся ў лесавы тундрастэп. Крайняй ступені суровасці дасягнуў клімат XVIII — XIV тысяч гадоў назад. Прыродныя ўмовы набылі рысы «субарктычнай пустыні». Зразумела, што ў такім прыродным асяроддзі чалавек існаваць не мог. Разам з тым адзначым, што ў час межледавікоўя клімат быў больш спрыяльным для існавання людзей. Другі фактар, які спрычыніўся да адсутнасці палеалітычных помнікаў, — у час наступаў ледавікоў стаянкі першабытнага чалавека поўнасцю разбураліся. Шматлікія знаходкі касцей маманта, шарсцістага насарога і іншых прадстаўнікоў палеафауны дазваляюць дапусціць, што палеалітычныя людзі жылі на тэрыторыі Дубровенскага раёна.

Пытанні першапачатковага засялення з'яўляюцца вельмі важнымі і актуальнымі, паколькі з іх пачынаецца разгляд гісторыі края. На сённяшні дзень найбольш старажытным помнікам Дубровеншчыны лічыцца мезалітычная стаянка каля вёскі Чыжоўка, дзе людзі жылі каля VII тысяч гадоў назад. Знаходзіцца яна за 300 м на паўднёвы ўсход ад населенага пункта, на мысу, які ўтварыўся пры ўпадзенні невялікай рэчкі ў Днепр. Выяўлены помнік У. П. Ксяндзовым у 1981 г. Усяго было раскапана 336 м^2 плошчы, на якой знойдзены крамянёвыя прылады працы і адходы іх вытворчасці ў колькасці 353 адзінак. У якасці

сыравіны выкарыстоўваўся крэйдавы марэнны камень шэрага колеру і вельмі дрэннай якасці. Частка прылад была выраблена з больш якаснага крэйдавага «сожскага» крэменю цёмна-шэрага колеру і дробназярністага кварцыту.

Нуклеусаў, з якіх здымалі нарыхтоўкі для прылад працы, знойдзена на помніку ў колькасці 20 экз. Ударныя пляцоўкі знаходак афармляліся пры дапамозе аднаго-двух сколаў. Яны гарызантальныя. Чатыры вырабы па форме блізкія да прызматычных. Адшчапленне нарыхтовак, даўжыня якіх дасягала 6 см, праводзілася з аднаго боку. Большасць жа нуклеусаў маюць аморфныя абрысы і з-за моцнай спрацаванасці і прысутнасці на паверхні ўчасткаў крэйдавай абалонкі. На помніку таксама сустракаюцца нуклеусападобныя кавалкі крэменю.

Найбольш шматлікімі ў калекцыі з'яўляюцца адшчэпы (241 экз.) і пласціны (17 экз.), з якіх выраблялiся прылады працы. Усяго прылад было знойдзена 53 экз. Выразнай групай прадстаўлены вастрыі — 6 экз. (рыс. 1, 3—8). Нарыхтоўкамі ім служылі пласціны, верхавіна якіх па аднаму краю апрацавана крутой ці паўкрутой рэтушшу з боку спінкі. У двух выпадках знаходкі падпраўляліся паўкрутой рэтушшу з брушка. Характар апрацоўкі і форма вырабаў дазваляюць сцвярджаць, што вастрыі выкарыстоўваліся ў якасці нажоў. Неапрацаваны натуральна востры канец прылады з'яўляўся лязом, працілеглы край рэтушыраваўся з мэтай не параніць пальцы пры рабоце.

Скрабкі знойдзены на помніку ў колькасці 4 экз. (рыс. 1, 10—13). Памеры іх дасягаюць 2—6 см у даўжыню пры шырыні 1,5—2 см. Усе скрабкі канцавыя, выраблены яны з пласцін, маюць дугападобны ці прамы рабочы край, які апрацаваны, як правіла, крутой рэтушшу. Зрэдку рэтуш заходзіць на краі загатоўкі. Апрацоўвалі скрабкамі шкуры жывёл.

Укладышавыя прылады прадстаўлены двума тыпамі вырабаў. Сячэнні пласцін знойдзены ў 2 экз. (рыс. 1, 15; рыс. 2, 16). Яны прамавугольнай формы, на краі адной знаходкі маецца рэтуш. Трапецыя ў калекцыі адна (рыс. 1, 4). Яна сіметрычная, краі апрацаваны сустрэчнай і аднабаковай крутой рэтушшу. Гэтымі вырабамі аснашчаліся прылады рыбалоўства і паляванння.

Сякучыя прылады працы знойдзены на стаянцы ў колькасці 2 экз. (рыс. 1, 15; рыс. 2, 16). Гэта сякеры, адна з якіх авальнай формы, выраблена з крамянёвага жалвака. Лязо яе апрацавана буйнымі сколамі і рэтушшу (рыс. 1, 15). Другая сякера адносіцца да тыпу з «перахватам», выраблена з масіўнага адшчэпа, лязо натуральна вострае.

Найбольш шматлікімі сярод прыладаў працы з'яўляюцца скоблі — 28 экз. (рыс. 2, 6, 10—15). Нарыхтоўкамі для іх служылі пласціны і адшчэпы, па краях якіх рэтушшу ствараліся выемкі. Прызначаліся гэтыя знаходкі для апрацоўкі дрэўка стрэл. Несумненна першабытны чалавек, які сяліўся каля вёскі Чыжоўка, карыстаўся лукам і стрэламі. Лук рабілі з цвёрдых парод дрэва (вязу, дубу, цісу), даўжыня яго дасягала 120—180 см, афармляўся ён з дапамогай зарубак на канцах і невялікага паглыблення для рук на сярэдзіне. Стрэлы былі драўлянымі ці з трыснягу. На адным канцы стралы рабілася выемка для ўпору на цеціву, на другім мацаваўся наканечнік (драўляны, касцяны, каменны), або яе проста завостравалі. На аснове стралы і па дрэўку наносілася апярэнне з мэтай захавання зададзенага палёту і магчыма надання вярчальнага руху. Спецыялізаваны ха-

рактар паляўніцтва вызначыў шэраг тыпаў стрэл, сярод якіх вылучаюцца стрэлы з тупым канцом для здабывання дробных звяроў і птушак (канец прытупляўся, каб не пашкодзіць шкуркі). На помніку таксама знойдзены скрэблападобныя прылады (рыс. 2, 9), рэтушыраваныя пласціны і адшчэпы (рыс. 2, 7, 8, 14), якімі выконвалі розныя работы (рэзалі, пілілі, стругалі, скаблілі, скраблі і г. д.). На другім баку (левым) рэчкі на араным полі сустракаюцца рэшткі ляпнога посуду, якія датуюцца часам неаліту і бронзы. Мясцовыя жыхары расказваюць, што ў абрыве берага Дняпра вельмі часта знаходзілі свідраваныя сякеры. Гэта месца, на жаль, не даследавалася. На тэрыторыі, дзе размяшчаецца мезалітычная стаянка, чалавек сяліўся другі раз у XIV—XVI ст. н. э. Аб гэтым сведчаць знаходкі рэшткаў посуду гэтага часу, старадаўнія замкі і ключы да іх, каваныя цвікі, нажы.

У час мезаліту паляванне, безумоўна, было асновай існавання, галоўным заняткам насельніцтва. Паляванне давала чалавеку мяса, будаўнічы і паліўны матэрыял (косць), адзенне і абутак (шкуры жывёл). Зай-

Знаходкі з познемезалітычнага помніка Чыжоўка.

маўся першабытны чалавек таксама рыбалоўствам, збіральніцтвам. Жыў ён у эпоху мезаліту ў невялікіх наземных і паўзямлянкавых жытлах плошчай 10—20 м^2.

Помнік ля вёскі Чыжоўка адносіцца да грэнскай культуры, насельніцтва якой у Верхняе Падняпроўе пранікла каля XI тысяч гадоў назад. Аб гэтым сведчаць добра даследаваныя помнікі Берасценава (Аршанскі раён), Аносава (Смаленская вобласць) і інш. Прыйшло грэнскае насельніцтва з захаду (з тэрыторыі цяперашніх Данії, ФРГ) і на працягу мезалітычнай эпохі рассялілася ў паўночнай і цэнтральнай частцы ўсходняй Беларусі. Яго гістарычны лёс археолагам пакуль невядомы.

Неалітычныя стаянкі на Дубровеншчыне не вывучаліся. Археолагам вядомы толькі адзінкавыя знаходкі гэтага часу. Мяркуючы па даследаванай неалітычнай стаянцы каля г. Орша, на гэтай тэрыторыі пражывала насельніцтва верхнедняпроўскай неалітычнай культуры. З'явілася яно тут каля VII тысячагоддзя ад нашых дзён і існавала да V тысячагоддзя. Як і ў мезаліце, аснову гаспадаркі складалі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. І толькі на заключных этапах эпохі пачалі развівацца земляробства і жывёлагадоўля. Насельніцтва сялілася на дзюнных узгорках поплыва і першай тэрасы Дняпра і яго прытокаў. Жытлы былі драўляныя паўзямлянкавыя (паглыбленыя ў глебу да 0,5 м), круглай ці авальнай формы, плошча іх дасягала 8—12 м^2. Каля жытлаў, як правіла, размяшчаліся агнішчы і ямы-сховішчы, у якіх захоўваліся ежа, паліва, сыравіна для вырабу прылад працы. Сустракаюцца на неалітычных паселішчах месцы апрацоўкі крэменю (майстэрні) і вырабу керамічнага посуду. Паходжанне верхнедняпроўскага неалітычнага насельніцтва звязана з

днепра-дзяснінскай мезалітычнай культурай, таму на ранніх этапах неалітычныя крамянёвыя комплексы ўтрымліваюць чаранковыя пласцінчатыя наканечнікі стрэл, бакавыя, сярэдзінныя, вуглавыя разцы, канцавыя і авальныя скрабкі, вастрыі, скоблі, праколкі, авальнай формы сякеры. Для больш позніх помнікаў характэрны ромбападобныя і трохвугольныя наканечнікі стрэл і коп'яў, скрабкі на круглаватых адшчэпах, вуглаватыя разцы, нажы, свярдзёлкі, разнастайныя сякеры, цёслы, часта сустракаюцца маленькіх памераў пласцінкі і адшчэпы, апрацаваныя па краях крутой рэтушшу. Спачатку верхнедняпроўскае насельніцтва вырабляла тоўстасценны вострадонны посуд з прамымі сценкамі і прамымі або ледзь адагнутымі вонкі венчыкамі. Паверхню пасудзін часам упрыгожвалі гарызантальнымі радамі ямкавых уцісканняў або адбіткаў буйнага грабеньчыка. Пазней паявіліся шырокагорлыя пасудзіны з вострым ці круглаватым дном. У гліну, як правіла, дабаўлялі пясок, дробны кварц, радзей раслінныя рэшткі, каб пры абпале посуд не трэскаўся.

Бронзавы век пачаўся на мяжы V і IV ст. ад нашых дзён. Выдзяляецца гэты перыяд у гісторыі тым, што з'яўляюцца вырабы з металу (бронзы). На паселішчах бронзавага веку сустракаюцца бронзавыя прылады працы, зброя, упрыгажэнні. Помнікі эпохі бронзы на Дубровеншчыне мала даследаваны. Беларускія археолагі лічаць, што гэта тэрыторыя ў час бронзы засялялася насельніцтвам сярэднедняпроўскай культуры. Займалася яно земляробствам і жывёлагадоўляй, а таксама паляваннем і рыбалоўствам. Для вырабу прылад працы выкарыстоўваліся крэйдавы крэмень, косць, дрэва. Сярод крамянёвых прылад трохвугольныя двухбакова апрацаваныя наканечнікі стрэл з прамой ці выемчатай асновай, сярпы, цеслы, праколкі. Апрацоўвалі каменныя прылады працы рэтушшу і шліхтаваннем. Часта сустракаюцца ўпрыгажэнні, сярод якіх медныя і бронзавыя дыядэмы, шыйныя грыўны, бранзалеты, трубчатыя пронізкі, скроневыя кольцы, бурштынавыя падвескі. З гліны выраблялiся гаршкі, кубкі, слоікі, чашы з шарападобным ці яйцападобным тулавам, слоікападобныя пасудзіны з плоскім дном. У глінянае цеста дамешвалі пясок, шамот і дробны кварц. Верхняя частка посуду ўпрыгожвалася адбіткамі шнура, лінейнага ці зубчастага штампа, наразнымі лініямі, пазногцевымі ўцісканнямі, якія ўтваралі гарызантальныя і дыяганальныя рады арнаментаў. Жытлы насельніцтва сярэднедняпроўскай культуры былі наземныя, слупавой канструкцыі плошчай да 50 м^2 і паўзямлянкавыя (плошча каля 10 м^2). Пахавальны абрад — трупапалажэнне (галавой на захад у авальных ці прамавугольных ямах у скручаным становішчы на баку з падсыпкай попелу і охры) і трупаспаленне (на курганных могілках).

Літаратура:

Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 1. Мн., 1968.

Ксензов В. П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья. Мн., 1988.

У. Ксяндзоў.

Археалагічныя помнікі Дубровеншчыны

Па тэрыторыі сучаснага Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці цячэ рака Днепр, вядомая па старажытных крыніцах як Барысфен. Гэта магутная рака падзяляе раён на паўночную і паўднёвую часткі. У паўднёвай частцы яна прымае да сябе прытокі Мярэю, Расасенку, Задубровенку, якія ў сваю чаргу звязаны з малымі рэчкамі і рачулкамі. У паўночнай частцы раёна блізка да Дняпра падыходзіць рака Вярхіта, якая праз сістэму азёр звязана з ракой Лучосай — прытокам другой вялікай ракі Віцебскай вобласці — Заходняй Дзвіны. Такім чынам, паўночныя рэкі Дубровеншчыны маюць выхад у басейн Заходняй Дзвіны, а паўднёвыя падыходзяць да вярхоўяў Віхры, Проні, Басі (прытокаў Сожа) і звязваюць гэтую частку раёна разам з Магілёўшчынай у адзіны масіў — басейн Верхняга Падняпроўя.

Наяўнасць разгалінаванай рачной сістэмы спрыяла прасоўванню і рассяленню людзей на гэтай тэрыторыі з даўніх часоў.

Калі леднікі адступілі на поўнач, чалавек пачаў асвойваць тэрыторыю сучаснай Беларусі. Першабытныя групоўкі прасоўваліся ў гушчары лясоў па вялікіх рэках, у тым ліку і па Дняпры, асядаючы на ўзвышшах уздоўж рэк, дзе былі найбольш спрыяльныя для жыцця ўмовы.

У Дубровенскім раёне першабытныя стаянкі каменнага веку былі зафіксаваны ў 1935 годзе каля вёскі Лазараўка (адносіцца да эпохі «новага камню» — неаліту), а таксама каля вёскі Чыжоўка, дзе ў 1981 г. У. П. Ксяндзовым былі выяўлены дзве стаянкі (эпохі мезаліту і эпохі неаліту).

На тэрыторыі раёна пакуль што не выяўлены стаянкі эпохі бронзы — пераходнага перыяду ад каменнага да жалезнага веку, але, безумоўна, яны тут існавалі. Невялікая колькасць паселішчаў каменнага веку на тэрыторыі Беларусі, якая паступова ўзрастае ад палеаліту, звязана з цяжкімі ўмовамі жыцця першабытнага чалавека, вельмі слаба развітай гаспадарчай дзейнасцю, якая зводзілася да паляванне і збіральніцтва, недасканаласцю прылад працы, безабароннасцю людзей перад прыроднымі стыхіямі.

Важкім крокам наперад з'явіўся пераход ад каменнага перыяду да эпохі жалеза. Паступова людзі асвоілі здабычу жалеза з балотных руд. Гэта была сапраўдная рэвалюцыя, якая рэзка павысіла гаспадарчы ўзровень. Асноўнымі гаспадарчымі галінамі ў гэты час былі земляробства і жывёлагадоўля, хаця побач з імі працягвалі існаваць паляванне і збіральніцтва. На тэрыторыі Беларусі жалезны век працягваўся ад VII ст. да н. э. да V ст. I тысячагоддзя н. э. Паўночную і цэнтральную Беларусь у I тысячагоддзі да н. э. і пачатку I тысячагоддзя н. э. засялялі плямёны так званых днепрадзвінскай і штрыхаванай керамікі культур. Насельніцтва гэтых археалагічных культур было балтамоўным, мела блізкія культурныя традыцыі (тып паселішчаў, домабудаўніцтва, вытворчасць керамічнага посуду), карысталася аднатыпнымі прыладамі працы, упрыгажэннямі. Носьбіты гэтых культур у дадзены гістарычны прамежак часу размяшчаліся адпаведна ў паўночнай (мяжрэчча Дняпра і Заходняй Дзвіны) і паўднёвай (Верхняе Падняпроўе) частках Дубровенскага раёна. Для плямёнаў днепрадзвінцаў і штрыхавікоў характэрны першабытнаабшчынны лад з кроўнародавымі сувязямі асобных абшчын, што пражывалі на так званых гарадзішчах-паселішчах, размешчаных на мысах рэк, у поймах на асобных па-



Знаходкі са старажытнага паселішча каля в. Вежкі.

горках. Гэтыя паселішчы ў значнай колькасці збярагліся на тэрыторыі раёна да нашага часу. Вядомы пад назвамі гарадзішчаў, гарадкоў, гарадцоў каля вёсак Баева, Баброва, Барадзіно, Вежкі, Дняпроўка (урочышча Германы), Каўровая (Дзяругі), Карабанавічы, Кісялі, Ляды, Ганчарова, Чырына, Стражава і інш. Частка гарадзішчаў была знішчана падчас розных будаўнічых работ, альбо сапсавана ў гады Вялікай Айчыннай вайны траншэямі і бліндажамі. Але тыя, што зараз існуюць, даюць выразнае ўяўленне аб месцы пасялення старажытных жыхароў раёна. Пляцоўкі гарадзішчаў былі невялікімі, памерам прыкладна 30 х 40 м, абнесены па краю частаколам з завостраных бярвенняў, шчыльна пастаўленых у адзін альбо два рады, аб чым сведчаць слупавыя ямы, выяўленыя падчас раскопак (напрыклад, на гарадзішчы каля в. Стражава).

Для насельніцтва ранняга жалезнага веку ў гэтым рэгіёне характэрнымі былі наземныя жытлы слупавой канструкцыі, якія на першым этапе складаліся з некалькіх камер (разлічаны на вялікую сям'ю), а пазней іх змянілі невялікія аднакамерныя пабудовы для малых сем'яў. Пабудовы гэтага часу размяшчаліся ўздоўж краю пляцоўкі гарадзішча блізка да частакола. Пры раскопках гарадзішча каля в. Дняпроўка (урочышча Германы) С. А. Дубінскім у 1928 г. былі выяўлены рэшткі бярвенняў хваёвага і дубовага дрэва, моцна абгарэлыя, якія знаходзіліся ў ніжнім гарызонце культурнага пласта разам са штрыхаванай керамікай. Яны былі арыентаваны ўздоўж вала, насып якога перакрываў гэты гарызонт слоя, і таму з'яўляліся больш раннімі па паходжанні, чым пабудаваны вал. Відаць, гэта былі рэшткі жытлаў штрыхавікоў, якія пражывалі на гарадзішчы ў раннім жалезным веку. Асобных умацаванняў у выглядзе штучных валоў ці ірвоў на гарадзішчах у раннім жалезным веку не рабілася. Жыхары абмяжоўваліся прыроднай круцізной схілаў пагоркаў, на якіх мясціліся гарадзішчы, альбо глыбокімі, таксама прыроднымі, ярамі з дзвюх бакоў мыса.

Найбольш раннія матэрыялы гэтага часу выяўлены на гарадзішчы Вежкі. Паселішча было заснавана ў сярэдзіне — другой палове I тысячагоддзя да н. э. носьбітамі днепра-дзвінскай культуры.

Пляцоўка гарадзішча была абкру-

жана драўлянай сцяной, сляды якой прасочваюцца па наяўнасці ям ад слупоў і частаколу па яе схілах.

У раскопе II (1995 г.) у паўднёва-заходняй частцы выяўлены фрагмент жылой пабудовы, прамавугольнай у плане, памерамі 10 х 1,8—2 м, паглыбленай у мацярык на 0,4—0,6 м. Комплекс знаходак складаецца з архаічных ляпных неарнаментаваных гаршчкоў, прадметаў быту і гаспадаркі (наканечнікі стрэлаў, гарпуны, праколкі, амулеты), выраблены з косці.

У апошняй чвэрці I тысячагоддзя да н. э. — пачатку I тысячагоддзя н. э. ў асяроддзі насельнікаў лясной зоны Усходняй Еўропы шырока распаўсюджваецца здабыча жалеза з балотных руд, выкарыстанне каляровых металаў. Найбольш выразны рэчавы матэрыял гэтага часу прысутнічаў на гарадзішчах каля вёсак Карабанавічы і Вежкі: жалезныя і бронзавыя шпількі, грузікі дзякаўскага тыпу, сярпы, касцяныя наканечнікі стрэлаў, праколкі з косці, жаночае ўпрыгажэнне — спіралепадобная скроневая прывеска. Посуд, знойдзены тут жа на гарадзішчах, даволі аднастайны — гаршкі з адагнутай шыйкай і параўнальна выпуклым тулавам, альбо слоікавыя пасудзіны з прамымі альбо злёгку пукатымі сценкамі.

Разам з тым, па матэрыялах раскопак як на тэрыторыі раёна, так і на сумежных тэрыторыях Аршаншчыны, Магілёўшчыны, Смаленшчыны ў канцы I тысячагоддзя да н. э. — пачатку I тысячагоддзя н. э. назіраецца прасочванне ў Верхняе Падняпроўе насельніцтва з поўдня — носьбітаў культур мілаградскай, познезарубінецкай, а ў II—III ст. I тысячагоддзя н. э. — кіеўскай. На гэты факт указваюць знаходкі на Карабанавіцкім гарадзішчы ў ранніх пластах керамікі з акруглым днішчам, а таксама жытла ў выглядзе паўзямлянкі акруглай формы слупавай канструкцыі (элементы мілаградскай культуры). Падлога пабудовы была апушчана ў глыбіню на паўметра. Пасярэдзіне паглыблення стаяў апорны слуп дыяметрам 0,3 м. На адлегласці 3 м ад яго па кругу былі прасочаны сляды канаўкі, у якую ўтыркаліся жэрдкі, якія мацаваліся другім канцом на апорным слупе. Пабудова мела выгляд шатра. У заходняй частцы жытла былі прасочаны рэшткі адкрытага вогнішча. Да познезарубінецкага

Агульны выгляд гарадзішча каля в. Карабанавічы.

Раскопкі на гарадзішчы каля в. Карабанавічы. 1995 г.

часу адносіцца знойдзены на гарадзішчах Карабанавічы і Вежкі прафіліраваны посуд з зашчыпамі і насечкамі па краю венчыка.

Пачынаючы з другой чвэрці I тысячагоддзя н. э. насельніцтва жалезнага веку Верхняга Падняпроўя і міжрэчча Дняпра і Заходняй Дзвіны акрамя гарадзішчаў асвойвае пад жыллё і гаспадарку землі, якія прылягаюць да гарадзішчаў. Гэтыя пасяленні адкрытага тыпу — селішчы — выдзяляюцца на разаранай зямлі колерам,— яны маюць арганічныя дамешкі ў грунце і таму цямнейшыя, чым навакольны грунт палёў. Прыкметы селішчаў гэтага часу выяўлены каля гарадзішчаў у вёсках Карабанавічы, Вежкі. Па звестках мясцовых жыхароў, у ваколіцах вёскі Стражава пры земляных работах былі адкапаны грунтавыя могілкі каля Дняпра, дзе разам з касцямі былі выяўлены гаршкі. Магчыма, гэта астаткі могільніка адкрытага паселішча, якое змяніла пасяленне на гарадзішчы. Падчас пераходу насельніцтва з гарадзішчаў на адкрытыя паселішчы кроўна-радавыя сувязі страчваюць сваю сілу і ім на змену прыходзіць суседская абшчына, калі на адным пасяленні месцяцца прадстаўнікі некалькіх радоў. З гэтага часу ў недрах першабытнаабшчыннага ладу пачынаюць выспяваць элементы раннесярэдневяковых культур, пачынае фарміравацца гістарычны перыяд, які атрымаў назву «ваеннай дэмакратыі». Выхад насельніцтва на адкрытыя пасяленні дазволіў павялічыць плошчы пад запашку, узрасла жывёлагадоўля, сталі больш дасканалымі прылады працы, з'явілася магчымасць мець так званы прыбавачны прадукт, які забяспечваў роду, племені жыццёвы мінімум падчас неўраджаю, стыхійных ці ваенных страт. Адначасова вярхушка племені, роду ў асобе князя, старэйшын і ваеннай дружыны атрымлівала ў якасці







Знаходкі на гарадзішчы каля в. Карабанавічы.

«дароў» дадатковую частку ўраджаю, жывёл і іншых здабытых сіламі роду, племені сродкаў існавання. Гэта паступова вяло да расслаення жыхароў аднаго племені, іх нераўнапраўя, што замацоўвалася «звыклым правам», па якому жылі члены племені.

Перамены ў сацыяльным ладзе вялі да змен у побыце жыхароў. З сярэдзіны — пачатку другой паловы I тысячагоддзя н. э. (канец V—VII ст.) гарадзішчы ранняга жалезнага веку, якія былі пакінуты насельніцтвам падчас пераходу на адкрытыя пасяленні, зноў пачынаюць другі этап свайго існавання. Іх выкарыстоўваюць у некалькіх напрамках. На адным з гарадзішчаў размешчаны культавыя святілішчы, дзе члены аднаго племені пакланяюцца сваім багам, у якасці культавых мясцін выступаюць таксама лясныя пушчы, крыніцы з лячэбнай вадой і інш. Так, у Дубровенскім раёне існуе і зараз крыніца непадалёк ад Дуброўны, вядомая яшчэ па звестках XIX ст. ў мясцовасці Грутава.

Іншыя гарадзішчы прыстасоўваліся пад схованкі падчас ваеннай небяспекі. Сюды збіраліся жыхары навакольля, тут жа ўкрывалі найбольш значную маёмасць роду, племені ад абрабавання ваяўнічымі суседзямі ці прышэльцамі з другіх зямель.

У VI—VII ст. гарадзішчы пачынаюць умацоўваць земляными валамі, якія могуць мець унутрывальныя канструкцыі. На жаль, малая вывучанасць археалагічных помнікаў Дубровенскага раёна не дае магчымасці з вялікай доляй верагоднасці вызначыць, якія з гарадзішчаў, што яшчэ захаваліся, былі ўмацаваны абарончымі валамі менавіта ў гэты час. Аднак знешні выгляд гарадзішчаў і наяўнасць культурных напластаванняў трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. дазваляюць думаць, што на гарадзішчах Карабанавічы, Баева, Стражава, Вежкі, Барадзіно, Германы (Дняпроўка) першапачатковыя валы былі ўзведзены падчас фінальнай фазы ваеннай дэмакратыі, калі гэтыя гарадзішчы адыгрывалі ролю цэнтраў абшчын, з якіх складалася племя.

Па формах керамічных комплексаў, а таксама па некаторых іншых прыкметах, насельніцтва трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. ў археалагічнай навуцы прынята падзяляць на асобныя культурныя масівы, якія адначасова размяшчаліся на сумежных тэрыторыях: у Віцебскім Падзвінні і міжрэччы Заходняй Дзвіны і Дняпра — гэта Банцараўская культура, у Смаленскім Падняпроўі — Тушамлінская, у Магілёўскім — Калочынская. Як паказалі археалагічныя даследванні, тэрыторыя Аршанскага, Дубровенскага, часткова Талачынскага раёнаў з'яўляецца зонай сутыкнення і ўзаемнага пранікнення носьбітаў гэтых культурных масіваў. У выніку атрымаўся шэраг помнікаў, на якіх можна сустрэць у адным і тым жа слоі керамічны посуд, характэрны для дзвюх альбо ўсіх трох археалагічных культур. Усе гэтыя культуры вельмі падобныя паміж сабой, і, магчыма, звязваюцца ў адну этнічную групоўку, дзе пераважае славянскі элемент. Гэта верагодна таму, што на працягу ўсяго I тысячагоддзя н. э. з поўдня па Дняпры і яго прытоках ішло напаўненне рэгіёна паўночна-ўсходняй Беларусі носьбітамі славянскага этнаса. Пры раскопках гарадзішчаў каля вёсак Стражава, Вежкі, Германы (Дняпроўка), выдзелены пласты, у якіх захаваліся матэрыялы, што адлюстроўваюць наяўнасць як Банцараўскай (Стражава), так і Калочынскай (Вежкі) археалагічных культур з мясцовымі, характэрнымі таксама для гарадзішчаў Аршаншчыны (Чаркасава), Талачыншчыны (Кісялі) асаблівасцямі ў керамічных комплексах.

У 3-й чвэрці I тысячагоддзя гарадзішча каля в. Вежкі стала цэнтрам славянскай (Калочынская культура) радавой абшчыны. Гаспадарчыя пабудовы на ім у гэты час размешчаны па перыметры пляцоўкі. Іх сляды прасочаны ў выглядзе абгарэлых бярвенняў, скапленняў каменняў і зерня. Адна з пабудоў выяўлена ў гарэлым слоі і мае памеры 1,8 х 1,4 м. Яна прамавугольнай формы, зрубнай канструкцыі і была перакрыта. У насыпу вала таксама сустрэта аналагічная гэтаму слою кераміка. Яна ж прысутнічае і ў слоі, які адклаўся адначасова з існаваннем насыпу вала. Такім чынам, першапачаткова паселішча трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. на гарадзішчы каля в. Вежкі не было ўмацавана валам, а відаць, толькі тынам, аб чым гаворыць праслойка гарэлага дрэва ўздоўж насыпу вала. Пазней, але ў той жа перыяд, на ім узвялі вал, у аснове якога была невялікая каменная вымастка, а ўнутраная частка земляного вала мела таксама нейкія драўляныя канструкцыі. На гарадзішчы былі сустрэты разнастайныя бытавыя рэчы (пружынныя нажніцы, нажы, пінцэт, гліняныя прасліцы, якія надзяваліся на верацяно), наканечнік стралы, дроцік. Асобна выдзяляюцца жаночыя ўпрыгажэнні: сярэбранае і некалькі бронзавых скроневых калец, дротавы пярсцёнак і пронізкі з бронзы, бурштынавыя бусы, фрагмент масіўнага літога бронзавага бранзалета з расшыранымі канцамі, арнаментаванага насечкамі. Аналагічныя ўпрыгажэнні шырока распаўсюдзіліся ў асяроддзі славянскага насельніцтва ад Ніжняга Дунаю на захадзе да Дняпра на ўсходзе ў VI—VII ст. і часта сустракаюцца ў скарбах антаў, якія датуюцца гэтым часам. У верхнім пласце побач з керамікай, лепленай ад рукі, выяўлены фрагменты гаршкоў, якія таксама лепленыя ад рукі, але ўжо праўлены на кругавой падстаўцы («паваротны столік»). Аб гэтым сведчаць як характэрныя зацёкі на днішчах сасудаў, так і афармленне края верхняй часткі пасудзін. Гэта вельмі цікавая знаходка, улічваючы, што ў цэлым помнік можа датавацца не пазней VIII — пачатку IX ст. Такім чынам, тут мы назіраем ранняе праяўленне развіцця тэхнікі ганчарнай вытворчасці — пераходны момант ад лепкі сасудаў ад рукі да фармавання іх на спецыяльных прыладах — правобразах ганчарнага круга.

З IX ст. пачынаецца новы этап у развіцці ранняга сярэдневечча. Да гэ-



Знаходкі з гарадзішча каля в. Вежкі.

тага часу сфарміраваліся асноўныя рысы новай эпохі. Па-першае, на месцы плямёнаў, якія раней можна было аб'ядноўваць толькі ў археалагічныя культуры па наяўнасці ці адсутнасці асобных рыс (Банцараўская, Тушамлінская, Талачынская і г. д.) пісьмовыя крыніцы называюць этнічныя аб'яднанні — саюзы плямёнаў. Гэта крывічы (полацкія, смаленскія, пскоўскія), дрыгавічы, радзімічы і інш. Па-другое, у названых племянных саюзаў з'яўляюцца свае цэнтры — першыя гарады — Полацк, Смаленск, Кіеў, Ноўгарад. Па-трэцяе, ідзе далейшы працэс дыферэнцыяцыі грамадства і ўтварэння раннекласавых «княжэнняў» — правобразаў дзяржаў — Кіеўскай, Полацкай, Смаленскай, Наўгародскай.

Рэгіён паўночна-ўсходняй Беларусі, куды ўваходзіць і Дубровенскі раён, працяглы час быў адносна самастойным і неўцягнутым у сферу дзяржаўных утварэнняў. Гэтаму спрыялі два фактары: наяўнасць сістэмы водных шляхоў з поўдня на поўнач, дзе ў месцах ўтварэння волакаў было больш шчыльнае засяленне тэрыторыі. Частка тавараў, якія з IX ст. правозіліся праз рэгіён па шляху «з варагаў у грэкі», асядала на волакавых паселішчах, спрыяла развіццю эканамічнай незалежнасці іх насельніцтва. Па-другое, «княжэнні» — Полацкае, Смаленскае, Кіеўскае, Наўгародскае — на раннім этапе развіцця мелі невялікія ўстойлівыя тэрыторыі вакол ядра — гарадскога (былога племяннога) цэнтра. Яны не маглі кантраляваць ці неяк уплываць на больш аддаленыя землі.

Для эпохі ранняга сярэдневечча на тэрыторыі Дубровенскага раёна новым відам археалагічных помнікаў з'яўляюцца курганныя могільнікі. З аднаго боку яны адлюстроўваюць характар пахавальнага абрада. З другога свед-

чаць аб вераваннях сельскага насельніцтва раёна. Пахавальны інвентар, які клалі ў магілу разам з астанкамі нябожчыка, дае ўяўленне аб прадметах быту і гаспадаркі таго часу. Скапленне курганоў на асобных участках тэрыторыі раёна дазваляе прасачыць месцы знаходжання сельскіх паселішчаў ранняга сярэдневечча. Форма курганоў (круглыя ці падоўжаныя) указвае ўскосна на іх храналагічную прыналежнасць. Так, падоўжаныя курганы былі раннія. Яны адносяцца да VII—VIII ст. У іх пахаванне адбывалася па абраду трупаспалення. І. А. Сербаў, які абследаваў помнікі археалогіі Дубровенскага раёна ў 1930-я гады, адзначыў, што ў адным з курганоў урочышча Змяінкі (якое атрымала сваю назву па форме падоўжаных курганоў) недалёка ад вёскі Азёры ў вяршыні насыпу было выяўлена пахаванне па абраду трупаспалення. Аналагічныя пахаванні выяўлены ў 1990 годзе ў групе з падоўжаных і круглых курганоў каля возера Арэхаўскае (Аршанскага раёна) разам з пахавальнымі гліняными гаршкамі VII ст. У Дубровенскім раёне найбольшае скапленне курганных могільнікаў праглядаецца ўздоўж р. Вярхіты ад вёскі Шэкі, дзе дзве групы (адпаведна 16 і 12 курганоў) размяшчаліся каля самой вёскі і каля возера, і далей у напрамку вёсак Азёры—Горбава яшчэ 8 курганных груп (адна з іх па р. Вязаўка — прытоку р. Вярхіты). У гэтых могільніках налічвалася ад 7 да 30 курганоў. Як вядома, р. Вярхіта ўпадае ў р. Лучосу і праз волакі і сістэму азёр звязана з р. Днепр. Таму зафіксаваныя курганы паказваюць месцазнаходжанне волакавых паселішчаў у паўночнай частцы Дубровенскага раёна. Пацвярджэнне гэтаму — знаходка ў 1962 г. на р. Вярхіце каля в. Добрына манетна-рэчавага скарба IX ст. У ім была знойдзена сярэбраная шыйная грыўна

(200,8 г) у выглядзе 8-граннага дрота, арнаментаванага па 4 верхніх гранях чатырохпялёсткавымі разеткамі з рэльефнымі кропкамі ў цэнтры. На абодвух канцах дроту кубікападобныя галоўкі з усечанымі верхнімі вугламі, арнаментаванымі востравугольнымі фігурамі і разеткамі як і на дроце. Акрамя грыўны ў скарбе было знойдзена 527 куфіцкіх дырхемаў (манет Арабскага халіфата), якія мелі даты ад 724 г. па 847 г.

У паўднёвай частцы раёна таксама існаваў волак з Дняпра ў басейн Сожа. Падняўшыся ўверх па Расасенцы, крыху ніжэй в. Казарынава шлях звачваў у яе левы прыток — раку Перавалачню. Па ёй пачынаўся волак у р. Паросіца, якая ўпадае ў р. Проня, а адтуль шлях вёў у Сож. Аб шырокім карыстанні гэтым шляхам сведчаць як шматлікія селішчы па р. Паросіца ў суседнім Горацкім раёне, так і наяўнасць гарадзішчаў раннефеадальнай пары каля вёсак Баева, Панізоўе ў Дубровенскім раёне. У 1936 годзе паміж гэтымі вёскамі быў знойдзены манетны скарб IX ст. Ён налічваў 138 цэлых і 168 фрагментаваных куфіцкіх дырхемаў. Самыя раннія з іх былі адбіты ў 705—715 гг., а найбольш познія — у 847—861 гг.

Акрамя курганоў на волаках у Дубровенскім раёне зафіксаваны яшчэ з канца XIX ст. курганныя могільнікі каля вёсак Баброва, Бахава, Глебава, Галяшы, Макараўка, Цілівічы, Ляды (хутар Усвяты).

У 1930-я гады курганы былі выяўлены каля в. Судзілавічы (12 насыпаў), вялікая колькасць курганоў была ў навакольлі в. Новая Тухінь (у лясах), каля самой вёскі зафіксаваны 8 круглых і 3 падоўжаных насыпы. Курганы былі каля в. Шалашына, адзін курган ёсць каля в. Сваташыцы. Паколькі мноства курганоў былі размешчаны ў навакольлі вёсак на полі, большая частка з іх ужо не існуе, яны разараны. Памяць людзей утрымлівае толькі падзеі нядаўняй пары, таму жыхары сучасных вёсак часта звязваюць старажытныя курганы з вайной 1812 года або крыху ранейшымі падзеямі часоў вайны са шведамі. Адсюль назвы курганоў — «шведскія» ці «французскія» магілы.

Усталяванне ў IX—X ст. шляха «з варагаў у грэкі» з поўдня на поўнач, які звязваў Візантыю — Кіеў — Готланд — Скандынавію, патрабавала дзяржаўнага кантролю на волакавых участках. Таму ў 947 годзе княгіня Вольга адправілася з Кіева па гэтаму шляху і ўстанавіла адміністрацыйныя пункты збору даніны з усіх плацежаздольных мясцін (пагосты, урокі). Ролю такіх пагостаў маглі выконваць умацаваныя гарадзішчы — цэнтры сельскіх абшчын, з якіх раней складаліся плямёны. Такім чынам, у сярэдзіне X ст. рэгіён паўночна-ўсходняй Беларусі апынуўся пад кантролем кіеўскіх князёў. Малая даследаванасць археалагічных помнікаў Дубровенскага раёна не дазваляе пакуль вылучыць тыя з гарадзішчаў, якія маглі выконваць функцыі пагостаў. Бліжэйшыя пункты ў сумежных раёнах — гарадзішча каля вёскі Чаркасава (Аршанскі раён), гарадзішча каля вёскі Горы (Горацкі раён).

У пачатку XI ст. пачынаецца экспансія Полацкага княства на ўсход. Мэта адна — авалодаць ключавымі пунктамі на шляху «з варагаў у грэкі» — Віцебскам і Усвятамі і далей устанавіць кантроль над волакамі з Верхняга Падняпроўя ў Падзвінне. У 1021 годзе полацкі князь Брачыслаў атрымаў ад кіеўскага князя Яраслава Мудрага Віцебск і Усвяты. А ў 1067 г. інтарэсы Полацкага княства сутыкнуліся з інтарэсамі ўжо існуючага самастойна Смаленскага княства на р. Аршыца (Рша) у «Смолиньска». Тады,

відаць, і была зроблена спроба ўстанаўлення граніцы паміж Полацкім і Смаленскім княствамі ў Верхнім Падняпроўі. Узнікненне на рубяжы XI—XII ст. спачатку пасяленняў адкрытага тыпу, а пазней крэпасцяў на правым і левым берагах р. Днепр (Оршы і Копысі) у невялікай адлегласці адна ад другой можа служыць ускосным пацвярджэннем гэтаму. Далейшая барацьба Полацка і Смаленска за Віцебск, Оршу, Копысь на працягу некалькіх стагоддзяў была спробай узяць верх над важнай воднай магістраллю.

Да X—XI ст. можна аднесці тапонімы «палачане», «смаляне» і вытворныя ад іх, якія сведчаць аб рэгіёне, дзе праходзіла фарміраванне памежжа Полацкай і Смаленскай зямель у гэты час. У наваколлі сучаснай Оршы на правым беразе р. Днепр ёсць назвы Смаляны, Смаленцы, што можа паказваць на прыналежнасць дадзенай тэрыторыі ў раннім сярэдневеччы да Смаленска. Але тут жа ёсць і тапонім Палачанка, які таксама дазваляе аднесці акрэслены рэгіён да Полацкай дзяржавы. Група тапонімаў — Палачані-Дыманава і Брослаўль размешчана на поўнач ад балота Верацея, якое цягнулася ад Бабінавічаў у бок р. Лучоса, а потым уздоўж яе да дарогі на Віцебск. Гэты дрыгвяны масіў, верагодна, у XI ст. служыў прыроднай мяжой паміж Смаленскім і Полацкім княствамі на поўначы. Такім чынам, тэрыторыя сучаснага Дубровенскага раёна ў X—XI ст. хутчэй за ўсё належала да Смаленскага княства і працягвала ўваходзіць у яго склад яшчэ на працягу дзвух стагоддзяў.

Фарміраванне тэрыторый дзяржаў у раннім сярэднявеччы адбывалася на аснове аб'яднання вялікіх зямельных участкаў, якія належалі асобным плямёнам — «валасцей» (ад слова «валодаць»), якія мелі свае цэнтры ўпраўлення. Пазней, у канцы XI — пачатку XII ст. гэтыя воласці ператварыліся ва ўдзельныя княствы (Віцебскае, Друцкае і інш.), куды ўжо ў якасці валасцей меншых памераў уваходзілі тэрыторыі былых пагостаў. Да такога падзелу прывяло развіццё сістэмы ўладальніцтва, вассалітэта, калі ўдзельныя князі павінны былі надзяляць «кармленнямі» сваіх дружыннікаў — вярхушку феадальнай знаці, якая да гэтага часу сфарміравалася. З цягам часу ўмацоўвалася тэрытарыяльна-адміністрацыйная структура Полацкай і Смаленскай дзяржаў-зямель. Гарады Копысь і Орша з парубежных крэпасцей ператварыліся ў цэнтры навакольнага асяроддзя.

Калі ў X—XI ст. Смаленская зямля (воласць) сама была ў залежнасці ад Кіева і плаціла яму даніну, то з атрыманнем самастойнасці Смаленскае княства пачало рэгуляваць збор даніны з навакольных тэрыторый у сваю карысць. У Статуце смаленскага князя Расціслава 1136 г. прыводзіцца спіс населеных месцаў, з якіх збіраюцца даходы на карысць князя. Сярод іх ёсць воласці Мірацічы і Басея, якія займалі тэрыторыю сучаснага Дубровенскага раёна і паўночных раёнаў Магілёўшчыны (Шклоўскі, Горацкі). Воласць Мірацічы размяшчалася ў паўднёва-ўсходняй частцы Дубровенскага раёна і называлася па рацэ Мярэя. Даследчыкі лічаць, што цэнтрам гэтай воласці магло быць гарадзішча каля вёскі Ляды альбо каля вёскі Леніна Горацкага раёна (былая вёска Рамана-ва). Воласць Мірацічы плаціла даніну 10 грывен срэбрам, што было самай нізкай цаной у спісе даннікаў. Магчыма, пастаянныя ваенныя паходы князёў праз гэтыя тэрыторыі не спрыялі стабільнасці развіцця эканомікі і гэтыя землі тады былі мала населенымі. Аб гэтым ускосна сведчыць малая колькасць курганоў у паўднёва-ўсходняй частцы Дубровенскага раёна.

Гарадзішча каля в. Стражава.

Як сведчыць грамата «Аб пагародзі і пачэсці» (1211—1218 гг.), у пачатку XIII ст. Копысь — цэнтр заходняй часткі Смаленскага княства, памежнай з Полацкай зямлёй, была адным з пяці адміністрацыйных цэнтраў, якія маглі самастойна плаціць пагароддзе, і адным з двух, што маглі запрашаць на службу епіскапа. У гэты час у склад воласці, падуладнай Копысі, напэўна ўваходзіла і частка зямель Дубровенскага раёна, набліжаная да горада.

У XII—XIII ст. на тэрыторыі Дубровенскага раёна, як і сумежных, што ўваходзілі ў склад Віцебскага, Смаленскага, Друцкага княстваў, утвараецца шэраг феадальных сядзіб, якія размяшчаліся на былых гарадзішчах. Гэта ўжо трэці перыяд выкарыстання гарадзішчаў пад паселішчы. Там, дзе гарадзішчы не мелі земляных умацаванняў (першая палова I тысячагоддзя н. э.), узводзяцца валы па краю пляцоўкі. На пляцоўцы знаходзілася жыллё феадала, якому належалі навакольныя вёскі. Частка гарадзішчаў у гэту пару выкарыстоўвалася пад старажавыя крэпасці на граніцы з іншымі княствамі. У гэтым разе на гарадзішчах узводзіліся больш магутныя земляныя валы з унутрывальнымі канструкцыямі. Абследаванне гарадзішчаў Дубровенскага раёна і раскопкі некаторых з іх дазваляюць думаць, што да феадальных сядзіб у XII—XIII ст. адносіліся гарадзішчы каля вёсак Панізоўе, Чырына, Ляды. Матэрыялы гэтага часу (у тым ліку керамічны посуд, шкляныя бранзалеты) знойдзе-

ны ў невялікай колькасці на гарадзішчах Карабанавічы, Германы (Дняпроўка), Стражава. Разам з тым, раскопкі гарадзішчаў каля в. Стражава і в. Германы паказалі, што магутныя валы былі ўзведзены тут менавіта ў XII — пачатку XIII ст. Вал на гарадзішчы каля в. Стражава меў у аснове каменную вымастку таўшчынёй 0,2—0,3 м з валуноў сярэдніх памераў. Яны шчыльна прымыкалі адзін да аднаго, утвараючы моцную пляцоўку. Паверх каменняў у цэнтры вала была складзена бярвенчатая рашотка ў некалькі радоў, якая ўтварыла каркас вала. Потым уся канструкцыя была шчыльна забіта зямлёй з глінай і пяском. Сама пляцоўка гарадзішча пасля ўзвядзення вала стала невялікай. З напольнага боку вал быў вышэй. У бок р. Днепр, над якой на мысу месцілася гарадзішча, абведзена двума глыбокімі равамі прыроднага паходжання. Сходную канфігурацыю і месцапалажэнне мае і гарадзішча каля в. Германы. Тут таксама была зафіксавана каменная вымастка значнай таўшчыні і драўляныя канструкцыі. Абодва гарадзішчы размешчаны над р. Днепр і маглі быць старажавымі крэпасцямі на пагранічы Смаленскай зямлі з суседзямі.

Падчас утварэння Вялікага княства Літоўскага заходняя частка Смаленскага княства (тэрыторыя былой Копыскай воласці) ужо ўваходзіла ў склад маёмасці князёў Друцкіх, што былі на службе Вялікага князя Літоўскага. Аб гэтым сведчыць дарчая грамата князя Друцкага-Зубрэвіцкага Дзмітрыя Сямёнавіча на зямлю «пустую Дубровенскую» першай паловы XV ст.

В. Ляўко, А. Мяцельскі,
Ю. Каласоўскі.

Там, дзе быў Дубровенскі замак
(першыя старонкі гісторыі Дуброўны)

Не так даўно лічылася, што ад замчышча ў Дуброўне амаль нічога не засталося. Культурны пласт, як уяўлялася, быў знішчаны падчас будаўнічых работ апошніх дзесяцігоддзяў. Таму першапачатковая гісторыя горада падавалася ў публікацыях толькі на падставе нешматлікіх пісьмовых крыніц. Гэтыя крыніцы ў сваю чаргу не заўсёды былі звязаны паміж сабою і нават ў пэўнай ступені з'яўляліся супярэчлівымі.

У чэрвені 1996 г. археолагам пашанцавала выявіць выразны культурны пласт добрай захаванасці на тэрыторыі былога Дубровенскага замчышча. Праведзеныя тут даследаванні дазволілі станоўча адказаць на шэраг пытанняў, якія датычацца развіцця цэнтра сярэдневяковай Дуброўны.

Дубровенскае замчышча размешчана ў цэнтральнай частцы сучаснага горада пры ўпадзенні р. Дубровенка (Задубровенка) у р. Днепр. Яно займае мысавое ўзвышша і ўяўляе сабою роўную прамавугольную пляцоўку, добра задзернаваную, без слядоў абарончых збудаванняў сярэдневяковай пары на яе паверхні. Таму цяжка ўявіць, якім было паселішча на гэтай пляцоўцы гадоў 300—500 назад.

На правым беразе р. Дубровенка каля самога замчышча на ўсход ад яго захаваліся рэшткі глыбокага калісьці рва, што злучаў, відаць, Дубровенку з Дняпром, надаючы замку выгляд астраўной крэпасці. Земляны насып паміж ірвом і Дубровенкай, які вузкім перашыйкам падыходзіць да паўднёва-ўсходняга краю замчышча, паказвае, дзе мог быць уезд на тэрыторыю замка, калі тут існавалі абарончыя збудаванні.

Раскопкі на замчышчы Дуброўны.

Сучасны рэльеф пляцоўкі замчышча дазваляе вылучыць асобныя ўмацаваныя раней часткі, якія былі зафіксаваны інвентаром 1645 г.: 1 — тэрыторыю самога замка (90 х 45 м); 2 — тэрыторыю падзамка ці «прыгародка» (35 х 45 м). Прыгародак размяшчаўся ва ўсходняй частцы замчышча і быў прыкладна на 1 м ніжэй, чым пляцоўка замка.

Археалагічнае даследаванне праводзілася на дзвюх пляцоўках, з якіх складаецца тэрыторыя замчышча. Раскопы I, II агульнай плошчай каля 100 м^2 былі закладзены ў заходнепаўднёвай і паўночнай частках замчышча. Тут жа зроблена прарэзка былога вала ў бок р. Днепр, спалучаная з раскопам II. Даўжыня вонкавай часткі вала, які захаваўся, склала 8 м. Яго вяршыня і верхнія культурныя напластаванні XVIII ст. на самой замкавай пляцоўцы былі знішчаны будаўнічымі работамі ў апошні час. Тая ж частка культурнага слою, што захавалася, мае магутнасць ад 1,1 да 1,4 м.

Усходняя частка замчышча («падзамак» ці «прыгародак») вывучалася шурфамі № 1—3 агульнай плошчай 24 м^2. Тут таксама быў зафіксаваны культурны пласт і рэшткі абарончага вала.

Трэба зазначыць, што паўднёвая частка культурнага пласта замчышча ў асноўным сапсавана пракладзенымі тут камунікацыямі і страціла сваю навуковую вартасць.

Выяўлены культурны пласт і рэшткі насыпу абарончага валу дазволілі ўдакладніць некаторыя моманты, звязаныя з часамі існавання самога паселішча на тэрыторыі замчышча і вылучыць этапы пабудовы абарончых канструкцый, іх характар.



Гарда шаблі ці шпагі.

Самы ранні культурны пласт магутнасцю 0,2—0,4 м, а на краі пляцоўкі пад валам 0,4—0,6 м прасочаны ва ўсіх раскопах і шурфах. У ім захаваліся рэшткі жылых пабудоў, заглыбленых у мацярык на 0,4—0,5 м з гідраізаляцыяй з чырвонай гліны. Пабудовы размешчаны бліжэй да цэнтра пляцоўкі. У адной з іх выяўлены тэракотавая гаршковая (падобная на гаршчок) кафля з высокім цыліндрычным вусцем. У гэтым жа пласце знойдзены кавалкі кафлі з крыжападобным вусцем. Такая кафля з'явілася на Беларусі ў другой палове XIV ст., калі на змену глінабітным печам прыйшлі печы, упрыгожаныя сасудападобнай кафляй. Яна выконвала ролю своеасаблівых каларыфераў, якія павялічвалі цеплааддачу печаў і таксама спрыяла ўпрыгажэнню інтэр'ера жытлаў.

Заглыбленыя ў мацярык жытлы невялікіх памераў накшталт дубровенскіх былі выяўлены падчас раскопак у Задунаўскай слабадзе Віцебска, дзе яны датаваліся паводле знойдзеных матэрыялаў XIV—XV ст. Фрагменты керамічнага посуду з ніжняга пласта замчышча таксама датуюцца не пазней XV ст.

Знаходкі кафлі і кавалка арнаментаванай вонкавай абкладкі пячнога скляпення XV ст. паказваюць наяўнасць заможнай часткі насельніцтва на дубровенскім паселішчы ў гэты час. Улічваючы значную магутнасць пласта, адпавядаючага першаму паселішчу на тэрыторыі Дубровенскага замчышча, можна меркаваць, што яно існавала працяглы час і было цэнтрам будучай Дубровенскай воласці — «Дубровенскі шлях», якая ўпамінаецца ў дакументах канца XV — пачатку XVI ст.

Менавіта паселішча на замчышчы магло даць назву і «зямлі пустой Дубровенскай» у той час, калі вакол яго яшчэ не было другіх населеных мясцін (першая палова XV ст.).

Тое, што Дубровенскія «пустыя» землі былі адпісаны княгіні Зофіі з нашчадкамі адным з друцкіх князёў Дзмітрыем Сямёнавічам Друцкім-Зубравіцкім (па мянушцы «Сякіра»), сведчыць аб іх уваходзе ў XV ст. ў склад беларускіх зямель ВКЛ.

Па дакументах пачатку XVI ст. Дуброўна ўжо вядома як «горад». Яна згадваецца ў сувязі з ваеннымі падзеямі 1514 г., калі была занята рускім войскам напярэдадні Аршанскай бітвы на р. Крапівенка. Відаць, у гэты час на Дубровенскім замчышчы ўжо існавалі першыя абарончыя збудаванні, якія дазвалялі называць яго «горадам». Прарэзка вала паказала, што спачатку па краю пляцоўкі праходзіў просты паркан, апорныя стаўбы якога адстаялі адзін ад другога на 0,4—0,5 м і мелі дыяметр да 0,2 м. Паркан згарэў, аб чым гаворыць праслойка вугалля, якая перакрыла тут культурны пласт першапачатковага паселішча.

На самой пляцоўцы ў гэты час, відаць, знаходзілася толькі двух'ярусная вежа, якая была нанесена на карту, складзеную С. Герберштэйнам, нямецкім дыпламатам і падарожнікам, у 1517 г.

У раскопе III знойдзены рэшткі пабудовы, якая можа мець дачыненне да абарончых збудаванняў замка на мяжы XV—XVI ст. Яе памеры звонку 5,4 х 5,4 м, унутраная плошча 4 х 4 м. Фундамент пабудовы зроблены ў выглядзе драўлянага каркаса з бярвенняў дыяметрам да 15 см, пакладзеных рашоткай у чатыры ярусы. Пляцоўка пад ніжнім ярусам з чырвонай, добра абпаленай гліны. Пад ніжні ярус бярвенняў падкладзены дзе-нідзе вялікія камяні, а вуглы каркаса замацаваны чатырохвугольнымі слупамі таўшчынёй 20—25 см ці камянямі. Вонкавая частка каркаса на шырыню 0,7 м забіта чырвонай глінай і ўтварае своеасаблі-

вы фундамент пабудовы. Яго вышыня складае 0,8 м, і ён поўнасцю заглыблены ў пясчаны мацярык.

Пры расчыстцы ўнутры пабудовы ў яе паўночна-ўсходнім куце выяўлены рэшткі разбуранай печы з шматкаляровай кафляй XVI ст., цэгла памерам 30 х 16 х 6 см. Тут жа ў слоі пажару знойдзены фрагменты ножнаў, рукаяць шаблі, лёза брытвы, нажніцы, касцяная пласцінка з прачэрчанай выявай чалавека эпохі рэнесанса, гліняны і шкляны імпартны посуд XVI ст., аконнае шкло.

Месцазнаходжанне, стратыграфія, комплекс выяўленых прадметаў дазваляюць датаваць пабудову ў цэлым XVI ст., а характар яе канструкцыі да абарончых вежаў гэтага часу.

Пасля знішчэння паркана па краю пляцоўкі ўзводзіцца земляны вал, які меў ядро з шчыльнай чырвонай гліны, пакрытае слоем з дамешкай бітай цэглы і кавалкаў гаршковай кафлі. Па версе землянога насыпу былі зроблены нейкія драўляныя канструкцыі, ад якіх праслежаны сляды слупоў вялікага дыяметру і праслойкі вугалля. Вядома, што Дубровенскі замак разбураўся і спальваўся ў 1535, 1552 гг., але хутка аднаўляўся.

Пасол аўстрыйскага імператара Мікалай Варкач у канцы 1593 г. адзначыў, што Дуброўна — замак шырокі ў акружнасці, але ўвесь драўляны.

Інвентар Дубровенскага замка 1645 г. паведамляе, што раней на валу стаялі сцены-гародні з некалькімі вежамі. Уезд у замак ажыццяўляўся па пад'ёмным мосце на жалезных ланцугах.

З цягам часу сцены-гародні былі заменены на астрог, тры новапабудаваныя вежы меў падзамак ці «прыгародак». Рамантаваліся і старыя вежы замка.

Усе гэтыя працы адлюстраваны падсыпкамі насыпу вала ў розныя часы і культурнымі напластаваннямі, якія адкладаліся ў прамежках рэканструкцый збудаванняў.

Выяўленыя падчас раскопак на замчышчы шматлікія знаходкі бытавога разнастайнага посуду XVI—XVII ст., прадметы гаспадаркі і быту, наканечнік стралы, рукаяць (гардэ), шпагі, ножны, манеты сведчаць аб развіцці жыцця замчышча ў гэты перыяд.

Асобую цікавасць уяўляюць чаша з каляровага метала, ажурныя накладкі, выява чалавека, прачэрчаная на касцяной пласціне, і шырокі асартымент

Фрагмент энкалпіёна (бронза).



Касцяная пласцінка з выявай.

тэракотавай і паліванай кафлі, у тым ліку гербавай.

Адлюстраваныя на кафлі гербы належаць роду князёў Глябовічаў, якія доўгі час з'яўляліся ўладальнікамі Дубровенскага замка. Тут прысутнічае герб Юрыя Глябовіча «Леліва» ў выглядзе шасцікутнай зоркі з паўмесяцам пад ёю. Герб «Пагоня» — вершнік з узнятым над галавой мячом належыць Зофіі Сангушцы, бабулі Яна Янавіча Глябовіча па мацярынскай лініі. Герб «Гжымал» належаў маці жонкі Яна Янавіча Катарыне Кратоўскай.

В. Ляўко

Гербавая кафля з выявамі «Лелівы» і «Пагоні».

СПІС КУРГАННЫХ ПОМНІКАЎ ДУБРОВЕНШЧЫНЫ

Бахатава (Бахава), вёска. Каля вёскі курган. Вядомы з 1873 года.

Вязаўка, рака, прыток Вархіты. У наваколлі вёскі Новая Зямля група курганоў. Адкрыты ў 1928 годзе.

Глебава, вёска. Група курганоў. Вядомы з 1873 года.

Галяшы, вёска. Каля вёскі 2 курганы. Вядомы з 1873 года.

Добрына, вёска. 7 курганоў насупраць вёскі. У 1962 годзе непадалёку знойдзены манетна-рэчавы клад IX ст. Вядомы з 1873 года.

Ляды, вёска. У напрамку хутара Усвяцце група курганоў.

Макараўка, вёска. Каля вёскі група курганоў. Вядомы з 1873 года.

Новая Тухінь, вёска. У лясах каля вёскі шмат курганоў, у тым ліку каля самой вёскі 8 круглых і 3 прадаўгаватыя насыпы. У 1971 годзе абследаваны Г. В. Штыхавым.

Азёры, вёска. 7 курганоў на паўночна-ўсходнім беразе возера Суканаўскае 30 курганоў па дарозе з вёскі Азёры на Добрына, 28 курганоў па дарозе ў Горбава. На адлегласці 1 км на паўночны захад ад іх яшчэ 19 курганоў. Адкрыты ў 1928 годзе І. А. Сербавым.

Судзілавічы, вёска. На беразе ракі Вярхіта група курганоў, з якіх захавалася 12 пашкоджаных насыпаў.

Цілівічы, вёска. Група курганоў. Вядомы з 1873 года.

Шалашына, вёска. Група курганоў.

Шэкі, вёска. Рэшткі 3 курганных могільнікаў. У першым, паміж вёскай і возерам, 6 насыпаў, у другім 7 і ў трэцім 12 курганных насыпаў. Адкрыты І. А. Сербавым.

І. А. Сербаў сведчыць

Апісваючы курганы Дубровенскага раёна па стану на 1928 год беларускі этнограф, фальклярыст і археолаг І. А. Сербаў адзначаў:

«...На правым беразе Дняпра выяўлена пакуль 12 курганных могільнікаў. Пад лесам яны даволі добра захаваліся, але на палях хутка знішчаюцца. Сяляне, шукаючы лішняга кавалачка зямлі, бязлітасна разворваюць іх. На месцы ніхто не клапоціцца аб ахове гэтых помнікаў. Вось некалькі прыкладаў зруйнавання курганных могільнікаў. Па дарозе з Макараўкі на Ступакі, на адлегласці 0,5 км ад Ступакоў па абодвух баках дарогі зусім развораны могільнік, ад якога захавалася толькі 7 зруйнаваных курганоў. У Ступаках з паўднёвага боку сядзібы старога фальварка знаходзіцца развораны магільнік, захоўваецца яшчэ 8 курганоў з сапсутымі насыпамі. На поўдні ад сяла Судзілавічы, з правага боку на Петрыкі, ляжыць магільнік, у якім захавалася 12 абвораных курганоў. На левым беразе ракі Вярхіты, на дарозе з вёскі Шэкі на груду азёр захаваліся рэшткі трох магільнікаў. Першы з іх пачынаецца ад Шэкаў і канчаецца на беразе возера. Тут засталася ўсяго 16 развораных курганоў. Другі, таксама развораны, магільнік у складзе 7 курганоў, ужо зруйнаваных, ляжыць на скрыжаванні Шэкаўскай і Ступакоўскай дарог. Трэці магільнік з 12 курганоў размяшчаецца на заходнім беразе возера пад зараснікам маладога сасняку. З гэтай прычыны тут некаторыя курганы захаваліся і маюць купалавідны выгляд да 1 м вышыні. На правым беразе ракі Вярхіты пакуль што выяўлена 6 магільнікаў. Першы з іх у складзе 7 парушаных курганаў займае невялікую плошчу на паўночным беразе Ступакоўскага возера на ворным полі. Другі магільнік, з 30 курганоў досыць добрай захаванасці, ляжыць па дарозе з вёскі Азёры ў Добрына, на правы бок ракі Лютына, у лесе. Трэці магільнік з 28 курганоў гэткай жа захаванасці ляжыць на адлегласці 0,5 км на захад ад другога магільніка, па дарозе на Горбава, у сасновым лесе. Чацвёрты магільнік з 19 курганоў размешчаны на адлегласці ў 1 км на паўночны захад ад трэцяга, па той жа дарозе, у глухім бару. Пяты магільнік з 7 курганаў размяшчаецца па той жа дарозе супраць вёскі Добрына, на захад ад яе. Шосты магільнік пад назвай «Змяінкі» ляжыць па дарозе на адлегласці 0,5 км ад пятага і мае ўсяго тры курганы падоўжанай формы... Найбольш тыповая па сваёй форме сярэдняя магіла, якая мае форму выцягнутай з захаду на ўсход грады ў 15 м даўжынёй і да 2 м шырынёй. Насып кургана з усіх бакоў абведзены раўчуком. Другія два курганы ўяўляюць з сябе насыпы крыху падоўжанай формы. Адзін з гэтых курганоў, які ляжыць на ўсходнім баку дарогі, раскапаны намі. Пясчаны насып яго ледзь выцягнуты з захаду на ўсход, і з усіх бакоў абведзены раўчуком. Вышыня кургана 1,75 м. Акружына па нізе — 40 м. На грунце вогнішча; вышэй яго ў насыпу попельныя праслойкі. У сподніх пластах насыпу мясцінамі трапляліся перапаленыя на вугаль чалавечыя косці і дробныя чарапкі глінянага ганчарнага посуду».

Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Працы археалагічнай камісіі. Т. 2. Мн., 1930. С. 90–91.

Заняткі, рамёствы і побыт дняпроўскіх крывічоў

Галоўным заняткам дняпроўскіх, а гэта значыць і дубровенскіх, крывічоў была сельская гаспадарка. Яны сеялі ячмень, авёс, пшаніцу. Трымалі коней, кароў, авечак, свіней. Для свойскай жывёлы касілі траву, сушылі сена. Акрамя сельскай гаспадаркі займаліся паляваннем і рыбнай лоўляй, бортніцтвам, збіралі дары прыроды.

Пра ежу можна меркаваць толькі ў агульным плане. З зерня рабілася мука і крупы, з чаго потым рыхтаваліся разнастайныя стравы. Асноўнымі напоямі былі хлебны квас і сокі дрэў, мядовыя настоі. Вядома ім было і хмяльное пітво.

Жылі ў драўляных пабудовах, якія рабілі з дрэва. Для ўцяплення паміж ачэсанымі і добра падагнанымі адзін да аднаго бярвеннямі закладвалі мох, а потым замазвалі яго тынкоўкай. Жытлы мелі дзверы і вокны, замест шкла выкарыстоўвалі мачавыя пухіры валоў. Знойдзеныя пры раскопках гарадзішчаў цвікі, разнастайныя бытавыя жалезныя вырабы (сякеры, долаты, шылы і г. д.) указваюць на тое, што тагачасныя жыхары верхняга Падняпроўя былі добра знаёмы з плотніцкай, сталярнай і асабліва з кавальскай справамі. Дужкі ад вёдзер і прыстасаванні для выразання пазоў у драўляным посудзе сведчаць аб добрым веданні і валоданні імі бандарнай справай.

Вядома было тутэйшым жыхарам пілаванне драўніны ўпоперак. Акрамя грабянёў з ласінай косці яны выраблялі іншыя падзелкі: ручкі для нажоў, пруткі для пляцення лапцей, кручкі для віцця вяровак.

У калекцыі Смаленскага абласнога гістарычнага музея захоўваецца шмат вырабаў з металаў, якія ўжываліся не толькі ў дамашнім абыходзе, але і як прылады працы, паляванння, рыбалоўства.

Пры раскопках знойдзены таксама вырабы са шкла і гліны.

У якасці хатніх промыслаў шырока былі развіты прадзенне і ткацтва. Адметнымі былі адзенне і ўпрыгажэнні.

Вызначаліся сваёй адметнасцю ў падняпроўскіх крывічоў і самі паселішчы. Напачатку яны былі звычайнымі, а з моманту расслаення грамадства сярод іх пачалі вылучацца пасяленні ваенна-радавой знаці — так званыя ўмацаваныя гарадзішчы. Гэтыя змены нанеслі адбітак і на пахавальныя абрады тагачасных жыхароў крывіцкага Падняпроўя. На змену доўгім курганам («стлпам на путех») прыйшлі радавыя усыпальніцы. Яны і сталі помнікамі распаду рода і фарміравання класавага грамадства.

А. Ярохін.

ДУБРОВЕНШЧЫНА Ў СКЛАДЗЕ КІЕЎСКАЙ РУСІ І СМАЛЕНСКАГА КНЯСТВА

У папярэдніх артыкулах аб падзеях на Дубровеншчыне было расказана ў асноўным на падставе матэрыялаў археалагічных даследаванняў. А што пра гэта кажуць пісьмовыя крыніцы? Калі і пры якіх абставінах Дубровеншчына ўваходзіла ў склад княстваў, другіх дзяржаўных утварэнняў, якім быў яе гістарычны лёс?

Старажытныя летапісы, у якіх адлюстраваны гістарычныя падзеі нашай бацькаўшчыны бяруць пачатак недзе з сярэдзіны IX ст. З гэтага часу пачынае фактычна праясняцца перад намі гіс-

торыя ўтварэння Айчыны, а з ёй разам і гістарычнае жыццё Дубровеншчыны.

Савецкая і сучасная беларуская гістарыяграфія мала ўвагі ўдзяліла распрацоўцы пытанняў уплыву на дзяржаўнаўтваральныя працэсы беларускіх зямель з боку Смаленскага княства. А між тым па дадзеных вядомых даследчыкаў А. Н. Насонава, А. В. Аляксеева, маладых беларускіх навукоўцаў В. Ляўко, А. Мяцельскага вынікае, што значная частка, больш за 2/3, сучаснай тэрыторыі Дубровеншчыны на адрэзку з IX да канца XIV ст. знаходзілася пад уплывам Смаленска. Таму важную ролю ў высвятленні лёсу Дубровеншчыны, яе палітычнай гісторыі набывае ўразуменне гісторыі Смаленскага краю.

Ранні перыяд палітычнай гісторыі Смаленскай зямлі, па вызначэнні вядомага спецыяліста па гэтаму пытанню А. В. Аляксеева названы «Смаленская зямля пры «старэйшых» і пры Алегу і Ігару». Першы ўспамін аб насельніцтве ў басейне Барысфена (р. Днепр) належыць Герадоту (V ст. да н. э.). Ён сцвярджае, што ў вярхоўях Дняпра, вышэй яго прытока р. Беразіна жывуць неўры. Герадот указвае на адну цікавую акалічнасць у тым месцы, дзе ён расказвае аб тым, што неўры з'яўляюцца чараўнікамі і могуць часова ператварацца ў ваўкоў. Гэта легенда дажыла да летапіснага перыяду. Летапісец у «Слове аб палку Ігаравым» скарыстаў яе ў адносінах да князя Усяслава, сцвярджаючы, што той у 1068 г. ператварыўшыся ў ваўка ўцёк з поўдня да сябе на поўнач. Выходзіць, што ў XI ст. яшчэ існавала ў народзе легенда аб здольнасцях жыхароў верхняга Падзвіння і Падняпроўя (крывічоў) ператварацца ў ваўкоў. Тым самым крывічы надзелены такімі ж здольнасцямі, што і герадотаўскія неўры. Дарэчы, у Дубровенскім раёне ёсць вёска пад назвай Ваўкалакава, старажылы якой памятаюць падобныя легенды. Пазней неўры пад уздзеяннем узаемнй асіміляцыі балтскага і славянскага насельніцтва праз некалькі стагоддзяў утварылі тую этнічную ветку славянства, якую летапісцы назвалі крывічамі. Крывічы, як славянскае племя гістарычнага перыяду, з'яўляюцца толькі часткай таго шматлікага народа, які Герадот назваў неўрамі. Гэты народ пазней распаўся на некалькі самастойных племянных утварэнняў: смаленскіх крывічоў, наўгародскіх славян, палачан і растова-суздальцаў і г. д.

Пацвярджэннем славяна-балтскага скандынаўскага паходжання дубровенцаў з'яўляецца наяўнасць у Дубровенскім раёне вёскі Лапыроўшчына, упершыню зафіксаванай у пісьмовых крыніцах у 1670 г. Энцыклапедычны слоўнік Браккгаўза Ф. А. і Эфрона І. А. дае наступнае тлумачэнне карэннага слова «лапыры»: «Лопыри, лапландцы — народ финского племени, живущий в северных округах Швеции, Норвегии, Финляндии и в Кольском уезде Архангельской губернии... Судя по некоторым данным начальной русской летописи и хорографическим названиям, есть основание полагать, что Л. распространились на Юг. Первоначально лопыри жили по образу дикарей каменного века, весьма вероятно, что не знавшие металлов, добывавшие себе пропитание охотою и пользовавшиеся стрелами с каменными и костяными наконечниками, были именно лопыри. Л. — народ смирный, робкий, честный, веселый, гостеприимный, кроткий в семейной жизни, сострадательный к бедным. Л. усвоили себе, однако, и некоторые менее привлекательные качества — отсутствие энергии, леность, упрямство, подозрительность, неопрятность, страсть к вину, обман в торговле». З узмацненнем распаду радавых адносін

і прырашчэннем багацця ў мясцовай знаці ўсё больш мацнелі іх сепаратысцкія тэндэнцыі. Рост сепаратызму ўскраін супаў з умяшаннем варагаў, што ў выніку прывяло да падпарадкавання паўночных славян варагам, якія «насилия деяху Словенам и Кривичем» і абклалі іх данінай. Невядома, колькі часу яны знаходзіліся пад варожым ігам. З дапамогай плямён меры і чудзі варагі былі разбіты і выгнаны, а землі паўночных славян канчаткова падзяляюцца на тры самастойныя воласці: Крывіцкую, Наўгародскую і Полацкую. Пасля распаду Славіі Смаленск не здолеў аб'яднаць паўночных севяран і ўтрымаць вядучую ролю. Аслаблены ў міжусобнай барацьбе ў VIII і IX стагоддзях, Смаленск у пачатковы гістарычны перыяд адступае на поўначы на другі план і ўступае вядучую ролю Ноўгараду.

Падзелу на княствы папярэднічала барацьба Смаленска з Ноўгарадам і Полацкам, яскрава апісаная ў Наўгародскім летапісу: «и всташа сами ся воевать, и бысть меж ими дать велика и усобица, и всташа град на град». Каб пазбегнуць кровапраліцця, было вырашана зацікавіць князёў з боку і прасіць варагаў схіліць трох братоў прыняць уладу. Прыняўшы добраахвотна ўручаную вярхоўную ўладу ад славян, браты падзялілі яе. Рурык атрымаў княства Наўгародскае і размясціў свой трон на Ладазе, ніжэй Ноўгарада Вялікага, Сінеус сеў у Растове на Белым Возеры, а Трувар на княстве Пскоўскім, у горадзе Ізборску. Паводле летапісу гэта прыпадае на 862 г. У Полацку хутка з'явіўся Рагвалод. Не ўпамінаецца толькі аб Смаленску, аб закліканні князя туды. Гэта замоўчанне аб Смаленску можна растлумачыць тым, што там засталася старая княжацкая ўлада, што не з'яўлялася навіной і таму не заслугоўвала ўвагі летапісца.

Калі два браты Рурыка памерлі без нашчадкаў, то яму дасталіся іх княствы. Смаляне не заклікалі да сябе варагаў. Смаленск падчас княжання Рурыка быў самастойным, незалежным, буйным горадам усходніх славян.

Адначасова з прыходам Рурыка на княжанне некаторыя з варажскіх выхадцаў з яго дазволу рынуліся на поўдзень па вялікаму воднаму Дняпроўскаму шляху і ўтварылі вакол добра населенага і ўмацаванага ў той час Кіева новае варага-рускае ўладанне, па летапісах звязанае з імёнамі Кія, Аскольда і Дзіра. Але гэта ўладанне, як заўважыў рускі гісторык С. М. Салаўёў, не магло мець належнай моцы, будучы заснаваным шайкай прышлых людзей, можа быць храбрых і добра ўзброеных, але не меўшых мэты заснаваць належны парадак сярод плямёнаў, асеўшых па вялікаму воднаму шляху.

Як сведчыць славуты смаленскі гісторык-даследчык П. Нікіцін са спасылкай на зводныы летапіс Ляйбовіча і Усцюжкі, у 863 г. Аскольд і Дзір, плыўшы з Ноўгарада да Дняпра і далей у Візантыю падступілі да Смаленску, але павінны былі яго пакінуць, не адважыліся авалодаць ім: «...пойдоста из Новгорода (...) по Днепру вниз мимо Смоленска и не явистася Смоленску, зане град велик и мног людьми». Яны плылі ўніз па Дняпры праз тэрыторыю сучаснай Дубровеншчыны да Кіева. У той час, як сцвярджае Цвярскі летапіс пад 865 г., Аскольд і Дзір, падплыўшы да Кіеву, «...узраста на горе градок мал». Кіеў здаўся ім невялікім горадам у параўнанні са Смаленскам і быў узяты. Усталяваўшыся ў Кіеве, яны на 200 чаўнах хадзілі ўніз па Дняпры «на Греки». У 867 г., будучы ўжо кіеўскімі ўладальнікамі, Аскольд і Дзір ажыццявілі паход у землі палачан і далучылі іх да сябе. У Ніканаўскім летапісу аб гэтым

гаворыцца: «Воева Аскольд и Дир палочан и многа зла створиша». Напэўна, разам з Полацкай зямлёй да Кіева былі далучаны землі дрыгавічоў, бо яны ляжалі на шляху ад Кіева на Полацк.

У 882 г. Алег набірае вялізнае войска з наўгародскіх славян, ізборскіх і полацкіх крывічоў, варагаў залежных плямён чудзі і меры і выступае на поўдзень. Імкнучыся таксама прылучыць смаленскіх крывічоў, Алег прыблізіўся да Смаленску. Смаленскія купцы ў той час ужо вялі значны гандаль і па выказваннях візантыйскіх летапісцаў дасягалі на судах Грэцыі. Гэта адбывалася пасля крыгалому на ракách, пасля чаго з-пад Ноўгарада і Смаленска спускаліся флатыліі даўбежных чоўнаў, каб потым, сабраўшыся каля прыстаней Кіева, рухацца з тавамі да рынкаў Візантыі. Смаляне не прызнавалі пастаўленых над імі намеснікаў Рурыка, не вельмі хацелі падпарадкоўвацца і Алегу. Аднак старэйшыны Смаленска выйшлі насустрач і здаліся без супраціўлення, чаму садзейнічалі аднапляменнікі, якія сабраліся пад сцягамі Алега.

У Архангельскім летапісу за 882 г. аб гэтым сказана: «И приде к Смоленску и кривичи и стал выше города и шатры паставиша многа разноличны цветы. Уведавше же Смольяне и изыдоша старейшины их к шатрам и спросиша единого человека: «Кто сей приде, царь ли, или князь в великой славе». И изведе из шатра Олег имый (маючы) на руках у себя Игоря и рече Смольянам: «сей есть Игорь князь Рюрикович Русский» и нарекоша его Смольяне государем. И вдася весь град за Игоря и прия град и посады в нем муж свои». З-пад Смаленску пусціўся Алег з войскам уніз па Дняпры на ладдзях да севяран, каб узяць старажытны горад Любіч. Здзіўленыя продкі сённяшніх дубровенцаў маглі назіраць за рухам гэтай флатыліі. Не выключана, што некаторыя з іх маглі стаць і ўдзельнікамі таго плавання, бо, як расказваюць летапісы, пасля Смаленску да войска Алега далучыліся шматлікія смаленскія крывічы.

Спачатку штурмам быў узят Любеч, горад севяран, а потым Алег авалодаў і Кіевам. Аскольд і Дзір былі забіты. Зрабіўшы Кіеў сваёй сталіцай, Алег пачаў канцэнтраваць вакол яго ўсе ўсходнеславянскія племянныя «княжанні». У ліку падданых Кіеўскаму князю часоў Алега Іпацьеўскі летапіс называе крывічоў. Пазней да іх далучыліся радзімічы, севяране, потым дрыгавічы (не без прымусу), што праяўлялася ў плаце даніны Кіўскім князям, удзеле ўсіх славянскіх княстваў у ваенных паходах Алега. Але было б памылковым лічыць, што тэрыторыя Старажытнарускай дзяржавы ўтварылася з моманту з'яўлення ў Кіеве Алега, а потым Ігара. Яна ўзнікла ў выніку працяглага ўнутранага працэсу, які пачаўся задоўга да гэтай падзеі і закончыцца на працягу многіх стагоддзяў пасля яго. Безумоўна, вядучым матывам аб'яднання ўсходніх славян з'яўляліся, па-першае, узросшыя эканамічныя сувязі паміж падняпроўскімі плямёнамі (княжаннямі), а па-другое, імкненне скінуць іга суседніх дзяржаў і засцерагчыся ад падобных пагроз у будучым. Істотнай прычынай трэба лічыць таксама імкненне наўгародскай і крывіцка-смаленскай знаці захапіць у свае рукі ўсе выгоды ад гандлю з Візантыяй.

Менавіта з гэтай мэтай у 907 г. смаленскія крывічы ўдзельнічалі ў чатырохгадовым паходзе Алега на Візантыю, аб чым у Лаўрэнцьеўскім летапісу захаваўся наступны запіс: «Иде Олег на греки... поя (узяў) же множество варяг и славен и чудь и кривичи...». Сабраўшы звыш 80 000 ваяроў, ён распачаў паход «...на Греки на ко-

нех и кораблях и бе число кораблей 2000». Алег асадзіў Царгорад і прынудзіў імператара прыняць яго ўмовы міру. Заключаны дагавор выкрывае мэты паходу. Першае, чаго дамагаліся Алег і яго дружына, — багацця, вось чаму запатрабаваў на кожнага воіна па 12 грыўнаў (да 6 фунтаў серабра). Астатнія пункты дагавора накіраваны на забеспячэнне ільготных умоў гандлю славянскаму купецтву. Сярод рускіх гарадоў, атрымаўшых ільготы па дагавору з Візантыяй, упамінаецца і Смаленск.

У 912 г. Алег ездзіў у Ноўгарад і Ладагу, а па дарозе назад у Кіеў зазірнуў у Смаленск. Пасля смерці Алега Ігар два разы у 941 і 944 гг. хадзіў... «на Греки на «лодьях и на конех». І, наогул, усе паходы старажытнарускіх князёў на Царгорад учыняліся на ладдзях і чоўнах па Дняпры і Чорным моры. Пазней назва «Варяжский путь» у летапісах утрымліваецца толькі адносна паўночнай часткі шляху «из варяг в Греки» і асноўным цэнтрам яго з'яўляецца горад Смаленск, а шлях па сярэдняму і паўднёваму Дняпру атрымаў назву «греческого пути».

Пасля смерці Ігара Смаленскам валодала княгіня Вольга, якая ў 947 г. наведала яго і аблегчыла яго жыхарам выплату даніны. Гэта была спроба прывабіць паўночныя княствы, і асабліва Смаленск і Ноўгарад, да Кіеўскага цэнтра, бо асабістыя інтарэсы іх прыйшлі ў супярэчнасць з выгодамі кіеўскай знаці і «валацужнай» дружыны кіеўскіх князёў. Сепаратысцкія памкненні на поўначы пачалі праяўляцца ў адмове ад выплаты дані Кіеву і ў адасабленні мясцовай княжацкай улады. Паўночна-славянскія купцы павінны былі плаціць вялікія пошліны, але абароны з боку Кіева яны не атрымоўвалі. Кіеўская ўлада Алега і Ігара не клапацілася аб забеспячэнні інтарэсаў Смаленска і Ноўгарада, а ўсе выгоды гандлю з Візантыяй забірала сабе і раздавала паўднёвым купцам.

Ішоў час. Кіеўскім князем стаў Яраполк. Ён хадзіў на Смаленск. Праз два гады князь Уладзімір сабраў вялікае войска і пайшоў на поўдзень, разбіў Яраполка і сам сеў у Кіеве на вялікае княжанне (980—1015 гг.). Пры Уладзіміры Кіеўская Русь значна пашырыла свае граніцы, Кіеў зноў стаў дыктаваць умовы Візантыі. Насаджаючы хрысціянства ў Кіеўскай Русі Уладзімір паслаў намеснікамі ў розныя гарады і землі сваіх сыноў, двух з іх — старэйшага Ізяслава і прыёмнага Святаполка (сына Яраполка) — ён назначыў адпаведна ў Полацкую зямлю і ў Тураўскае княства.

Каля 990 г. Уладзімір ездзіў у Смаленск і Ноўгарад, дзе сам назіраў за хрышчэннем народа. Не гледзячы на прынятыя меры, дасягнуць адзінства ў імперыі яму не ўдалося. Пасля смерці Уладзіміра Святаполк распачаў міжусобную крывавую барацьбу са сваімі братамі. Але ў 1019 г. Яраслаў Мудры (1019—1054), Наўгародскі князь, сагнаў з Кіеўскага стала Святаполка і сам заняў яго месца.

Каб не дапусціць паўтору міжусобіц пасля сваёй смерці, Яраслаў яшчэ пры жыцці падзяліў рускія землі паміж сынамі. У падзеле Яраслава ёсць Полацкае, Смаленскае і Наўгародскае княствы. Смаленск дастаўся чацвёртаму сыну Яраслава Вячаславу (памёр у 1057 г.). Так узнікла самастойнае Смаленскае княства, а Смаленск стаў яго сталіцай.

У другой палове XI ст. Старажытнаруская дзяржава пачала распадацца на асобныя княствы і феадальныя рэспублікі. Багацці Смаленскай зямлі прыцягвалі ўвагу паўднёвых князёў. За валоданне Смаленскім княствам у канцы XI ст. праходзілі жорсткія феадальныя войны паміж князямі, і нарэшце ў 1097 г. ім авалодаў Уладзімір

Манамах і яго род. Безумоўна, многія міжусобныя войны таго часу і выкліканыя імі паходы закраналі тэрыторыю Дубровеншчыны і пражываўшых на ёй жыхароў.

Адной з першых на Беларусі стала адасабляцца Полацкая зямля. Пасля смерці князя Ізяслава Уладзіміравіча (1001 г.) Полацк стаў спадчынным уладаннем яго нашчадкаў. Феадалы Полацкай зямлі імкнуліся пашырыць падуладную ім тэрыторыю за кошт захопу суседніх Наўгародскай і Смаленскай зямель. Асаблівае значэнне для іх па-ранейшаму мелі шляхі зносін, па якіх ішоў гандаль паміж Кіевам і Ноўгарадам, Скандынавіяй і Візантыяй. У сярэдзіне і другой палове XV ст. ў Полацкай зямлі княжыў сын Брачыслава Усяслаў. Пасля бітвы на р. Нямігa кіеўскія князі павялі з Усяславам перагаворы аб міры. Ізяслаў Яраслававіч заманіў Усяслава ў свой лагер каля Оршы і вераломна захапіў яго ў палон, затым адправіў у Кіеў і пасадзіў у «поруб» (турму). У гісторыі ўзаемаадносін Полацкага і Смаленскага княстваў да сённяшняга дня застаецца нявырашаным пытанне аб тэрытарыяльнай прыналежнасці Оршы. З сярэдзіны нашага стагоддзя лёс Оршы пачынаюць звязваць з Полацкай зямлёй.

Пад уладай смаленскіх князёў у XII—XIII ст. знаходзіліся Крычаў, Прапойск, Мсціслаў, размешчаныя на левабярэжжы Дняпра. У другой чвэрці XII ст. з Полацкага княства ў якасці самастойных выдзеліліся Ізяслаўскае княства (1128 г.), у сярэдзіне XII ст. — Стрэжаўскае, у 1162 г. — Гарадзіцкае, у 1165 г. — Віцебскае, у 1180 г. — Лагойскае. У 60—70-я гг. XII ст. полацкі і віцебскі князі часова трапляюць у залежнасць ад больш моцнага Смаленскага княства, якое да гэтага часу палітычна адасобілася ад Кіева і імкнулася пашырыць свае ўладанні.

Заснавальнікам Смаленскай княжацкай дынастыі трэба лічыць унука Манамаха князя Расціслава Мсціслававіча (1125—1160). Яго пераемнікам быў яго сын Раман (1160—1180). Пры ім Смаленск не толькі адасабляецца ад Кіева, але і становіцца цэнтрам Вялікага княства, аб'яднаўшага шэраг удзелаў. У XIII ст. ў Вялікім княстве было 17 удзельных княстваў. Падчас вайны Полацкага княства з крыжаносцамі палачане і віцебцы просяць дапамогі ад Смаленска. Дапамога была аказана, у выніку чаго захопнікі былі адкінуты, а полацкія землі вызвалены.

З 1222 г. Полацк і Віцебск увахо-дзяць у склад Смаленскага княства. У 1238—1240 гг. татары рынуліся на паўднёвыя рускія княствы і паваявалі іх. Смаленск жа пазбегнуў татарскіх пагромаў. Набегі паўтарыліся ў 1333 і 1339 гг., але Смаленск выстаяў. Смаленскія князі не ездзілі да хана і не плацілі яму даніну. У 1380 г. Смаленскія палкі прымаюць удзел у рашаючай бітве з татарамі — Кулікоўскай, дзе вызначыўся смаленскі князь Іван. Трэба думаць, што ў той бітве прынялі ўдзел і дубровенцы.

У канцы XIV ст. Смаленск апынуўся на мяжы ўплываў з боку Масквы і Вялікага княства Літоўскага, што прадвызначыла яго далейшы лёс.

З сярэдзіны XIV ст. значна паскорыўся працэс драблення Смаленскага княства на ўдзелы. Пісьмовыя крыніцы вельмі сціпла сведчаць пра падзеі, якія адбываліся на Смаленшчыне, і таму цяжка сказаць, калі Орша і Дуброўна апынуліся ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Але ў складзе новай дзяржавы пачалося пераўтварэнне Оршы і Дуброўны з невялікіх крэпасцей у буйныя гарады на яго ўсходніх межах. Аднак і тады Смаленск не жадаў змірыцца са стратаю Оршы і Дуброўны, якія былі своеасаблівым ключом да яго. У 1386 г. Святаслаў Іванавіч зрабіў няўдалую спробу вярнуць іх Смаленскаму княству.

У 1395 г. Вялікі князь Літоўскі Вітаўт узяў Смаленск. Цвярскі летапіс паведамляе аб гэтым: «...Витовт много богатства взял... и много в плен увел и казнил без милости... Се зло учинилось сентября 28». У пачатку 1401 г. князь Юрый Святаслававіч адваяваў Смаленск, але пасля некалькіх подступаў у 1401—1404 гг. Вітаўт узяў Смаленск 24 чэрвеня 1404 г. З гэтага часу Смаленскае княства было ператворана ў правінцыю Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Падрыхтаваў да друку М. Ляшчынскі

Літаратура

1. Алексеев Л. В. Полоцкая земля в IX—XIII в.в. (очерки истории северной Белоруссии). М., 1966.

2. Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX—XIII в.в. (Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии). М., 1980.

3. Андреев Н. В., Маковский Д. Н. Смоленский край в памятниках и источниках. Ч. 1. Смоленск, 1949.

4. Голубовский П. В. История Смоленской земли до начала XV столетия. Киев, 1895.

5. Маковский Д. П. Смоленское княжество. Смоленск, 1948.

6. Маковский Д. П., Орлов В. С. Смоленск с древних времен до XX века. Смоленск, 1948.

7. Насонов А. Н. «Русская земля» и образование территории древнерусского государства. М., 1951.

8. Никитин П. Очерк истории г. Смоленска. Смоленск, 1845.

9. Писарев С. П. Памятная книга г. Смоленска (Историко-современный очерк, указатель и путеводитель). Смоленск, 1896.

10. Смоленский край. Смоленск, 1993, № 7—8.

11. Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск, № 6. (Мяцельскі А. А. Орша ў XI—XIII ст.ст.: Паміж Полацкам і Смаленскам).

За векам век

Самым магутным і значным княствам з усіх, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі ў X—XIII ст., з'яўлялася Полацкая зямля, гістарычным ядром якой было племянное княжанне крывічоў-палачанаў больш ранніх часоў. Менавіта да ўзнікнення Полацкага, Тураўскага, а пазней Гарадзенскага, Новагародскага, Смаленскага і іншых княстваў адносяцца вытокі беларускай дзяржаўнасці. Створаная ў гэты час матэрыяльная і духоўная культура стала падмуркам дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях.

Пасля распаду Кіеўскай Русі Кіеў і Ноўгарад пастаянна сапернічалі паміж сабой за аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель, пры гэтым Полацку надавалася важнае значэнне. Напачатку полацкая знаць і мясцовыя князі дзейнічалі, абапіраючыся на Кіеўскага князя. З апошняй трэці X ст. «трымаў Полацкую зямлю і правіў ёю» незалежны ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада мясцовы князь Рагвалод.

У 980 годзе Уладзіміру Святаслававічу, які быў тады наўгародскім князем і змагаўся са сваім братам Ярапалкам за кіеўскі стол, удалося захапіць Полацк. Рагвалод і два яго сыны былі забіты, а яго дачка Рагнеда прымусова стала жонкай Уладзіміра. Пазней Рагнеда зрабіла няўдалы замах на жыццё Уладзіміра і была разам з сынам Ізяславам выдалена з Кіева ў Полацкую зямлю.

Уладзімір Святаслававіч вымушаны быў узнавіць бацькаўшчыну Рагнеды, аддаўшы ёй яе «отчину» — Полацкую зямлю. Сацыяльнай сілай, якая выражала мясцовыя палітычныя тэндэнцыі, з'яўлялася полацкае баярства. Адсюль вынікае, што ўступка была зроблена Уладзімірам гэтай рэальнай сіле ў Полацкім княстве.

Ізяслаў Уладзіміравіч з Рагнедай

атрымалі або пабудавалі Ізяслаўль (сучаснае Заслаўе). Затым Ізяслаў, верагодна, быў запрошаны палачанамі княжыць у Полацку. Супраць гэтага не выступаў Уладзімір, бо прыкладна тады, пасля хрышчэння Русі, кіеўскі князь, праводзячы адміністрацыйную рэформу, накіроўваў другіх сваіх сыноў у буйныя гарады ў якасці намеснікаў.

Знаходжанне Полацка ў складзе старажытнарускай дзяржавы было непрацяглым і нетрывалым. У адпаведнасці з уяўленнямі скандынаваў (варагаў) уся Кіеўская Русь у XI ст. падзялялася на тры часткі на чале з Ноўгарадам, Полацкам і Кіевам. Гэтыя гарады спаборнічалі нават у галіне манументальнага дойлідства.

Пасля 1036 года ўладу ў Кіеўскай Русі захоўвалі толькі дзве княскія дынастыі: сын Уладзіміра — Яраслаў Мудры — у Кіеве і праўнук Рагвалода — Брачыслаў Ізяслававіч — у Полацку. У той час, калі ўсе іншыя землі на тэрыторыі старажытнарускай дзяржавы пераходзілі паводле старшынства да нашчадкаў Яраслава Мудрага, Полацк устойліва знаходзіўся ў руках прадстаўнікоў мясцовага княскага роду.

Добра вядомы ў гісторыі Беларусі князь Усяслаў Брачыслававіч, які княжыў у Полацку з 1044 да 1101 года. Пры ім Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці. Пасля смерці Усяслава яно было падзелена паміж шасцю яго сынамі.

У 1116 г. Уладзімір Манамах моцна спустошыў Мінскае ўдзельнае княства, дзе княжыў Глеб Усяслававіч, забраў у яго Копысь і Оршу з навакольнымі вёскамі і далучыў іх да Смаленскай зямлі. З гэтага часу і на многія стагоддзі Дубровеншчына трапляе ў сферу ўплыву Смаленскага княства і на яе гісторыі моцна адаб'юцца многія падзеі, што будуць мець месца на Смаленшчыне.

1101 г.

Спроба Уладзіміра Манамаха стварыць самастойнае ад поўдня княства, а таксама аддзяленне Смаленскай царквы ад Пераяслаўскай епіскапіі. Зроблена гэта было па патрабаванню смалян.

1103 г.

Удзел смалян у паходзе на полаўцаў.

1104 г.

Няўдалы паход смалян на Мінск.

1107 г.

Паход рускіх, у тым ліку і смалян, з Яраполкам на полаўцаў з мэтай ачысціць гандлёвы шлях у Візантыю.

1116 г.

Паход Уладзіміра Манамаха з сынамі і з смаленскім князем Вячаславам на Мінск і вяртанне ў склад Смаленскага княства гарадоў Оршы, Копысі і інш., а таксама Дубровеншчыны.

«Найперш трэба адзначыць, — піша гісторык М. Ермаловіч, — што Смаленская зямля ў гэты час дасягнула найбольшых сваіх памераў» (Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 203). Паводле Устаўной граматы Смаленскага князя Расціслава 1136 года, усходнія межы Смаленшчыны даходзілі да сярэдняга цячэння ракі Масква, а на захадзе яны ўключалі Оршу, Копысь і частку Дубровеншчыны.

1127 г.

Удзел смалян у паходзе на Полацк, які перажываў голад і мор людзей з-за вялікага неўраджаю.

1133 г.

Смаленск спыняе сваю залежнасць ад Кіева, якая выражалася ў выплаце даніны.

1141 г.

Першая вайна Смаленскага княства з Чарнігаўскім.

1146 г.
Пачатак новай вайны.

1147 г.
Вайна Расціслава і Ізяслава супраць Юрыя Далгарукага і Ольгавічаў.
Другое нападзенне на Смаленскую зямлю полаўцаў.

1158 г.
Пераход Ноўгарада пад уплыў Смаленска. Страта там уплыву Юрыя Далгарукага.

1160 г.
Расціслаў займае Кіеўскі стол. Падначальваюцца яму і чарнігаўскія князі. Яшчэ праз год Смаленск аднаўляе свой уплыў у Ноўгарадзе.

1161—1162 гг.
Паход смалян з князем Раманам на Чарнігаўшчыну да крэпасці Усціж (каля Бранска) і барацьба з Растова-Суздалем за ўплыў у Ноўгарадзе.

1165 г.
Пачатак вайны смалян з наўгародцамі, у якой удзельнічалі і палачане.

1178 г.
Смаленск абараняе Полацк ад наўгародцаў.

1180 г.
Вайна чарнігаўскіх князёў супраць смаленскіх Расціславічаў за Кіеў, у якую было ўцягнута і Друцкае княства.

1185 г.
Здрада палачан Смаленску, пераход іх на бок чарнігаўскіх князёў. Паход смалян на Полацк.

1186 г.
Паўстанне баяр у Смаленску, падтрымка іх Полацкам. Новае падначаленне Полацка Смаленску.

1195 г.
Напад чарнігаўскіх князёў на Віцебск і Смаленскую зямлю.

1196 г.
Паход смалян на Чарнігаўшчыну.

1207 г.
Паход полацкіх і смаленскіх князёў на дапамогу хівам і літоўцам супраць крыжакоў.

1214 г.
Паход смалян на Кіеў. Выгнанне адтуль чарнігаўскіх князёў. У Кіеве стаў княжыць Мсціслаў Смаленскі.

1216 г.
Разгром смаленскім князем Мсціславам Давыдавічам літоўскіх дружын у Полацкім княстве.

1226 г.
Напад літоўцаў на Смаленск, Тарапец і іншыя гарады.

1239 г.
Напад на Смаленск ліцвінаў, паход на Літву Яраслава.

1240 г.
Перамога войск Наўгародскага князя Аляксандра Яраслявіча (Неўскага) над нямецкімі крыжакамі на Чудскім возеры; удзел у гэтай бітве полацкіх дружын.
Перамога войск Наўгародскага князя Аляксандра Яраслявіча (Неўскага) над шведскімі войскамі на рацэ Нява; удзел у гэтай бітве полацкіх воінаў.

1258—1259 гг.
Набегі татараў на землі Беларусі і Літвы.

1274—1275 гг.
Набегі татараў на землі Беларусі і Літвы.

1287 г.
Набегі татараў на землі Беларусі і Літвы.

1318 г.
Фіксаванне ў летапісах тэрміна «Белая Русь».
У першыню Белай Руссю названа тэрыторыя Віцебшчыны.

1320 г.
Уваходжанне Віцебскага княства ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

1325 г.
Напад на Полацкую зямлю татараў.

1333 г.
Напад татараў на Смаленск і міжусобная вайна паміж смаленскімі і бранскімі князямі.

1339 г.
Напад татараў на Смаленск.

1355 г.
Далучэнне да Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Бранска і ўсяго княства.

1366 г.
Напад войскаў ВКЛ на Смаленск.

1359 г.
Напад войскаў ВКЛ на Смаленск і захоп імі Мсціслаўля.

1368 г.
Першы паход Альгерда на Маскву.

1370 г.
Другі паход Альгерда на Маскву і ўдзел у ім смаленскага князя.

1372 г.
Апошні з вядомых паходаў Альгерда на Маскву.

1392 г.
Падпісанне ў Востраве пагаднення аб падзеле ўлады паміж польскім каралём Ягайлам (Уладзіславам I) і Вітаўтам.
Пачатак княжання ў ВКЛ Вітаўта. Княжыў да 1430 года.

1395 г.
Захоп Вітаўтам Смаленска.

1397 г.
Аблога смалянамі горада Орша.

1400 г.
Паўстанне смаленскіх гараджан. Паход Вітаўта на Смаленск.

1403 г.
Паход войскаў ВКЛ пад Смаленск.

1404 г.
Спроба смалян увайсці ў склад Маскоўскага княства.
Канчатковае пакарэнне Смаленска і ўключэнне яго ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

1407 г.
Умацаванне Оршы і Дуброўны як прыгранічных гарадоў на ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

1408 г.
Устанаўленне мяжы паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Прайшла па рэках Угра і Ака.

1514 г.
Аршанская бітва войскаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага на чале з гетманам найвышэйшым Канстанцінам Астрожскім супраць войскаў Маскоўскага княства.

1534 г.
«Полки в глубокую осень выступили из Москвы с двумя главными воеводами, князьями Михайлом Горбатым и Никитою Оболенским, любимец Елены (правительница при малолетнем Иване IV-авы), Телепнев, желая славы мужества, вел передовой полк. От границ Смоленска запылали сёла и предместия городов литовских: Дубровны, Орши, Друцка, Борисова. Не встречая неприятеля в поле, и не занимаясь осадою крепостей, воеводы московские дошли до Молодечны...» (Карамзин Н. М. История государства Российского. Т. VIII, гл. I. СПб., 1842. С. 17).

1535 г.
«Князь Василий Шуйский, главный воевода, с Елениным любимцем, Телепневым, который вторично принял начальство над передовым отря-

дом... выжгли предместие Мстиславля, взяли острог, отправили пленников в Москву и шли беспрепятственно далее. ...Шуйский, предав огню все места вокруг Княжичей, Шклова, Копоса, Орши, Дубровны, отступил к Смоленску» (Карамзин Н. М. История Государства Российского. Т. VIII, гл. I. СПб., 1842. С. 19–20).

Падрыхтаваў да друку
А. Ярохін.

ДУБРОВЕНШЧЫНА Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Вялікае княства Літоўскае — ВКЛ, афіцыйная назва Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае — феадальная дзяржава ва Усходняй Еўропе, якая займала тэрыторыю Беларусі і Літвы (у XIII–XVIII ст.), Жэмайціі (з 1450-х гадоў), частку «украінных» (ускраінных) зямель (Кіеўская, Чарнігаўская землі і Валынь, з 1360-х гадоў), частку вялікарасійскіх зямель (у XIV — пачатку XVI ст.).

Ядром дзяржавы пры яе ўтварэнні былі беларускія землі верхняга і сярэдняга Панямоння, так званая Чорная Русь, ці гістарычная Літва, і землі па верхнім цячэнні ракі Віліі са сталіцай у Навагродку.

Утварэнне ВКЛ з цэнтрам у Навагродку адносіцца да 1240-х гадоў, калі па запрашэнні мясцовых баяр тут стаў княжыць Міндоўг (сярэдзіна 1230-х гадоў — 1263).

Невядома дакладна, калі і якім чынам Дубровеншчына апынулася ў складзе Вялікага княства Літоўскага, якое ўтварылася на рэштках Кіеўскай Русі пасля мангольскага нашэсця. Можна толькі меркаваць, што ўваход Дубровеншчыны ў гэтую дзяржаву адбыўся не пазней другой паловы XIV ст. У канцы яго ўладу вялікага князя Вітаўта прызнавала ўжо ўсё Смаленскае княства.

Дзейнасць Вітаўта, які княжыў у ВКЛ з 1392 г. па 1430 г., адбілася на тэрыторыі Дубровеншчыны ў паданнях і геаграфічных назвах, якія жылі потым не адно стагоддзе. У інвентарах Дубровенскага маёнтка ў XVIII ст. згадваецца займішча над Вітавым Пограбам. Гэтая назва, напэўна, абавязана сваім паходжаннем нейкай легендзе, звязанай з асобай Вітаўта. Праўда, азначанае ўрочышча знаходзілася не на тэрыторыі сучаснага раёна, а крыху далей на ўсход, у парэччы Бярэзіны на Смаленшчыне. Але падобныя ж паданні маглі існаваць і ў іншых месцах.

З эпохай Вітаўта часта звязваюць і першае непасрэднае ўпамінанне Дуброўны. Сапраўды, у адной з кніг так званай Літоўскай метрыкі (дзяржаўнага архіва ВКЛ, які зараз знаходзіцца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве), у рэестры паасобных дакументаў, якія пазней былі страчаны, згадваецца і грамата, датаваная 6900 годам ад стварэння свету (1392 ці 1393 гады ад Нараджэння Хрыстова). У ёй князь Дзмітрый Сямёнавіч запісвае маёнткі («двары») Зубрэвічы, Хімы, Быхава, Добасна і «зямлю пустую Дубровенскую» княгіні Зоф'і і яе дзецям[1].

Вельмі заманліва лічыць, што тая загадкавая «зямля Дубровенская» мае дачыненне да сучаснай Дуброўны. Але ёсць і важкія довады супраць. Увогуле, ужо датыроўка граматы ў рэестры яўна памылковая. Гэта вынікае з таго, што побач з годам ад сатварэння свету

ў ім прыводзіцца і так званы індыкт — парадкавы нумар года паводле 15-гадовага цыклічнага календара, пашыранага ў той час на Русі і ў Візантыі. Але сёмы індыкт, якім датавана грамата, не мог адпавядаць 6900 году, на які прыходзіўся 15 індыкт.

У свой час польскі гісторык Ю. Вольф у сваёй кнізе «Літоўска-рускія князі з пачатку XIV ст.» разабраўся з асобай загадкавага аўтара гэтай граматы і паказаў, што ім быў адзін з князёў Друцкіх — Дзмітрый Сямёнавіч Друцкі-Зубравіцкі па мянушцы «Сякіра», які нарадзіўся недзе ў канцы XIV ст., а ў крыніцах упамінаецца з 1425 г. па 1432 г. Такім чынам, грамата магла быць выдадзена ў адзін з гадоў сталага жыцця гэтага князя, які прыпадае на 7 індыкт (1429 г. ці 1444 г.).

У дакументах канца XV — пачатку XVI ст. неаднаразова выступае таксама воласць Дубровенскі шлях (Дубровенский путь), якая ўваходзіла ў Смаленскае ваяводства. Вось яна бясспрэчна мела дачыненне (прынамсі, часткова) да сучаснай Дубровеншчыны. У 1494 г. вялікі князь Аляксандр «пожаловал» сёлы Тугошчы і Залатавічы са складу гэтай воласці смаленскаму баярыну Сеньку Цераховічу[2]. Пад Тугошчамі трэба разумець Туговішчы, якія да сёння існуюць у Смаленскай вобласці ля самай мяжы Дубровенскага раёна. Размешчаныя непадалёку Залатавічы трэба лічыць першым населеным пунктам Дубровеншчыны, які непасрэдна згадваецца ў пісьмовых крыніцах.

З іншых паселішчаў у складзе Дубровенскага шляху ў 1495 г. ўпамінаюцца Хамінічы і Шышалова, у 1498 — Бабінічы, у 1509 — Звяровічы. Да сёння з іх засталося толькі апошняе сяло, якое таксама знаходзіцца на Смаленшчыне. Такім чынам, Дубровенскі шлях ахопліваў абшары на мяжы сучасных Беларусі і Расіі па абодвух берагах ракі Мярэі — прыкладна там, дзе раней знаходзілася воласць Мярацічы.

Вельмі цікавае пытанне звязана з назвай воласці. Дарэчы, слова «путь» у тагачасных крыніцах даволі часта сустракаецца не ў сэнсе «дарога», а ў значэнні «воласць». А вось чаму «Дубровенскі»? Расійскі гісторык М. Любаўскі лічыў, што цэнтрам гэтай воласці была вёска Дубровенка (зараз ужо не існуючая) на захадзе Смаленшчыны. Такім чынам, і ў гэтым выпадку супадзенне з назвай Дуброўны магло быць выпадковым. Але не выключана, што воласць першапачаткова мела сваім цэнтрам Дуброўну, ад якой і атрымала назву.

Дуброўна ўжо бясспрэчна існавала на мяжы XV і XVI ст., хаця непасрэдна пачынае ўпамінацца крыху пазней. У адным з дакументаў 1538 г. прыгадваецца, што яшчэ пры вялікім князі Казіміры (памёр у 1492 г.) яна была пажалавана ва ўласнасць пану Юрыю Глябовічу, тагачаснаму смаленскаму намесніку. Але, здаецца, гэтае ўпамінанне не зусім дакладнае, бо ў іншым дакуменце гісторыя набыцця Ю. Глябовічам Дуброўны выкладзена крыху інакш. Недзе ў канцы XV ст. гэты маёнтак разам з суседняй Крапіўнай (Аршанскі раён) належаў літоўскаму пану Якубу Ралавічу, а потым (напэўна, пасля яго смерці) перайшоў да вялікага князя Аляксандра, які пачаў панаваць пасля смерці свайго бацькі Казіміра. І вось менавіта Аляксандр перадаў Дуброўну і Крапіўну ў вечнае карыстанне Ю. Глябовічу і яго нашчадкам (гл. дакумент 7).

Напэўна, да Дуброўны ўжо тады належала вялікая воласць па абодвух берагах Дняпра. Значная яе частка разам з самім дваром стала прыватнай уласнасцю спачатку Ралавіча, потым — Глябовіча. Магчыма, тая частка воласці, якая засталася пад кан-

тролем вялікага князя і са складу якой ён пазней рабіў наданні Цераховічу і іншым баярам, захавала назву «Дубровенскі шлях», хаця Дуброўна ўжо перастала быць яе цэнтрам.

Дубровенскае паселішча знаходзілася ў вельмі зручным для абароны месцы, на мысу, з трох бакоў акружаным рэчышчамі Дняпра і Дуброўны (Дубровенкі). Напэўна, гэта навяло Ю. Глябовіча на думку заснаваць на гэтым месцы замак. Пры яго будаўніцтве частка паселішча на ўсход ад мыса, з напольнага боку, засталася неўмацаванай і набыла статус мястэчка — населенага пункта, жыхары якога мелі права займацца не толькі сельскай гаспадаркай, але і гандлёва-рамесніцкай дзейнасцю.

Гэта адбылося напярэдадні 1514 г., калі Дуброўна ўпершыню непасрэдна згадваецца ў крыніцах, прычым ужо ў якасці «горада» (так у той час называлі не толькі сапраўдныя гарады, але ўсе ўмацаваныя паселішчы). Заснаванне Дубровенскага замка было выкліканa грознымі падзеямі, якія адбываліся ў той час на ўсходніх межах ВКЛ. На пачатку XVI ст. суседняе Вялікае княства Маскоўскае распачало жорсткую барацьбу з Вялікім княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім за кантроль над тэрыторыяй колішняй Кіеўскай Русі. Былі захоплены вялікія тэрыторыі, а ў жніўні 1514 г. рускія пасля 12-тыднёвай аблогі ўзялі Смаленск.

Адразу пасля гэтага, 13 жніўня, маскоўскія войскі без боя занялі Дуброўну і рушылі на захад, да Оршы і Друцка. Дубровенскія мяшчане пад уражаннем ад поспехаў Масквы прынеслі прысягу на вернасць маскоўскаму вялікаму князю Васілю Іванавічу. Але насустрач рускім ужо рушылі сумесныя польскія і беларуска-літоўскія войскі на чале з гетманам Канстанцінам Астрожскім. 8 верасня ля вусця рэчкі Крапіўна адбылася вядомая Аршанская бітва, у якой 80-тысячнае маскоўскае войска было разбіта. Пасля гэтага рускія гэтак жа без боя пакінулі Дуброўну і адышлі на абарону Смаленска.

З гэтага часу паміж Дуброўнай і Смаленскам пралягала лінія фронту, якая ператварылася ў новую дзяржаўную граніцу, бо ніводны з бакоў у ходзе наступных баявых дзеянняў не здолеў дасягнуць рашаючых поспехаў. У 1517 г. праз Дуброўну праехаў пасланец аўстрыйскага імператара Жыгімонт Герберштэйн, які накіроўваўся ў Маскву з мэтай спрыяць мірнаму пагадненню паміж ваюючымі дзяржавамі. Пазней ён упамянуў Дуброўну ў сваіх мемуарах, якія былі надрукаваны і карысталіся папулярнасцю ў Заходняй Еўропе. Дзякуючы гэтаму, Дуброўна ўпершыню набыла еўрапейскую вядомасць.

Між тым мір паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ быў заключаны толькі ў снежні 1522 г. На левабярэжжы Дняпра граніца была праведзена па рацэ Мярэі (там, дзе яна праходзіць і сёння), на правым беразе за ВКЛ заставаўся значны абшар, які цягнуўся прыкладна на 20 км на ўсход уздоўж Дняпра, далёка за вусце Бярэзіны (зараз ён уваходзіць у паўночную частку Краснінскага раёна Смаленскай вобласці). Верагодна, ужо тады гэты абшар належаў да Дубровенскага маёнтка, у складзе якога застаўся на чатыры стагоддзі.

Граніца па Мярэі рассекла на дзве часткі воласць Дубровенскі шлях. Тая частка, што засталася ў складзе ВКЛ, была далучана да Аршанскага намесніцтва і лічылася дзяржаўнай уласнасцю. Аднак сын Юрыя Глябовіча Ян, які пасля смерці бацькі ўступіў ва ўладанне Дуброўнай, выкарыстаў той факт, што яго маёнтак аддзяляў бераг Мярэі ад астатняй часткі Аршанскага

намесніцтва («дзяржавы»). Ён папросту падпарадкаваў дзяржаўных сялян сваёй уладзе і тым самым значна абкругліў межы сваіх уладанняў. Прыкладна ў той жа час ён набыў і частку Расасенскай воласці ў парэччы аднайменнай рэчкі. Цэнтрам гэтай часткі быў двор Снегіроўшчына, які належаў баярыну Івану Казарыну і які знаходзіўся, напэўна, на месцы ці паблізу сучаснай вёскі Казарынава. Ян Глябовіч купіў у Казарына яго ўладанні і далучыў да Дуброўны.

Ян быў даволі прыкметнай асобай свайго часу. Яшчэ пры жыцці бацькі, у 1516 г., прыкладна ў трыццацігадовым узросце, ён стаў вялікакняжацкім маршалкам, у 1529 г. быў прызначаны віцебскім ваяводам, а ў 1532 — полацкім. Я. Глябовіч тройчы браў шлюб, і кожны раз яго абранніцай станавілася спадчынніца вялізных маёнткаў. Першая жонка, Ганна Станіславаўна Монтаўт, па сваёй маці была спадчынніцай паловы маёнткаў згаслага роду Манівідаў. Пасля яе смерці Глябовіч ажаніўся з Зоф'яй, адзінай дачкой заможнага пана Станіслава Петкавіча. Паводле перапісу войска ВКЛ, складзенага ў 1528 г., Ян павінен быў выстаўляць у войска 148 коннікаў з маёнткаў бацькі і першай жонкі, яшчэ 88 — з уладанняў другой жонкі (адзін коннік адпавядаў 8 сялянскім службам, ці прыкладна 15—20 дварам). Такім чынам, ужо ў 1528 г., яшчэ да прызначэння на ваяводскую пасаду, яму належала не менш 3,5—4,5 тысяч сем'яў. Пасля смерці Зоф'і Я. Глябовіч узяў князёўну Ганну, адзіную дачку аршанскага намесніка Фёдара Заслаўскага (Жаслаўскага). Гэты шлюб дапамог яму далучыць як частку аршанскіх падданых, так і спадчыну князя Заслаўскага.

У канцы жыцця Я. Глябовіч узняўся на самую вяршыню дзяржаўнай іерархіі. У 1542 г. ён атрымаў прызначэнне на вышэйшую службовую пасаду віленскага ваяводы, а ў 1546 г. дадаткова стаў яшчэ і канцлерам ВКЛ.

Сярод кніг Літоўскай метрыкі захавалася кніга, у якую заносіліся рашэнні і прысуды, якія выносіў Ян Глябовіч у сваю бытнасць віцебскім і полацкім ваяводам, з 1530 г. па 1538 г. На яе старонках неаднаразова згадваецца Дуброўна — маёнтак ваяводы, у якім ён часта спыняўся і там жа вяршыў ваяводскі суд. Некалькі разоў у кнігу заносіліся рашэнні Глябовіча па ўнутраных справах Дубровенскага маёнтка. Сёння яны з'яўляюцца адзінымі звесткамі аб яго ўнутраным жыцці, якія дайшлі да нас з XVI ст.

Тэрыторыя маёнтка ў той час складалася з зямельных абшараў, кожны з якіх знаходзіўся ў карыстанні жыхароў асобнага сяла. У такі абшар уваходзілі лясы, сенакосы, выганы, паляўнічыя ўгоддзі. Калі суседзі парушалі межы гэтых абшчынных уладанняў, распачыналіся канфлікты (гл. дакумент 2). Важнае месца ў сялянскім жыцці займаў бортны промысел — здабыча мёду. Пчаліныя сем'і гняздзіліся ці то ў борцях (калодах, падвешаных на спецыяльна вызначаныя бортныя дрэвы), ці то ў наземных вуллях — карэннiках. Кожнае бортнае дрэва ці вулей былі ўласнасцю асобнай сялянскай сям'і, іх пазначалі спецыяльнымі клейнамі, а за парушэнне права ўласнасці прадугледжвалася кара (гл. дакумент 1). Часам сяляне наўмысна псавалі чужыя клейны, разлічваючы такім чынам прыдбаць суседскую маёмасць. Гэта таксама прыводзіла да канфліктаў (гл. дакумент 3).

Ворыўная зямля была падзелена на кавалкі прыкладна роўнай вартасці, якія лічыліся ўласнасцю пана. Тая сялянская сям'я ці група сем'яў, якая карысталася такім участкам, павінна была выконваць пэўныя павіннасці, таму і надзел гэты называўся «служ-

бай». У 1538 г. трымальнікі адной службы, незалежна ад іх колькасці, павінны былі адпрацаваць 2 дні прыгону ў тыдзень. Яшчэ 8 разоў у год трэба было высылаць па аднаму чалавеку з кожнай хаты («дыму») на выкананне пэўных калектыўных работ дзеля панскай гаспадаркі, прычым харчавацца прыходзілася сваім хлебам. Іншы від работы, пры якім пан абавязаны быў ставіць за яе выкананне пачастунак, называўся талакой. Талаку належала склікаць 4 разы ў год (гл. дакумент 5).

Сяляне выконвалі і іншыя павіннасці: касілі для пана сена, удзельнічалі ў панскім паляванні ў якасці загоншчыкаў, будавалі і рамантавалі замкавыя ўмацаванні, гаспадарчыя пабудовы і дарогі. Асобную катэгорыю ўтваралі путныя і панцырныя слугі, альбо зямяне. Замест прыгону яны павінны былі альбо выконваць для пана кур'ерскую службу, альбо выходзіць на вайну са сваім узбраеннем у складзе панскага «пошту» (вайсковага атрада).

Цэрквы на тэрыторыі маёнтка таксама знаходзіліся пад фактычным кантролем яго ўладальніка. Для патрэб святара пан вызначаў зямельны надзел. Ён нават меў паўнамоцтвы за нейкія правіннасці выдаліць папа з прыходу (гл. дакумент 4). Як ужо згадвалася, асобны статус мелі і насельнікі мястэчка — мяшчане. Яны маглі займацца рамяством і гандлем. Тэрыторыя мястэчка, прыдатная пад хатнія забудовы і агароды, падзялялася на ўчасткі, якія называліся пляцамі. За карыстанне кожным з іх належала плаціць штогод пэўную суму грошай, а таксама несці гарнізонную службу ў замку. Апрача таго, мяшчанам належалі і ворыўныя землі, звычайна ў бліжніх ваколіцах мястэчка.

Той факт, што Ян Глябовіч далучыў да свайго маёнтка вялікую колькасць дзяржаўных падданых, зразумела, не мог застацца незаўважаным. Пакуль аршанскім намеснікам быў цесць Яна, састарэлы князь Заслаўскі, гэтае пытанне не паўставала, тым больш што князь і сам быў не бездакорным у гэтым сэнсе: таксама за кошт падданых Аршанскага замка абкругліў межы свайго маёнтка Межава пад Оршай (які, дарэчы, потым перайшоў да яго зяця). Калі ж у 1538 г. князь Фёдар памёр і замест яго аршанскім намеснікам быў прызначаны князь Васіль Друцкі-Талачынскі, той адразу заўважыў нястачу падданых і звярнуўся са скаргай да вялікага князя.

Здаецца, у той раз Глябовіч, які карыстаўся прыхільнасцю жонкі вялікага князя Боны, удалася замяць справу. Але праз два гады пасля яго смерці, у 1551 г., пытанне паўстала зноў. Вялікакняжацкі рэфендар (службовая асоба, у абавязкі якой уваходзіў кантроль за праходжаннем скаргаў, пададзеных на імя вялікага князя) паспрабаваў прыцягнуць да адказнасці ўдаву Яна, якой давялося адказваць за ўчынкі і мужа, і бацькі.

На жаль, мы не ведаем, які вердыкт вынеслі камісары, накіраваныя князем для разгляду справы на месцы. Але калі спробы вярнуць дзяржаўную ўласнасць і мелі нейкі эфект, то толькі часовы. Так, паводле інвентару Аршанскага замка, складзенага ў 1560 г.[4], з усіх абшараў у парэччы Мярэі да гэтага замка адносілася адзінае сяло Баева з 18 сялянскімі сем'ямі. Прычым у далейшым, як мы ўбачым, і гэтае сяло ўвайшло ў склад Дубровенскага маёнтка. Так праўдамі і няпраўдамі ішло фарміраванне вялізнай магнацкай латыфундыі, якая ахапіла не толькі ўвесь сучасны Дубровенскі раён, але і вялікія сумежныя абшары.

На тэрыторыі Дубровеншчыны захаваліся два абшары зямлі, якія адносіліся не да Дуброўны, а да іншых

маёнткаў. Адзін з іх ахопліваў абодва берагі ракі Расасенка ў яе ніжнім цячэнні, ля ўпадзення ў Дняпро. Калі паўднёвая частка Расасенскай воласці з маёнткам Снегіроўшчына (Казарынава), як мы памятаем, была куплена Янам Глябовічам, то паўночная частка з мястэчкам Расасна, паўстаўшым недзе ў XVII ст., у далейшым адносілася да маёнтка Любавічы, цэнтр якога знаходзіўся ў сучасным Руднянскім раёне Смаленскай вобласці. На жаль, падрабязнасці ўключэння Расасны ў Любавіцкую воласць і яе гісторыю ў XVI ст. прасачыць пакуль што не ўдалося.

Крайні паўднёва-ўсходні кут Дубровеншчыны, дзе зараз знаходзяцца Асташкавічы, Казлы, Ляхаўка і Панізоўе, належаў да маёнтка Раманава (сучаснае Леніна ў Горацкім раёне).

Гэты маёнтак у канцы XV — пачатку XVI ст. разам з Копыссю і Баранню, што пад Оршай, знаходзіўся ва ўладанні князёў Гальшанскіх. Затым праз шлюб усе яны перайшлі да славутага пераможцы ў Аршанскай бітве князя Канстанціна Астрожскага, а пасля яго смерці ў 1530 г. да яго старэйшага сына Ілыі, які памёр даволі маладым у 1539 г. Удава Ілыі — польская шляхцянка Беата Касцялецкая — пазней выйшла за Альбрэхта Ласкага (таксама паляка), які пасля яе смерці ў 1576 г. падараваў жончыны маёнткі вялікаму князю.

Тым часам Дуброўна пасля смерці Яна Глябовіча ў 1549 г. перайшла да яго ўдавы Ганны і іх сына Яна, якому ў той час было ўсяго 5 гадоў. Ганна затым узяла шлюб з панам Ярашам Сяняўскім, захаваўшы за сабой бацькоўскія Заслаўе і Межава. Дуброўна ж лічылася выключнай уласнасцю Яна малодшага. 19-гадовым юнаком ён удзельнічаў у абароне Полацка ад войскаў Івана Грознага ў 1563 г. і трапіў у палон, адкуль выйшаў у 1566 г.

Паводле перапісу войска 1567 г. Яну Янавічу належала ставіць з Дуброўны 30 коннікаў, што адпавядае агульнаму памеру маёнтка ў 300 службаў ці прыкладна ў 600 сямей (4—5 тысяч жыхароў).

Напэўна, колькасць падданых была б яшчэ большай, калі б не пагранічнае становішча маёнтка, якое выклікала яго разбурэнне ў выніку ваенных дзеянняў. Практычна кожнае ўзнаўленне вайны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай прыводзіла да захопу і спалення Дуброўны. Так адбылося двойчы пры жыцці Яна Юр'евіча Глябовіча, у 1535 г. і 1536 г. Тое ж паўтарылася на пачатку Лівонскай вайны, у 1562 г. Яшчэ праз два гады Дубровеншчына зноў стала арэнай баявых дзеянняў. У 1564 г. маскоўскія войскі рушылі з двух напрамкаў, з Полацка і Смаленска, мяркуючы сустрэцца каля Друцка і ісці ўглыб тэрыторыі ВКЛ. Аднак войска, што выйшла з Полацка, 11 лютага было разбіта на рацэ Ула каля Чашнікаў. Тым часам другое войска на чале з князем Сярэбраным спустошыла Дубровеншчыну і дасягнула Барані пад Оршай, але, даведаўшыся пра вынік бітвы на Уле, адышло назад і стала кошам недалёка ад мяжы, на тэрыторыі Дубровенскага маёнтка. Тагачасны аршанскі намеснік Філон Кміта выслаў сваіх людзей і паграміў маскоўскія старажавыя атрады, пасля чаго рускія адышлі да Смаленска. На апошнім этапе доўгай Лівонскай вайны, у 1580 г., маскоўскае войска зноў на кароткі час захапіла Дуброўну.

За час гэтай вайны ў ВКЛ адбыліся значныя перамены. У 1565—1566 гг. была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, дзяржава была падзелена на ваяводствы і паветы з акрэсленымі межамі, а буйныя магнацкія вотчыны накшталт Дуброўны пазбаўлены юрыдычнай экстэрытарыяльнасці, якой яны фактычна карыс-

Фрагмент карты 1554 г.



Фрагмент карты 1556 г. па Герберштэйну.

таліся раней, і ўключаны ў склад паветаў на агульных правах. Дубровенскі маёнтак пры гэтым увайшоў у Аршанскі павет Віцебскага ваяводства, у якім і заставаўся на працягу далейшай гісторыі ВКЛ.

Само ВКЛ у 1569 г. аб'ядналася з Польшчай у федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую Абодвух Народаў, прычым захавала ўласнае войска, казну і заканадаўства. Кіравалі дзяржавай выбарны кароль (які адначасова лічыўся і вялікім князем літоўскім) і Сенат, куды паводле пасады ўваходзілі вышэйшыя дзяржаўныя асобы — ваяводы, кашталяны і міністры.

Дубровенскі маёнтак належаў да ліку буйнейшых не толькі ў Аршанскім павеце, але і ва ўсім ВКЛ, што дазваляла яго ўладальнікам устойліва трымацца наверсе дзяржаўнай іерархіі. Ян Янавіч Глябовіч быў у ліку нямногіх магнатаў, якія атрымалі тытулы графаў Святой Рымскай імперыі (ён тытулаваўся графам на Дуброўне і Заслаўі, а Дубровенскі маёнтак з гэтай пары паступова пачаў называцца графствам). У 1572 г. Глябовіч заняў пасаду мінскага кашталяна, якая давала права на месца ў Сенаце, з 1581 г. стаў земскім падскарбіем (міністрам фінансаў), з 1585 г. — трокскім кашталяна. Памёр ён у 1591 г. ў 47-гадовым узросце, пакінуўшы сваіх сыноў Яна і Мікалая зусім юнымі.

Недзе ў канцы XVI ст., напэўна, яшчэ пры жыцці трокскага ваяводы, у маёнтку была праведзена валочная памера: замест старых службаў зямля падзелена на стандартныя валокі плошчай каля 21,3 га. Кожная валока падзялялася на 30 моргаў і знаходзілася ў карыстанні адной ці некалькіх (звычайна дзвюх) сялянскіх сямей. На валокі былі перамераны і мяшчанскія ворыўныя надзелы. З кожнай валокі трэба было выконваць строга фіксаваныя павіннасці, памер якіх залежаў ад якасці глебы.

У 1593 г. праз Дуброўну праязджаў пасол аўстрыйскага імператара Мікалай Варкач, які пакінуў сцісłае апісанне: «Дуброўна — горад і ў гэтым месцы апошні пагранічны замак супраць масквіцян. Горад ляжыць на Дняпры, а па другі бок замка працякае рака Дуброўніца. Гэты замак шырокі ў акружнасці, толькі ўвесь драўляны».

Дубровенскі замак у той час і пазней складаўся з двух частак: Верхняга замка памерамі 90 х 45 м і Ніжняга, альбо «падзамка». Верхні замак быў умацаваны вежамі і абнесены гародняmі (бярвенчатымі зрубамі, засыпанымі для трываласці зямлёй), Ніжні быў абнесены астрогам — парканам з бярвення.

У 1607 г. ў мястэчку Дуброўна мелася 235 пляцаў, кожны з іх плошчай па 1 моргу (0,71 га). 222 пляцы былі ў карыстанні мяшчан, а 13 пуставалі. На жаль, колькасць двароў не называецца, але, улічваючы, што двароў звычайна было крыху менш, чым аседлых пляцаў (некаторыя заможныя мяшчане мелі па 2 пляцы на 1 двор), можна прыблізна вызначыць — насельніцтва мястэчка блізка да 200 двароў. Мяшчанам належалі таксама 64 валокі ворыва і яшчэ 30 валок былі замацаваны за асобнай катэгорыяй мяшчан — пушкарамі, галоўным абавязкам якіх было абслугоўванне замкавай артылерыі.

Сельскае насельніцтва маёнтка было прыпісана да валасцей. Адна з іх, Задняпроўская, ляжала на паўночным беразе Дняпра і не была яшчэ перамерана на валокі. На супрацьлеглым беразе знаходзілася 45 паселішчаў, заселеных часткова сялянамі, часткова баярамі (слугамі альбо зямянамі). Нека-

торыя паселішчы мелі вялікую колькасць ворыва (праўда, невядома, колькі сямей яго апрацоўвалі). Так, у Верамееўскім абрубе налічвалася 105 баярскіх валок, у сяле Сватошыцы — 60 сялянскіх, у сяле Гудава — 39 сялянскіх і 8 баярскіх, у Асіпішчаве, Карабанавічах і Бахаўцы — па 40 валок і г. д. Яшчэ згадваецца асобная Расасенская воласць з сёламі Чырына, Дзям'янкава, Парфенава, Казарынава, Юкава і Міхаліна*.

У складзе Дубровенскага маёнтка ў гэты час знаходзілася ўжо і сяло Баева з 16 валокамі, якое раней належала да Аршанскага замка. Увогуле на абшары паміж Расасенкай і Мярэяй Глябовічам належаў цэлы шэраг паселішчаў: Людзінічы, Корсакава, Мікіціна, Літвінава, служба Залатовіцкая, Ляды, Хоміна і Арловічы. Магчыма, якраз іх некалі так удала прыхапіў са складу дзяржаўнай воласці дзед Мікалая Глябовіча.

Мікалай таксама быў вельмі ўплывовай асобай. У маладосці ён займаў прыдворную пасаду падстолія, у 1611 г. стаў смаленскім ваяводам, а ў 1621 г. — віленскім каштalянам. У 1630 г. ён заснаваў у Дуброўне кляштар бернардзінцаў з касцёлам. Пры ім Дуброўна часова страціла сваё прыграничнае становішча, бо ў час вялікай смуты ў Маскоўскай дзяржаве ў 1611 г. Смаленскае ваяводства было зноў далучана да ВКЛ. Праўда, яшчэ ў 1615 г. атрады князя Хаванскага зрабілі набег пад Дуброўну, але пасля міру Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, заключанага ў 1618 г., Дубровеншчына на некалькі дзесяцігоддзяў была пазбаўлена ад ваенных разбурэнняў.

Напэўна, гэта прывяло да пэўнага заняпаду замкавых умацаванняў, які фіксуе інвентар 1645 г.[6] У гэты час маёнтак належаў ужо сыну памерлага ў 1632 г. М. Глябовіча — Юрыю Каралю. На Верхнім замку большасць гародзен была заменена простым астрогам, захаваліся толькі 6 гародзен з боку Дняпра ды 2 вежы, адна з якіх пазначалася як «старая нахіленая, з гмахамі старымі зусім апалымі». У гэтым замку размяшчалася рэзідэнцыя дубровенскага намесніка.

Графская рэзідэнцыя знаходзілася ў Ніжнім замку, умацаваным астрогам і 3 вежамі. Там стаяў драўляны двухпавярховы палац з высокім ганкам і балюстрадай, прычым амаль увесь другі паверх займала парадная зала. Побач мясціліся гаспадарчыя пабудовы: кухні, стайні, піўніца, цэйхгауз (арсенал) і інш., а таксама жылы флігель. На ўзбраенні замка мелася 18 гармат. Дарога да яго вяла праз уязную браму, праз пад'ёмны мост на двух жалезных ланцугах.

Дубroўна не была галоўнай сядзібай Глябовічаў, якія мелі яшчэ палацы ў Вільні і ў Заслаўі. У 1640 г. граф Юры Караль ажаніўся з Кацярынай Радзівіл, якая па мацярынскай лініі была спадчынніцай вялізных вотчын паноў Кішкаў, род якіх згас у 1653 г. Тым не менш Дубровенскае графства заўсёды было адным з галоўных камянёў у падмурку эканамічнай магутнасці роду Глябовічаў. Багацце абумоўлівала і іх трывала высокае палітычнае значэнне. Юры Караль у 1642 г. стаў смаленскім ваяводам, у 1651 г. — жамойцкім старастам, а за год да смерці, у 1668 г., заняў вышэйшую пасаду віленскага ваяводы.

Не менш значнымі асобамі былі і ўладальнікі іншага маёнтка — Рамана-ва. У канцы XVI ст. тагачасны віленскі ваявода Крыштаф Радзівіл па мянушцы Пярун, які быў жанаты з пляменніцай князя Ілыі Астрожскага, да-

---

* Выказваем падзяку М. Спірыдонаву, які даў звесткі з дакумента 1607 г., што знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве Літвы.

могся, каб вялікі князь перадаў яму вымарачныя маёнткі Ілы і яго ўдавы Беаты. З таго часу Раманава разам з Копыссю стала ўласнасцю біржайскай галіны Радзівілаў: ад Крыштафа Пяруна яно перайшло да яго сына Януша, пазнейшага віленскага кашталяна, а ў 1620 г. — да сына апошняга, малалетняга Багуслава.

Захаваліся інвентары Раманаўскага маёнтка Багуслава Радзівіла за 1647 і 1648 гг.[7], у якіх сярод іншых названы і паселішчы на тэрыторыі Дубровеншчыны: Асташкавічы (22 валокі, 44 двары), Азарава (адпаведна 15 і 31), Ляхава ці Ляхаўка (3 і 13), Займішча (2 і 6), Казлы (2 і 5), Сукіна (17 і 19).

Што датычыць Расасны, то яна ў першай палове XVII ст. разам з Любавічамі належала панам Сцяцкевічам-Заверскім, якія не належалі да ліку магнатаў, займаючы больш сціплае месца ў дзяржаўнай іерархіі. Гэты род вядомы тым, што пасля Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г., калі ў Вялікім княстве рэзка ўзмацніліся міжканфесійныя супярэчнасці, Сцяцкевічы выступалі паслядоўнымі абаронцамі праваслаўя і праціўнікамі уніяцтва. Браслаўскі падкаморы Вільгельм Багданавіч Сцяцкевіч быў зяцем не менш гарачага прыхільніка праваслаўя — князя Багдана Агінскага. Ён памёр у 1616 г., пасля чаго Расасна належала яго старэйшаму сыну Багдану. Пасля смерці Багдана ў 1651 г. Расасна і Любавічы дасталіся дачцэ апошняга Крысціне, якая была жонкай князя Мікалая Друцкага-Любецкага.

Увогуле канец XVI — першая палова XVII ст. былі даволі супярэчлівым перыядам у гісторыі ВКЛ. З аднаго боку, гэта быў час эканамічнага ўздыму, калі расла шчыльнасць насельніцтва, бурна пашыраліся старыя паселішчы і ўзнікалі новыя. Верагодна, яшчэ да сярэдзіны XVII ст. атрымалі статус мястэчкаў і два паселішчы Дубровенскага графства — Баева і Ляды. З другога боку, адбываўся рост міжрэлігійнай і сацыяльнай напружанасці, шмат незадаволеных падаваліся ў казакі (як гэта адбылося нават з сынам пана Сцяцкевіча). Паступова дзяржава апынулася ў глыбокім крызісе, давяршэннем якога стала новая, самая разбуральная вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай.

Вайна выбухнула летам 1654 г. Вялікае маскоўскае войска аблажыла Смаленск, а ўжо ў чэрвені атрад князя Куракіна дасягнуў Дубровеншчыны. Праўда, ён не здолеў адразу захапіць замак, толькі разрабаваў навакольныя вёскі. З падыходам новых маскоўскіх сіл пачалася доўгая аблога Дуброўны. Замак баранілі галоўным чынам мясцовыя жыхары: з 27 харугваў дубровенскага гарнізона 10 былі набраны з мяшчан-хрысціян і 10 — з яўрэяў. Наёмныя венгерскія жаўнеры, казакі і гайдукі ўтваралі астатнія 7 харугваў. Баючыся вялікіх страт, рускія не рызыкавалі штурмаваць замак, толькі трымалі яго ў аблозе і абстрэльвалі з гармат ды вялі сярод дубровенцаў агітацыю, усяляк схіляючы іх у маскоўскае падданства.

Дуброўна трымалася ўпарта, некалькі разоў абаронцы рабілі паспяховыя вылазкі. Нават пасля заняцця Смаленска, Оршы ды іншых крэпасцяў дубровенцы працягвалі змагацца. Нарэшце, не маючы ніадкуль падтрымкі, са сканчэннем запасаў пораху і ежы, 12 кастрычніка яны вымушаны былі капітуляваць.

За ўпартае супраціўленне Дуброўну чакала кара. Яшчэ да ўзяцця горада цар Аляксей Міхайлавіч даваў інструкцыі ваяводзе князю Чаркаскаму: «Как город Дубровно здастца, и ... шляхты лучших людей выбрав, прислать к государю, ... а остальную шляхту велеть послать на Тулу, а ме-

щан и уездных людей раздать ратным людям семьями, а город Дубровно выжечь». Гэты загад быў выкананы: 17 кастрычніка замак быў спалены, палонных шляхціцаў са складу гарнізона, а таксама 30 сямей лепшых мяшчан вывезлі ў царскую стаўку ў Смаленск[8].

Тым часам зімой 1655 г. беларуска-літоўскае войска ўчыніла контрнаступленне. Карыстаючыся тым, што галоўныя маскоўскія сілы на зіму былі выведзены, яно зноў заняло Копысь, Оршу і Дуброўну. Але гэта быў часовы поспех. Ужо ў красавіку 1655 г. рускі атрад ваяводы Ф. Замятні ўвайшоў у Дуброўну, дзе быў нанова пабудаваны земляны астрог. У горадзе быў пакінуты невялікі рускі гарнізон, і з гэтага часу практычна да сканчэння вайны Дуброўна заставалася пад кантролем Маскоўскай дзяржавы.

У ходзе гэтых падзей вялікая колькасць насельніцтва была захоплена ў палон. Яўрэяў гвалтоўна хрысцілі, а тых, хто адмаўляўся, высылалі ўглыб Масковіі. Сярод дакументаў Халопскага прыказу захаваўся, напрыклад, запіс за 1658 г. аб палонных, захопленых на Беларусі баярынам Траякуравым. Сярод іх быў 13-гадовы Абрашка — «родом жидовин, а во крещенье Васька Михайлов сын, города Дубровны, а полонили его люди окольничего князя Бориса Ивановича Троекурова в прошлом во 163 году (1655 г. ад Нараджэння Хрыстова. — *В. Н.*), и с тех пор мест и по се число живет у окольничего князя Бориса и впредь жить хочет».

У верасні таго ж 1658 г. ў роспісу паселеных у Маскве іншаземцаў згадваюцца шматлікія мяшчане, вывезеныя з Дуброўны. У Мясніцкай паўсотні было паселена 28 дубровенскіх мяшчан, у Новасямёнаўскай слабадзе — 12, у Дзмітраўскай і Пакроўскай сотнях — па 2. Усе яны былі пераважна мяснікамі, шаўцамі, краўцамі, хлебнікамі, лекарамі і інш.

У верасні 1664 г., незадоўга да канца вайны, рускія вывезлі з Оршы і Дуброўны вялікую колькасць мяшчан і сялян з жонкамі і дзецьмі для пасялення ў Смаленскім ваяводстве, якое разлічвалі ўтрымаць за сабой. У прыватнасці, з Дуброўны было адпраўлена 77 мяшчанскіх сем'яў (226 чалавек), з навакольнай воласці — 16 сем'яў (66 чалавек). Пры праверцы, праведзенай у маі 1655 г., у Смаленску ў наяўнасці аказалася 37 сямей. Частка астатніх была пераведзена ў Дарагабуж і нават Калугу, некаторых сялян па дарозе ў Смаленск перахапілі і рассялілі ў сваіх маёнтках памешчыкі[9].

Доўгая і жорсткая вайна скончылася, нарэшце, падпісаннем у 1667 г. мірнага пагаднення, паводле якога былі адноўлены межы 1522 г.: Смаленшчына адышла да Маскоўскай дзяржавы, а Дубровенскае графства было вернута ў склад ВКЛ.

Юры Караль Глябовіч зноў уступіў у валоданне сваім спустошаным маёнткам. Хутка затым, у 1669 г., ён памёр апошнім мужчынскім прадстаўніком славутага роду Глябовічаў. Яго ўладанні былі падзелены паміж дзвюма дачкамі: Марцыбелай Ганнай, якая з 1661 г. была жонкай князя Марцыяна Агінскага, і Крысцінай Барбарай, якая ў 1667 г. выйшла за пана Казіміра Яна Сапегу.

Было падзелена на дзве часткі і Дубровенскае графства, якое паводле перапісу дамоў Аршанскага павета за 1667 г. налічвала 384 дамы[10].

Маёнтак складаўся з шэрагу войтаўстваў, якія замянілі сабой старыя воласці. У цэнтральнай яго частцы, на левабярэжжы Дняпра, знаходзіліся Савінскае і Дабрынскае войтаўствы, на месцы былой Расасенскай воласці — Скараходаўскае, а на месцы Крапівенскай — Крапівенскі тракт, дзе пераважалі зямянскія службы. На правым

беразе Дняпра ляжала Задняпроўскае войтаўства, а ў парэччы Лучосы, на поўначы Дубровеншчыны — Лучоскае. Паўночна-ўсходняя частка маёнтка, ужо на тэрыторыі сучаснай Смаленшчыны, называлася Бярэзінскім войтаўствам.

Пры падзеле паміж сёстрамі, канчаткова замацаваным пагадненнем у Вільні ў 1677 г., некаторыя войтаўствы амаль цалкам адышлі ў адну з частак, некаторыя былі падзелены на палы. Фактычна падзел адбыўся раней, бо ўжо інвентар 1672 г. пералічвае толькі частку дубровенскіх паселішчаў — менавіта тую, якая ўвайшла ў долю Крысціны і яе мужа Казіміра Сапегі. Ёй дасталіся Савінскае і Скараходаўскае войтаўствы, мястэчка Ляды, частка сёл і службаў па левым беразе Дняпра да вусця Мярэі (Арловічы, Хоміна, Лазараўка, Рэдзькіна). У Крапівенскім тракце Крысціне дасталася частка зямянскіх паселішчаў, у Задняпроўскім войтаўстве — яго заходняя частка з сёламі Стрэжава, Чыжоўка, Якубава, Макарава, Ступакі і іншымі (часткова на тэрыторыі сучаснага Аршанскага раёна). З Лучоскага войтаўства ў гэтую долю ўвайшлі толькі некалькі дробных, знікшых пазней паселішчаў, а Бярэзінскае войтаўства — практычна цалкам[11].

З інвентару добра відаць, якія спусташэнні прынесла маёнтку нядаўняя вайна. У Скараходаўскім войтаўстве з 448 валок 372 заставаліся пустымі, прычым у Казарынаве пуставалі ўсе 16 валок, у Дзем'янкаве — 18 з 20, у Мікіціне — 23 з 24, у Літвінаве — 39 з 40 і г. д. У Савінскім войтаўстве з 412 валок пуставала 224,5, прычым у Корабаве [Карабанавічах(?)] — 19 з 20, у Барсуках — 28,5 з 30, у Старынках — 24 з 26 . Такая ж жудасная карціна назіралася і ў Задняпроўскім войтаўстве, дзе з 270 валок 240,5 былі пустымі, у тым ліку цалкам сёлы Макарава, Якубава і некаторыя іншыя.

У самой Дуброўне долю Крысціны Сапежынай утваралі 82 двары ў так званым Старым горадзе, 10 — у Задубровенскім пасадзе і 20 — у Задняпроўскім. Невядома, колькі двароў было ў долі Марцыбелы Агінскай, але наўрад ці ўсё мястэчка мела больш насельнікаў, чым 65 гадамі раней, у 1607 г. Увесь прырост за гэты час з'ела вайна.

Прыкладна ў гэты ж час нямецкі мастак і падарожнік Маерберг пакінуў замалёўку агульнага выгляду Дуброўны з драўлянай царквой і напаўразбуранай мураванай (напэўна, бернардынскім касцёлам, які моцна пацярпеў у вайну), з хаткамі без комінаў, якія тапіліся «па-чорнаму», а дым выходзіў праз валаковае акенца.

У 1681 г. памерла адна з саўладальніц маёнтка, Марцыбела Агінская. Яна не мела дзяцей. Яе долю ў Дубровенскім маёнтку захаваў за сабой яе муж, канцлер Марцыян Агінскі. Перад яго смерцю ў 1690 г. муж другой саўладальніцы Казімір Сапега выкупіў гэтую (так званую «канцлерскую») частку і далучыў да сваёй, але ў 1693 г. аддаў у заклад за 210 тысяч злотых стрыечнаму брату Марцыяна — Сымону Каралю Агінскаму.

Крысціна Сапежына памерла ў 1695 г. Яна завяшчала свае маёнткі мужу і тром сынам: Юрыю Станіславу, Міхалу Францішаку і Аляксандру Паўлу. Муж яе Казімір Сапега быў у той час бадай што самай яркай і супярэчлівай асобай сярод сваіх сучаснікаў[12]. Уладальнік шматлікіх латыфундый, ён вызначаўся не толькі багаццем, але вялікімі здольнасцямі і не меншым славалюбствам. Ужо ў 45-гадовым узросце ён дасягнуў у 1682 г. вышэйшых дзяржаўных пасад, стаўшы адначасова віленскім ваяводам і вялікім гетманам ВКЛ. У канцы стагоддзя яго роля ў дзяржаве яшчэ больш узрасла. Сапега адчуваў сябе

некаранаваным каралём, застаючыся, дарэчы, у вельмі напружаных адносінах з сапраўдным каралём Янам Сабескім, які таксама вызначаўся моцным характарам.

Сярод вялізных вотчын, што належалі Казіміру Сапегу, было ў прыватнасці і Горы-Горацкае графства, якое межавала з Дубровенскім на поўдні. У 1695 г. ён стаў апекуном маёнткаў памерлай у той час Людвікі Караліны Радзівіл — адзінай дачкі Багуслава Радзівіла, якая была жонкай германскага князя Караля Філіпа Нейбургскага і пакінула малалетнюю дачку Альжбету. У склад яе спадчыны ўваходзіў і Раманаўскі маёнтак, які, нагадаем, часткова ахопліваў тэрыторыю Дубровеншчыны. Казімір Сапега разлічваў з цягам часу набыць гэтую велізарную спадчыну, але яго намер сарваўся з-за бурных падзей, у вір якіх зацягнула яго самога.

Пасля смерці Яна Сабескага ў 1696 г. Сапега паспрабаваў правесці ў каралі Рэчы Паспалітай свайго стаўленіка — французскага прынца Канці. Але ў дзяржаве было вельмі шмат незадаволеных самаўладдзем Сапегі. Яго праціўнікі здолелі ў канцы 1697 г. дамагчыся абрання іншага прэтэндэнта — курфюрста Саксоніі Аўгуста. Адразу пасля гэтага ВКЛ апынулася літаральна на грані грамадзянскай вайны паміж дзвюма магнацкімі групоўкамі. Адну з іх узначальваў Сапега з братам Бенедыктам і сынамі, а ў шэрагах другой вызначаліся родзічы яго былога сваяка — князі Агінскія. Асабістая варожасць абцяжарвалася і маёмаснымі спрэчкамі з-за Дуброўны, на «канцлерскую» частку якой прэтэндавалі Агінскія. Тым не менш пасля смерці Сымона Караля Агінскага ў 1699 г. Сапега зноў далучыў гэтую частку да свайго маёнтка. Аднак пляменнікі Сымона, асабліва сын яго сястры Раіны Людвік Пацей, не супакойваліся, сцвярджаючы, што Сапега не выкупіў маёнтак з закладу.

Сітуацыя зусім абвастрылася з пачаткам у 1700 г. Паўночнай вайны паміж Расіяй і Швецыяй, у якой кароль Аўгуст выступіў саюзнікам Пятра I. Сапега ж, варожа настроены супраць караля, выказаў прыхільнасць да яго праціўніка, Карла XII Шведскага. У лістападзе таго ж года праціўнікі Сапегі абвясцілі ўзброенае выступленне («канфедэрацыю») супраць яго. Грамадзянская вайна нарэшце выбухнула. 18 лістапада ў бітве пад Алькенікамі каля Вільні войска Сапегі было разгромлена канфедэратамі, загінуў яго сярэдні сын Міхал, сам жа Сапега вымушаны быў падавацца на ўцёкі.

Тым часам Карл XII пасля перамогі над Пятром пад Нарвай перанёс ваенныя дзеянні на тэрыторыю Рэчы Паспалітай. Пётр у пачатку 1701 г. накіраваў на дапамогу Аўгусту войска. Адзін з канфедэратаў, Людвіг Пацей, пайшоў на злучэнне з гэтым войскам і пры тым выкарыстаў момант, каб захапіць Дубровенскае графства, разрабаваць яго і вывезці ў свае маёнткі вялікую колькасць сялян.

Казімір Сапега працягваў змагацца. Са сваіх падданых, сялян і зямян, ён сфарміраваў узброены атрад у 26 харугваў, але 8 ліпеня 1701 г. каля Дуброўны гэты атрад быў ўшчэнт разбіты Пацеем. Загінула 1674 чалавекі. У іншыя маёнткі Сапегі былі ўведзены саксонскія войскі караля Аўгуста, пасля чаго ў 1702 г. Казімір адкрыта перайшоў на бок Карла XII і да 1708 г. побач з ім ваяваў супраць Аўгуста і Пятра I. Гэта быў трагічны час, калі Беларусь ператварылася ў арэну для высвятлення адносін паміж рускімі і шведамі. Зноў пацярпела і Дуброўна, якую ў 1708 г. спаліў атрад казакаў і калмыкаў на чале з рускім капітанам Салаўёвым.

Фактычным уладальнікам Дуб-

роўны ў гэты час заставаўся Людвіг Пацей. Аднак у 1711 г. паміж Аўгустам і Казімірам Сапегам намецілася пацяпленне адносін, а потым апошні і ўвогуле атрымаў поўную амністыю са зваротам усіх правоў і маёнткаў.

У такіх умовах Пацей, не спадзеючыся, напэўна, утрымаць Дуброўну за сабой, прадаў яе набліжанаму Пятра I князю Аляксандру Меншыкаву за 150 тысяч талераў. Афіцыйны акт продажу быў падпісаны ў 1715 г., але фактычна Меншыкаў выступае ўласнікам Дуброўны ўжо ў маі 1711 г., калі ён выдаў тамашнім мяшчанам пацвярджанне прывілеяў, раней нададзеных Сапегам і Пацеем[13].

Казімір Сапега, зразумела, не мог пагадзіцца са стратай такога вялікага маёнтка і распачаў супраць Меншыкава судовы працэс. У 1716 г. ён адсудзіў спадчыну сваёй былой жонкі, але «канцлерская» частка маёнтка засталася ва ўласнасці Меншыкава. У 1719 г. суд пацвердзіў права апошняга валодаць гэтай часткай як набытай у законнага спадчынніка Агінскіх Пацея, пры ўмове, што Сапегу будзе выплачана 250 тысяч талераў адступнога. Аднак у фаварыта Пятра I не знайшлося такіх грошай, і ён палічыў за лепшае вярнуць Дуброўну Сапегу, які такім чынам аднавіў кантроль над усім графствам.

У гэты час фінансавыя справы Казіміра Сапегі былі ўжо далёка не такімі бліскучымі, як некалі. Спустошаныя маёнткі не прыносілі даходу, а з крэдыторамі трэба было разлічвацца. Таму амаль адразу пасля звароту Дуброўны Сапега частку маёнтка з сёламі Кісялі і Залатовічы перадаў у заклад пану Пшаздзецкаму, а іншую частку заклаў за 15 681 злоты Яну Лендорфу.

Хутка затым, у 1720 г., Казімір Сапега памёр ва ўзросце 83 гадоў. Дуброўна перайшла ў спадчыну да яго сыноў: Юрыя, мсціслаўскага ваяводы, і Аляксандра, маршалка ВКЛ. Абодва яны ў 1721 г. выкупілі з закладу Кісялі і Залатавічы. Дубровенскае графства было нанова падзелена на дзве часткі, прычым кожнаму з братоў было вылучана па палове мястэчкаў Дуброўна, Баева і Ляды і па частцы кожнага з войтаўстваў. Як вынікае з інвентару[14], у долю Аляксандра ўвайшлі 124 хрысціянскіх і 45 яўрэйскіх двароў у цэнтральнай частцы Дуброўны, адпаведна 46 і 2 двары — у Задняпроўскім пасадзе, 6 двароў — у Задубровенскім пасадзе. Яму ж належала 130 паселішчаў у наваколлі, а агульная колькасць падданых вымяралася 1538 дварамі[14].

У інвентары 1722 г. колькасць двароў у гэтай частцы маёнтка паменшала да 1472 — напэўна за кошт частковага перараз мяркавання паміж братамі. У прыватнасці, са 168 двароў мястэчка Ляды, якія належалі Аляксандру годам раней, засталося толькі 86. Увогуле ж, напэўна, абодвум братам належала каля 3 тысяч двароў, з іх у самой Дуброўне мусіла быць каля 400—500[15]. Па тагачасных мерках гэта быў ужо сапраўдны горад.

Набор сялянскіх павіннасцяў у параўнанні са звесткамі XVI ст. змяніўся вельмі мала. Па-ранейшаму з кожнай валокі належала адпрацоўваць 2 дні прыгону ў тыдзень, раз у год выконваць падворную павіннасць — везці панскі груз вагой не больш за 2 беркаўцы (20 пудоў) на адлегласць не далей за 50 міль (каля 390 км). Прыходзілася касіць таксама панскую сенажаць і плаціць невялікую мядовую даніну — у сярэднім па 3 пуды з войтаўства, якое налічвала звычайна ад 100 да 150 двароў.

Абодва браты па-ранейшаму мелі патрэбу ў грошах, таму працягвалі закладваць часткі сваіх маёнткаў. Юры ў 1722 г. аддаў у заклад пану Бялецкаму за 4 тысячы талераў сяло

Гудава з 64 дварамі, а пану Юзафовічу-Глябіцкаму — сёлы Карабанавічы і Дабрынь. Аляксандр у тым жа годзе заклаў на 3 гады ўсю сваю частку графства пану Дунічу.

У 1724 г. 56-гадовы Юры Сапега ажаніўся паўторна з Тэадорай Солтан, якая была прыкладна на 30 гадоў маладзейшая за яго. Ён запісаў маладой жонцы 200 тыс. злотых пад забеспячэнне на Савінскім і Стрэжаўскім войтаўствах Дубровенскага графства. Гэта азначала, што ў выпадку яго смерці жонка мае права карыстацца даходам з азначаных войтаўстваў, пакуль іншыя родзічы і спадкаемцы не выкупяць іх за такую суму. У 1730 г. Юры такім жа чынам запісаў жонцы яшчэ 100 тыс. злотых на так званым Камандорстве — частцы Дубровенскага маёнтка паміж рэкамі Расасна і Мярэя.

Астатнюю частку маёнтка Юры працягваў раздаваць у заклад. У 1725 г. сяло Халуі і частка Стрэжаўскага войтаўства часова перайшлі да пана Тышкевіча, у 1730 г. сёлы Чубакова і Свіракі былі закладзены Вяжэвічу, а ў 1731 г. частка, ацэненая ў 52 тыс. злотых — Пшэздзецкаму. Паны Бучынскія трымалі ў закладзе Скараходаўскае войтаўства, да якога ў 1731 г. за 35 тыс. злотых прылучылі Літвінавічы, Кабылы і Лаўкі. У сваю чаргу Аляксандр за 150 тыс. злотых заклаў Браніцкаму сваю частку замка і мястэчка Дуброўны з часткай Тухінскага войтаўства за Дняпром[16].

Складзены з гэтай нагоды інвентар 1731 г. зноў падрабязна апісвае Дуброўну[17]. Абодва замкі, Верхні і Ніжні, у той час ужо амаль страцілі абарончае значэнне, хаця і былі адноўлены пасля Паўночнай вайны. На Ніжнім размяшчаўся драўляны палац з гаспадарчымі пабудовамі, садам і агародам. У палацы змяшчаліся два вялікія пакоі, два меншыя і два кабінеты. На Верхнім замку стаяў новапабудаваны, таксама драўляны, палац, дзе меліся 6 пакояў і кабінет, а ў мезаніне — вялікая парадная зала. Будынкі ацяпляліся кафлянымі печамі і камінамі, асвятляліся высокімі вокнамі з алавяннымі пераплётамі. Дубовыя дзверы былі аздоблены металічнымі кольцамі ў ільвіных пашчах, так званымі антабамі. У кожным палацы была галерэя, з якой можна было любавацца прыгожымі дняпроўскімі краявідамі.

Дуброўна па-ранейшаму складалася са Старога горада, Задняпроўскага і Задубровенскага пасадаў, да якіх далучыўся новы пасад за рэчкай Свінка (прадмесце Свінна, альбо Пераміль). У Старым горадзе гандлёвая плошча, дзе стаяла Спаская царква, а таксама купецкія лаўкі і свірны («імбары»). Вядома, што ў 1732 г. Юры Сапега атрымаў дазвол на правядзенне ў горадзе штогадовага кірмашу на дзень Св. Ільі. Пазней, у 1765 г., праводзіліся 2 кірмашы, на саборным тыдні і на свята Спаса. Тады ж 2 кірмашы адбываліся штогод і ў мястэчку Ляды — на Сёмуху і Пакроў.

Між тым маёнтак працягваў драбіцца паміж саўладальнікамі і закладатрымальнікамі. У 1732 г. памёр мсціслаўскі ваявода Юры Сапега. Яго частка маёнтка адышла да ўдавы Тэадоры і непаўналетняй дачкі Крысціны, якая пазней (у 1745 г.) выйшла за князя Казіміра Масальскага. Сын Юрыя ад першага шлюбу — Антоні Казімір — атрымаў у спадчыну іншыя бацькоўскія маёнткі.

Малодшы брат Юрыя, маршалак Аляксандр Сапега, перажыў яго на два гады. Ён пакінуў трох сыноў: Казіміра Леана, Юзафа Станіслава і Міхала Антонія. Паміж імі і была падзелена яго частка Дубровенскага графства. Хутка затым, у 1738 г., памёр старэйшы з іх, Казімір, пакінуўшы малалетніх сыноў Аляксандра і Міхала пад апекай іх маці — Караліны Радзівіл.

Інвентары за 1739—1740 гг. фіксуюць стан маёнтка на гэты час[18]. Удаве Юрыя тады належала 49 хрысціянскіх і 20 яўрэйскіх двароў у самой Дуброўне, а ўвогуле ў маёнтку — 364, і яшчэ 65 належала выкупіць з закладу. Іншая частка, якая належала спадкаемцам Аляксандра, уключала каля 1500 двароў, з іх у Дуброўне — 262 хрысціянскіх і 51 яўрэйскі.

Апрача таго, Караліна Радзівіл аддала ў заклад капітану Пакашу Гусынскае і Смыкаўскае войтаўствы, а брат яе мужа Міхал Антоні за 6 тыс. талераў заклаў мястэчка Баева Парыцкаму. У 1743 г. тая ж Караліна аддала значную частку сваіх уладанняў у заклад Салагубу, у якога яна была выкуплена толькі ў 1770 г.

Але ў другой палове XVIII ст. драбленне маёнтка спынілася. Дараслі да сталага ўзросту сыны Казіміра і Крысціны. Малодшы з іх, Міхал, у 1759 г. саступіў сваю частку Дуброўны старэйшаму, Аляксандру (будучаму полацкаму ваяводзе і канцлеру ВКЛ). У 1760 г. іх дзядзька Міхал Антоні таксама завяшчаў сваю частку Аляксандру. Многія паселішчы былі паступова выкуплены з закладу, і ў руках Аляксандра зноў сабралася даволі значная латыфундыя, хаця частка яе па-ранейшаму належала спадкаемцам Юрыя Сапегі — яго ўдаве Тэадоры Солтан і дачцэ Крысціне Масальскай.

Цікава, што князь Сяргей Меншыкаў, унук пятроўскага вяльможы, узнавіў свае прэтэнзіі на Дуброўну. У 1765 г. Крысціна Масальская мусіла выплаціць яму 21 500 злотых, каб ён адмовіўся ад гэтых прэтэнзій[19].

Што тычыцца іншых маёнткаў на тэрыторыі Дубровеншчыны, то Расасна ў першай палове XVIII ст. была аддзелена ад Любавіцкага графства і перайшла ва ўласнасць аршанскага кляштара трынітарыяў. Пра яе гісторыю, на жаль, вядома вельмі мала. Расасна была адносна невялікім мястэчкам, налічвала каля 60—70 двароў, і яшчэ каля 150 мелася ў навакольных вёсках.

Частка Дубровеншчыны па-ранейшаму адносілася да маёнтка Раманава, які ў ліку іншай спадчыны князёўны Нейбургскай у 1731 г. дастаўся прадстаўніку нясвіжскай галіны Радзівілаў Гераніму Фларыяну, а пасля яго смерці ў 1760 г. перайшоў да яго пляменніка, славутага Караля Станіслава Радзівіла па мянушцы Пане Каханку. Інвентар Раманава за 1755 г. згадвае на тэрыторыі Дубровеншчыны 8 вёсак: Азарава, Асташкавічы, Валькава, Займішча, Казлы, Ляхаўку, Парфенаўку і Сукіна, у якіх разам было 124 дварыі[20].

У такім стане знаходзілася Дубровеншчына ў 1772 г., калі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай яна апынулася ў складзе Расійскай імперыі і пачаўся новы перыяд яе гісторыі.

В. Насевіч.

Крыніцы:

1. Смоленские грамоты XIII—XIV вв. М., 1963.

2. Русская историческая библиотека. Т. 27. СПб., Литовская метрика. С. 152.

3. Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого литовского статута 1529 г. М., 1892. С. 275.

4. Документы Московского архива Министерства юстиции. Т. 1. М., 1897. С. 123—134.

5. Аддзел рукапісаў бібліятэкі АН Літвы. Ф. 16. Спр. 13. Л. 80—104.

6. Якимович Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в. Мн., 1991. С. 128—132.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. КМФ-5. Воп. 1. Спр. 3550, 3551.

8. Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 92—94; Сагановіч Г. М. Невядомая вайна (1654—1667). «Спадчына». 1993, № 3, 4.

9. Русско-белорусские связи. Сб. док. Мн., 1963. С. 387, 400, 402, 404, 405, 473, 474.

10. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. ДА. Спр. 3236. Л. 14.

11. НАРБ. Ф. 3258. Воп. 1. Спр. 1.
12. Sapiehowie. T. 2. Petersburg, T. 2. 1891. S. 158–212.
13. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. Т. 13. Вильно, 1886. С. 144.
14. НАРБ. Ф. 3258. Воп. 1. Спр. 3.
15. Там жа. Спр. 4.
16. Sapiehowie. T. 3. Petersburg, 1894. S. 83–105, 205–206.
17. НАРБ. Ф. 3258. Воп. 1. Спр. 8, 9.
18. Там жа. Спр. 10, 11.
19. Sapiehowie. Petersburg. T. 3. S. 201, 298, 318, 365.
20. НАРБ. Ф. КМФ-5. Воп. 1. Спр. 1789.

Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 года

У канцы XV–XVI ст. адносіны паміж новастворанай Маскоўскай дзяржавай і Беларуска-Літоўскай былі вельмі напружаныя. Дыпламатычная барацьба паміж імі за палітычны ўплыў у Еўропе і за валоданне землямі былой Кіеўскай Русі суправаджалася ваеннымі канфліктамі. У канцы 1512 г. пачалася новая маскоўска-літоўская вайна.

...Трэцяя кампанія пачатковага перыяду вайны характарызавалася лепшай падрыхтоўкай расейскай арміі Васіля III. Капітуляцыя Смаленска адбылася 30 ліпеня 1514 г.

Пасля захопу Смаленска Васіль III загадаў 80-тысячнаму коннаму войску накіравацца ў глыбіню тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Яно прасоўвалася да Оршы і Друцка, а потым на Віленскім напрамку. Насустрач маскоўскім баярам і іх палкам з Вільні праз Менск і Барысаў выйшаў са сваім войскам кароль польскі і вялікі князь літоўскі і рускі Жыгімонт Казіміравіч.

Царскія палкі таксама былі накіраваны да Мсціслава. Вынікам гэтага паходу быў пераход мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча Заслаўскага на бок непрыяцеля. Прысягу Васілю прынялі жыхары Крычава і Дуброўны.

Кароль Жыгімонт сабраў войскі абедзвюх дзяржаў: феадальнае апалчэнне Вялікага княства Літоўскага на чале з гетманам, князем Канстанцінам Іванавічам Астрожскім — 16 тысяч вершнікаў, 14 тысяч польскіх коннікаў, 3 тысячы наёмнай польскай пяхоты, а таксама дробныя феадальныя атрады з Малой Польшчы і шляхціцы — добраахвотнікі з Вялікай Польшчы. Была і артылерыя, але колькасць гарматаў невядомая. 4 тысячы ваяроў Жыгімонт I пакінуў сабе ў Барысаве, а астатнюю, найбольшую частку войска (больш за 30 тысяч чалавек) пад агульным камандаваннем князя Канстанціна Астрожскага накіраваў да Оршы.

Рускі гісторык С. М. Салаўёў адзначаў, што ў маскоўскіх ваяводаў было 80 тысяч войска.

Размясцілася маскоўскае войска паміж Оршай і Дуброўнай — на ўзгорках каля вёсак Пугайлава і Рукліна, пакінуўшы свабодную прастору для непрыяцеля ў лукавіне Дняпра на яго левым беразе каля Оршы.

7 верасня 1514 г. войска К. Астрожскага наблізілася да Дняпра ў раёне Оршы. Па двух часовых мастах на працягу ночы была перапраўлена ўся пяхота і артылерыя войска Вялікага княства ў раён вёскі Пашына. А 9 гадзіне раніцы ў пятніцу 8 верасня 1514 г. войска князя К. Астрожскага было ўжо пастаўлена ў баявых парадках на полі бітвы.

Бітва адбылася на полі ў тры кіламетры па фронту ўздоўж Дняпра, за 200–400 метраў ад берага ў першай фазе бітвы і за тры з паловай кіламетры ў другой ягонай фазе. У глыбіню

абодвух франтоў поле бою таксама складала прыблізна тры кіламетры.

Пасол германскага імператара да вялікага князя маскоўскага Васіля III — барон Жыгімонт Герберштэйн, які наведаў у Вільні у пачатку 1517 г. (калі ехаў у Маскву) палонных І. А. Чалядзіна і М. І. Булгакава-Голіцу (былых ваяводаў у рускім войску) і размаўляў з імі пра бітву пад Оршай, расказвае ў сваіх запісах пра разгром расейскага войска: «Ліцвіны, наўмысна адступіўшы да таго месца, дзе ў іх былі схаваныя гарматы, накіравалі іх супраць маскавітаў, якія насядалі, і паразілі іх заднія шэрагі, што выстраіліся ў рэзерве, але занадта скучаныя, унеслі замяшанне ў іх шэрагі і рассеялі. Так нечаканы баявы прыём прывёў маскавітаў у жах, бо яны лічылі, што ў небяспецы знаходзіцца першы рад, які б'ецца з ворагам; прыйшоўшы ў замяшанне і лічачы, што першыя шэрагі ўжо разбітыя, яны кінуліся наўцёкі. Ліцвіны, разгарнуўшыся і накіраваўшы ўсе свае сілы, праследавалі іх, гналі і забівалі. Убачыўшы гэтыя ўцёкі, адступілі і абодва рускія флангі. Толькі ноч і лясы спынілі гэтае вынішчэнне». (Цыт. па кн.: Герберштейн С. Записки о Московии.)

Беларуска-літоўскія коннікі працягвалі праследаванне ажно да васьмі літоўскіх міляў (г. зн. на 60 кіламетраў).

М. М. Карамзін у «Истории государства Российского» адзначыў: «Літоўцы ніколі не атрымлівалі такой славутай перамогі над расіянамі: гналі, рэзалі, тапілі іх у Дняпры і Крапіўне; целамі ўсеялі палі паміж Оршай і Дуброўна... Мы страцілі трыццаць тысяч воінаў: ноч і лясы выратавалі астатніх».

Страты маскоўскага войска палоннымі перавышалі пяць тысяч чалавек. 20 тысяч трафейных коняў і палова вайсковага абозу былі параздаваны пераможцам.

М. Стрыйкоўскі нагадвае, што ў войску літоўскім і польскім загінулі чатыры паны і знатныя шляхціцы, а простых жаўнераў і шляхты крыху болей за чатырыста. У гэтай трагедыі было шмат параненых.

Адразу пасля бітвы Дуброўна, Мсціслаў і Крычаў перайшлі на бок вялікага князя Жыгімонта.

Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 г. стала вядомай ва ўсёй Еўропе. Каля 1520 г. невядомы мастак, хутчэй за ўсё ўдзельнік гэтай бітвы, намаляваў карціну, якая лічыцца першай у батальным жывапісу Усходняй Еўропы. Зберагаецца ў Кракаўскім музеі.

А. Грыцкевіч.

Хто такі Канстанцін Астрожскі?

Канстанцін Іванавіч Астрожскі (1460—1530) — адзін з самых славутых герояў беларускай гісторыі, вялікі абаронца Айчыны. Паходзіў з роду турава-пінскіх князёў, нашчадкі якіх з канца XIV ст. мелі галоўнай рэзідэнцыяй горад Астрог на Валыні. Вайсковую службу пачаў удзелам у барацьбе з крымскімі татарамі ды ў першай вайне Маскоўскай дзяржавы супраць Вялікага княства Літоўскага. Як найбольш таленавіты вайсковы кіраўнік ва ўзросце 37 гадоў атрымаў чын гетмана найвышэйшага — галоўнага начальніка над войскам дзяржавы — ды неўзабаве здабыў еўрапейскую славу.

У змаганні з крымскімі татарамі і маскоўскімі заваёўнікамі Астрожскі не меў сабе роўных. Згодна з надпісам на ягоным надмагіллі, гетман 63 разы дамагаўся перамогі над імі. Асабліва слаўнай была перамога над амаль утрая большым маскоўскім войскам пад Оршай 8 верасня 1514 г., якой Астрожскі фактычна ўратаваў краіну ад чужога панавання.

Пра слаўную перамогу даведалася ўся Еўропа. Ёй быў прысвечаны спецыяльны ліст ок навінаў, выпушчаны ў Нюрнбергу ў 1514 г. Аршанская бітва ўвайшла ў еўрапейскія хрэстаматыі ваеннай гісторыі як узор удалай тактыкі змагання з намнога перасяжнымі сіламі ворага, як прыклад выразнага ўплыву таленту і майстэрства вайсковага начальніка на вынік баталіі.

Нястомна рупячыся пра належную абарону Вялікага княства, найвышэйшы гетман не шкадаваў ні свайго жыцця, ні сродкаў, ды на ўласныя грошы ставіў харугвы вершнікаў. У Еўропе Канстанціна Астрожскага называлі «Ромулам», «Сцыпіёнам», «другім Ганібалам», «князем, найбольш вартым светлай памяці». Гетманства гэтага «брата расіянаў па царкве, але іх страшнага ворага ў полі» стала ўзорам вайсковай чыннасці ў Вялікім княстве.

В. Насевіч.

Дакументы сведчаць

ПАСОЛЬСКІЯ ПАСЛАННІ ПОЛЬСКАГА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА ДА МАСКОЎСКАГА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВАСІЛЯ III АБ ЗАКЛЮЧЭННІ МІРУ

1520 г., ч э р в е н ь

...III. – Жикгимонт, Божьею милостью король Польский и пр., чиним знаменито сим нашим листом. Намовившися с паны радами нашими, послали есьмо от нас в поселстве до великого князя Московского, воеводу Подляшского, маршалка нашого, старосту Переломского, Радуньского и Ожского, пана Януша Костевича, а подскарбия земского, маршалка и писаря нашого, державцу Каменецкого, пана Богуша Боговитиновича, для миру и покоя, и науку нашу в другом нашом листе им есьмо отдали, которым обычаем мели межи нами з великим князем Московским покой и мир доконати и встановити. Пак ли ж бы водлуг тое нашое науки мир стати ся не мог, тогды перемирье взяти, на колько лет умова будет, и записы водле обычая вчинити. А границы выписати, покуль теперь на обе стороне украинники держат. А Смоленска у перемирной грамоте в его сторону не писати, поки перемирье будет держано, подлуг умовы. А Дубровны города и волостей наших Полоцких, Витебских, Роских, Мстиславских, Кричовских, и князьских и панских и князей Горских, и иных князей, которые нам служат, не поступовати у его сторону. А похотел бы, за перемирьем, вязни свои мети, а напротивку вязни наши выпустити, ино отказати: естли князь великий Смоленска поступит нам, а мы напротивку того вязни его выпустим. А естли бы без выпущенья вязни перемирья на колько лет вчинити не хотел, ино ехати прочь, жадного конца не чинячи, и взложите вси речи на нас господаря. А похотел бы в перемирье мети, ажъбы с обу сторон напротивку царя Перекопского быти за-один: ино, не менуючы царя, нижьли написати, ажъбы на кождого неприятеля быти за-один. А выписати в перемирной грамоте, ижьбы в тые лета послы на обе стороне безпечно ходили и покой и мир вечный еднали. Для которого ж певного сведомья в том листе и рука наша властная есть подписана и печать наша приложона. А тую есьмо науку вчинили и написали з радою всих панов рад наших. Писан в Торуни.

Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 2. Санкт-Петербург, 1848. С. 134.

З ПАСОЛЬСКАГА ПАСЛАННЯ МАСКОЎСКАГА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВАСІЛЯ ІААНАВІЧА ПОЛЬСКАМУ КАРАЛЮ ЖЫГІМОНТУ

1525 г., м а й—л і п е н ь

...III. – Великий господарь, король и великий князь Жигимонт велел тобе говорити: Што еси говорил нам от брата и свата нашого, великого князя Василья Ивановича, иж присылал к нему наместник его Стародубский, што будьто бы наши врядники и люди с Пропойска и з Речицы, через перемирныи грамоты, вступалися в его волости

242 адзінкі агнястрэльнай зброі. Да іх, згодна інвентару, мелася 11 бронзавых двухчасткавых формаў для адліўкі вялікіх і малых ядраў і куль, 14 жалезных і 4 каменныя формы, а таксама значны запас боепрыпасаў: 56 коп (г. зн. 3360 шт. — *М.Т.*) рознай велічыні ядраў, 19 фунтаў куль, 122 каменных ядра і ядры з волава і аблітыя волавам, значны запас шроту — «глоту», 6 1/4 пуда мушкетнага пораху, 15 пудоў з лішкам пораху гарматнага, болей за 41 пуд салетры, 24 парахавыя ступы, да іх 180 таўкачыкаў, многа парахаўніц, патранташаў. З даспехаў і халоднай зброі дакумент называе 4 старасвецкія шышакі, 229 пяхотных і 5 казацкіх шабляў, апраўленых срэбрам, 16 коп'яў, 113 сякерак, 179 бердышаў без абухоў, «набіўных серабром», 17 з абухамі. Цікавыя звесткі пра абмундзіраванне гарнізонных гайдукоў, для якіх у цэйхгаузе мелася «жупаноў белых гайдуцкіх 26, жупаноў чырвоных — 170, 7 зялёных, лісою падбітых, 181 блакітная дэлія, падшытая белым «кірам» (дэлія — кароткая свабоднага пакрою шуба без рукавоў, якую апраналі на панцыр; «кір» — тоўстае сукно.— *М.Т.*), 22 шапкі-катанкі белыя, 200 чорных шапак-мурак. Называюцца прапарцы на коп'ях, 11 сцягаў-харугваў, у тым ліку харугвы гараджан і сельскіх жыхароў. Усе яны прымалі ў абавязковым парадку ўдзел у абароне замка. Меліся барабаны — «бубны», сігнальныя трубы і многае іншае. Запас хлеба захоўваўся ў 10 свірнах»[8].

М. Ткачоў.

1. РАБВДУ. А-1538. Л. 1 адв.; А-1532. Л. 1.
2. Описание документов и бумаг, хранящихся в МАМЮ. Кн. 21. М., (без даты издания). С. 406.
3. АПРГ. М., 1800. С. 157.
4. Зимин А. А. Россия на пороге нового времени. М., 1972. С. 164—166; ПСРЛ. Т. 32. С. 127; БЦДАМЛМ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 14. Л. 58 адв.; Герберштейн С. Записки о Московских делах. СПб., 1908. С. 326—327 (карта).
5. Россия. Т. 9. С. 387; ПСРЛ. Т. 32. С. 100; Посольство Иоанна Кобенцеля в Москве в 1575—1767 гг. // Варшавские университетские известия. Т. 8. Варшава, 1896. С. 50; БА. Т. 2. С. 290; ГБДМ. Т. 1. С. 169.
6. Россия. Т. 9. С. 109; Описание путешествия в Москву посла римского императора Николая Варкоча с 22 июля 1593 г. // ЧОИДР. Кн. 4. М., 1874. С. 9.
7. РАБВДУ. А-1397. Л. 1-15 об.
8. Там жа. Л. 12—12 адв., 13—15 адв.

Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 90—95.

Дакументы сведчаць

З ЛІСТА ДУБРОВЕНСКАГА ВАЯВОДЫ Я. Г. ГРАТОЎСКАГА ВАЯВОДАМ РУСКІХ ГАРАДОЎ АБ ПРОПУСКУ СЯЛЯН ДУБРОВЕНСКАГА ПАВЕТА САВЫ ІВАНОВА, ІВАНА САВІНА І ІВАНА ЛАЎРЫНАВА З ТАВАРАМІ

1645 г., 10 (20) снежня

...Ведомо чиню, что месчане места Дубровского имянем Иван Савин, Сава Иванов, Иван Лавринов едут до земли Московской с товарами своими и з готовыми деньгами для продажи товаров своих и для покупки соболей и для иных мяхких товаров на прямую потребу ясневельможного его милости пана Юрья Кароля Глебовича на Дубровне воеводы смоленского, пана моего. За которых прилежно прошу, чтоб так в государстве его королевское милости, також, естьли прилучитца где в государстве и в котором-нибудь городе земли Московские, безо всякие зацепки как люди купетцкие пропущены были, которую ту доброту с показного жалованья таковым же обычаем отслужить должен буду.

Писан в Дубровне году 1645-го декабря в 20 день.

А внизу припись: Ян Кгабриель Кгротовский судья земский венденский рукою моею.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 195, 196.

З АПОВЯДУ Ў ПАСОЛЬСКІМ ПРЫКАЗЕ ГАНДЛЁВЫХ ЛЮДЗЕЙ ДУБРОВЕНСКАГА ПАВЕТА САВЫ ІВАНОВА І ІВАНА ЛАЎРЫНАВА

1646 г., 2 лютага

154-го февраля в 2 день. В Посольский приказ привел Таможенной сын Боярской Савин Айдаров 4-х человек литовских купцов...

... А приводные литовские купцы сказались: з Дубровны воеводы смоленского пана Юрья Кароля Глебовича крестьяне белорусцы Савелий Иванов, Иван Лаврентьев, да с ними челяди 2 человека; а ехали де они в государеву сторону серпейским рубежом на Колугу; а ис Колуги приехали к Москве для долгов своих, побити челом государю на должников на Туленина на Сергея Тучкова да на князь Матвея Михайловича Долгоруково; а товаров де с ними, опричь хмелю и масла и анису, никакова нет ...

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 197, 198.

З АПОВЯДУ Ў ПАСОЛЬСКІМ ПРЫКАЗЕ ВЯЗЕМСКАГА ТАРГОВАГА ЧАЛАВЕКА С. КАЛУЖКІ

1654 г., 22 студзеня

162-га генваря в 22 день. В Посольском приказе явился вязьмятин торговой человек Стенька Колужка, а в роспросе сказал:

По государеву де указу имали ево с собою в Литву государевы великие послы, боярин князь Борис Александрович Репнин с товарищи. И как де ево те государевы великие послы отпустили из Орши в Могилев с товары и для проведыванья вестей, и он де в Могилеве жил 17 недель. И как он послышал, что пришол из обозу и под Речицы литовской гетман ксенжа Радивил в местечко Головчин, от Могилева 25 верст, ездил из Могилева в Головчин к гетману для того, чтоб осмотрить гетманова войска и розведать вестей.

... Да он же де был и в Глебовичеве маетности в Дубровне, и в тех де вышеписаных городех, в Орше и в Могилеве и в Шклове и в Глебовичеве маетности, в Дубровне, ратных людей никого нет, только тутошные жильцы.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 288, 290.

Нашэсце

...Усе тры арміі рускага цара Аляксея Міхайлавіча павінны былі ўдарыць адначасова. Галоўныя сілы пачалі рухацца з Масквы 15 траўня 1654 г. Тады ў бок мяжы Вялікага княства Літоўскага выйшлі перадавы полк ваяводаў Мікіты Адоеўскага, Хвёдара Хварасціна і Дзімітра Львова ды ертавульны Васіля Шарамецева і Цімафея Шчарбатава. На другі дзень туды ж накіраваліся вялікія палкі Якава Чаркаскага і старажавы Міхайлы Цёмкіна-Растоўскага.

18 траўня ў паход выпраўляўся сам цар з астатнімі палкамі. У Маскве цэлы дзень білі ў званы. Манарх вышаў у зброі, доўгай дэліі, гафтаванай золатам, высокай спічастай шапцы з залатым яблыкам і крыжам на канцы. За ім рухаліся думныя баяры, вазы са скарбам, урэшце, баяры Барыс Морозаў ды Ілья Міласлаўскі з усім царскім дваром. Абапал дарогі стаяла вышэйшае духавенства ды бласлаўляла ратнікаў, акрапляючы іх пасвечанай вадой.

На многія вёрсты расцягнулася па Смаленскім шляху чарада палкоў і сотняў, вазоў з боезапасамі і правіянтам, чатырохконак з гарматамі. Самыя цяжкія абложныя гарматы былі выпраўлены на Вязьму загадзя, яшчэ ран-

няй вясной, бо дзеля цяжкае вагі іх цягнулі надзвычай павольна, пераадольваючы па якой мілі за дзень.

Цар спяшаўся. 26 траўня ён быў ужо ў Мажайску, адкуль пісаў сям'і ў Маскву: «а спешю, государыни мои, для тово, что сказывают людей в Смоленске и около Смоленска нет никого, чтобы поскорее захватить».

Добра ведаючы канфесійныя праблемы Вялікага княства Літоўскага, маскоўскі ўрад рабіў стаўку на яго праваслаўных жыхароў. Царскія граматы, што папярэдне засылаліся ў Рэч Паспалітую, мусілі пераконваць людзей у лаяльнасці Масквы да іх, ухіляць праваслаўных у бок царскіх ратнікаў. Цар, у прыватнасці, пісаў: «В Польское королевство и Литовское княжество, матери нашей святой восточной церкви сынам... от многих времен от святые восточные церкви к вам, чадам ее, и от всех православных христиан Малые России моление было да законным вспоможением, елико верным по верных достоит помогать, поможем. И вот теперь умилостивились ины и Малую Россию, православных христиан, под единого словесных овец пастыря Христа Бога нашего державу решили принять. И вот теперь всем извещаем, что Богохранимое наше царское величество за Божию помощью, собравшись со многими ратными людьми на досадителей и разорителей святой восточной церкви греческого закона, на поляков, воружаемся, дабы господь Бог над всеми нами, православными христианами, умилосердился и чрез нас, рабов своих, тем месть сотворил... И вы бы, православные христиане, освободились от злых... прежде всего царского пришествия разделения с поляками сотворите, как верою, так и чином... и каждый против супостат Божиих да вооружается. Которые добровольно прежде нашего государского пришествия известны и верны нам учинятся, о тех мы в войске заказ учинили крепкий, да сохранены будут их домы и достояние от воинского разорения». Апроч захавання маёмасці тым, хто пяройдзе на бок Масквы, абяцаліся ўзнагароды, прывілеі ды розная матэрыяльная падтрымка.

Нягледзячы на беспрэцэдэнтную сілу і надта зручны момант для нападу (царскі ўрад выдатна інфармаваны пра разлад у Вялікім княстве Літоўскім і непадрыхтаванасць гэтае дзяржавы да вайны), сярод баяраў знайшліся і такія, хто быў супраць распачатых дзеянняў. Відаць, памяталася, што раней такія выправы мелі часцей благі канец. Сам князь Трубяцкой ужо на другі дзень пасля выезду з Масквы пісаў цару, што ў ягоным войску — нязгода і няшчырасць.

Яшчэ 17 траўня 1654 г. на Беларусь рушыла 120-тысячная казацкая конніца. Гетман Багдан Хмяльніцкі паведамляў цару: «По указу твоего царского величества... с ратными людьми Ивана Никифоровича, полковника Нежинского, посылаем по боку твоего царского величества, которые люди чтоб... всех врагов под ноги твоему царскому величеству покоряли...».

Старажавы полк цэнтральнае арміі 1 чэрвеня ўжо падышоў да горада Белы, і ён капітуляваў. А 3 чэрвеня тое ж здарылася з Дарагабужам. У сярэдзіне месяца ваяводы ўжо выходзілі з Дарагабужа, ад якога да Смаленска — блізу 70 кіламетраў.

Толькі тады, 18 чэрвеня, атрымаўшы нарэшце ад караля на Варшаўскім сойме булаву вялікага гетмана, Януш Радзівіл кінуўся дзейнічаць. Проста з сойму ён рушыў на тэрыторыю ваенных дзеянняў і стаў збіраць пад Воршай абоз. У канцы чэрвеня гетман фармальна меў 11 261 чалавека. Але на справе баяздольных было менш. 20 ліпеня Радзівіл пісаў каралю

з абозу, што жаўнераў у яго фактычна толькі 4 тысячы, астатнія — некалькі тысячаў паспалітага рушання і павятовых харугваў — мала на што здатныя. «Што тут рабіць? — пытаў ён. — Чатыры тысячы на кавалкі рваць ды ісці на падмогу? Ці Літву бараніць... Толькі на Спадара Бога спадзяемся, той няхай сам нас ратуе».

А пад Смаленскам ужо стаяла ўся царская армія. 25 чэрвеня на падыходах да горада каля ракі Калодна яе перадавы полк быў нечакана заатакаваны. Выявілася, што гэта палкоўнік Корф, вывеўшы са Смаленска 400 конных і 200 пешых жаўнераў, спрабаваў затрымаць напаўзанне лавіны. Ды страціўшы колькі дзесяткаў сваіх смельчакоў, мусіў вярнуцца да муры. Наступнага дня полк ваяводы Адоеўскага ўжо ўмацаваўся абозам на беразе Дняпра пад самым Смаленскам, а 28 чэрвеня пад горадам была размешчана і царская стаўка, перанесеная 5 ліпеня яшчэ бліжэй, на Дзявочую гару. Месца зацiскалася ў абцугі аблогі.

1 ліпеня Януш Радзівіл выправіў пад Смаленск обер-лейтэнанта Ганскага з 3-тысячным корпусам. Той перайшоў каля горада мост цераз Дняпро і пад Багданавай ваколіцай уначы напаў на лагер аднаго з маскоўскіх палкоў. «Некалькі дзесяткаў сотняў паклаўшы, а сваіх і трох дзесяткаў не страціўшы», Ганскі захапіў вялікі пашон, шмат баявых сцягоў і пасля яшчэ адной сутычкі з непрыяцелем удала вярнуўся ў абоз пад Воршу.

Пачуўшы пра капітуляцыю Полацка, а праз два дні — і Рослава, вялікі гетман вырашыў ратаваць Амсціслаў. Ён пакінуў у абозе магістра артылерыі Мікалая Юдзіцкага, а сам з часткаю войска рушыў на Горы. Але там атрымаў вестку, што Амсціслаў ужо захоплены, а вялікія сілы непрыяцеля накіраваліся проста да Воршы. Тады, павярнуўшыся, Радзівіл хутка пайшоў назад.

Ваявода Чаркаскі вёў з-пад Смаленска магутнае войска, складзенае з адборных частак вялікага, перадавога, старажавога ды іншых палкоў, з адной мэтай — зліквідаваць корпус Радзівіла.

Гэтыя весткі пра рух Чаркаскага прымусілі вялікага гетмана паспешліва вяртацца з-пад Гораў да Воршы. Ужо 2 жніўня ён пісаў у Вільню, калі б хто на дзень спазніўся, — заспеў бы на месцы лагера толькі попел. Вораг стаяў ужо за нейкія 6 міляў! На злучэнне з Чаркаскім ішоў Трубяцкой. Па чутках, сюды з-пад Віцебска і Полацка спяшалася дапамога Шарамецева. «Сёння, заўтра і штохвілінна чакаем непрыяцеля», — паведамляў Радзівіл і ў адчаі дадаваў, што гэта будзе расправа: «Як справіцца з няроўнай і такой вялізнай сілай? — Бог лепей ведае, бо апроч гэтага кволага войска няма нічога ні з паноў, ні з мясцовае шляхты, якая раней лічылася тысячамі... Адзін толькі я, пазбаўлены ўсялякай дапамогі... ужо 6 тыдняў стрымліваю на сваіх плячах такога моцнага непрыяцеля з боку Полацка, Віцебска, Смаленска, Амсціслава, трывожачы яго і замінаючы ягоным планам, аднак біць і разбіваць яго не магу. Вытрымліваць даўжэй такія слабыя сілы не ў стане; таму трэба чакаць аднаго з двух: або — барані Божа! — войска гэтае кінецца ў небяспеку і, у выпадку нявытрымкі, да нас на падмогу павінна паспяшацца ўся Рэч Паспалітая, або ўсімі гэтымі землямі, што знаходзяцца амаль у сярэдзіне княства Літоўскага, завалодае непрыяцель».

Калі Радзівіл перавёў абоз з-пад Воршы да Копыся, палявы гетман Гасеўскі застаўся пад Воршай і 3 жніўня ўначы нечакана атакаваў лагер маскоўскіх ваяводаў, прычыніўшы ім вялікую шкоду. Хутка Чаркаскі з галоўнымі сіламі ўвайшоў у пакінутую Воршу і адразу ж рушыў уздагон за

Радзівілам, да Копыся. Туды ўжо падыходзіў і Трубяцкой, які па дарозе захапіў мястэчка Расну ды скаардынаваў свае дзеянні з Чаркаскім. Ваяводы распачыналі сапраўднае паляванне на невялікі корпус Януша Радзівіла. 12 жніўня пад Шкловам той прыняў бой з войскам Чаркаскага. Пры вялізнай дыспрапорцыі сілаў (у Чаркаскага было не менш за 20 тысячаў) ён змог нанесці непрыяцелю надзвычай цяжкія страты — ад 3 да 7 тысячаў! — і нават захапіў 610 палонных, а ягоных загінула ўсяго каля 700 чалавек. Але гэта была апошняя перамога вялікага гетмана...

Ваявода Трубяцкой, авалодаўшы Копысем, толькі на якую гадзіну спазніўся на бітву пад Шкловам. Шклоў неўзабаве быў заняты войскам Чаркаскага, і абедзьве арміі зноў пачалі пераслед Радзівіла, які злучыўся пад Галоўчынам з Гасеўскім ды, ухіляючыся ад Трубяцкога, перайшоў пад Бялынічамі Друць. Тады Трубяцкой пераправіўся цераз гэтую ж раку пад Цяцерынам і пачаў атачаць абоз Радзівіла. Вялікі гетман спрабаваў адысці ў бок Барысава, але 24 жніўня пад мястэчкам Шапялевічы быў вымушаны даць бой насядаючаму войску Трубяцкога. Тут пачалася самая цяжкая ў ягоным жыцці бітва, якая прынесла Радзівілу першую паразу. Загінула пад тысячу чалавек — гэта вялікія страты для 6—8-тысячнага корпуса. Сам гетман быў паранены. Двойчы яго ратавалі ад смерці — спачатку афіцэр Графенберг, затым — вугорская пяхота Юшкевіча. Разбітае войска рассеялася па лесе. А непрыяцель, забраўшы абоз, мог вяртацца: арміі Вялікага княства Літоўскага больш не існавала...

Тым часам краіна страчвала горад за горадам. Яшчэ 24 ліпеня армія Васіля Шарамецева захапіла Дзісну і Друю. Ваявода паведамляў цару, што Друю здабылі з боем: «взяли взятьем и ратных и всяких людей, которые в городе сидели, побили и город и костёлы и домы все пожгли без остатку...». 9 жніўня гэтая ж армія заняла Глыбокае, 20-га — Азярышча, атачыла Віцебск.

Ваявода Сямён Стрэшнеў, высланы дзейнічаць асобна, 16 жніўня «горад Усвят осадил накрепко, и с того числа августа по 23 число с литовскими людьми бились днём и ночью беспрестанно», пакуль 23 жніўня ўсвяцкі падстараста не адкрыў гарадскую браму.

А на паўднёвым усходзе Беларусі ўжо гаспадарыў наказны гетман Запарожскага войска Іван Залатарэнка.

Тады ж, пры канцы жніўня, быў вырашаны лёс Магілёва. Буйнейшы гандлёва-рамесніцкі цэнтр тагачаснае Беларусі, стратэгічная фартэцыя, ён быў ключом да Дняпра і адкрываў шлях у Вялікае княства Літоўскае. Аднак да бітвы за яго не дайшло. Яшчэ 5 ліпеня 1654 г. магілёўскі шляхціц Канстанцін Паклонскі, якога і да вайны рэкамендавалі цару як лідэра праваслаўнае партыі на Беларусі, як «свайго», пакінуў Магілёў ды з 14 аднадумцамі перайшоў на бок Масквы (аддаўся казакам). Залатарэнка адаслаў яго да Багдана Хмяльніцкага, а ўжо той са сваімі рэкамендацыямі паслаў здрадніка да цара. 22 ліпеня Паклонскі быў у царскай стаўцы пад Смаленскам.

6 жніўня, калі Паклонскі з Ваейкавым былі ў Радамлі, туды прыехаў чавускі поп Васіль з трыма мяшчанамі ды папрасіў «приехать в Чаусов и привесть их к вере». Так здаліся Чавусы. Паклонскі правёў там першы набор у свой полк: папісаў жыхароў і набраў 800 чалавек. Праз колькі дзён у яго была ўжо тысяча «крестьян... с бердышы и рогатины и с пищалми, да конных крестьян со сто человек».

Капітуляцыі вымагала само стано-

вішча, у якім апынуўся Магілёў: адсядзецца не выпадала, а дапамогі чакаць ужо не было адкуль. На вачах у магілёўцаў адбылася трагедыя Амсціслава, які паспрабаваў адбіцца. Вядома было ўжо і пра лёс Друі. Цар жа зрабіў правілам тактыкі: калі горад не прымаў прапановы аб капітуляцыі ды бараніўся, яго бралі штурмам і ўзорна каралі.

25 жніўня Аляксей Міхайлавіч напісаў Паклонскаму, што выслаў на Магілёў ваяводу Шарамецева з войскам, але яно ўжо не спатрэбілася: 28 жніўня Магілёў капітуляваў.

Праз колькі дзён Паклонскі атрымаў новае царскае даручэнне: «... и мыслить бы тебе, как Кричев сговорить и под нашу царскую высокую руку привест». Над горадам ужо даўно «промышляли» ратнікі ертавульнага палка, але авалодаць ім не маглі. Пад уплывам агітацыі «беларускага палкоўніка» (так цяпер падпісваўся шляхціц Паклонскі) крычаўцы, з якімі ён і раней патаемна падтрымліваў сувязь, у канцы верасня таксама здалі горад непрыяцелю. З царскае ласкі яго атрымаў у кіраванне Паклонскі. Яму ж цяпер падпарадкоўваўся Магілёўскі павет і сам Магілёў (да прызначэння маскоўскага ваяводы).

Цяпер апроч Старога Быхава і Дуброўні ў Падняпроўі заставаўся няскораным толькі Смаленск, даўно адрэзаны і зацiснуты жалезным колам аблогі. Занядбаныя ўмацаванні там кінуліся падпраўляць літаральна за месяц да падыходу маскоўскага войска, калі прыехаў інжынер Боналіг. Працавалі ўдзень і ўначы, нават сам ваявода Абуховіч і камендант Корф браліся за ўкладванне дзірвану. Але ці можна за месяц прывесці да ладу муры, вежы, валы, калі тыя не даглядаліся 20 гадоў...

У першыя ж дні аблогі, калі царскія ваяводы ўзяліся абстрэльваць горад з гарматаў і рыхтаваць агульны штурм, стала відаць, што фартэцыя аніяк не прыдатная для доўгае абароны. Ядрамі збівалі зубцы на сценах, прабівалі затворы, трушчылі брамы. Смаленцы будавалі для прыкрыцця зрубы, запаўняючы іх глінай ды каменнем, але і гэта не ратавала. Даводзілася няспынна аднаўляць умацаванні, узводзіць вал унутры замка ды ставіць на ім зрубы. Гэтым займалася ўсё насельніцтва Смаленска. На такія патрэбы разбіралі нават хаты ды іншыя пабудовы.

У глыбіні краіны пра становішча адрэзанага ад усяго свету Смаленска амаль нічога канкрэтнага не ведалі. Хіба дзіўнай сілы патрыятызм мацаваў дух смаленцаў, дазваляючы ім не толькі паспяхова адбівацца, але і прыносіць вялікую шкоду непрыяцелю.

Агляд сілаў паказаў, што чарговага прыступу Смаленск ужо не вытрымае. Людзей ледзь-ледзь хапала, каб паставіць на валы, сцены, вежы, на іншыя пазіцыі, а для рэзерва — зусім не заставалася. Муры ў некалькіх месцах мелі вялікія праломы. Пораху было гадзіны на чатыры актыўнае стральбы. Да таго ж прыйшлі весткі пра разгром войска Радзівіла...

Смаленск быў здадзены 23 верасня 1654 г. Маскоўскае войска ўвайшло ў горад.

Пасля страты Смаленска нядоўга заставалася стаяць і Дуброўні. Ужо ў жніўні ў Дубровенскі павет прыйшлі маскоўскія войскі «...повоевали и села и деревни пожгли, и полон многий поимели», ды адразу ж паспрабавалі захапіць і горад, але не змаглі. Дуброўню абаранялі ў асноўным жыхары горада і ваколіцаў, а рэгулярнага войска тут было зусім мала: «мещан де хорунг з десять, жидов хорунг з десять», ды «казаков две хорунги ж, венгров хорунга, гайдуков две хорун-

ги ж». Адбіваючы прыступы, яны ў адказ і самі рабілі вылазкі, бралі палонных. У дапамогу войску ваяводы Куракіна цар паслаў сюды Трубяцкога, затым аблогай займаўся Чаркаскі. Дзеля вялікіх стратаў штурмаваць горад не дазвалялася — толькі здабываць «зажогом и сговором». Па Дняпры прыслалі вялізныя пішчалі — спецыяльна для разбурэння дубровенскіх умацаванняў. На кастрычнік тут зграмадзіліся магутныя сілы, бо Дуброўня ж засталася адной з апошніх незаваяваных царом фартэцый на ўсходзе Беларусі. 5 кастрычніка пад валы горада былі падведзены здраднікі шляхціц Васіль Лаўрынаў і магілёвец Марка Сідорскі, каб угаварыць дубровенцаў паддацца. Але апошнія абстралялі іх і забілі Лаўрынава, а ўвечары зрабілі чарговую вылазку.

За ўпартую непакору Дуброўню чакала ўзорнае пакаранне. Цар даслаў ваяводу Чаркаскаму загад, у якім вызначалася: «как город Дубровна здастца... шляхты лутчие выбрав, прислать к... государю... а достальную шляхту велеть посылать на Тулу, а мещан и уездных людей роздать ратным людям семьями, а город Дубровну выжечь».

Змогшыся, дубровенцы здалі горад 12 кастрычніка 1654 г. Пераможцы выслалі ў царскую стаўку пад Смаленск шляхту, вугорскую пяхоту, гайдуцкага ротмістра і 30 мяшчанскіх сем'яў, астатніх пабралі ратнікі. Гэтак яны вывелі з Дуброўні ўсіх людзей, а 17 кастрычніка падпалілі яе і праз два дні, скончыўшы справу, рушылі далей.

Сагановіч Г. М.

Невядомая вайна. 1654–1667. Мн., 1995. С. 14–26.

Дуброўна пала апошняй

У чэрвені 1654 г. Дуброўну аблажылі рускія войскі князя Куракіна. У складзе гарнізона замка, акрамя шляхты, мяшчан і сялян воласці, была наёмная «угорская пяхота». Атрад Куракіна не мог узяць горад, абаронцы якога мужна супраціўляліся. 7 жніўня, як паведамляў ваявода цару, «выходили из города Дубровна литовские конные и пешие многие люди з знамены и з снаряды, и у них с теми литовскими людьми был бой, на том бою государевы ратные люди литовских многих людей побили и в город вогнали, а Дубровенский уезд повоевали, и села и деревни пожгли и полон многий поймали». У тым баі быў паранены акольнічы і ваявода князь В. П. Львоў. Хоць стольнік і ваяваў з ратнымі людзьмі, загадана было «за их службу похвалить» і рэкамендавана на літоўскіх людзей «промышлять сколько милосердный Бог помощи подаст», стала зразумелым, што атраду Куракіна Дуброўну не ўзяць. Яго адклікалі ў Смаленск, накіраваўшы сюды замест войска князя Я. К. Чаркаскага, якому ўказвалася Дуброўну здабываць «зажогом и сговором, всякими обычаи, а приступать не велено»[1]. 13 верасня абложаныя ў замку зноў выходзілі на вылазку, якая з цяжкасцю была адбіта. Пасля гэтага рускае камандаванне прыняло меры для таго, каб гарантаваць бяспеку свайго войска і ўзмацніць яго агнявую магутнасць. Насупраць замка быў зроблены «земляной городок», у якім размясцілася войска. Са Смаленска пад Дуброўну накіравалі «...рекой Днепром в судах и на плотах наряд 2 пищали галанские по 1 пуду 15 гривенок ядро, да русского литья пищаль Соловей ядро в 25 гривенок, пищаль Левик — ядро в 15 гривенок, с станы и с колесы и с волоками и с конаты, да к тем же пищалям по 100

ядер, да пушечных запасов 200 пуд, зелья пушечного 5 пуд, зелья ручного, на нарядные мехи 500 аршин холста, на пыжи 10 пуд пеньки, 4 пуда фетилю». Дастаўлены нарад паставілі ў земляным горадзе, адкуль пачалася бамбардзіроўка дубровенскіх умацаванняў[2].

Нягледзячы на тое, што ў першыя дні кастрычніка пад Дуброўнай былі сабраны буйныя сілы рускіх войскаў, іх камандаванне ашчаджала сваіх людзей і прымала розныя меры, каб схіліць гарнізон і мяшчан горада здацца без залішняга кровапраліцця. Масіраваная бамбардзіроўка замка пажаданых вынікаў не дала. Пасля гэтага была зроблена спроба актыўнага ідэалагічнага ўздзеяння на жыхароў Дуброўны рознага веравызнання з дапамогай святароў, прывезеных з раней занятых гарадоў Копысі, Шклова і Оршы, а таксама мяшчан і шляхты Копысі і Магілёва. Пад Дуброўну прыбылі арганізатары здачы рускім войскам Копысі копыскі пратапоп Антоні, Шляхціц Васіль Лаўрынаў і мешчанін Якаў Багданаў «со товарищи». З Магілёва прыбыў ігумен Куцеінскага манастыра Іоіль Труцэвіч са шматлікаю «братьею», якія раней распрапагандавалі і схілілі да здачы мяшчан Магілёва. Адначасова пад Дуброўну былі накіраваны «шкловские доминикане к римскому духовенству, а от жиды к жидам листы з заруками, чтоб дубровенские осадные сидельцы государю добили челом и город здали». У самой Дуброўне вёў прапаганду мясцовы пратапоп Дзміцер Палікарпаў, які «дубровенских людей, шляхту и мещан и всяких чинов людей, по многое время уговаривал, чтоб они город сдали без кровопролития»[3]. Дэлегацыю суправаджаў «для абереганья» вайсковы атрад Трафіма Адгібалава «с дворяны и бояре». 5 кастрычніка на перамовы да сцен замка паслалі «...Василия Лаврова (Лаўрынава — *М.Т.*), могилёвского мещанина Марка Сидорского. И дубровенские сидельцы, приняв их к городу, того Василия убили из пищали до смерти, а мещанин Марка побежал. Вечером того же дня дубровенские сидельцы учинили вылазку на пеших людей, которые были под городом в городке»[4]. Але ў гэты час да Дуброўны падыходзілі перадавыя атрады рускага войска князя А. Н. Трубяцкога, якое дапамагло адбіць нападзенне.

Цара раздражняла супраціўленне Дуброўны, якая разам са Старым Быхавам заставалася адзіным горадам на верхнім цячэнні Дняпра, што не дазваляла рускім гарантаваць бяспеку Смаленска і ўсяго левабярэжжа Дняпра. А. Н. Трубяцкой і іншыя ваяводы з войскам, пасланыя да Дуброўны, мелі цвёрдую ўстаноўку і план далейшых дзеянняў, каб «с нашими ратными людьми шли под Дубровну..., и над Дубровной промышляли сколько милосердный бог помощи даст»[5].

Між тым «дубровенские сидельцы», бачачы прыход новых рускіх войскаў, каб засцерагчыся ад нечаканага штурму і здрады, засыпалі вароты зямлёй і падрыхтаваліся да далейшай аблогі, не страціўшы надзею атрымаць дапамогу ад войскаў гетмана Радзівіла. Аднак вера ў гэтую дапамогу з кожным днём слабела, а намеры рускіх войскаў, да якіх 6 кастрычніка падышлі і «на приступ изготовились» асноўныя палкі А. Н. Трубяцкога, не пакідалі сумненняў. Знаходжанне ў абложаным горадзе вялікай колькасці цывільнага насельніцтва, жанчын і дзяцей, цяжкасці з харчаваннем прымусілі кіраваўшага абаронай горада Шляхціца Храпавіцкага пачаць перагаворы пра ўмовы здачы. Як пісалі ў адпісцы цару князь Я. К. Чаркаскі і баяры, «...октября 11 числа выходили к ним из города Дубровны шляхта

Граповецкий с товарищи да мешчане белорусцы 17 человек и говорили, чтоб с ними об городской сдаче говорили, и они бояре и воевода дубровенцам говорили, чтоб они добили челом государю и город здали, как иные многие польские и литовские люди государю добили челом и города здавали, а на себя большой крови не навели б»[5].

Пагадненне было дасягнута 12 кастрычніка, калі «...дубровенские литовские люди добили челом и город здали и ворота отсыпали». Пасля гэтага абложаныя «...с благочестивыми священниками с образами, а шляхта и желдаки, и мещане всяких чинов служилые люди и жилецкие люди... их, бояр и воеводы встретили... за городом с хлебом». Ваяводы, якія ўехалі ў горад, «дубровенских осадных сидельцев и наряд, и зелье, и свинец велели переписать»[6]. Лёс дубровенцаў цар вырашыў яшчэ раней ў асобным указе Я. К. Чаркаскаму: «...как город Дубровна здастца, и... шляхты лучших людей выбрав, прислатьк... государю, ... а достальную шляхту велеть посылать на Тулу, а мещан и уездных людей раздать ратным людям семьями, а город Дубровну выжечь». Гэты ўказ Я. К. Чаркаскі выканаў. У царскую стаўку ў Смаленск была адпраўлена палонная шляхта, угорская пяхота, гайдуцкі ротмістр, 30 сем'яў лепшых мяшчан, яўрэі. 17 кастрычніка Дуброўна была спалена, а ўсё палоненае насельніцтва выводзілася ў рускія землі. Прыняццем такіх суровых мер рускі ўрад хацеў пакараць горад, які ўпарта супраціўляўся, каб застрашыць іншыя беларускія гарады. Адначасова здавальняліся інтарэсы рускіх служылых людзей, паколькі ім дазвалялася браць сялян і мяшчан у палон[7].

Між тым далейшы ход ваенных дзеянняў паказаў бяссэнсавасць і пастлівасць знішчэння ўмацаванняў у Дуброўне. Зімой войскі Рэчы Паспалітай перайшлі ў контрнаступленне і занялі Копысь, Оршу, затым і Дуброўну, умацаваўшыся тут і «отняв», такім чынам, шлях да рускіх па Дняпру. Каб ачысціць гэты шлях, быў сфарміраваны вялікі атрад на чале са стольнікам і ваяводай Ф. Л. Замятняй. Ужо ў красавіку 1655 г. цар накіраваў яго ў Дуброўну з ратнымі людзьмі, каб ён размясціўся «...в земляном городе и жил бы еси в Дубровне с великим береженьем и Божьим и нашим делом промышлял неоплошно». Ваяводзе было прадпісана аднавіць умацаванні. Аднак перад тым трэба было выбіць атрад войскаў, якія заселі ў Дубровенскім спаленым горадзе. Адбыўся бой ля млына на Дуброўне і на беразе Дняпра, пасля якога праціўнік адышоў да Куцеінскага манастыра пад Оршу. Рускія ратнікі пачалі спешна ўзводзіць умацаванні. У адпісцы цару Ф. Л Замятня паведамляў, што «...по твоему указу пришол я... с твоими ратными людьми к Дубровне сделать земляной город и ров около города копал, и строг поставил, и всякие крепости учинил, и к тому городе чертеж послал к тебе. А мерою коло тово города и острога 256 сажень, да к острогу готового государь, острожку к раскату 81 сажень». Пакінуўшы ў Дуброўне полк Ф. Траферта, Ф. Л. Замятня са сваімі людзьмі рушыў з горада»[8].

У наступныя гады Дуброўна як бы засталася ў баку ад ваенных падзей. Тут пастаянна знаходзіўся толькі нязначны гарнізон рускіх войскаў у 40 чалавек. Сітуацыя садзейнічала паступоваму аднаўленню жыцця горада. У 1655 г. дубровенскі пратапоп Д. Палікарпаў, пасланы пасля здачы горада па царскаму ўказу ў Магілёў, пісаў адтуль цару, «...что здесь он всякую нужду терпел и ныне я... скитаюсь

меж двор без приюту разорен в конец». Ён прасіў цара грамату на пабудаванне ў Дуброўне царквы і аб засяленні горада, каб можна было з чаго «кормиться». Грамата гэтая была выдадзена, аднак справы пратапопа рухаліся дрэнна. Яшчэ ў 1661 г. Дуброўна мела сумны выгляд. Аўстрыйскі дыпламат барон А. Меерберг у сваіх дарожных нататках адзначаў: «...8 чысла верасня... праехалі па Дняпру... Дуброўну, раней горад Мсціслаўскага ваяводства, а цяпер Віцебскага. Ён узвышаецца на абодвух берагах ракі ў 80 вярстах ад Смаленска, і калісьці меў вялікае мноства збудаванняў, а цяпер бедствамі разбураны з часоў Маскоўскай вайны з велізарнымі стратамі ў маёмасці для яго ўладальніка Георгія Карла Глябовіча»[9].

Ваенныя дзеянні канца вайны зноў «внивеч обернули» адроджаны горад[10].

Цераз 11 гадоў пасля падпісання Андрусаўскага перамір'я, у верасні 1678 г., праз Дуброўну праязджаў і адпачываў тут дыпламат Бернгард Танер, які адзначаў, што горад паступова прыходзіў у сябе пасля вайны[11].

У канцы XVII ст. Дуброўна пераходзіць ад Глябовічаў да Казіміра Сапегі — гетмана польнага Вялікага княства Літоўскага і віленскага ваяводы. Паколькі ў гады паўночнай вайны Сапегі былі на баку шведаў, Дуброўну разам з замкам занялі і спалілі калмыкі спецыяльнага атрада рускага капітана Салаўёва. Некаторы час горад і навакольныя вёскі былі ўласнасцю паплечніка Пятра I князя А. Д. Меншыкава. Пасля Паўночнай вайны Сапегі зноў сталі ўладальнікамі Дуброўны.

У 1712 г. ў Дуброўне замка не было. Тут стаяў толькі «двор», загароджаны новым дубовым штыкетам і часткова папраўлены старым. Мелася ўязная брама, на момант складання інвентару яшчэ не скончаная і не пакрытая. Пляцоўку «двара» займалі гаспадарчыя і жылыя пабудовы[12]. Пазней, у 30-я гады XVIII ст., замак усё ж аднавілі, і ён праіснаваў да 1772 г.

Г. Сагановіч.

1. РДВА. Ф. 210. Разрядный приказ. Новгородский стол, стб. 212. Л. 104, 106, 167.

2. РДВА. Севский стол, стб. 157. Л. 263, 230, 131.

3. РДВА. Московский стол, стб. 262. Л. 86—88; АМГ. Т. 2. С. 441.

4. РДВА. Московский стол, стб. 262. Л. 88.

5. Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. С 48; ЦДАСА. Ф. 210. Разрядный приказ. Московский стол, стб. 263. Л. 117.

6. РДВА. Ф. 210. Новгородский стол, стб. 212. Л. 54.

7. Там жа.Л. 52—55.

8. РДВА. Ф. 210. Московский стол, стб. 254. Л. 225—226; Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. С. 49.

9. РДВА. Ф. 210. Разрядный приказ. Московский стол, стб. 254. С. 116; стб. 274. Л. 204; стб. 262. Л. 73; стб. 254. Л. 90, 116, 134 об.

10. АМГ. Т. 2. С. 441; Т. 3. С. 106, 109; Путешествия в Московию барона Августина Майерберга. ОИДР при Московском университете. Кн. 3. М., 1891. С. 119.

11. АВАК. Т. 34. С. 329.

12. Бернгард Т. Описание путешествия польского посольства в Москву в 1678 г. ЧОИДР при Московском университете. Кн. 3. М., 1891. С. 119.

Сагановіч Г. «Спадчына». 1993, № 3. С. 98—110.

Дакументы сведчаць

З ЦАРСКАГА РАСПАРАДЖЭННЯ АДНОСНА ДАНЯСЕННЯ ВАЕЙКАВА І ПАКЛОНСКАГА

1654 г., 25—27 ж н і ў н я

...Бьет челом государю из Орши лавник Сава Иванов сын Казин, да посадцкой человек Володимер Тимофеев: как был в Орше гетман Януш Радивил, и он де их разорил и розграбил, и они де остаточные свои животы и всякую рухлядь и платные и заемные кабалы и всякие крепости из Орши вывезли в Дубровну и поставили у протопопа Дмитрия Поликарпова. И государь бы ево пожаловал, велел им дать свою государеву грамоту к боярину и воеводам, ко князю Якову Куденетовичю Черкаскому с товарыщи: как город Дубровну под государеву высокую руку покорять и всякие крепости и кабалы сыскав им отдать. Дать грамота к бояром: как город Бог поручит государю, и те животы ево, спору не будет, взяв у протопопа, отдать ему с росписко́ю.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России.
Т. 14. С.-Петербург, 1889. С. 285, 286.

ГРАМАТА З ЦАРСКАГА СТАНА ПАД СМАЛЕНСКАМ ПАЛКАВОМУ ВАЯВОДЗЕ Я. К. ЧАРКАСКАМУ АБ ПРЫЗНАЧЭННІ Ў ЯГО ПОЛК МАГІЛЁЎСКАГА ЛЕКАРА Н. ЗАРЭЦКАГА

1654 г., 16 к а с т р ы ч н і к а

От царя и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великие и Малые Росии самодержца, бояром нашим и воеводам князю Якову Куденетовичю Черкаскому с товарищи.

Бил нам челом Могилева города лекарь Миколай Зарецкой: по нашему де указу велено ему быть в Смоленску для лечбы наших ратных людей, а животы де ево и лекарства всякие ныне в Дубровне, и нам бы ево пожаловать, для ево животов и всяких лекарств велети отпустить в Дубровну. И по нашему указу лекарю Миколаю Зарецкому велено быти у вас в полках для лечбы наших ратных людей, покаместо нам, великому государю, бог поручит город Дубровну.

И как к вам ся наша грамота придет, и вы лекарю Миколаю Зарецкому велели быть на нашей службе с собою для лечбы наших ратных людей. А как нам, великому государю, бог поручит город Дубровну, и вы Миколая Зарецкого для ево животов и всяких лекарств велели отпустить в Дубровну, а из Дубровны велели б есте ево отпустить в Могилев, да о том к нам отписали.

Писан на нашем стану в Смоленску лета 7163-го октября в 16 день.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 320.

З ЛІСТА ПАЛКОЎНІКА КАНСТАНЦІНА ПАКЛОНСКАГА АБ НАБОРЫ ЯГО СОТНІКАМІ КАЗАКАЎ

1655 г., 10 с т у д з е н я

Список с белорусского листа. Костянтин Поклонскій, полковник его царского величества белорускій. Всем вопче и всякому особно, кому о том ведати належит, а имянно, войску его царского величества всяким людем, конным и пешим, ведомо чиню, что приказал я паном сотником моим, се есть пану Демиду Рагозе и пану Федору Ондреевичю, людей на услугу его царского величества в городе Кадине и в Романове призывати, и во всем уезде Дубровинском которые сотники, чтоб никаковы помешки ни от кого не имели. К сему тем же сотником моим приказываю быть на залозе в Кадине и в Романове, которым чтоб подданные тамошніе во всем послушны были, что всякого чину мірского и духовного людем и тем же охотником моим повелеваю по проступку всякого наказывать. Писан в Могилеве, лета 1654, месяца ноября 26 дня.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 14. С.-Петербург, 1889. С. 481.

З ДАНЯСЕННЯ ПАЛКАВОГА ВАЯВОДЫ З. Ф. ЛЯВОНЦЬЕВА Ў ЦАРСКІ СТАН У СМАЛЕНСКУ

1655 г., 15 м а я

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичу, всеа Великия и Малыя Росии самодержцу, холоп твой Замятенка Левонтьев челом бьет.

В нынешнем, государь, во 163 году маия в 11 день прислана твоя государева царева и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя Росии самодержца, грамота ко мне, холопу твоему. А в твоей государевой грамоте написано: велено мне, холопу твоему, с твоими государевыми ратными людьми из Дубровны итти в Копось, а в Дубровне, государь, велено оставить полковника Фрянца ево полку с начальными людьми и с солдаты и велеть ему жить с великим береженьем; а что у меня, холопа твоего, учнет в дороге делатца, или от ково какие вести объявятца, и которово, государь, числа в Копось приду, и о том мне, холопу твоему, к тебе, государю, отписать.

И тово ж, государь, числа по твоему государеву указу пошол я, холоп твой, из Дубровны, а полковника, государь, Фрянца с ево начальными людьми и с солдаты оставил в Дубровне и приказал, государь, ему в Дубровне жить с великим береженьем. И тово ж, государь, числа пришол я, холоп твой, с твоими ратными людьми под Оршу.

На л. 88 помета: Государю чтена. И жить с великим береженьем. И кое учинились под нашею государевою высокою рукою, тех мещан и уездных людей оберегати. И кто по нашему указу в Дубровну пришол, и в православную веру приведен, и приставов дать для береженья и про литовских людей проведывать послал, — и то учинил добро, и впредь жить з береженьем и …, где доведеца, сторожи поставить, и в лотках по причиным местам велеть ехать за (.....), и чтоб судов не пускали и на сю сторону не переходили.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 338, 339.

ВЫПІСКА З «ПОЛОНЯНИШНЫХ» КНИГ ХАЛОПСКАГА ПРЫКАЗА

1658 г., 12 с а к а в і к а

…Полоняник роспрашиван, а в роспросе сказал: зовут де ево Обрашком, родом жидовин, а во крещенье Васька Михайлов сын, города Дубровны, а полонили ево люди окольничего князя Бориса Ивановича Троекурова в прошлом во 163 году, и с тех мест и по се число все живет у окольничего князя Бориса Ивановича и впредь жить хочет. Васька в лице продолговат, нос прям, глаза красно-серы, волосом голова руса, сказался 13-ти лет.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 385—387.

З ПЕРАПІСУ «ЛИТОВСКИХ» ГАНДЛЁВЫХ І РАМЕСНЫХ ЛЮДЗЕЙ, ШТО ЖЫВУЦЬ У ДВАРЦОВЫХ СЛАБОДАХ МАСКВЫ

1658 г., в е р а с е н ь

Роспись иноземцом, которые живут на Москве в государевых дворцовых слободах и хто чем торгует.

В Барашской слободе:

На Михайловском дворе свечника живут города Дубровны Мосейко Аврамов да Витепска города Дмитрейко Иванов, кормятца христовым именем; на Микифоровском дворе мыльника живет вспевака Василей Иванов сын Пятницын; во дворе гостиные сотни Мелентья Кислицына живут Дубровны города Ефимко да Филька да Илюшка да Микишка Олесеевы, торгуют мясным промыслом; во дворе Ивана оловяничника живут иноземца капитана Василья Гриневского жена Настасья Стефанова, муж ее Василей ныне на государеве службе в Тонбове; во дворе Корзина живут паньи Анна Иванова дочь Павлова жена Каштерова да Оксинья Ондреева дочь Офонасьева жена Решнова, а мужья их на государеве службе в Белегороде, да в том же дворе живет Дубровны города Данилко Степанов, торгует хлебом.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 400.

З ПЕРАПІСУ «ЛИТОВСКИХ» ГАНДЛЁВЫХ І РАМЕСНЫХ ЛЮДЗЕЙ, ШТО ЖЫВУЦЬ У МАСКВЕ НА ПАСАДЗЕ

1658 г., 26 верасня

167-го сентября в 26 день. По указу великого государя царя и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержца, и по грамоте переписывано в черных сотнях и в слободах иноземцов польских и литовских людей, и хто в которой сотне и в слободе живут своими дворами и на пустых дворех и в соседех и в захребетниках и в гулящих людех, и в каком чину, и какими товары и сшепетиньем торгуют. И тому роспись:

В Дмитровской же сотне Дубровны города:

Янка Петров, лекарь, да зять ево Янка Ларионов, делают нашивки золотные, а живут в выморочном дворе.

В Мяснишной полусотне Дубровны города мещаня:

Ермолка Михайлов сын, портной мастер; Нестерка Иванов сын, мясник; Кузька Павлов сын, мясник; Спиридонка Артемьев сын, мясник; Макейко Юрьев сын, сапожник; Ивашко Спиридонов сын, мясник; Гришка Спиридонов сын, мясник; Ермолка Степанов сын, мясник; Костька Михайлов сын, мясник; Лучка Назарьев сын, мясник; Левка Лукьянов сын, мясник; Васька Сидоров сын, мясник; Оська Семенов сын, мясник, живет своим двором; Алешка Григорьев сын, мясник; Сенька Лукьянов сын, мясник; Стенька Лукьянов сын, мясник, живет в надворничестве; Ерофейко Михайлов сын, сапожник; Савка Павлов сын, мясник; Васька Афонасьев сын, мясник; Левка Конша, портной мастер, живет в захребетниках; Ермолка Григорьев сын, мясник; Алферка Яковлев сын, мясник; Ивашко Сологубов сын, мясник; Андрюшка Сологубов сын, мясник; Андрюшка Сидоров сын, мясник; Алешка Федоров сын, мясник; Ивашко Иванов сын, мясник; Ермолка Иванов сын, мясник.

Ат дубровенца, опричь Оськи и Стеньки, живут все на выморошных тяглых дворех.

В Новосеменовской слободе Дубровны города мещаня:

Павлик Леонтьев сын, нашивочник; Аврамко Наумов сын, кузнец; Мартынко Иванов з детьми, да у нево ж живут Федька да Осипко Аврамовы дети, кузнецы; Гришка да Савка Ильины дети, овчинники; Павлик Михайлов сын, мясник; Федька Никитин сын, хлебник; Мишка Карпов сын, хлебник; Янко Офонасьев сын, сапожник; Федька Андронников сын, сапожник. А жевут в выморочных в тяглых дворех.

В Покровской сотне Дубровны города мещаня:

Игнашко Обросимов сын, хлебник; да Фомка Михайло(в) сын, мясник, живут в выморочных дворех; да Копося города мещанин Микифорко Иванов сын, скорняк, да Якушко, скорняк, живут на выморочных дворех.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 401—405.

З ПЕРАПІСУ «ЛИТОВСКИХ» МАСЦЕРАВЫХ ЛЮДЗЕЙ, ШТО ЖЫВУЦЬ У ПУШКАРСКАЙ СЛАБАДЗЕ МАСКВЫ

1658 г., верасень

В Пушкарском приказе в зеленых мастерах и в подмастерьях дубровенцы:

В мастерах — Григорий Ларионов, Кашпир Григорьев; подмастерьи — Ивашко Григорьев, Онисимко Игнатьев, Сергушка Кашпиров, Стенька Кашпиров. А живут они в Пушкарской слободе своими дворами, купя пушкарские дворы.

Да по скаске пушкарей Алешки Скрылева с товарыщи всего приказу в их Пушкарской слободе живут в соседстве иноземцы ж дубровенцы:

В Маркове дворе Андреева Перфилка Иванов; в-Ысачкове дворе лучинника Ивашка Иванов; в Сергушкине дворе Павлова Иевка Артемьев з Гор. А работают они все 3 человеки у зелейного уговорщика у иноземца у Давыда Бахерахта из найму, делают зелье.

А опричь тех иноземцев в их слободе иных нет.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 405.

ДАНЯСЕННЕ СМАЛЕНСКАГА ВАЯВОДЫ Ф. Ф. КУРАКІНА Ў РАЗРАДНЫ ПРЫКАЗ АБ КОЛЬКАСЦІ БЕЛАРУСКІХ МЯШЧАН І СЯЛЯН, ПАСЕЛЕНЫХ У СМАЛЕНСКІМ І ІНШЫХ УЕЗДАХ

1665 г., м а й

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичю, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержцу, холопи твои Федька Куракин с товарыщи челом бьют.

В нынешнем, государь, во 173 году мая в 3 день в твоей великого государя царя и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержца, грамоте из Розряду за приписью дьяка Федора Грибоедова писано к нам, холопем твоим:

В нынешнем, государь, во 173 году в розных месяцех и числех послано в Смоленеск к нам, холопем твоим, из Дубровны ис полков боярина и воевод князя Юрья Алексеевича Долгоруково с товарыщи с смоленским стрельцом Борисова приказу Бобаева с Максимком Елизарьевым да с Смоленскими мещаны с Федькою Васильевым с товарыщи дубровенских и оршанских мещан и Дубровинского уезду пашенных крестьян з женами и з детьми 619 человек. И о тех, государь, мещанех и о крестьянех к тебе великому государю, велено нам, холопем твоим, отписать: все ль они в Смоленску налицо и как построены? И велети б их построить на пашне, где доведетца, и ото всяких обид оберегать. А где, государь, мещаня и крестьяня будут построены, и о том к тебе, великому государю, велено нам, холопем твоим, по тому ж отписать.

И в нынешнем, государь, во 173 году сентября в 17 день писали к нам, холопем твоим, из Дубровны боярин и воеводы князь Юрьи Алексеевич Долгоруково с товарыщи и прислали в Смоленск Борисова приказу Бобаева с стрельцами с Максимком Елизарьевым да с смоленскими мещаны с Федькою Васильевым да с Ондрюшкою Федоровым с товарыщи дубровенских и оршанских мещан и тем мещаном да Дубровенского уезду крестьянам список за приписью диака Офонасья Зыкова. А в отписке, государь, их написано, что тех мещан и крестьян отпустили они в Смоленск из Дубровны по их челобитью для селидьбы в Смоленском уезде в твоих великого государя дворцовых волостях. И по списку, государь, каков список прислали к нам, холопем твоим, из Дубровны боярин и воеводы князь Юрьи Алексеевич Долгоруково с товарыщи, написано дубровенских мещан 77 семей, а в тех семьях 266 человек; оршанских мещан 46 семей, а людей в них 181 человек; Дубровинского уезду пашенных крестьян 16 семей, а людей в них 66 человек, да Могилевского уезду 1 человек крестьян, да из Орши Кутеинского девича монастыря и волосных крестьян и вдов з детьми 15 семей, а в тех семьях 60 человек. И всего, государь, по тому списку дубровинских и оршанских мещан и Дубровинского и Могилевского уездов и Кутеинского девича монастыря крестьян и вдов з детьми написано 155 семей, а в тех семьях людей 574 человека. А в Смоленеск, государь, тех дубровинских и оршанских мещан пришло и на смотре объявилось налицо: дубровинских мещан 37 семей, а людей в них 131 человек; оршанских мещан 29 семей, а людей в них 113 человек; всего, государь, дубровинских и оршанских мещан пришло в Смоленеск и на смотре объявилось налицо 66 семей, а людей в них 244 человека. И ис того, государь, числа живут в Смоленску на посаде дубровинских и оршанских мещан 29 семей.

Да марта, государь, в 4 день по твоему великого государя царя и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержца, указу и по грамотам ис приказу Большаго дворца послано из Смоленска в Колугу с смольнянином с Васильем Красенским да с сотником смоленских стрельцов с Михайлом Прикаскиным тех же дубровинских и оршанских мещан в воловники и в винокуры 35 семей, да ис Смоленска, государь, перешли жить в Дорогобуж дубровинских же мещан 2 семьи. И всего, государь, дубровинских и оршанских мещан, которые живут в Смоленску на посаде и в Дорогобуже, и которые посланы в Колугу в воловники и в винокуры, 66 семей. А против, государь, списка боярина и воевод князя Юрья Алексеевича Долгоруково с товарыщи дубровинских и оршанских мещан в Смоленеск не пришло 57 семей, а людей в них 203 человека. А Дубровинского, государь, и Могилевского уездов и Кутеинского девича монастыря и волосные пашенные крестьяня и оршанские вдовы з детьми, которые в списку боярина и воевод князя Юрья Алексеевича Долгоруково с товарыщи написаны имяны, в Смоленеск не бывали и на смотре не объявились. И Дубровинского, государь, уезду про крестьян дубровинской войт сказал, что тех крестьян 7 семей, догнав на дороге от Дубровны в 20-ти верстах против села Гончарова, полку боярина и воеводы князя Юрья Алексеевича Долгоруково дворянин, а как ему имя и чей словет, того он не ведает, ис стругов взял к себе; а достальные де, государь, Дубровинского уезду крестьяня остались в Смоленском уезде в селе Сырокоренье и в Кузине и в-ыных селех и в деревнях. А Кутеинского, государь, девича монастыря и про волосных оршанских крестьян и про вдов з детьми тот же войт да оршанской мещанин Емелька Онтонов сказали, что тех кутеинских

крестьян боярин и воевода князь Юрьи Алексеевич Долгоруково по челобитью того монастыря игуменьи с сестрами отдал им во крестьяня по-прежнему; а волосные де, государь, крестьяня и вдовы з детьми из Орши в Смоленеск не бывали ж.

Да с Васильем ж, государь, Красенским и с сотником с Михайлом Прикаскиным в той же посылке послано из Смоленска в Колугу в воловники ж и в винокуры дубровенских же и оршанских мещан и пашенных крестьян, которые приходили в Смоленеск после присылки дубровенских и оршанских мещан порознь сами, а имян их в списку боярина и воевод князя Юрья Долгоруково с товарыщи не написано, да с ними иных городов и розных сел и деревень крестьян же, 65 семей.

Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 472—474.

З ПЕРАПІСУ, СКЛАДЗЕНАГА Ў ЗЕМСКІМ ПРЫКАЗЕ, БЕЛАРУСКІХ РАМЕСНІКАЎ І ГАНДЛЁВЫХ ЛЮДЗЕЙ, ШТО ЖЫЛІ Ў УВАСКРАСЕНСКІМ МАНАСТЫРЫ І ПАДМАСКОЎНЫМ ПАЛАЦАВЫМ с. ТАЙНІНСКІМ

1668 г. 9(?) красавіка

Мещаня ж отданы в Покровскую сотню.

Фомка Михайлов сын, прозвище Козел, Дубровны города мещанин. Жена у него Овдотьица, детей у него Куземка 10 лет, Федорка 15 лет, Овдотьица 2 лет, Анница 10 недель. Живет на своем купленом дворе, а торгует один рыбою на старом гостине дворе. А долгу на нем и иных никаких промыслов нет.

Ермошка Степанов, того ж города мещанин. Жена у него Прасковьица, детей у него Петрушка 9 лет, Максимко 2 лет, да Фимка 5 лет. Живет в Покровской сотне на своем дворе. Да у него ж живет зять ево, Борисова города мещанин Тишка Семенов, зелейного дела подмастерья, з женою своею Федоркою. Да у него ж живет нищий, бывал Орши города мещанин. Ивашко Шашка з женою своею Наською. А торгует он, Ермошка, з зятем своим с Тишкою на Покровке мясом. А иных никаких промыслов и долгу на нем нет.

Пашка Яковлев сын Ерпелев, того ж города мещанин. Жена у него Палашка, дети у него Якушко году. Да с ними же живет мать ево Катеринка да сноха // ево вдова Настасьица: у Настасьицы дети Васька 5 лет, Ондрюшка 3 лет. Живет он, Пашка, на своем купленом дворе, торгует на Покровке в мясном ряду. А иных промыслов и долгу нет.

Алешка да Тимошка Григорьевы дети Гейковы, того ж города мещаня. У Алешки жена Марьица, детей у него Алимпейка 11 лет, Пашка 10 лет, Офросиньица 4 лет. У Тимошки жена Федосьица, у него ж дочь Оринка полугода. А живут они, Алешка и Тимошка, в Покровской сотне своим двором, а торгуют на Стретенке в мясном ряду. А иных никаких промыслов и долгу нет.

Сенька Лукьянов сын Гирин, того ж города мещанин. Жена у него Агашка, детей у него Анница 7 лет, Марфица 10 недель. Живет в Покровской сотне своим двором, а торгует на Покровке в мясном ряду...

Ганька Данилов сын Корнилов, того ж города мещанин. Жена у него Дарьица, у него же сын Кондрашко 13 лет. Живет на дворничестве у Игнатья Вердеревского, а кормитца — печет и продает хлебы. А иных никаких промыслов и долгу на них нет. //

Филька Алексеев сын Сукин, того ж города мещанин. Жена у него Марьица, детей у него Васька 5 лет, Васька 3 лет, Игнашко 10 недель, Овдотьица 10 лет. Живет Филька на дворничестве у князя Никиты Болховского, а кормитца — печет и продает хлебы. А иных никаких промыслов и долгу на них нет.

Федосьица Иванова дочь, вдова, того ж города мещанская жена. Детей у ней Оська 13 лет, Юрка 12 лет, Лучка 7 лет, Ондрюшка 4 лет, дочь Оринка году. А живет она своим двором, кормитца — делает сапожное. А иных никаких промыслов и долгу на ней нет.

Мещаня ж, которые отданы в Мясницкую полусотню.

Сіла Калацінскі	1/6	10	-	-

Сума

На гэту першую частку свяшчэннікаўскіх вольных моргаў 2... платных моргаў 18 1/3 1/4/26, а ў пусце моргаў 2/43/2 1/2.

Імёны мяшчан	Валокі	
	Платныя	Пустыя
Валокі пасады Заднепрскай		
Па Лукіане Скарабагатым	-	1
Па Сазоне Сімановічу	-	1
Па Матвею Санковічу	-	1/2
Па Івану Апотку	-	1/2
Па Раману Жарнаўцу	-	1/2

Імёны мяшчан	Валокі	
	Платныя	Пустыя
Па Петраку Ляўчонку	-	1
Па Мікіце Паўлюшыным	-	1/2
Па Карпу Чапцу	-	1/2
Давід Галавен	1/2	-
Карп Чапчонак	1/2	-
Пятрок Дрывіцкі	1/2	-

Таго ж валокі 1/2 да другой часткі адлучана

Іван Несвітаеў	1	-
Фёдарава ўдава	1/2	-
Амельян Брэзгуноў	1/2	-
Кандрат Федзькоў Беднар (бачар)	1	-
Максім Лазараў	1	-
Па Ляўку Іллюшыным	-	1
Па Ваську Азаронку	-	1/2
Па Іване Голеню	-	1
Па Ярмоле Логвіне	-	1
Па Сцяпане Сладоўніку	-	1/2
Па Харку Маскалю	-	1/2
Па Дзямідзе Вабенку	-	1
Па Аннані Свіраку	-	1/2
Па Андрэю Івановічу	-	1
Па Іване Жуку	-	1/2
Па Кандраце Свірыдавым	-	1/2
Па Грышку Картузе	-	1/2
Па Міхалку Кавалю	-	1/2
Па Грышку Аўчынніку	-	1/2
Раман Батукалін	1	-
Іван Ратчонак	1	-
Па Халімоне Васілевічу	-	1
Па Ігнаце Печачовым	-	1/2
Па Даніле Літвіне	-	1/2
Яраш Леўчонак	1	-
Даніла Калацінскі	1/2	-

Таго ж валокі 1/2 да другой часткі адлучана

Войцех Сімашкаў	1/2	-

Васка Барысавага валокі 1/2 да другой часткі адлучана

Па Саўку Ляўчонку	-	1/2
Грышко Пірог	1	-
Іван Пірог	1/2	-
Па Савасцею Фурмалею	-	1/2
Па Сідару Струхару	-	1/2
Астап Баброўнік	1	-
Якім Пірог	1/2	-
Улас Пірагоў	1/2	-
Малах Вераб'ёў	1/2	-
Па Гаўрыле Герасімовічу	-	1/2
Па Іллюшы	-	1/2
Па Іване Сысою	-	1

Сума

На гэту першую частку свяшчэнніка вольных валок 2, належыць валок 34, з іх на плаце валок 13, у пусце валок 21.

Сума на цяперашні 1672 год прыходзіцца на гэту першую частку з места Дуброўна, з Задубровенскай і Заднепрскай пасад чыншу коп 486/8/3, асабліва з арэнды гарэлачнай коп 440, за сенажаці пустыя коп 2.

НАРБ, ф. 3258, воп. 1, спр. 1, л. 1 — 10 адв.

Спіс населеных пунктаў Дубровеншчыны

(з інвентара за 1672 год)



Фрагмент інвентара Савінскага войтаўства з пералікам вёсак

ВОЙТАЎСТВА САВІНСКАЕ:

Сяло Савін
Сяло Бурае
Сяло Халоўе
Сяло Загваздзіна
Сяло Верамеева
Засценак Будзішча
Сяло Міхалінава
Засценак Гласава Карпенін
Засценак Свянцова
Сяло Корабава
Сяло Юкава
Сяло Пецькі
Сяло Барсукі
Засценак ад Негацінскай сцяны адарваны
Сяло Старжынскія
Сяло Бяскі
Засценак Бяскі
Сяло Негацін путных баяр
Засценак Найдзёнаўшчына
Сяло Склётаўшчына

ВОЙТАЎСТВА СКАРАХОДАВА:

Сяло Казарынава
Засценак каля Расасны
Сяло Парфенава
Сяло Дзям'янкава
Сяло Коршакава
Сяло Мікіціна
Сяло Арвяніца
Сяло Лапырова
Сяло Радашкова
Сяло Кісялёва
Сяло Зялескава
Сяло Літвінава
Засценак па-над рэчкай Усвяткай

Засценак Калатоўка
Сяло Лаўкі
Сяло Кабылія
Засценак пад сялом Кабылім
Сяло Гарэлкі
Засценак паміж Гарэлкамі і Іскозамі
Засценак Будзішча
Засценак Купля
Сяло Іскоза
Засценак Маманкіны
Засценак пасля Макарэвіча
Засценак пасля Хамы Масня
Сяло Залатовішча
Служба Катоўшчына
Урочышча Праскорны
Служба Рэдзькіна
Служба Лазараўская
Засценак Фіяноўскі
Сяло Хоміна
Сяло Арловічы
Урочышча Ігрушкі
Займішча Багданаўшчызна
Займішча Перапечына
Займішча Гарошкава
Займішча Коты
Займішча Папкіны
Мястэчка Ляды

КРАПІВЕНСКІ ТРАКТ:

Сяло Махначы
Грунт ад Чубакоўскай мяжы

ВОЙТАЎСТВА ЗАДНЯПРОЎСКАЕ:

Сяло Стражава
Засценак да вёскі Якубава і Пірагам
Засценак Кострыч у Чыжоўскім бару
Сяло Макарава
Сяло Якубава
Засценак Макараўскі
Сяло Ступакі
Урочышча Востраў
Засценак Буда Петрытоўская
Слабада Сялец і Юр'ева
Сяло Бохатава
Новая Зямля
Засценак Камароўскі

Пераклаў з польскай мовы А. Груца.

НАРБ, ф. 3258, воп. 1, спр. 1, л. 11–22.

Пасляваеннае запусценне

«...Рассмотрим изменения в соотношении обрабатываемых и пустующих земель. Этот показатель позволяет наиболее отчетливо проследить эволюцию сельского хозяйства, периоды его упадка, восстановления и дальнейшего развития... В периоды, непосредственно следовавшие после войн середины XVII и начала XVIII в., посевные площади в волостях магнатских вотчин резко сокращались. В Дубровно в эти периоды обрабатывалась только половина всех пахотных земель, а то и менее. Степень запустения в отдельных вотчинах была различной. В то время, когда в Дубровенском графстве в 1672 г. пустовало 73% пахотных земель, в Тимковичах в 1670 г. — только 4%. Многое зависило от случайностей — передвижения войск, распространения эпидемий и т. п.

В результате разорения, массового бегства крестьян резко сокращалась численность хозяйств и наделы оказывались брошенными. В Дубровенском графстве в 1722 г. наряду с брошенными крестьянскими дворами и наделами мы находим крестьян, которые живут на месте, но обрабатывают уменьшенный надел. Например, в д. Чирино Смыковского войтовства из 6 пустующих волок, по нашим подсчетам, более трех волок были оставлены крестьянами, продолжавшими хозяйничать в той же деревне. В д. Ивановичи пустовали две волоки из 11. В д. Быстриевка более половины всех пустошей составляли пахотные земли, ранее принадлежавшие хозяевам, которые хотя и остались на месте, но уменьшили свои наделы.

Однако далеко не всегда оставление крестьянином части надела означало сокращение его посевной площади. В ряде волостей крестьяне, забрасывая одни земельные участки, использовали другие из числа пустовавших. В упоминавшемся Смыковском войтовстве Дубровенского графства в 1722 г. Якуб Звягин держал

1/4 волоки основного надела. Вторую часть волоки он бросил, но взял себе 1/4 из другого участка. Так же поступили Лазарь Козырев, Савка Ловкач и десятки других крестьян.

С наступлением мирного периода, по мере роста населения, увеличения поголовья скота крестьяне восстанавливали прежние посевные площади. Рост используемых пахотных земель наблюдается почти во всех волостях магнатских вотчин начиная с 30-х годов XVIII в.

Расширение крестьянской пахоты было обусловлено не только укреплением крестьянского хозяйства, но и ростом населения. Этот рост имел два источника: естественный прирост, вызывавший деление крестьянских хозяйств, и приток в магнатские вотчины посланцев извне.

В войтовство Побережное Дубровенского графства около 1735 г. прибыли бобыли — «человек сто, а может быть и более». изъявившие желание осесть на земле и платить чинш».

Козловский П. Г.

Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII—XVIII в. Мн., 1969. С. 46, 47, 51.

Дакументы сведчаць

З АПІСАННЯ ВАНДРОЎКІ БЕРНГАРДА ТАНЕРА З ПОЛЬСКІМ ПАСОЛЬСТВАМ У МАСКВУ 9—11 верасня 1678 г.

Обратный путь из Смоленска по Литве

...В дер. Баеве мы ночевали 8-го сентября. Здесь на литовской границе простились с нами пристав и провожатые и поехали назад в Смоленск; а мы к великому удовольствию, по милости всеблагого и великаго Бога, достигли Литвы. Отъехав три мили, достигли дер. Чирина, где обедали. Сделав снова три мили, прибыли в первый литов-ский город Дубровну, принадлежащий воеводе полоцкому, товарищу князя-посла, и потому, по милости ясновельможного владельца, давший передохнуть не столько нам, сколько усталым лошадям 9-го, 10-го и также — день пришелся на воскресенье — 11-го сентября.

Бернгард Таннер.

Пераклаў з лацінскай мовы І. Івакін.

Москва. Университетская типография, Страстной бульвар, 1891. С. 119.

З КОПІІ ПІСЬМОВЫХ КНІГ «СПРАЎ ВЕЧНЫХ» ТРЫБУНАЛА ВКЛ, ВЫКЛАДЗЕНЫХ (АФОРМЛЕНЫХ) У ВІЛЬНІ

1699 г., 29 мая

...І самой яе міласці зацверджаныя і мне ў спакойнае валоданне нерухомай маёмасцю ў будучым пададзенае, нікому не абяцанае, ніякім правам неабмежаванае, у якіх, маючы сілу паводле права ВКЛ, хачу кіраваць і распараджацца, з тых-то маіх маёнткаў і маёмасці, з дому Глябовічаў паходзячых, а менавіта маёнтка, названага Дуброўна, размешчанага ў Аршанскім павеце, па маёй добрай волі, а не з якой-небудзь чужой намовы, выключна дбаючы аб аб'яднанні майго роду (дома) і захаванні пачуцця ласкі, прыхільнасці і ўдзячнасці яснавяльможнага яго міласці пана віленскага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ і самой яе міласці на далейшы час да сябе і майго роду і вяртаючы да дому Глябовічаў, раней адышоўшыя маёмасць і пажыткі, а менавіта той маёнтак Дуброўну старгаванай на вечнасць, беручы суму грошай, як па большай часці павагай і зычлівасцю маей да іх міласцей жадаю, абы той маёнтак Дуброўна, які перад тым заставаўся такім жа непадзельным, так і зараз і потым, і магла заставацца ў адных руках. Аб тым дасканала знесшыся з сабой памянёны маёнтак Дуброўну маёнткі Межава і Рэпухова, размешчаныя ў Аршанскім павеце, якія да таго маёнтка Дуброўны не належаць, толькі сам той маёнтак Дуброўну, сам двор, мястэчка, фальварак, усякія мураваныя і драўляныя будынкі, гумны, вёскі, воласці, подданыя (памешчыкаў) землеўладальнікаў, баяр, іх жонкі, дзеці, пал

палеткі, землеўладальніцкія засценкі, пушчы, лясы, гаі, сенажаці, балоты, азёры, рэчкі, ставы, сажалкі, млыны, корчмы і ўсякія агульныя ў шырокім сэнсе прыналежнасці, як той маёнтак Дуброўна здаўна перад тым існаваў у шырыні, граніцах і іх накірунку, абходах і зараз маецца. Як дасталася мая частка ва ўсім з роўнага падзелу, як у маім валоданні заставалася, так і ў сабе быць павінна, нічога з яе і ні з якой-небудзь рэчы на сябе самога, на братоў, сясцёр, пляменнікаў, блізкіх, кроўных тых і ні на каго іншага не выключаючы, а ні вылучаючы, а, наадварот, адхіліўшы ўсіх тых асоб кроўных, яснавяльможнаму яго міласці пану Казіміру Яну Сапезе віленскаму ваяводзе, гетману ВКЛ, графу Дубровенскаму, Быхаўскаму, Заслаўскаму, і самой яснавяльможнай яе міласці пані Хрысціне Глебавічавай Сапежыне яго жонцы сумесна абадвым іх міласцям за суму ў сто тысяч польскіх злотых добрай манеты на вечнасць прадаю і ўступаю і ўсяго таго, што вынікае з права вечнасці, адракаюся... праз судовага выканаўцу аддаю яе ў валоданне, пасля майго доўгага жыцця дазваляю прымножыць нажытае, а прымножыўшы, нікому ні па якой прычыне не маюць ні вылічваць, ані ажыццяўляць іх міласці самі і пераемнікі іх міласцей на вечныя часы, будуць вольны і маюць моц той маёнтак Дуброўну ўвогуле з усімі да яе прыналежнасцямі, стратамі з пажыткамі ўладаць, кіраваць, траціць, узнаўляць, ашчаджаць, што было б з якіх-небудзь прычын праз каго запісанага, па праву адстойваць вёскі, фальваркі, грунты, якія праз сканаўшых іх міласцей паноў Глябовічаў аказаліся ў закладзе застаўленымі, адкупляць за кошт сваёй казны, каму захочуць даць, прадаць, дараваць, запісаць, замяніць, арэндаваць у заклад тое паводле волі, схільнасці, заўзятасці сваей самі іх міласці і пераёмнікі іх міласцей як пажадаюць будуць мець волю і моц распараджацца, раздаваць, кіраваць, загадваць. Ва ўсім тым ні ў адной рэчы не толькі я сам, але браты, сёстры і блізкія кроўныя мае з гатоўнасцю і надалей ніякай перашкоды чыніць у тое ўмешвацца і ніякай запазычанасці ніколі ні ў чым для сябе з-за карыслівасці дамагацца не маем і мець не можам пад закладам ста тысяч злотых польскіх і з абавязкам выплаты ўзнагароды памянёнаму боку за прычыненыя шкоды. Аб парушэнні грашовага падмацавання згоды, у чым-небудзь таго майго вечнага запісу даю дазвол сябе і кожнага, хто памкнецца турбаваць, прыцягнуць да любога дзяржаўнага суда гарадскога і земскага, трыбунальскага, асэсарскага, падчас да каралеўскага, да каптуровага, усюды выклікаць, куды без усякай адтэрміноўкі, выключэння, адмаўлення, затрымкі функцыянiравання эфектыўна стаць, апраўдацца, падлягаць пад пастанову суда і выконваць яе маю з усяго майго дабра і павінен буду ў адпаведнасці з той маей вышэйпамянёнай зарукай, якую б не раз заплаціўшы наперакор таму лісту майму запісу, замацоўваю, мае вечна і непарушна заставацца і на тым даў той над печацямі і подпісамі кіраўніцтва і іх міласцей паноў канцлераў (падпісантаў) мной упрошаных ніжэй названых. Пісан у Вільні ў тысяча шэсцьсот восемдзесят дзевятым годзе месяца ліпеня шостага дня...

Пераклад з польскай мовы А. Груца.

Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, ф. 1177, воп. 1, адз. зах. 3522, л. 44–47.

Перадумовы краху Рэчы Паспалітай

Пасля таго, як Расія захавала за сабой у выніку Андрусаўскага пера-мір'я 1667 г. Смаленскае ваяводства, Левабярэжную Украіну і Кіеў, стала відавочным, што ў далейшым менавіта яна будзе дыктаваць свае ўмовы Рэчы Паспалітай, а не наадварот, а Вялікае княства Літоўскае будзе заўжды толькі зачэпкай для гэтага. З другога боку акрамя супраціўлення каралеўскай улады Расія набывала для сябе яшчэ аднаго ворага як у самой Польшчы, так і ў ВКЛ – канфедэратаў.

Канфедэрацыі – часовыя ваенна-палітычныя саюзы шляхты ў XVI–XVIII ст. – ствараліся ва ўмовах аслаблення каралеўскай улады на так званых канвакцыйных соймах, якія абвяшчалі сябе галоўнай уладай. Існавалі таксама мясцовыя (ваяводскія) канфедэрацыі. Яны мелі свае соймы, пастановы прымаліся большасцю галасоў. Часам канфедэрацыі аказвалі ўзброенае супраціўленне каралеўскай уладзе (рокаш).

Расчараваны няўдачамі ў вайне з Расіяй 1654–1667 гг., польскі кароль Ян Казімір 16 верасня 1668 г. адрокся ад трона

і выехаў у Францыю, дзе памёр праз чатыры гады. 19 чэрвеня 1669 г. каралём польскім і вялікім князем літоўскім быў выбраны Міхаіл Карыбут Вішнявецкі (1669—1673), вылучэнец прааўстрыйскай групоўкі магнатаў і шляхты. Паводле пастановы сойма 1673 г. кожны трэці сойм (акрамя тых, якія выбіралі караля) збіраўся «у Вялікім княстве Літоўскім у горадзе Гродне».

У 1660-я — 1-й палове 1670-х гадоў у ВКЛ найбольшага ўплыву дасягнулі Пацы, прыхільнікі шляхецкай прааўстрыйскай групоўкі. Яны прызначаліся каралём на найбольш важныя дзяржаўныя пасады.

Пасля смерці Міхаіла Карыбута Вішнявецкага польскім каралём і вялікім князем літоўскім 8 мая 1674 г. быў выбраны палкаводзец Ян Сабескі (1674—1696), якога падтрымлівалі магнаты і шляхта прафранцузскай арыентацыі, таму супраць кандыдатуры караля спачатку вельмі моцна выступала «літоўская» групоўка на чале з Пацамі.

Новы кароль давёў вайну з Турцыяй і яе васалам — Крымам — да перамогі. Паводле Журавінскага міру 1676 г. да Польшчы былі далучаны Белацаркоўская і Павалоцкая акругі. Падолія ж засталася ў туркаў. У новай вайне з Турцыяй (1683—1699) Польшчай былі вернуты Падолія і частка Правабярэжнай Украіны.

«Вечны мір» 1686 г. паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй замацаваў дзяржаўную граніцу паміж краінамі (Кіеў і Смаленск засталіся за Расіяй) і стварыў умовы для сумесных дзеянняў супраць Турцыі і Крымскага ханства. Аднак тлумачэнне 9-га артыкула дагавору, дзе гаварылася, што праваслаўным цэрквам, манастырам і брацтвам «ніякага ўціску і да веры рымскай і да уніі прымусу» не будзе, успрымалася ў Рэчы Паспалітай неаднолькава, таму ён быў ратыфікаваны польскім бокам толькі ў 1710 г., калі расійскія войскі знаходзіліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Пры Сабескім, асабліва пасля таго, як ён падтрымаў Сапегаў і Агінскіх, супрацьстаянне шляхты абвастрылася да крытычнай рысы, тым больш, што атрымаўшы ад караля вялікія пасады і ўмацаваўшы сваё становішча, апошнія выступілі супраць караля, маючы на мэце ўзначаліць самастойнае Вялікае княства Літоўскае. Супраць Сапегаў у 1696 г. пачалася адкрытая барацьба беларускай і літоўскай шляхты, якую ўзначаліў вялікі харужы княства Р. Агінскі. Выкарыстаўшы смерць Яна Сабескага (17.6.1696), Агінскі падтрымаў прэтэнзіі на трон сям'і Сабескіх.

Утварылася канфедэрацыя. Шляхце ВКЛ удалося правесці на канфедэрацыйным сойме 29 жніўня 1696 г. канчатковае ўраўнаванне яе правоў з правамі польскай шляхты, хоць на тым жа сойме была прынята пастанова аб замене афіцыйнай беларускай мовы ў ВКЛ польскай мовай.

У чэрвені 1697 г. каралём польскім і вялікім князем літоўскім быў выбраны Аўгуст II Моцны (1697—1733), курфюрст Саксоніі, падтрыманы Расіяй і Аўстрыяй. Ён імкнуўся прымірыць варагуючыя бакі на Беларусі, але канфлікт паміж Сапегамі і большай часткай шляхты («рэспубліканцамі») набыў характар грамадзянскай вайны. У лістападзе 1700 г. пад Алелькамі каля Вільні ў рашаючай бітве атрады шляхты разбілі войскі Сапегаў. Прыхільнікі караля на чале з Агінскім прапанавалі праект аддзялення ВКЛ ад Польшчы і стварэння спадчыннай манархіі для Аўгуста II і яго нашчадкаў, што і скарыстаў кароль. Ён увёў у ВКЛ саксонскія войскі нібыта для «прымірэння бакоў», а таксама быццам бы для аховы гэтых зямель ад шведаў.

У тым жа годзе Аўгуст II уступіў у Паўночную вайну (1700—1721) як саюзнік Пятра I і як курфюрст Саксоніі. Рэч Паспалітая спачатку ўдзел у вайне не прымала. Пасля разгрому расійскай арміі пад Нарвай у лістападзе 1700 г. шведскі кароль Карл XII накіраваў свае войскі ў межы Рэчы Паспалітай. У пачатку 1702 г. яны разрабавалі Гародню і навакольныя вёскі і мястэчкі, потым пайшлі ў Польшчу.

А ў Вялікім княстве Літоўскім працягвалася барацьба паміж большай часткай шляхты і Сапегамі, якія перайшлі на бок шведаў. Сапегі арганізавалі казацка-сялянскія атрады на чале з Юрэвічам, Більдзюкевічам і Хмарай, дзейнічалі ва ўсходняй частцы Беларусі: Дуброўна, Галоўчын, Быхаў, пакуль не былі разбіты ў лютым 1702 г.

Прадстаўнікі шляхты ў 1702 г. падпісалі дагавор з Расіяй, паводле якога Пётр I абяцаў ваенную і грашовую дапамогу ВКЛ. Скліканая вясной 1703 г. генеральная канфедэрацыя ВКЛ абвясціла саюз з Расіяй. У Польшчы была створана Сандамірская канфедэрацыя 1704 г. супраць шведаў.

У сваю чаргу Карл XII арганізаваў альтэрнатыўную канфедэрацыю, якая 13 ліпеня 1704 г. выбрала каралём польскім і вялікім князем літоўскім познанскага ваяводу Станіслава Ляшчынскага.

Восенню 1704 г. 60-тысячная руская армія пад камандаваннем А. І. Рапніна ўступіла ў Беларусь, да лета 1705 г. частка арміі заняла Гародню, другая частка размясцілася каля Менска. Карл XII вярнуўся з Польшчы і аблажыў Гародню, але рускаму войску ў сакавіку 1706 г. ўдалося вырвацца з Гародні і праз Бярэсце адысці ў Кіеў. Шведскае войска разам з атрадамі К. А. Сапегі прайшло па цэнтральнай Беларусі, руйнуючы маёнткі шляхты.

Пацярпеўшы паражэнне, Аўгуст II паводле ўмоў Альтранштацкага дагавора 1706 г. адмовіўся ад кароны на карысць Станіслава Ляшчынскага, на бок якога перайшлі магнаты Радзівілы, Пацы, Вішнявецкія і частка шляхты. Аднак Сандамірская канфедэрацыя і канфедэрацыя ВКЛ не прызналі гэтага дагавора, іх падтрымліваў Пётр I.

У студзені 1708 г. шведскія войскі зноў уступілі на Беларусь, занялі Гародню і рушылі на Смаргонь і далей у напрамку Смаленска. У ноч на 4 ліпеня 1708 г. каля мястэчка Галоўчын Аршанскага павету адбылася бітва паміж рускімі і шведскімі войскамі, у выніку якой корпус Рэпніна быў разбіты, а сам ён Пятром I разжалаваны ў радавыя салдаты.

28 верасня 1708 г. каля вёскі Лясной пад Прапойскам армія Пятра I разграміла шведскі корпус графа А. Левенгаўпта.

Пасля перамогі расійскіх войск пад Палтавай 27 ліпеня 1709 г. ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі адбываліся паміж рускімі войскамі і канфедэратамі з аднаго боку і прыхільнікамі Станіслава Ляшчынскага з другога.

Аўгуст II зноў вярнуўся ў Польшчу і заключыў саюз з Пятром I. Неўзабаве пасля гэтага на Беларусі пачалася барацьба паміж прыхільнікамі Людвіка Пацея, які фактычна сканцэнтраваў у сваіх руках уладу ў ВКЛ, і прыхільнікамі караля на чале з польным гетманам літоўскім Станіславам Дэнгофам. Пацея падтрымлівалі Агінскія і іншыя магнаты, караля — Расія і Прусія. Створаная Віленская канфедэрацыя 1716 г. выступіла супраць абсалютысцкіх планаў караля. Аднадзённы «нямы» сойм (1.2.1717) абмежаваў уладу караля і гетманаў, падцвердзіў права ліберум вета, скарацiў польскую армію і войска ВКЛ.

Пасля смерці 1.2.1733 г. караля Аўгуста II шляхта выбрала польскім каралём і вялікім князем ВКЛ Станіслава Ляшчынскага, але гэта незадаволіла Расію. На тэрыторыю Рэчы Паспалітай былі ўведзены рускія войскі, праведзены новыя выбары, у выніку якіх новым каралём і вялікім князем ВКЛ стаў Аўгуст III (1733—1763), курфюрст Саксоніі, сын Аўгуста II.

У час яго кіравання адбылося далейшае паглыбленне палітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай, соймы пастаянна зрываліся, што паралізавала дзейнасць цэнтральнай улады.

Барская канфедэрацыя была заснавана 29 студзеня 1762 г. ў г. Бар на Падоліі па ініцыятыве братоў Адама і Міхала Красінскіх для барацьбы супраць уплыву рускага царызму на палітыку каралеўскага ўрада, за захаванне шляхецкіх вольнасцей і прывілеяў каталіцкай царквы.

Да барскіх канфедэратаў далучыліся патрыятычныя колы польскага грамад-

ства, абураныя тым, што рускі пасол у Варшаве М. В. Рэпнін арыштаваў праціўнікаў царызму ў Польшчы. Выступленне канфедэратаў прывяло да міжусобнай вайны і сялянскага паўстання супраць шляхецка-каталіцкага прыгнёту ў Правабярэжнай Украіне, так званай калііўшчыны, пад кіраўніцтвам М. Залізняка і І. Гонты. Паўстанне задушылі каралеўскія і рускія войскі.

Актыўным дзеячам Барскай канфедэрацыі быў буйны магнат Беларусі Караль Радзівіл.

Барскай канфедэрацыі дапамагалі замежныя дзяржавы, якія баяліся ўзмацнення ўплыву Расіі на Польшчу. Турцыя абвясціла вайну Расіі, Аўстрыя дазволіла канфедэратам рыхтаваць на сваёй тэрыторыі атрады, Францыя пасылала ім грошы.

Падрыхтаваў да друку А. Ярохін.

Дакументы сведчаць

ЧАЛАБІТНАЯ ДУБРОВЕНСКАГА ПРАТАПОПА К. ПАЛІКАРПАВА Ў ПАСОЛЬСКІ ПРЫКАЗ АБ ВЫДАЧЫ ГРОШАЙ НА ПАКУПКУ ЦАРКОЎНА-СЛУЖБОВЫХ КНІГ, ЗВАНА І ІНШ.

1686 г., с а к а в і к

Царем государем и великим князем Иоанну Алексеевичю, Петру Алексеевичю, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержцем, бьет челом богомолец ваш протопоп дубровенской Кондрат Поликарпов.

В нынешнем, государи, во 194 году приехал я, богомолец ваш, с полномочным послом Мартином Агинским, канцлером великого княжства Литовского, и бью челом я, богомолец ваш, вам, великим государем, о утвари, о сосудах и о книгах, да у той же церкви Николая нет колокола.

Милосердые государи цари и великие князи Иоанн Алексеевич, Петр Алексеевич, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержцы, пожалуйте меня, богомольца своего, велите, государи, х той церкви Николая чюдотворца на церковной сосуд и на книги и на колокол свое великих государей жалованье выдать, чем вам, великим государем, господь бог известит.

Цари государи, смилуйтеся, пожалуйте.

На обороте помета: 194-го марта в 19 день. Выписать, а буде выписать не из чего, и ево роспросить.

Русско-белорусские связи во второй половине XYII в. (1667—1686 гг.). Сборник документов. Мн., 1972. С. 337.

З ЛІСТА ПАСОЛЬСКАГА ПРЫКАЗА Ў ПРЫКАЗ ВЯЛІКАГА ПАЛАЦА АБ ВЫДАЧЫ ПРАТАПОПУ К. ПАЛІКАРПАВУ ЦАРКОЎНАСЛУЖБОВЫХ КНІГ ДЛЯ НІКАЛАЕЎСКАЙ ЦРКВЫ г. ДУБРОЎНА

1686 г., 23 с а к а в і к а

В приказ Большаго дворца марта в 23 день.

Великия государи пожаловали польского города Дубровны благочестивые церкви святаго чудотворца Николая протопопа Кондрата Поликарпова, который приехал ныне к Москве королевского величества польского с великими и полномочными послы, велели ему по ево, протопопову, челобитью в ту Николаевскую Дубровенскую церковь дать своего великих государей жалованья, книг служебных церковных, из выходу по книге, какие выходы ныне есть налицо, ис приказу Большаго дворца.

С оборотом. За приписью диака Василья Посникова.

На обороте отметка: А по справке с приказом Большаго дворца даны ему, протопопу, в Николаевскую церковь книги: евангелие напрестольное, служебник, минея общая, пролог во весь год, псалтырь учебная, триодь цветная.

Русско-белорусские связи во второй половине XYII в. (1667—1686 гг.). Сборник документов. Мн., 1972. С. 341.

З ЛІСТА АРУЖЭЙНАЙ ПАЛАТЫ Ў КАЗЁННЫ ПРЫКАЗ АБ ВЫРАБЕ ЦАРКОЎНАГА АДЗЕННЯ ДЛЯ ДУБРОВЕНСКАГА ПРАТАПОПА К. ПАЛІКАРПАВА

1686 г., 24 сакавіка

Лета 7194-го марта в 24 день. По указу великих государей царей и великих князей Иоанна Алексеевича, Петра Алексеевича, всеа Великия и Малыя Росии самодержцев, окольничему Семену Федоровичю Толочанову с товарыщи.

Великия государи цари и великия князи Иоанн Алексеевич, Петр Алексеевич, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержцы, пожаловали польского города Дубровны благочестивые церкви святаго чюдотворца Николая протопопа Кондрата Поликарпова, которой ныне приехал к Москве с великими и полномочными послы, велели ему по ево челобитью в тое Николаевскую церковь зделать ризы и подризники тафтяные со всею к тому пристойною службою.

...Расписка: По сему великия государей указу протопоп Кондратей ризы да подризники дорогильные, патрахиль с поручьми атласными принял и росписался.

Русско-белорусские связи во второй половине XVII в. (1667—1686 гг.). Сборник документов. Мн., 1972. С. 342.

З магілёўскай хронікі

У гэтым жа (1701.— *Рэд.*) годзе. Месяца ліпеня 26-га падступілі за некалькі міляў пад Дуброўна дваццаць шэсць кампутовых харугваў. Што пачуўшы, выйшаў з Дуброўна з некалькімі татарскімі і валашскімі харугвамі пан Корша і з імі некалькі тысяч стральцоў са стрэльбамі і сяляне з розным рыштункам. Спачатку выехалі на перагаворы, дзе кампутовыя патрабавалі падаткаў паводле Алкініцкіх дагавораў. Аднак упартыя сяляне, хоць пан Корша і ўгаворваў, нічога даваць не хацелі, жадалі пабіцца. Дзе, з-за няўмельства, сяляне, даўшы агню, разам бітву не пачалі, палягло іх 1674, акрамя параненых, сярод якіх мала засталося недабіткаў. Самі мы гэта чулі. А другія пахаваліся ў вёску, у хаты і гумны, адкуль моцна шкодзілі кампутовым, тады мусілі запаліць вёску і гумны. І так сялян, жанчын і дзяцей, згарэла на некалькі соцень. А самога пана Корша паланілі і адправілі ў Вільню да іх мосцяў паноў кампутовых. Тут жа загінула і некалькі дзесяткаў мяшчан-дубровенцаў. А мяшчане-дубровенцы, яшчэ перад гэтым, спадзеючыся на паражэнне, пахавалі свае скарбы у купале большай царквы, нават і падумаць было немагчыма, што там могуць быць грошы, аж з нечыйга здрайства кампутовыя, напаўшы на Куцеінскі кляштар і знайшоўшы у купале вялікія скарбы, іх пабралі і кляштару нямала нашкодзілі, і многа гараджан давялі да жабрацтва.

Пераклаў з польскай мовы З. Яцкевіч.

Полное собрание русских летописей. Т. 35. М., 1980.

А. С. Пушкін пра Дуброўну

...На каждой станции Пётр писал письма, из Вязьмы — к Меншикову и адмиралу Головину, из Смоленска — к Долгорукому, торопя его быть с Преображенским полком в Смоленск; Меншикову, чтобы он уступал к Вильне; из Дубровны — к смоленскому губернатору Салтыкову о вооружении шляхты, к Шереметеву, к Нарышкину о плане дороги от Смоленска до Пскова.

25 января в Дубровне Петра встретил Меншиков с донесением, что Гродно осадил король. 14-го и 15-го, по показанию шведских историков, русские при перепп-

раве его через Неман были побиты и отступили...

...Пётр остановясь в Дубровно и с воинского совету, послал в Митаву через Александра Кикина — повеление Боуру и Розену не отлучаться далеко от Митавы; Репнину быть осторожну и, буде король станет дожидаться Рейншильда, то б непременно отступить...

А. С. Пушкин. Полное собрание сочинений. Т. 9. Л., 1977. С. 106–107.

Дакументы сведчаць

З ГРАМАТЫ РУСКАГА ФЕЛЬДМАРШАЛА АЛЯКСАНДРА МЕНШЫКАВА, ДАДЗЕНАЙ ДУБРОВЕНСКІМ МЯШЧАНАМ ПІЛАТАМ

1718 г., 20 верасня

Перад намі, суддзямі галоўнымі, выбранымі з ваяводстваў, зямель і паветаў у трыбунал Вялікага княства Літоўскага на год сёлетні тысяча семсот восемнаццаты, стаўшы асабіста, патрон імць пан Адам Макушынскі, кватэрмайстар Наваградскі, заявіў і да актаў спосабам пераноса з горада аршанскага падаў грамату дадзеную іх яснавяльможнасцю князем Менжыкам дубровенскім мяшчанам Пілатам, якая ім служыць і належыць і, падаючы да актаў, прасіў нас суд, каб са ўсім занатаваным у ёй зместам была прынята і ўпісана ў галоўныя кнігі вечных спраў трыбунала Вялікага княства Літоўскага, вось чаму мы суд тую прыняўшы загадалі ўнесці ў кнігі, якой змест наступны:

Мы Александер Менжиков, светлейший римский и российского господарств Изерского князь, енерал фельт-маршал и кавалер святого Андрея и прочих орденов, полковник от лейб-гвардии Преображенского полку, губернатор Санкт-Петербургский, староста Оршанский и Дисненский и прочая и прочая, их милосцям господам комисаром, аконому, администратором нашим в маентностях Белоруских, а именно: в грабстве Дубровинском и в Езнеском. Чиню, кому ведать о том надлежит, нинейшим и впредь будучим: которые имеют заставою маентности у себя. Пилаты, мещане наши Дубровенские, от бывших антецессоров его милости господина Сапеги — воеводы Виленского и его милости господина Потея — гетмана великого князтва Литовского, от грабства Дубровинского отлученые, у побличних сесь днях у правах и у крепостях выражоныя суммы, також де им сею конфирмациею утвержаем, оных при всяких вольностях ненарушно ни от кого имать, покаместь оным заложеные дни сполна дойдуть, и про оное наше и выше помянутое потвеждение да аж будущие господа комисары, економы, администраторы имели в охоронности и протекции нашей и ни кому от войск его царского величества, также и от войск великого князтва Литовского. На што дана сия наша конфирмация з подписом руки нашей. Печать приложеная. Из Санкт-Петербурха. Мая шестнадцатого дня, тысяча семьсот одиннаццатого году.

На той грамаце пры пячаці подпіс рукі князя яго міласці тымі словамі: Аляксандр Меншчыкаў. Такога зместу тая грамата, атрыманая горадам аршанскім; года тысяча семсот адзінаццатага месяца лістапада восьмага дня, стаўшы асабіста, слаўны пан Федар Пілат, дубровенскі жыхар, тую грамату яго міласці Мензыка да справы далучыў. Атрымаў Мікалай Юзеф Халевіч, намеснік аршанскі.

Тая грамата за подпісам яе да актаў памяненым патронам да кніг спраў вечных галоўнага трыбунала Вялікага княства Літоўскага прынята і ўпісана.

Пераклаў з польскай мовы А. Груца.

АВК. Т. 13. 1886. Л. 144.

ДУБРОВЕНСКАЯ ФЕАДАЛЬНАЯ ВОТЧЫНА

1738 г. Інвентар Дубровенскага графства

I. Агульны пералік (генеральны компут) местаў, вёсак, засценкаў, валок, крамаў, пляцоў, маргоў і поўнага дахода з гэтай часці Дубровенскага графства, удавы Юрыя Сапегі Фядоры.

Месты (Дуброўна і Ляды)		2	
Вёсак населёных		15	
Абрубаў		5	
Засценкаў		55	
Займішчаў		3	
Засценкаў наездных		23	
	Разам	103	
Дымаў хрысціянскіх		1098	
яурэйскіх		69	
	Разам	1167	
Крамаў у рынку платных		33	1/2
вольных		14	1/2
пустых		1	
	Разам	49	
Пляцоў цяглых хрысціянскіх платных		192,	2/3, 1/8
кунічных яурэйскіх платных		44,	1/4
вольных		41,	1/6, 1/24
пустых		77,	1/4, 1/6
	Разам	355	2/3
Маргоў, або пляцоў гуменных платных		132	1/8, 1/6
вольных		9	2/3
пустых		139	3/4, 1/6
	Разам	281	3/4, 1/8
Валок засялёных (асадных) на рознай плаце		166,	1/2 1/16
прыёмных і наездных		343,	1/2, 3/16
вольных (на войтах, дзесятніках і па закону)		83,	1/8
пустых		291,	3/4
	Разам	885,	1/8, 1/12
Маргоў занятых (асадных)		162 і прутоў 27	1/2
прыёмных		239	12
наездных		1757	231/2
пустых		573	13
	Разам	7962	3

Перавёўшы гэтыя маргі ў валокі будзе 93 вал. 1/6 марг. 4 прут.
Разам з генеральнымі валокамі — 978 вал. 3/4 марг.

II. Агульны пералік прыбыткаў

Чынш	Злоты	Грошы
М. Дуброўна	3995	10
За долю места на 3 гад. кантракту Абрама Аўсеявіча	233	10
Глаўнай арэнды з Дуброўны	4515	-
Савінскае войтаўства чынша	7696	61/6
падарожчыны	1106	215/6
Долі ў в. Бурай, Савіне і Верамеяве па 3 год кантракту трымае Лейба Лейзаравіч	2045	-

Чынш	Злоты	Грошы
Долі ў в. Загвоздіне па 3-х гад. кантракту ў Марка Пальчонка	980	-
Долі ў в. Барсукі, Сташынка, Юкава і Карабаева па 3-х гад. кантракту ў Андрэя Пілата	2400	-
Доля ў в. Печкі па 3-х гад. кантракту ў Абрама Шмуйлавіча	120	-
Доля ў в. Міоціні па 3-х гад. кантракту ў Шлёмы Ельявіча	630	-
Доля ў в. Міхаліні па 3-х гад. кантракту ў Яна Пілатовіча	470	-
Паручэнства чыншу	5404	13 1/2
падарожчыны	748	161/4 1/16
Долі ў Паручэнстве па 3-х гад. кантракту ў Лейбы Лейзаравіча	550	-
Каменданцтва чыншу	13087	21 3/4
падарожчыны	1393	9 3/8
З поля каменданцкага на арэндзе	420	-
Частка Стрэжаўскага войтаўства чыншу	563	2 1/2
падарожчыны	106	8
Места Ляды чыншу	1715	14 1/2
арэнды з долей у м. Лядах	2200	-
Разам	50162	14 1/2
Запіснога ад чынша і падарожчыны	1433	29
Усяго за 1738 г.	51596	13 1/4

III. Дадатак на 1739 г.

1. За сканчэннем вольнасці чыншу	12	
падарожчыны	2	13 1/8
запіснога	-	171/2
2. Даніла Макарэвіч за дазволены шынк Даніла Якушоў, Касцюк Макараў, Іван Брыль — за ўзятыя 12 валок пасля Паноўскага,	200	-
	па 50 злот. з валокі	600
3. Лейба Лейзаравіч і Сцяпан Несцяравіч з в. Вялікага Савіна за ўзятыя 4 валокі па 50 злот.	200	-
4. Арэнды за пабудаваны ў в. Крапіўні млын Андрэй Пілат паводле кантракту	550	-
5. Лейба Лейзаравіч надбавіў на кантракт за долі ў в. Бурай, абодвух Савінах, Верамеяве і ў Паручэнстве	100	
6. Філіп Баран надбаўкі на долі ў м. Дуброўне	66	20
7. Мужы в. Міхалінава, усёй вёскай, узялі 12 валок, па 40 злот., з іх Ян Пілатовіч плаціў 470 злот.		
Цяпер мае быць 480. Павелічэнне	10	-
8. На Каменданцкай арэне павелічэнне	280	-
9. На Савінскай арэндзе павелічэнне	300	-
10. На Ляднянскай арэндзе павелічэнне	800	-
11. На галоўнай Дубровенскай арэндзе павелічэнне	485	-
12. Мікалай Макарэвіч за 1 вал., 13 марг. і 6 прут з запісным	109	24 1/2
Разам павелічэнне на 1739 г.	3716	15 1/8
Усяго даходу на 1738 г. згодна інвентара	51596	13 3/4
на 1739 г.	55312	28 3/4

IV. Устава генеральнай павіннасці паловы графства Дубровенскага з часці ваяводзінай мсціслаўскай Федоры з Солтанаў Сапежынай

1. Чыншы, арэнды, долі павінны быць выбраны згодна з раскладам інвентара і асобных кантрактаў, з наглядам за тым, каб правільна вылічыўшы — колькі от каго належыць, ніякага злішку не было ў спагнанні чынша, і каб квіты былі запісаны ў кнігі.

Тэрмін для выбірання чыншаў вызначаецца ад божага нараджэння рымскага, без упярэджання і ўпушчэння.

18. Паколькі людзі з другой часці маюць значны заработак з пушчы, прадаючы дрэвы на рынку, а людзям маёй часці гэта забаронена, то калі-б на далейшы час адміністратары той часці заставаліся пры той жа ўпартасці, чынячы забарону на аднолькавае карыстанне пушчай, няхай узаемна забараняць людзям той часці і грабяць іх на рынку.

19. Калі які-колечы хлоп выйдзе з воласці, пакінуўшы засеў, то адміністратар павінен даць загад сабраць збожжа, а калі іншы трапіў на аселасць і ў стане заплаціць чынш, то збожжа дазваляецца аддаць яму, інакш гэта збожжа трэба завезці да замку, ацаніць у прысутнасці войта і добрасумленных людзей па рыначнай цане, і захаваць да справаздачы.

20. Стральцы павінны выконваць сваю павіннасць паводле даўных звычаяў, старанна быць птушак, мядзведзяў, ваўкоў, ласёў, рысяў, а скуры маюць захоўвацца адміністратарам.

21. Рыбакі ў сераду, пятніцу і суботу, згодна даўнага звычая, павінны дастаўляць [рыбу] адміністратару прапарцыянальна на спажыванне. Апроч рыбакоў ніхто не павінен лавіць рыбу без дазволу і ўмовы з дворам.

22. Ляснікам і падляснічым, пад пакараннем смерцю, загадваецца, каб у пушчах не высякаліся стаячыя дубы. А ляжачых не павінны браць без апавяшчэння замку, пад суровым пакараннем ста дубцамі.

23. На права карыстання горадам і воласцю дрывамі з пушчы і дрэвам на будову і на лучыво павінны браць карткі ад адміністратара, які дае дазвол згодна даўных звычаяў, г. зн. на сваю хатнюю патрэбу і тынф; на продаж і капа; на лазню, пуню і асець — 1 злот.; на іншыя лёгкія патрэбы хлопаў, як: дровы на ацяпленне, лыкі, луб, жэрдзі для гарожы вёскі і дамоў — маюць вольны ўступ да пушчы без усякай карткі. А ляснікі і падляснічыя маюць, пад пакараннем, даглядаць за тым, каб на дровы не спушчалі дрэва з пня, але бралі сухое і ляжачае.

24. Забараняецца і тое, каб з Дубровенскай пушчы выдавалася што колечы дарэмна каму чужому, чаго не можа і не павінна быць і каб і ў другой часці супольнай пушчы не рабілася гэтага праванарушэння.

25. У супольных азёрах маюць быць і супольныя ловы рыбы, за чым мае наглядаць адміністратар.

26. Аннуата кс. бернардынам Дубровенскім у суме 1300 злотых павінна быць выдана ў два тэрміны: на божае нараджэнне 650 злот. і на св. Міхала — другая 650 злот. На пакрыццё гэтай аннуты прапануецца наступны расклад:

З места Дуброўны разам з яўрэямі	150 злот.
З Камендатуры	230 “
З Савінскага войтаўства	200 “
З м. Лядаў з яўрэямі	45 “
З Паручэнства	110 “
З часці Стрэжаўскага войтаўства	20 “
Разам	755 злот.

Паводле гэтае раскладкі паказаная сума мае быць выбрана кожны год два разы, а злішкі па разрахунку павінны належыць адміністратару.

27. Далучаецца і тое, што калі-б у яўрэйскіх катлах хто-колечы вырабляў напой, то мае заплаціць ня звыш 3 злотых, адну асміну аўса і курыцу, пад штрафам у 10 коп. на арандара, які вымагае больш. А калі хто будзе браць на старане гарэлку або піва, або без дазвола яе вырабляць, то гэткага арандатар павінен запазваць да замку, не адважваючыся з ім чыніць ніякай згоды пад штрафам 20 коп. на абодвы бакі.

28. Меры збожжа, гарэлкі і піва — гарцы — павінны быць справядлівыя і за дворнай адзнакай, што ракамендуецца пільнаму дазору, адміністратара пад штрафам на кожнага яўрэя 40 коп., які-б адважыўся прадаваць гарэлку і піва фальшывымі гарцамі.

29. Коняў на пасылкі нідзе з воласці не маюць браць, хіба на гвалтоўную патрэбу, і то па замкаваму распараджэнню. Таксама не маюць іх браць з места — у хрысціян і ў яўрэяў.

30. Паборы з воласці, або з места, не павінны раскладваць самі паручнік, камендант і войты гарадскія і валасныя. Але адміністратар на кожны набор мае выдаць падпісанае пасведчанне і тагды воласць, сабраўшыся, мае ўчыніць справядлівы расклад, маючы на ўвазе хто сколькі зможа заплаціць. Пасля спагнання набора мае быць, у прысутнасці адміністратара, справаздача для зацверджання набора і выдаткаў.

31. Адміністратар згодна паданага рэестра мае адшукваць разышоўшых падданых цывільным спосабам. У выпадку неаддачы павінен прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасці.

32. Грунты і валокі павінны быць аднолькавымі па свайму памеру ў кожнага, і ніхто не павінен пераворываць межаў пад спагнаннем 10 коп. А каму стане крыўда з прычыны гэткага пераворвання, то мае ў гэта ўмяшацца адміністратар, загадаць учыніць памеру і прыўлашчаючага чужы грунт пакараць, а накладзены штраф адабраць да скарбу. Каб не было такога пераворвання — маюць даглядаць войты і дзесятнікі, у Паручнікаўскай часці — паручнік, а ў Камендатуры — камендант, пад штрафам на войта, паручніка і каменданта 20 коп., а дзесятнікам 5 коп.

33. Усі маюць рабіць гарожу выганаў пад штрафам на абвінавачанага за доказ 5 коп., і на двор 10 коп. Ад пустых валок маюць гарадзіць цэлай воласцю.

34. Разбіраць пустуючыя будынкі і прадаваць іх ніхто не мае права, пад штрафам на двор 10 коп. А калі адважыцца на гэта хто-колечы ў вёсцы, або ў засценку, а двор даведаецца аб гэтым паміма данясення суседзяў, то штрафу ў 10 коп. будзе падлягаць уся вёска і той, хто купіць.

35. Войты і дзесятнікі па вёсках павінны за тым сачыць і мець пільнае вока на тое, каб хлопы не збягалі, і ў восень засявалі жыта, а калі-б заўважылі і зразумелі, што хлоп выходзіць або мае замысел, тады загадзя аб гэтым павінны даваць ведама ў двор. Гэта загадваецца войтам і дзесятнікам пад штрафам на войтаў 50 коп., а на дзесятнікаў 20 коп. і пакараннем пастронкамі.

36. Адміністратару рэкамендуецца, каб у часе сваёй адсутнасці не дазваляў і забараніў судзіць важнейшыя справы і правадзіць па іх дазнанне, але павінен даручыць намесніку толькі запісваць іх у пратаколе. Караць жа намеснік нікога не мае моцы ў адсутнасці адміністратара. Гэта рашуча забараняецца і ўстанаўляецца.

37. Дадаецца, што ў выпадку калі-б рашэннем адміністратара былі мала задаволены бакі, стаўшыя да суда, то ім не забараняецца ў кожны час апеляваць да майго суда, і ў выпадку гэтай апеляцыі дэкрэт адміністратара не мае быць накіраваны да выканання.

V. Пераліковая ведамасць дымаў

	Дымы	
Места Дуброўна	49	З гэтых дымаў у кожную рату з дыма па 6 злот. рускай манеты, што складае на адну рату 2184 злот.
Яўрэі Дубровенскія	20	
Савінскае войстаўства	91	
Каменданцтва	101	
Паручэньства	62	
Места Ляды	23	
Яўрэі Ляднянцы	4	
Стрэжаўскага войтаўства часць	8	
Папы гэтай часці	5	
Разам	364	

Застаўныя дымы гэтай палавіны

Борздаўка — п. Бародзіч	3	З гэтых дымаў застаўных з кожнага па 4 злот., што складае на адну рату 260 злот.
Стрэжаўскае войтаўства	35	
Халуі, вёска	10	
Пшедзеччына	12	
Парцэвічы — п. Іозефовіч	1	
Кудаева — п. Віткоўскі	1	
Макараўка і Царкавішча	2	
Есіпава — п. Ражановіч	1	
Разам	65	

VI.

Ардынарыя	Савінскае войтаўства	Каменданцтва	Паручэнства	Разам
Валок аселых	56.2/3.1/6	71 1/3	38.1/3.1/12	Валокі асел. 166 1/3.1/4
З кожнай валокі				Асьмух:
Жыта асьмух	2	1 1/2	1	259 1/12
Ячменя асьмух	2	1 1/2	1	259 1/12

Ардынарыя	Савінскае войтаўства	Камен-данцтва	Паручэнства	Разам
Аўса	2	1 1/2	1	259 1/12
Канапель агулам	12	16	-	28
Кур штук	4	2	2	447
Яец	10	5	5	1091
Сена вазоў	1	1	-	-
Ялавіц з воласці 6, або за кожную па 20 злотых	-	-	-	2
Вяпроў з млыноў	-	-	-	
Мёду з войт. Савінскага	4 пуды			7
З часці войт. Стрэжаўскага	3 пуды			

Мёд бортны — бортнік маёй часці Іван Апанасавіч павінен дапільнаваць пры дворным віжу, каб не было шкоды.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 235—242.

З апісання Дубровенскага замку за 1731 г.

Уязджаючы ў замак мост дзеравяны на ізбіцах (быках) з парэнчамі па баках; з мосту таго ад брамы мосцік доўгі на слупах праз роў з парэнчамі аж да вуліцы. У канцы мосту брама пабудаваная, з варотамі і маленькімі варотцамі (фортай). Вароты і варотцы з драніц, цвікамі жалезнымі папрыбіваныя, на жалезных завесах, з папярэчнай перакладзінай для замыкання, з жалезнымі зашчапкамі як у варотах, так і ў варотцах з клямкай, скабой і жалезнымі прабоямі.

Увайшоўшы ў браму па правым баку турма з акном, з жалезнымі кратамі, дзверы ў яе на жалезных завесах, з драніц, цвікамі жалезнымі злучанымі, з вялікай зашчапкай для замка і жалезным прабоем. Па левым баку гаўптвахта (варта), з акном, дзверы на жалезных завесах, з драніц, з жалезнымі зашчапкай і прабоямі. На браме невялікая зала, акружаная вакол балконам (галярэйкай), у якой сталяванне з драніц габляваных, таксама падлога з такіх жа драніц. На гэтай жа браме дах чатырохсхільны, пакрыты гонтамі. З брамы ідучы ў замак па абодвух баках паркан на балясінах як у сад, так і ў агарод, пакрыты гонтамі, па адным баку паркану, г. зн. ад саду ідучы з брамы на дзядзінец (двор) вялікая кладка з цесаных брусаў з парэнчамі. Увайшоўшы ў замак па правым баку ў канцы паркану пры вазоўні вароты новыя падвойныя ў сад на жалезных завесах з зашчапкай і прабоямі жалезнымі, гонтамі пакрытыя. Пры тых варотах вазоўня з двума падвойнымі варотамі, на бегунах, з драніц, вялікімі жалезнымі цвікамі прыбітымі, з драўлянымі засовамі, зашчапкамі і вялікімі жалезнымі прабоямі без замкоў... Далей у канцы вазоўні вялікая стайня з падвойнымі дзвярамі, цвікамі дзеравянымі папрыбіванымі, на бегунах, з зашчапкай і прабоямі жалезнымі.

У канцы стайні над Дняпром маштарня новазбудаваная, яшчэ без дзвярэй і акон, у той маштарні бакавая камора таксама яшчэ без дзвярэй і акон. Далей ад стайні склеп пад асобным дахам з драніц крыты, куды дзверы на бегунах з зашчапкай і жалезнымі прабоямі. Недалёка ад гэтага склепу (падвалу) вялікі рум (будынак) зусім, як здаўна быў на Дняпры. Уваходзячы ў сені, невялікія прыступкі, у гэтыя сені дзверы на завесах з клямкай, зашчапкай і жалезнымі прабоямі; ідучы з сяней па правым баку вялікі пакой, у які дзверы на завесах з клямкай, зашчапкай, кручком і жалезнымі прабоямі; тры акны часткова ў олава, часткова ў дрэва апраўлены, з жалезнымі завесамі і кручкамі; у гэтым пакоі печ з зялёных кафель з камінам і выведзеным комінам. У бакавы пакоік

дзверы на завесах, з зашчапкай кручком і прабоямі; у гэтым пакоіку печ з зяленых кафель з выведзеным комінам...

Ззаду гэтага руму ўздоўж Дняпра галярэя з тачонымі балясамі. Дах руму гонтамі крыты, трынаццаць акяніц на жалезных завесах з прутамі, кручкамі. Пры гэтым жа руме вялікая драбіна вышэй комінаў. Далей ідучы з гэтага руму ў канцы галярэі градусы або сходы з парэнчамі..., сажалка (стаў), на якой мост на ізбіцах з ганкам на балясах тачоных; як ад Дняпра, так ад сажалкі ў палац новы ганак на градусах, дзе, уваходзячы ў сярэдзіну, дзверы вялікія, дубовыя, фугаваныя, падвойныя, з унутраным лужовым замком, з ручкамі (антабамі), на вялікіх завесах з лужовымі засоўкамі. Увайшоўшы ў сярэдзіну пры гэтых жа дзвярах два акны пабочныя (бакавыя), у олава апраўленыя, завесы да іх, кручкі, кольца, прабойчыкі лужовыя. У гэтых жа сянях вісіць вялікая шкляная лятарня (фанар). Ідучы далей па правым баку вялікі пакой, падвойныя дубовыя дзверы, фугаваныя, з унутраным лужовым замком, з ручкамі, засоўкамі і лужонымі завесамі. У гэтым пакоі два акны ў олава апраўленыя, завесы, кручкі, прабойчыкі лужоныя; у ім вялікая белая печ з камінам і выведзеным комінам. У гэтым жа пакоі партрэт св. памяці пана Яна Сапегі, маршалка ВКЛ. З гэтага пакою пакоік у рагу (вуглавы), дзверы падвойныя фугаваныя, з унутраным замком лужоным, з ручкай, клямкай і лужонымі засовамі... Выходзячы з пакою па правым баку ў пакоік бакавы дзверы адзінарныя, з унутраным замком, з ручкамі і лужонымі завесамі...

З гэтага пакоіку дзверы ў кабінет падвойныя, з унутраным замком, ручкай, з завесамі і засоўкамі лужонымі, у ім два акны, апраўленыя ў олава, печ акруглая з белых кафель... Вакол палацу паверх даху карніз, а сам палац гонтамі крыты, верх чатырохсхільны, па канцах драніцаю фугаваны, жалезнымі цвікамі прыбітыя. Акон у гэтым даху шэсць, апраўлены ў олава..., выведзеных тры коміны, разам з комінам на даху дзве вялікія драбіны. Недалёка ад палацу вялікія падвойныя вароты..., на жалезных завесах, з зашчапкай і прабоямі, верх востры, таксама футраваны (абшыты дошкамі), цвікамі жалезнымі прыбіты.

Вакол палацу палісада аж да новага паркану. Назад вяртаючыся па правым баку кухня, у якой дзверы на бегунах. У кухні вялікі стол для выдавання ежы, паліцы для кухоннага посуду... Далей ад кухні рум адміністратарскі, у якім два пакоі з каморкамі. Паміж тымі пакоямі кладоўка. У гэтых пакоях дзве зялёныя печы з выведзенымі комінамі і камінам. Восем дзвярэй, усе на жалезных завесах з зашчапкамі, прабоямі, а двое дзвярэй з клямкамі. Вакон у гэтым руме восем, апраўлены ў дрэва, дзевятае невялікае ў кладоўцы, восем акяніц на завесах... Рум крыты драніцамі. Пры гэтым будынку вялікія вароты ў агарод, на бегунах, з зашчапкай і прабоямі жалезнымі. Ад варот новы паркан да свіронку гаспадарчага...

Ззаду гэтага свіронку гусятнік. Пры гэтым свіронку лядоўня, поўная лёду, дзверы на бегунах, з зашчапкай і жалезнымі прабоямі, крытыя драніцамі. Недалёка два вялікія свірны для ссыпання збожжа і складання маёмасці з ганкам...

У канцы амбараў стайня, яшчэ не да канца збудаваная. Пры гэтай стайні дзве старыя стайні... Пры іх маштарня і камора без даху, якая мае быць перанесена ў другое месца. Ад руму па правым баку кухня з пякарняй... Сам замак ад брамы да кухні абнесены новым парканам...

Слуг замкавых 10, капрал адзінаццаты. Уся маёмасць абодвух палацаў і вазоўні апісана ў рэестры, які знаходзіцца ў мясцовага войта Філіпа Барана.

Пераклаў з польскай мовы А. Груца

НАРБ, ф. 3258, воп. 1, спр. 2, л. 1–6.

КРУТЫ ПАВАРОТ ЛЁСУ

ПА СЦЭНАРЫЮ ІМПЕРАТРЫЦЫ

У 1762 г., калі каранавалася Кацярына II, у Маскву з нагоды гэтае ўрачыстасці прыехаў беларускі праваслаўны епіскап Георгій Каніскі. Гутарка з царыцай вялася пра абарону праваслаўнай рэлігіі ў Рэчы Паспалітай. Кацярына, якая толькі-толькі стала займацца дзяржаўнымі справамі на такім узроўні, асцярожна спытала, якую ж карысць яна будзе мець з гэтага. Адзін з прысутных, ігумен, тлумачыў без дыпламатыі: Расія, маўляў, законным чынам можа адабраць у палякаў кавалак урадлівай зямлі ў 600 вёрст ды яшчэ атрымаць безліч праваслаўных, якія будуць тую зямлю апрацоўваць. Імператрыца, як заўжды, ветліва выслухала гэтую параду і... зрабіла свае вывады. Ва ўсякім разе, усё ж распрацавала планы пашырэння расійскіх уладанняў у заходнім накірунку.

А абставіны, і міжнародныя, і тыя, што склаліся ў самой Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVIII ст., спрыялі гэтым планам. Шматнацыянальная краіна «абодвух народаў» з-за свайго кансерватызму, памножанага на анархічнае разуменне «залатой вольнасці», зрабілася практычна безабароннай. А вакол — тры магутныя дзяржавы: Аўстрыя, Прусія і Расія. Спакуса вялікая. Мілітарызм у спалучэнні з цэнтралізаванай уладай толькі і шукаў моманту для захопу суседніх тэрыторый. Гэты момант вышукаўся дыпламатамі, сярод якіх асаблівую ролю ў лёсе Рэчы Паспалітай адыграў Мікалай Рэпнін. Пры яго непасрэдным удзеле адбываліся выбары ў сойм, выпрацоўваліся праграмы дзеянняў на карысць суседкі на ўсходзе. Калі ж здарылася непаслушэнства — паралізавалася дзейнасць дзяржаўных устаноў, была нават «патрэбная» канстытуцыя.

Расія абяцала пакуль не чапаць граніц Рэчы Паспалітай, гарантавала недатыкальнасць яе зямель. Тым часам, аднак, вяліся актыўныя перагаворы паміж Венай, Берлінам і Пецярбургам. І вось сталіца Расійскай імперыі становіцца галоўным штабам па вырашэнню лёсу польска-літоўскай дзяржавы. 5 ліпеня 1772 г. трыма зацікаўленымі бакамі падпісваецца сакрэтная канвенцыя. Пачынаецца першы акт гістарычнай трагедыі...

Адпаведна з канвенцыяй, па першаму падзелу Рэчы Паспалітай да Расіі адыходзілі ваяводствы Мсціслаўскае, Віцебскае, Полацкае, Інфлянцкае і частка Мінскага за Дняпром. Гэтыя землі разам з часткай Лівоніі склалі плошчу каля 93 тыс. км^2 з насельніцтвам у 1 млн. 300 тыс. чалавек.

У верасні 1772 г. тэкст канвенцыі быў афіцыйна накіраваны польскаму ўраду, які рашуча пратэставаў супраць гэтага, нават звярнуўся да кіраўнікоў Англіі і Францыі за падтрымкай, але дарэмна. Паслы трох дзяржаў — Аўстрыі, Прусіі і Расіі — ультыматыўна «рэкамендавалі» ратыфікаваць трактат. Рэч Паспалітая такім чынам страчвала свае землі на карысць суседзяў. Адначасова была «аказана дапамога» ў дэлегаванні паслоў на сойм. Патрыятычна настроеных прадстаўнікоў гінучай дзяржавы аказалася зусім мала: толькі Тадэвуш Рэйтан, пасол новагародскі, ды яшчэ колькі асоб. 30 верасня адбылася ратыфікацыя.

Але яшчэ задоўга да гэтых падзей, 28 мая 1772 г., генералу графу Захару Чарнышову быў дадзены імянны загад (наказ) з дакладнай інструкцыяй. Ён быў прызначаны генерал-губернатарам новых расійскіх зямель. Царыца загадала ўтварыць дзве новыя губерні: Пскоўскую з правінцыямі Пскоўскай, Вялікалуцкай, Дзвінскай (у якую ўключаліся Польскія Інфлянты), Полацкай (на поўнач ад Дзвіны), Віцебскай (правабярэжная Дзвіна); Магілёўскую — з правінцыямі Магілёўскай, Аршанскай, Рагачоўскай і Мсціслаўскай. І калі цэнтрам Магілёўскай губерні натуральна павінен быў стаць Магілёў, то ў Пскоўскай — чамусьці Апочка.

У наступным імянным загадзе ад 16 жніўня 1772 г. граф Чарнышоў называецца ўжо «беларускім генерал-губернатарам», якому прадпісваецца «...паміж 1-м і 7-м чыслом надыходзячага верасня месяца ўзяць у сапраўднае наша валоданне ўсе пад Расійскі скіпетр прызначаныя месцы і землі...».

Нарэшце, 23 кастрычніка 1772 г. з'явіўся афіцыйны дакумент для ўсёй дзяржавы, які абвяшчаў аб далучэнні да Расійскай імперыі ад Рэчы Паспалітай зямель, а таксама падзеле іх на Пскоўскую (губернскі горад Апочка) і Магілёўскую губерні. Губернатарамі прызначаліся: у першую — генерал-маёр Крачэтнікаў, у другую — генерал-маёр Кахоўскі...

Беларусь на сямі рубяжах. Мн., 1993. С. 20—23.

Дакументы сведчаць

З ВОПІСУ ГАНДЛЁВЫХ ШЛЯХОЎ, КІРМАШОЎ, МЫТНЯЎ І ТАВАРАЎ, ЯКІЯ КАНТРАБАНДАЮ ПРАВОЗЯЦЦА З-ЗА МЯЖЫ Ў ПОЛАЦКІМ ВАЯВОДСТВЕ І АРШАНСКІМ ПАВЕЦЕ

1765 г.

Главная таможня в Могилёве

Таможные пункты: 1-й в Чаусах, 2-й в Борисове, 3-й в Белыничах, 4-й в Быхове, 5-й, новоустановленный, в мест. Ляды, находящийся на самой московской границе, где р. Мирея отделяет Московию от Оршанского пов., на которой мельница и мост, до половины принадлежащий Московии. За мостом, на московской стороне Шелеговская корчма, при которой форпост и таможня, где пропуск для купцов, едущих из Московии в польские края.

Однако не все московские купцы там переходят, т. к. ныне в дер. Гусини Дубровенского владения, находящийся в 4 милях от Ляд над Днепром, у Московской границы по договоренности с местным гусинским арендатором, без уплаты в казну тайком перевозят на лодках товары в дер. Гусино, а потом транспортируют по Днепру до гор. Дубровна. Тот же гусинский арендатор скупает в Оршанском и Витебском пов. водку в бочках на несколько тысяч, которую в ночное время продает московитам, при чём продаёт за одну ночь 7 и более бочек водки. Казне же от этого он ничего не платит. Стража — в Погосте и Пропойске.

Перечень городов, находящихся в пов. Оршанском, в которых устраиваются ярмарки.

1. Дубровно, в которой 2 ярмарки: одна главная на соборной неделе, другая на спаса, где бывают московские купцы с разными мехами и копченой рыбой, продолжается неделю.

2. В Ляде на троицу и в день покрова. Московские купцы приезжают со своими товарами.

Белоруссия в эпоху феодолизма. Мн., 1960. С. 351—352.

З ДАКЛАДА СЕНАТА АБ ПАДЗЕЛЕ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ

1773 г., 22 жніўня

...9. Уездными ж городами, в которых правленію уездных Коммисаров быть, назначиваются следующіе:

В Могилевской Губерніи

В Могилевской провинціи местечки Шклов и Быхов. Оршанской местечки Сенное и Дубровну.

Все сіи для уездных городов назначиваемыя местечки выбраны в таком разсужденіи, чтоб уездные Коммисары весь им вверяемый уезд способно почасту объезжать и все им повелеваемы исполнять могли, и чтоб при том и каждый житель по положенію онаго не далеко правосудія и разрешенія дела своего искать принужден был.

Полное собрание законов Россійской имперіи с 1649 года. Т. XIX. 1830, л. 796.

З ДЗЁННІКА ПАДАРОЖЖА КАЦЯРЫНЫ II

...Мая 31. По утру, в 9 часов, Ея императорское Величество, по выслушании службы Божией, для дня воскреснаго, в девичьем тамошнем монастыре, на котором Ея Величество пожаловала триста рублей, изволила отправиться в путь свой в провожании графа Фалькенштейна. Обеденной стол был в городе Орше,— 17 верст, где от монастырей и церквей тамошних, православных, римских и унитских при колокольном звоне приветствуема была Ея Величество встречею духовенства в их облачении. По переправе на поромах, чрез реку Днепр, Ея Императорское Величество изволила путь свой продолжать чрез местечко Дубровну — 15 верст, принадлежавшее Литовскому великому канцлеру князю Сапеге, при въезде в которое, равно как и при выезде, поставлены были триумфальныя ворота с играющею на них музыкою; и в 6 часов по полудни, прибыла в местечко Ляды — 15 верст, на границе Могилевской губернии лежащее; где и был ночлег.

Сборник русского исторического общества. НАРБ, Т. 1. фофр, спр. 2618. С. 384—386, 409, 410.

ЦАРАДВОРЦЫ ПАДКАЗВАЛІ КАЦЯРЫНЕ II...

1) Дубровна от Орши в 17 верстах на левом берегу Днепра. В нем 4 Греческія церкви и 1 Католицкая, так же почтовой дом; тут бывают в год 3 ярмарки.

...2) Ляды от Орши в 48 верстах на левом берегу речки Мереи. В нем 2 Греческія церькви, Живодская школа и почтовой дом. Тут бывают в год 2 ярмарки.

Речка Мерея полагает в сем месте предел между пределами Смоленского наместничества и Белорусского и по сему на правом оной берегу учреждена таможенная застава.

3) Баева на правом берегу той же речки Мереи, на самых пределах. Тут 1 Греческая церковь.

... В Оршанском уезде сверх сего 24 деревни, а во всем уезде жителей 25150 и 1972 Жида.

...Все произведения по Сожу везут в низ, откуда вышед в Днепр тянутся в верх до вышеназваннаго местечка Дубровны, от коего леса перетаскивают зимним временем до Бабинович в 42 верстах от Дубровны отстоящаго, и сплавляют весною по реке Лучосе впадающей в Двину пониже Витебска как выше сказано.

Земли Могилевского наместничества хлебороднее Полотского, оне открытее, большею частію песчано-иловатыя, местами глинисты, а местами и песчаны, но больших песков мало; в прочем повсюду земля требует удобренія; удобренная ж родит обильно рожь, овес, ячмень, пшеницу, просо, конопли, которые с особливым сеют раченіем, и льняное семя. С присовокупленія сей области к Россіи земледеліе в нем весьма умножено. В 1777-м году в посеве хлеба было в Могилевском Наместничестве с лишком сто тысяч четвертей более прежних лет.

Лесами Наместничество сіе, кроме Мстиславской округи, избыточествует; ...в сих то лесах лучшія находятся мачтовые деревья, все поемныя около рек пади,— особливо же Сожа и других в него впадающих, насаждены дубом, годным на корабельное строение, которое с прочими отпускаются в Ригу. Как в сих, так и в других лесах не мало растет липы, по чему и пчелиные рои в Белоруссіи обильны. Пчельники их двоякого рода, или обыкновенные в садах и огородах ульи, или пасеки, т. е.: борти. Последней род пчеловодства хотя не столько требует присмотру, и по их приметам обильнее приносит мед; но с другой стороны невозвратной делает ущерб лучшим дубовым и сосновым деревьям.

Леса служат им и другою выгодою: береза дает деготь, сосна и ель смолу; клен, вяз, илем и грап герд-ашь; прочія же листовыя деревья обыкновенной посташь.

Глинистыми породами Наместничество сіе обильно. Каменными же произведениями не повсюду снабжена; однако около Орши и Дубровны в довольном количестве находится дробной известной камень, из коего тут и небольшие Днепровскіе составлены пороги.

К довольному скотоводству Белоруссія имеет все выгоды; низменныя места около озер, рек и множества речек, на коих везде безпорядочныя построены прежде были мельницы, составляют пажити и обильные травою луга, которые ныне осушеніем болот и расчищеніем кустарников приумножены и приумножаются. На них прозябают, хотя обыкновенныя, но здоровыя сенокосныя растенія.

Топографическія примечаніи на знатнейшія места путешествія ея императорскаго величества в Белорусскія наместничества 1780 г. при С.П.Б. Импер. Акад. Наук.

З ПЕРАПІСУ МАЁНТКАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

В Оршанской провинции

	В них по поголовной переписи				Всего
	христиан	евреев	христиан	евреев	
	в местечках		в деревнях		
Александра Сапеги, воеводы полоцкага, мест. Дубровно и Ляды с 407 деревнями	1767	722	15726	387	18602

По указу от 2 августа 1773 г. отданы онаму Сапеге обратно

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. III. Мн., 1961. С. 41.

З ПЕРАПІСУ НАСЯЛЕНЦАЎ ДУБРОЎНЫ

1782 года июля 24 дня могилевского наместничества Оршанского округа владения великого княжества литовского канцлера князя Александра Казимировича Сапеги полномочный комисар и поверенной его ж господина Сапеги полковник великого княжства литовского Г. Яцинтх Иванов сын... состоящагося 1781-го года ноября 16 дня ея императорскаго величества и в народе опубликованного манифества дал сию Скаску о состоящих в Оршанской округе в местечках Дубровно и Баево с принадлежащими к оным деревнями, мужска и женска пола не исключая самых малолетних и престарелых крестьянскаго звания людях по самой истинне без всякой утайки а будет кем... обличены явлюсь или по свидетельству найдется что кого либо утаил то обвинен положенному по указам штрафу без всякого милосердия.

Местечко Дубровна	Мужска	Женска
	лета	
Улица Скребниовская		
1. Катерина Иванова вдова		60
У нее дети:		
сын Емельян Прокофьев	2	
дочери Анна		13
Матрена		10
Ирина		8
2. Григорий Сысоев сын	69	
У него жена Прасковья Гаврилова		50
У них дети:		
сыновья		
1. Игнат	30	
У него жена Наталья Иванова		25
У них дочь Графена		1
2. сын...	20	
У него жена Дарья Григорьева		20
3-й Емельян	15	
Дочь Авдотья		10
и т. д.		
Улица Прабойная в Смоленск		
1. Яков Максимов Такар	40	
У него жена Марфа Степанова		30
сын	10	
2-й Степан Максимов Такар	30	
У него жена Агафья Зиновьева		30
У них дети:		
сыновья Павел	5	
Григорий	4	
Осип	2	
дочь Анна		10

Местечко Дубровна	Мужска	Женска
	лета	
3. Палагея Павлова вдова		60
Сын ее Антон Иванов	25	
Зять ее Семен Степанов	30	
У него жена Авдотья Иванова		20
4. Маланья Андреева		45
У нее дети: сыновья Павел	18	
Прокофий Тихонов	6	
дочь Анна		4

НАРБ, ф. 3258, воп. 16 спр. 15, л. 1, 4 ад.

З «ЗАПИСОК» ЛЬВА МІКАЛАЕВІЧА ЭНГЕЛЬГАРДА

...В 1782 году светлейшія князь Потемкин, проезжая чрез Могилев, обещал отцу моему взять меня к себе в адъютанты.

...Вот происшествіе, случившееся во время проезда его светлости. Со времени случая Зорича они между собою были непріятели; хотя князь и не имел к Зоричу ненависти, но тот всегда думал, что он к нему не благоволит; чтобы доказать противное, светлейшій князь остается в Шклове на целый день. Один Еврей просил позволенія переговорить с князем наедине; князь, не ожидая ничего важнаго, не хотел было его к себе допустить, но как тот Еврей безотвязно просил о том, то князь и велел ввести его к себе в особливую комнату. Еврей показывает сторублевую ассигнацію: «Видите ли, ваша светлость, что она фальшивая?» Князь долго рассматривал и не находил ничего: так она хорошо была подделана, подпись сенаторов и разными чернилами, казалось, не могла быть подвергнута ни малейшему сомненію. «Ну что же тут, покажи», — сказал князь. Тогда Жид показывает, что вместо ассигнація напечатано ассигиація. — «Где ты ее взял?» — «Если вашей светлости угодно, я вам чрез полчаса принесу несколько тысяч». — «Кто же их делает или выпускает?» — «Камердинер графа Зановича и карлы Зоричевы». Князь дал Еврею тысячу рублей і приказал, чтоб он променял их на фальшивыя ассигнаціи и привез бы ему на другой день в местечко его Дубровну, недавно им купленное, от Шклова по Смоленской дороге верстах в семидесяти.

Отпустив Еврея, князь притворился нездоровым и в тот же день, до выздоровленія, возвратился в Дубровну и послал за отцом моим, чтоб он туда к нему приіехал; на другой день, как скоро батюшка мой к нему явился, князь, полученный уже тогда пук ассигнацій показав ему, сказал: «Видишь, Николай Богданович, у тебя в губерніи делают фальшивыя ассигнаціи, а ты не знаешь? Как скоро я проеду Могилев, то ту же минуту поручи уголовной палаты председателю Малееву произвести следствіе, не щадя ни самаго Зорича, ежели будет в подозреніи; я для того не хочу, чтобы ты сам следовал, чтобы изысканіи вины Зорича и его друзей-плутов не был употреблен Энгельгард, мой родственник».

РДГА, фофр, спр. 1731, л. 26—29.

УЛАДАЛЬНІКІ ДУБРОВЕНШЧЫНЫ

Апошняя чвэрць XV ст.— пачатак XVI ст.	Юрый Глябович набыў Дуброўну ў вечнае карыстанне.
Першая чвэрць XVI ст.— 1549 г.	Ян Юр'евич Глябович (па спадчыне).
1549—1591 гг.	Ян Янавич Глябович (па спадчыне).
1604—1632 гг.	Мікалай Янавіч Глябовіч (па спадчыне).
1632—1669 гг.	Юрый Караль Глябович (па спадчыне).
1669—1681 гг.	Марцыбела Агінская (дачка Мікалая Глябовіча) — часткай маёнтка (па спадчыне).
1681—1690 гг.	Марцыян Агінскі (муж Марцыбелы).
1690—1693 гг.	Частку маёнтка у Марцыяна Агінскага выкупіў Казімір Сапега.

1693 г.	Сваю частку маёнтка Казімір Сапега аддаў у заклад стрыечнаму брату Марцыяна Агінскага — Сымону Каралю Агінскаму.
1669—1695 гг.	Крысціна Барбара Сапежына (дачка Мікалая Глябовіча і жонка Казіміра Яна Сапегі) — другой часткай маёнтка (па спадчыне).
1695—1701 гг.	Доля Крысціны Барбары Сапежынай па завяшчанню дасталася мужу Казіміру Сапегу і тром сынам Юрыя (Станіславу, Міхалу Францішаку і Аляксандру Паўлу).
1701—1711 гг.	Пасля вераломнага захопу Дубровенскага графства ім валодаў Людвіг Пацей.
1711—1716 гг.	Аляксандр Данілавіч Меншыкаў купіў Дубровенскае графства ў Пацея.
1719 г.	Казімір Сапега аднавіў кантроль над графствам у выніку судовага працэсу.
1720 г. — па другую палову XVIII ст.	Пасля смерці Казіміра Сапегі пачаўся падзел на часткі, заклад, драбленне Дубровенскага маёнтка паміж рознымі саўладальнікамі-нашчадкамі.
1782 г., лістапад.	Рыгор Аляксандравіч Пацёмкін набыў Дубровенскае графства ў канцлера Сапегі.
1791—1804 гг.	Ксаверый Станіслававіч Любамірскі. Набыў Дубровенскае графства ў выніку абмену на маёнтак Смелае на Украіне.
1804—1917 гг.	Дубровенскім маёнткам уладаюць нашчадкі Ксаверыя Любамірскага.

* * *

ГЛЯБОВІЧЫ, старадаўні шляхецкі род, прадстаўнікі якога ў XV—XVI ст. адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным жыцці Вялікага княства Літоўскага. Паходзяць ад мінскіх князёў.

Найбольш вядомыя:

Станіслаў (г. н. і смерці невядомы), полацкі намеснік. У 1422, 1499, 1501 гг. вёў перагаворы ў Маскве пра ўзаемаадносіны Вялікага княства Літоўскага і Рускай дзяржавы.

Ян Юр'евіч (г. н. невядомы — 1549), у 30—40-я г. XVI ст. полацкі намеснік ваявода. У 1536 г. вёў мірныя перагаворы з Рускай дзяржавай, у выніку якіх заключана перамір'е на 5 гадоў, Гомель пакінуты у складзе Вялікага княства Літоўскага, Себеж — у Рускай дзяржаве.

Ян Янавіч (г. н. невядомы — 1590), у 50—70-я г. мінскі кашталян, у 80-я г. — троцкі ваявода. У Лівонскую вайну 1558—1583 гг. узначальваў полацкія палкі. Выступаў за выбранне Івана IV Жахлівага (у 1575) і яго сына Фёдара Польскім каралём і Вялікім князем Літоўскім.

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 3. Мн., 1971. С. 521.

САПЕГІ, магнацкі род на Беларусі, прадстаўнікі якога займалі вышэйшыя дзяржаўна-адміністрацыйныя і ваенныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVIII ст. Паходзяць з полацкіх баяр. Лічыўся другім па значэнню (пасля Радзівілаў) родам. На Беларусі валодалі Чарэяй, Свіслаччу, Асвеяй, Дрысвятамі, Друяй, Коханавам, Ружанамі, Бешанковічамі, Сянном, Зэльвай, Дзятлавам, Бялынічамі, Старым Быхавам, Дуброўнай. Былі жорсткімі прыгнятальнікамі беларускага, літоўскага і ўкраінскага народаў. З XVII ст. мелі княжацкі тытул. Род падзяляўся на 2 лініі: ружанская (альбо северская і чарэйская) і кодзеньская. Першы з Сапегаў, які ўпамінаецца ў крыніцах — Сямён, пісар вялікага князя літоўскага Казіміра (40-я г. XV ст.). У канцы XVI — пач. XVII ст. перайшлі з праваслаўя (і кальвінізму) у каталіцтва. У 80—90-я г. XVII ст. спрабавалі стварыць самастойную дзяржаву з сваёй дынастыяй, што выклікала канфедэрацыю літоўскай і беларускай шляхты супраць іх. 18.11.1700 г. былі разбіты пад Алькенікамі, пазбаўлены пасад і выгнаны з Вялікага княства Літоўскага. У Паўночную вайну 1700—1721 гг. Сапегі былі на баку шведаў. У XX ст. мелі маёнткі ў Расіі і Аўстра-Венгрыі. У 1915—18 гг. прэтэндавалі на трон Літоўскай дзяржавы, якую планавала стварыць Германія; мелі сувязі з беларускім буржуазна-нацыяналістычным рухам.

Найбольш вядомыя:

Іван Сямёнавіч (1450—1517), ваявода Віцебскі з 1511 г. і падляшскі з 1513 г.; **Леў Іванавіч** (1557—7.7.1633), пісар вялікі літоўскі (1581—85), падканцлер літ. (1585—89), канцлер вял. літ. (1589—1623), ваявода віленскі з 1621 г., гетман вял. літ. (1625—33), староста слонімскі, брэсцкі, магілёўскі, адзін з арганізатараў Літоўскага трыбунала; пад яго кіраўніцтвам закончана складанне Статута Вялікага княства Літоўскага (1588), удзельнік польска-літоўскай інтэрвенцыі ў Расію ў пачатку XVII ст., павялічыў валоданні Сапегаў; **Ян Пётр** (1569—1611), староста ўсвяцкі з 1606 г., удзельнік інтэрвенцыі ў Расію ў пач. XVII ст., узначальваў войска ў час асады Тройца-Сергіева манастыра; **Казімір Леў** (1609—56), пісар вял. літ. з 1631 г., маршалак надворны літ. з 1637 г., падканцлер літ. з 1645 г., староста аршанскі, гродзенскі, слонімскі; **Павел Ян** (каля 1610—65), абозны літ. з 1638 г., падстолі літ. з 1645 г., ваявода віцебскі з 1646 г., віленскі і гетман вял. літ. з 1656 г., удзельнік руска-польскай вайны 1654—67 гг.; **Казімір Ян** (1637—1720), гетман польны літ. з 1681 г., ваявода віленскі (1682—1703, 1705—20) і гетман вял. літ. (1682—1703, 1705—08).

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 9. Мн., 1973. С. 358.

ЛЮБАМІРСКІЯ, магнацкі род, прадстаўнікі якога адыгрывалі значную ролю ў дзярж. і грамадска-паліт. жыцці Рэчы Паспалітай. Вядомы ў XV ст. Мелі маёнткі ў Польшчы, Аўстрыі, на Украіне і з канца XVIII ст. ў Магілёўскім намесніцтве (мяст. Дуброўна і больш за 400 вёсак).

Найбольш вядомыя:

Станіслаў (1583—17.6.1649), ваявода кракаўскі (з 1638), камандаваў войскамі Рэчы Паспалітай у бітве з туркамі пад Хацінам у 1621 г., з 1647 г. князь; **Юзаф** (г. н. невядомы — 1811), падстолі літоўскі; **Марцін** (г. н. невядомы — 1811), ген.-л. кароннага войска, маршалак Барскай канфедэрацыі ў Кракаўскім ваяводстве.

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 4. Мн., 1972. С. 454.

Генерал-лейтенант Князь Ксаверий Любомирский по кончине своей, оставил девятеро детей от трех жен, от первой дочерей в замужестве за Графом Центнером и маршалом Кроером, от второй сыновей князей Константина и Евгенія, дочерей в замужестве за Генерал Маіором Чорбою и Графом Струтынским, от третьей малолетних сыновей Антонія и Александра и дочь Марину.

НАРБ. ф. 3258, в I. спр. 47, т. II, арк. 971.

ДУБРОВЕНШЧЫНА Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Сацыяльна-эканамічны і культурны стан

У 1772 г., пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, усходняя Беларусь адышла да Расійскай імперыі і ўвайшла ў склад Пскоўскай і Магілёўскай губерняў. Па ўказу ад 22 ліпеня 1773 г. адным з павятовых гарадоў, «в которых правлению уездных комиссаров быть», была прызначана Дубровна Аршанскай правінцыі Магілёўскай губерні. У 1777 г. яна ўвайшла ў склад Аршанскага павета[1].

Па апісанню за 1775 г. дубровенска-га замка, які ў той час належаў вялікаму літоўскаму канцлеру князю Аляксандру Міхалу Сапегу, палац быў крыты гонтам, вокны ў ім былі белага шкла, меў ніжнюю і верхнюю галерэі. На першым паверсе былі пакоі, на другім — зала. Каля палаца былі розныя гаспадарчыя памяшканні, сад і агароды. Пры ўездзе стаяла брама.

У 1773 г. ў мястэчку былі вуліцы Старазамкавая, Шклоўская, Узваль-

ная, Перавозная, Падгорная, Ганчарная, Смаленская і іншыя. У 1802 г. акадэмік В. Севяргін пісаў, што «Дубровна есть прекрасно выстроенное небольшое местечко, знаменитое суконною фабрикою здесь находящеюся, на которой делали особливо хорошее красное сукно, но коей большая часть переведена была некогда в Новороссийск. Здесь делают также хорошее пиво. Многие занимаются пилением леса»[2].

У 1780 г. праз Дуброўну праязджала Расійская імператрыца Кацярына II, пры ўездзе і выездзе ў мястэчка знаходзіліся трыумфальныя вароты, гралі музыкі. 10 лютага 1782 г. ў Беларусі было загадана заснаваць новыя дарогі. У 1786 г. ў Дуброўну быў прызначаны паштмайстар шляхціц Крыжаноўскі, у 1788 г. ў мястэчку была паштовая кантора, якую ў гэтым годзе і скасавалі[3].

У лістападзе 1782 г. канцлер Сапега падпісаў пагадненне з князем Рыгорам Пацёмкіным аб продажу яму Дубровенскага графства за 5 800 000 злотых.

З 80-х гадоў дзейнічалі ў м. Дуброўна суконная, пазументная і гадзіннікавая фабрыкі, якія належалі князю Пацёмкіну. На суконнай працавала каля 300 чалавек прыгонных.

У 1794 г. Магілёўскі губернатар С.Вязміцінаў паведамляў графу Зубаву, што «крестьянские семейства Дубровенской суконной, часовой и позументной фабрик и свечных мастеров, по открытию первого подножного корму, из прежних своих жилищ в Екатеринослав отправлены»[4].

У «Экономических примечаниях для генерального межевания Могилёвской губернии» (складзены ў 1800–1802 гг.) пры апісанні горада Оршы сказана, што «коженных заводов не



Дуброўна. Малюнак 1784 г.

имеется, а привозятся в оный город разного сорта кожи из города Могилёва и его уезда, местечка Шклова, до онаго уезда местечка Дубровны юфтяных черных больших до 100, малых — до 500 штук... Гончарных не имеется, а привозят из города Копыси и из местечка Дубровны и ежегодно расходится до 2000 разного сорта. Кафельных заводов тоже не имеется, а для нужного случая привозят оного же местечка Дубровны и кафель расходится не более до 500 штук»[5].

М. В. Без-Карніловіч у гістарычнай даведцы аб Дуброўне піша, што ў мястэчку ў 40-х гадах XIX ст. быў касцёл, шэсць праваслаўных цэркваў, сінагога, а таксама бальніца на 40 ложкаў[6].

У пачатку жніўня 1812 г. французскае войска на чале з Напалеонам супынялася каля мястэчка Расасна, адтуль пайшло на Ляды ў бок Краснага. Свяшчэннік прыходскай царквы м. Расасна Дзмітрый Бруевіч потым казаў, што калі Напалеон быў у мястэчку, царкву наведалі два генералы. У лістападзе, адступаючы, Напалеон зноў аказаўся ў гэтых месцах. У м. Ляды знаходзіўся яго штаб, тут французы знайшлі і некаторую колькасць харчавання. 18 лістапада Напалеон пакінуў Ляды і прыбыў у м. Дуброўну. Па выступленні з Дуброўны, у моцны мароз, Напалеон некаторы час ішоў пешшу, потым звярнуўся з прамовай да сваёй старой гвардыі. Затым ён быў у маёнтку Цеалін, які належаў графу Феліксу Струтынскаму, які у той час быў падпрэфектам французскага ўрада. Пасля вайны многія гарады і вёскі Беларусі былі разбураны. «Праедзеш Оршу, Дуброўну, Барысаў, Мінск, — пісаў рускі афіцэр Ф. Глінка, — і нічога не заўважыш, апрача... паўсюднага разбурэння — немінучага выніку вайны»[7].

У першай палове XIX ст. ў прамыс-



Дубровенскі замак (злева). Малюнак 1784 г.

ловых адносінах мястэчка Дуброўна не ўступала і некаторым гарадам. З 1793 г. па 1861 г. дзейнічала ў мястэчку суконна-талесная мануфактура (да 1817 г. яе ўладальнікамі былі князі Любамірскія). У 1817 г. яна размяшчалася ў 2-павярховым мураваным будынку, з 1847 г. — у драўляным. Вырабляла талесы і арбаканфосы. Воўна набывалася за мяжой і ў навакольных маёнтках, фарбы і клей — у Маскве. У 1809 г. дзейнічалі 23 ткацкія станкі, у 1814 г. — 31, у 1855 г.— 12. У 1793 г. працавалі 285 рабочых; у 1809 г.— 312 (выраблена 24,9 тысячы аршын тканін); у 1814 г.— 261 (выраблена 20 тысяч аршын). Вырабы славіліся добрай якасцю.

У 1819—1851 гг. дзейнічала і другая суконна-талесная мануфактура, уладальнікам якой быў Евяльсон. Яна таксама вырабляла талесы і арбаканфосы. У 1819 г. на 12 станках працавалі 103 чалавекі. У 1830 г. з 10 рабочых было 3 малалеткі. Уладальнікамі трэцяй суконнай мануфактуры былі Гінзбург і Евяльсон. У 1817 г. на 25 станках працавала 109 чалавек, усе вольнанаёмныя, у тым ліку майстар, 2 падмайстры, 25 ткачоў, 10 памочнікаў ткача, 3 часальшчыкі воўны, 50 прадзільшчыкаў, 18 чорнарабочых; было выраблена прадукцыі на 18,1 тысячы рублёў.

У пачатку XIX ст. ў м. Ляды дзейнічала друкарня.

Значна было развіта вінакурэнне. Яно давала князю Любамірскаму значную частку даходаў. У 1809 г. прыбыткі Дубровенскага графства князя Канстанціна Любамірскага былі: ад фальваркаў — 30 144 руб. 31 кап. (або 43,9%); ад гарэлкі — 12 248 руб. (17,8.%); чынш і даніна — 26 262 руб. 78 кап. (38,3%); у 1830 г. — ад фальваркаў — 68 102 руб. 61 кап. (37,8%); ад гарэлкі — 77 843 руб. 67 кап. (43,3%); ад арэнды — 2460 руб. 58 кап. (1,4%), чыншы і даніна — 31 600 руб. 59 кап. (17,5%)[8].

Наогул князі Любамірскія мелі ў пачатку XIX ст. (Дуброўна і іншыя маёнткі) 13 300 валок зямлі і лесу і 2[illegible] 232 прыгонных сялян. Прыбыткі з гэтага, напрыклад у 1811 г., былі 33[illegible] 708 руб. 67 кап9.

У 1860 г. ў мястэчку Дуброўна быў 1001 дом (з іх каменных 3), жыхароў — 6884. У тым ліку праваслаўных — 2623, католікаў — 74, пратэстантаў — 1, іудзеяў — 4183. Цэрквы было 6 (з іх каменных 3), каменны касцёл і капліца, драўляная яўрэйская сінагога і 13 яўрэйскіх малітоўных школ. На паштовай станцыі прымалася і выдавалася розная карэспандэнцыя. Мелася вольная аптэка, правізарам якой быў Рэйнгольд. Пры эканамічнай бальніцы медыкам служылі А. В. Багушэўскі. Быў і яшчэ адзін урач — А. Ф. Жураўковіч. У мястэчку знаходзілася кватэра прыстава 2-га стану і конны этап. З навучальных устаноў былі казённае яўрэйскае вучылішча 1-га разраду і сельскае вучылішча пры Нікольскай царкве. З прамысловых прадпрыемстваў працавалі 4 талесныя фабрыкі, 4 піваварныя заводы, 2 вадзяныя млыны. Кірмашы праводзіліся ў нядзелю, сераду і пятніцу. Праз раку Днепр хадзіў паром. Належала мястэчка князю Аляксандру Ксавер'евічу Любамірскаму. 28 мая 1884 г. ў Дуброўне, у раёне Задняпроўскай слабады, узнік вялікі пажар, у выніку якога згарэла 30 двароў.

У мястэчку Расасна было 86 драўляных дамоў, 691 жыхар. У тым ліку праваслаўных — 405, іудзеяў — 286 чалавек. Тут меліся адна драўляная царква, яўрэйская малітоўная школа і вадзяны млын. Належала яно таксама А. К. Любамірскаму.

У мястэчку Ляды налічвалася 348 драўляных дамоў з 2741 жыхаром. Праваслаўных было 636 чалавек.

іудзеяў — 2104 чалавекі. У мястэчку былі 2 драўляныя праваслаўныя царквы і 4 яўрэйскія малітоўныя школы. Паштовая станцыя. Стаялі тут этапны дом і вадзяны млын. Кірмашы былі Духаўскі (са дня Сашэствія Св. Духа на 4 дні); Ільінскі 20 ліпеня; Пакроўскі 1 кастрычніка. На кожны кірмаш прывозілася тавараў на суму да 3 тыс. руб. срэбрам і на столькі ж прадавалася. Належала яно князям Уладзіславу, Яўгену і Івану Яўгенавічам Любамірскім.

У мястэчку Баева было 57 драўляных дамоў і 366 жыхароў. З іх праваслаўных — 236, іудзеяў — 130. Праваслаўная драўляная царква і яўрэйская малітоўная школа, вадзяны млын. Належала яно князям Стэфану, Яўгену, Уладзіславу і Івану Яўгенавічам Любамірскім[10].

19 лютага 1861 г. былі падпісаны Маніфест і «Палажэнні» аб адмене прыгоннага права. На Магілёўскую губерню распаўсюджвалася «Палажэнне для губерняў вялікарасійскіх, навараасійскіх і беларускіх». У губерні былі ўстаноўлены вышэйшыя і ніжэйшыя памеры надзелаў ад 4 да 5,5 дзесяцін, да 1 — 2 дзесяцін на душу мужчынскага полу. Паншчына ўстанаўлівалася ў памеры 40 дзён мужчынскіх і 30 дзён жаночых у год з надзелу на душу. Дзесяціна зямлі па выкупу ў Магілёўскай губерні была крыху больш за 8 руб. Аднак сяляне заставаліся часоваабавязанымі і ў значнай меры залежалі ад памешчыка, за якім захоўвалася права апекі над сялянамі і прадстаўніцтва іх інтарэсаў на судзе. Агульнае «Палажэнне» вызначала парадак кіравання сялянамі. Сяляне, якія жылі на зямлі аднаго памешчыка, як правіла, складалі адну сельскую абшчыну, якая на сходзе выбірала сельскага старасту і іншых службовых асоб. Сельскія старасты падпарадкоўваліся валасному праўленню, улада якога пашыралася на сялян вёсак, што, як правіла, адносіліся да пэўнага царкоўнага прыходу. На валасных сходах сельскія старасты і выбраныя ад сельскай грамады (па адным ад 10 дамоў) выбіралі валаснога старшыню.

Тэрыторыя сучаснага Дубровенскага раёна прыходзілася на Дубровенскую, Баеўскую, Холбнянскую, Сваташыцкую воласці Горацкага павета і Высоцкую і Нова-Тухінскую воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні. Самым буйным землеўладальнікам на гэтай тэрыторыі заставаўся князь Яўген Яўгенавіч Любамірскі. Ён валодаў 9 маёнткамі, сярод якіх былі Дуброўна і Станіславова, усяго меў зямлі 27 725 дзесяцін, з іх пад лесам — 10 184, пад ворывам — 2762, пад сенажаццю — 2884, а таксама 11 вадзяных млыноў і 3 бровары, якія прыносілі гадавы даход 13 100 руб.

Сяляне Баеўскай і сумежных валасцей Горацкага павета ў складзе 43 вёсак, належаўшых да ўладанняў князя Я. Любамірскага, былі надзелены зямлёй і здзейснілі выкуп да ўказа 2 лістапада 1863 г. аб абавязковым выкупе і, вядома, не на падставе выкупнога акта, а па добраахвотнаму выкупному дагавору. Дагавор быў зацверджаны, выкупная сума атрымана памешчыкам і ўсякія абавязковыя адносіны князя з сялянамі перапыніліся. Між тым, у сялян не хапала каля 1500 дзесяцін неабходных угоддзяў, за карыстанне якімі яны павінны былі або плаціць асобна, або адпрацоўваць, і па гэтай прычыне ў іх накапілася к 1872 г. вялікая нядоімка, у адной толькі Баеўскай воласці ў 57 тыс. руб. Памешчык князь Любамірскі ў прысутнасці Горацкага з'езда міравых пасрэднікаў падпісаў пагадненне, у якім ён абавязваўся не толькі дабавіць зямлі, якой не хапала, але і дабавіць звыш таго. Міравы з'езд к канцу 1872 г. 39 вёскам бязвыплатна дабавіў 4023 дзе-

сяціны зямлі, а вялікая нядоімка пачала паступова змяншацца[11].

У 1863 г. на тэрыторыі Беларусі і ў Літве ўспыхнула нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць царызму. У захопе павятовага горада Горкі прымалі ўдзел і «группа мятежников» з фальваркаў князя Любамірскага, аднак ім удалося даказаць сваю недатычнасць да паўстання.

Павялічвалася колькасць навучальных устаноў. У 1869 г. было адчынена Баеўскае народнае вучылішча, працягвала сваю дзейнасць дубровенскае яўрэйскае вучылішча, заснаванае ў 1852 г. У 1888 г. ў дубровенскім народным вучылішчы навучаліся 87 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак, настаўнік — А. Станішэўскі і законавучыцель В. Трусевіч; у Сваташыцкім — 49 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі (М. Нікалаевіч і Д. І. Забелін); у Баеўскім — 40 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак (К. І. Венграў і С. Ф. Вяліча); у дубровенскім аднакласным яўрэйскім вучылішчы было 107 вучняў (настаўнік Н. С. Рабіновіч). У Ляднянскім прыватным вучылішчы вучылася 20 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі, настаўнікам і ўтрымальнікам яго быў А. Рыўкін[12].

Прыходскімі праваслаўнымі царквамі былі: Ляднянская Свята-Духаўская, прыхажан — 2330 чалавек, да яе была прыпісана Пакроўская царква (пабудавана ў 1745 г.); Дубровенская Барыса-Глебская (пабудавана ў 1824 г.), прыхажан — 2174 чалавекі; Дубровенская Мікалаеўская (у XVIII ст.) — 2979 чалавек; Дубровенская Праабражэнская (1715 г.) — 1918 чалавек; Дубровенская Траецкая (1812 г.) — 967 чалавек; Сваташыцкая Вазнясенская (1838 г.) — 2667 чалавек; Чырынская Уваскрасенская (1863 г.) — 2797 чалавек; Баеўская Вазнясенская (1863 г.) — 2916 чалавек; Міхалінаўская Свята-Духаўская (1865 г.) — 2877 чалавек; Нова-Тухінская Мікалаеўская, прыхажан 2565 чалавек.

У мястэчках і вёсках, дзе былі прыходскія цэрквы, у 80-х гадах XIX ст. адчыняліся царкоўна-прыходскія школы, а ў больш аддаленых вёсках, дзе не было цэркваў, адчыняліся школы пісьменнасці. У Дубровенскім Праабражэнскім прыходзе была царкоўна-прыходская школа (ЦПШ), у якой вучылася 18 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак; у Дубровенскай Траецкага прыхода — 6 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі; у Дубровенскай Барыса-Глебскага прыхода — 48 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі; у Ланенцы — 9 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка; у Лядах — 34 хлопчыкі і 1 дзяўчынка; у Савінскай — 36 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі; у Чырынскай — 20 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі; у Нова-Тухінскай — 9 хлопчыкаў і 11 дзяўчынак. Школы пісьменнасці былі ў сяле Дабрынь, вёсках Мужычая і Сярэдняя Дзяцель, Пнявічы, Чырвоная Слабада, Халалееўка, Загваздзіна, Бахава, Пішчыкі, Гудава Зямянскае, Быстрыёўка, Каровіна, Пуцяціна, Асташкавічы, Засценкі, Кісялі[17].

Акрамя м. Дуброўна сельская лячэбніца была ў с. Сваташыцы на 20 ложкаў. Аптэкі былі ў Дуброўне і Лядах. Дубровенскі аптэкар Рэйнгольд быў вядомы тым, што лічыўся адным з лепшых пчаляроў у Магілёўскай губерні, у 1877 г. ён трымаў 180 вулляў. На яго пчальніку былі пчолы, прывезеныя з Мінскай губерні[18].

У другой палове XIX ст. на тэрыторыі раёна дзейнічалі гарбарныя, суконныя, мукамольныя прадпрыемствы. Так, у м. Дуброўна ў 80-х гадах уладальнікамі гарбарных прадпрыемстваў былі сяляне Максім Радчанка (заснавана ў 1860 г., 3 майстры, валавы прыбытак 560 руб. у год) і Дзяніс Кароткін (заснавана ў 1860 г., 5 майстроў, прыбытак 1065 руб.). У Лядах уладальнікамі былі мяшчане Залман

Эйдзінаў (заснавана ў 1845 г., 1 майстар, 3 рабочых, 1800 руб. даходу), яго ж (заснавана ў 1871 г., 1 майстар, 2 рабочых, 1000 руб. прыбытку); Нота Эйдзінаў (заснавана ў 1856 г., 1 майстар, 2 рабочых, 1000 руб. прыбытку); Гершэна Засценкіна (заснавана ў 1870 г., 1 майстар і 1 рабочы, 750 руб. прыбытку).

У Дуброўне працягвала дзейнасць самая лепшая ў губерні талесная фабрыка. Талесная тканіна (белая з чорнымі палосамі, якой пакрываліся ў час малітвы яўрэі) адрознівалася незвычайнай тонкасцю, трываласцю і выраблялася з вышэйшых гатункаў чыстай воўны. Маткі каляровай, белай і чорнай воўны атрымлівалі з Масквы. Сукнавальні былі ў мястэчку Расасна (уладальнік князь Я. Любамірскі, заснавана ў 1881 г., 1 рабочы, валавы прыбытак 200 руб., арэндатар мешчанін Абрам Нахмансон, за арэнду плаціў 300 руб); у мястэчку Баева (уладальнік той жа, заснавана ў 1831 г., 1 рабочы, прыбытак 60 руб., арэндатар купец Гамшэй Гіндлін, 900 руб.); у с. Міхалінава (яго ж, 1876, 1 рабочы, прыбытак 50 р., арэндатар той жа); у с. Кісялі (яго ж, 1880), 1 рабочы, 50 руб., мяшчане Сураз і Марковіч); у в. Казарынава (уладальнік — сялянскае таварыства, 1878, 1 рабочы, 60 руб., мешчанін Беніамін Цыпік). У 1890 г. дзейнічала ў Дуброўне трыкатажная фабрыка, на якой працавалі 96 рабочых[15].

У Горацкім павеце запас збожжа, азімага і яравога, знаходзіўся ў 6 цэнтральных і 120 сельскіх запасных магазінах. У 1885 г. ў Дубровенскай воласці было 17 сельскіх збожжазапасных магазінаў, у якіх было зерня азімага 1450 чвэрцяў, яравога — 665; у Сваташыцкай — 1 цэнтральны, 2387 чвэрцяў азімага і 1209 яравога; у Баеўскай — 1 цэнтральны, 1921 чвэрць азімага і 825 яравога; у Хобнянскай — 1 сельскі збожжазапасны магазін, 1585 чвэрцяў азімага і 970 яравога. Сяляне выключна займаліся земляробствам, якое было далёка не ў лепшым стане, што абумоўлівалася невысокай пладароднасцю глебы і недахопам жывёлы.

Вадзяныя млыны былі ў мястэчках Ляды і Баева, сёлах Міхалінава і Кісялі, вёсках Асташкавічы, Казарынава, ветраныя млыны — у вёсках Асташкавічы, Сукіна і інш.[16]

У 1886 г. адбыліся хваляванні сялян в. Казьяны Холбнянскай воласці. 2 ліпеня 1886 г. магілёўскі губернатар Дэмбавецкі пісаў міністру ўнутраных спраў: «Общество крестьян д. Козьяны Горецкого уезда Холбнянской волости в числе 60 дворов отказалось платить в экономию князя Евгения Любомирского согласно договору деньги за правопользование 136 дес. экономической земли, вследствие чего состоялось судебное решение о присуждении в пользу экономии 400 руб., каковую сумму ответчики добровольно не уплатили, и судебным приставом описаны, назначено в продажу на 23-е минувшего июня месяца движимое имущество крестьян, разрешенное к продаже уездным по крестьянским делам присутствием как на необходимое для поддержания хозяйства... Уездный исправник с 2 становыми приставами, урядником, вызвав всех соседских сотских и десятских, местного волостного старшину, и на месте встретил открытое противодействие крестьян исполнению продажи их имущества, а именно описанное имущество крестьяне вывезли из дворов, скрыли... но силою не допустили розыск такового... Я убедился, что этот случай неповиновения крестьянского общества д. Козьяны имеет в своей основе общее недовольство против владельцев Любомирских». Губернатор вырашыў выслаць у вёску 2 роты

з 42-й пяхотнай дывізіі і самому наведаць вёску, каб не было дурнога прыкладу для іншых сялянскіх таварыстваў[17].

У 1896 г. пачалося перасяленне сялян у Сібір. Гэта было звязана з недахопам зямлі, павелічэннем праслойкі беззямельных сялян, слабым развіццём саматужных промыслаў, зменшылася высечка лясоў.

У 1897 г. ў Расійскай імперыі прайшоў першы агульны перапіс насельніцтва. Па гэтаму перапісу на тэрыторыі раёна было 218 населеных пунктаў рознага тыпу (мястэчкі, сёлы, вёскі, маёнткі, фальваркі і інш.) з колькасцю насельніцтва каля 50 тыс. чалавек. У Дуброўне ў 1897 г. налічвалася 1161 двор, 1247 жылых дамоў, 8053 жыхары (мужчын 3855, жанчын 4198). У мястэчку было 6 праваслаўных цэркваў, 2 часоўні, касцёл, сінагога, 17 яўрэйскіх малітоўных дамоў, 4 багадзельні пры праваслаўных цэрквах і 1 яўрэйская багадзельня, яўрэйскае пачатковае вучылішча, народнае вучылішча, царкоўна-прыходская школа і 3 школы пісьменнасці, прыёмны пакой, валасное праўленне, паштовая станцыя, 4 збожжазапасныя магазіны; заводы: 6 гарбарных, 2 цагельных, мылаварны, 2 гаршэчных; 41 кузня, 3 вадзяныя млыны; 135 гандлёвых лавак; 2 пастаялыя двары, 1 харчэўня, 2 карчмы, 2 вінныя лаўкі, 1 оптавы склад гарэлкі.

У Лядах — 599 жылых дамоў і 4434 жыхары (мужчын 2155, жанчын 2279). У мястэчку 4 праваслаўныя царквы, 8 яўрэйскіх малітоўных школ, 2 багадзельні пры царквах, царкоўна-прыходская школа, прыёмны пакой, паштова-тэлеграфная станцыя, 2 гарбарныя заводы, вадзяны млын, 2 крупадзёркі, 82 гандлёвыя лаўкі, 4 пенькатрапальні, 11 кузняў, 3 маслабойні; 2 пастаялыя двары, карчма, 2 піўныя лаўкі; падвал для гарэлкі. Кірмашы на Духаў Дзень, 1 жніўня і 1 лістапада, базары ў нядзелю.

У Расасне — 148 двароў, 167 жылых дамоў, 1023 жыхары (мужчын 512, жанчын 511), 2 праваслаўныя царквы, яўрэйскі малітоўны дом, багадзельня пры царкве, царкоўна-прыходская школа, збожжазапасны магазін, вадзяны млын, 3 кузні, 7 гандлёвых лавак, карчма; таржкі 23 красавіка і 1 кастрычніка.

У м. Баева было 145 жылых дамоў, 892 жыхары (мужчын 432, жанчын 460), 2 праваслаўныя царквы, часоўня; яўрэйская малітоўная школа, багадзельня пры царкве, царкоўна-прыходская школа, фельчарскі ўчастак, валасное праўленне, 2 збожжазапасныя магазіны, вадзяны млын, сукнавальня, крупадзёрка, 3 ветраныя млыны, 6 кузняў, 6 гандлёвых лавак, карчма, кірмаш раз у год, базары ў нядзелю.

На тэрыторыі цяперашняга Дуброўенскага раёна былі 2 вінакурныя заводы ў фальварках Станіславова і Усвяты, цагельны завод у фальварку Ступакі; крупадзёрка ў в. Жалезкава; сукнавальні з вадзянымі млынамі ў Кісялях і фал. Слатаўшчына, вадзяныя млыны — у с. Кісялі, в. Казарынава, сядз. Міхалінава, маён. Арловічы, фал. Каралін, сядзібах Якуціна, Сетаўка; ветраны млын у пас. Кулакоўшчына, паравы млын у фал. Заполле, кузні былі ў фал. Станіславова, фал. Казьяны, в. Сенцюры, в. Заволны, Заполле, в. Новае Сяло, в. Красная Слабада. Збожжазапасныя магазіны былі ў в. Старое Ганчарова, Якіменкі, Буда, Копці, Чубакова, Рыбалтова, с. Малое Савіна, в. Вялікае Савіна, Ерамееўшчына, с. Красная Слабада, в. Хандогі, Гуракі, Баброва, Бурая. У в. Старое Ганчарова сяляне займаліся бандарным промыслам, а ў в. Новая Ганчарова рабілі калёсы. Пастаялыя двары — с. Чырына, пас.

Быстрыёўка, в. Дзяцель мужычая, в. Дабрынь, сядз. Гуракі, сядз. Сетаўка; корчмы ў в. Красная Слабада, в. Заволны, сядз. Казьяны, в. Асташкавічы, в. Жалезкава, в. Кісялі, фал. Сваташыцы, с. Літвінава, с. Новая Тухінь, с. Холбні, в. Макараўка, в. Чыжоўка, в. Загваздзіна, сядз. Усвяты, фал. Слатаўшчына, фал. Жалезкова. Цэрквы — с. Міхалінава, 2 — у с. Ланенка, Хоміна, Кісялі, Чырына. Часоўні — с. Чырына, в. Кобызева, 2 у фал. Зарубы; капліцы — фал. Хоміна, в. Старое Ганчарова, сядз. Жалезкава; багадзельні — фал. Хоміна, с. Чырына, с. Новая Тухінь, с. Холбні, с. Літвінава, с. Сваташыцы, с. Малое Савіна, Міхалінава. Царкоўна-прыходскія школы — с. Чырына, в. Кобызева, в. Красная Слабада, Хоміна, с. Ланенка, Міхалінава, Глебава, в. Вячэрына, в. Пішчыкі, в. Быстрыёўка, в. Пуцяціна, в. Кляны, в. Радзякі, в. Дзяцель мужычая, в. Дзяцель Вялікая, в. Дзяцель Малая Зямянская, в. Пневічы, в. Волева, в. Гудава мужычае, в. Гудава Зямянскае, в. Пасудзева, в. Бахава Вялікае, в. Сішчава, с. Малое Савіна, с. Літвінава; народныя вучылішчы былі ў с. Новая Тухінь, Холбні, Сваташыцы; школы пісьменнасці — с. Новая Тухінь, в. Старое Ганчарова, в. Стражава, в. Шалашына, в. Баброва, в. Буроя, в. Чыжоўка, в. Загваздзіна. Ваенныя праўленні — с. Новая Тухінь, Холбні, Сваташыцы. Цэнтральная бальніца ў с. Сваташыцы. Кірмашы праводзіліся ў с. Чырына (1 жніўня), с. Сваташыцы (у дзень Вазнясення Гасподня і 20 ліпеня), с. Красная Слабада (9 мая), с. Малое Савіна (на Вазнясенне), с. Ланенка (1 кастрычніка), Хоміна (на Вазнясенне), в. Чубакова (у 12 пятніцу пасля Пасхі). Царкоўныя святы адбываліся ў с. Літвінава (23 красавіка і 29 чэрвеня), с. Холбні (9 мая)[18].

У 1900 г. ў Дуброўне акцыянерным таварыствам «Дняпроўская мануфактура» была заснавана тэкстыльная фабрыка. Яна выпускала баваўняныя, шаўковыя, джутавыя тканіны, пражу. У 1908—13 гг. тут былі паравыя рухавікі, працавала 488 рабочых, 160 ткацкіх станкоў, штогод вырабляласяпрадукцыі на 623—625 рублёў. У 1910 г. на фабрыцы рабілі толькі набіўку тканін і займаліся ткацтвам, асноўны капітал прадпрыемства склаў 1020 тысяч рублёў. Дзейнічалі цэхі — ткацкі, фарбавальны, набівачны і апрэтурны[19].

А. Філатава.

Крыніцы:

1. Полное собрание законов Российской империи. Т. XIX. СПб., 1830. С. 799. Т. XX, СПб., 1830. С. 514.

2. НАРБ. Ф. 3258. Воп. 1. Спр 14. Л. 1—3; Спр. 33. Л. 5. ад, 7 ад, 9 ад, 10 ад, 14 ад, 16 ад і 19 ад; Севергин В. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда чрез оныя в 1802 году. СПб., 1803. С. 140.

3. Сборник русского исторического общества. Т. 1. СПб., 1867. С. 409—410; Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. СПб., 1855. С. 264, 270.

4. Болбас М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988. С. 79; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 217—221.

5. Е. П. Закалинская. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII века. Могилев, 1958. С. 48.

6. Живописная Россия. Т. III. СПб., 1882. С. 415; Без-Корнилович М. В. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. СПб., 1855. С. 219, 220; Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. VIII. Ч. III. СПб., 1848. С. 5.

7. Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года под редакцией К. Военскаго. Т. III. СПб., 1912. С. 17, 18; Живописная Россия. Т. III. СПб., 1882. С. 312; Арманде Коленкур. Мемуары. Поход Наполеона в России. Смоленск, 1991. С. 240, 241. Глинка Ф. Письма русского офицера 1812 г. Смоленск, 1946. С. 249.

8. Болбас М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988. С. 78, 79, 242; Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 297; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 60.

9. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 60.

10. Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 г. Могилев, 1861. С. 12, 59, 61, 62, 69—73; НАРБ. Ф. 2005. Воп. 1. Спр. 285. Л. 1.

11. Гісторыя Беларускай ССР. Т. II. Мн., 1972. С. 26, 27, 29; Памятная книжка Могилевской губернии на 1893 г. Могилев, 1885. С. 110, 132, 133; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II. Мн., 1940. С. 636; Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 1. Могилев, 1884. С. 11, 12.

12. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1873/74 уч. год. Вильна, 1873. С. 616, 652; на 1889/90 уч. год. С. 217, 218, 223, 224.

13. Календарь для духовенства Могилевской епархии. Могилев, 1893. С. 97—99, 115; Отчет о церковно-приходских школах Могилевской епархии за 1889-90 уч. год. Могилев, 1891. С. 87—91, 133.

14. Список населенных местностей и краткий статистический обзор Горецкого уезда Могилевской губернии. Могилев, 1886. С. 32; Опыт описания Могилевской губернии. Кн. II. Могилев, 1884. С. 614.

15. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. II. С. 152, 157, 158, 276; Болбас М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988. С. 79.

16. Список населенных местностей и краткий статистический обзор Горецкого уезда Могилевской губернии. Могилев, 1886. С. 32, 33, 34; НАРБ. Ф. 2005. Воп. 1. Спр. 371. Л. 212.

17. Белоруссия в эпоху капитализма. Т. 1. Мн., 1983. С. 238, 239.

18. РДГА ў Пецярбургу. Ф. 1299. Воп. 11. Спр. 1347. Л. 2, 4, 5, 7, 246, 471а, 253, 254, 260, 266, 331, 333, 345, 354, 544, 554, 585, 553, 559, 562, 571, 456, 241, 258, 440, 252, 553, 437, 438, 488, 243, 244, 248, 249, 250, 251, 255, 259, 252, 469, 535, 565, 556, 325, 448, 261, 548, 569; спр. 1359, л. 527, 469, 473, 503, 462, 424, 537, 380, 472, 373, 548, 328, 332, 335.

19. Болбас М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988. С. 79.

Новыя гаспадары

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай усходняя Беларусь адышла да Расійскай імперыі. Новыя гаспадары адразу ж распрацавалі ўмовы і прынцыпы правядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу гэтых зямель у адпаведнасці з тагачасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам Расіі. Тычылася гэта і Дубровеншчыны. Прымаліся меры па ўздыму вытворчага і эканамічнага патэнцыялу новадалучаных тэрыторый, арганізацыі мануфактурнай прамысловасці, дарожных зносін і сродкаў сувязі. Развіваліся рамёствы і адыходныя промыслы. Рабіліся канкрэтныя захады па ўпарадкаванню феадальнай эксплуатацыі сялян як з боку землеўласнікаў, так і з боку дзяржавы, якая мела найпершым клопатам каб «обедневшие или же больные селяне не разошлись и сохранили возможность нести повинность в нашу пользу». Уводзілася сістэма асветы, аховы здароўя, праяўляўся клопат аб захаванні канфесійнай раўнавагі. Адпрацоўвалася сістэма і яе элементы ўнутрытэрытарыяльнага і пагранічнага рэжыму. Для ўсяго гэтага патрабавалася шмат энергічных і дзелавых людзей. Асабліва ўзрос на іх попыт пасля таго, як многія былыя гаспадары маёнткаў і фальваркаў, адмовіўшыся прысягаць Кацярыне II, пераехалі ў Рэч Паспалітую. У вырашэнні гэтага пытання руская імператрыца пайшла праверaным шляхам: пачала раздаваць на далучаных землях шчодрыя надзелы для сваіх надзейных людзей з бліжэйшага акружэння, а таксама таленавітым дзяржаўным дзеячам і служачым вышэйшага рангу. Не забывала яна і самую верную сваю апору яшчэ з часоў дзяржаўнага пераваротy — гвардыю.

У выніку гэтага на Беларусі апынуліся князь Пацёмкін, граф Чарнышоў, будучыя губернатары Кахоўскі і Крачэтнікаў, архіепіскапы Георгій Каніскі і Станіслаў

Богуш-Сестранцэвіч. Падтрымалі іх у правядзенні пераўтварэнняў Генеральны штаб, Акадэмія навук, тагачасныя грамадскія арганізацыі Расіі, таленавітыя мясцовыя сілы.

Гэта дало магчымасць ўжо да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай многае зрабіць на заваяваных тэрыторыях. У 1802 г. акадэмік В. Севяргін вось што пісаў пра Дуброўну: «Дубровно есть прекрасно выстроенное небольшое местечко, знаменитое суконною фабрикою здесь находящеюся, на которой делали особливо весьма хорошее красное сукно, но коей большая часть переведена некогда в Новороссийск. Здесь делают также хорошее пиво. Многие занимаются пилением леса». (Севергин В. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или минералогические хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 году. СПб., 1803. С. 140).

А вось што датычыцца Дуброўны як штатнага цэнтра павятовага камісарства з 22 ліпеня 1773 г., дык ужо праз год рускай уладзе давялося рабіць значную карэкціроўку, паколькі згодна з Указам Кацярыны II ад 1 чэрвеня 1773 г. яна разам з Лядамі спачатку была ўзята ў казённае ўпраўленне, а 2 жніўня 1773 г. вернута іх папярэдняму ўладальніку Аляксандру Сапегу, полацкаму ваяводзе, з 407 вёскамі, у якіх пражывалі 18 602 жыхары.

Як вынікае з «Ведомости... мест, в которых находятся ныне уездные комиссарствы и куда некоторые из них к перенесению представляются...», новым штатным цэнтрам павятовага камісарства была прызначана Рудня Бабінава Бабінавіцкага староства з 70 жыхарамі, перададзеная ў пажыццёвую арэнду пану Бучынскаму (ЦГАДА, ф. 16, стр. 7630, л. 9, 10).

Шмат зрабіў для развіцця беларускіх зямель граф Захар Рыгоравіч Чарнышоў, які быў прызначаны Кацярынай II генерал-губернатарам Беларусі. Асабліва праявіўся яго талент у арганізацыі на тэрыторыі Беларусі паштовай сувязі і дарожнага будаўніцтва. Як адзначае Без-Карніловіч, «...Генерал-Аншеф Граф Захарий Григорьевич Чернышев, приняв в свое управление Белоруссию, прежде нежели приступил до установления в ней постоянных почт, занялся устройством для них дорог, которых оказалось весьма мало, да и те были узки, извилисты, и не везде удобны для проезда. По его распоряжению землемеры вехами обозначили направление и ширину новых почтовых дорог: мерою определили их длину, указали места, где быть почтовым домам, и на каждых 700 саженях поставили верстовые столбы. (По всей Белоруссии почтовые перегоны между станциями первоначально были назначены семисотными вёрстами, а потому и все вёрсты на маршрутах тогдашнего времени надо считать семисотными вёрстами. — Тут і далей заўвагі Без-Карніловіча. — *А. Я.*) Там же, где оканчивались 7 вёрст, складывали на известке каменную из кирпича пирамиду, высотою в 1 1/2 сажени, означавшую милю. (Белорусская миля содержала в себе 7 вёрст.)

Распоряжением Гражданского начальства на новопроложенных дорогах построены деревянные почтовые станции. (По представлению Генерал-губернатора, на постройку почтовых домов, которых примерно требовалось 134 в обоих губерниях, считая каждый в 200 руб., было отпущено 27 000 рублей. В губернских городах повелено их называть Почтамтами, в прочих местечках — Почтовыми дворами.) Через реки поделаны мосты; через болота насыпаны плотины, гати; все дороги по бокам обсажены в два ряда березами, составившими в последствии прекрасную, густую, длинную аллею поныне существующую.

За устройство дорог в Белоруссии Генерал-Майор Каховский в 1774 году произведён в Генерал-Порутчики...» (Без-Корнилович М. В. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. СПб., 1855. С. 266–267).

У 1780 г. беларускія намесніцтвы, у тым ліку Дуброўну і Ляды, наведала Кацярына II. Яе візіт актывізаваў дзелавое жыццё на беларускіх землях. У лістападзе 1782 г. князь Пацёмкін купіў за 5,8 млн.

злотых у літоўскага канцлера Сапегі Дубровенскае княства, а ў наступным годзе ў князя Ф. Любецкага маёнткі Расасна і Любавічы. У сваіх валоданнях ён пабудаваў суконную, пазументную і гадзіннікавую фабрыкі. Для гэтых патрэб запрасіў вопытных майстроў сваёй справы з Пецярбурга П. Нардштэйна і І. Фаленберга (дарэчы, бацьку будучага дзекабрыста з Дубровеншчыны. — *А. Я.*), якія падрыхтавалі неабходных спецыялістаў з ліку прыгонных сялян Пацёмкіна і наладзілі вытворчасць прадукцыі на яго мануфактурах.

Пры Пацёмкіне эканамічны патэнцыял Дубровеншчыны атрымаў агульнадзяржаўнае значэнне. Яна ўдзельнічала ў стварэнні расійскага Чарнаморскага флота, якому потым дала славутага флатаводца Казарскага, апранала рускую армію ў суконнае адзенне, пастаўляла ёй прадукты харчавання. Але «пацёмкінскі» перыяд у гісторыі Дубровеншчыны быў непрацяглым. Стаўшы херсонскім губернатарам, Р. А. Пацёмкін абмяняў Дуброўну на маёнтак князя Ксаверыя Любамірскага Смелае (цяпер Смела), які знаходзіўся ў Кіеўскай губерні.

2-е. Хотя видимым образом не было сожжено ни древень, ни местечек, чрез которыя войска непріятельскія проходили, однакож чрез биваки, наводимые мосты и всякаго рода безпорядки, не менее того деревни и местечки пострадали: за всем тем Бабиновицкій уезд никаких вспомоществованій, ни частных ни от Правительства не получал: сіе тем чувствительнее было для сего уезда, что он по худой почве своей, быв лишенным рогатого скота, лошадей и части жителей, кроме хлебопашества не имея других средств к по правленію своего состоянія, и по нынешнее время почитается и есть беднейшим уездом между прочими Могилевской губерніи.

3-е. Установляемое непріятелем Правительство в уездном городе Бабиновичах было: Подпрефектура и Уездная Комиссія. Первая заведывала внутренним города распоряжениём, но все оныя ограничивались лишь доставленіем разных войск потребностей. Сіе Правленіе основано было на правах военных и той участи подвергались жители уезда.

4-е. Разсказывают, что Наполеон, чрез гор. Бабиновичи, ехал в трех одинаковых каретах, в которой же именно неизвестно; что останавливалися в доме ныне мещанина, еврея Залмана, а от туда, как выше пояснено, отправился в м. Росасну, куда и прибыл 1-го Августа вечером, верхом на малой почтовой англизированной лошади, в белых панталонах и в темном мундире со звездою, в треугольной шляпе, окружен своим в богатых золотом и серебром шитых платьях генералитетом; что проехав местечко в длину, вошел в дом еврея Гирши Юдкина и, увидев неопрятность онаго, повелел в боровом лесу, над Днепром, раскинуть свой шатер, три сажени длиною и две шириною, как сіе оказывается по существующим и по ныне бугоркам от канав, на том месте где был оный построен. Шатер сей был из полосатой, зеленой и белой шелковой, толстой матеріи, разделен на 5-ть комнат: 1-ю Пріемную и Столовую, 2-ю Спальню, 3-ю Лакейскую, 4-ю — канцелярію Бертье и 5-ю — для офицеров Штаба; в котором шатре был для него приготовлен обеденный стол; а после верхом по городу, коль скоро подъехал Наполеон к палатке, сошел с лошади, снял шляпу, и, поднеся руку к голове, посмотрев на собранные кругом войска, вошел с маршалом Даву, прибывшим тогда и соединившимся с ним по дороге из Дубровны к Росасне, в шатер, где и обедали только в двоем. Прислуживал им мамелюк, верно Рустан; прочим же генералам и офицерам на земле была послана зеленая сафьяновая скатерть и поставленные все серебряные, как тарелки и такіе же вызолоченные кубки. Во время въезда Наполеона в местечко, хотя евреи вышли встречать с хлебом солью, но видя множество генералов в золоте и серебре, не знали кому поднести. Однакож Наполеон, поднеся руку к шляпе, дал себя сим узнать. Лес весь был окружен войском, в зади шатра было построено несколько палаток из ельника и место для кухни. Говорят, что вечером, когда все утихло, Наполеон по дорожке, в сем же лесу, без шляпы, один же прохаживался, останавливался и приложив руку к голове часто призадумывался и сверх сего довольно часто кашлял. Однако ж, ровно с восходом солнца, 2-го Августа, выступил из своего лагеря, за которым указывается ныне пребольшая яма, в которую брошено

множество умерших французов, после бегства Наполеона из Москвы. Таким образом место, которое для многих служило временным отдохновеніем, в непродолжительном весьма времени соделалось вечным их убежищем и успокоеніем. При выезде Наполеона из Росасны, за переводчика и для указыванія разных деревень по дороге и их наименованій, был взят еврей, Зрол Сонца, который довел Наполеона чрез Ляды до Краснаго; брат сего еврея разсказывал, что будто бы Наполеон, ехав верхом, всегда имел на руке план, писанный на шелковой матеріи и, разспрашивая чрез переводчика о разных деревнях, окрестностях и месте положенія оных, ехал версту и более шагом, после чего во всю конскую прыть, с версту и более, запускал лошадь, опять оную придерживал и разспрашивал, едучи шагом; и таким образом до самого местечка Краснаго доехал, приказывая же еврея отпустить, повелел ему сказать, дабы возвращался проселочными дорогами.

5-е. К жителям Бабиновицкаго уезда никаких возваній и прокламацій мнимых не было и жители никаких содействій для непріятеля не делали, а напротив того старались всевозможным образом делать затрудненія в доставленіи вынуждаемых разных для войска непріятелем потребностей: ибо, видя столь беспорядочное шествіе Наполеоновых полчищ и множество бродяг и мародеров, одушевлялись всегда надеждою, что с наступленіем зимы, преследуемыя победоносными нашими войсками, войска Наполеона собственным своим беспорядком уничтожутся, а дети Севера возвратятся к законному своему Правительству и Государю.

6-е. Кроме сраженія вышесказаннаго около м. Рудни и дер. Инково, на обратном пути, под Лешном, 27 Октября, Платов поразил непріятеля, зделав убитых и раненых, более чем на 850 человек. Генерал Бороздин, под м. Лядами, 5-го Ноября, более чем на 400 человек, и 12-ть взял пушек; генерал Ожаровскій, около Козян, 8-го Ноября, на 978 чел. и четыре пушки; наконец Платов, около Любавич, 12-го Ноября, более чем на 3300 убитых и раненых. Перед нашествіем французов, 20-го Іюля, в м. Росасну дивизіонный генерал в Росасне был Оленин: когда же французы рейтировались, первый вступил в м. Росасну с казаками генерал Греков, и узнав, что французы находятся в именіи над Днепром, Холовье, на другом берегу реки в числе более 500 человек, малым отрядом казаков оных поразил и в плен забрал.

7-е. Как со всей арміи Наполеона, состоящей во время перехода реки Немана из 250 т., на обратном пути из Москвы с Наполеоном в Смоленск было не более 40 т., а после сраженіи под Красным, где корпуса Вице-Короля Евгенія, Даву, гвардіи Наполеона, наконец корпус Нея, генералами Милорадовичем и Платовым совершенно были поражены и едва сам Наполеон не попался в плен казакам. Всего войска, в Лядах, у Наполеона было около 15 т. и то, за неименіем фуража и съестных припасов, совершенно изнуреннаго, так что везде валялись людскія и скотскія тела, и большое число закопано умерших и скотских трупов.

8-е. Из подвигов жителей Бабиновицкаго уезда достойно есть вниманія, что сверх старательств вредить непріятелю в недоставленіи требуемых им подвод, фуража и разных вещей, напротив же тоже охотнаго, скораго и усерднаго доставленія всего требуемаго нашими войсками, многія семейства с малолетними своими детьми, видя отечественные пределы захваченныя непріятелем, не только не колебались в верноподданической их верности к законному своему Государю, но, желая оное сохранить в питомцах своих, уезжая в разныя Россійскія губерніи и скитаясь по лесам, оставляли все свое имущество и достояніе на жертву непріятелю и тем подвергались совершенному ограбленію.

9-е. По Бабиновицкому уезду и в Белоруссіи Ополченія никакого не было, а пред нашествіем французов, в Бабиновицком уезде находилось Черниговское ополченіе. Равным образом пожертвованій дворянством, купечеством и другими сословіями ничего не было, и никаких по сему распоряженій по Бабиновицкому уезду не делалось.

Примечанія.

В Бабиновицком уезде считается две Рудни: местечко Рудня, чрез которое, во время нашествія французов, маршал Ней и король Неаполитанскій Мюрат, с корпусами своими проходили, и около котораго Платов в первых числах Августа поразил французскаго генерала Себестіяни, и деревня Рудня, помещика Струтынскаго, чрез которую Наполеон из г. Бабинович проехал в м. Росасну. В м. Росасне, на Днепре, были наведены пять мостов на козлах, из брусьев и досок, к чему послужили разныя местечковыя строенія, как то: господскій магазейн, строенія священника, кроме церкви, и разныя домы; первый мост был наведен против бороваго лесу, другой выше перевоза, один онаго ниже, и еще один мост чрез речку Росасенку, для удобнейшаго перехода в лес и, наконец, пятый мост, на Днепре, под деревнею Корунною, в пяти верстах от м. Росасны. Маршал Ней, равно и Мюрат, составляли авангард арміи Наполеона, а с маршалом Даву, от Немана в первый раз Наполеон с ним соединился в м. Росасне. Росасенская церковь Св. Великомученика

Ад часоў першабытных — 1917

Георгія, где священником тогда находился и как еще живет, отец Дмитрій Бруевич, и как он разсказывал, ничего не потерпела и все иконы уцелели, за исключеніем того, что ружья были ставлены в притвор, а на обратном пути, что в целой онаго окружности французы поделали квадратные дыры для ружейнаго огня, равномерно как и во многих домах повынимали бревна для стрельбы и обороны, которой однако ж не было и никто ничего не взял; не от того-ли что в самый день выступленія Наполеона из Росасны, два генерала, придя к оному к священнику и желая церковь видеть, которую он им указал, один из них, отходя, на польском языке посоветовал ему наносить разных во внутрь оной церкви вещей как то: гонту, брусьев и досок, дабы она не столько для простого народу была примечательна, что он исполнил и последствія совета оказались удовлетворительными. Наполеон, в бегстве своем из Москвы, пріехал на санях в м. Дубровну, за оттепелью таковыя сани оставил в доме княгини Маріи Львовны Любомирской, которыя были подарены ею Бабиновицкаго уезда помещику, Доктору Цекерту, и по ныне у него находятся, равномерно как и сани, на которых в Дубровну пріехал король Неаполитанский Мюрат. Вице-же король Евгеній посоветовал ему, Цекерту, продать своих четыре вороных лошадей и сам купил за две тысячи франков. Сколь мало французы озабочивались доставленіем всякому справедливости и возвращеніем забраннаго доказательством тому, что, когда во время двухнедельнаго пребыванія маршала Нея в м. Ліозне, один Бабинавицкаго уезда помещик явился к нему и жаловался на генерала Лефевра за заграбленіе самовольно у него новой Петербургской коляски, которая в лице самого Нея на дворе находилась и просил заграбленное возвратить, Ней отвечал, что сіе есть следствіе войны, ежели не он, Лефевр, то кто другой бы взял; «а сколь часто бывают не верныя показанія жителей, доказательством, что один еврей Шмуйло разсказывал что будто бы сам видел Наполеона в м. Росасне на почтовой, малой, англизированной лошади, в черном платье с белыми отворотами, как бы в трауре, и в треугольной шляпе, тоже обшитой такими же белыми каймами; тогда, как вышеприведенныя показанія его платья и пребыванія утверждено лицами видевшими лично Наполеона в м. Росасне и самим же священником отцем Димитріем.

В м. Росасне почиталось жителей более 400 душ, земли под местечком 42 десятины 1360 саженей, под лесом 37 десятин и 600 саженей.

Акты, документы и матеріалы для политической и бытовой исторіи 1812 года. Т. III. С.-Петербург, 1912. Л. 24—30.

Воін і бунтар П. І. Фаленберг

Нарадзіўся Пётр Іванавіч Фаленберг у 1791 годзе. Бацька яго, выхадзец з Саксоніі, меў інжынерную адукацыю, добра ведаў суконную вытворчасць. З гэтай нагоды і запрасіў яго ў Расію князь Р. Пацёмкін. Неўзабаве Фаленберг-старэйшы прыступіў да наладжвання такой вытворчасці ў Дуброўне, якая, між іншым, належала тады таму ж Пацёмкіну.

Па прыкладу бацькі Пётр Іванавіч таксама меў намер прысвяціць сваё жыццё развіццю рускай прамысловасці. У 1811 годзе ён скончыў Царскасельскі лясны інстытут. Маладога таленавітага юнака чакала добрая службовая кар'ера. Але, на здзіўленне сваякам і таварышам, малады інжынер паступіў на ваенную службу. У пачатку 1812 года будучага дзекабрыста прызначылі прапаршчыкам і накіравалі ў 3-ю Заходнюю армію, якая з пачаткам Айчыннай вайны вяла баявыя дзеянні супраць саюзнікаў Напалеона — аўстрыйскіх і саксонскіх войск у напрамку Брэста-Літоўска. 24 ліпеня рускія войскі авало-

П. І. Фаленберг

лі гэтым горадам, а праз тры дні ўзялі Кобрын. Затым адбылася бітва пры Гарадзічным. У пачатку снежня руская армія штурмам узяла Вільню.

Актыўны ўдзел у гэтых баях прыняў і Фаленберг. У прыватнасці, у адным з данясенняў было сказана, што «...прапаршчык П. І. Фаленберг пры ўступленні ў горад Вільню... вёў калоны пад моцным ружэйным агнём і ўвесь час знаходзіўся ў авангардных баях». За мужнасць, праяўленую ў гэтай аперацыі і ў папярэдніх баях, яму прысвоілі чын падпаручніка. 25 жніўня 1813 года адбылася бітва на рацэ Кабцах. І тут зноў вызначыўся Пётр Іванавіч. Адвага і мужнасць маладога афіцэра былі адзначаны ордэнам Ганны 4-й ступені.

Апошнім эпізодам баявой біяграфіі Фаленберга стала ўзяцце Парыжа. За мужнасць і знаходлівасць, праяўленую ў ім, Фаленберга ўзнагародзілі ордэнам Уладзіміра 4-й ступені і прускім ордэнам «Ваенныя заслугі».

Рускія афіцэры, вяртаючыся з Заходняй Еўропы, нібы нанава адкрывалі для сябе сваю радзіму. Іх думкі выказаў у «Пісьмах рускага афіцэра» Ф. Глінка — актыўны член «Саюза благадзенства». Ён пісаў: «Усюды попел і разбурэнне. У вёсках нічога не чутна, акрамя стогнаў і скаргаў... Праедзеш Оршу, Дуброўну, Барысаў, Мінск і нічога не ўбачыш, акрамя беднасці ў народзе і паўсюднага разбурэння». Гэтым шляхам вяртаўся да дому і падпаручнік Фаленберг. У памяці ўставалі малюнкі вёсак і гарадоў, якія бачыў у дзяцінстве. Ад многіх з іх засталіся толькі назвы. Больш за ўсё краналі сэрца абыякавыя, бяздушныя адносіны ўлад да прастога народа, які адстаяў незалежнасць Айчыны.

Далейшая службовая кар'ера Фаленберга склалася добра. У 1825 годзе ён меў ужо чын падпалкоўніка. Смеласць і незалежнасць думкі, крытычныя адносіны да рэчаіснасці, эрудыцыя і высакародства стварылі Пятру Іванавічу высокі аўтарытэт сярод таварышаў па службе. У 1822 годзе ў час адной з гутарак А. Баратынскі паведаміў яму аб існаванні тайнага таварыства і планах забойства цара. Фаленберг — праціўнік прыгоннага права і царызму — не толькі падтрымаў гэты план, але і выказаў жаданне асабіста ажыццявіць яго. Аб гэтым абяцанні — зрабіць замах на жыццё імператара — Фаленберг паведаміў і следчай камісіі 30 студзеня 1826 года.

Дзеянні Фаленберга былі аднесены да чацвёртага разраду цяжкасці. Суд прыгаварыў яго да 15 гадоў катаржных работ.

У канцы 1826 года першая партыя пакараных дзекабрыстаў прыбыла да месца адбыцця катаргі на Чыцінскія руднікі. Умовы працы там былі цяжкія. Кожны дзень даводзілася апускацца ў глыбокія шахты. Турэмная вопратка хутка дралася і не магла захаваць ад моцных сібірскіх марозаў. Грошай, выдзеленых на харчаванне, хапала толькі, каб не памерці з голаду. У першы месяц шмат дзекабрыстаў цяжка захварэла. Менавіта тады пакладзі асуджаныя пачатак агульнай гаспадарчай дзейнасці.

Праз нейкі час яны дабіліся параўнальна ніштаватых умоў існавання. Жыццё навучыла таму, аб чым раней і не думалася. Узніклі розныя майстэрні: сталярная, кравецкая, шавецкая, у якіх выраблялiся самыя неабходныя рэчы. Пётр Іванавіч добра валодаў слясарнай, такарнай, сталярнай справай.

Фаленберг нядрэнна маляваў. У Інстытуце рускай літаратуры Акадэміі навук СССР захоўваецца акварэль «Чыта. Царква і вуліца», зробленая ім сумесна з дзекабрыстам М. Рэпіным. Маючы інжынерную адукацыю, ён зрабіў падрабязны план Чыцінскага астрога, які таксама дайшоў да нашых дзён.

Страх за магчымыя ўцёкі дзекабрыстаў прымусіў царскі ўрад падумаць аб стварэнні спецыяльнай турмы. Месцам будаўніцтва яе выбралі Пятроўскі катаржны завод, які знаходзіўся побач з Іркуцкам. Умовы жыцця ў Пятроўскай катар-

жнай турме, куды дзекабрысты прыбылі восенню 1830 года, былі больш жорсткімі. У Пятроўскай турме Пётр Іванавіч пачаў цікавіцца аграноміяй. Многа працаваў са спецыяльнай літаратурай, якую прысылылаі па яго просьбе.

У 1833 годзе, пасля шэрагу ўказаў, па якіх былі скарочаны тэрміны пакарання, катаржан пачалі адпраўляць у розныя куткі Сібіры. Фаленберга накіравалі на вечнае пасяленне на Троіцкі саляварны завод. Даведаўшыся аб гэтым, Мікалай I і галоўны жандар Расіі Бенкендорф выказалі сваё незадавальненне такім рашэннем і загадалі хутчэй аддаліць дзекабрыста ад рабочых і саслаць яго ў Шушанскае.

Да месца новага пасялення Пётр Іванавіч прыбыў у цяжкім душэўным стане. У той час Шушанскае было амаль поўнасцю заселена крымінальнымі элементамі, якія, карыстаючыся падтрымкай мясцовага ваяснога старасты, беспрабудна п'янствавалі. Фаленбергу, адрэзанаму ад свайго сацыяльнага асяроддзя, было вельмі цяжка прывыкнуць да новай абстаноўкі.

Дзекабрысты ў сваіх успамінах назвалі гэты перыяд жыцця самым цяжкім. Адна з прычын — страшэннае адзіноцтва. Яно падрывала духоўныя і фізічныя сілы. Да таго ж у Шушанскім Пятра Іванавіча чакалі вялікія матэрыяльныя нястачы. Ён быў адным з нямногіх дзекабрыстаў, якія не атрымлівалі ніякай матэрыяльнай дапамогі ад сваякоў. Прыходзілася разлічваць толькі на ўласныя сілы. Але асабліва прыгнятала адзіноцтва. З кожным годам ён усё больш і больш адчуваў, што і фізічныя сілы пакідаюць яго.

Аб цяжкім становішчы Фаленберга стала вядома паэту-дзекабрысту А. Адоеўскаму — аўтару вядомага адказу на пушкінскае пасланне ў Сібір. Восенню 1833 года Адоеўскі звярнуўся да мясцовых улад з просьбай дазволіць атрымаць ад сваякоў грошы, каб матэрыяльна дапамагчы хвораму Пятру Іванавічу, з якім ён моцна пасябраваў у час знаходжання на катарзе. Прашэнне было накіравана ў Пецярбург, адкуль неўзабаве прыйшоў адмоўны адказ.

Цяжкія ўмовы жыцця прымушалі да актыўнага дзеяння. Фаленберг пачынае займацца сельскай гаспадаркай і агародніцтвам.

У 1836 годзе на пасяленне ў Шушанскае прыехаў дзекабрыст А. Фралоў. Адразу стала маральна лягчэй жыць і працаваць. З кожным годам мацнелі сувязі з іншымі мінусінскімі дзекабрыстамі.

Працуючы побач з сялянамі, Пётр Іванавіч і яго таварышы вывучалі і пераймалі іх багаты жыццёвы вопыт і звычкі. Гэта збліжала іх з простымі людзьмі, дапамагала лепш зразумець іх патрэбы і спадзяванні. З другога боку, і самі дзекабрысты вельмі многа зрабілі для культурнага развіцця мясцовага насельніцтва. Яны вучылі тамашніх жыхароў рацыянальным прыёмам земляробства, укаранялі новыя сельскагаспадарчыя культуры, праводзілі доследы па вырошчванні фруктовых дрэў, кветнікаў і г. д.

Многа зроблена дзекабрыстамі і па вывучэнні сібірскага краю. Не стаяў з боку ад гэтага і Фаленберг. Добры знаўца астраноміі, ён у многіх навакольных вёсках вырабіў сонечныя гадзіннікі. Па парадсяброў зняў копіі рунічаскіх надпісаў з трох камянёў, якія спецыяльна прывезлі ў Шушанскае з берагоў Енісея. Гэту працу ён адправіў у Расійскую Акадэмію навук.

У 1840 годзе адбылося вяселле Фаленберга (першая жонка не дачакалася яго, выйшла замуж за другога) з дачкой казацкага ўрадніка станіцы Саянскай Ганнай Сакаловай. Стаўшы сямейным чалавекам і згубіўшы надзею на перамену месца жыхарства, Пётр Іванавіч пачаў хадайнічаць перад валаснымі ўладамі аб адводзе зямельнага ўчастка для будаўніцтва ўласнай хаты. І яму адвялі такі ўчастак — на беразе Шушы, побач з валасной і зборнай турмамі, што для ўлад было вельмі зручна, каб назіраць за яго дзейнасцю. Аўтарам праекта гэтага дома з'яўляўся дзекабрыст А. Фралоў. У 1848 годзе будаўніцтва было завершана.

У стане «дзяржаўных злачынцаў» дзекабрысты пражылі ў Сібіры 30 год. Толькі па амністыі 1856 года ім было дазволена вярнуцца на радзіму і жыць, дзе пажадаюць, у межах імперыі, акрамя Санкт-Пецярбурга і Масквы. Амністыя не выклікала асаблівага захаплення ў Фаленберга. Сваякоў у яго к таму часу ў еўрапейскай Расіі амаль не засталося. Ды і шматгадовае знаходжанне ў Сібіры выпрацавала ўжо новыя звычкі і ўяўленні аб сэнсе жыцця. Але галоўнай прычынай рашэння застацца ў Сібіры былі матэрыяльныя цяжкасці. У пісьме да аднаго з таварышаў Фаленберг у верасні 1856 года пісаў: «Не маючы ніякіх сродкаў у Расіі, прыдзецца міжволі застацца ў Сібіры. Тут мяне пракармлівае тытунёвая плантацыя, а жыць у горадзе — для таго патрэбны сродкі».

У далейшым лёсе Фаленберга адметную ролю адыграла моцнае сяброўства дзекабрыстаў. Таварышы і на гэты раз дапамаглі яму матэрыяльна. Дзякуючы І. Пущчыну былі сабраны сродкі, якіх хапіла, каб выбрацца з Сібіры. Вярнуўшыся са ссылкі, Фаленберг атрымаў месца кіраўніка маёнткаў у Падольскай губерні.

Апошнія гады жыцця Фаленберг правёў у Белгарадзе. Шмат часу аддаваў падрыхтоўцы да друку сваіх успамінаў. Ва ўзросце 82 год ён памёр.

У сузор'і нашых слаўных землякоў ярка гарыць і зорка Пятра Іванавіча Фаленберга.

Яршоў І.

«Віцебскі рабочы». 1987, 5—9 мая.

«Потомству в пример»

...Нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Казарскі ў мястэчку Дуброўна. Яго дом стаяў на беразе Дняпра. Рос Аляксандр дапытлівым, моцным, хутчэй за ўсіх сваіх дружбакоў пераплываў раку. У хуткім часе дзядзька адвез пляменніка ў далёкі маларасійскі горад Мікалаеў вучыцца ў штурманскім вучылішчы, якое Саша паспяхова скончыў у 1813 г.

У 1814 г. мічман Казарскі атрымаў прызначэнне ў Дунайскую ваенную флатылію. У 1826 г. яго прызначылі камандзірам брыга «Суперпік». (Брыг — двухмачтавае ветразевае судна з прамым ветразевым узбраеннем на абедзвюх мачтах.) Патрабавальны да сябе, уважлівы да падначаленых, малады камандзір заслужыў любоў і павагу сярод маракоў. Гэта падмацоўвалася глыбокім веданнем справы, эрудыцыяй сапраўднага марскога спецыяліста.

А. І. Казарскі.

У 1828 г. «Суперпік» вызначаецца ў марскіх бітвах і пры ўзяцці крэпасцяў Анапа і Варна. Пра камандзіра брыга Казарскага на флоце пачалі гаварыць як пра выдатную асобу, якая з любой сітуацыі знойдзе выйсце, даб'ецца перамогі. Пра гэта ў свой час пісаў у «Русском инвалиде» генерал-адъютант А. І. Вярыгін: «...яшчэ адзін герой, ужо чацвёрты, родам з Беларусі, аб'явіўся ў гэтым паходзе рускіх цуда-волатаў. Яго імя — Казарскі, флоцкі афіцэр. За ўдзел у штурме Анапы ўзнагароджаны залатой шпагай з надпісам «За храбрасць».

Гераізм Казарскага, памножаны на выдатнае валоданне баявой спецыяльнасцю, сучаснікі бачылі і пры штурме Варны. Бо ў баі аднолькава відаць — уменне і бяздарнасць, храбрасць і асцярожнасць, кемлівасць і бесталковасць, асаблівае марское братэрства.

Калі паўстала пытанне, каго накіраваць на разведку турэцкай эскадры, адмірал Грэйг і камандзір лінейнага карабля «Азоў» віцэ-адмірал Лазараў прыйшлі да адзінай думкі — Казарскага. Яго прызначаюць камандзірам брыга «Меркурый», на ўзбраенні якога знаходзілася 18 састарэлых гармат. Калі на «Меркурыі» даведаліся, што Казарскі прызначаны камандзірам, матросы зрабілі прыгожы футарал для яго залатой шпагі. Пазней купцы з Пецярбурга падарылі Казарскаму вышыты золатам мундзір і пазалочаныя похвы для той шпагі, якую ён меў гонар насіць за штурм Анапы. Але найвялікшая слава нашага героя чакала яшчэ наперадзе...

...Пунктам адліку подзвігу брыга «Меркурый» стаўся бой 14(26) мая 1829 г. Няхай усе беларусы свету таксама захаваюць у сваёй памяці гэты дзень і год найвялікшай славы нашага суайчынніка.

Вось што пісаў пра гэты дзень адзін з турэцкіх ваенных маракоў:

«Карабель Капудзін-пашы і наш уступілі з ім (брыгам «Меркурый») у гарачы бой і — справа нечуваная і неймаверная — не змаглі прымусіць яго здацца. Ён змагаўся, адступаючы і манеўруючы з усім ваенным майстэрствам так, што мы — сорам прызнацца — спынілі бой, між тым як ён, перамагаючы, працягваў свой шлях. Калі старажытныя і новыя летапісы сведчаць нам пра ўзоры храбрасці, дык гэты апошні заслоніць усе іншыя, і сведчанне аб ім заслугоўвае быць накрэсленым залатымі літарамі ў храме славутасцей. Капітан гэты быў Казарскі, а імя брыга — «Меркурый».

А вось як апісвае подзвіг «Меркурыя» В. Ф. Альшэўскі: «Першы помнік у Севастопалі ўвекавечыў бяспрыкладны гераізм брыга «Меркурый», які 14 мая 1829 года пад камандаваннем капітан-лейтэнанта Аляксандра Іванавіча Казарскага выйграў няроўны бой з двума турэцкімі караблямі. Чатыры гадзіны працягвалася жорсткая артылерыйская дуэль. Рускія камандоры прыцэльным агнём 18 невялікіх гармат прымусілі змоўкнуць 194 буйнакаліберныя варожыя гарматы. Нягледзячы на 22 прабоіны (шэсць з якіх падводныя), каля 300 пашкоджанняў у такелажы і



Бой брыга «Меркурый» з турэцкімі караблямі. З карціны Барры.

ветразях, брыг сваім ходам вярнуўся ў Севастопаль. Загінулі чатыры матросы, восем чалавек былі паранены, у тым ліку і камандзір карабля».

Усе на «Меркурыі», як камандзіры, так і матросы, аднадушна вырашылі змагацца з туркамі да апошняй каплі крыві. Той, хто застанецца ў жывых, павінен накіраваць брыг на бліжэйшы турэцкі карабель, а потым спусціцца ў трум і стрэліць у бочку з порахам, каб узарваць свой і варожы караблі.

...Брыг быў узнагароджаны кармавым Георгіеўскім сцягам, а ўсе члены экіпажа адзначаны ўзнагародамі. У гонар славутай падзеі быў выбіты памятны медаль. Капітан-лейтэнанта Казарскага ўзнагародзілі ордэнам Георгія 4-й ступені і прысвоілі воінскае званне на адну ступень вышэй — капітан 2-га рангу. Адважнаму афіцэру прызначылі пажыццёвую пенсію.

Перад узнагароджаннем адбылося асабліва кранаючае мерапрыемства. У гонар Казарскага і яго падначаленых (адзін з іх, матрос А. Шчарбакоў, выратаваў жыццё свайму камандзіру), у гонар гераічнага карабля быў праведзены парад ваенных суднаў, на якім прысутнічалі ўсе жыхары горада.

У 1829 г. Казарскі камандуе фрэгатам — трохмачтавым ваенным суднам, якое мае вялікую хуткасць ходу. У 1831 г. яму прысвойваецца званне капітана 1-га рангу. Мікалай I прызначыў доблеснага марака ў сваю світу.

Але баявыя раны не давалі спакою марскому афіцэру. І ва ўзросце трыццаці шасці гадоў герой руска-турэцкай вайны, капітан 1-га рангу А. Казарскі раптоўна памёр у горадзе Мікалаеве 16(28) чэрвеня 1833 г.

Подзвіг Казарскага і яго экіпажа жыве на палотнах вялікага мастака-марыніста І. Айвазоўскага «Бой брыга «Меркурый» з турэцкімі суднамі» (карцінная галерэя імя І. К. Айвазоўскага) і «Брыг «Меркурый» пасля перамогі над двума турэцкімі суднамі сустракаецца з рускай эскадрай» (Дзяржаўны Рускі музей).

...З таго часу на Чарнаморскім флоце заўсёды быў і ёсць ваенны карабель «Памяць «Меркурыя». І помнік у Севастопалі з надпісам: «Казарскому потомству в пример».

М. Маліноўскі,
правадзейны член
Геаграфічнага таварыства.

З навуковага даследавання

ПОМЕЩИЧЬЕ ХОЗЯЙСТВО

По характеру помещичьего землевладения Белоруссия в первой половине XIX в. относилась к районам крупных владений. Крупные помещичьи землевладения составляли здесь высокий процент.

...Во всех пяти губерниях Белоруссии из 9 тыс. помещичьих имений в 40—50-е гг. было лишь несколько больших хозяйств. Концентрировались земли в одном месте, это позволяло вести многоотраслевое хозяйство. Таким крупнейшим имением в Могилёвской губернии было имение «Дубровно» в Оршанском уезде, принадлежавшее князьям Любомирским, в нём было 15 фольварков, 11 тыс. душ крепостных крестьян и до 22 тыс. десятин пахотной земли.

...Значительный рост помещичьей земли наблюдался в Дубровенском имении князя Константина Любомирского: в 1809 г. здесь было 12 фольварков, в них пахотной земли было 744 десятины и сенокосной 228 десятин; в 1830 г. стало 15 фольварков, пахотная земля помещика занимала около 2483 десятин, сенокос — 476 десятин.

...В Дубровенском имении Оршанского уезда, принадлежавшем в конце XVIII в. графу Потёмкину, было 442 «пригонные» (барщинные) волокі, а «купичных», плативших чинш по 20 руб. с волоки земли, — 701. В 30-е гг. все эти крестьяне стали барщинными, исполняя с тягла по 4 дня барщины в неделю.

...В конце XVII — начале XVIII в. основную часть доходов Дубровенского графства, принадлежавшего князьям Любомирским, доставлял чинш. В сумме доходов равной 398 708 руб., поступивших с Дубровенского имения в 1811 г., 122 131 руб., т. е. свыше 36%, составляли поступления от фольварочного хозяйства, 106 134 руб. (31,3%) давал чинш. Поступления с крестьян натурой — данина — давали 30 104 руб., т. е. около 9%.

ВОТЧИННАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ

...В Могилёвской губернии в 80—90-е гг. существовали помещичьи мануфактуры, производившие продукцию на местный рынок. К ним относились суконные предприятия Любомирского в Дубровно Оршанского уезда. На каждом из них работало от 20 до 80 крепостных рабочих и, кроме того, по 2—3 наёмных мастера. Две мануфактуры изготовляли тонкое сукно из покупаемой в Риге шерсти. Большая часть произведённой продукции продавалась на местном рынке, некоторая часть шла «для домашнего употребления».

УПАДОК ПОМЕЩИЧЬЕГО ХОЗЯЙСТВА

...Катастрофическое падение крестьянского хозяйства Белоруссии в 40—50-е гг. неизбежно обусловило и упадок состояния помещичьего хозяйства.

...В таком же крупном имении Могилёвской губернии — «Дубровно» Оршанского уезда, принадлежавшем князю Любомирскому, доходы во втором десятилетии составляли 300—350 тыс. руб., а в 30-е гг. они едва достигли 180—200 тыс. руб.

В. Чапко

Літаратура:

НГАБ. ф. 2548, воп. I, спр. 60.

Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Мн., 1966. С. 11, 13, 21—23, 77, 103.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА АБ СТАНЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў ГУБЕРНІ

1848 г., 23 сакавіка

Ведомость о фабриках и заводах в Могилёвской губ.

Звание городов и селений, где находятся фабрики и заводы	Какие фабрики и заводы и сколько	На какую сумму выделывается товару, руб.	Куда сбыт производится
мест. Дубровно	талесных 4	14 380	Внутри губернии и частью в Витебскую и Минскую губ.

ДГАЛ, ф. 1281, воп. 4, спр. 55, л. 98—100.

З архіўных фондаў

ВЕДОМОСТЬ

О Талесной фабрике вольной купеческой Состоящей Могилевской Губернiи Оршанского Уезда В Местечке Дубровне принадлежащей Оршанскому 3-ей Гильдiи купцу Местечка Дубровны жителю Еврею Гирше Лейзаровичу Тумаркину. За 1854 год

Звание изделия и по каким ценам	Счет станков	В году сработано		О мастеровых
		кол-во изделий	на сумму руб. коп.	
Талесов:				На фабрике машин не имеется, а производится рукоделiем мастеровых, коих то есть ткачев имеется 9, черно-рабочих 18 человек, мастеровые и черно-рабочiе вольнонаемные здешнiе евреи, особых же мастеров нет.
В 8 Аршин по 18 руб.	1	10	180	
В 7 Аршин по 12 руб.	2	48	576	
В 6 Аршин по 8 руб. 50 коп	2	130	1105	
В 5 1/2 Аршин по 4 руб.	2	145	580	
В 5 Аршин по 3 руб. 50 коп	1	110	385	
Аброканфос:				
В 2 1/2 Аршина по 75 коп.	1	152	114	
И т о г о:	9	595	2940	

На фабрике употребляются материалы: Шерсть Испанских и Шмонских Овец, Сало Гусиное, Мыло, Клей и кубовая краска, кои покупаются в Столичном Городе Москве. Сбыт изделий Фабрики производится на месте а преимущественно В Минской, Гроднен-ской и Виленской Губернiях.

Улучшенiя по фабрике в теченiи года неучинено. Особаго изобретенiя не сделано. Фабрика сiя помещается в Одном Деревянном Доме.

ДА Магілёўскай вобл., ф. 1, воп. 1, спр. 639, л. 60, 61 ад.

ВЕДОМОСТЬ

О кожевенном заводе состоящем в Могилевской Губернiи Горецкаго уезда 3-го Стана в местечке Лядах, принадлежащем Еврею мещанину Залману Гиршову Эйдинову.

Званiе изделiй и по каким ценам	Число чанов	В 1862 году сработано		О мастеровых
		кол-во издел.	на сумму	
Выделано кож:	3 чана			
на юхты по одному рублю серебром		100	100	Мастер один, подмастерки два из евреев.
На подошвы по одному рублю серебром		75	75	В заводе машин пять.
Опойков по двадцати пяти копеек серебром		300	75	
И т о г о:	3	475	250	

Особые объясненiя:

1-е. Для выделки кож употребляются матерiялы следующiе: Лозовая кора, известь, чистый деготь, рыбий жир, мука овсяная и купарос, материалы эти приобретаются покупкою, как-то: кора, чистый деготь, мука на месте, известь в городе Орше, рыбий жир и купарос в городе Смоленске, сбыт изделий преимущественно производится на месте и внутри уезда.

2-е. Улучшенiй по этому заводу в теченiи года не последовало.

3-е. Завод это помещается в одном деревянном доме.

Горецкого Уезда Пристав 3-го Стана Козловскiй.

ДА Магілёўскай вобл., ф. 1, воп. 1, спр. 639, л. 77, 77 ад.

Паўстанне 1863—64 гг. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве

Нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць царызму было падрыхтавана польскімі, беларуска-літоўскімі канспіратыўнымі арганізацыямі, створанымі ў канцы 1850-х — пачатку 1860-х гг. Яны мелі сувязі з падпольнымі арганізацыямі ў Польшчы, з арганізацыяй расейскіх рэвалюцыянераў «Зямля і воля», якая рыхтавала сялянскае паўстанне.

Да канца 1861 г. ў Польшчы арганізацыйна аформіліся два палітычных лагеры — «белыя» і «чырвоныя». Праграму паўстання распрацаваў Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК), створаны летам 1862 г. ў Варшаве, які стаяў на пазіцыях правых «чырвоных». Праграма прадугледжвала аднаўленне польскай дзяржавы ў межах былой Рэчы Паспалітай, захаванне памешчыцкага землеўладання, выкуп дзяржавай зямлі, адведзенай пад сялянскія надзелы, перадачу сялянам ва ўласнасць без выкупу надзелаў, атрыманых паводле рэформы 1861 г., замену падушнага падатку падымным, ураўнаванне грамадзянскіх правоў сялян і шляхты, аднаўленне уніяцкай царквы і іншыя. Права беларускага, літоўскага, украінскага народаў на самавызначэнне фактычна адмаўлялася.

На Беларусі і ў Літве падрыхтоўку паўстання з восені 1861 г. ўзначальваў Камітэт руху, які дзейнічаў у Вільні незалежна ад Варшавы. Летам 1862 г. ЦНК падпарадкаваў яго і ўтварыў Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), на чале якога ў кастрычніку 1862 г. стаў К. Каліноўскі. Ён узяў курс на самастойнасць і раўнапраўе ва ўзаемадачыненнях віленскага і варшаўскага цэнтраў, арыентаваўся на сялян як галоўную сілу рэвалюцыі, выступаў за перадачу ім усёй зямлі, права на самавызначэнне Беларусі і Літвы. Свае погляды па аграрных пытаннях ён часткова выказваў у газеце «Мужыцкая праўда». Аднак паўплываць на пазіцыі ЦНК не змог. Апошні не ўзгадніў з ЛПК нават рашэнне аб пачатку ўзброенага выступлення, прызначанага на 22.1.1863 г., калі былі выданы Маніфест і два аграрныя дэкрэты, у якіх выкладалася праграма паўстання. У такіх умовах ЛПК вагаўся, як аднесціся да нечаканага паўстання ў Польшчы, і толькі 1.2.1863 г. прыняў станоўчае рашэнне і ў сваім Маніфесце заклікаў насельніцтва Літвы і Беларусі падтрымаць яго. Пры гэтым ЛПК, пераварыўшыся ў Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі, быў вымушаны прыняць і апублікаваць праграму паўстання, выпрацаваную польскім нацыянальным урадам. З мэтай павесці паўстанне па памяркоўным шляху на пачатку сакавіка да яго далучыліся «белыя» і захапілі кіраўніцтва ў свае рукі. 11.3.1863 г. па ініцыятыве варшаўскіх «белых» быў расфарміраваны Часовы ўрад Літвы і Беларусі на чале з Каліноўскім і заменены Аддзелам кіравання правінцыямі Літвы. Кіраўніком яго прызначаны Я. Гейштар. У мясцовай рэвалюцыйнай арганізацыі «белыя» ўвялі сваіх прадстаўнікоў. Каліноўскі ацаніў гэтую акцыю «белых» як здраду рэвалюцыі, аднак быў вымушаны прыняць назначэнне на пасаду гродзенскага ваяводскага камісара. У канцы студзеня 1863 г. з Польшчы на Беларусь прыйшлі першыя паўстанцкія атрады (найбольшы з іх атрад Р. Рагінскага). У сакавіку — красавіку фарміраваліся мясцовыя атрады. **У ліку найбуйнейшых акцый паўстанцаў на Беларусі быў захоп г. Горкі Магілёўскай губерніі атрадам Л. Звяждоўскага з дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута (24.4.1863 г.) і Мілавідская бітва 21.5.1863 г.** ў Слонімскім павеце, у час якой лагер паўстанцаў (каля 800 чалавек) некалькі гадзін атакавалі царскія войскі (5 рот салдат з 4 гарматамі), але пацярпелі вялікія страты і адступілі. У лютым — жніўні 1863 г. на тэрыторыі Беларусі адбылося 46 баёў і баявых сутычак з царскімі войскамі (2/3 з іх на Віленшчыне і Гродзеншчыне). Прыход «белых» да кіраўніцтва паўстаннем адмоўна адбіўся на адносінах

да яго беларускіх сялян. Удзел у паўстанні польскіх памешчыкаў — сваіх спрадвечных прыгнятальнікаў — яны, асабліва пад уплывам афіцыйнай агітацыі, успрымалі як выступленне за аднаўленне прыгону. Царскія ўказы ад 1.3 і 2.11.1863 г., якія спынялі часоваабавязаныя адносіны сялян да памешчыкаў, пераводзілі сялян на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў на 20%, падмацоўвалі ілюзіі пра «цара-вызваліцеля». Толькі невялікая частка сялян Беларусі, пераважна казённых, падтрымала паўстанне; 70% паўстанцаў складала беззямельная і малазямельная шляхта.

Сярод расійскай грамадскасці, нават ліберальна-дэмакратычнай, паўстанне пад лозунгам аднаўлення Рэчы Паспалітай з далучэннем да яе Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны выклікала ўздым шавінізму. Праз дзяржаўныя ўстановы, царкву, школу, друк шавіністычная хваля шырока распаўсюджвалася ў Расіі і фактычна паралізавала агітацыю рэвалюцыйных дэмакратаў, перакрэсліла іх надзеі на ўсерасійскае сялянскае паўстанне. Гэтым быў вырашаны лёс паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Спадзяванні пастанцаў на дапамогу заходніх дзяржаў таксама не спраўдзіліся.

На задушэнне паўстання на Беларусі і ў Літве ў маі 1863 г. быў накіраваны віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў. Жорсткімі рэпрэсіямі ён прымусіў «белых» памешчыкаў і вышэйшае каталіцкае духавенства адмовіцца ад падтрымкі паўстання. Многія яго актыўныя дзеячы былі арыштаваны, расстраляны, павешаны. У такіх умовах Каліноўскі ў чэрвені 1863 г. зноў быў запрошаны ў Вільню. У ліпені ён узначаліў Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы, які быў пераўтвораны ў Выканаўчы аддзел Літвы, а 22 жніўня яму перадалі і паўнамоцтвы камісара Варшаўскага ўрада ў Вільні. У канцы лета 1863 г. Каліноўскі зноў стаў на чале паўстання на Беларусі і ў Літве, аднак дамагчыся пераломy ў барацьбе ўжо не змог: да верасня 1863 г. паўстанне ў беларуска-літоўскім краі фактычна было задушана.

Царызм жорстка расправіўся з яго ўдзельнікамі. На Беларусі і ў Літве 128 чалавек пакараны смерцю, 12 483 высланы на катаргу і пасяленне ў Сібір. Маёнткі памешчыкаў, якія мелі дачыненне да паўстання, канфіскоўваліся і на льготных умовах прадаваліся царскім генералам і чыноўнікам, выхадцам з цэнтральных губерняў. Закрываліся або ператвараліся ў праваслаўныя цэрквы многія касцёлы. **За ўдзел студэнтаў у паўстанні была закрыта адзіная на Беларусі ВНУ — Горы-Горацкі земляробчы інстытут.** Мясцовыя настаўнікі, медыцынскія работнікі, земляміры, чыноўнікі былі пераведзены на службу ў цэнтральныя губерні, а на іх месца адтуль запрошаны новыя. У краі быў устаноўлены рэжым выключных законаў, накіраваны на русіфікацыю.

У польскай і расійскай (у тым ліку савецкай) гістарыяграфіі паўстанне 1863—64 гг. у цэлым ацэньваецца як польскае, не ўлічваюцца яго асаблівасці ў беларуска-літоўскім рэгіёне і тое, што напярэдадні і ў ходзе паўстання тут праявілася плынь беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на чале з Каліноўскім. У беларускай гістарыяграфіі яно ў дачыненні да Літвы і Беларусі як польскае не вызначаецца.

М. Біч.

Беларусь. Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 571—572.

КАЛІНОЎСКІ Кастусь (Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч; 2.2.1838 г., в. Мастаўляны Беластоцкага ваяводства — 22.3.1864), лідэр беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, тэарэтык адраджэння беларускай дзяржаўнасці і культуры пачатку 1860-х гг., публіцыст, паэт, кіраўнік паўстання 1863—1864 гг. Скончыў Свіслацкае дваранскае вучылішча (1855), Пецярбургскі універсітэт (1860). У Пецярбургу член рэвалюцыйнага гуртка З. Серакоўскага, удзельнік студэнцкага руху. У пачатку 1861 г. вярнуўся на Беларусь з мэтай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання. У 1861—1862 гг. стварыў у Гродне і Гродзенскай губерні шэраг нелегальных рэвалюцыйных арга-

нізацый, каардынаваў сваю дзейнасць з рэвалюцыйнымі сіламі Польшчы. Выступаў за шырокі ўдзел беларускіх сялян у барацьбе супраць самадзяржаўя і прыгонніцтва. Адзін са стваральнікаў восенню 1861 г. Камітэта руху — арганізацыйнага цэнтра «чырвоных» па падрыхтоўцы паўстання. З кастрычніка 1862 г. старшыня Літоўскага правінцыяльнага камітэта. 1.2.1863 г. ўзначаліў Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі. У сакавіку 1863 г. адхілены «белымі» ад кіраўніцтва і накіраваны на пасаду рэвалюцыйнага камісара Гродзенскага ваяводства. Са жніўня 1863 г. зноў на чале ўзброенай барацьбы на ўсім абшары Літвы і Беларусі, старшыня Выканаўчага аддзела Літвы. У лютым 1864 г. арыштаваны, паводле рашэння ваенна-палявога суда павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні. Каліноўскі першы абгрунтаваў праграму барацьбы за палітычнае і духоўнае вызваленне беларускага народа і спрабаваў рэалізаваць свае ідэі стварэння дэмакратычнага ладу ў суверэннай Беларусі, у аснову якой пакладзены канстытуцыйны і парламенцкі вопыт ЗША, Францыі і інш. Выканаўчы аддзел Літвы ў час старшынства Каліноўскага называлі ўрадам (Літоўска-беларускі чырвоны жонд), а самога Каліноўскага — «дыктатарам паўстання». Паўстанне ён разглядаў не як самамэту, а толькі як адзіны магчымы і таму непазбежны ў тагачасных умовах сродак дасягнення свабоды і незалежнасці Беларусі. Каліноўскі падзяляў думку Герцэна пра стварэнне ў далейшым федэрацыі незалежных дзяржаў свабодных славянскіх народаў. Ён адзін з выдаўцоў, аўтар і рэдактар першай у свеце газеты для сялян на беларускай мове «Мужыцкая праўда»; пісаў пад псеўданімам «Яська-спадар з-пад Вільні». У 1863—1864 гг. ім выдаваліся таксама газеты «Choragiew swobody» («Сцяг свабоды»), «Glos z Litwy» («Голас з Літвы»), на старонках якіх праводзіліся ідэі сацыяльнай і нацыянальнай свабоды, неабходнасці аб'яднання беларускай і літоўскай зямель у суверэнную дзяржаву. Разам з братам В. Каліноўскім распрацаваў адну з першых канцэпцый гісторыі Беларусі (часткова выкладзена ў выдаваемых газетах), паводле якой беларуская і літоўская землі мелі сваю самастойную гісторыю і разглядаліся ў адзінстве. Выступаў у абарону уніяцтва, супраць прымусовага пераводу беларускіх сялян у праваслаўе. З публіцыстычнай дзейнасцю Каліноўскага звязана развіццё на Беларусі рэвалюцыйнага дэмакратызму як самастойнай ідэалагічнай плыні. Садзейнічаў станаўленню беларускай літаратурнай мовы. Этапнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры сталі яго публіцыстыка («Лісты з-пад Шыбеніцы») і вершы («Марыська, чарнабровая галубка мая», прысвечаны нарачонай Марыі Ямант, і «Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці» — развітанне з беларускім народам). Каліноўскі перакладаў на беларускую мову з польскай рэвалюцыйныя песні (мазурка Дамброўскага «Яшчэ Польшча не загінула» і інш.). Неацэнны яго ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці і культуры беларусаў. Разам з Ф. Скарынам ён — адзін з самых вядомых прадстаўнікоў беларускай нацыі ў свеце. Вобраз Каліноўскага шырока адлюстраваны ў розных відах мастацтва. У гарадскім пасёлку Свіслач яму пастаўлены помнік.

Тв.: Беларуская літаратура XIX ст. // Хрэстаматыя. 2 выд. Мн., 1988;

К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988;

Беларусь. Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 358—359.

Падзеі на Дубровеншчыне падчас паўстання 1863 года

У час падрыхтоўкі паўстання фарміраванне мясцовых атрадаў, месца і час іх збора вызначаліся па загадах з Вільні ў сакавіку—красавіку 1863 г.

З вядомых матэрыялаў аб паўстанні і даследаванняў вынікае, што адзінага плана баявых дзеянняў не было. Адносны поспех спадарожнічаў першаму выступленню атрада Людвіга Звяждоўскага, прызначанага кіраўніком паўстанцкіх сіл у Магілёўскай губерні. З дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута яму ў ноч з 23 на 24 красавіка 1863 г. ўдалося захапіць павятовы горад Горкі. Падрыхтоўка да баявых дзеянняў і паходу на Горкі праводзілася таксама ў фальварках князя Любамірскага — Слепцах, Зарубах, Дзяцелях і іншых.

Мясцовыя сяляне не падтрымалі паўстанцаў і атрад Звяждоўскага неўзабаве быў разбіты, а ўдзельнікі паўстання пакараны.

Горацкая і Аршанская следчыя камісіі збіралі паказанні на ўсіх западозраных ва ўдзеле ў паўстанні, або спачуванні паўстанцам. Так, 9 ліпеня 1863 г. быў дапрошаны Горацкай следчай камісіяй Пракоп Лявонцьевіч Мачульскі, селянін маёнтка Дуброўна, 48 гадоў, праваслаўны, непісьменны, які з 1861 г. быў валасным старшынёй. Ён паказаў, што 23 сакавіка 1863 г. «бывший посредник Бронезовский с князем Владиславом Любомирским были в Дубровенском костёле на богомолье, в то же время там были — частный землемер Заиончковский, вольнопрактикующий доктор Ростковский, священничий сын Шелепень, эконом фольварка Холовье Онехимовский и много других лиц. Любомирский с Бронезовским из костела отправились в дом князя Любомирского фол. Слепцы, а Заиончковский, Онехимовский, Шелепень и Ростковский — в Дубровенский фольварк к управляющему Суднику... от Судникова в фольварк кн. Любомирского — Зарубы, где собиралась шайка мятежников... До 23 апреля много людей заезжало в Слепцы к кн. Любомирскому и от него отправлялась в Зарубы; при этом 22 апреля в понедельник Любомирский (Стефан или Владиєлав) посылал своего Лакея Леона в шайку мятежников. Понятно было, что Бронєзовский хлопотал об отправлении из Дубровны в Зарубы людей, а потом отправился и сам в Горки, чтобы самому видеть и знать, какой будет иметь успех их шайка».

Дубровенскі валасны пісар Якаў Феафанавіч Шабунін, 27 гадоў, праваслаўны, паказаў, што фарміраванню горацкай шайкі садзейнічаў князь Стэфан і князь Уладзіслаў Любамірскія, і што «в фол. Слепцы были съезды, помещиков и прочей шляхты». Павел Сідараў, 37 гадоў, праваслаўны, паказаў, што «вообще перед Юрьевым днем очень заметно было несколько времени, что к князю в Слепцы беспрестанно приезжали разные паны и сторож фольварка Слепцы крестьянин дер. Карабановичи Никита рассказывал, что приехал какой-то Варшавский пан с саблею, почему все думали, предполагали, что это съезды делаются для каких-нибудь приготовлений, тем более, что все делалось по ночам и князь отсылал сторожа в деревню».

Аршанскай следчай камісіі любавіцкі яўрэй Хаім Хаўкін паказаў, што для князя Любамірскага на кірмашы ў мястэчку Любавічы было куплена 6 пудоў пораху для гармат, які быў дастаўлены ў фальварк Слепцы. Селянін вёскі Бахава Іван Іваноў, 45 гадоў, праваслаўны, паказаў Горацкай следчай камісіі, што «вскоре пришла весть, что поляки выжгли Горки, тогда же стали прятать свое имущество. Сам не знаю и доказать не могу, но общий голос, что Становой пристав Василевский дал знать князю, что у него будут делать обыск и потому не мудрено, что там ничего не нашли».

60-х гг. у судах разглядаліся справы людзей, якія мелі дачыненне да паўстання. Маёнткі вінаватых канфіскоўваліся ў казну і на вельмі льготных умовах перадаваліся царскім генералам і чыноўнікам. Але калі ўдавалася даказаць сваю недатычнасць да паўстання, і калі яшчэ маёнтак не канфіскавалі, то яго вярталі. Так, напрыклад, прадпісаннем генерала ад інфантэрыі М. Мураўёва было дазволена зняць секвестр з маёнтка і маёмасці эканома князя Любамірскага Фабіяна Заіанчкоўскага.

А. *Філатава.*

НАРБ, ф. 3286, воп. 2, л. 4, 5, 20, 23.

Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1995. С. 319, 320, 325, 326, 328, 329.

ЗАРАНКА Сяргей Канстанцінавіч, н. 24.9 (6.10).1818 у в. Ляды. Памёр 20.12.1870 (1.1.1871). Рускі жывапісец і педагог. Сын прыгоннага. Вучань і пасляданўнік А. Венецыянава. З 1834 г. вучыўся ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Акадэмік (1843), прафесар (1850). Прафесар Маскоўскага вучылішча жывапісу, ваяння і дойлідства (1856—70). Напісаў партрэты Венецыянава (2-я пал. 30-х г.); В. Пятрова (1849); Ф. Талстога (1850); ротмістра П. Панамарова (1855); групавы партрэт «Выгляд залы вучылішча правазнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў» (1841); інтэр'еры («Унутраны выгляд Марскога Нікольскага сабора», 1843; і інш.). Распрацаваў сістэму выкладання, пабудаваную пераважна на вывучэнні натуры, дакладнасці ў перадачы бачнага свету. Сярод вучняў — В. Пяроў, У. Маякоўскі, В. Пукіраў. У Дзяржаўным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь 3 работы мастака.

Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. 4. Мн., 1971. С. 500.

Унутраны выгляд Марскога Нікольскага сабора.

Партрэт А. Г. Венецыянава.

СВЕДЧЫЦЬ МАГІЛЁЎСКІ ГУБЕРНАТАР ДЭМБАВЕЦКІ

...Крестьяне Баевской и смежных волостей Горецкого уезда, в составе 43 деревень, принадлежавших к большим владениям князя Евгения Любомирскаго, были наделены землею и совершили выкуп до Высочайшаго указа 2 ноября 1863 года об обязательном выкупе и, следовательно, не на основании выкупнаго акта, а по добровольному выкупному договору. Договор был давно утвержден, выкупная ссуда давно получена помещиком и всякия обязательныя отношения с крестьянами прекратились. Между тем у крестьян не доставало около 1500 десятин крайне необходимых угодий, за пользование которыми они должны были или платить особо, или отрабатывать и только по этой причине в них накопилась к 1872 г. огромная недоимка на одной Баевской волости в 57 тыс. рублей. Разумеется, вследствие таких причин, Баевская волость при распределении должников казны на категории, о чем сказано выше, была причислена к тем неимевшим возможности правильно уплатить долги, с которых до времени решено было не требовать уплат. Вести дело с помещиком о необходимой земле для крестьян формальным путем казалось не-

удобным; это затянулось бы на долго, а между тем помещик, живя постоянно то в больших городах, то заграницею, лишь изредка приезжал в Могилевскую губернию. Во второй половине августа 1872 г. он приехал в имение, а 27 августа из г. Горок с нарочным ему было послано весьма внушительное письмо с просьбою о свидании у него-ли в имении или в Горках. На следующий день кн. Любомирский прибыл в город и, после долгаго совещания, дал согласие и подписал в присутствии Горецкаго съезда миравых посредников условие, которым он обязался не только прирезать недостающее количество земли, но еще прибавить сверх того. Мировой Съезд приступил тотчас к осуществлению этого условия и к концу года одним 39-ти деревням, из 43-х, безвозмездно прирезано, с выдачею данных, 4023 дес. 1867 кв. саж., т. е. на 2500 дес. более, чем недоставало у всех 43 деревень. Благодаря такому правильному к столь серьезному делу отношению кн. Любомирскаго, заслуживающему полной признательности, тяготившая на Баевской волости огромная недоимка начала постепенно уменьшаться и крестьяне ныне оправились.

Дембовецкий А. С.

Опыт описания Могилевской губернии. Т. 1. Могилев на Днепре. С. 11–12.

Дакументы сведчаць

З архіўных крыніц

ВЕДОМОСТЬ

фабрикам и заводам Могилевской губерніи за 1881 год.

Счет фабрик и заводов			Род, название и местонахожденіе фабрик и заводов; имя и фамилия, званіе и вероисповеданіе владельцев их	Год основ. фабр. или завода	Число мастеровых	Число постоянных рабочих	Кол-во выработ. изделий	Валовый доход в рублях	Состоит ли в аренде, у кого и за какую сумму
По губерніи	По городам	По уездам							
I. Фабрики и заводы, обделывающие животные продукты									
Кожевенные									
Горецкій уезд									
82	82	3	Радченко Максима, крест., прав. м. Дубровна	1860	3	-	390	560	
83	83	4	Короткина Дениса, крест., прав., там же	1860	5	-	750	1065	
84	84	5	Эйдинова Залмана, мещ.,іуд., м. Ляды	1845	1	3	1380	1800	
85	85	6	Его же, там же	1871	1	2	780	1000	
86	86	7	Эйдинова Ноты, мещ., іуд., там же	1855	1	2	850	1000	
87	87	8	Застенкина Гершена, мещ., іуд., там же	1870	1	1	610	750	
Сукновальные									
219	45	7	Любомирскаго Евгенія, князя, рим.-кат., д. Тиливичи	1750	1	1	20000	400	Мещ. Абрама Нахмансон, с мельницею, 500 р.

ЧАРВІНСКІ Рыгор Лявонавіч
ЧАРВІНСКІ Самуіл Захаравіч
ШАБАЙЛАЎ Іван Сцяпанавіч
ШАЛАТОНІН Ягор Ільіч
ШАРАЙ Аляксандр Мітрафанавіч
ШУПЛАЎ Аляксандр Мітрафанавіч
ШЧАРБАКОЎ Архіп Дзянісавіч
ШЧУКА Сцяпан Міхайлавіч
ШЧУПАКОЎ Феадосій Харытонавіч
ЯКУШЭНКАЎ Гаўрыла Фёдаравіч

Падрыхтаваў да друку
А. Гаўруцікаў.

З разрухі і галечы

Летам 1924 года II сесія ЦВК БССР ліквідавала паветы і воласці, стварыўшы акругі і раёны. Па новаму тэрытарыяльна-адміністрацыйнаму падзелу Дуброўна становіцца горадам, цэнтрам Дубровенскага раёна Аршанскай акругі. Гэты факт адыграў значную ролю ў далейшым развіцці гарадка на Дняпры. З'явіліся больш спрыяльныя ўмовы для аднаўлення і развіцця разбуранай вайной гаспадаркі, расла занятасць насельніцтва, прыкметна павышаўся яго жыццёвы ўзровень.

Вядучым прадпрыемствам была тэкстыльная фабрыка «Дняпроўская мануфактура». У сакавіку 1925 года на фабрыцы было выпрацавана 18 тысяч метраў тканіны, у студзені 1926 года — 141 тысяча. За гэты час колькасць рабочых павялічылася са 142 да 475 чалавек. Сярэдняя зменная выпрацоўка на станок узрасла з 15 да 25 метраў, зарплата рабочага — з 0,72 да 1,65 рубля ў дзень.

Накіроўваючай сілай калектыву выступала партячэйка, якая аб'ядноўвала 46 камуністаў. На прадпрыемстве было шырока разгорнута спаборніцтва за ўдарную працу. Калектыў фабрыкі з яго працоўнымі і рэвалюцыйнымі традыцыямі, моцным ядром старых кадравых рабочых аказваў значны ўплыў на іншыя працоўныя калектывы раёна.

Пачаў дзейнічаць заснаваны яшчэ да рэвалюцыі маслазавод. На Дняпры ажыла гарадская прыстань. Накіроўвалася ў кааператыўнае рэчышча кустарная прамысловасць.

Адначасова з аднаўленнем і развіццём прамысловасці вялікая ўвага ўдзялялася жыллёваму будаўніцтву. Апошняе тлумачылася вострым недахопам жылля ў сувязі з вялікім прытокам у горад сельскага насельніцтва. Пры найбольш буйных прадпрыемствах узнікалі жыллёва-будаўнічыя кааператывы. Так, жылбудка-

Дубровенскае суднабудаўнічае прадпрыемства.

аператыў фабрыкі «Дняпроўская мануфактура», колькасць рабочых якой узрасла да 800 чалавек, называлася «Чырвоны чаўнок». Па ініцыятыве гэтага кааператыва ў 1927 годзе быў пабудаваны абсталяваны цагельны завод. У чэрвені завод прыступіў да вытворчасці цэглы. Хутка на заводзе ўступіла ў строй гофманская печ магутнасцю да 4000 штук цэглы-абпалу штодзённа. З уводам яе ў дзеянне ў раёне ў асноўным адпала патрэба ў будаўнічай цэгле кустарнай вытворчасці. Жыллёва-будаўнічыя кааператывы адыгралі станоўчую ролю ў вырашэні жыллёвай праблемы і добраўпарадкаванні горада. Ён вырас і папрыгажэў.

Прыкметныя зрухі адбываліся ў духоўным жыцці горада. Аб гэтым яскрава сведчыць простае супастаўленне фактаў. Да рэвалюцыі ў Дуброўне было 6 праваслаўных цэркваў, рымска-каталіцкі касцёл, сінагога і 6 малітоўных дамоў. Побач з імі казённае вучылішча і адзіная пачатковая школа глядзеліся больш чым сціпла. На прыканцы 20-х гадоў у горадзе было адкрыта пяць школ — дзве сямігодкі і тры пачатковыя. Калі ж гаварыць аб развіцці народнай адукацыі на Дубровеншчыне ў цэлым, то да пяці гарадскіх варта дадаць яшчэ 47 сельскіх школ. У 1928 годзе ў школах горада і раёна займалася 69 працэнтаў усіх дзяцей школьнага ўзросту. Не дзесяць, не пятнаццаць, як было да рэвалюцыі, а ўжо 105 настаўнікаў вялі іх у свет ведаў. З 4423 школьнікаў малодшых класаў 363 былі піянерамі.

Дубровенская пачатковая школа. Малюнак 1929 г.



Мал. № 1. Фабрыка „Дняпроўская мануфактура" ў м. Дуброўне.
Мал. В. Класінскага.

Цэнтрамі масава-палітычнай і асветніцкай работы сталі Народны дом культуры і раённая бібліятэка з кніжным фондам 3400 тамоў. Акрамя таго, у сістэме палітасветы ў горадзе і раёне дзейнічалі тры хаты-чытальні і 33 чырвоныя куткі (агульны кніжны фонд 4380 тамоў), 3 школы рабочай і сельскай моладзі, паўсотні сельскагаспадарчых, селькораўскіх, драматычных гурткоў, у якіх займаліся 735 чалавек. Ад вострых масавых дыскусій па разнастайных пытаннях грамадска-палітычнага і культурнага жыцця да гутарак па санітарыі і гігіене — такі быў дыяпазон дзейнасці гэтых ачагоў духоўнага жыцця таго часу.

Развівалася ахова здароўя. У цэнтры функцыяніравалі бальніца, дзіцячая кансультацыя, страхамбулаторыя, акрамя таго ў раёне дзейнічалі Новатухінскі ўрачэбны пункт, Верацейскі і Кляноўскі фельчарскія пункты.

Упершыню ў гісторыі Дубровеншчыны была звернута ўвага на развіццё фізічнай культуры і спорту. Так, у адным з дакументаў адзначана, што за летні перыяд 1927 года ў рады фізкультурнікаў горада ўцягнута 163 чалавекі, з іх 118 рабочых. Займаліся фізкультурнікі ў 6 розных гуртках.

На чале ўсіх пераўтварэнняў на Дубровеншчыне стаяла раённая партыйная арганізацыя. Рабочыя, сяляне з ліку вясковай беднаты і батракоў складалі яе аснову (на 1.10.1929 — 124 чалавекі). Адметна, што ў наступным 1930 годзе партарганізацыя раёна выросла на 42,9 працэнта, прычым рабочыя і батракі з ліку прынятых складалі 76,7, сяляне-калгаснікі — каля 14 працэнтаў. Партячэйкі былі створаны на ўсіх прадпрыемствах горада і ў сельсаветах раёна.

Памочнікам партарганізацыі была раённая камсамольская арганізацыя. За дзесяцігоддзе з часу яе заснавання рады арганізацыі памножыліся і ў 1928 годзе 28 ячэек горада і раёна аб'ядноўвалі 750 членаў. Ударная праца лічылася справай гонару кожнага камсамольца. Камсамольцы ўдзельнічалі ва ўсіх масава-палітычных мерапрыемствах і сельскагаспадарчых кампаніях. Рэйды камсамольскай «лёгкай кавалерыі» накіроўваліся на выяўленне укрывальнікаў хлеба, барацьбу з бюракратызмам і рэлігіяй.

Вялікае значэнне для эканамічнага і культурнага развіцця краю мела асваенне Асінаўскіх балот — магутных тарфяных залежаў, якія стагоддзямі ляжалі пад дрыгвой. У даваенныя гады слава пра Асінбуд імя Сталіна ішла па ўсёй рэспубліцы. Цікавая і прадгісторыя Асінбуда. Цяперашні цэнтральны пасёлак торфапрадпрыемства «Асінторф» размешчаны на

Камсамольская арганізацыя в. Новая Тухінь. 1927 [1928(?)] г.

Юр'евым востраве, а востраў знаходзіцца сярод вялізнага балотнага масіву. Паданне сведчыць, што яшчэ ў часы прыгону збег сюды ад лютага пана селянін Юрый. Пасяліўся на востраве, да якога з-за непраходных балот можна было падступіцца хіба толькі зімой. Пэўны час пасялення адчуваў сябе спакойна. Але аднойчы пан у суправаджэнні лесніка прабраўся на востраў, каб вярнуць і пакараць свавольніка. Ды атрымалася інакш. Юрый са сваімі сынамі добра адлупцаваў пана і лесніка, кінуў іх на сані, прывязаў і пусціў каня ў зваротным кірунку. З той пары востраў і стаў называцца Юр'евым.

Паступова тут выросла невялікая вёсачка з той жа назвай Юр'еў Востраў. Па сталыпінскаму закону 1910 года аб выхадзе сялян з абшчын большасць гаспадароў выдзелілася з вёскі на хутары. Але пасяліліся яны паблізу адзін другога, бо востраў быў невялікі, а далей яго ходу не было — наўкол ляжала балота. Жыхары вострава амаль круглы год былі адарваны ад знешняга свету. Зімой па саннаму шляху запасаліся соллю, мылам, запалкамі, іншымі таварамі, вывозячы на абмен натуральную прадукцыю сваіх гаспадарак. Школы сваёй на востраве не было. І калі каторыя з сялян хацелі аддаць дзяцей у «навуку», то бегалі дзеткі ў школу ў вёску Заполле за пяць вёрст ад вострава, зноў жа толькі зімою.

Савецкія ўлады адразу ж пасля рэвалюцыі звярнулі ўвагу на багацейшыя тарфяныя месцанараджэнні вакол вострава. Літаральна пад нагамі ляжала каштоўнае паліва, якога так не хапала разбуранай народнай гаспадарцы краіны. У 1918 годзе Аршанскі чыгуначны вузел прыступіў да асваення Асінаўскіх балот. У раёне вёскі Шабаны, на адноснай ускраіне масіва, чыгуначнікі ўзводзяць тры пасёлкі і пачынаюць здабычу кавалкавага торфу, які ідзе ў топкі паравозаў.

Тэхналогія здабычы была вельмі простая, усё рабілася ўручную. Спачатку здымаўся верхні слой залежы — ачос. Затым рабочыя-рэзчыкі рэзакамі рэзалі тарфяныя цаглінкі і выкладвалі іх на броўку для прасушкі ў малыя клеткі. Лепшы рэзчык за змену наразаў каля 5000 цаглінак — 310 пудоў торфу.

У 1919—1920 гадах, калі навісла пагроза белапольскай акупацыі, здабыча торфу спынілася. Затым зноў была адноўлена і працягвалася да 1922 года. Цяпер торф выкарыстоўваўся чыгункай і Дубровенскай тэкстыльнай фабрыкай. Новая старонка Асінторфа звязана з будаўніцтвам Беларускай ДРЭС. У 1927 годзе ВСНГ прыняў пастанову аб будаўніцтве на базе Асінаўскіх месцанараджэнняў торфу Беларускай дзяржаўнай раённай электрычнай станцыі. Будаўніцтва ажыццяўлялася ў адпаведнасці з планам ГОЭЛРО (Дзяржаўнай Камісіі па электрыфікацыі Расіі). Адпаведная пастанова была прынята бюро ЦК КП(б)Б.

З будаўніцтвам БелДРЭС звязваліся планы індустрыялізацыі рэспублікі і інтэнсіфікацыі яе сельскай гаспадаркі. 9 чэрвеня 1927 года адбылася ўрачыстая закладка электрастанцыі. Да дзесяці тысяч рабочых і сялян прыехалі і сышліся ў гэты дзень на Асінаўскі тарфяны масіў на мітынг, прысвечаны гэтай падзеі. Тут жа прысутнічалі і выступілі з прамовамі Старшыня Саўнаркома рэспублікі Н. М. Галадзед і сакратар ЦК КП(б)Б В. Г. Кнорын. Віншавальную тэлеграму прыслаў народны камісар унутранага і знешняга гандлю СССР А. І. Мікаян, які назваў закладку электрастанцыі на Асінаўскіх балотах «бліскучым дасягненнем» беларускага пралетарыяту і сялянства. А ў ліставе 1930 года — у дзень святкавання 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі — была пушчана першая чарга электрастанцыі. «Будаўніцтвам Асінаўскай раённай электрычнай станцыі мы ўжо практычна паставілі беларускія балоты на службу індустрыялізацыі краіны», — гаварылася ў пастанове ЦВК і СНК БССР аб пуску электрастанцыі.

У 1927 годзе на торфараспрацоўках былі ўстаноўлены дзве паравыя фармовачныя машыны прадукцыйнасцю больш за 90 тысяч цаглін у змену. Гэтыя машыны механізавалі толькі перапрацоўку торфу.

Абслугоўвала кожную машыну брыгада з 30 чалавек. Яны падзяліліся на ямшчыкаў, секачоў і спільшчыкаў. Ямшчыкі (ад слова яма) размяшчаліся ступеньчата ў кар'еры, рыдлёўкамі капалі і накідвалі залеж у элеватар, якая па транспарцёру элеватара трапляла ў прэс. Пасля перапрацоўкі тарфяная маса цераз мундштук падавалася на падкладачныя дошчачкі і па канатнаму транспарцёру перамяшчалася на палі сцілкі. А перад гэтым, на выхадзе з мундштука, сякач адсякаў спрасаваную і сфармаваную тарфяную масу на даўжыні дошчачкі. Так ужо механізаваным, ці лепш сказаць механізавана-ручным спосабам утвараліся тарфяныя цагліны. Яны ішлі на прасушку, дошчачкі вярталіся назад для наступнага цыклу.

Праца людзей каля гэтых машын была вельмі цяжкай. Машына задавала тэмп, падачу залежы ў элеватар збавіць было немагчыма, з мундштука роўна і бесперапынна выціскалася спрасаваная маса, якая рассякалася на цагліны, і людзі працавалі ў строгім рытме машыны, поўнасцю падуладныя ёй. Але ў канчатковым выглядзе выпрацоўка такіх цаглін у сярэднім на аднаго работніка значна павялічвалася, гэта быў «прагрэс» і гэта было галоўным. Хто тады думаў пра чалавека?..

З адносным развіццём тэхналогіі торфаздабычы пэўным чынам паляпшаўся побыт торфаздабытчыкаў. Было пабудавана 11 рабочых пасёлкаў. 11-ы стаў Цэнтральным. На 1-м пасёлку адкрылася бальніца, на 8-м у цагляным будынку размясціўся дзіцячы сад-яслі. На 2-м быў клуб з глядзельнай залай на 270 месц, на Цэнтральным — сталовая, аптэка, амбулаторыя, бальніца, бібліятэка з кніжным фондам да 17 тысяч кніг, агульнаадукацыйная сярэдняя школа і школа ФЗА. Было распачата будаўніцтва двухпавярховай сярэдняй школы, пякарні...

Ф. Кулакоў.

З ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК БССР «ПРА ПУСК АСІНАЎСКАЙ РАЁННАЙ ЭЛЕКТРЫЧНАЙ СТАНЦЫІ ІМЯ т. СТАЛІНА

Пабудовай Асінаўскай раённай электрычнай станцыі мы ўжо практычна паставілі беларускія балоты на службу індустрыялізацыі краіны. Вітаючы пралетарыят і ўсіх працоўных БССР з пабудаваннем першай чаргі раённай электрычнай станцыі імя т. Сталіна, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Пусціць першую чаргу раённай электрычнай станцыі імя т. Сталіна 8 лістапада 1930 г. — у дзень святкавання 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

2. Узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР галоўнага інжынера т. Алейнікава, яго намесніка т. Шаршнёва і лепшых ударнікаў-рабочых будаўніцтва гэтай станцыі: тт. Шміта, Смірнова, Штэера і Гаеўскага.

3. Выдаць Ганаровыя граматы інжынерам: тт. Русанаву, Маяровічу і рабочым-ударнікам: тт. Фёдараву У., Санкіну С., Гаўрыленку, Палікарпаву, Зудзіну і Аксіду.

4. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР заклікаюць рабочых і ўсіх працоўных накіраваць усе свае сілы і энергію на змаганне за яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за выкананне і перавыкананне плана народнагаспадарчага развіцця, за далейшае паспяховае сацыяльнае наступленне на капіталістычныя элементы па ўсяму фронту ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, за выкананне пяцігодкі ў чатыры гады.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. Чарвякоў
Старшыня Савета Народных Камісараў М. Галадзед
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта А. Хацкевіч

ЗЗ БССР, 1930. № 39, арт. 261.

НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ РАЗВІЦЦЯ ДУБРОВЕНШЧЫНЫ Ў 1918—1933 гг.

На 1932 г. насельніцтва раёну складаецца з 71308 чал., якое па нацыянальнаму складу падзяляецца так: беларусаў — 89%, яўрэяў — 8,7%, рускіх — 1%, літоўцаў — 0,7%, палякаў — 0,2% і інш. — 0,3%.

Агульная тэрыторыя раёну складае 115 287 га. Сюды ўваходзіць зямель сельска-гаспадарчага прызначэння — 80,9%, лясоў — 17,8%. З зямель сельска-гаспадарчага прызначэньня ўжыткоўнай — 95,3% і няўжыткоўнай — 4,7%.

Па тытульнаму сьпісу 1931 г. ў раёне было 61 прадпрыемства з агульнай колькасцю рабочых 1650. У лік гэтых прадпрыемстваў уваходзілі: электрастанцыя — 1, тарфяных арцеляў — 2, суднабудаўнічая — 1, кавальскіх — 2, цагельных — 4, чарапічная — 1, вапнавых млыноў — 2, канатная арцель — 1, фабрыка «Дняпроўская мануфактура» — 1, ткацкая арцель — 1, шавецкіх — 3, кравецкіх — 3, панчошная — 1, ільназаводаў — 2, маслазаводаў — 12, млыноў электрычных — 1, нафтавых — 1, ветракоў — 9, вадзяных — 11, жывёлабойня — 1, бровар — 1.

Лік дробных прадпрыемстваў за 1932 г. зьменшыўся з прычыны аб'яднаньня і частковай ліквідацыі.

У 1932 г. ў раёне існавала 5 дзяржаўных, 31 коопэрацыйнае, а ўсяго 36 прамысловых прадпрыемстваў. Персанал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1.XII.32 г. складаў 1789 адзінак, у гэтым ліку рабочых (бяз вучняў і МАП) — 1596, служачых — 128, акрамя таго працуючых па хатах — 5 асоб. Чатыры прадпрыемствы мелі рухавікі.

Галоўнымі прамысловымі прадпрыемствамі ў 1932 г. былі: баваўняна-папяровая фабрыка «Дняпроўская Мануфактура» у м. Дуброўна, з лікам рабочых у сярэднім за 1932 г. 1225 і валавой прадукцыяй у цэнах 1926/27 г. 3 969 700 р.; ільнозавод у Зарубах, з лікам рабочых 96; арцель па вырабу вяровак у м. Ляды, з агульнай колькасцю прадукцыі 303,698 р. пры 83 рабочых; суднабудаўнічая арцель у г. Дуброўна, прадукцыя якой за палову 1932 г. складала 94 000 р. пры 34 рабочых; ткацкая арцель у г. Дуброўна, з валавой прадукцыяй 182 130 р. пры 56 рабочых; Дубровенскі ільнозавод — 80 рабочых, з валавой прадукцыяй 77 917 р.; вінзавод у саўгасе «Станіславова» з лікам рабочых — 8 і валавой прадукцыяй — 160 572 р.; панчошная арцель у Лядах, з лікам рабочых — 29 і валавой прадукцыяй — 53 933 р.; Ляднянская кравецкая арцель, рабочых — 52, прадукцыя — 81 747 р.; цагельна-ганчарная арцель у Лядах, рабочых — 35, прадукцыя — 49 092 р.; кравецкая арцель у гор. Дуброўна, рабочых — 75, прадукцыя — 350 436 р. Дубровенская шавецкая арцель, рабочых — 45, прадукцыя — 130 497 р.

Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі ў раёне праводзіцца ў ільна-малочным напрамку. Саўгасаў у раёне 6 і адна прыгарадная гаспадарка. Сьвінагадоўчых саўгасаў у раёне два, у іх рабочых — 138, пахаці — 858 га, сенажаці — 184 га; буйнай рагатай жывёлы ўсіх узростаў было ў 1932 г. 196 галоў, сьвіней старэй за 4 месяцы — 957, коняй рабочых — 125. Малочна-жывёлагадоўчых саўгасаў — 2, у іх рабочых — 380, пахаці — 1445 га, сенажаці — 561 га, буйной рагатай жывёлы ўсіх узростаў — 599, сьвіней старэй за 4 мес. — 10, рабочых коняй — 108. Насенаводных саўгасаў — 2, у іх рабочых — 84, пахаці — 1060 га, буйной рагатай жывёлы — 249, рабочых коняй — 102.

Першая Дубровенская канферэнцыя рабселькораў. 1930 г.

У раёне адзін гарсавет, адзін мястэчковы савет і 17 сельсаветаў. У раёне налічваецца двароў, зьвязаных з сельскай гаспадаркай 10 627, з іх на 1 студзеня 1933 г. было колектывізавана 5301 двор, што складае 49,8% агульнага ліку двароў у раёне. На 1.II 33 г. ў раёне было колгасаў 171, якія займалі 55,6% агульнай плошчы сенапахаці раёну (6 саўгасаў). З ліку колгасаў маецца спэцыялізаваных фэрм: СКТФ — 20, з агульнай колькасцю пагалоўя на 1.IV.33 г. — 593; МТФ — 20, з пагалоўем на 1.VI.33 г. — 1507, цялячых фэрм — 40, з пагалоўем — 1334; каняводных фэрм — 2, з пагалоўем — 61.

У раёне дзейнічае МТС (у якой ёсьць 40 трактараў, з агульнай магутнасцю ў 400 HP), якая абслугоўвае 93 колгасы і налічвае складаных машын: малатарняў — 23, ільнацеп-білак — 51, сеялак радковых — 19, сеялак розных — 10, сенакасілак — 7.

Колгасы маюць наступныя машыны: сенакасілак — 53, конных грабляў — 27, жняярак-самаскідак — 95, снопавязалак — 15, бульбакапалак — 84, сеялак — 64.

Уся пасеўная плошча раёну ў 1932 г. складала 41 510 га, з якіх пад збожжавымі культурамі было 57,5%, пад бульбай — 14,1%, пад тэхнічнымі — 14,0 га, пад палявымі травамі — 8,1%.

Сетка навучальных устаноў у раёне налічвае: 4-годак 75, у іх настаўнікаў 181 і вучняў — 7869; ФЗС — 1, у ёй настаўнікаў — 12 і вучняў — 396; ШКМ — 11, у іх настаўнікаў — 88 і вучняў — 4235.

Парторганізацыя раёну налічвае 366 членаў, у якіх лік членаў КП(б)Б — 214, кандыдатаў — 152. Партсетка складаецца з 31 ячэйкі. Камсамольскіх ячэек у раёне 8, якія налічваюць 869 членаў.

У раёне арганізаваны палітаддзел пры саўгасе «Холаўе».

У раёне выдаецца газэта «За соцыялістычнае будаўніцтва».

Домбаля Т.Ф. Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 288—290.

Драматычны шлях калектывізацыі

Найбольш цяжкім і драматычным напрамкам пераўтварэнняў, праведзеных пад сцягам пабудовы сацыялізму, з'явілася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Сталінскае кіраўніцтва праводзіла яе ў час актыўнага фарміравання дыктатарскага рэжыму і культу асобы. Калектывізацыя была яскравай праявай гэтых заганных працэсаў. У час яе ажыццяўлення верх бралі націскныя метады работы, характэрныя для часоў дэмантажу нэпа, які Сталін вырашыў «адкінуць да д'ябла». Любыя альтэрнатыўныя варыянты ў разлік не прымаліся.

Разгром так званага «правага ўхілу» знішчыў альтэрнатыўны варыянт развіцця сельскай гаспадаркі. Верх узяў ганебны сталінскі варыянт, у аснове якога былі адміністрацыйныя метады кіраўніцтва, шырокае выкарыстанне надзвычайных мер, ігнараванне аб'ектыўных фактараў у развіцці грамадства. І ўсё гэта праводзілася дзеля суцэльнай калектывізацыі, прымусовага ўцягнення сялян у калгасы.

Ажыццяўленне гэтай палітыкі тут значна актывізіравалася з сярэдзіны 1929 г. Калі на 1 чэрвеня ў рэспубліцы ў калгасах знаходзілася 12,9 тыс. сялянскіх гаспадарак, дык да канца лістапада гэтага ж года — 77,7 тыс. Але матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя ўмовы для правядзення калектывізацыі створаны не былі. Яна пачыналася ў асноўным на старой базе сялянскіх гаспадарак. Спадзяванні, што калектыўны спосаб вытворчасці ўжо сам па сабе дасць добрыя вынікі, былі беспадстаўныя і дылетанцкія.

У лютым 1930 г. бюро ЦК Кампартыі Беларусі вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы 75—80 сялянскіх гаспадарак. 10 лютага гэтага ж года ЦК КП(б)Б адправіў у ЦК УКП(б) дакладную запіску з прапановаю прызнаць БССР рэспубліканай суцэльнай калектывізацыі. Гэта — яскравы прыклад палітычнай слепаты, пражэкцёрства і ўгодлівасці.

Такія падыходы абумовілі шырокае выкарыстанне адміністрацыйных метадаў. Сялян нярэдка прымушалі запісвацца ў калгасы, што прывяло да вялікага нарошчвання колькасных паказчыкаў. Да 1 сакавіка 1930 г. ў Беларускай ССР у калгасах лічылася 457,7 тыс. сялянскіх гаспадарак — 58% іх агульнай колькасці.

Аднавяскоўцы. Запіс у калгас.
Мастак М. Апіёк.

Буйной негатыўнай з'явай, асабліва характэрнай для канца 1929 г. — пачатку 1930 г., было масавае забойства і продаж хатняй жывёлы. Гэта стала вынікам не столькі кулацкай агітацыі, колькі рэакцыяй сялянства на фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі і вялікае абагуленне рабочай і прадукцыйнай жывёлы, уключаючы нярэдка хатнюю птушку. Толькі ў снежні 1929 г. ў рэспубліцы было прададзена ці забіта звыш 35 тыс. коней, шмат кароў, свіней, авечак, птушкі. Да мая 1930 г. пагалоўе коней і буйной рагатай жывёлы скарацілася больш чым на чвэрць.

Аднак Сталін і яго акружэнне былі далёкімі ад таго, каб цяжкасці ў правядзенні масавай калектывізацыі звязаць з заганнасцю сваёй палітыкі, ігнараваннем прынцыпаў нэпа і разумных падыходаў да кааперыравання. У іх было ў многім гіпертрафіраванае ўяўленне аб цяжкасцях. Таму няспыннае фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі ў канцы 1929 і ў першыя месяцы 1920 г. суправаджалася актывізацыяй барацьбы з кулацтвам. Гэта вылілася ў палітыку раскулачвання. У яе аснове ляжаў рэзка выражаны класавы падыход, які вызначаў у той час вырашэнне фактычна ўсіх сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных з'яў.

Меры, прынятыя супраць кулацтва, былі драконаўскі жорсткія і не дыктаваліся неабходнасцю. Тым больш не былі прадугледжаны вынікі гэтага ў будучым, якія заключаліся ў вялікім падрыве сельскагаспадарчай вытворчасці. Антыкулацкая сталінская палітыка супярэчыла ўсякаму здаровaму сэнсу і разуменню гэтай з'явы. Да канца мая 1930 г. ў Беларускай ССР было раскулачана 15 629 кулацкіх гаспадарак, а іх маёмасць перададзена ў непадзельныя фонды калгасаў. За дзейнасць, накіраваную супраць калгаснага ладу, за межы рэспублікі было выслана 6 тыс. кулакоў, што склала 0,74% ад агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак. Лёс гэтых людзей, а таксама іх сем'яў — трагічны. Мала хто з іх вярнуўся ў родныя мясціны.

Ужо ў гэты час яскрава вызначалася тэндэнцыя пашыранага падыходу да ажыццяўлення палітыкі раскулачвання, аднясення да кулакоў часткі сераднякоў.

...Непазбежным вынікам вялікай паспешнасці, буйных перагінанняў, недапрацовак і жорсткіх памылак у ажыццяўленні калектывізацыі стаў масавы выхад сялян з калгасаў, што адбыўся вясною 1930 г. На працягу сакавіка — мая ў рэспубліцы з калгасаў выйшла 370,3 тыс. сялянскіх гаспадарак, а ступень калектывізацыі ўпала з 58 да 11,1%. Рабіліся захады, скіраваныя на спыненне далейшых выхадаў з калгасаў, стабілізацыю становішча, стварэнне ўмоў для далейшага пашырэння прымусовай калектывізацыі.

Работа па ўмацаванню калгасаў рухалася вельмі марудна. Да таго ж у ёй дапушчаны злачынныя дзеянні. Яны, у прыватнасці, звязаны з дэспатычнымі мерамі па ахове сацыялістычнай маёмасці. 7 жніўня 1932 г. ЦВК і СНК СССР прынялі пастанову «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці». Тэкст гэтай пастановы быў уласнаручна падпісаны Сталіным. У ёй, у

прыватнасці, адзначалася, што «людзі, якія спакушаюцца на грамадскую маёмасць, павінны быць разгледжаны як ворагі народа».

Вядома, што на падставе гэтай пастановы да канца 1932 г. ў СССР было асуджана каля 55 тыс. чалавек. З іх звыш 2,1 тыс. — да вышэйшай меры пакарання. ...У Беларускай ССР па гэтаму бесчалавечнаму закону было асуджана больш за 10 тыс. чалавек.

Але ні праца калгаснага сялянства, ні прымяненне дзяржаўных мер не дапамаглі сельскагаспадарчай вытворчасці зрабіць крок наперад. Яе ўзровень заставаўся нізкім. Адпаведным было і матэрыяльнае становішча сялян.

...Грубае папіранне агульнапрынятых прынцыпаў кааперыравання, адказ ад магчымасцей новай эканамічнай палітыкі зрабілі пераход сялянства на калектыўны шлях гаспадарання цяжкім выпрабаваннем.

Калектывізацыя нанесла цяжкі ўдар па найбольш гаспадарлівай частцы сялян, якія былі асноўнымі носьбітамі земляробчага вопыту. Іх лёс трагічны. Гэта вельмі адмоўна адбілася на развіцці сельскай гаспадаркі, паклала пачатак ганебнаму працэсу расслаення вёскі.

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995. С. 163—178.

З чаго пачыналася...

23 студзеня 1923 г. ў Новай Тухіні праходзіла валасная беспартыйная канферэнцыя сялян па дакладу аб X Усерасійскім з'ездзе Саветаў. Канферэнцыя мела вялікі ўплыў на далейшае жыццё сялян воласці. Актывісты з сялянскага асяродзя пачалі агітаваць за стварэнне сельскагаспадарчай арцелі. Беднякі падтрымалі гэту прапанову. У камуну ўвайшлі сяляне з вёсак Старая і Новая Тухіні, Іваноўшчына, Рыленкі, Германы. Пазней, калі пачалася масавая калектывізацыя, на базе камуны быў створаны калгас імя Карла Маркса (цяпер саўгас «Перамога»). Актыўнымі арганізатарамі камуны былі ўдзельнікі той памятнай канферэнцыі Канстанцін Філіпенка, Нікіфар Нікіцёнак, Васіль Свойнікаў, Дзмітрый Сілкоў, Уладзімір Кастрыцкі і іншыя. У тым жа 1923 г. была створана сельскагаспадарчая арцель у Лядах. Адным з арганізатараў яе быў Пётр Галубцоў. У адзін з цёмных вечароў, калі Галубцоў позна затрымаўся ў сельсавеце, яго смяртэльна ранілі стрэлам праз вакно.

Актывістамі калгаснага руху на Дубровеншчыне былі: матрос рэвалюцыйнага браненосца «Пацёмкін» Е. Д. Пекаў, дэлегат XIII Усерасійскага з'езда Саветаў Р. С. Шурдзіс, удзельнікі грамадзянскай вайны С. Д. Рэйтузаў і Р. А. Чарвінскі, сакратар партарганізацыі Новатухінскага сельсавета В. Р. Свойнікаў, камуніст І. П. Абраменка і інш.

Калектывізацыя была нялёгкай справай. Яна праходзіла ў гарачых спрэчках і дыскусіях розных слаёў сельскага насельніцтва, у вострай барацьбе бедных з заможнымі. Стварэнню і ўмацаванню калектыўных гаспадарак, арцеляў і таварыстваў раённы камітэт партыі і райвыканком надавалі выключнае значэнне. Так, мерапрыемствамі на 1928 г. прадугледжвалася ўмацаваць існуючыя сельгасарцелі ў вёсках Каралін, Шабаны, Бахава, арганізаваць малочныя таварыствы ў вёсках Валкулакава, Сваташыцы, аказаўшы ім дапамогу крэдытам і кіраўніцтвам. Тымі ж мерапрыемствамі планавалася ў Верацейскім малочным масларобным таварыстве і іншых населеных пунктах зрабіць перабудову памяшканняў для жывёлы, даказаць насельніцтву, наколькі можна павысіць прадукцыйнасць дойнага статка ва ўмовах калектыўнай гаспадаркі.

Пэўная дапамога сялянам аказвалася

таксама ў стварэнні меліярацыйных, садова-агародных, насенных таварыстваў. І ўжо ў 1928 г. ў насенным таварыстве Новая Тухінь было засеяна 6-гектарнае поле гатункавым жытам. У тым жа годзе ў дзень Свята ўраджаю ў камуне «Чырвоная Паляна» і ў вёсцы Верацея былі арганізаваны раённыя сельскагаспадарчыя выстаўкі.

Колькасць калгасаў расла, некаторыя з іх дабіваліся прыкметных поспехаў. Так, ужо ў канцы 20-х гадоў асобныя гаспадаркі пачалі ўкараняць шматпольны севазварот, высяваць караняплоды. Хаця, як адзначалася на раённай партканферэнцыі ў красавіку 1930 г., на Дубровеншчыне, як і паўсюдна, у пагоні за стопрацэнтнай калектывізацыяй не ўдалося пазбегнуць памылак. Частка калгасаў распалася, на пачатак 1931 г. ў калгасах заставалася 8 працэнтаў ад агульнай колькасці сялянскіх двароў. Але затым яны пачалі ствацца зноў, толькі на гэты раз на больш трывалай аснове, хоць і не без жорсткага прымусу.

25 лютага 1933 г. СНК БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову «Аб абавязковай пастаўцы хлеба дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі». Пастановай адмянялася існуючая дагаворная (кантрактная) сістэма нарыхтовак збожжавых культур і зацвярджаліся маючыя сілу падатку цвёрдыя абавязацельствы па здачы хлеба дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах. Дасведчаны чалавек разумее, што размова ідзе пра час, калі ў калгасаў і аднаасобнікаў пачалі забіраць столькі хлеба, колькі лічылі патрэбным і магчымым дырэктыўныя органы.

Тое, што зведала ў 30-я, 40-я гады ўся краіна, зведала і Дубровеншчына. Маюцца на ўвазе сталінскія рэпрэсіі. Жыхар Ленінграда М. А. Доўбыш, бацькоўская сям'я якога да вайны жыла ў Асінторфе, расказваў, як адзін з асінторфцаў, зусім непісьменны чалавек, быў рэпрэсіраваны толькі за тое, што сказаў на людзях: «Раней былі са скацінкай, цяпер носім торф карзінкай», маючы на ўвазе працу дзяўчат-«тарфушак», якія на торфапрацоўках сапраўды насілі ў кошыках высушаны торф. У Мінску жыве Лідзія Ціханаўна Сафронава (Капусціна). Перад вайной сям'я Капусціных жыла ў Асінторфе, бацька — Ціхан Мікітавіч Капусцін, былы баец 1-й Коннай арміі Будзённага — працаваў тут кладаўшчыком. Ён быў рэпрэсіраваны 23 чэрвеня 1941 г. і назад не вярнуўся. А над яго жонкай і дзецьмі доўгія гады вісеў ярлык «сям'і ворага народа».

Такое з нашай гісторыі не выкрасліш. Але нельга адмаўляць і таго, што дзяржава рабіла многае, каб калгасы хутчэй уздужалі, трывала сталі на ногі. Разам з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі разгарнуўся рух за ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. На Дубровеншчыне было намечана адкрыць 15 лікбезаў з ахопам у 700 чалавек и дзве школы для малапісьменных. Але гэтага аказалася недастаткова, таму што ў лікбезы не маглі трапіць усе жадаючыя. Так, напрыклад, калі ў Верацейскім, Азярэцкім, Сваташыцкім сельсаветах гэта праблема была вырашана паспяхова, то аб астатніх дзесяці сельсаветах такога сказаць было нельга. Але адставаць ніхто не хацеў. У райвыканком прыходзілі дэлегацыі ад насельніцтва вёсак Стражава, Якубава, Макараўка з просьбай аб адкрыцці дадатковых камплектаў у школах лікбеза і саміх школ, у якіх адчуваўся вялікі недахоп. Такія просьбы стараліся задаволіць.

«Вучыліся ўсе,— успамінаў заслужаны настаўнік БССР М. Ц. Шабураў, які абучаў у школе лікбеза сялян вёскі Новая Тухінь.— Пад лікбез было адведзена памяшканне былога валаснога праўлення. Дарослыя людзі з букварамі ў руках — звычайная карціна таго часу. А з якім гонарам людзі атрымлівалі даведкі, у якіх было напісана: «Скончыў школу лікбеза». Ужо к 1932 году наша вёска ўвайшла ў спіс тых, дзе поўнасцю была ліквідавана непісьменнасць».

Тут будзе дарэчы такое параўнанне. Па даных 1897 г. ў Магілёўскай губерні, куды ўваходзіла і Дубровеншчына, сярод сель-

скіх жыхароў толькі 19,9 працэнта, ці адзін з пяці ўмелі чытаць і сяк-так пісаць. Сярод жанчын пісьменнасцю валодалі менш трох з сотні. З сельскага саслоўя ні аднаго чалавека не было ў вышэйшых навучальных установах, а атрымаўшыя адукацыю вышэй пачатковай складалі прыкладна паўпрацэнта, іншымі словамі — адзін на 200 сельскіх жыхароў.

А каб завяршыць наш расказ аб сацыяльных пераўтварэннях вёскі, прывядзем такія параўнанні. У мінулым на тэрыторыі Дубровенскага раёна было 40 валасцей, насельніцтва якіх складала 35 тысяч чалавек. Саслоўная вярхушка — князь, 17 памешчыкаў, служыцелі 19 цэркваў, звыш 150 стражнікаў і ўраднікаў. Землекарыстанне ўяўляла такую карціну: 20 423 гектары зямлі знаходзіліся ва ўласнасці князя Любамірскага, да 1000 гектараў было ва ўладанні цэркваў, 1775 гектараў належала «ахоўнікам парадку», 11 424 гектары — заможным сялянам. І толькі 44 тысячы гектараў лічылася за сераднякамі і беднякамі.

На той жа зямлі ў перадваенныя гады было створана 158 калгасаў, некалькі саўгасаў і дзве МТС. У распараджэнні калектыўных гаспадарак знаходзілася звыш 1000 сельгасмашын, 18 аўтамашын, не лічачы тэхнікі МТС, поўнасцю паставленай на службу калгасам. Значная частка калгасаў была электрыфікавана, а сельсаветы — тэлефанізаваны.

У раёне было адкрыта больш за 80 школ, з іх па 15 поўных і няпоўных сямігодак, раённая калгасная школа, 5 клубаў, 15 бібліятэк. У кожным сельсавеце меўся медпункт.

Змянілася і Дуброўна. Цяпер гэта быў рабочы гарадок з 10-тысячным насельніцтвам і добра развітай прамысловасцю. Значнымі былі культурныя дасягненні. Дзеці рабочых атрымалі магчымасць вучыцца ў 3 пачатковых, двух сямігадовых і адной сярэдняй школе. Для іх былі адкрыты два рабфакі і школа фабрычнага навучання. Расчынілі дзверы два клубы, спортзала пры фабрыцы «Дняпроўская мануфактура», кінатэатр, які размясціўся ў пераабсталяванай зале былога каталіцкага касцёла.

Ф. Кулакоў.

Рэпрэсіі — самае цяжкае злачынства дыктатарскага рэжыму

З пераходам да фарсіраванай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, усталяваўся і пачаў умацоўвацца дыктатарскі рэжым. Не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы, ідэалогіі, навуцы, нават у маралі стаўка была зроблена на дыктат. На вялікіх будоўлях «сталінскіх пяцігодак» пачала выкарыстоўвацца праца спецперасяленцаў, таму што пры дапамозе звычайных эканамічных метадаў было немагчыма перамясціць велізарную колькасць людзей для забеспячэння фарсіраванага выканання звышзаданняў. Для гэтага спатрэбіліся тэзісы і аб абвастрэнні класавай барацьбы, і аб масавым арганізаваным супраціўленні будаўніцтву сацыялізму.

З 1930 г. колькасць рабочай сілы для патрэб фарсіраванай, звышнапружанай індустрыялізацыі Дзяржплан СССР пачаў узгадняць з АДПУ і НКУС. Галоўнае ўпраўленне лагераў (ГУЛАГ) забяспечвала значную долю грамадскай працы. Менавіта з гэтым звязаны разнарадкі па рэгіёнах на «ворагаў народа» і «шкоднікаў». Гэта — эканамічная прычына рэпрэсій.

Вялікі маштаб рэпрэсій быў абумоўлены і тыранічнай прыродай палітычнага рэжыму, які ўсталяваўся ў краіне. Партыйнае кіраўніцтва непасрэдна ўзяло на сябе функцыі дзяржаўнага кіравання.

1 снежня 1934 г., у дзень забойства С. М. Кірава, была прынята пастанова

Прэзідыума ЦВК СССР «Аб парадку вядзення спраў па падрыхтоўцы ці здзяйсненню тэрарыстычных актаў». Тэрміны вядзення следства па такіх справах абмяжоўваліся 10 днямі, абвінаваўчае заключэнне абвінавачваемаму ўручалася за 1 суткі да суда. Справы разглядаліся без удзелу пракурора і адваката. Касацыйнае абскарджанне і падача хадайніцтваў аб памілаванні не дазваляліся, смяротныя прыгаворы выконваліся неадкладна. Аналагічны парадак уводзіўся ў верасні 1937 г. па справах аб шкодніцтве і дыверсіях, што практычна адкрыла магчымасць прымяняць яго ў адносінах да любога чалавека. У 1935 г. была афіцыйна ўстаноўлена карная адказнасць, аж да смяротнага пакарання, у адносінах да дзяцей, пачынаючы з 12 гадоў.

Асобая нарада пачала дзейнічаць не ў поўным складзе, як прадугледжвалася законам, а ў выглядзе «пяцёркі», «тройкі» і нават «двойкі». Да гэтага трэба дадаць, што ў 1937 г. Сталін ад імя ЦК УКП(б) даў органам НКУС дырэктыву аб прымяненні да арыштаваных фізічных мер. Іншымі словамі, дазволіў біць і катаваць арыштаваных.

...Апраўданнем самавольства служыла і высунутая Вышынскім «тэорыя», у адпаведнасці з якой па справах аб дзяржаўных злачынствах галоўным і рашаючым доказам з'яўлялася прызнанне самога абвінавачваемага. Следчым заставалася толькі «добрасумленна» любой цаной выконваць наказ генеральнага праваахоўніка краіны.

Маштаб рэпрэсій пашыраўся з кожным годам. У першыя часы ў абвінаваўчыя заключэнні часцей усяго ўносілася фармуліроўка — «за антысавецкую агітацыю супраць калектывізацыі». Тэрмін пакарання за гэта быў яшчэ не вельмі суровы — 3 гады высылкі ў паўночны край, Сібір ці Казахстан. Пазней абвінавачванні становяцца больш разнастайнымі — «контррэвалюцыйная агітацыя», «невыкананне збожжапастаўак», «шкодніцтва ў калгасах і на прадпрыемствах», «шпіянаж у карысць замежных краін», «здрадніцтва Радзіме», «вораг народа» і інш.

Чым бліжэй падыходзіў 1937 год, тым больш нарасталі маштабы рэпрэсій і абсурднасць абвінавачванняў, яны страчвалі ўсялякую логіку і праўдападобнасць.

У Беларусі, як і ва ўсёй дзяржаве, распальвалася татальная падазронасць, варожасць сярод людзей, гальванізаваліся іх самыя ганебныя інстынкты і чорныя таямніцы душы. Даносы, паклёпы, агаворы зрабіліся звычайнай з'явай. Сусед суседа абвінавачваў у антысавецкіх выказваннях і настроях, каб затым забраць яго маёмасць ці кватэру, падначалены — начальніка, каб звесці з ім асабістыя рахункі ці заняць яго пасаду, пісалі адзін на аднаго, каб проста расквітацца ні адпомсціць. Грамадства было ў маральна-псіхалагічным памутненні. Гэта вынік і адна з прычын вакханаліі рэпрэсій.

Масавы тэрор супраць народа, які быў развязаны ўладай,— самае цяжкае злачынства дыктатарскага рэжыму. Ніякага апраўдання мільённых ахвяр няма. Злачыннасць супраць народа не можа быць апраўдана ні неабходнасцю індустрыялізацыі, ні падрыхтоўкай да вайны. Кадравы вакуум на ўсіх узроўнях дзяржаўнага і грамадска-палітычнага жыцця запаўняўся няграматнымі, непадрыхтаванымі людзьмі. Кампетэнтнасць, прафесіяналізм не маглі кампенсавацца паслухмянасцю, безагаворачнай стараннасцю.

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995. С. 201–205, 212–213.

Успаміны ветэрана аб трагізме часу

Трывожным, неспакойным было маё юнацтва. З ранняга дзяцінства, каб здабыць кавалак хлеба — дацямна батрачыў. Падросшы, уступіў у камсамольскую ячэйку, а затым у хуткім часе стаў яе ўзначальваць і адначасова быў выбраны старшынёй Савінскага сельсавета. Гэта быў якраз час калектывізацыі, час бурны, трывожны, небяспека падсцерагала на кожным кроку. Аднак мы, моладзь 30-х гадоў, не баяліся варожых абрэзаў, актыўна ўключыліся ў кампанію па арганізацыі калгасаў, раскулачванню сельскіх міраедаў.

У вёсках Савіна і Чырвоная Сладаба дзейнічалі цэрквы. Нялёгкай было справай перамяніць погляд тутэйшых жыхароў на рэлігію, аднак таго патрабаваў час. Агульнымі намаганнямі камсамольскія ячэйкі і Савінскага сельсавета цэрквы ўдалося закрыць, а ў тых пабудовах размясціць клуб і хату-чытальню.

За такую ініцыятыву даводзілася нярэдка цяжка расплачвацца. Аднойчы я быў падпільнаваны, па-зверску збіты і кінуты ў гнойную лужыну на двары раскулачанага і высланага гаспадара. Зусім выпадкова на мяне натрапілі сакратар райкома партыі тав. Жулега і начальнік райаддзела ГПУ тав. Колцін, якія прыязджалі ў нашу вёску. Яны мяне выратавалі ад смерці. Раны гаіліся хутка, паправі̆шыся, зноў стаў у строй, працягваў праводзіць калектывізацыю на тэрыторыі сельсавета і акружаючых яго вёсак. Гэта не падабалася тым, хто хацеў расправіцца са мною. І хутка пасля майго выздараўлення мяне зноў пабілі ў памяшканні сельсавета. Толькі цудам застаўся жыць.

Пасля калектывізацыі ў Савінскім сельсавеце мяне накіравалі ў Сваташыцкі. Гэта быў 1934 год. З таго часу я ўзначаліў Сваташыцкі сельскі Савет. Праз год і там з кулацкімі элементамі было пакончана, а Савет заняў першае месца па ўсіх гаспадарча-палітычных паказчыках. У 1935 годзе з групай актыву сельсавет наведалі старшыня ВЦК Беларусі тав. Чарвякоў і старшыня СНК тав. Галадзед з той мэтай, каб вопыт работы актыву нашага сельвыканкома перанесці ў іншыя раёны рэспублікі. За добрую работу яны прэміравалі мяне патэфонам і трыццаццю метрамі шарсцяных тканін.

Аднак кулакі і кулацкія элементы, якія хаваліся ў лясах, працягвалі праследваць мяне, іх не пакідала жаданне расправіцца са мною да канца. Аднойчы, калі па службовых справах ехаў я праз лес з Негацінай ў Барадзіно, у мяне тры разы выстралілі. Я быў ранены, конь, на якім ехаў, забіты.

Але, відаць, я быў народжаны для таго, каб жыць. Раны зажылі, а я працягваў працаваць, закончыў Вышэйшую Камуністычную сельскагаспадарчую школу імя Леніна ў Мінску, стаў працаваць на розных пасадах. Не зажыве толькі памяць аб тых далёкіх неспакойных днях маладосці.

В. Рабчыкаў.

Ужываліся радасць і смутак

Вырас я ў вёсцы Парфенкава ў простай сялянскай сям'і. Трохі павучыўся ў школе і працаваў з бацькам на яго невялікім надзеле. Дык вось, памятаю, што ў вёсцы Пагодзіна была камуна, а галоўным камунарам у ім быў Бугаеў. Потым пачалася калектывізацыя, якая ахапіла ўсе вёскі і нашага Слатаўскага сельсавета. У людзей абагулілі жывёлу, нават авечак. Але гэтыя калектыўныя гаспадаркі аказаліся нетрывалымі і хутка разваліліся.

Другая хваля калектывізацыі была больш магутнай і напорыстай. Павінен сказаць, што ідэя калектывізацыі знаходзіла падтрымку даволі вялікай часткі сялян. Да калгаснага ладу цягнулася мо-

ладзь, якой не хацелася, па прыкладу бацькоў, жыць паасобку, у цёмнаце, нічога не чуць і не бачыць далей свайго надзела, свайго гумна ці хлява. Я мяркую па сабе. Як і многія мае равеснікі, стаў я камсамольцам і ўсім сэрцам паверыў у новы лад. А таму, калі ў нашай вёсцы арганізаваўся калгас «Кастрычнік», я самастойна, раней за маіх бацькоў уступіў у яго.

Ці добраахвотна ўступалі людзі ў калгас? Усяляк было... Не магу прамаўчаць вось пра што. На сход па стварэнню калгаса прыехаў прадстаўнік з раёна. Заняў месца ў прэзідыуме, выняў і паклаў на стол пісталет. Сказаў прамову і закончыў яе прыкладна так:

— Хто за савецкую ўладу, прашу падняць руку.

Ахвотна ці неахвотна, але рукі ўзнімаюцца. Як жа прызнацца, што ты супраць савецкай улады? Тады прадстаўнік абвяшчае:

— Тых, хто прагаласаваў за савецкую ўладу, запісваем у калгас. Пішыце заявы.

Так утварыўся калгас. Але на ногі станавіўся ён цяжка. Не хапала насення, і мы, камсамольцы, збіралі яго па хатах, па хутарах. Гэтак жа збіралі інвентар, збрую, хоць коней, у каго яны былі, абагулілі. Мяне прызначылі брыгадзірам і клопатаў прыбавілася. Але калгас патроху мацнеў, недзе праз год мы садзілі гектараў 30 бульбы. Частку яе здавалі дзяржаве. Вазілі на станцыю Краснае, цераз Днепр перапраўлялі ў лодках. З ураджаю заставалася і на працадні.

Калектывізацыя суправаджалася барацьбой з «кулакамі» і «ворагамі народа». У нас таксама выявіўся кулак, па вясковаму яго звалі Пучок. Меў ён гектараў 12—15 зямлі, 3 кані, 3 каровы. Працавалі на гаспадарцы тры яго сыны, але трымаў і аднаго работніка. І вось усю гэтую вялікую сям'ю саслалі ў Мурманскую вобласць. Вярнуўся, наколькі мне вядома, толькі адзін сын Адам, які ўжо таксама памёр. Так і звялася з роднай зямлі сям'я сапраўдных хлебаробаў.

У «ворагі народа» трапіў старшыня нашага калгаса Фёдар Белавусаў. Яго арыштавалі, асудзілі. А мяне, малодшага, 20-гадовага, абралі на яго месца. Трэба было спраўляцца з новымі абавязкамі, і я, здаецца, спраўляўся, пакуль не прызвалі ў Чырвоную Армію.

Перад вайной жыў у Дуброўна, займаў адказныя пасады. Я раней гаварыў, што жылі тады не вельмі заможна, але і не бедна. У людзей было болей аптымізму, чым цяпер, больш радасці, усе верылі, што заўтра будзе лепш, чым сёння. А калі браць сацыяльна-эканамічнае развіццё, то так яно і было.

Але ў выніку бясконцай і не зразумелай класавай барацьбы ў людзей, асабліва ў асяроддзі кіруючых работнікаў і служачых, інтэлігенцыі пасяліўся страх: каго забяруць сёння ноччу ці заўтра раніцой? А забіралі спраўна. На месцы, дзе цяпер будынак рэдакцыі, была царква. У ёй да пары да часу ўтрымлівалі рэпрэсіраваных. І яшчэ ў адной мясцовай турме. Там, дзе цяпер музычная школа, быў будынак міліцыі. А за ім яшчэ адзін, прыстасаваны пад утрыманне арыштаваных.

Вядома, тады ўсё, што адбывалася, нам бачылася зусім ці ў многім не так, як цяпер. Для мяне, напрыклад, ідэалы маёй маладосці засталіся са мной на ўсё жыццё. Але і цёмных плям з нашай гісторыі не сатрэш.

Ц. Цыngалеў.

Ад праўды нікуды не дзенешся

Тады ў Ляхаўцы жыў селянін Венядзікт Емяльянавіч Хлімановіч, па вясковай мянушцы — Панадык. Дзелавы мужык, але беднага паходжання. Падчас сталыпінскіх рэформ ён так-сяк набыў 20 гектараў зямлі на няўдобіцах. Але нястомнай працай сваёй ператварыў гэтыя ўчасткі-балотцы, аборкі — у палеткі, якія давалі выдатны ўраджай. Да яго за вопытам нават вучоныя людзі з Горак прыязджалі. А ён на няўдобіцах і сад вырасціў — 4 гектары. Меў пасеку, карову, каня, авечак, свіней. Мог трымаць і дзесяць кароў, але ў гэтай глушы попыту на малако не было.

Летам наймаў трохі сялян на работу: людзі самі ішлі да яго. Звычайна Венядзікт Емяльянавіч плаціў за дзень 40 капеек (цана аднаго пуда збожжа). Але выдаваў і па 35 капеек. Гэта азначала, што такі работнік можа прыходзіць і заўтра — ён атрымае 40 капеек, плюс пяць капеек даплаты за ўчарашні дзень. Хто атрымліваў 40 капеек адразу, назаўтра мог не прыходзіць. Яго работа гаспадару не падабалася. Хоць Хлімановіч работу не абмяраў, ні на каго не крычаў, нікому дрэннага слова не гаварыў. Паглядзеў — і ўсё.

А ў тыя сталыпінскія рэформы пачалі адчыняцца сельскія школы. І адчынілася школа ў доме Венядзікта Емяльянавіча, для гэтага ён адвёў пад класы лепшыя пакоі. У школу на першым часе прыходзілі ў першы клас і пятнаццацігадовыя дзецюкі. І калі яны не слухаліся настаўніка ці настаўніцы, у клас прыходзіў Венядзікт Емяльянавіч з конскім путам. Ён мог перацягнуць свавольніка тым путам уздоўж спіны — і ў класе наступаў парадак на ўсю зіму. Любіў Венядзікт Емяльянавіч дысцыпліну і парадак ва ўсім.

А ў сёлах жылі не толькі заможныя сяляне, але і беднякі. Да беднасці людзей даводзілі розныя прычыны, але часцей за ўсё — лянота, няўменне і нежаданне працаваць і гаспадарыць. Як толькі пачынаецца жніво, такія нясуць пуд за пудам збожжа да Меера ў краму. Набяруць гарэлкі, табакі. П'юць, гуляюць, аб заўтрашнім дні не дбаюць. Да вясны ў іх ужо хлеба няма. Свой праматалі, нават сеяць няма чым. Бягуць да Венядзікта Емяльянавіча і іншых такіх пазычаць. Венядзікты пазычалі ўсім, хто да іх прыходзіў, нават тым, з каго не вельмі спадзяваліся спагнаць пазычанае.

І вось у 1930 годзе Венядзікта Хлімановіча раскулачылі. Адабралі ўсё, а самога, ужо старога чалавека, саслалі ў Сібір. Гэта бедната, якую ён выручаў, якой дапамагаў, так жорстка з ім расправілася. Гэтыя гультаі, крыкуны сталі актывістамі. Сталі старшынямі калгасаў, брыгадзірамі і рознымі чыноўнікамі. Яны ж запаланілі органы НКВД. І жорстка вынішчалі дзелавых людзей, сапраўдных працаўнікоў. Так расправіліся з дзелавымі людзьмі ў Ляхаўцы, Займішчы, Дзёмкіне — па ўсёй краіне. Асабліва пацярпеў Дзёмкіна. Там у сталыпінскія часы атрымалі зямлю-няўдобіцу 16 сем'яў. Яны зрабілі сваю вёску ўзорнай. З аднаго боку — луг, з другога — сады, гаі, уся вёска была абсаджана ліпамі, іншымі карыснымі дрэвамі. Не вёска — казка па тым часе. У 1930 годзе ўсе 16 сем'яў раскулачылі, праз некалькі гадоў вёскі не стала.

А вось як гэта адбылося ў Дзёмкіне ў 1930 годзе. У жыхароў адабралі ўсю жывёлу. У адным з гумнаў размясцілі 32 быкоў. Пад раніцу вартаўнік паралічыў пагалоўе, не далічыўся адной галавы. Ад страху, што не ўсцярог ад злодзеяў быкоў і за гэта давядзецца адказваць, надумаўся падпаліць гумно. Так і зрабіў. Гумно з быкамі згарэла. А потым камісія ўстанавіла, што ў гумне былі ўсе 32 быкі, проста адзін забраўся за восець і вартаўнік яго не заўважыў. Але віну за падпал гумна ўскласлі на «кулакоў» і ўсіх адразу — у Сібір. Праз многа гадоў вартаўнік па п'яніцы размалоў, як было ўсё на самой справе. Але яму нічога не было. За ўсё адказалі кулакі, а дакладней гаспадары, заможныя сапраўдныя рупліўцы зямлі.

Гэтыя заможныя сяляне не былі памешчыкамі і міраедамі. Яны працавалі самі ад зары да зары. Толькі на ўборачную прымалі работнікаў па найму (нібы цяпер не возяць у калгасы студэнтаў ды службоўцаў). Аплата была дагаворная. Сілком ніхто нікога не прымушаў. А хто хацеў зарабіць пуд хлеба за дзень, таму давалі такую магчымасць. На Дубровеншчыне калісьці было некалькі маёнткаў, дзе працавалі батракі, але гэта іншая справа.

А што да такіх, як Венядзікт Хлімановіч, то проста бязвінна зглумілі дзелавых людзей. Дзелавых зглумілі, а самі спіліся, разбэсціліся і ў паняверцы гібеюць.

В. Куляшоў.

Сацыялістычным шляхам... праз пакуты

З успамінаў П. Мінчанкі

Туліцца на Дубровеншчыне невялікая вёсачка Кулакоўшчына. Сярод яе нешматлікіх насяленцаў жывуць браты — ветэраны вайны Фёдар Андрэевіч і Васіль Андрэевіч Бугаёвы. Нялёгкі лёс за іх плячыма. У 1929 годзе нечакана арыштавалі бацьку Андрэя Міканоравіча. За што? Залічылі ў кулакі і этапіравалі ў далёкую сцюдзёную Сібір.

Як нешта пачварнае і страшнае ўспаміналася той час. Палова вёскі — пятнаццаць сем'яў — былі «раскулачаны». Высылалі ўзімку. Холад страшэнны, мяцеліца, а тут патрабуюць пакідаць назаўжды малітую потам і крывёю зямлю. Дзеці плачуць, жывёла раве і вісчыць, мацяркі з кутка ў куток мітусяцца, галосяць. А ў сям'і Бугаёвых было пяцёра сыноў і адна дачка, якая выйшла замуж у вёску Чырына. Старэйшаму споўнілася трынаццаць гадоў, малодшаму — паўтара. Прысеўшы на дарожку, выцершы рогам хусткі горкія слёзы, маці Фядора Ягораўна прытуліла да грудзей свайго старэйшага і на вуха прашаптала: «Бяжы, Міцечка, схавайся ў лесе, перачакай небяспеку, а потым да сястры Мані ў Чырына ідзі. Барані божа не вяртайся назад!» — і наўскрыж перахрысціла сына.

Упаўнаважаныя не адразу заўважылі знікненне Міці. Не да дзяцей ім было. Да таго ж былі перакананы, нікуды ў такую завею не дзенецца. Памыліліся — не вярнуўся. Чакаць не сталі. Фядора Ягораўна з чатырма малымі на руках пачала блуканне па пакутах.

Але жыццё складаецца не толькі з чорных старонак, на якіх гора пастаянна прыпісана. Колькі мужнасці трэба мець, каб рашыцца на рызыкоўны крок — пакінуць няўтульны сцюдзёны край і ў родныя мясціны падацца. Рашылася. Думалася: чым паміраць у чужой старонцы, лепш на радзіме знайсці апошні прытулак. Шмат дзён і месяцаў цягнуўся гэты бяспрыкладны «марафон». Па чарзе везла малых на санках. Па дарозе вымушана была жабрачыць, спадзявалася на людскую міласэрнасць. Людзі ёсць людзі. Дапамагалі, чым маглі.

...Са слязьмі на вачах глядзела смяротна стомленая кабета на колішнюю сялібу. Застаўся ад яе толькі падмурак. Хату разабралі і звезлі немаведама куды. Пасяліліся ў старэнькай лазенцы. Цяжка сказаць, колькі гора перажыла сялянка. Ад мужа ніводнай вестачкі не атрымала. Міця гадаваўся ў сястры. Дадому наведваўся прыцемкамі, баяўся, каб хто не заявіў у «органы».

Кожны стук, кожны шорах балюча аддаваўся ў мацярынскім сэрцы. Баялася не за сябе, за малых баялася...

Горкія мільёны

Перада мной выпіска з пратакола пасяджэння камітэта пры Віцебскім абласным Савеце народных дэпутатаў па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій. Разглядалася пытанне аб кампенсацыі Карапанавай (Цімошчанка) Надзеі Георгіеўне маёмасці яе бацькі Цімошчанкі Георгія (Ягора) Макаравіча.

Сухія, казённыя радкі пратакола:

«У ходзе праверкі заявы Карапанавай было ўстаноўлена, што рашэннем пасяджэння тройкі пры ПП АДПУ ад 29 мая 1931 года галава кулацкай сям'і Цімошчанка Ягор (Георгій) Макаравіч высланы на спецпасяленне разам з сям'ёй у складзе:

жонка — Цімошчанка Кацярына Назараўна, 1882 года нараджэння,

сын — Цімошчанка Міхаіл Георгіевіч, 1916 года нараджэння,

дачка — Цімошчанка Вера Георгіеўна, 1917 года нараджэння,

дачка — Цімошчанка Надзея Георгіеўна, 1927 года нараджэння,

дачка — Цімошчанка Любоў Георгіеўна, 1930 года нараджэння,

нявестка — Цімошчанка (Клыкава) Варвара Канстанцінаўна, 1919 года нараджэння.

У ссылцы нарадзіўся ўнук Цімошчанка Анатоль Міхайлавіч.

Цімошчанка Георгій Макаравіч, 1870 года нараджэння, беларус... высланы з в. Судзілавічы, малапісьменны, кулак, займаўся з сям'ёй земляробствам...

У анкеце арыштаванага Цімошчанкі Ягора Макаравіча ўказана, што на момант высялення сям'я валодала наступнай маёмасцю: ворыва — 8,5 дзесяціны, коней — 1, жарабят — 1, кароў — 2, цялят — 1, авечак — 2, свіней — 2, хата — 1, хлеў — 1, свіран — 1.

Па заключэнню пракуратуры Віцебскай вобласці ад 27 кастрычніка 1992 года падлягаюць рэабілітацыі: (пералічана ўся сям'я)». І далей ідзе заключэнне аб кампенсацыі, якой у канчатковым выглядзе налічана 2 398 858 рублёў.

Многа? Але што сёння гэтыя мільёны? Што за іх купіш? Ды і не ў гэтым справа. А ўявіце сям'ю, дзе ўжо немаладыя бацькі і грудное дзіця, якую выгналі з роднай хаты і павезлі ў невядомую, а таму страшную Комі-Пярмяцкую акругу.

Каб лягчэй было ўявіць, прыводзім пісьмо Івана Нікіфаравіча Яфіменкі, 1906 года нараджэння, некалі селяніна-аднаасобніка вёскі Новая Зямля, раскулачанага і высланага з сям'ёй у тым жа 1931 годзе ў тую акругу, дзе ў пасёлку Салым жыве і цяпер. Пісьмо напісана на імя старшыні райвыканкома.

«... Быў вельмі рады, атрымаўшы рашэнне аб кампенсацыі мне адабранай пры раскулачванні маёмасці ў 1931 годзе, а яшчэ больш — за аднаўленне справядлівасці. Я ўжо сам стары чалавек, але ўспамінаю сваіх бязвінна загінуўшых у 30-х гадах бацькоў, як яны прадказвалі: прыйдзе час, калі нас, мёртвых, уваскрэсяць і асудзяць сталінскія рэпрэсіі. А нас будуць ухваляць, як лепшых працаўнікоў сельскай гаспадаркі, аб гэтым будуць ведаць нашы ўнукі, а магчыма, і праўнукі.

Нас загналі ў паўночныя лясы вобласці за 20 кіламетраў ад бліжэйшага населенага пункта. Летам секлі лес і будавалі дамы на месцы высечкі. Да зімы пабудавалі каля сотні дамоў, без цвікоў, толькі сякера ды піла. У кожным доме — суцэльныя нары, жывуць 4—5 сем'яў, не менш 15—17 чалавек. У доме па аднаму акну — не было шкла. Печаў таксама не было — палілі дровы на кастры па-чорнаму, адчынялі дзверы, пакуль гарэў агонь. Тут і варылі пахлёбку, калі было з чаго варыць. Праз год ніякіх прадуктаў не стала, да вясны 1934 года больш паловы людзей памерла. А ў маі прыйшла, нарэшце, баржа з прадуктамі, якія пасля такога гора ўжо не вельмі радавалі нас.

Потым прывезлі крымскіх татар, ім жылося тут не лепш.

Знаходзіліся сярод ссыльных уцекачы, але мала каму гэта ўдалося. Для мясцовага насельніцтва мы былі ворагамі народа. Яно вылаўлівала ўцекачоў і прыводзіла ў райаддзел дзяржаўнай бяспекі, за што было заахвочванне. І нават неабавязкова прывесці жывога чалавека, можна было забіць, а прынесці ў камендатуру толькі адрэзаныя вушы. У той час быў вялікі дэфіцыт на соль. Вось соллю і прэміравалі паляўнічых на беглых ссыльных. Адсюль і пайшло: «пярмяк — салёныя вушы».

Дажылі да 1937—1938 гадоў. І ўжо сярод нас, так жорстка пакараных без усялякай віны, зноў пачаліся арышты. За два гады арыштавалі чалавек 70, з іх вярнуліся чалавек 5, астатнія загінулі. Сваёй чаргі дачакаўся і я: 20 лютага 1943 года мяне арыштавалі, чатыры месяцы патрымалі ў КПЗ, потым асудзілі на 6 гадоў лагераў і этапам адправілі ў г. Салікамск у турму.

Тут якраз прыбыў цягніком курскі этап — 850 чалавек. Нас, 20 чалавек, далучылі да іх, пагрузілі ў баржу і павезлі па Камераце, затым на Вішэры. У глухамані выгрузілі. Тут ужо чакаў нас лагерны канвой. І пагналі нас кіламетраў за 40 у лес.

Лагер быў толькі што пабудаваны — вялікія баракі, двайныя нары, у бараку па два акенцы. Спалі апранутыя, ушчыльную адзін да другога. Ганялі на лесанарыхтоўкі. Кармілі супам з зерня пшаніцы два разы ў дзень. Канвой быў вольнанаёмны, вельмі дрэнны, злы, некаторых забівалі без прычыны, начальства гэта заахвочвала.

Лагер апанавала дызентэрыя, людзі сталі паміраць. З курскага этапа засталося 150 чалавек. Гэты лагер закрылі, астаткі перавялі ў іншыя месцы. Я за два гады пабываў у пяці лагерах, у апошнім — 3,5 года. На радзіме я быў малады, дужы мужчына, важыў 92 кілаграмы, тут дайшоў да 46 кілаграмаў, проста цень чалавечы. Выжыў, напэўна, таму, што ў апошнім лагеры была падсобная гаспадарка — каровы, свінні, коні, вырошчвалі бульбу, капусту, моркву, цыбулю, часнок, збожжавыя. У гэтым лагеры сярод зняволеных было пяць аграномаў і заатэхнік, вось яны і арганізавалі падсобную гаспадарку, ратавалі людзей. Адсюль я выйшаў на волю ў 1947 годзе. Ды ў гэтых краях і застаўся.

Пражыў я свой доўгі век не так, як жывуць людзі, а ў пакутах і знясільваючай працы. Нічога, акрамя як кароценькі час да раскулачвання, не меў і нічога не маю цяпер: ні тэлевізара, ні халадзільніка, ніякіх іншых электрапрыбораў. Не бываў ні ў горадзе, ні ў тэатры, ні ў доме адпачынку. Апошнім часам застаўся яшчэ і без левай рукі — аддалося перанесенае.

Адно, што маю — трох дачок, чатырох унукаў і пяць праўнукаў. Жыву ў доміку, пабудаваным сваімі рукамі. Даглядае за мной дачка, жонка памерла.

Забыў яшчэ вам напісаць, што на маім жарабяці, які вырас цудоўным рысаком, ездзіў у 1932—1933 гадах старшыня Дубровенскага райвыканкома. Так мне пісалі землякі».

Вось такая споведзь чалавека. Селяніна, які ўмеў і любіў працаваць, і якога зрабілі «кулаком». Бо меў Іван Яфіменка каня, жарабя, карову, цялушку, 6 авечак, двух свіней, хату, хлеў, свіран, гумно і льномялку. Дык цяпер такую ці амаль такую гаспадарку маюць многія працаздольныя і працалюбівыя сем'і. А Івану Нікіфаравічу праз 62 гады налічана за адабранае дабро, за растоптанае жыццё 2 107 174 рублі. Не многае набыў, дорага заплаціўшы.

Ф. Кулакоў.

Вязень ГУЛАГа

— Жылі мы ў вёсцы Янаўка існа-ваўшага тады Журавіцкага раёна. Гэта на Гомельшчыне. Сям'я была як сям'я — сялянская, калгасная. Я яшчэ маладым хлопцам асвоіў кавальскую справу і працаваў у сельскай кузні. Потым на службу прызвалі, служыў на Далёкім Усходзе. Адслужыў, вярнуўся, зноў да горна стаў. Сям'я новую хату будаваць надумалася, працаваць трэба было многа. Для чагосьці дурнога ні часу, ні месца не заставалася. Ды і што там магло быць, у нашай ціхай вёсцы? Працуем ці зрэдку адпачываем.

Вось так аднойчы пайшлі мы з сябруком пагуляць у суседнюю вёску — справа маладая. Ідзем дамоў, цёплы летні вечар душу радуе. А насустрач — падвода. Спыняецца каля нас і ступаюць з яенасустрач міліцыянер і адзін з актывістаў нашага Доўскага сельсавета. Актывіст міліцыянеру на мяне паказвае: «Вось гэты», — гаворыць. «Сядай, паехалі», — без лішніх слоў абышоўся са мной міліцыянер.

Прывезлі дамоў, учынілі вобыск, маці перапалохалі, сястру малую. А за што — ні слова не гавораць. Потым прывезлі мяне ў Журавічы, патрымалі ў КПЗ і зноў нічога не сказалі. На машыне пераправілі ў Гомель, у турму, і там доўга не было ніякіх допытаў.

— Калі пачаліся, пра што дапытваліся, што ставілі ў віну? — пытаюся.

— Дыверсіі. Толькі дзе і якія я ніяк не мог уразумець. Ну, падумайце, пра якія дыверсіі мог думаць я, просты сялянскі хлопец? Да таго ж і савецкая ўлада была мне сваёй. Але следчаму Турбіну хацелася іншага. Потым яго і самога рэпрэсіравалі, але памучыў мяне ён нямала.

Як жа прымусіць зусім невінаватага чалавека прызнаць сваю віну? Мяне вось так тры гады трымалі, прызнанне выбівалі ўсяляк.

— Вось да прыкладу парылка. У моцна напаленае памяшканне метры на тры набіваюць чалавек сорак. І так трымаюць. Многія трацяць прытомнасць і вісяць на плячах таварышаў, бо падаць ім няма куды. Так і стаіць на нагах гэтая паўжывая маса, па костачкі ва ўласным поце. Потым выцягваюць па аднаму — і на допыт. А то пакладуць на лаўку і ў рот ваду наліваюць — глытай. Яна ўжо назад льецца, а яе туды льюць. У галаве ўсё мутнее, допыт працягваецца. Яшчэ мне палец у дзвярах зацiскалі.

Усе марылі: вось каб пра мяне даведаўся Сталін! Рабілі так: калі можна было, згортвалі і перакідвалі ў двор запісачку з просьбай да добрага чалавека пераслаць яе Сталіну. Цяпер разумею, якімі мы былі наіўнымі. А тады можа і добра, што так верылі, гэта падтрымлівала...

Па прыгавору асобай нарады атрымаў я пяць гадоў лагераў з залікам двух гадоў, праведзеных у гомельскай турме.

На поўдні мы будавалі лагер для нямецкіх ваеннапалонных, і яны там былі. Дык ім давалі каўбасу, тушонку, яйкавы парашок, чаго нам і не снілася. Нам — пайку хлеба і суп-баланду. Я быў — адны косці. Праўда, і немцаў потым падраўнялі.

Рэабілітаваны быў толькі 26 ліпеня 1989 года.

Скончыў наш сын школу, захацеў у ваеннае вучылішча паступаць. А яму пра бацьку напомнілі і не дазволілі. Гэта былі брэжнеўскія часы. Сын, праўда, потым свайго дабіўся.

Р. Ляснеўскі

Вернутыя імёны

Спіс ахвяраў беспадстаўных рэпрэсій (не поўны)

АГАРОДНІКАЎ Нікіфар Васілевіч, н. ў 1885 г. ў в. В. Бахава. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.4.1989 г.

АМАНЕНКАВА Малання Мартынаўна, н. ў 1877 г. ў в. Стражава. Аднаасобніца. Арыштавана 1.4.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ пазбаўлена волі. Рэабілітавана 11.8.1989 г.

АНАНЕНКА Малання Міронаўна, н. ў 1878 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобніца. Арыштавана 15.3.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пазбаўлена волі. Рэабілітавана 11.8.1989 г.

АНАНЕНКА Фёдар Лук'янавіч, н. ў 1910 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.3.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 10.4.1930 г. пазбаўлены волі. Рэабілітаваны 11.8.1989 г.

АНАНЕНКАЎ Сідар Лук'янавіч, н. ў 1906 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.5.1930 г. Па пастанове асобай тройкі заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

АНДРЭЕЎ Нікан Фаміч, н. ў 1884 г. ў в. Міхалінава. Арыштаваны 26.12.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 31.12.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.10.1989 г.

АНДРЫЯНАЎ Цімафей Пятровіч, н. ў 1899 г. ў в. Востраў. Калгаснік. Арыштаваны ў 1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

АНІКЕЕНКА Даніла Фёдаравіч, н. ў 1893 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі ад 29.5.1931 г. асланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

АНТРАПОВІЧ Аўрам Яфімавіч, н. ў 1893 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

АНТРАПОВІЧ Лаўрэнцій Яфімавіч, н. ў 1875 г. ў в. Пунішча. Арыштаваны 19.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

АНТРАПОВІЧ Рыгор Дзянісавіч, н. ў 1870 г. ў в. Дзяцель. Арыштаваны 14.12.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

АНТРАПОВІЧ Цімафей Рыгоравіч, н. ў 1905 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

АРЛОЎСКІ Фёдар Андрэевіч, н. ў 1898 г. ў в. Кулакоўшчына. Разам з сям'ёй быў высланы на Урал 28.5.1931 г. Рэабілітаваны 3.3.1992 г.

АРЦЮХОЎ Павел Спірыдонавіч, н. ў 1882 г. ў в. Страхі. Селянін-серадняк. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1932 г. быў высланы ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1989 г.

АСТРОЎСКІ Ксенафонт Трыфанавіч, н. ў 1874 г. ў в. Бяскі. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.10.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.1.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў, высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 22.6.1989 г.

АСТРОЎСКІ Павел Трыфанавіч, н. ў 1872 г. ў в. Бяскі. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.8.1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны 31.8.1989 г.

АЎЛАСЕНКА Піліп Маісеевіч, н. ў 1897 г. ў в. Сваташыцы. Калгаснік. Арыштаваны 24.11.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989 г.

АЎРАМЕНКА Варфаламей Паўлавіч, н. ў 1900 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.12.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 14.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 25.5.1989 г.

АЎРАМЕНКА Павел Палікарпавіч, н. ў 1873 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

АЎРАМЕНКА Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1908 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 1.11.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

БАБІЧАЎ Ануфрый Цімафеевіч, н. ў 1871 г. ў в. Русаны. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.8.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 18.10.1989 г.

БАБІЧАЎ Фама Ануфрыевіч, н. ў 1912 г. ў в. Русаны. Арыштаваны 20.11.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.9.1989 г.

БАБРАЎНІЦКІ Іосіф Фёдаравіч, н. ў 1880 г. ў г. Дзяржынск. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 15.9.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 29.9.1937 г. ў г. Орша. Рэабілітаваны 19.4.1989 г.

БАЛДЭСАЎ Адам Яфімавіч, н. ў 1885 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 14.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

БАРДАДЫНАЎ Марк Данілавіч, н. ў 1905 г. ў в. Ляды. Касір фабрыкі. Па пастанове асобай тройкі ад 23.9.1937 г. пазбаўлены волі тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.4.1965 г.

БЕЛКІН Пейсах Абрамавіч, н. ў 1874 г. ў г. Дуброўна. Царкоўны служка. Арыштаваны 17.1.1938 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1938 г. прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 28.9.1989 г.

БІРУЛЯ Сідар Дзмітрыевіч, н. ў 1881 г. ў г. Дуброўна, дзякан Праабражэнскай царквы. Арыштаваны 14.4.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.7.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 29.5.1989 г.

БОБРЫК Нікіфар Карпавіч, н. ў 1875 г. ў в. Кобызева. Калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 25.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989 г.

БОБРЫКАВА Марыя Парфенаўна, н. ў 1875 г. ў в. Кобызева. Аднаасобніца. Арыштавана 7.2.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 30.7.1932 г. заключана ў канцлагер тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітавана 31.10.1989 г.

БУГАЁЎ Андрэй Ніканоравіч, н. ў 1885 г. ў в. Радзякі. Аднаасобнік. Арыштаваны 14.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.9.1989 г.

БУГАЁЎ Даніла Ніканоравіч, н. ў 1875 г. ў в. Кулакоўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.9.1989 г.

БУГАЁЎ Іван Ніканоравіч, н. ў 1882 г. ў в. Кулакоўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

БУГАЁЎ Кірыла Ніканоравіч, н. ў 1901 г. ў в. Кулакоўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 26.9.1989 г.

БУГАЁЎ Ларыён Ніканоравіч, н. ў 1899 г. ў в. Кулакоўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 14.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 26.9.1989 г.

БУГАЁЎ Ягор Фядосавіч і **БУГАЁВА Палагея Андрэеўна** н. ў в. Кулакоўшчына. Высланы ў 1931 г. разам з сынам **БУГАЁВЫМ Яўгенам Ягоравічам**. Рэабілітаваны ў 1993 г.

БУЕВІЧ Мікалай Восіпавіч, н. ў 1884 г. і **БУЕВІЧ Алена Антонаўна**, н. ў 1890 г. ў в. Бахава. У 1929 г. высланы ў Пермскую вобласць разам з братам **Восіпам Восіпавічам**, сястрой **Эміліяй Восіпаўнай**, маці **Куняй Станіславаўнай**, дочкамі **Сцепанідай** і **Антанінай**, сынам **Альбертам**. Рэабілітаваны 7.4.1994 г.

БАЦЯН Іван Сяргеевіч, н. ў 1867 г. ў в. Андрыянава. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.3.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 10.4.1930 г. пазбаўлены волі тэрмінам на 6 месяцаў. Рэабілітаваны 11.8.1989 г.

БЫЧЫНСКІ Сямён Кузьміч, н. ў 1884 г. ў в. Карабанавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.9.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1992 г.

БЕРАЗОЎСКІ Віктар Львовіч, н. ў 1894 г. Жыў у г. п. Асінторф. Арыштаваны ў 1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 4.9.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 16.10.1937 г. Рэабілітаваны 18.10.1989 г.

ВАЛУЕЎ Авяр'ян Анціпавіч, н. ў 1877 г. в. Баева. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ВАЛУЕЎ Савелій Анціпавіч, н. ў 1875 г. ў в. Баева. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.11.1929 г. Асобым пасяджэннем АДПУ ад 1.12.1929 г. пазбаўлены права пражывання ў Маскве і іншых месцах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1992 г.

ВАЛЧОК-ВОЛКАЎ Аляксей Емяльянавіч, н. ў 1889 г. ў в. Новае Сяло Талачынскага р-на. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 11.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 15.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.4.1989 г.

ВАЛЬКОВІЧ Агрыпіна Сцяпанаўна і яе сын **ВАЛЬКОВІЧ Іван Фёдаравіч**, жылі ў в. Засценак Юр'еў. Рэабілітаваны ў 1994 г.

ВАЛЬКОВІЧ Ігнат Фёдаравіч, н. ў 1913 г. в. Засценак Юр'еў. Рабочы саўгаса. Арыштаваны 17.4.1931 г. Сям'я была выслана вясной 1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 17.5.1931 г. быў таксама высланы. Рэабілітаваны 22.12.1989 г.

ВАРАНЕЦКІ Ягор Пракопавіч, н. ў 1909 г. ў в. Засценкі. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 12.9.1963 г.

ВАРАНОВІЧ Канстанцін Кірылавіч, н. ў 1884 г. ў в. Голені Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Жыў у г. Дуброўна. Царкоўны служка. Арыштаваны 8.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 15.9.1937 г. прыгаворан да расстрэлу. Расстраляны.

ВАРОНІН Ісак Максімавіч, н. ў 1894 г. ў в. Валькава. Аднаасобнік. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 15.9.1937 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ВАРОНІН Міхаіл Макеевіч, н. ў 1900 г. ў в. Валькава. Калгаснік. Арыштаваны 12.11.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.5.1933 г. высланы ў Башкірыю тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ВАШЧАНКА Фёдар Піліпавіч, н. ў 1873 г. ў Тміна-Валдаева. Калгаснік. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 7.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. асуджаны тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

ВЕДЗЕЛЕЎ Апанас Іванавіч, н. ў 1913 г. ў в. Каз'яны. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.6.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.7.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992 г.

ВЕДЗЕЛЕЎ Раман Іванавіч, н. ў 1901 г. ў в. Каз'яны. Заможны селянін. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.8.1932 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.7.1964 г.

ВЕДЗЕЛЕЎ Філімон Іванавіч, н. ў 1893 г. ў в. Кулакоўшчына. Заможны селянін. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.8.1932 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.7.1964 г.

ВЕРАБ'ЁЎ Емяльян Андрэевіч, н. ў 1870 г. Жыў у в. Кобызева. Аднаасобнік. Высланы ў 1930 г. ў г. Кіраўск Мурманскай вобласці з жонкай **Марыяй Карпаўнай**, 1871 г. н. і дачкой **Верай Емяльянаўнай**, 1914 г. н. Рэабілітаваны 27.1.1995 г.

ВІТКОЎСКІ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1878 г. ў в. Чырвоная Слабада. Калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 28.9.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 12.10.1937 г. ў г. Орша. Рэабілітаваны 12.4.1989 г.

ВІТКОЎСКІ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1879 г. ў в. Чырвоная Слабада. Аб'ездчык лясніцтва. Арыштаваны 26.2.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 4.10.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989 г.

ВІТКОЎСКІ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1891 г. ў в. Чырвоная Слабада. Арыштаваны 26.1.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 4.10.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989 г.

ВІТКОЎСКІ Лявон Сцяпанавіч, н. ў 1882 г. ў в. Чырвоная Слабада. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.2.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 4.10.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989 г.

ВОЛКАЎ Андрэй Пятровіч, н. ў 1891 г. ў в. Калінаўка Аршанскай акругі. Арыштаваны 22.10.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 25.11.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.10.1989 г.

ВОЛЬСКІ Альфонс Антонавіч, н. ў 1898 г. ў в. В. Бахава. Рабочы. Арыштаваны 20.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.3.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 11.8.1989 г.

ВЯЛІЧКА Міхаіл Савельевіч, н. ў 1865 г. ў в. Баева. Святар. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКВД ад 8.9.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 12.10.1937 г. ў г. Орша. Рэабілітаваны 18.5.1989 г.

ГАЛАДКОЎСКІ Яўген Цімафеевіч, жыў у в. Літвінава. У 1930 г. разам з жонкай **Марыяй Максімаўнай** і дачкой **Аляксандрай** высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны ў 1993 г.

ГАНЧАРОВА Аляксандра Дзмітрыеўна, н. ў 1916 г. ў в. Сазонаўка. Калгасніца. Па пастанове Асобага схода пры НКУС СССР ад 9.6.1945 г. выслана з дзецьмі ў Краснаярскі край тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітавана 20.10.1983 г.

ГАРБУЛЁЎ Маісей Васілевіч, н. ў 1904 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

ГАРОДНІК Міхаіл Нікіфаравіч, н. ў 1881 г. ў в. Буда. Жыў на ст. Орша. Рабочы. Арыштаваны 27.10.1929 г. Рашэннем Асобага схода пры калегіі АДПУ ад 3.2.1930 г. вызвалены з-пад стражы. Рэабілітаваны 24.11.1989 г.

ГІЛЯСЕЎ Іван Емяльянавіч, н. ў 1877 г. ў в. В. Бахава. Арыштаваны 18.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКВД ад 15.9.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 29.9.1937 г. ў г. Орша. Рэабілітаваны 19.4.1989 г.

ГЛУШАКОЎ Дзмітрый Пятровіч, н. ў 1903 г., жыў у г. Дуброўна. Раскулачаны і высланы разам з жонкай у Сібір. Рэабілітаваны Віцебскім абласным судом 14.4.1995 г.

ГОЛУБЕЎ Спірыдон, ГОЛУБЕВА Малання і іх дзеці **Арцём, Сцяпан, Сідар, Пётр, Рыгор, Уладзімір** і **Ганна** з в. Скуматы ў 1931 г. высланы

ў Косінскі раён Пермскай вобл. Рэабілітаваны ў 1992 г.

ГРЫНЁЎ Еўдакім Захаравіч, н. ў 1908 г. ў г. Дуброўна. Рабочы. Пастановай асобай тройкі ад 26.11.1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 29.10.1960 г.

ГРЫЧУЛІН Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1887 г. ў в. Слабодка. Аднаасобнік. Арыштаваны 15.7.1937 г. Рашэннем асобай тройкі НКВД ад 28.12.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.10.1989 г.

ГРЫШУНОЎ Рыгор Ігнатавіч, н. ў 1874 г. ў в. Новая Зямля. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 26.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989 г.

ГРЫШЧАНКОЎ Емяльян Несцеравіч, н. ў 1897 г. ў в. Ірвяніца. Арыштаваны 29.7.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 26.8.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Арыштаваны ў другі раз 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 29.8.1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны 12.6.1989 г.

ГРЫШЧАНКОЎ Кірыл Зіноўевіч, н. ў 1904 г. ў в. Ірвяніца. Селянін-серадняк. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 19.6.1932 г. высланы ў Заходнюю Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989 г.

ГРЫШЧАНКОЎ Фёдар Зіноўевіч, н. ў 1886 г. ў в. Ірвяніца. Селянін-серадняк. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі ад 19.6.1932 г. высланы ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989 г.

ГРЫШЧАНКОЎ Фёдар Зіноўевіч, н. ў 1895 г. ў в. Ірвяніца. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі ад 19.6.1932 г. высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989 г.

ГУДЫНА Васіль Герасімавіч, жыў у в. Чырына. У 1933 г. высланы на Далёкі Усход. Рэабілітаваны ў 1994 г.

ГУЗАВА Лідзія Яўменаўна, н. ў 1926 г. ў в. Асташкавічы. Аднаасобніца. Па пастанове асобай тройкі ад 7.7.1931 г. выслана з бацькамі на Урал. Рэабілітавана 20.11.1992 г.

ГУЗАВА Лізавета Сямёнаўна, н. ў 1912 г. ў в. Асташкавічы. Аднаасобніца. Арыштавана 13.6.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.7.1930 г. заключана ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 4.6.1992 г.

ГУЗАВА Матрона Яўменаўна, н. ў 1918 г. ў в. Асташкавічы. Па пастанове асобай тройкі ад 7.7.1931 г. выслана з бацькамі на Урал. Рэабілітавана 20.11.1992 г.

ГУЗАВА Ніна Яўменаўна, н. ў 1922 г. ў в. Асташкавічы. Па пастанове асобай тройкі ад 7.7.1931 г. выслана з бацькамі на Урал. Рэабілітавана 20.11.1992 г.

ГУЗАВА Яўгенія Сямёнаўна, н. ў 1914 г. ў в. Асташкавічы. Аднаасобніца. Арыштавана 13.6.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.7.1930 г. заключана ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 4.6.1992 г.

ГУЗАЎ Архіп Арцёмавіч, н. ў 1894 г. ў в. Лапіроўшчына. Калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 28.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 18.10.1989 г.

ГУЗАЎ Архіп Арцёмавіч, н. ў 1894 г. ў в. Асташкавічы. Арыштаваны 20.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 28.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1989 г.

ГУЗАЎ Іван Сафронавіч, н. ў 1870 г. ў в. Асташкавічы. Арыштаваны 13.6.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.7.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992 г.

ГУЗАЎ Кірыл Яўменавіч, н. ў 1928 г. ў в. Асташкавічы. Высланы з бацькамі на Урал. Вызвалены 5.12.1941 г. Рэабілітаваны 20.11.1992 г.

ГУЗАЎ Мікалай Аляксеевіч і **ГУЗАВА Пелагея Мікалаеўна**, в. Дзёмкіна. Раскулачаны і высланы ў 1930 г. Рэабілітаваны 30.9.1994 г.

ГУЗАЎ Панцеляймон Арцёмавіч, н. ў 1893 г. ў в. Займішча. Арыштаваны 18.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край разам з жонкай **ГУЗАВАЙ Марынай Восіпаўнай** і дзецьмі **Антанінай, Марыяй, Надзеяй** і **Кацярынай**. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ГУЗАЎ Фёдар Іванавіч, н. ў 1910 г. ў в. Асташкавічы. Арыштаваны 29.7.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 26.8.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1992 г.

ГУЗАЎ Харытон Аляксандравіч, н. ў 1885 г. ў в. Дзёмкіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ГУЗАЎ Яўмен Аляксеевіч, н. ў 1885 г. ў в. Асташкавічы. Арыштаваны 24.5.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.7.1931 г. высланы разам з сям'ёй на Урал. Памёр у 1933 г. Рэабілітаваны 20.11.1992 г.

ГУРАЎ Раман Максімавіч, н. ў 1886 г. ў в. Чырвоная Слабада. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.3.1935 г. Рашэннем асобага сходу пры НКУС ад 1.8.1935 г. вызвалены. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ГУРСКІ Яфім Ільіч, н. ў 1873 г. ў в. Рыбалтова. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 26.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989 г.

ГУТАРАЎ Рыгор Трафімавіч, н. ў 1874 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 7.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

ДЗЕНІСЕНКА Пётр Карпавіч, н. ў 1895 г. ў в. Карабанавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.9.1929 г. Быў высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 7.5.1992 г.

ДЗЯРЖЫЦКІ Фёдар Цімафеевіч, н. ў 1892 г. ў в. Барздоўка. Аднаасобнік. Жыў у в. Дзёмкіна. Арыштаваны 18.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ДУБРОЎСКІ Аляксандр Васілевіч, н, ў 1885 г. ў в. Кобызева. Асуджаны ў 1933 г. на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ДУБРОЎСКІ Леў Карпавіч, н. ў 1889 г. ў в. Кобызева. Вартаўнік. Жыў у г. Віцебск. Арыштаваны 19.7.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 25.9.1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны 10.4.1989 г.

ДУДАРАЎ Фёдар Парфенавіч, н. ў 1905 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 7.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

ДУХОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1879 г. ў г. Бешанковічы, прапаведнік і гандляр прадметамі рэлігійнага культу. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 1.1.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры АДПУ ад 14.7.1932 г. высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1989 г.

ЁЖЫКАЎ Сафрон Ларыёнавіч, н. ў 1885 г. ў в. Кляны, яго жонка **Марыя Мяфодзьеўна**, н. ў 1885 г., дачка **Сукліта**, н. ў 1915 г., дачка **Еўдакія**, н. ў 1920 г., сын **Мяфодзій**, н. ў 1921 г., сын **Васіль**, н. ў 1924 г., сын **Павел**, н. ў 1926 г., сын **Пётр**, н. ў 1930 г. Высланы ў Пермскую вобласць у 1931 г. Рэабілітаваны 18.8.1994 г.

ЖМАЧЫНСКІ Дзяніс Міхайлавіч, н. ў 1885 г. ў в. Пунішча. Арыштаваны 20.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ЖМАЧЫНСКІ Еўдакім Міхайлавіч, н. ў 1882 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. сасланы ў Паўночны край разам з сям'ёй: жонка **Сынклета Аўтаномаўна (Лідзія Антонаўна)**, дзеці **Улляна**, **Якаў** і **Ганна**.

ЖМАЧЫНСКІ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1901 г. ў в. Пунішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.3.1931 г. Высланы разам з сям'ёй. Рэабілітаваны 24.11.1989 г.

ЖУРАЎКІН Якаў Васілевіч, н. ў 1893 г. ў в. Жабыкі. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 27.10.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.4.1992 г.

ЖЫГУНОЎ Аляксей Ільіч, н. ў 1873 г. ў в. Шэра-Селішча. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. Рэабілітаваны 15.6.1992 г.

ЗАБЛОЦКІ Іван Іосіфавіч, н. ў 1909 г. ў в. Верасняны Кіеўскай акругі. Працаваў грабаром на Асінбудзе і жыў у п. Асінторф. Арыштаваны 25.12.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.3.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 28.3.1989 г.

ЗАЙЦАЎ Апанас Рыгоравіч.

ЗАЙЦАЎ Васіль Міхайлавіч.

ЗАЙЦАВА Лукер'я Адамаўна.

ЗАЙЦАЎ Якім Якімавіч. Жыхары в. Новае Сяло, арыштаваны ў 1934 г. Рэабілітаваны ў 1957 г.

ЗАХАРЭНКА Барыс Іванавіч, н. ў 1898 г. ў в. Кіраёва. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

ЗВЯРКОЎ Герасім Васілевіч, н. ў 1890 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Па пастанове асобай тройкі ад 17.11.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.9.1965 г.

ЗЕМЛЯНЫ Барыс Ягоравіч, н. ў 1891 г. ў г. Дуброўна. Арыштаваны 1.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

ЗЕМЛЯНЫ Сяргей Паўлавіч, н. ў 1899 г. ў в. Рыбалтова. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.10.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.10.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ЗУБКОЎСКІ Васіль Свірыдавіч, н. ў 1906 г. ў в. Казлы. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ЗУБКОЎСКІ Герасім Дзям'янавіч. Жыў у в. Азарава. У 1932 г. раскулачаны і высланы на Далёкі Усход. Рэабілітаваны ў 1994 г.

ЗЯБКО Раман Емяльянавіч, н. ў 1871 г. ў в. Новая Тухінь. Арыштаваны 23.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі высланы ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 16.7.1958 г.

ЗЯМЦОЎ Еўдакім Антонавіч, н. ў 1898 г. ў в. Бяскі. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.11.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 8 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989 г.

ЗЯМЦОЎ Ягор Аляксеевіч, н. ў 1887 г. ў в. Бяскі. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.10.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад

11.1.1933 г. высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 22.6.1994 г.

ІВАНОЎ Іван Фядосавіч, н. ў 1919 г. ў в. Кавалеўшчына. Рэабілітаваны 6.7.1994 г.

ІВАНОЎ Фядос Мітрафанавіч, н. ў 1874 г. ў в. Кавалеўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 26.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1989 г.

ІВАШКЕВІЧ Дзяніс Філімонавіч, н. ў 1896 г. ў в. Ланенка. У 1930 г. разам з жонкай **Нінай Малахаўнай**, дзецьмі **Аляксандрам** і **Таццянай** высланы ў г. Кіраўск Мурманскай вобл. Рэабілітаваны ў 1993 г.

ІВАШКЕВІЧ Капітон Савельевіч, н. ў 1889 г. ў в. Ланенка. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. знволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

ІВАШКЕВІЧ Нікіфар Пятровіч, н. ў 1895 г. ў в. Ланенка. Калгаснік. Арыштаваны 8.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

ІВАШКЕВІЧ Сяргей Яфрэмавіч, н. ў 1876 г. ў в. Ланенка. Калгаснік. Арыштаваны 8.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

ІЛАРЫЁНЕНКА Якаў Паўлавіч, н. ў 1907 г. ў в. Альхоўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. высланы разам з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 21.8.1989 г.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1912 г. ў в. Дзёмкіна. Арыштаваны 8.8.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 6.8.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.6.1991 г.

КАВАЛЕЎСКІ Іван Апанасавіч, н. ў 1885 г. ў в. Дзёмкіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

КАВАЛЕЎСКІ Іван Апанасавіч, н. ў 1884 г. ў в. Кобызева. Калгаснік. Жыў у г.Дуброўна. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 28.9.1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны 25.4.1989.

КАВАЛЕЎСКІ Іван Восіпавіч, н. ў 1892 г. ў в. Кобызева. Высланы разам з сям'ёй (жонкай **КАВАЛЕЎСКАЙ Таццянай Емяльянаўнай** і дзецьмі **Зінаідай**, **Міхаілам** і **Мікалаем**) у Пермскую вобл. Рэабілітаваны ў 1993 г.

КАВАЛЕЎСКІ Павел Мікітавіч, н. ў 1898 г. ў в. Дзёмкіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 12.12.1989 г.

КАВАЛЕЎСКІ Рыгор Апанасавіч, н. ў 1881 г. ў в. Кобызева. Жыў у в. Дзёмкіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.8.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 26.8.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.6.1991 г.

КАВАЛЕЎСКІ Рыгор Апанасавіч, н. ў 1871 г. ў в. Кобызева. Жыў у г. Дуброўна. Калгаснік. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 29.8.1937 г. расстраляны. Рэабілітаваны 25.4.1989 г.

КАДЗЕШ Цімафей Яфімавіч, н. ў 1883 г. ў г. Дуброўна. Саматужнік-адзіночка. Арыштаваны 3.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

КАЗЛІНСКІ Фядот Сяргеевіч, н. ў 1885 г. ў в. Займішча. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.12.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 14.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 29.5.1989 г.

КАЗЛОЎ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1912 г. ў в. Сіпішчава. Калгаснік. Арыштаваны 7.11.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 3.12.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.9.1962 г.

КАКОЦЬКА Арцём Рыгоравіч, н. ў 1885 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 7.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

КАКОЦЬКА Дзмітрый Фядотавіч, н. ў 1877 г. ў г. Дуброўна. Вартаўнік. Арыштаваны 18.4.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.7.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.5.1989 г.

КАЛІНІН Дзмітрый Сцяпанавіч, н. ў 1884 г. ў в. Слабодка. Аднаасобнік. Арыштаваны 15.7.1937 г. Рашэннем асобай тройкі НКУС ад 28.12.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.10.1989 г.

КАЛУМБІН Міхаіл Іванавіч, н. ў 1886 г. ў в. Гуракі. Калгаснік. Арыштаваны 18.7.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 14.8.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 21.8.1937 г. Рэабілітаваны 10.5.1989 г.

КАЛУМБІН Фёдар Цімафеевіч, жыў у в. Казьяны. У 1933 г. высланы. Рэабілітаваны ў 1993 г.

КАМІСАРАЎ Дзмітрый Кляменцьевіч, н. ў 1887 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 1.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

КАМПАНЕЦ Амвросій Рыгоравіч, н. ў 1890 г. ў в. Верасовічы Вернеўскага р-на. Іераманах

Новатухінскай царквы. Жыў у в. Новая Тухінь. Арыштаваны 24.12.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.5.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.7.1989 г.

КАПЕЛЬКА Міхаіл Гаўрылавіч, н. ў 1898 г. ў в. Пушчаі. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 21.8.1989 г.

КАПУСЦІН Ціхан Мікітавіч, н. ў 1894 г. ў в. Юр'еў. Кладаўшчык. Арыштаваны 23.6.1941 г. Асуджаны па арт. 58. Памёр у лагеры 23.1.1943 г. ў г. Горску Арэнбургскай вобл. Рэабілітаваны 23.12.1960 г.

КАПЦЕРАЎ Панцялей Мікалаевіч, н. ў 1882 г. ў в. Снегіры. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.3.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.9.1989 г.

КАРАЛЁЎ Іларыён Пятровіч, н. ў 1893 г. ў в. Пятрыкі. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 21.8.1989 г.

КАРАПАНАВА (ЦІМОШЧАНКА) Надзея Георгіеўна, н. ў 1927 г. ў в. Судзілавічы. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. выслана разам з бацькамі на Урал. Вызвалена 15.1.1942 г. Рэабілітавана 27.10.1992 г.

КАТКОЎСКІ Лаўрэн Сяргеевіч, н. ў в. Замошша. Аднаасобнік. Жыў у в. Дзёмкіна. Арыштаваны 18.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

КАТКОЎСКІ Мікіта Кузьміч, н. ў 1901 г. ў в. Каз'яны. Калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 28.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.8.1989 г.

КІРЫЕНКА Сцяпан Дзям'янавіч, н. ў 1882 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 8.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі ад 29.5.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.8.1989 г.

КІСЯЛЁЎ Іван Барысавіч, н. ў 1894 г. ў в. Засценкі. Калгаснік. Арыштаваны 21.4.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.4.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 15.6.1989 г.

КІСЯЛЁЎ Кірыл Пятровіч, жыў у в. Пуніна. У 1931 г. разам з жонкай **Марыяй Сямёнаўнай** і дзецьмі **Рыгорам** і **Галінай** высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны ў 1993 г.

КЛІНДУХОЎ Леанід Васілевіч, н. ў 1891 г. у в. Свяцілавічы Веткаўскага раёна. Святар. Жыў у в. Расасна. Арыштаваны 6.8.1937 г. Прыгавораны да расстрэлу 29.8.1937 г. Расстраляны 23.9.1937 г. Рэабілітаваны 10.5.1989 г.

КЛЫКАВА Варвара Канстанцінаўна, н. ў 1919 г. ў в. Судзілавічы. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. выслана разам з бацькамі на Урал. Рэабілітавана 27.10.1992 г.

КЛЯЦКОЎ Іван Апанасавіч, н. ў 1875 г. ў в. Свіракі. Аднаасобнік. Жыў у в. Горная Крапіўна. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 28.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.12.1989 г.

КОНАНАЎ Якаў Рыгоравіч, н. ў 1888 г. ў в. Страхі. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 24.11.1989 г.

КОТАЎ Іван Фокавіч, н. ў 1899 г. ў в. Іскозы. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 25.9.1989 г.

КРАЎЦОЎ Самуіл Цярэнцьевіч, н. ў 1885 г. ў в. Снегіры. Калгаснік. Жыў у в. Копані. Арыштаваны 26.12.1937 г. Рашэннем асобай тройкі НКУС ад 31.12.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1989 г.

КРОТАЎ Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1908 г. ў в. Слатаўшчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.6.1929 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.7.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992 г.

КРУЧКОЎ Васіль Анціпавіч, н. ў 1908 г. ў в. Баева. Рабочы. Арыштаваны 5.10.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 14.10.1930 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992 г.

КРУЧКОЎ Анціп Цярэнцьевіч, н. ў 1870 г. ў в. Баева. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.1.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

КРУЧКОЎ Савелій Пятровіч, н. ў 1888 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 7.4.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

КРЭС Мікіта Васілевіч, н. ў 1867 г. ў г. Дуброўна. Калгаснік. Арыштаваны 7.3.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.6.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 4.10.1989 г.

КУКСЯНОК Яфімія Ермалаеўна, н. ў 1907 г. ў в. Стражава. Аднаасобніца. Арыштавана 1.3.1930 г. Па пастанове асобай тройкі была зняволена тэрмінам на 3 месяцы. Рэабілітавана 11.8.1989 г.

КУЛЯШОЎ Пётр Рыгоравіч, н. ў 1881 г. Жыў у г. Дуброўна. Арыштаваны 17.4.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.7.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 29.5.1989 г.

КУРАКОЎ Парфен Васілевіч, н. ў 1879 г. ў в. Чырына. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.6.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.8.1989 г.

КУХАРСКІ Рыгор Васілевіч, н. ў 1897 г. ў в. Забрудае Жытомірскай вобл. Грабар. Жыў у п. Асінторф. Арыштаваны 22.2.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.3.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.3.1989 г.

ЛАВЕЙКІН Ілья Фёдаравіч, н. ў 1905 г. ў в. Казлы. Калгаснік. Арыштаваны 12.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ЛАВЕЙКІН Сцяфан Фёдаравіч, н. ў 1909 г. ў в. Казлы. Арыштаваны 2.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ЛАЗОЎСКІ Валерыян Іосіфавіч, н. ў 1888 г. Жыў у в. Расасна. Загадчык млыну. Па пастанове судовага органа ад 11.11.1938 г. прыгаворан да расстрэлу. Памёр 23.11.1938 г. Рэабілітаваны 9.4.1959 г.

ЛАМБОЦКІ Ігнат Палікарпавіч, н. ў 1899 г. ў в. Гуракі. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.11.1932 г. Па пастанове асобай тройкі ад 11.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.6.1989 г.

ЛАМБОЦКІ Малах Трафімавіч, н. ў 1886 г. ў в. Гуракі. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.3.1935 г. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ЛАПАВУХАЎ Адам Ільіч, н. ў 1900 г. ў в. Сенцюры. Арыштаваны 19.11.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.12.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 19.1.1938 г. Рэабілітаваны 21.10.1989 г.

ЛАЎРОЎСКІ Яўген Мікалаевіч, н. ў 1896 г. Жыў у г. Дуброўна. Служка. Арыштаваны 8.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 15.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 28.4.1989 г.

ЛУК'ЯНАЎ Сямён Уласавіч, н. ў 1880 г. ў в. Ляхаўка. Арыштаваны 19.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі ад 12.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20.11.1989 г.

ЛЯШКЕВІЧ Васіль Дзмітрыевіч, жыў у г. Дуброўна. У 1930 г. высланы ў п. Таратурна Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны ў 1992 г.

ЛЯХОВІЧ Андрэй Давыдавіч, н. ў 1870 г. ў в. Кобызева. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 3.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 30.11.1989 г.

ЛЯХОВІЧ Васіль Іванавіч, н. ў 1877 г. ў в. Сідаровічы Кіеўскай акругі. Грабар. Жыў у п. Асінторф. Арыштаваны 21.12.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 11.3.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 28.3.1989 г.

ЛЯХОВІЧ Ісак Піліпавіч, н. ў 1901 г. ў в. Кобызева. Калгаснік. Арыштаваны 31.1.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 30.7.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989 г.

МАЖЫЛОЎСКІ Іван Лаўрэнавіч, н. ў 1889 г. ў в. Бахава. Калгаснік. Арыштаваны 25.6.1941 г. Па пастанове асобага сходу НКУС зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.4.1989 г.

МАЖЫЛОЎСКІ Канстанцін Ягоравіч, н. ў 1894 г. ў в. Ланенка. Калгаснік. Арыштаваны 8.1.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 7.2.1933 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

МАІСЕЕЎ Раман Яфімавіч, н. ў 1902 г. ў в. Волева. Арыштаваны 20.2.1935 г. Па пастанове Вярхоўнага суда зняволены тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.12.1968 г.

МАКАРАНКА Мікалай Міронавіч, н. ў 1892 г. ў в. Судзілавічы. Арыштаваны ў 1932 г. Расстраляны 26.2.1958 г. Рэабілітаваны 26.2.1958 г.

МАКАРАНКА Фёдар Міронавіч, н. ў 1900 г. ў в. Судзілавічы. Аднаасобнік. Жыў у в. Заполле. Арыштаваны 9.3.1931 г. Высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.3.1989 г.

МАЛАЛЕТНІ Маісей Сцяпанавіч, н. ў 1902 г. ў в. Рэдзькі. Аднаасобнік. Жыў у в. Судзілавічы. Арыштаваны 9.3.1931 г. па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 29.5.1931 г. Высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 21.8.1989 г.

МАЛЮШЫЦКІ Станіслаў Казіміравіч, н. ў 1910 г. Жыў у в. Судзілавічы. Арыштаваны 19.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі ад 29.5.1931 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

МАРТЫНАЎ Емяльян Пятровіч, н. ў 1912 г. ў в. Каз'яны. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.11.1929 г. Па пастанове асобага сходу пры калегіі АДПУ ад 15.12.1929 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 4.6.1992 г.

МАРТЫНЕНКА Макар Самуйлавіч, н. ў 1899 г. ў в. Рэдзькі. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі ад 29.5.1931 г. высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

МАРЫСКІН Мікіта Дзмітрыевіч, н. ў 1891 г. ў в. Каз'яны. Асуджаны ў 1939 г. Рэабілітаваны ў 1991 г.

МАРЫЧАЎ Карп Якаўлевіч, н. ў 1883 г. ў в. Лаўкі. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.11.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 8.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 22.9.1989 г.

МАРШАЛАЎ Васіль Аляксандравіч, н. ў 1871 г. ў в. Дзяцель. Калгаснік. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 26.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989 г.

МІХАЙЛАЎ Парфір Сцяфанавіч, н. ў 1893 г. ў в. Жабыкі Бельскага сельсавета. Арыштаваны 8.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 27.7.1989 г.

МІХАЙЛАЎ Пракоп Сцяфанавіч, н. ў 1875 г. ў в. Жабыкі Бельскага сельсавета. Арыштаваны 8.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 27.7.1989 г.

МІХАСЁЎ Макар Ізотавіч, н. ў 1892 г. ў в. Засценкі. Калгаснік. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.4.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 15.6.1989 г.

Ніжэй пералічаны жыхары в. Новае Сяло, абылганыя карнымі органамі і па пастанове асобай тройкі АДПУ пры БВА ад 16.11.1934 г. асуджаныя на 3 гады канцлагера:

МІШКАРУДНЫ Васіль Паўлавіч.
МІШКАРУДНЫ Піліп Адамавіч.
МІШКАРУДНЫ Яфім Якімавіч.

Той жа пастановай асобай тройкі АДПУ пры БВА асуджаны на 10 гадоў канцлагера:

МАЛАХОВІЧ Парфір Іванавіч.
МІШКАРУДНЫ Павел Несцеравіч.

В. С. Мішкарудны.

МІШКАРУДНЫ Сідар Аляксеевіч.
МІШКАРУДНЫ Сяргей Рыгоравіч
МІШКАРУДНЫ Цімафей Сцяпанавіч.

Згодна з той жа пастановай асобай тройкі расстраляны

МІШКАРУДНЫ Васіль Сцяпанавіч.

Усе асуджаныя рэабілітаваны 17.10.1957 г. за адсутнасцю складу злачынства.

МУРАШКА Фёдар Дзмітрыевіч, н. ў 1909 г. ў в. Рэдзькі. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931 г. і высланы разам з жонкай **МУРАШКА Еўдакіяй Самуйлаўнай**, н. ў 1909 г., і дачкой **МУРАШКА Валянцінай Фёдараўнай**, н. ў 1931 г., у Пермскі раён. Рэабілітаваны 6.6.1991 г.

МЯЛЕШКІН Кузьма Іванавіч, н. ў 1881 г. ў в. Снегіры. Арыштаваны 4.3.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 19.6.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

МЯТЛІЦКІ Ягор Васілевіч, н. ў 1893 г. ў в. Баева. Арыштаваны 8.2.1930 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 9.3.1930 г. высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 25.9.1989 г.

НАВУМАЎ Міхаіл Навумавіч, жыў у в. Махначы. У 1933 г. раскулачаны і высланы. Рэабілітаваны ў 1994 г.

НАЗАРАЎ Іўка Андрэевіч, н. ў 1891 г. ў в. Карабанавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 29.8.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

НАЗАРАЎ Фёдар Прохаравіч, н. ў 1907 г. ў в. Карабанавічы. Калгаснік. Жыў у в. Сваташыцы. Арыштаваны 19.9.1937 г. Па пастанове асобай тройкі ад 26.9.1937 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.4.1989 г.

НІКІЦЕНКА Сямён Іванавіч, н. ў в. Старое Ганчарова. Жыў у г. Полацк. Арыштаваны 21.6.1927 г.; 19.12.1927 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Па пастанове асобай тройкі пры калегіі АДПУ ад 28.10.1929 г. пасля адбыцця тэрміну зняволення высланы ў Паўночны край тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.7.1992 г.

НІКІЦІН Сямён Макаравіч, н. ў 1877 г. ў в. Анціпенкі. Калгаснік. Арыштаваны 2.12.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 10.1.1934 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 10.10.1989 г.

ПАБІРАШКА Фёдар Агеевіч, н. ў 1905 г. ў в. Пятрыкі. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.3.1931 г. Па пастанове асобай тройкі ад 29.5.1931 г. высланы з сям'ёй на Урал. Рэабілітаваны 5.9.1989 г.

ПАКІДЗЬКА Ларыён Дзянісавіч, н. ў 1908 г. ў в. Сваташыцы. Арыштаваны 26.12.1932 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 13.1.1933 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989 г.

ПАЛУПОПАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1873 г. ў в. Засценкі. Калгаснік. Арыштаваны 21.12.1931 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 21.4.1932 г. заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.6.1989 г.

ПАПОЎ Фёдар Ісакавіч, н. ў 1896 г. ў в. Сіпішчава. Калгаснік. Арыштаваны 3.12.1933 г. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АДПУ ад 10.1.1934 г. зняволены ў ППЛ тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989 г.

ПАХАНАЎ Дзмітрый Епімахавіч, н. ў 1878 г. ў в. Сіпішчава. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 г. Па пастанове асобай тройкі НКУС ад 29.8.1937 г. прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 16.5.1989 г.

Быў забіты і нямецкі афіцэр высокага звання. Пакуль услед за наступаючымі гітлераўцамі падаспела іх зондеркаманда, на полі бою пабываў удзельнік грамадзянскай вайны Ц. А. Янчанка. Ён наткнуўся на забітага нямецкага афіцэра. Нічога не прывабіла ў ім старога салдата. Але планшэт з дакументамі і ваеннай картай ён узяў з сабой, відаць, лічыў, што спатрэбіцца. Пры зборы сваіх забітых фашысты выявілі гэту прапажу. Яны зрабілі вобыск у вёсцы. Знайшлі планшэт, а Цімафея Аляксандравіча расстралялі за яго хатай.

Б. Шалуха,
настаўнік-краязнаўца.

З успамінаў Марыі Архіпаўны Корбан, настаўніцы-пенсіянеркі, г. Дуброўна

У пачатку ліпеня 1941 г. я вярнулася з Сенненскага раёна на Дубровеншчыну ў родную вёску Літвінава. З трывогай чакала мяне сям'я: сястра, чатыры браты і бацька. Маці памерла значна раней, старэйшы брат Іван быў у Чырвонай Арміі.

Дома я стала гаварыць, што юнакам, якія не трапілі ў армію, нечага сядзець і чакаць гітлераўцаў. Трэба падавацца ў наш тыл, але не з пустымі рукамі, а гонячы туды калгасную жывёлу. Так пагоншчыкамі сталі мой родны брат Фёдар Міхееў, дваюрадны брат Аляксей Міхееў, Іван Конышаў, некалькі дзяўчат і пажылых мужчын. Я ж засталася пры меншых братах-падлетках, каб уратаваць іх.

Пагоншчыкі даставілі калгасны статак ажно ў Чувашыю. Адтуль Фёдар, Аляксей і Іван пайшлі на фронт. Двое з іх вярнуліся з перамогай, а Аляксей Рыгоравіч Міхееў загінуў.

ЮНЫ ПАТРЫЁТ

Дзесяцігадовы Вася Казакоў з вёскі Пішчыкі разам са сваім сябруком Пятром Клімянковым адправіўся пасвіць коней на ўскрайку леса каля вёскі. З лесу да іх падышоў камандзір Чырвонай Арміі (лейтэнант, бо Вася запомніў, што ў яго на пятліцах было па два кубікі) і папрасіў хлопчыкаў з'ездзіць у в. Чырына па ліпецкай прасёлкавай дарозе, прыгледзецца, што там ёсць, вярнуцца і расказаць. Пеця не справіўся з канём, і Вася паехаў адзін.

Праз нейкі час яго затрымаў нямецкі варта вы. Заплакаўшы, Вася стаў паказваць, што ед ў Чырына. Немцы адпусцілі яго. А хлопчы паехаў далей і ўбачыў бясконцую калону нямецкіх аўтамашын і танкетак. У рэчцы купаліся гітлераўцы.

---

* Г. Гудериан. Воспоминания солдата. Перевод с немецкого. М., 1954. С. 168—173.)



Карта-схема наступлення нямецкіх войск на Смаленскім напрамку ў 1941 г.

Цішком, мінуўшы вартавых, Вася падаўся назад. Лейтэнант выслухаў і падзякаваў хлопца.

А неўзабаве варожую калону з боку Волева атакавалі нашы танкі, а з флангаў — пяхота. Бой закончыўся толькі вечарам. На месцы бою засталіся знішчаная мотакалона і сотні трупаў гітлераўцаў.

Была ў гэтым заслуга і юнага Васі Казакова, якому потым чырвонаармейцы падарылі гармонік.

Б. Шалуха.

З успамінаў Н. С. Платонавай

Пасля бою ліпеньскім ранкам 1941 г. каля вёскі Барадзіно я сабрала дзяўчат, і мы пайшлі туды, дзе зусім нядаўна грымелі стрэлы. Абшарылі ўсё наваколле, сабралі нашых параненых байцоў і камандзіраў. Тут жа, на полі бою, назбіралі санітарных сумак з медыкаментамі, бінтамі. Так пачалося лячэнне раненых. Штодзень нам пагражала смяртэльная небяспека, але інакш паступіць мы не маглі. Я гавару мы, бо была не адна. Калгаснікі ўсёй вёскай даглядалі, кармілі параненых воінаў. І небяспечная наша работа не прапала марна. З васемнаццаці чалавек памёр ад цяжкіх ран адзін толькі камбат — малодшы лейтэнант Фёдар Іваненка з Казані, яго пахавалі на вясковых могілках. А выздаравеўшыя працягвалі затым барацьбу з ворагам. Напрыклад, Сяргей Крываносаў стаў партызанам, потым зноў воінам Чырвонай Арміі, заслужыў баявыя ўзнагароды. Пасля вайны вярнуўся ў Барадзіно, дзе працаваў старшынёй калгаса. Я стала яго жонкай...

...Калі пасля таго бою мы хавалі нашых загінуўшых байцоў і камандзіраў, я збірала медальёны з іх прозвішчамі і адрасамі і іншыя дакументы. Схавала ўсё гэта ў сваім доме. Але ў 1944 г. фашысты спалілі наш дом. На вялікі жаль, разам з усім астатнім згарэлі і тыя бясцэнныя дакументы...

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» у напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамадавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтву эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленню акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам і план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры бела-

рускага народа. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае на поўдні, па р. Зяльвянка і ўсходняму ўзлессю Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі складала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стану на 4 снежня 1941 г.). Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Часткі Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Дубровенскі раён быў акупіраваны гітлераўскімі войскамі ў сярэдзіне ліпеня 1941 г. (райцэнтр — 16 ліпеня). Ужо з першых дзён акупацыі жыхары раёна адчулі так званы «новы парадак». Перш за ўсё гітлераўцы сталі выяўляць і расстрэльваць камуністаў, потым арганізоўваць канцэнтрацыйныя лагеры і гета для яўрэяў.

Вось як апісвае прыход акупантаў Станіслаў Пятровіч Шмуглеўскі, былы кіраўнік падпольнай камсамольскай арганізацыі ў пас. Асінторф:

«Цэнтральны пасёлак быў разбуджан трэскам нямецкіх матацыклаў, рокатам аўтамашын. Чалавек трыццаць немцаў праімчаліся па пустыннай вуліцы. Ніхто не сустракаў заваёўнікаў.

...Людзей не краналі, яны быццам іх не прыкмячалі. На вачах жыхароў пасёлка працягвалася марадзёрства.

...Праз некалькі дзён фашысты зноў наляцелі ў цэнтральны пасёлак. Яны ўрываліся ў дамы, выпіхвалі ўсіх на вуліцу, таго, хто забавіўся, білі прыкладамі, паганялі расстраляць на месцы. Паднялася паніка, раздаваліся папераджальныя выстралы і лаянка салдат. Плакалі дзеці. Сабраўшы вялізны натоўп на плошчы, гітлераўцы ачапілі яе шчыльным кальцом і пагналі да лесапільнага ўчастка. Падыходзячы да лесапілкі, людзі ўбачылі другі аград фашыстаў. Тут ужо былі знаёмы афіцэр і Трублін (бургамістр). Калі натоўп прыблізіўся да іх метраў на дзесяць, аўтаматчыкі расступіліся, і людзі ўбачылі толькі што вырытую яму. На яе краі стаяла маладая дзяўчына. Рукі яе былі звязаны калючым дротам, на грудзях вісеў кавалак фанеры з надпісам: «За сувязь з партызанамі». Ліцо пакрыта шрамамі і барвовымі сінякамі. Дзяўчына ледзьве трымалася на нагах, і цяжка было пазнаць у ёй учарашнюю настаўніцу Аню Лотаву з в. Заполле.

...Афіцэр падаў знак. Раздалася чарга — кароткая і адрывістая. Аня ўздрыгнула, неяк ненатуральна выпрасталася і паволі на спаўзла на край ямы. Гул жаху і абурэння пракаціўся над натоўпам».

Згодна з ваенна-адміністрацыйным дзяленнем акупіраваных гітлераўцамі тэрыторый, Дубровенскі раён уваходзіў у вобласць армейскага тылу групы армій «Цэнтр», які меў свайго камандуючага, падпарадкаванага камандуючаму групай армій «Цэнтр» і начальніку аператыўнага ўпраўлення генеральнага штаба сухапутных войск Германіі.

Выканаўчым органам у руках ваеннага камандавання ахоўных войск і камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» з'яўляліся камендатуры — палявыя (фельдкамендатуры) і мясцовыя (ортскамендатуры), надзеленыя ўсёй паўнатой улады ў зоне сваёй дзейнасці.

У тылавым раёне групы армій «Цэнтр» канцэнтраваліся вялізныя сілы карнікаў, якія прызначаліся для ажыццяўлення акцый пакарання.

Органы паліцыі бяспекі і СД прадстаўлялі тут спецыяльныя аператыўныя атрады ваеннага тыпу, вядомыя пад назвай айнзацгруп (аператыўныя групы),

якія ўзніклі ў выніку ўзгаднення паміж галоўным упраўленнем бяспекі, вярхоўным камандаваннем узброеных сіл і галоўным камандаваннем сухапутных войск. Гэтыя атрады прафесійных забойцаў і катаў рухаліся за армейскімі часцямі фашысцкай арміі.

Айнзацгрупы падзяляліся на айнзацкаманды (аператыўныя каманды) і зондэркаманды (асобыя каманды). У абавязкі айнзацкаманд і зондэркаманд уваходзіла знішчэнне людзей, падставай служыла забеспячэнне бяспекі на захопленых тэрыторыях, як у раёне баявых дзеянняў, так і ў тыле.

Асобую ролю ў сістэме ваенна-фашысцкага акупацыйнага апарату на тэрыторыі «вобласці армейскага тылу» выконвала тайная палявая паліцыя (ГФП). Як састаўная частка вермахта яна ажыццяўляла ваенна-паліцэйскія функцыі. У ГФП набіраліся супрацоўнікі гестапа, нямецкай паліцыі і іншых карных органаў. Яе групы пры армейскіх фарміраваннях (дывізіях, карпусах, арміях) падпарадкоўваліся начальніку разведкі і контрразведкі гэтага фарміравання. Групы і каманды ГФП, прыдадзеныя палявым і мясцовым камендатурам, з'яўляліся іх выканаўчымі органамі і выконвалі функцыі гестапа ў зоне баявых дзеянняў, у франтавых і армейскіх тылах. Каманды ГФП пры мясцовых камендатурах і ахоўных дывізіях дзейнічалі ў кантакце з паліцыяй бяспекі і СД, палявой жандармерыяй і іншымі фашысцкімі карнымі органамі. Найбольш цесныя кантакты ГФП падтрымлівала з органамі фашысцкай ваеннай разведкі і контрразведкі — абверам, якія густой павуцінай аблыталі ўсю тэрыторыю Беларусі, асабліва вобласці, размешчаныя блізка ад фронту.

У Дуброўне размяшчаліся: мясцовая ваенная камендатура на чале з ортскамендантам, каманда СД-9, мясцовая каманда групы ГФП № 723, разведвальная і контрразведвальная групы «Абвера», раённая паліцыя службы парадку і іншыя карныя органы, якія з'яўляліся галоўным сродкам падтрымання «новага парадку», масавага крывавага тэрору. Для практычнага ажыццяўлення гэтай палітыкі на тэрыторыі раёна была створана сістэма нямецкіх гарнізонаў, а таксама апорных пунктаў паліцыі службы парадку, якая стваралася з мясцовых жыхароў, што перайшлі на службу да немцаў. Найбольш буйнымі з іх былі гарнізоны ў райцэнтры Дуброўна і ў Асінторфе.

Аднак правядзенне ў жыццё сваёй палітыкі не магло быць забяспечана толькі дапамогай ваенна-паліцэйскага тэрору. Каб замаскіраваць грабежніцкія мэты і ўзмацніць уплыў на мясцовае насельніцтва, гітлераўцы пачалі шукаць падтрымку сярод жыхароў раёна. Вылілася гэта ў арганізацыю мясцовых дапаможных устаноў самакіравання — управаў. У Дуброўне была створана раённая ўправа, бургамістрам якой прызначылі былога старшыню тарфкома Скварчэўскага, у Асінторфе — былога начальніка электрацэха здрадніка Радзімы І. Трубліна. На тэрыторыях сельсаветаў былі створаны воласці на чале з валаснымі бургамістрамі, у вёсках прызначаліся старасты.

З АДМІНІСТРАТЫЎНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР»

I. О назначении бургомистров в волостях

1. На должности бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица по возможности из числа белорусов.

2. Бургомистр является представителем волости.

3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.

4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.

5. Все жители, проживавшие в волости по состоянию на 21.06.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.

6. Бургомистр немедленно должен позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

7. Бургомистр привлекается к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Он должен всеми средствами предотвращать акты саботажа. В его обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.

8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 000 жителей назначает комендант полевой комендатуры.

Командующий тылом группы армий «Центр»
фон Шенкендорф, генерал инфантерии

НАРБ, ф. 4683, оп. 3, д. 952, л. 1.

Уся акупацыйная палітыка гітлераўцаў была накіравана на рабаванне і каланізацыю тэрыторыі раёна, на выкачванне для сваёй арміі і вывазу ў Германію як мага больш матэрыяльных рэсурсаў. Сістэма рабавання ў вёсках уключала абкладванне жыхароў падаткамі, паборамі, пастаўкамі, працоўнымі павіннасцямі, якія неабмежавана мог прызначыць і павялічыць любы прадстаўнік акупацыйнай адміністрацыі. Усе калгасы былі распушчаны. Замест іх гітлераўцы спрабавалі стварыць так званыя «абшчынныя гаспадаркі», на базе былых саўгасаў — «дзяржаўныя маёнткі». Быў уведзены рэжым паднявольнай працы і бесчалавечнай эксплуатацыі. Сотні і сотні жыхароў Дубровеншчыны і суседняй Аршаншчыны прайшлі праз «выхаваўчыя» працоўныя лагеры, якія былі створаны ў вёсках Вячэрына, Галяшы, Карабанавічы, Станіславова і іншых.

Аб тым, што давялося перажыць вязням канцлагера ў населеным пункце Востраў Юр'еў (на тэрыторыі Асінторфа), расказвала газета 11-й гвардзейскай арміі «Боевая тревога» ад 27 чэрвеня 1944 г.: «Тут людзей даводзілі да стану прывідаў, нацкоўвалі на іх азвярэлых аўчарак, марылі голадам і холадам. Нават воіны-гвардзейцы, загартаваныя ў баях, знямелі, калі ўбачылі, да чаго давялі савецкіх людзей фашысцкія нелюдзі». (Газета захоўваецца ў музеі баявой і працоўнай славы п. Асінторф.)

Свае крывавыя справы акупанты імкнуліся рабіць з дапамогай здраднікаў савецкай радзімы, ці людзей, зламаных духам. Пры гэтым яны не абмяжоўваліся толькі паліцэйскімі фарміраваннямі.

С. П. Шмуглеўскі ўспамінае:

«У лютым 1942 года фашысты прыслалі ў Асінторф сваіх агентаў для арганізацыі з савецкіх ваеннапалонных так званай «Рускай народнай нацыянальнай арміі (РННА)».

На сёмы пасёлак прыбылі з Берліна камандуючы будучай арміяй былы царскі палкоўнік Ч. Санін, начальнік штаба белаэмігрант Румянцаў, сын генерал-лейтэнанта царскай арміі калчакавец І. Сахараў, белагвардзейцы браты С. Н. і І. Н. Івановы.

Фашысцкія халуі арганізавалі тры гарнізоны з назвай «Масква», «Урал», «Байкал». Гэтым яны падкрэслілі свае мэты. У чэрвені 1942 года «армія» ледзь налічвала 600—700 чалавек...».

Як сведчыць былы баец партызанскага атрада асобага прызначэння падпалкоўнік у адстаўцы Аляксандр Сяргеевіч Казіцкі, «народнікі» ўдзельнічалі ў карных аперацыях супраць партызан. І яны ж, тыя, хто ў душы не прадаўся ворагу, масава, з

узбраеннем пераходзілі на бок народных мсціўцаў.

На Дубровеншчыне дзейнічалі партызанскія брыгады 115-я Горацкая, «Звязда», асобныя атрады 112-ы Горацкі, «Трэція». На тэрыторыю раёна заходзілі для ажыццяўлення баявых аперацый дывер-сійныя, разведвальныя групы іншых партызанскіх фарміраванняў, якія дыслацыраваліся ў суседніх раёнах. У розны час на Дубровеншчыне былі створаны і дзейнічалі шматлікія падпольныя арганізацыі і групы. У падполлі і партызанскіх атрадах змагаліся з ворагам сотні ўраджэнцаў Дубровеншчыны.

Адной з галоўных мэт акупацыйнай палітыкі гітлераўцаў было планамернае знішчэнне насельніцтва. Для гэтага яны выкарыстоўвалі турмы ў Оршы і Дуброўне, шматлікія канцэнтрацыйныя і працоўныя лагеры. У Аршанскай турме былі расстраляны выкрытыя правакатарам падпольшчыкі Новай Тухіні. Масавыя расстрэлы праводзіліся ў Дуброўне, каля в. Ляды і ў Лугаўцах.

Тысячы жыхароў раёна прымусова былі вывезены на катаржныя работы ў Германію. Але гітлераўцам і гэтага здавалася мала. Перад прыходам нашых войск восенню 1943 г., а затым і вясной 1944 г. акупанты пачалі выганяць мірнае насельніцтва ў свой тыл, а вёскі паліць. Частка бежанцаў дабралася толькі да Аршанскага раёна, частка — да Талачынскага, іншыя трапілі ажно ў Трасцянец пад Мінскам і далей — у Прыбалтыку. Пра пакуты тых змрочных дзён расказваюць у сваіх успамінах тыя, хто перажыў гэтыя жахі.

Вось вынікі крывавага гаспадарання гітлераўцаў на дубровенскай зямлі.

На тэрыторыі раёна захопнікі спалілі і разбурылі поўнасцю ці часткова звыш сотні вёсак, раённы цэнтр, пасёлак Асінторф, разрабавалі прадпрыемствы, калгасы і саўгасы, вывезлі ў Германію тэхніку, жывёлу, маёмасць.

У зоне баявых дзеянняў акупанты разбіралі дамы для будаўніцтва бліндажоў, перапраў, укладкі дарог. Для гэтых жа мэт высякалі лясы. Толькі ў Дуброўне захопнікі спалілі 2680 дамоў. Без даху над галавой засталіся больш за 7 тысяч сем'яў. Жыллём для іх сталі зямлянкі і бліндажы. Але самымі цяжкімі, непапраўнымі стратамі былі людзі. За гады акупацыі ў горадзе Дуброўне і раёне фашысты знішчылі каля 5 тысяч чалавек, у тым ліку ў райцэнтры больш за 2 тысячы. Людскія страты, панесеныя раёнам за гады вайны, і іх наступствы адмоўна адбіваюцца на яго дэмаграфічным становішчы праз многія дзесяцігоддзі.

Нямецкія войскі пакінулі пасля сябе незлічоныя мінныя палі, вывеўшы з землекарыстання 11 240 гектараў сельгасугоддзяў, на некаторыя месцы доступ небяспечны і ў цяперашні час.

У. Лемяшонак,
Ф. Кулакоў.

Вось такой была «новая ўлада»

Дзе і калі мы ўбачылі «новую ўладу»? У Клянах ужо была воласць і паліцыя. Памятаю і бургамістра воласці Маршалава, і начальніка паліцыі дубровенца Турава, і прозвішчы некаторых паліцаяў. Не, не трэба сцвярджаць, што да вайны ў нас не было ворагаў савецкай улады. Былі і толькі чакалі зручнага моманту, каб здрадзіць, насаліць ёй. «Новая ўлада» пачынала з арыштаў, з расстрэлаў. Проста пагуліцца над людзьмі любілі, сілу і ўладу сваю паказаць. Раз было так. Едзе па вёсцы Пячонкі бургамістр Маршалаў. Трапіліся яму на вочы двое старых — Панфіл Ладысеў і Астась Казлоў. Падалося бургамістру, што не выказалі яму вяскоўцы належнага гонару. За адно за гэта прыязджаюць паліцаі і гоняць старых у Кляны на экзекуцыю, там для гэтага была прыстасавана лазня. Старых збілі так, што яны доўга ні сесці, ні легчы не маглі, а Казлоў хутка памёр.

Шмат гора прынеслі народу немцы, не менш і іх «верныя служакі» — паліцаі. У каго забяруць карову, каня, моладзь угонялі ў Германію. Плач стаіць над вёскамі, над усім родным краем. Раўнадушнымі да здзекаў не заставаўся ніхто, асабліва хлопцы дапрызыўнога ўзросту. Добра памятаю іх. Вось Валодзя Аляксееў, Валодзя Лук'янаў, Мікалай Ладысеў... Перад самай вайной яны скончылі дзевяць класаў. Выдатнікі вучобы, актыўныя камсамольцы. Калі Ладысева і Аляксеева выклікалі ў Дуброўна і прапанавалі пайсці служыць у паліцыю, юнакі прыкінуліся вар'ятамі, і іх адпусцілі дамоў. Часта ў нас збіраліся гэтыя маладыя хлопцы, але да канца пра мэту іх збораў мы не ведалі. А хлопцы чыталі савецкія лістоўкі, паведамлялі, хто што чуў аб падзеях на франтах.

Хтосьці іх выдаў.

25 сакавіка 1943 г. абедзьве вёскі былі акружаны фашыстамі. Яны ўрываліся ў хаты і хапалі тых, хто быў указаны ў спісе.

Арыштаваных збівалі да паўсмерці, рабілі ў іх дамах вобыскі, затым гналі ці валачылі ў дом Р. Ладысева, каб усіх разам спаліць. Але крыкі, слёзы, жах ні ў чым не вінаватых людзей чамусьці змянілі план катаў. Сем'і адпусцілі. А арыштаваных пагналі на г. Горкі — паліцаі, немцы былі адтуль. 25 сакавіка іх прадаўжалі катаваць, а 26-га расстралялі. Вось прозвішчы патрыётаў:

в. ПЯЧОНКІ

ЛАДЫСЕЎ Іван Рыгоравіч, 1922 г. н.
ЛАДЫСЕЎ Мікалай Ігнатавіч, 1922 г. н.
ЛАДЫСЕЎ Еўдакім П., 1901 г. н.
РЫБАЕЎ Мануіл Дзянісавіч, 1906 г. н.
РЫБАЕЎ Еўдакім Дзянісавіч, 1912 г. н.
РЫБАЕЎ Якаў Дзянісавіч, 1925 г. н.
КАЗЛОЎ Іван Сямёнавіч, 1920 г. н.
КАЗЛОЎ Васіль Сямёнавіч, 1923 г. н.
КУДРАЎЦАЎ Піліп Ф., 1905 г. н.
БАЖКОЎ Мікалай Дзмітрыевіч, 1924 г. н.

в. ЖАРНЁЎКА

АЛЯКСЕЕЎ Уладзімір Мікалаевіч, 1924 г. н.
ЛУК'ЯНАЎ Уладзімір Антонавіч, 1924 г. н.
ЛУК'ЯНАЎ Марк П., 1917 г. н.
ЕЎТУШЭНКА Дзмітрый М., 1925 г. н.

З нашай сям'і расстраляны Ладысеў Мікалай Ігнатавіч.

На наступны тыдзень пасля расстрэлу некаторыя родзічы загінуўшых ездзілі ў г. Горкі, у тым ліку і мой свёкар. Расстралялі там вельмі многа народу, метадычна запаўняючы да краёў вялізныя ямы, якія сталі для савецкіх людзей брацкімі магіламі.

Т. Ладысева.

З успамінаў Барыса Фёдаравіча Шалухі, ураджэнца вёскі Крапіўна

Восенню 1943 г. гітлераўцы забралі ўсіх мужчын вёскі Крапіўна і пад канвоем пагналі ў аршанскі лагер, што знаходзіўся каля чыгуначнай станцыі. Вечарам з Пятром Каткоўскім мы непрыкметна ўцяклі.

У сакавіку 1944 г. ў другі аршанскі лагер — у былым Куцеінскім манастыры — трапілі мае бацькі, тры браты і сястра. Потым іх перавезлі ў лагер у Магілёў. Там ад невыносных пакут памерлі мой брат Ігар і сястра Нэлі. А мяне з сястрой Аленай загналі ў лагер Горная Крапіўна, а затым у лагер каля вёскі Чырына.

Вакол калючы дрот і ўзмоцненая ахова. Раніцай пад канвоем гоняць на земляныя работы на дарогу Дуброўна—Зарубы. Работа — не менш 12 гадзін. Ніякая непагадзь пад увагу не бралася. Пасля работы на ўсю ноч заганяюць, як жывёлу, у бункер без вокнаў. На вясенняй золі ўсе прамоклі, але абсушыцца немагчыма. У дзіравы бункер прабіваецца начны туман і становіцца яшчэ халадней. Ні на гадзіну не пакідае вострае адчуванне голаду, бо ў суткі на дваіх выдаюць нямецкую буханку хлеба (эрзац з пырсай), ранкам на кожнага — лыжку павідла і паўлітра чаю, вечарам — літр баланды і чай. Абед пры такой знясільваючай рабоце не прадугледжваўся.

Але мучылі не толькі голад і холад. Прыгнятала і выклікала буру гневу бесчалавечнасць фашыстаў, іх імкненне запалохаць, растаптаць нас. Куды ні глянь — позірк натыкаецца на канваіра з аўтаматам, на вышку з вартавым, на калючы дрот.

Горка было і ад таго, што фронт, Чырвоная Армія былі зусім побач, на тэрыторыі нашага ж, Дубровенскага раёна, але дапамагчы нам не магла. Лагернікі толькі і жылі чаканнем вызвалення, але да нас (мяне да гэтага часу перагналі ў лагер в. Карабанавічы) праніклі страшныя весткі, што немцы расстралялі ўсіх, хто знаходзіўся ў штрафным лагеры ў Чырына і паляць вёскі. Ды і мы самі бачылі вялізнае зарыва то ў адным, то ў другім месцы. Мясцовыя жыхары беспамылкова вызначалі вёску, якая была і знікла ў полымі вайны. А што чакае нас?

...Пачалася аперацыя «Баграціён». Вязняў з лагераў Дубровеншчыны сабралі і пагналі праз вёску Крапіўна ў бок Оршы. Па дарозе за спробу да ўцёкаў некалькі чалавек расстралялі.

28 чэрвеня 1944 г. войскі 31-й арміі вызвалілі нас з няволі. А ў хуткім часе, пасля непрацяглай падрыхтоўкі, я стаў кулямётчыкам ў 183-м палку гэтай арміі.

Яблынька

Яна і цяпер стаіць пасярэдзіне сяла, як жывы помнік тых грозных дзён. Кожны, і малы, і стары, беражліва ахоўвае яе. Аб ёй перадаюцца хвалюючыя расказы. І ўсё, што тут, у вёсцы Баброва, адбылося, усё, аб чым бы людзі ні завялі гаворку, іх цяжкія ўспаміны абавязкова вядуць да раненай яблыні.

...Больш за два гады гаспадарылі фашысты ў вёсцы Баброва — цэнтры невялікага тады на Дубровеншчыне калгаса. Разграбілі ўсё багацце арцелі, па-зверску здзекваліся над людзьмі. Нямала жыхароў вёскі было ўгнана на катаргу ў Германію.

Але нашы людзі не скарыліся ворагу. Адны пайшлі ў партызаны, другія, застаючыся на месцы, помсцілі захопнікам за зганьбаваную родную зямлю. Гэта прыводзіла гітлераўцаў у шаленства, яны сталі яшчэ больш бязлітасныя да насельніцтва.

Па падазрэнню ў сувязі з партызанамі быў расстраляны калгаснік Іван Гудына. Жорсткі лёс напаткаў старшыню сельсавета Тараса Маісеенку. У люты мароз фашысты вывелі яго з хаты раздзетага і вадзілі па снезе, пакуль ён не страціў прытомнасць.

Да смерці быў збіты прыкладамі падлетак Пеця Языкоў. І толькі за тое, што яго западозрылі ў сувязі з партызанамі. Аднойчы вечарам Пеця вярнуўся з лесу, вёз на санках дровы. Гітлераўцы чамусьці рашылі, што ён быў у партызан.

Гэта не адзіныя прыклады з трагедыі вёскі Баброва. Нямой сведкай падзей была і яблынька.

Перад адступленнем гітлераўцы дашчэнту спалілі вёску.

В. Шалдаманаў.

Гарэлі нашы хаты

Было гэта вясной сорак чацвёртага года. Ад нашых мясцін фронт быў ужо недалёка. У гэтай прыфрантавой паласе вельмі густа стаялі нямецкія воінскія часці. Мы ведалі, што там, дзе войскі, там баі. І ўсё ж спадзяваліся, хацелася верыць, што наша вёска Пасуддзева ўцалее.

Але атрымалася інакш. У адну з начэй насупраць нашай вёскі па дарозе на Сіпішчава была разбіта нямецкая машына. А Пасуддзева ў акупантаў лічылася партызанскай вёскай, бо некалькі чалавек адсюль, у тым ліку і мой брат Мікалай Макаравіч Раскоша, былі ў радах лясных мсціўцаў.

І вось назаўтра раніцой у вёску ўварваліся карнікі. Усіх вяскоўцаў выгналі да вясковых могілак, паставілі асобна старых, асобна жанчын з малымі дзецьмі, навялі кулямёт. Прачыталі прыгавор: за разбітую машыну, за ўкрыццё партызан — усіх расстраляць. Але тут да старшага пад'ехаў другі фашыст, відаць, з камендатуры, і нас не расстралялі.

Затое ў нашай прысутнасці карнікі пачалі паліць вёску: хаты, хлявы — усё, што магло гарэць. Аблівалася сэрца крывёю: муж на фронце, ля мяне спалохана збіліся ў кучку малалетнія дзеці — як жыць, што рабіць? Сэрца заходзілася ад гора.

Гадзін да дзесяці раніцы ў нас на вачах вёска гарэла. А нас пад канвоем пагналі ў канцлагер...

...Мы перажылі ўсё. Адбудаваліся. Вырасцілі дзяцей. Мой муж не вярнуўся з вайны. І брат-партызан — таксама.

М. Раскоша,
жыхарка в. Пасуддзева.

Трагедыя вёскі

Вёска Верашчакі Горацкага раёна некалі размяшчалася ў адным кіламетры ад вёскі Паташы і налічвала больш за 20 двароў. Перад вайной тут быў калгас, у які ўваходзілі і сяляне вёскі Паташы. Людзі жылі мірна, старанна працавалі. Паколькі ў Верашчаках не было культавага збудавання, жыхары вёскі наведвалі сінагогу ў Горках. На горацкіх яўрэйскіх могілках хавалі памерлых.

І вось у Верашчакі прыбылі немцы-карнікі. Да вялікай ямы на ўскраіне вёскі падводзілі сем'і — бацькоў, старых і малых дзяцей — і расстрэльвалі. Нікога не засталося ў жывых. Было знішчана больш за 150 чалавек — усе яўрэі з Верашчак і некалькі жыхароў, што прыехалі ў першыя дні вайны з Дуброўны, Лядоў і іншых мястэчак Дубровеншчыны і Аршаншчыны да сваіх родных. У вёсцы былі таксама спалены ўсе хаты. Пасля вайны яна так і не аднавілася.

І. Стэльмашонак.

З успамінаў Лідзіі Новікавай, жыхаркі вёскі Слабада

Раніца на Пакрова ў 1943 годзе выдалася халоднай. Немцы заходзілі ў хаты, калі гаспадары марудзілі, злосна выштурхоўвалі на вуліцу. А стараста са сваімі памочнікамі выстраілі сялянскі абоз на вуліцы.

Шчымела ад болю сэрца, ручаямі цяклі ў людзей слёзы, калі пачулі каманду ехаць, ехаць з родных мясцін, пакідаючы хаты, скарб, нажыты ўласнымі рукамі, паліты салёным потам, ехаць у бежанцы.

Па дарозе да абозу далучылі жыхароў суседніх вёсак. Ужо не было відаць ні канца, ні краю патоку бежанцаў, якіх гнаў канвой, гнала вайна. Толькі вечарам пачулі каманду спыніцца.

Па некалькі сем'яў размясцілі ў кожным з пустуючых калгасных хлявоў. Павячэраўшы, пачалі выгнаннікі ўладкоўвацца, каб прылегчы адпачыць.

...Нейкі час абоз бежанцаў стаяў каля вёскі Судзілавічы. Аднойчы з вечара загулі гарматы. Пачынаўся бой. Снарады рускіх гармат даляталі і да лагера бежанцаў, абсыпаючы гарачай зямлёй і без таго пакрыўджаных людзей. Некаторыя з іх назаўсёды засталіся ляжаць на гэтай зямлі.

Крыху воддаль ад стагоў размясцілася некалькі сем'яў старатухінцаў. Сярод іх была і сям'я бабулі Фомчыхі. Калі пачыналася вайна, з'ехаліся да бабулі з гарадоў яе нявесткі, дочкі, унукі. Сыны і зяці былі на фронце.

Недзе пад поўнач стаў нарастаць гул самалётаў. Смертаносны груз упаў на стаянку бежанцаў. Бомба трапіла на месца, дзе знаходзілася сям'я Кажуровых, бабулі Фомчыхі. Як звар'яцелыя, беглі з гэтага месца людзі, дзе яшчэ дымілася зямля, дзе адчуваўся пах дыму, гары. Толькі калі дым рассеяўся, пачуліся слабыя стогны параненых, уцалелых жывых, якіх аглушыла выбухам. Некаторыя былі забіты.

Бабуля стаяла побач. Стаяла нерухома, быццам ногі ўраслі ў зямлю. Калі ўбачыла сваіх мёртвых дзетак — цяжкі стогн вырваўся з грудзей старой. Вяскоўцы спрабавалі ўцешыць яе. Ды толькі хіба гэта магчыма? Так і стаялі ўсе, плакалі да самай раніцы.

Немцам пасля гэтай ночы было не да бежанцаў.

Выгнаннікі паехалі кожны сваёй дарогай. Пачаліся блуканні па лясах, па вёсках. Многія спрабавалі вярнуцца назад, да сваіх хат. Ды толькі гэта было немагчыма. Дарогі перакрыты чужынцамі.

Праз некалькі дзён мы са сваякамі (ехалі на адной падводзе) і суседзямі дабраліся да вёскі Рагаціна. Тут і спыніліся.

Аднаго разу з'явіліся ў вёсцы карнікі. Учынілі аблаву. Жыхарам гэта было знаёма. Вестка аб аблаве разнеслася імгненна. Адбіралі дзяцей ад матак, матак ад дзяцей. Патрэбны былі маладыя, дужыя людзі.

Мінула некалькі дзён. Фашысты зноў наведалі вёску. На гэты раз яны выгналі з яе ўсіх людзей — бежанцаў і гаспадароў. Пагналі зноў цяжкімі дарогамі. У вёсцы Высокае спыніліся. Тут нам удалося ўцячы ад немцаў, і праз некаторы час мы трапілі ў вёску Туравічы, што на Аршаншчыне. Але новае няшчасце напаткала нас. Захварэлі на тыф маці, мая малодшая сястра і яшчэ адна жанчына з малым дзіцём... Па два тыдні цяжка хварэлі людзі. Пасля крызісу (хто выжыў) пачалі папраўляцца. Толькі адзін раз за гэты час пераначавалі ў цёплай лазні. Тады ўпершыню за месяцы блукання мы распрануліся.

Пасля Новага году нашай бабулі ўдалося ў вёсцы Пузырова дамовіцца з гаспадарамі наконт жылля. Другую палову зімы праводзілі нашы сем'і ў цёплай хаце. Есці не было чаго. Таму жабравалі...

Пасля вызвалення трымалі кірунак на свой дубровенскі край, які сустрэў нас папялішчамі, бітай цэглай, снарадамі ды мінамі, ямамі ад бамбёжак, пустазеллем у рост чалавека. Гэта ўсё, што засталося ад даваеннай прыгожай вёскі Старая Тухінь.

Успамінае Ладысева Таццяна Міхайлаўна, настаўніца, жыхарка г. Дуброўна

Жнівень—верасень 1943 года. Фашысты адступаюць. Імі забіта ўсё наваколле, заселены ўсе хаты, нас проста выгналі. Мы пасяліліся ў кустах за вёскай. Зрабіла я шалаш з лапак ды травы. Ночы дзве пераначавалі і раптам немцы акружаюць наша прыстанішча з усіх бакоў. З крыкамі пагналі нас на в. Хаетчына. Пазней мы даведаліся, што ў пячонкаўскім лесе хтосьці забіў двух немцаў. А нас ледзь не спалілі за гэта ў канюшні, пратрымаўшы там да раніцы. Прама на гною. А калі выгналі нас адтуль, мы сваёй сям'ёй уцяклі ў Горацкі раён, у в. Юркова, дзе жылі родзічы свякрухі. Толькі і там не знайшлі спакою, і там немцы выгналі нас з хаты, і я для сябе і дзяцей выкапала зямлянку ў агародзе пад вішняй. Побач — сям'я свёкра. Яду, якая была, на кастры гатавалі.

Аднойчы немцы забегалі, замітусіліся. Увесь дзень самалётам эвакуіравалі сваіх раненых. А на наступны дзень быў страшны бой за пасёлак Леніна, што ад нас кіламетраў за пяць. А здавалася, што побач. Ад выбухаў, дыму і пылу дзень ператварыўся ў ноч. Мы і ў сваіх зямлянках не хаваліся, баяліся быць пахаванымі зажыва.

Нас, мірных жыхароў, праз колькі дзён немцы пагналі на Оршу. У нас на чатыры сям'і была адна падвода, таму ехалі толькі мае дзеці ды дзве бабулі. Астатнія чатырнаццаць чалавек ішлі, трымаючыся за тую падводу. Пад той падводай ды пад адкрытым небам і начавалі. І так аж да Барысава. А дні, і асабліва ночы, усё халадней і халадней...

У Барысаве нас пачалі сартаваць: працаздольных заганялі ў вагоны — і на Германію. Малых і старых — на Трасцянец. Тутэйшыя жыхары паціху гаварылі, што лепш выбраць Нямеччыну, бо Трасцянец — гэта душагубка. Ды тут сам не вырашыш. І вось мы ўжо на шляху ў бок Мінска. Едзем—ідзем праз Мінск, мінчане, хто кавалачак хлеба, хто бульбіну маім дзеткам працягне. Дзеці рады, а мяне душаць слёзы.

У Трасцянец дабраліся вечарам, гэта кіламетраў пятнаццаць ад Мінска. Там усё забіта бежанцамі. А за паўтара кіламетра ад вёскі, бліжэй да лесу, дзень і ноч гараць людзі. Гаварылі, што спальваюць яўрэяў з мінскага гета. Але гарэлі там не толькі яўрэі.

Пагналі нас, некалькі жанчын, разгрузіць машыну з сенам. Мясцовыя жыхары падказалі нам: «Загляніце ў той хлеў. Там вартавога няма і вароты з абодвух бакоў адчынены». Мы загледзелі. Ля варот на перакладзіне вісіць адзенне, хтосьці, відаць, добраахвотна не згадзіўся «ехаць» у агонь. А далей у хляве (хлеў высокі і доўгі) — два вялізныя ярусы адзення, складзенага конусам пад самы дах. І гэтыя два конусы занялі увесь хлеў. Задумайцеся: колькі тысяч нявінных людзей трэба пагубіць на такую колькасць адзення? Мы дзень і ноч, кожную хвіліну чакалі такой жа долі. Выратавала тое, што аднойчы днём нас, бежанцаў, сабралі каля шашы і пагналі на Пятровічы Смалявіцкага раёна. Маю сям'ю прызначылі жыць да пажылых людзей Мартына і Мары... Двое іх сыноў былі на фронце, дзве дачкі — у партызанах яшчэ адна дачка жыла асобна з бацькоў тут жа, у Пятровічах.

Пасля вызвалення мы ў хуткім часе на спадарожных машынах падаліся ў родныя мясціны, на радзіму мужа. Ад хаты засталося папялішча, але пасля ўсяго перажытага гэта ўжо не здавалася самым страшным. У верасні 44-га я зноў стала працаваць у школе. А потым муж прыслаў пісьмо-грашовы перавод. На душы станавілася лягчэй, хоць цяжкасцей наперадзе было нямала. Толькі мы ўсё перанеслі і ўсё адолелі.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ГРУПЫ ГФП № 723 за студзень 1943 года

26.01.1943 г.

Пераклад з нямецкага.

Местной комендатурой в Дубровне был доставлен в группу староста деревни Барсуки (10 км юго-восточнее Дубровно) Довиденко Сергей. Двух разведчиков группы, которые выдали себя за сброшенных советских парашютистов, он принял с большой радостью и по всему видно, что он помогает бандитам*. Он сообщил нашим разведчикам опорные пункты полиции службы порядка (полиция, которая была создана в городах и деревнях Белоруссии из местных жителей, перешедших на службу к оккупантам.— В. Л.), о команде по вербовке (имеется в виду команда по насильственному захвату жителей района на работы в Германию.—В. Л.), которая действует в районе и легко может быть уничтожена, а также назвал пронемецки настроенных жителей своей деревни. Кроме того, он обеспечивал евреев теплой одеждой. Бандиты свободно чувствовали себя в его деревне. Довиденко частично был изобличен личными показаниями, а отчасти показаниями свидетелей и был расстрелян.

НАРБ, ф. 4683, оп. 3, д. 963, л. 8.

Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак.

ДАНЯСЕННЕ ГРУПЫ ГФП № 709 НАЧАЛЬНІКУ ТАЙНАЙ ПАЛЯВОЙ ПАЛІЦЫІ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» АБ ЛІКВІДАЦЫІ ЛАГЕРА Ў пас. АСІНТОРФ

6.12.1943.

Пераклад з нямецкага.

Относительно лагеря Осинторф.
Основание: служебные переговоры 30.11.43.

Лагерь Осинторф не переведен в Борисов. Он ликвидирован и больше не существует. Находившиеся в нем узники, если они не отпущены на свободу, переведены в различные концентрационные лагеря в генерал-губернаторство (территория оккупированной Польши. — *В. Л.*).

При Березинском лесопильном заводе в Борисове имеется лагерь СД вместимостью в 300 человек, который сейчас полностью заполнен. Он не является заменителем лагеря Осинторф, его нужно скорее рассматривать как пропускной лагерь. Арестованные сортируются там и пересылаются большей частью в концентрационные лагеря в генерал-губернаторство. Лагерь не в состоянии принимать арестованных из других районов, за исключением отдельных случаев приема лиц из этой же местности.

Учитывая возникающие трудности и положение на фронте, в настоящее время не предусмотрено создание в районе Центральной группы армий специального лагеря.

Вышеприведенные данные получены в беседе с оберштурмфюрером СС Кохом, СД, боевая группа в Борисове.

Хардер, комиссар полевой полиции и командир части.

Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак.

НАРБ, ф. 4, оп. 33а, д. 576, л. 19.

---

* Пытаясь опорочить и дискредитировать партизанское движение, гитлеровцы именовали партизан и подпольщиков «бандитами», а их боевые формирования — «бандами».

«Вырашэнне яўрэйскага пытання»

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Па ўказанню Гітлера фашысцкія верхаводы летам 1941 г. пачалі распрацоўваць планы «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэта «канчатковае вырашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў... Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала 1/3 частку яўрэяў усяго свету*.

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Дубровеншчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх уваходзіла «вырашэнне яўрэйскага пытання». Менавіта яны адразу ж аддзялілі яўрэяў ад мясцовага насельніцтва, загналі іх у гета, абнесенае калючым дротам, а потым на працягу 1941—1942 гг. поўнасцю знішчылі — усяго каля 4 тысяч чалавек.

Аб жудаснай расправе, якую ўчынілі гітлераўцы над яўрэйскім насельніцтвам мястэчка Ляды і іншых населеных пунктаў Дубровенскага раёна, сведчыць «Акт аб зверствах нямецка-фашысцкіх мярзотнікаў у мястэчку Ляды Дубровенскага раёна», які быў складзены 10 кастрычніка 1943 г. і падпісаны гвардыі капітанам Анішка, гвардыі капітанам Раўкіным, гвардыі капітанам Бабурыным, сакратаром Дубровенскага РК КП(б)Б Яленскім, старшынёй Дубровенскага раённага Савета дэпутатаў працоўных Сцефановічам, жыхарамі м. Ляды Пракапцавай, Марынкінай, А. Панулінай, Е. Панулінай.

У дакуменце гаворыцца, што вясной 1942 г., у чысты чацвер перад пасхай, гітлераўцы правялі пагалоўнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва ў самім мястэчку і навакольных населеных пунктах: у вёсцы Баева, мястэчку Расасна, Дуброўна і інш.

У Лядах расстралянымі, закатаванымі і кінутымі жывымі (малымі дзецьмі) быў запоўнены супрацьтанкавы роў (усяго каля 1200 чалавек). Было знішчана таксама некалькі дзесяткаў рускіх і беларусаў з гэтага мястэчка і суседніх вёсак**.

Сіла ўздзеяння гэтага дакумента, яго сапраўднасць узмацняюцца тым, што ён складзены па гарачых слядах адразу ж пасля ўступлення Чырвонай Арміі на зямлю Дубровеншчыны і ў якім разам з подпісам воіна стаіць подпіс непасрэднага выдавочніка дзеянняў гітлераўскіх катаў. Савецкі салдат і выратаваны ім жыхар Беларусі пісалі праўду, праўду — выратаваную праўду — папярэджанне.

У. Лемяшонак

---

* Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». Т. 7. М., 1961. С. 401—402.

** Акт аб зверствах гітлераўцаў у мястэчку Ляды, складзены мясцовымі жыхарамі і прадстаўнікамі воінскай часці ў кастрычніку 1943 г., глядзі ў 2-й кнізе Хронікі Памяці раёна.

Дакументы сведчаць

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР»

7.07.1941.

Пераклад з нямецкага.

III. Отличительные знаки для евреев и евреек

1. Все евреи и еврейки, находящиеся на занятой русской территории и достигшие 10-летнего возраста, немедленно обязаны носить на правом рукаве верхней одежды и платья белую полосу шириной в 10 см с нарисованной на ней сионистской звездой или же желтую повязку шириной в 10 см.

2. Такими повязками обеспечивают себя сами евреи и еврейки.

3. Евреям категорически запрещается приветствовать.

Нарушители будут строжайше наказываться местным комендантом по месту жительства.

Командующий тылом группы армий «Центр»
фон Шенкендорф, генерал инфантерии

НАРБ, ф. 4683, оп. 3, д. 952, л. 2.

Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак.

Жертвы фашистского геноцида

Нулевая верста Старой Смоленской дороги стояла когда-то у реки Мереи, левого притока Днепра. Отсюда начинался старинный большак от Белоруссии на Красный, далее на Смоленск и Москву.

За Мереей, на возвышенности, полого спускающейся к реке, располагалось до войны большое еврейское местечко Ляды Дубровенского района Витебской области.

Его жители занимались сферой обслуживания, торговлей. Были в Лядах различные мастерские, верёвочная артель, маслосырзавод, водяная мельница.

14 июля 1941 года местечко Ляды было занято гитлеровскими войсками. И сразу же спецподразделение эсэсовцев с набранными позже полицаями из окружающих деревень ввело особый режим для еврейского населения. Людей заставляли выполнять тяжелые работы под охраной конвоиров, заставляли впрягаться мужчин в телеги, а зимою в сани и возить воду из Мереи для немцев. Для еды выдавали мизерный паёк. Местечко охранялось постовыми, особенно в ночное время. Это было гетто.

Первого—второго апреля 1942 года всё еврейское население местечка Ляды под усиленной охраной гитлеровцев повели в гору по Старой Смоленской дороге к противотанковому рву в трёхстах метрах от большака. Здесь и обрели свою мученическую смерть свыше двух тысяч евреев. Закапывали под вечер вместе с убитыми и упавших раненых*.

В начале октября 1943 года части Советской Армии освободили Ляды от оккупантов. Местечко представляло сплошное пожарище. Военные вскрыли захоронение, чтобы документально доказать о зверствах немецких фашистов. 31 октября 1943 года в газете «Красноармейская правда» была напечатана статья капитана Б. Усалиева о трагедии у реки Мерея, на границе Смоленщины с Белоруссией.

19 июня 1966 года, спустя почти четверть века, на месте расстрела был поставлен памятник, изготовленный в Санкт-Петербурге на средства, собранные оставшимися в живых родственниками уничтоженных евреев местечка Ляды.

На территории Краснинского района в том же 1942 году, весной, на поле нынешнего совхоза «Марковский», были расстреляны евреи небольшого белорусского местечка Баево.

Ф. Меженцев.

Журнал «Край Смоленский».
1992. № 4. С. 30—31.

---

* Больш падрабязна аб трагедыі жыхароў м. Ляды глядзі ў 2-й кнізе Хронікі Памяці раёна.

Жыхары г. Дуброўна яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляныя гітлераўцамі каля льнозавода ў 1941—1944 гг.*

АРЫЕЛЬ Фрыда і яе сям'я.
АРЫЕЛЬ Якаў Рыгоравіч.
АРЫЕЛЬ Фрыда.
БАГАРАД Зэлік.
БАГАРАД Міра.
БАГАРАД Осіп.
БАГАРАД Эстэр.
БАЛБІРЭР Ілья Ісакавіч.
БАТЛІНЫ — сям'я.
БЕРКЕНБЛІТ Эстэр Маісееўна, н. ў 1883.
ГАЛІНЫ — сям'я.
ГАРШНКЕЛЬ Броха Гіршалеўна.
ГЛЕЙЗЕР Марыя Яфімаўна.
ДАРЭЎСКІЯ — сям'я.
ДРАПКІН Айзік Абрамавіч.
ДРАПКІН Герасім Абрамавіч, н. ў 1890.
ДРАПКІН Давід Герасімавіч, н. ў 1930.
ДРАПКІН Лейбе, н. ў 1862.
ДРАПКІН Маісей Герасімавіч, н. ў 1924.
ДРАПКІНА Голдэ.
ДРАПКІНА Соня Лейзераўна, н. ў 1893.
ЗЭЛІКОЎСКІ.
ЛАПАТУХІН Афраім Янкелевіч.
ЛАПАТУХІН Муля.
ЛАПАТУХІНА Бася Янкелеўна.
ЛАПАТУХІНА Яўгенія Янкелеўна.
ЛУГАВІЕР Зяма.
МАЛКІЕЛЬ — сям'я.
НІРМАН Арон Евелевіч.
НІРМАН Давыд Алтаравіч.
НІРМАН Сейна Алтараўна.
НІРМАН Слейма Алтаравіч.
ПАЛУЙ — сям'я.
ПАРКАН Моўша Ісакавіч.
ПАРТУГОЛЫ — сям'я.
ПІНЗУР Хася.
ПАРТНЫ.
ПШЧЫКЕР — сям'я.
ПЛІС — сям'я.
ПОЛУДЗЬ.
ПЭРВІН.
РАПАПОРТ.
РАСКІН Аба.
РЫСКІН.
РЭЙНГОЛЬД Мацвей Маісеевіч.
СУСМАН Мацвей Ісакавіч.
УЛАДЗІМІРЭНКА Ганна Яфімаўна.
ФЕЙГІНЫ — сям'я.
ФРЫДМАН.
ФРЭЙДЛІНА Доба Маісееўна.
ФРЭЙДЛІНА Сімха.
ЦЕМКІН.
ШЭЛЕКТАР Фаіна Самойлаўна.
ЭФРОС Гіта Аронаўна, н. ў 1895.
ЭФРОС Яфім, н. ў 1930.

Магіла ахвяр фашызму.

* Спіс складзены па памяці ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны Ю. А. Нірманам.

Жыхары м. Ляды яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляныя гітлераўцамі 2 красавіка 1942 года

АБКІН і яго сям'я 4 чал.
АРОНАВА Дыня.
АРОНАВА Мэры Бенцыенаўна.
АРОНАЎ Бенцыен Залманавіч.
БАБІН Хаім Лейбавіч, н. ў 1888.
БАБІНА Дзвейра Ісакаўна, н. ў 1890.
БАГАРАД і яго сям'я 6 чал.
БАЕВА Хана.
БАЦЯНКОВЫ Сіма і Меер.
БЕСКІН і яго сям'я 5 чал.
БРАЙНІН.
БРУК і яго сям'я 4 чал.
БРУК Бася Якаўлеўна.
БРУК Ісак Львовіч, калгаснік.
БРУК Мар'яся Ісакаўна, н. ў 1923.
БРУК Цыля Ісакаўна, н. ў 1919.
БУЯНОВЕР Брайна.
БУЯНОВЕР Залман.
БУЯНОВЕР Лейба.
БУЯНОВЕР Няхама Залманаўна і 2 дзяцей.
БУЯНОВЕР Рува Залманавіч, студэнт.
БУЯНОВЕР Сімв Лейбаўна і дачка.
БУЯНОВЕР Фрума Лейбаўна і дачка.
БУЯНОВЕР Фрэйда.
ВЕЛІКОЎСКАЯ Дора Саламонаўна, н. ў 1935.
ВЕЛІКОЎСКАЯ Гіта.
ВЕЛІКОЎСКАЯ Рохл.
ВЕЛІКОЎСКІ Вова Саламонавіч і сын.
ВЕЛІКОЎСКІ Залман.
ВЕЛІКОЎСКІ Ловэ Саламонавіч.
ВЕСКЕР Бася Абрамаўна.
ВЕСКЕР Гірш Абрамавіч.
ВЕСКЕР Довід Абрамавіч, шавец.
ВЕСКЕР Дыня і 3 дзяцей.
ВЕСКЕР Эйдзя Ісакаўна.
ВЕСКЕР Этл-Лея і яе дачка па мужу **ТАТ-РАШАК.**
ВОЛЬПЕРТ Нохім, яго жонка і 3 дзяцей.
ГЕРЦ (ГРАДЗЕНЧЫК) Рахіль Львоўна, дзеці **Вілен** і **Ізя.**
ГІСІНА Ганна.
ГЛІЦЫНА Хаке-Рашэ.
ГОЛЬДЫН, яго жонка і 3 дзяцей.
ГУРЭВІЧ Арон.
ГУРЭВІЧ Сорэ-Рэве і 2 дзяцей.
ГУСІНСКАЯ Вольга Мендзелеўна.
ГУСІНСКАЯ Гіта-Лея Марлухоўна, н. ў 1886.
ГУСІНСКАЯ Міня, н. ў 1853.
ГУСІНСКАЯ Рохл Сендзераўна, н. ў 1925.
ГУСІНСКАЯ Цыля.
ГУСІНСКІ Генух Залман-Мотавіч, н. ў 1932.
ГУСІНСКІ Залман-Мотэ Генуховіч, н. ў 1886, рабочы цагельнага завода.
ГУСІНСКІ Хаіл Залман-Мотавіч, н. ў 1935.
ДЛЫ Барыс Маісеевіч, н. ў 1892.
ДЛЫ Вера Мордухаўна, н. ў 1924.
ДЛЫ Ганна Барысаўна, н. ў 1924.
ДЛЫ Маісей Барысавіч, н. ў 1930.
ДЛЫ Міня Абрамаўна, н. ў 1895.
ДЛЫ Мордух Маісеевіч, н. ў 1893.
ДЛЫ Рахель Алтэраўна, н. ў 1903.
ДЛЫ Фаіна Мордухаўна, н. ў 1927.
ДРАБКІНА Хана Восіпаўна, н. ў 1903 і дзеці **Шыфра, Хіма** (імёны 2 дачок не ўстаноўлены).
ДРЭНДЗЕЛЬ Айзік, дзве дачкі і ўнукі.
ДРЭНДЗЕЛЬ Гута.
ДУБРОВЕНСКАЯ Сара Ерамееўна, працавала на ткацкай фабрыцы і 2 дзяцей.
ДЫМШЫЦ, н. ў 1900.
ДЫМШЫЦ і яго сям'я.
ДЫНІНА Ася Ейтаўна, н. ў 1941.
ДЫНІНА Сіма Аронаўна.
ДЫНІН Ціва Давыдаўна, н. ў 1888.
ДЫНІН Сімекорс Якаўлевіч, н. ў 1924.
ЗАЛАТАВІЦКАЯ Юда.
ЗАЛАТАВІЦКАЯ і яе сын 12 гадоў.
ЗАЛАТАВІЦКІ, н. ў 1930.
ЗАЛАТАВІЦКІ Хачэ і 3 дзяцей.
ЗАЛАТАВІЦКІЯ, сям'я, 3 дзяцей.
ЗАЛЕСКАВЕР Якаў, звыш 90 гадоў.
ЗЭЛЬДЗІНА Люба, н. ў 1924.
ЗЯМКЕВІЧ і яго сям'я 4 чал.
ІОФЭ і яго сям'я, 6 чал.
ІОФЭ Арон Мулевіч, н. ў 1929.
ІОФЭ Барыс.
ІОФЭ Барыс Мулевіч, н. ў 1939.
ІОФЭ Годл-Лібэ.
ІОФЭ Зяма Мулевіч, н. ў 1926.
ІОФЭ Ішыя, шавец.
ІОФЭ Лія Мендзелеўна, н. ў 1900.
ІОФЭ Муля, н. ў 1900.
ІОФЭ Сара і 2 дзяцей.
ІОФЭ Уладзімір.
ІОФЭ Хайм-Ішыевіч, шавец.
КАБАЛКІН Афроім.
КАБАЛКІН Вельке.
КАБАЛКІН Восіп, н. ў 1900, старшыня калгаса.
КАБАЛКІНА Ніна Ісаеўна, н. ў 1913.
КАБАЛКІНА Сара Ісаеўна, н. ў 1912.
КАБАЛКІНА Фрума, н. ў 1900.

КАБАЛКІНА Хана Сімонаўна, н. ў 1883.
КАБАЛКІНА Цыва Ісаеўна, н. ў 1910.
КАГАН Барыс Кардзеравіч, н. ў 1908.
КАГАН Восіп Мордухавіч, н. ў 1907.
КАГАН Злата Ісаеўна, н. ў 1904.
КАГАН Мордух-Лейбе Нохімавіч і яго жонка.
КАГАН Хава Лазараўна, н. ў 1882 і яе дзеці.
КАЛЬНЕР, заг. хлебапякарні.
КАЛЬНЕР.
КАНТАРОВІЧ і яго сям'я 10 чал.
КАПЛАН Гіта Шнеераўна, н. ў 1910.
КАПЛАН Марык, н. ў 1935.
КАПЛАН Уладзімір, н. ў 1930.
КАПЛУН і яго сям'я 4 чал.
КАПЫЛОВА Геня Навумаўна, н. ў 1935.
КАЦ і яго сям'я 7 чал.
КІСІН Ісан.
КІСІН Берл.
КІСІН Довід Залманавіч, н. ў 1883, вартаўнік.
КІСІН Ісроэл.
КІЦІН Леў Аронавіч, н. ў 1930.
КІЦІН Рыгор Аронавіч, н. ў 1925.
КІЦІНА Ігуда, н. ў 1894.
КОТЛЯР і яго сям'я 5 чал.
КРОЛЬ і яго сям'я.
КУЗНЯЦОВА Гіта Ізраелеўна.
КУЗНЯЦОВА Лея-Рыва, н. ў 1880.
КУЗНЯЦОВА Міня Ісакаўна.
КУЗНЯЦОВА Рыва Пінхусаўна, н. ў 1919, і 2 дзяцей 2 і 4 гадоў.
КУЗНЯЦОВА Рыся Маісееўна, н. ў 1888.
КУЗНЯЦОВА Сара Мордухаўна, н. ў 1921, настаўніца.
КУЗНЯЦОВА Сіма.
КУЗНЯЦОВА Фаіна Хаімаўна, н. ў 1910.
КУЗНЯЦОВА Хана Хаімаўна, н. ў 1913.
КУЗНЯЦОВА Цыва Давыдаўна, н. ў 1888.
КУЗНЯЦОВА Цыля, н. ў 1895.
КУЗНЯЦОВА Чыня Гэрцэлеўна, н. ў 1900.
КУЗНЯЦОВА Эстэр Хаімаўна, н. ў 1923.
КУЗНЯЦОЎ Восіп Мордухавіч, н. ў 1931.
КУЗНЯЦОЎ Гэрс Ісакавіч.
КУЗНЯЦОЎ Ізя.
КУЗНЯЦОЎ Лейзар Давідавіч, н. ў 1883.
КУЗНЯЦОЎ Маісей, н. ў 1885.
КУЗНЯЦОЎ Міхаіл Восіпавіч, н. ў 1926.
КУЗНЯЦОЎ Міхаіл Мордухавіч, н. ў 1928.
КУЗНЯЦОЎ Мома, дашкольнік.
КУЗНЯЦОЎ Мордух Іосілевіч, н. ў 1887.
КУЗНЯЦОЎ Мошэ-Ічэ Ізраелевіч, н. ў 1888.
КУЗНЯЦОЎ Пінхус Давыдавіч, н. ў 1884, каваль.
КУЗНЯЦОЎ Янкель Міхелевіч, н. ў 1870.
КУН і яго сям'я 5 чал.
КУНІН і яго сям'я 5 чал.
КУНІН Берл Абрамавіч, н. ў 1882, рамізнік.
КУНІНА Алтэ Берлаўна.
КУНІНА Бася-Ева, н. ў 1860.
КУНІНА Бела.
КУНІНА Гута Берлаўна, н. ў 1939.
КУНІНА Гэня Гэрцэлеўна, н. ў 1915.
КУНІНА Майя Аляксандраўна, н. ў 1940.
КУНІНА Энтэ Берлаўна, н. ў 1937.
КУНІНЫ, сям'я.
ЛЕВІНА Міся.
ЛЕВІНА Сіма.
ЛІПОВІЧ Восіп, н. ў 1941.
ЛІПОВІЧ Гінда Восіпаўна, каля 55 год.
ЛІПОВІЧ Рыгор, н. ў 1939.
ЛІПОВІЧ Соф'я Лейбаўна, з Смаленска.
ЛІПОВІЧ Шыфра Лейбаўна, н. ў 1918, расстраляна, а 3 дзяцей кінуты жывымі ў магілу.
ЛУГАВІЕР Бася-Фейга Залманаўна, н. ў 1890.
ЛУГАВІЕР (ГУСІНСКАЯ) Вольга Мінаеўна, н. ў 1907, цырульнік, і 2 дзяцей 4 і 6 гадоў.
ЛУГАВІЕР Раіса Мінаеўна, н. ў 1912, настаўніца, і сын ад нараджэння 10 дзён.
ЛУР'Е і яго сям'я 3 чал.
МАЛКІН Берл Саламонавіч, н. ў 1900.
МАЛКІН Даніла Беркавіч, н. ў 1929.
МАЛКІН Довід Нісанавіч.
МАЛКІН Зэлік Саламонавіч, н. ў 1883.
МАЛКІН Нісан Саламонавіч, н. ў 1892.
МАЛКІН Саламон Залманавіч, н. ў 1857.
МАЛКІНА Гіля Залманаўна.
МАЛКІНА Каця Восіпаўна, н. ў 1902.
МАЛКІНА Люба Нісанаўна, н. ў 1928.
МАЛКІНА Сара Нісанаўна, н. ў 1925.
МАЛКІНА Сошэ Янкелеўна, н. ў 1853.
МАЛКІНА Эстэр, н. ў 1927.
МАЛКІНА Эта-Лія Рахманаўна.
МАРКОВІЧ Ганна Якаўлеўна, н. ў 1907.
МАРКОВІЧ Ілья Ісакавіч, заг. вытворчасцю вяровачнай арцелі.
МЕЛІХАН Залман Маісеевіч, н. ў 1924, выпускнік музычнай школы.
МЕЛІХАН Захар, н. ў 1927.
МЕЛІХАН Маісей, н. ў 1927.
МЕЛІХАН Маісей, н. ў 1880, яго жонка і дачка.
МЕЛІХАН Сямён, н. ў 1928.
МІХЛІН і яго сям'я 4 чал.
МІНКІН і яго сям'я 6 чал.
НЭЙМАРК Лейбэ.
НЭЙМАРК Лейке.
НЭЙМАРК Хае-Геле.
ОДЗІНАВА Х'ема Маісееўна, работніца аптэчнага кіёска.
ОДЗІНАЎ Саул Хаімавіч, н. ў 1870, заг. аптэчным кіёскам.

ПАЛАВІЦКАЯ Разалія Саламонаўна, н. ў 1905, і 2 сыны 1930 і 1932 г.н.

ПАЛАВІЦКІ Барыс Рыгоравіч, н. ў 1903, брыгадзір у калгасе.

ПЕЎЗНЕР Аляксандра, н. ў 1928.

ПЕЎЗНЕР Давід.

ПЕЎЗНЕР Двося Вульваўна, н. ў 1890.

ПЕЎЗНЕР Лейвік, н. ў 1895.

ПЕЎЗНЕР Люба, н. ў 1933.

ПЕЎЗНЕР Марк Беркавіч, н. ў 1880.

ПЕЎЗНЕР Мінул, яго жонка **Роня** і іх дзеці.

ПЕЎЗНЕР Рыва, н. ў 1895.

ПОЛЯК Леся Хаімаўна, н. ў 1875, хатняя гаспадыня.

РАЙКІН Лазар.

РАЙХЛІН Айзік, н. ў 1894.

РАЙХЛІН Лейба.

РАЙХЛІН Сора-Бэйле.

РАЙХЛІН Эля Лейбавіч, н. ў 1910.

РАЙХЛІНА Рыва, н. ў 1895 і 2 дзяцей.

РАЙХЛІНА Рэся Гэрцэлеўна, н. ў 1913 і яе дзеці.

РАЙХЛІН і яго сям'я 4 чал.

РАМАНАВА Ітке і дзеці **Фрыда** і **Яфім.**

РАМАНАВА Таня, н. ў 1938.

РАМАНАВА Сара Рыгораўна, н. ў 1866.

РАМАНАВА Фаіна Айзікаўна, н. ў 1898.

РАТНЕР і яго сям'я 7 чал.

РОЗБАШ Ічэ.

РОЗБАШ Леве.

РОЗБАШ Мейшэ.

РОЗБАШ Фрыда Макаеўна, каля 80 год.

РОЗБАШ Яфім Маркавіч, каля 50 год.

РУБІНА Роза, н. ў 1926 г.

РЫЎКІН Мошэ-Меер і 4 дзяцей.

РЫЎКІНА Злата Восіпаўна, н. ў 1897.

РЫЎКІНА Нехама, яе муж і 5 дзяцей.

РЫЎКІНА Роза.

РЫЎКІНА Сафія.

РЫЎКІНЫ, сям'я 5 чал.

СЕЛІХАНАЎ, шавец, і яго сям'я.

СІМАНОВІЧ і 3 дзяцей.

СІМКІН і яго сям'я 6 чал.

СОНІН і яго сям'я 6 чал.

СЫРАКАРЭНСКАЯ.

СЫРАКАРЭНСКАЯ і 3 дзяцей **Аля, Ічэ,** Лейба.

СЫРАКАРЭНСКАЯ Фрыда Абрамаўна.

СЫРАКАРЭНСКІ Залман.

СЫРАКАРЭНСКІ і яго сям'я 2 чал.

СУС Алтэр, закончыў жыццё самагубствам перад расстрэлам.

ТАМАРКІН Гідалій Янкалевіч, н. ў 1930.

ТАМАРКІН Гідалій Лейбавіч, 10 год.

ТАМАРКІН Ейсеф.

ТАМАРКІН Лейзер Янкелевіч, н. ў 1928.

ТАМАРКІН Маісей Іосілевіч, н. ў 1884.

ТАМАРКІН Меей Янкелевіч, н. ў 1925.

ТАМАРКІН, вучань 9 кл.

ТАМАРКІН Янкель Восіпавіч, н. ў 1894.

ТАМАРКІН Якаў Лейбавіч, 6 год.

ТАМАРКІНА Гінда.

ТАМАРКІНА Злата.

ТАМАРКІНА Малкэ.

ТАМАРКІНА Рохл і яе 13 дзяцей.

ТАМАРКІНА Хана.

ТАМАРКІНА Эсфір Хаімаўна, н. ў 1901.

ТАТРАШАК Бэр і яе дзеці, **Рыва** 10 год, **Соня** 7 год, **Іда** 3 гады.

ТАТРАШАК Соня.

ТАТРАШАК Эля.

ФАЙТЛІН Барыс Файвусавіч.

ФАЙТЛІНА Цыля Натанаўна і яе сын 7 год.

ФАЙТЛІНА Эся.

ФЕЛЬДМАН Двойрэ Абрамаўна.

ФРАДКІН Довід.

ФРАДКІН Зяма Неяхавіч, н. ў 1926.

ФРАДКІН Неях Ізраілевіч, н. ў 1887.

ФРАДКІН Шмуэл, н. 1887.

ФРАДКІНА Рухама, н. ў 1888.

ФРАДКІНА Фаня Неяхаўна, н. ў 1924.

ФРАДКІНА Цыля і яе сын.

ФРУМІНА Алена, н. ў 1924.

ФРУМІНА Леля, яе бацькі і сястра.

ФРУМІНА Фаня Рыгораўна, н. ў 1902.

ХАЗАН і яго сям'я 4 чал.

ХАЙКІНСОН (жонка **Хасіна Ісака Ільіча**).

ХАЙКІНСОН Цыля Аронаўна, н. ў 1924.

ХАЙКІНСОН Эстэр Аронаўна, н. ў 1869.

ХАНІН і яго сям'я 6 чал.

ХАСІНА Ганна Ісакаўна, н. ў 1873.

ХАСІНА Дыня Аронаўна, н. ў 1870.

ХАСІН Ісак Ільіч, н. ў 1870.

ХАСІН Перац Залманавіч.

ХАСІНА Рахіль Ісакаўна, н. ў 1926.

ХАСІНА Роза Ісакаўна, н. ў 1914.

ЦЕМКІН Ісак, н. ў 1900.

ЦЕМКІНА Ганна, н. ў 1896.

ЦЕМКІНА Маня, н. ў 1923.

ЦЫПІН.

ЦЫПІН Зэлік і яго сям'я.

ЦЫПІН.

ЦЫПІНА Груня, н. ў 1924.

ЦЫПКІНА, сям'я 4 чал.

ЧАРАВІКІН Якаў Азаравіч, н. ў 1888, бухгалтар калгаса.

ЧАРАВІКІНА Муся Навумаўна, н. ў 1894.

ЧАРНЯК Берл.

ЧАРНЯК Айзік.

ЧАРНЯК і яго сям'я 8 чал.

ЧАРНЯК Мацвей Барысавіч.

ЧАРНЯК Зэлма.

ЧОРНАМОРДЗІК і яго сям'я 5 чал.

ШАЙКЕВІЧ і яго сям'я 8 чал.

ШЛЕНСКІХ і яго сям'я 5 чал.

ШУЛЬРЫХТАР Абрам Восіпавіч.

ШУЛЬРЫХТАР Абрам Лейвігдаравіч, н. ў 1925.

ШУЛЬРЫХТАР Блюма Абрамаўна, н. ў 1899 і 2-е дзяцей.

ШУЛЬРЫХТАР Давыд і яго сям'я.

ШУЛЬРЫХТАР Мера Гілеўна і дзеці **Муся, Ківа, Зяма, Бейля, Гіля, Арон, Фіра.**

ШУЛЬРЫХТАР Міня Шмарлаўна і 3 дзяцей.

ШУЛЬРЫХТАР Рыва Самуілаўна, н. ў 1932.

ШУЛЬРЫХТАР Хава Лейвігдаўна, н. ў 1928.

ШУЛЬРЫХТАР Шмерл і яго сям'я.

ШЭНДЛЯР Ісак Барысавіч, н. ў 1940.

ШЭНДЛЯР Соня, н. ў 1899.

ШЭНДЛЯР Таццяна, н. ў 1910, урач.

ЭЙДЗІНАВА Маша.

ЭЙДЗІНАВА Райха.

ЭЙДЗІНАЎ Гірша Шмарлавіч, яго жонка і 3 дзяцей.

ЮХВІЧ Соня Цадзікаўна.

Спіс склаў настаўнік Ляднянскай СШ *Л. Эрэнбург.*

Жыхары м. Ляды яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляныя гітлераўцамі ў іншых месцах

БЕНДЗІЯН, расстраляны ў в. Плавуны Краснінскага раёна Смаленскай вобл.

ГУСІНСКІ Мойшэ Генуховіч, н. ў 1899, псіхічна хворы, расстраляны ў 1941.

ІЗРЫН Ісай, расстраляны ў Смаленскай вобл.

КАБАЛКІНА Яўгенія Ісаеўна, н. ў 1915, расстраляна ў Маскоўскай вобл.

КАБІШЧАР Сара Ільінічна, таваразнаўца, расстраляна ў г. Гродна.

КАЛМАНОВІЧ Абрам Маісеевіч, яго жонка і 3-е дзяцей, расстраляны ў г. Херсон.

КАЛМАНОВІЧ Арон Маісеевіч, н. ў 1901, расстраляны ў г. Магілёў.

КАЛМАНОВІЧ Залмон-Моўшэ Нохімавіч, н. ў 1864, расстраляны ў 1941 у г. Дуброўна.

КАЛЬНЕР Таццяна, расстраляна ў 1941 за сувязь з партызанамі.

КІЦІН Арон, н. ў 1896, брыгадзір, закатаваны ў 1941.

КРОЛЬ Бебачка, н. ў 1934, фашысты зламалі рукі і ногі і закапалі ў зямлю.

КРОЛЬ Геня Герцаўна, расстраляна пасля катавання.

КУЗНЯЦОВА Хася і яе дзеці, расстраляны ў г. Дуброўна.

КУЗНЯЦОЎ Айзік Ерамеевіч, працаваў на ткацкай фабрыцы ў г. Дуброўна, расстраляны ў г. Дуброўна.

ЛІПОВІЧ Лейба, работнік вяровачнай арцелі, расстраляны ў 1941.

ЛУР'Е, равін, расстраляны ў г. Мінск.

МУРАВІЦКІ, расстраляны ў 1941 у ліку 28 яўрэяў-інтэлігентаў.

ПІНСОН, расстраляна ў г. Манастыршчына Смаленскай вобл.

РЫЎКІНА Бела Маісееўна, настаўніца, расстраляна ў 1941.

ФРАДКІН Маісей Довідавіч, старшы бухгалтар вяровачнай арцелі, расстраляны ў 1941 у в. Плавуны Краснінскага раёна Смаленскай вобл.

ХАЙКІНСОН Алег Мееравіч, н. ў 1924, расстраляны ў г. Смаленск.

ХАЙКІНСОН Меер Саламонавіч, н. ў 1885, расстраляны ў г. Смаленск.

ХАЙКІНСОН Муся Самуілаўна, н. ў 1884, расстраляна ў г. Смаленск.

ХАЙКІНСОН Эта Саламонаўна, н. ў 1888, расстраляна ў г. Смаленск.

ХАЙКІНСОН Ягор Мееравіч, н. ў 1925, расстраляны ў г. Смаленск.

ШЭНДЛЯР Мацвей Барысавіч, н. ў 1941, разарваны на вачах у маці.

Жыхары яўрэйскай нацыянальнасці Расасненскага сельсавета, расстраляныя гітлераўцамі ў 1942 г.

Фамилия, имя, отчество	Год рождения	Род занятий
БЕЛКИН Бэрка	1898	колхозник
БЕЛКИНА Злата	1890	колхозница
БЕЛКИН Симша	1900	колхозник
БЕЛКИНА Фэйка	1908	колхозница
БЕЛКИНА Цыля	1934	
БЕЛКИНА Цырля	1880	колхозница
БЕЛКИНА Соня	1920	колхозница
БЕЛКИНА Вера	1924	колхозница
БЕЛКИНА Либа	1934	
БЕЛКИНА Гая	1936	
ГАБАЙ Борис	1900	колхозник
Ида	1903	колхозница
Лева Миколь...	1933	учащийся
Миколь Мик...	1936	
КИСЕЛ... Либа	1898	колхозница
Мотка	1892	колхозник
Бела	1894	колхозница
Залман	1918	колхозник
Хана	1922	колхозница
Мария	1924	колхозница
Файба	1926	
КИСЕЛИЕР Сара Мотковна	1926	
Ида Мотковна	1930	учащаяся
МЕНДЕЛЕВ Арон Бэйсекович	1906	кузнец
МЕНДЕЛЕВ Либа Моисеевич	1912	партизан
МЕНДЕЛЕВ Стеря Аронович	1923	учащийся
МЕНДЕЛЕВА Люся Ароновна	1936	
МЕНДЕЛЕВ Иосиф Лейбович	1880	колхозник
Рохина Мот...	1876	колхозник
Мойша Иосифовна	1918	колхозница
Мойсий Иосифович	1922	колхозник
Цыля Мотковна	1875	колхозница
Янколь Толков...	1888	колхозник
Мушка Янколевна	1900	колхозница
Хая Янколевна	1916	колхозница
Хася Янколевна	1918	колхозница
Гирша Янколевич	1922	колхозник
Борка Янкел...	1924	колхозник
Михаль	1928	учащийся
Эств	1922	колхозник
Хаем	1936	
Хаез	1938	
МУДРЫЙКОМЕР Тойба	1900	колхозница
Бэрка	1928	
Генэся	1890	колхозница
Круня	1930	
МОГАНЕТ Владимир	1916	колхозник
Хацкаль	1920	колхозник
РЫВКИН Борис Яковлевич	1890	колхозник
Голда	1891	колхозница
Арон Борисович	1930	учащийся
Хая Борисовна	1933	учащаяся
Мэер	1887	колхозник
Хонахрода	1886	колхозница
Ольга Мееровна	1916	колхозница
СЫРКИН Мэер	1894	колхозник
Накама	1896	колхозница
Рыва Мееровна	1928	учащаяся
Маша Мееровна	1932	учащаяся
Файба Меерович	1934	

Филиал Госархива Витебской области в г. Орша, ф. 778, оп. 3, д. 5в, л. 37.

Людзей вывозілі на катаргу

Адным з цяжкіх злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі, у тым ліку і на Дубровеншчыне, быў насільны вываз грамадзян на катаржныя работы ў Германію.

Правал «маланкавай вайны» супраць Савецкага Саюза, вялікія страты ў жывой сіле на савецка-германскім фронце паставілі прамысловасць і сельскую гаспадарку фашысцкай Германіі рабочых рук. Гэты недахоп гітлераўскія правіцелі імкнуліся папоўніць за кошт грамадзян, гвалтоўна вывезеных з акупіраванай тэрыторыі СССР.

Вываз нашых людзей на фашысцкую катаргу з'яўляўся часткай злачыннага акупацыйнага рэжыму і меў на мэце атрымаць дармавую рабочую сілу, падарваць базу росту партызанскага руху. Фашысцкія верхаводы ўжо ў лістападзе 1941 г. далі ўказанне па выкарыстанню «рускай рабочай сілы» ў Германіі. У пачатку 1942 г. пастаўлена задача вывезці на прымусовыя работы ў Германію з акупіраваных абласцей СССР 15 млн. чалавек. Гаспадарчай інспекцыі групы армій «Цэнтр» і генеральнай акрузе «Беларусь» прадпісвалася штодзённа пасылаць у рэйх па 500—1000 рабочых. Вываз на фашысцкую катаргу ажыццяўлялі спецыяльныя ведамствы на чале з генеральным упаўнаважаным па выкарыстанню рабочай сілы, войскі і паліцыя. Фашысты арганізоўвалі на савецкіх людзей аблавы, хапалі працаздольных мужчын, жанчын і падлеткаў, пад канвоем адпраўлялі ў перасыльныя лагеры, жорстка здзекваліся.

У снежні 1943 г. часці нямецкай арміі і паліцыя пачалі выконваць распараджэнне фашысцкіх верхаводаў аб адпраўцы на прымусовыя работы ўсіх працаздольных, уключаючы дзяцей 10-гадовага ўзросту. Гэта злачынная акцыя была разлічана на падрыў біялагічнага патэнцыялу нашага народу.

Умовы жыцця і працы савецкіх людзей у Германіі былі выключна цяжкімі. Яны рэгламентаваліся спецыяльнай інструкцыяй, у якой гаварылася, што «ўсе рабочыя павінны атрымліваць такую ежу і такое жыллё і падвяргацца такому абыходжанню, якія давалі б магчымасць эксплуатаваць іх у самай высокай ступені і пры самых мінімальных затратах». Сярод вывезеных былі шматлікія захворванні і вялікая смяротнасць.

Ратаванне савецкіх людзей ад вывазу ў фашысцкае рабства было адной з важнейшых задач партызан і падпольшчыкаў. Усяго з Беларусі было вывезена каля 380 тысяч чалавек, у тым ліку некалькі тысяч з Дубровенскага раёна і 310 чалавек з г. Дуброўна.

У. Лемяшонак.

СА ЗНАКАМ «ОСТ» № 077746

З успамінаў Марыі Апанасаўны Пырко (Чапяловай)

У пачатку лета 1944 года нас, некалькі соцен юнакоў і дзяўчат, прыгналі ў Дуброўну. У будынку былой бальніцы, дзе зараз размешчаны інтэрнат медработнікаў, нас агледзелі нямецкія ўрачы, адбіралі дужых, здаровых, а потым, не дазволіўшы нават развітацца са сваякамі, як тую жывёлу, пагналі па этапу ў Оршу. На чыгуначнай станцыі нас загналі ў страшэнна брудныя вагоны, дзе акрамя бярэмя гнілой саломы нічога не было, і павезлі на захад, у невядомае.

Завод, на які нас прывезлі, размяшчаўся ў вёсцы Галігенхаўзен, што паблізу ад Дзюсельдорфа. Размясцілі нас у лагеры за калючым дротам. Аб свабодным выхадзе ў вёску, ці аб тым, каб з'ездзіць у суседні горад, можна было толькі марыць. Нас памылі ў лазні, сфатаграфавалі, зрабілі адпячаткі пальцаў, і кожнаму замест імя і прозвішча далі нумарны знак. З таго моманту мяне звалі не Марыя Пырко, а нумар 077746. На вопратцы быў нашыты абрэзак тканіны з надпісам «ОСТ». Калі нас размясцілі ў «пакоях», то мы некалькі гадзін запар не абсталяваннем свайго жылля займаліся, а пільна ўглядваліся і чыталі безліч надпісаў на каменных сценах. Іх былі

тысячы. Надпісы паведамлялі аб адрасах тых, хто тут раней знаходзіўся, аб лёсе суайчыннікаў. Многія надпісы красамоўна сведчылі аб тым, што іх аўтараў ужо няма ў жывых. Засталася толькі просьба паведаміць сваякам...

Працавалі мы па 12 і больш гадзін, без выхадных. Наш «гардэроб» складаўся з драўляных «чаравікаў» і робы з надпісам «ОСТ». З дня ў дзень кармілі неачышчанымі буракамі, фасоляй, вельмі кіслай і напалову гнілой капустай. На паднявольна-прымусовую работу ганялі пад канвоем. Многія з нас хварэлі туберкулёзам, а самых слабых кудысьці забіралі і мы іх больш не бачылі. Хадзілі чуткі, што ўсіх хворых гітлераўцы знішчалі.

У 1944 годзе наша авіяцыя і авіяцыя саюзнікаў усё часцей і часцей наносіла бомбавыя ўдары па аб'ектах гітлераўцаў на іх жа тэрыторыі. Такія дні для нас былі святочныя, мы радаваліся, верачы ў тое, што хутка надыйдзе час і нас вызваляць з палону, мы вернемся на Радзіму, аб якой думалі і марылі кожны дзень. У час бамбардзіровак нас гналі ў бомбасховішча.

Побач з нашым лагерам размяшчаўся лагер, дзе ўтрымліваліся і працавалі французы, італьянцы. Іх кармілі значна лепш, не зневажалі так, як рускіх.

Многія нашы таварышы, не вытрымаўшы цяжкай, знясільваючай прпцы, здзекаў, пагард, канчалі жыццё самагубствам. Больш «загартаваныя», зняволеныя са стажам, імкнуліся дапамагаць юнакам і дзяўчатам. Былі на той фабрыцы і спачуваючыя немцы. Майстар Гаміло, рабочы-кантралёр Ганна Зусна, немкі Эма, Кейта. Яны ўпотай расказвалі, што страшэнна незадаволены гітлераўскімі парадкамі, вайной, якую Германія вядзе супраць Расіі. Час ад часу, калі выпадала магчымасць, яны перадавалі хлеб, суп, іншыя прадукты, іншы раз патрэбныя лекі.

У маі 1945 года нас вызвалілі салдаты арміі Злучаных Штатаў Амерыкі.

Пасля вяртання дадому я ўладкавалася ў швейную арцель (зараз райбыткамбінат), дзе і працавала ўвесь час да пенсіі.

ПРАЗ ФАШЫСЦКУЮ НЯВОЛЮ

З успамінаў В. Панцюшэнкі, ураджэнкі вёскі Карабанавічы

Было гэта ў жніўні 1943 года. Намі, як дровамі, набілі таварны састаў, каб вывезці ў Германію. Гэта была моладзь 1925—1926 гадоў нараджэння, вельмі многа — з Дубровеншчыны, але адпраўка праводзілася з Оршы.

Да Варшавы дзвярэй вагона не адчынялі наогул. У Варшаве нас стрыглі, абсыпалі дустам з помпы і зноў грузілі ў таварныя вагоны. Ноччу мы прыбылі ў лес, у лагер пад горадам Кельстэрбах. Гэта быў размеркавальны лагер. Нас раздзялілі на чатыры катэгорыі. У першай — хто дужэй, у чацвертай — самыя слабыя. Адзін раз у дзень давалі баланду — вада з пахам варанай бульбы.

Прыходзілі немцы і выбіралі нас, як выбіраюць рабочую жывёлу. Выстройваюць тую ці іншую катэгорыю. «Гаспадар» ідзе ўздоўж строю, палкай паказвае, хто яму падыходзіць, той адразу пакідае строй. Калі набіраецца група, яе ўводзяць.

Так праходзілі дні і тыдні. Мы хварэлі, галадалі, гублялі сілы. Калі нас засталося прыкладна паўсотні, дайшла чарга і да нас... Трапілі ў лагер Штэргайле, што на ўскраіне г. Франкфурт-на-Майне. Прызначылі на авіязавод. Працавалі па дванаццаць гадзін у дзве змены. Першая змена — з шасці раніцы. А паколькі лагер ад завода быў кіламетры за чатыры, то пад'ём рабілі ў чатыры гадзіны. Пастраенне, праверка па нумарах і строем, пад канвоем з сабакамі — на работу. Назад — тое ж самае. На нагах у нас калодкі-драўлянкі. Панчох няма. У калодкі набіваецца снег... Кармілі вельмі дрэнна. Напрыклад, у абед — чарпак супу з бручкі. Вечарам — маленькі кавалачак хлеба і адна ці дзве маленькія бульбіны ў «мундзірах».

Так працягвалася да лета 1944 года. А потым, у сувязі з моцнымі бамбёжкамі, нас разам з абсталяваннем эвакуіравалі ў лес, у падзямелле паблізу в. Арс, што на рацэ Мозель. Завод поўнасцю схаваны пад зямлёй. Ноччу мы працавалі на заводзе, днём будавалі для сябе баракі, у якія нас набівалі бітком. Тут было ўжо і зусім невыносна.

Аднойчы ноччу нас пагналі кудысьці строем. Калі немцы-ахоўнікі прыпыніліся на хвілінку прыкурыць, мы — некалькі чалавек — ірвануліся ў бок, схаваліся, а калі строй пайшоў далей — групамі рассыпаліся ў лесе. Са мной аказаліся Алена Федарцова, цяпер жыве ў вёсцы Ерамееўшчына, Вера Клячкіна з гэтай жа вёскі, Кацярына Фёдараўна Петракоўская з Карабанавіч (цяпер жыве ў Мінску), Зіна з вёскі Германы нашага раёна і Аня з Талачына. Мы забраліся ў лес далей за ўсіх, схаваліся пад скалой і гэтым выратаваліся, бо іншых немцы да раніцы злавілі, і іх лёс мне невядомы.

Як блукалі мы ў лесе, што елі, дзе спалі — гаварыць пра гэта ў мяне не хапае сіл. У такіх

умовах шанцаў выжыць не было. І мы настойліва прабіраліся ў бок Францыі — прабірацца ў бок Расіі азначала пагібель. Праз нейкі час выйшлі на перадавую англа-амерыканскіх войск.

Сустрэлі нас добра. Накармілі, паставілі для нас палатку. А потым даставілі ў г. Вердэн — мы ўжо не маглі трымацца на нагах. Там нас апрануулі, абулі, бо тое, што было на нас, згніло і сапрэла канчаткова.

Пад Вердэнам саюзным войскам давялося адступаць, да нас нікому справы не было. І толькі потым нас перавезлі на поўдзень ад г. Шалон. А праз некаторы час прыбыло папаўненне — савецкія ваеннапалонныя і дзеці да чатырнаццаці гадоў, якіх вызвалілі англа-амерыканскія войскі. Сярод іх былі і мае землякі — Мікалай Яўменаў з Карабанавіч, Каткоўскі і Любавіцкі з Бахава, яшчэ некалькі чалавек, чые імёны з часам забыліся. Далейшае жыццё пайшло па ваеннаму парадку. Так, М. Яўменаў быў камандзірам узвода падлеткаў, я — пісарам роты, батальёна, Алена Федарцова (Краўцова) — поварам.

...Нарэшце надышоў доўгачаканы дзень Перамогі. Якое гэта было свята! Усё насельніцтва гарадка прыйшло да нас у лагер. Нас віншавалі, нам дарылі падарункі, усе былі шчаслівымі і радаснымі. А праз некалькі месяцаў, прайшоўшы некалькі праверак у Германіі, мы вярнуліся на знявечаную і зруйнаваную радзіму. І тут мяне чакала гора. З усёй сям'і — бацька і сямёра дзяцей — засталася я адна. Знайшлі мяне тры «пахаронкі» — аб гібелі бацькі і двух братоў. Нам, хто прайшоў праз фашысцкую няволю, дома было цяжэй, чым іншым, штомесячна выклікалі ў КДБ, глядзелі з недаверам, не прымалі ў камсамол. Але мы не апускалі галовы, працавалі, выходзілі замуж, жаніліся, расцілі дзяцей.

Падпольшчыкі вядуць барацьбу

З першых дзён вайны ўся наша краіна ператварылася ў ваенны лагер. Так было і на Дубровеншчыне. Каля дзесяці тысяч жыхароў раёна пайшлі на франты Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскія атрады. Амаль да самай акупацыі раёна працягвалася мабілізацыя ў Чырвоную Армію, дзейнічаў створаны райваенкаматам загараджальны атрад. На барацьбу з ворагам, на дапамогу Чырвонай Арміі ўзнімалася сельскае насельніцтва. У Новай Тухіні, напрыклад, такую барацьбу ўзначаліў камуніст, сакратар партарганізацыі Новатухінскага сельсавета Васіль Раманавіч Свойнікаў. Ён выводзіў насельніцтва на рамонт разбомбленай ворагам чыгункі Мінск — Масква, з групай самых смелых і рашучых таварышаў лавіў дыверсантаў, асабіста сам дапамагаў нашым адступаючым войскам у пераправе праз Дняпро, затым у выхадзе з акружэння. Так было не толькі тут.

У гэты час закладваліся асновы развіцця на Дубровеншчыне партызанскага руху і падпольнай барацьбы. Так, дырэктар торфапрадпрыемства «Асінторф» Г. Г. Амельчанка, начальнік спецчасткі гэтага прадпрыемства Е. Л. Грышчанок і іншыя праверэныя людзі атрымалі заданне стварыць базу для развіцця партызанскага руху ў гэтым раёне. Месцам для стварэння базы быў выбраны 62-гі квартал Шчэрбінскага лясніцтва (Шчэрбінскай дачы) пад Асінторфам. Для гэтай мэты быў выдзелены грузавік, прадукты бралі з магазінаў і складоў Асінторфа, Дуброўны, Оршы. У значнай колькасці былі завезены боепрыпасы, зброя, медыкаменты, розная маёмасць, пішучыя машынкі, папера, усё гэта надзейна схавана. За некалькі кіламетраў ад гэтай базы былі закладзены яшчэ дзве апорныя кропкі для будучага партызанскага атрада і штаба. Пазней гэта база сыграла станоўчую ролю ў арганізацыі партызанскага руху. Тут жа быў сфарміраваны ў 1942 годзе і выйшаў на адкрытую барацьбу з ворагам партызанскі атрад «Хуткі», камандзірам якога стаў Г. Г Амельчанка.

А яшчэ да прыходу немцаў са строю было выведзена торфапрадпрыемства «Асінторф», якое сілкавала палівам Бел-ДРЭС, разам з ім — электрападстанцыя, радыё, тэлефон і тэлеграф, спалены сакрэтныя дакументы і план прадпрыемства, знішаны запасы гаручага, раздадзены насельніцтву прадукты харчавання.

Падобная карціна чакала акупантаў і ў

Дуброўне. Усё, што можна было выратаваць і вывезці, было эвакуіравана, астатняе разбурана, сапсавана, знішчана.

...Па квітнеючаму прыдняпроўскаму краю пракаціўся вогненны вал фронту. Дубровеншчына засталася пад пятой рабаўніка, які нёс сюды так званы «новы парадак».

У канцы ліпеня 1941 года праз лінію фронта ў раён Асінторфа прыбыў з групай таварышаў І. С. Шурман, былы сакратар Снядаўскага райкома партыі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, а цяпер прадстаўнік ЦК КП(б)Б і Віцебскага абкома партыі, накіраваны сюды для дапамогі пакінутым камуністам у арганізацыі падпольнага і партызанскага руху, збору разведінфармацыі і дыверсій на камунікацыях ворага.

У пачатку вайны з Заходняй Беларусі ў раён вярнуўся С. С. Максіменка, які да 1939 года працаваў загадчыкам аддзела Дубровенскага райкома партыі. Такі ж лёс спасціг ураджэнца гэтых месцаў, былога сакратара Валожынскага райвыканкома В. Ф. Мальчэўскага.

Яшчэ да акупацыі Дуброўны для арганізацыі падпольнай работы ў горадзе і раёне былі пакінуты загадчык ваеннага аддзела райкома партыі І. М. Леўчанка, начальнік спецчасткі сувязі г. Орша, ураджэнец тутэйшых месцаў стары камуніст А. І. Палітаў, а для ажыццяўлення сувязі паміж дубровенскімі падпольшчыкамі і Аршанскім партыйным падпольным цэнтрам — ядром супраціўлення гэтай зоны — камуністы А. Ф. Матыноўскі (брыгадзір трактарнай брыгады Дубровенскай МТС), І. Т. Кляўзо (ткач фабрыкі «Дняпроўская мануфактура») і іншыя. Для ўмацавання падполля ў Асінторфе, Дуброўне, Пірагах, Новай Тухіні нямала зрабіў І. С. Шурман. Ён каардынаваў іх сумесныя дзеянні, падтрымліваў сувязь з кіраўнікамі Аршанскага партыйнага падпольнага цэнтра ў час нелегальных сустрэч і нарад у Оршы ці Пірагах (у гэтай вёсцы дзейнічала папольная арганізацыя А. І. Палітава), вырашаючы пытанні стварэння партызанскіх груп і атрадаў для адкрытай барацьбы, больш эфектыўнай дапамогі Чырвонай Арміі, расшырэння агітацыйнай і прапагандысцкай дзейнасці сярод шырокіх мас насельніцтва.

Падпольшчыкі забяспечвалі каштоўнай разведінфармацыяй разведгрупу камандзіра Чырвонай Арміі А. І. Катуліна, партызанскія брыгады «Баці» (В. У. Бойка), К. С. Заслонава, А. Ф. Данукалава і інш.

Так, В. У. Бойка, дакладваючы ў штаб партызанскага руху, пісаў: «Праз разведчыкаў, што жывуць у Дубровенскім раёне, разведалі наступныя аб'екты: Асінторф — германскім камандаваннем з ваеннапалонных фарміруюцца воінскія часці. Па гораду Дуброўна ў ткацкіх цэхах фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» засяроджаны галоўныя франтавыя аўтарамонтныя майстэрні...».

Пакінула Дубровеншчына свой радок і ў летапісу слаўных спраў легендарнага партызанскага камбрыга, Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава. Тут, на нялёгкім шляху з-за лініі фронту ў Оршу, вёска Заполле стала яго апорным пунктам. Тут, у кватэры і ў двары А. Я. Мішкаруднай схаваў ён да пары ўзрыўчатку, зброю, маёмасць. Прайдуць гады, і адзін з членаў групы Заслонава Герой Сацыялістычнай Працы А. Е. Андрэеў напіша гэтай простай савецкай жанчыне:

«Паважаная Алена Якаўлеўна!

Ваша пісьмо напомніла мне цяжкія дні позняй восені 1941 года, калі наша група на чале з Заслонавым прыйшла да Вас... Усе мы, і ў першую чаргу наш камандзір Заслонаў былі ўдзячны Вам за тое, што Вы, не баючыся смяртэльнай небяспекі, не толькі далі нам магчымасць перадыхнуць пасля цяжкага шляху, але і згадзіліся схаваць частку нашай зброі і ўзрыўчаткі.

Як усё гэта спатрэбілася нам потым, у перыяд дзеянняў на Аршанскім вузле, і колькі разоў мы ўспаміналі Вас добрым словам за ваш бясстрашны і патрыятычны ўчынак...».

І пазней К. С. Заслонаў і заслонаўцы не раз абапіраліся на дубровенскіх па-

трыётаў. Так, па заданню К. С. Заслонава ў Дуброўне дзейнічала падпольная група А. Сарнычава, якая вясной 1942 года выйшла ў Заслонаўскую брыгаду. Існавалі і іншыя шляхі сувязі паміж К. С. Заслонавым і дубровенскімі падпольшчыкамі і патрыётамі, многія з якіх папаўнялі рады народных мсціўцаў.

Дубровеншчына з яе багатымі рэвалюцыйнымі традыцыямі была добрым асяроддзем для партызанскага руху. Тут жа ў баях з гітлераўцамі брыгада К. С. Заслонава ўзаемадзейнічала з партызанамі Смаленшчыны.

Баявую групу стварылі С. С. Максіменка і былы ўпраўляючы Дубровенскага маслапрома камуніст А. П. Кудрашоў. Ужо ў жніўні 1941 года яна пачала актыўныя дзеянні. У верасні таго ж года да яе далучылася група І. М. Леўчанкі. Асноўнай задачай патрыёты ставілі дыверсіі на чыгункі. Група Максіменкі правяла ў канцы 1941 года сход камуністаў раёна ў лесе пад вёскай Пасуддзева, на якім ішла размова аб узмацненні барацьбы і кіраўніцтве барацьбой. Пасля гэтага баявыя дзеянні ўзмацніліся. Гітлераўскія сышчыкі і паліцэйскія ўпарта імкнуліся натрапіць на след падпольшчыкаў. Па даносу здраднікаў С. С. Максіменка быў арыштаваны. Вясной 1942 года паліцыя арыштавала іншых застаўшыхся ў горадзе камуністаў. 18 мая С. С. Максіменка і яшчэ пяць камуністаў-падпольшчыкаў былі расстраляны ва ўрочышчы Лугаўцы ў двух кіламетрах ад горада. А. П. Кудрашову па шчасліваму выпадку ўдалося пазбегнуць арышту, ён змагаўся і памёр на баявым посту. У жорсткай схватцы з карнікамі загінуў І. М. Леўчанка.

І. М. Леўчанка.

С. С. Максіменка.

Моцная падпольная арганізацыя была створана пад кіраўніцтвам камуністаў у вёсцы Станіславова, цэнтры саўгаса «1 Мая». У арганізацыю ўвайшлі мясцовыя рабочыя, актывісты. Рыхтуючыся да барацьбы з ворагам, яны сабралі многа зброі, боепрыпасаў, схаваўшы ўсё гэта ў Велідарскай лясной дачы. Вясной 1942 года патрыёты перадалі зброю партызанскаму атраду К. С. Заслонава і самі ўліліся ў яго атрад. У атрад «Дзядзі Косці» прыйшлі таксама 12 камуністаў і камсамольцаў з Дуброўны.

Рашуча і смела дзейнічала падпольная арганізацыя ў вёсцы Пірагі. Яе кіраўнік — камуніст А. І. Палітаў нарадзіўся ў гэтай вёсцы. Да зімы 1941 года падпольшчыкі сабралі значную колькасць зброі і боепрыпасаў, прадуктаў харчавання. Пасля ўсё гэта было перададзена партызанам. Палітаў падтрымаліваў сувязь з прадстаўніком ЦК КП(б)Б і Віцебскага абкома І. С. Шурманам, кіраўніцтвам Аршанскага падпольнага партыйнага цэнтра, узгадняючы з імі сумесныя дзеянні і выконваючы іх адказныя заданні. Восенню 1941 года падпольшчыкі прынялі і вывелі ва ўмоўленае месца дэсант парашутыстаў, выкінутых для аказання дапамогі ў арганізацыі партызанскага руху.

У пачатку красавіка 1942 года з групай у 13 чалавек выйшаў у лес і размясціўся ў раёне вёскі Пірагі В. Ф. Мальчэўскі, перад якім была пастаўлена задача стварыць партызанскі атрад. Пры садзейнічанні А. І. Палітава група хутка папаўнялася людзьмі і зброяй і пачынала моцна дапякаць гітлераўцам. Ужо ў канцы красавіка немцы пачалі супраць яе карную аперацыю. Мальчэўскі, перахітрыўшы ворага, пераправіўся з групай цераз Дняпро і злучыўся з групай Макса Хадорыка, што выйшла з Оршы. Так быў створаны пар-

тызанскі атрад, камандзірам якога быў Макс Хадорык, камісарам — В. Ф. Мальчэўскі.

А. І. Палітаў працягваў небяспечную барацьбу ва ўмовах падполля. Ён кіраваў баявымі дзеяннямі падпольнай арганізацыі, збіраў разведвальную інфармацыю для партызан, быў утрымальнікам явачнай кватэры. Смелы і разважлівы падпольшчык, ён змагаўся на сваім посту да злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі, потым пайшоў на фронт і загінуў смерцю храбрых.

Чырвоным радком ва ўсенародную барацьбу ўпісана баявая дзейнасць Новатухінскай падпольнай арганізацыі. Стварыў яе В. Р. Свойнікаў. Акрамя яго ў арганізацыю ўвайшлі яго жонка Соф'я Мартынаўна і дачка, камсамолка-настаўніца Е. В. Свойнікава, былы сакратар сельсавета Ц. П. Шыцік, настаўнікі-камсамольцы П. П. Белясаў і Д. Е. Тарасенка, калгаснікі А. П. Доўбыш і А. Т. Васілёнак, юныя камсамольцы Ваня Саўкін і Бора Васілёнак, рабочы БелДРЭСа Г. Е. Кузьмянкоў, партыйны работнік Ф. М. Шабураў, які незадоўга да пачатку вайны прыехаў сюды з Камчаткі, дзе працаваў сакратаром акружкома партыі, наведаць родзічаў, але сур'ёзна захварэў і не змог эвакуіравацца. Арганізацыя ўзяла напрамак на дыверсійна-разведвальную дзейнасць. Гэта тлумачылася тым, што вёска Новая Тухінь размешчана паблізу аўтамагістралі і чыгункі Мінск—Масква — буйнейшых ваенных артэрый, што ўзмоцнена ахоўваліся фашыстамі.

І вось першыя баявыя дзеянні падпольшчыкаў.

На аўтамагістралі ўзрываюцца на мінах два грузавікі з ваенным грузам. Хутка ў раёне Новай Тухіні быў спушчаны пад адхон воінскі эшалон, які ішоў да фронту. Вораг вымушаны быў прызнаць: разбіта два вагоны з жывой сілай і 15 — з боепрыпасамі, загінула 60, ранена 65 салдат і афіцэраў рэйха. Дыверсантаў схапіць не ўдалося. І зноў ляціць пад адхон воінскі эшалон на перагоне Асінаўка—Краснае. Гэта сам Васіль Свойнікаў выбраў тут месца для дыверсіі, сам здзейсніў яе.

З акружэння, затым з лагераў ваеннапалонных з дапамогай падпольшчыкаў вырывалася нямала нашых байцоў і камандзіраў, патрыётаў, якія жадалі працягваць барацьбу з ворагам. Часта іх трэба было на пэўны час легалізаваць, гэта значыць забяспечыць неабходнымі дакументамі. Смяртэльна рызыкуючы, гэтым займаліся новатухінскі бургамістр Гаўрыіл Кузьмянкоў і пісар Іван Саўкін.

З уходам патрыётаў у лясы падпольшчыкі Новай Тухіні забяспечвалі чыстымі бланкамі нямецкіх дакументаў, разведвальнай інфармацыяй партызанскія штабы, былі сувязнымі і ўтрымальнікамі явачных кватэр, збіралі і перадавалі партызанам зброю і боепрыпасы, наводзілі партызан на нямецкія абозы з прадуктамі харчавання і іншай нарабаванай акупантамі маёмасцю. В. Р. Свойнікаў актыўна рыхтаваў папаўненне партызанскім атрадам з ліку мясцовай моладзі і акружэнцаў.

З дапамогай правакатара ворагу ўдалося выкрыць і схапіць усіх названых тут членаў арганізацыі. Яны былі дастаўлены ў Оршу і, пасля пакутлівых катаванняў, расстраляны.

Правал Новатухінскай арганізацыі быў сур'ёзным ударам для падпольна-партызанскага руху на Дубровеншчыне. Але барацьба з ворагам працягвалася.

Асобае месца ў падпольнай барацьбе жыхароў Дубровеншчыны, і не толькі яе, займае Асінторфскае камсамольска-маладзёжнае падполле. Юнакі і дзяўчаты, відавочцы будаўніцтва першынца беларускай энергетыкі і пакарэння балот, не сталі на калені. Пра іх напісаны артыкулы і нарысы, ім прысвечана кніга В. Люкава і Ю. Панова «Зарыва над юнацтвам». Ля магістралі Мінск—Масква героям-камсамольцам пастаўлены помнік. Радзіма ўзнагародзіла іх ордэнамі і медалямі, многіх пасмяротна. Так, яны варты таго, каб пра іх складалі паэмы і песні. Але ў нашым скупым выкладанні гісторыя іх самаадданай, беззапаветнай барацьбы выглядае сурова і проста.

Ноччу з 15 на 16 ліпеня 1941 года ў

канторы торфапрадпрыемства «Асінторф» пад кіраўніцтвам яго дырэктара Г. Г. Амельчанкі праходзіла вузкая нарада камуністаў, кіруючых работнікаў торфапрадпрыемства, БелДРЭСа, Белгалоўторфа і г. д. Вырашалася пытанне аб стварэнні групы для барацьбы ў варожым тыле. На гэтай жа нарадзе Амельчанка сказаў, што ў размове з ім група камсамольцаў выказала гарачае жаданне застацца і змагацца з ворагам. На нарадзе вырашана было не ўцягваць пакуль што падлеткаў у смяртэльна небяспечную справу. Але перад уходам у лес Амельчанка сустрэўся з сакратаром школьнай камсамольскай арганізацыі Станіславам Шмуглеўскім і даў яму патрэбныя парады і ўказанні.

Яшчэ ў першыя дні акупацыі камсамольцы надзейна схавалі значную частку зброі з пакінутага абоза воінскай часці, што трапіла ў акружэнне.

Некалькі пазней, 10 жніўня, на кватэры сясцёр Людмілы і Веры Букацік адбыўся камсамольскі сход, на якім і было вырашана стварыць падпольную камсамольскую арганізацыю. У яе ўвайшлі Васіль Агурцоў, Аляксей Малаховіч, Мікалай Малаховіч, сёстры Букацік, Марыя Макаранка, Яўген Цяленчанка, Пётр Клімовіч, Валянціна Бугаёва, Надзея Пракапенка, Іван Тращякоў, Віталь Беразоўскі. Камандзірам выбралі Станіслава Шмуглеўскага. Так была закладзена аснова арганізацыі, у якую затым уваходзілі 45 юнакоў і дзяўчат.

У сям'і Букацік пад выглядам далёкага родзіча хаваўся ранены палітрук роты, былы дырэктар школы з Нальчыка камуніст Я. У. Вільсоўскі. Ён стаў ідэйным кіраўніком арганізацыі і членам яе штаба, у які акрамя яго і С. Шмуглеўскага ўвайшлі Васіль Агурцоў і Людміла Букацік. Арганізацыя перажыла правалы і няўдачы, але дзейнічала канспіратыўна правільна, заўсёды абапіраючыся на дапамогу старэйшых таварышаў-камуністаў, і здолела захаваць свае рады. Расказаць тут аб усіх галоўных баявых справах юных змагароў немагчыма, абмяжуемся толькі кароткім і няпоўным пералікам іх.

Ворагу патрэбна была БелДРЭС. І зразумела, што для гэтага неабходна было аднавіць торфапрадпрыемства, якое забяспечвала электрастанцыю палівам. Камсамольцы ўпарта і паслядоўна перашкаджалі гэтаму.

У студзені 1942 года быў знішчаны завезены з Германіі торфапомпавы кран — складаны механізм з чатырма электраматорамі. Дыверсію здзейснілі Мікалай Малаховіч, Васіль Агурцоў і Георгій Тращякоў, інсцэніраваўшы напад партызан.

Па даручэнню штаба Міхаіл Прудніка ў, Аляксей Жэнікаў і Аляксей Малаховіч спалілі трансфарматары высокавольтнай падстанцыі паблізу адзінаццатага пасёлка.

24 лютага 1942 года падпольшчыкі арганізавалі ўцёкі з лагера ваеннапалонных. Група ў 31 чалавек, забяспечаная зброяй і харчаваннем, пайшла на злучэнне з партызанамі. Аперацыя прайшла пры непасрэдным удзеле Вільсоўскага, які прабраўся ў лагер у нямецкай форме і забіў вартавога.

У сакавіку таго ж года Станіслаў Шмуглеўскі і Пётр Клімовіч ноччу спалілі барак, у якім размясцілася на адпачынак разбітая пад Масквой нямецкая вайсковая часць.

Таццяна Цімошчанка і Марыя Макаранка выпусцілі на зямлю бензін з 60 бочак. Немцы арыштавалі паліцаяў за бесклапотнасць у ахове склада.

У топках БелДРЭСа ўзарваліся тры артылерыйскія снарады, што трапілі з ваганетак з торфам, якія выгружаліся аўтаматычна. На рамонт катлоў і топак спатрэбіўся цэлы месяц. Асноўную задачу ў гэтай надзвычай складанай і сур'ёзнай дыверсіі выканалі І. Тращякоў і В. Агурцоў.

У 1942 годзе падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з брыгадай К. С. Заслонава. З гэтага часу ў іх дзейнасці значнае месца займае разведка і разлажэнне фарміраванняў так называемай «рускай народнай арміі», падрыхтоўка «народнікаў» да пераходу на бок партызан. На працягу 1942—

43 гадоў да заслонаўцаў перайшло больш за 800 «народнікаў». Ішлі яны добра ўзброеныя, на «развітанне» імкнуліся як мага мацней насаліць фашыстам. У рабоце з «народнікамі» вызначаліся Валянціна Бугаёва, Людміла Букацік, Зінаіда Варламава, Яўгенія Няфёдава, Марыя Макаранка, Надзея Пракапенка і іншыя дзяўчаты-падпольшчыцы.

Зімой 1943 года заслонаўцы вымушаны былі пакінуць гэтыя мясціны. Падпольшчыкам удалося звязацца з 16-й Смаленскай партызанскай брыгадай. Па заданню яе камбрыга І. Р. Шлапакова падпольшчыкі ўзарвалі мост на дарозе Асінторф—БелДРЭС, спалілі склад з ваеннай маёмасцю на станцыі Асінаўка, разам з чацвёртым атрадам брыгады знішчылі ўпаўнаважанага Гітлера барона фон Шпаўке, які прыехаў сюды з загадам пусціць на поўную магутнасць торфапрадпрыемства і ўмацаваць Асінторф.

Немцы імкнуліся ўсімі сіламі натрапіць на след падпольнай арганізацыі. Па нязначнаму падазрэнню быў арыштаваны С. Шмуглеўскі, але адпушчаны з-за адсутнасцю доказаў. За ім пачалі сачыць. Камсамольцы паведамілі аб гэтым камандаванню 16-й Смаленскай брыгады. Не жадаючы рызыкаваць дзесяткамі жыццяў адважных юных змагароў, камандаванне брыгады прыняло рашэнне аб пераходзе падпольшчыкаў у партызанскі атрад. У брыгаду прыйшло каля паўсотні чалавек. Перад уходам падпольшчыкі разбілі камендатуру, дзе захапілі бланкі, пасведчанні, пропускі, пішучую машынку, розныя дакументы.

У 16-й Смаленскай партызанскай брыгадзе яны працягвалі гэтак жа мужна змагацца супраць фашысцкіх захопнікаў. Многія з іх не дажылі да Дня Перамогі, але імёны іх навечна ўвайшлі ў слаўную гісторыю Ленінскага камсамола, які выхаваў іх сапраўднымі патрыётамі Радзімы. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у маі 1965 года за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Валянціна Бугаёва, Людміла Букацік, Зінаіда Варламава (Калітуха), Яўген Уладзіслававіч Вільсоўскі, Мікалай Малаховіч, Наталля Нольберт, Надзея Пракапенка, Яўген Цяленчанка і Міхаіл Цяленчанка ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Але ўсе, акрамя В. Бугаёвай і З. Варламавай, удастоены гэтай высокай узнагароды пасмяротна. Жывыя і загінуўшыя, яны ў гады вайны да канца выканалі свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай.

С.П. Шмуглеўскі, ганаровы грамадзянін г. п. Асінторф.

Падпольна-партызанская барацьба на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі разгортвалася пад кіраўніцтвам партыйных органаў. У лістападзе 1943 года быў створаны Дубровенскі падпольны райком партыі. Яго сакратаром быў выбраны І. І. Старавойтаў, камісар партызанскай брыгады «Аляксея» (А. Ф. Данукалава). На базе гэтай брыгады дзейнічаў і Дубровенскі райком камсамола, створаны некалькі раней.

Некаторыя асаблівасці дзеянняў падпольшчыкаў Дубровеншчыны былі абумоўлены прыфрантавым становішчам раёна з восені 1943 года, калі тут пралягла лінія фронту

Цесна ўзаемадзейнічалі армейская і партызанская разведкі, падпольшчыкі і партызаны былі звязаны з Чырвонай Арміяй, савецкім тылам. Па абодва бакі фронту — у падполлі і партызанскіх атрадах і ў часцях Чырвонай Арміі — з ворагам змагаліся тысячы дубровенцаў.

Ф. Кулакоў,
М. *Шкадаў.*

ПА ЗАГАДУ СЭРЦА

З пісьма Ісака Рыгоравіча Борыкава на імя сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава 23.1.1966 г.

Кудрашоў Аляксандр (імя па бацьку пакуль не ўстаноўлена), член партыі, працаваў у Дубровенскім раёне ўпраўляючым аддзялення Дзяржбанка, а перад Вялікай Айчыннай вайной — упраўляючым маслапрома. У пачатку вайны тав. Кудрашоў быў пакінуты ў тыле для арганізацыі партызанскага руху.

Тры гады жывучы нелегальна, у нечалавечых умовах, падвяргаючы сябе небяспецы, камуніст Аляксандр Кудрашоў праводзіў у раёне вялікую прапагандысцкую і арганізатарскую работу. Гэта работа не прапала дарэмна. Пад яго кіраўніцтвам зроблена нямала спраў.

Каля сотні былых краснаармейцаў, што засталіся ў акружэнні і пражывалі ў вёсках, забяспечаны зброяй і перапраўлены ў партызанскія атрады. Больш за сто чалавек з ліку моладзі, камсамольцаў вёсак Пішчыкі, Глебава, Вячэрына, Гудава, Сіпішчава, Пасуддзева, Каўровая, Чубакова, Барсукі і іншых былі выратаваны ад фашысцкага рабства, добра ўзброены і перапраўлены ў партызанскія атрады. Многія з іх аддалі жыццё за Радзіму.

Паліцэйскі атрад вёскі Дабрынь колькасцю 27 чалавек летам 1943 года з поўным узбраеннем перайшоў на бок партызан.

У маі 1942 года адбылася партыйная канферэнцыя Дубровенскага раёна, дзе было выбрана кіраўніцтва райкома. На канферэнцыю прабраўся правакатар, які выдаў немцам яе ўдзельнікаў. Амаль увесь састаў, каля 20 чалавек, былі закатаваны ў гестапаўскіх засценках, але справа, пачатая падпольшчыкамі, не загінула.

Разгромлены гарнізоны паліцэйскіх у вёсках Анціпенкі Дубровенскага раёна і Сава Горацкага раёна. Частка гарнізона в. Баева перайшла на бок партызан восенню 1943 года. Знішчаны здраднікі народа — староста вёскі Хаетчына Г. і іншыя.

Імя Кудрашова для савецкіх людзей было сімвалам перакананасці ў перамозе над ворагам. Народ у асобе Кудрашова бачыў прадстаўніка партыі, ведаў, што партыя збірае сілы для разгрому ворага, што партыя з народам...

З успамінаў былога палітрука 3-й роты 3-га батальёна партызанскага палка «Трынаццаць» І. Р. Борыкава

Летам 1942 года немцы пачалі фарміраваць так называемую рускую вызваленчую армію (РОА) пад камандаваннем генерала Уласава з рускіх ваеннапалонных, якія знаходзіліся ў лагерах, а яшчэ з тых акружэнцаў, што аселі па вёсках і займаліся хто чым, многія пайшлі ў прымакі да ўдоў, салдатак, дзяўчат. Многа такіх прымакоў было ў Дубровенскім раёне. Але ж гэта — кадравыя, добра абучаныя байцы і камандзіры Чырвонай Арміі. І вось ужо немцы сталі браць іх на ўлік.

Кудрашоў выказаў думку, што такую сілу нельга пускаць да немцаў, што трэба яе перапраўляць да партызан. Многія з іх — гэта людзі, адданыя нашай Радзіме і ўжо гатовы пайсці ў партызаны. З навакольных вёсак Сваташыцы, Глебава, Вячэрына, Гудава, Сіпішчава, Дабрынь і іншых гэтых людзей (прыкладна 20 чалавек) хутка пераправілі ў партызаны. Толькі нямногія пайшлі служыць да немцаў.

Цяжэй было з ваеннапалоннымі, жыўшымі ў Дуброўне і вёсках каля яе — Чыжоўцы, Мардахах, Савіне і іншых. За гэту справу ўзяліся настаўнікі з Дуброўны Іван Піліпавіч Бацьянаў і А. І. Раманенка. Ранняй вясной 1943 года пачалі з Дуброўны перапраўляць гэтых людзей у партызаны той групы атрадаў, якія пазней пераараслі ў 17-ю партызанскую брыгаду. Многія ішлі са зброяй і боепрыпасамі.

Пасля ўходу ў партызаны вялікай групы моладзі, у пачатку жніўня 1943 года ў народныя мсціўцы падаўся і я.

А Кудрашоў працягваў небяспечную работу ў падполлі. Нямецкая камендатура стварыла ў в. Анціпенкі так званы заградатрад на чале з галаварэзам Гронскім. Кудрашову ўдалося і ў гэты атрад заслаць свайго чалавека — камсамольца з вёскі Ерамееўшчына Івана Сотчанку — з заданнем разлажыць маральна гэты атрад. Укамплектаваны атрад у асноўным быў з былых чырвонаармейцаў, многія з іх згадзіліся перайсці на бок партызан.

Тым жа часам (канец жніўня — пачатак кастрычніка 43-га года) у многіх вёсках (саўгас «1 Мая», Чубакова, Бахава, Барадзіно, Дзяруг і інш.) моладзь арганізоўвалася для таго, каб пай-

сці ў партызаны. І калі ў канцы верасня прыйшлі пасланцы ад партызан, за адну ноч было сабрана каля сотні юнакоў і дзяўчат з Дубровенскага раёна.

Складаней атрымалася з паліцаямі в. Анціпенкі (пры спробе расправы з Гронскім таму ў адной бялізне ўдалося ўцячы, у перастрэлцы з іншымі паліцаямі, не згоднымі да пераходу, загінуў камсамолец Васіль Струкаў з в. Юкава). Але хаця аперацыя з заградатрадам прайшла не зусім удала, ён перастаў існаваць.

У гэтую ж ноч была ў мяне апошняя сустрэча з жывым А. Кудрашовым. Тры гады цяжкага жыцця не прайшлі проста так: ён памёр у адзіноце ад цяжкай хваробы ног і поўнага знясілення. Яго труп знайшлі ў сярэдзіне жніўня 1944 года ў зямлянцы каля вёскі Пішчыкі, у лесе. Прывезлі ў вёску і пахавалі чалавека, да канца выканаўшага заданне партыі і аддаўшага жыццё за нашу перамогу.

Падрыхтаваў да друку Ф. Кулакоў.

Дакументы сведчаць

З ІНФАРМАЦЫЙНАГА ПАВЕДАМЛЕННЯ СУВЯЗНОЙ ВІЦЕБСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА ПАРТЫІ Л. І. МАЙЗІТ САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АК КП(б)Б Я. А. ЖЫЛЯНІНУ

Упаўнаважаны Віцебскага абкома КП(б)Б тав. Рэзнікаў даў мне заданне ўстанавіць:

1. Ці маецца ў Дубровенскім раёне партыйная арганізацыя.
2. Ці маецца ў Дубровенскім раёне партызанскі атрад і ўстанавіць сувязь з ім.

Прыбыўшы ў г. Дуброўна, я ўстанавіла наступнае:

1. Аб арганізацыі. Значная частка партыйнага актыву ў пачатку вайны эвакуіравалася ў савецкі тыл. У пачатку мая 1942 года сакратар РК КП(б)Б Кудрашоў арганізаваў скліканне партыйнага сходу, паслаўшы павесткі кожнаму члены партыі... Усе члены партыі былі арыштаваны, 4-х членаў партыі расстралялі, астатніх вызвалілі. Пасля чаго яны ўсе працуюць ці ў паліцыі, ці на іншых пасадах у немцаў і лічацца ў ворагаў благанадзейнымі. Пасля гэтага правалу і партарганізацыі, як такой, не існуе. 5—7 членаў партыі з Дубровенскага раёна прыйшлі ў партызанскія атрады ў раён дзеяння Заслонава. Гэтак жа значная частка камсамольцаў пайшла служыць у паліцыю... 7 камсамольцаў з раённага актыву нядаўна прыйшлі ў партызанскую брыгаду Заслонава. У 2—3 кіламетрах ад Дуброўна існавала партарганізацыя ў саўгасе «1 Мая» (Станіславова). Пасля пачатку вайны гэта партарганізацыя таксама падверглася рэпрэсіям і як партарганізацыя не існуе, аднак адзін з членаў гэтай арганізацыі даў мне ведаць, што калі ў Дубровенскі раён заявіцца партызанскі атрад, то 10—12 чалавек членаў і кандыдатаў у члены партыі, камсамольцаў і рабочых саўгаса пойдуць у партызанскі атрад, прычым ў іх у Станіславове закапана і прыхавана шмат узбраення, ёсць нават кулямёты. Шмат зброі прыхавана ў Велідарскай лясной дачы — аб гэтай зброі ведае тав. «Х».

2. Аб партызанскім атрадзе. Вясной гэтага года сакратар РК КП(б)Б Кудрашоў арганізаваў невялікі партызанскі атрад, але істотных баявых аперацый атрад не праводзіў...

Сувязі з імі я не ўстанавіла.

3. Аб гарнізоне і ўзбраенні праціўніка.

У Дубровенскім раёне (да часу 10—12 жніўня) было ў нямецкім гарнізоне каля 300 чалавек разам з байцамі так званай «народнай арміі» з ваеннапалонных і 160 паліцэйскіх. У асноўным гарнізон размешчан у г. Дуброўна і невялікімі групамі па чыгунцы на станцыі Асінаўка — 9 немцаў, у калгасе «Камінтэрн» вёскі Новая Тухінь — 3 немцы і адзін паліцэйскі, м. Расасна — 11 немцаў, на станцыі Чарнаручча — 7 немцаў і адзін паліцэйскі. Гарнізон у асноўным узброены вінтоўкамі і аўтаматамі, акрамя таго ў Дуброўне маецца адзін станкавы кулямёт і 5 танкетак, але ўсе танкеткі няспраўныя, і адна савецкая бронетанкавая машына, таксама няспраўная.

Ва ўправе маецца загад нямецкага камандавання аб давядзенні колькасці паліцэйскіх у кожным раёне за 300 чалавек. Значная колькасць паліцэйскіх — моладзь, якая нават не ўмее валодаць зброяй. Акрамя паліцэйскіх і немцаў чыгунку ахоўваюць ноччу калгаснікі, абавязак іх заключаецца ў тым, каб пры з'яўленні партызан узняць шум і дабегчы да вартавых. Гарнізон Дуброўны сканцэнтраваны ў паўночнай частцы горада, у гарнізоне, акрамя салдат — 9 афіцэраў. 12 жніўня праходзіла мабілізацыя моладзі

нараджэння 1923 года, пры апавяшчэнні іх аб яўцы ў камендатуру ім гаварылі, што яны будуць ахоўваць г. Дуброўна... Аб малой аператыўнасці паліцыі і гарнізона сведчыць наступны факт: 27 ліпеня праз Дубровенскі раён праходзіў партызанскі атрад, які накіроўваўся ў Магілёўскую ці Гомельскую вобласць (не ўдакладніла), аб з'яўленні партызанскага атрада на тэрыторыі раёна ў камендатуры даведаліся ў 6 гадзін раніцы, атрад праходзіў у 5-ці кіламетрах ад Дуброўна і ўсё ж паліцыя і немцы сабраліся даганяць партызан толькі каля 12 гадзін дня... Спіс усіх паліцэйскіх раёна можна атрымаць у тав.«Р» (спіс адрасоў прыкладаецца).

...На фабрыцы «Дняпроўская мануфактура» немцы пусцілі 5 станкоў, дзе ткуць марлю. Рабочыя, што працавалі на «Дубровенскай мануфактуры», разышліся ў большасці сваёй па вёсках і ў большасці прэтэндуюць на атрыманне зямлі і калгаснага ўраджаю, чым выклікаюць незадаволенасць у сялян. У горадзе яшчэ працуе рамонтная (швейная) майстэрня на 15 чалавек і на МТС у невялікай колькасці рамантуецца сельгасінвентар.

У пачатку жніўня немцы пачалі вывозіць з Дуброўны ў Оршу збожжанарыхтовак 1941 года, якое ў асноўным было не выкарыстана, бо жыхарам хлеб не адпускаўся, а гарнізон увесь час быў невялікі. Збожжа вывозяць пад аховай, машыны калонамі прыходзяць з Оршы, гэтак жа вывозяцца ў Оршу і грошы і іншая маёмасць.

...15 жніўня на станцыі Асінаўка Дубровенскага раёна высадзіўся эшалон немцаў з 30 вагонаў для барацьбы з атрадамі і брыгадамі партызан Заслонава, Сакалова, Зюкава, Антоненкі, Яцыні, Амельчанкі, Саўчанкі — атрады гэтыя размешчаны ў вёсках і лесе каля вёсак Маркава, Салаўі, Драгілі, Сярэдкі, Коты.

...Да пачатку баёў з немцамі брыгада Заслонава прыняла ў свой састаў 150 чалавек з так званай «Народнай арміі», якую гітлераўцы арганізавалі ў Асінторфе з ваеннапалонных у колькасці каля 2-х палкоў. Народаармейцы перайшлі да партызан са сваім узбраеннем. Пасля іх уходу нямецкае камандаванне раззброіла каля 700 народаармейцаў і адправіла назад у канцлагеры.

Сувязная Віцебскага абкома КП(б)Б МАЙЗІТ Лізавета Іванаўна, 2 верасня 1942 года.*

Падпольная маладзёжная група ў Дуброўне

З успамінаў А. С. Малчанава

«Около деревни Теолин мои соседи подростки обнаружили груду противотанковых мин, которые мы спрятали на территории строящейся больницы. Ручной пулемёт и патроны я хранил на огороде около дома. Адам Бобков возле деревни Гураки, где он жил до войны, запрятал значительное количество оружия, гранат, патронов, 6 винтовок с патронами у деревни Бурая спрятал Пётр Спругис.

В начале осени в Дубровно оказался Сергей Коровико, а позже и Григорий Волчков, которые проходили кадровую службу в Красной Армии, но попали в окружение.

При встречах мы сходились во мнениях, что надо включаться в борьбу с врагом. Изредка к нам попадали советские листовки. Мы добыли радиоприёмник, отремонтировали и иногда слушали Москву.

Осведомлённость о положении на фронте, даже незначительные успехи нашей армии в то время поднимали настроение, группировали около нас ребят. К этому времени нашими единомышленниками стали Адам Бобков, Василий Шупаев, сестра Сергея Коровико — Соня Реутович.

Основная наша цель была — уйти в лес и стать партизанами, к этому мы и готовились.

На территории ткацкой фабрики в Дубровно немцы начали ремонтировать разбитые на фронте

---

* У дакладной Л. І. Майзіт у значнай меры выказаны яе суб'ектыўны погляд, які не ў поўнай меры адпавядаў сапраўднасці. Тым не менш, ён адлюстроўвае абставіны тых дзён і расстаноўку сіл у раёне. А было ўсялякае. Адны ўзнімаліся на свяшчэнную барацьбу з ненавісным ворагам. Іншыя ішлі служыць да акупантаў.

Расказваючы аб гібелі дубровенскіх камуністаў, Л. І. Майзіт, пэўна, мае на ўвазе той выпадак, калі загінулі ў выніку здрадніцтва стары бальшавік, удзельнік грамадзянскай вайны С. С. Максіменка і яго таварышы.

автомашины. На их разборку привлекали дубровенцев. Вошедшие в нашу группу Пётр Спругис, Фёдор Иванов, Борис Фефелов, находя в автомашинах патроны, гранаты, снаряжение, уносили их и прятали. Так мы создали запас боеприпасов, 2 бинокля.

В это же время такая же молодежная группа формировалась на станции Орша.

На улице Железнодорожной, недалеко от железнодорожного вокзала, жили мои родственники братья Василий и Леонид Рыбаковы. Перед войной они переехали туда на жительство из Дубровно, я их посещал. Там я познакомился с Тимофеем Докутовичем, Евгением Корженем — будущими адъютантами Заслонова, с другими ребятами. По вечерам они собирались у Рыбаковых и, как мы, добывали оружие, вредили немцам, возможностей у них было больше, почти все работали на железной дороге.

Вокруг Орши уже появились группы партизан и окруженцев, ребята ходили в деревни за продуктами и искали встречи с ними.

На железнодорожном узле и дороге уже совершались диверсии, ходили слухи, что это работа парашютистов, на самом деле действовала группа Заслонова.

Мы договорились с оршанцами, что будем продолжать искать встречи с партизанами и подпольщиками, поддерживать связь между собой и при первой возможности уйдем в лес вместе.

В начале нового 1942 года я снова был в Орше. Василий познакомил меня с «Лёнькой». Это был офицер Красной Армии Сарнычев, бежавший из плена, впоследствии комиссар отряда в бригаде Заслонова. У Рыбаковых он жил нелегально.

От ребят я знал, что под Оршей уже есть партизанский отряд, туда направляется оружие, собранное оршанцами, Володя Хмылёв там уже бывал, поэтому я просил Сарнычева помочь нам, дубровенцам, уйти в отряд. Он обещал, но пока рекомендовал расширять группу, собрать сведения о командирах Красной Армии, оказавшихся в Дубровно, рассказал о многих правилах конспирации, связь поддерживать с ним через Василия, в необходимых случаях через Марию Сидоровну Бычинскую, жившую в Дубровно. Мне стало ясно, что Сарнычев является одним из руководителей подполья на станции Орша, этого он не скрывал сам.

С этого времени, т е. с января 1942 года, мы и стали подпольной группой молодёжи в Дубровно, но пока не знали, что мы уже заслоновцы.

Соня Реутович (Скупова) была знакома с лейтенантом Красной Армии Петром Кудиным, который жил в совхозе Станиславово. Дом Сони и Сергея стал местом наших встреч. Из Станиславова в группу вошли Николай Герасимов, Нина Лукьяненко, Лида Смолякова и другие, им была поставлена задача вооружиться самим и делать запас оружия, возможности к этому у них были.

Вскоре в Дубровно приехал на лошади Василий Рыбаков, его сестра жила в Станиславово, её муж Иванов Иван Иосифович с лета 1941 года хранил цинковые коробки с патронами. Часть из них мы высыпали в 2 мешка с картофелем и отвезли в Оршу. Позже за патронами приезжала из Орши Вера Доморацкая. Тогда же Сарнычев, знавший о запрятанном мной толе, попросил срочно доставить его в Оршу для изготовления угольных мин, помочь найти врача, который мог уйти к партизанам. Весь хранившийся у меня тол мы с Василием перенесли за несколько ходок пешком в Оршу.

Сергей Коровико и Василий Шупаев расширяли станиславовскую группу, там уже создался хороший запас оружия.

Расширялась и дубровенская группа. На Оршанской улице жил Калько Никодим Филимонович с дочерью Валей, женой Ефросиньей (погибла в партизанском отряде в 1943 году).

Там же на Оршанской улице жил Пич Матвей, а в Первомайском переулке лейтенант Суриков Леонид и Гуторов Иван Павлович. Все они стали участниками нашей группы.

На северной окраине Дубровно, где сейчас расположено ПМК, находился фуражный склад с установленным немцами оборудованием для прессовки сена. В начале марта 1942 года Адам Бобков поджёг склад, и он почти полностью сгорел. Бобков, я и Иван Молчанов (погиб под Будапештом) были арестованы. Кроме подозрений против нас улик не было. Да и следователь из военнопленных не очень старался их добыть. Отсидев три дня в тюрьме-сарае, нас отпустили.

Мы стали усиленно готовиться к уходу в партизаны. Самым сложным был вопрос как уйти, чтобы не пострадали семьи. Выход нашёлся. Немцы объявили набор добровольцев для поездки на работу в Германию. Под видом «добровольцев» мы отправились в Оршу, а оттуда в Пищаловский лес. На следующий день туда пришли и оршанцы, нас собралось 15 человек. Почти всё оружие, которое мы ранее доставляли в Оршу, было перевезено в отряд. Ночью мы пришли в Пищалово. Появление партизан там было полной неожиданностью. Первого обезоружили бургомистра, а затем полицейских. Там я и Сергей Коровико составили справку о деятельности нашей дубровенской группы. Почти все участники нашей дубровенской группы впоследствии стали партизанами.

Первой боевой операцией в составе партизанского отряда, в которой участвовали все первыми ушедшие дубровенцы, была в совхозе «Межево», куда немцы свезли большое количество продовольствия, в основном зерно для отправки в Германию. Из окружающих деревень мы собрали подводы, разогнали охрану, часть зерна вывезли, а остальное раздали населению.

Все мы, дубровенцы, затем были включены в диверсионную группу Михаила Лущина, и начались партизанские будни до соединения с Красной Армией в июне 1944 года.

В боях с врагом погибли Пётр Спругис, Адам Бобков, Фёдор Иванов, Лида Смолякова. Тяжело ранены были Сергей Коровико, Григорий Волчков, Борис Фефелов».

Асінторфскае камсамольска-маладзёжнае падполле

Дзейнічала ў раёне прадпрыемства «Асінторф», электрастанцыі БелДРЭС і чыгуначнай станцыі Асінаўка Дубровенскага раёна. Створана 10.8.1941 г. былым дырэктарам торфапрадпрыемства Г. Г. Амельчанкам з маладых рабочых торфапрадпрыемства і вучняў сярэдняй школы. Аб'ядноўвала каля 50 чал. У штаб увахадзілі: С. П. Шмуглеўскі (камандзір), Я. У. Вільсоўскі (камісар), Л. К. Букацік, В. Ф. Агурцоў. Да лістапада 1942 дзейнасцю падполля кіраваў камандзір партызанскай брыгады «Дзядзькі Косці» К.С. Заслонаў, у лютым—кастрычніку 1943 г. — камандзір 16-й Смаленскай партызанскай брыгады І. Р. Шлапакоў. Баявыя групы былі ў г. Дуброўна, рабочых пасёлках Цэнтральным, № 1, 2, 3, 5, 6, 8, 11, у Асінторфскім лагеры савецкіх ваеннапалонных, вёсках Судзілавічы, Заполле, Замоскі, Азёры.

Уладкаваўшыся ва ўстановы акупантаў, падпольшчыкі перадавалі партызанам звесткі пра дыслакацыю войск праціўніка, перапраўлялі за лінію фронту і да партызан савецкіх грамадзян, здабывалі зброю, боепрыпасы, медыкаменты, забяспечвалі партызанскіх разведчыкаў дакументамі, пропускамі, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, арганізоўвалі ўцёкі савецкіх ваеннапалонных з лагераў, перапраўлялі іх да партызан, ратавалі савецкую моладзь і ваеннапалонных ад вывазу ў Германію, псавалі тэлефонную сувязь, машыны і абсталяванне для здабычы торфу. Падпольшчыкі ўзарвалі чыгуначны мост, спалілі плаціну помпавай станцыі, знішчылі 3 склады боепрыпасаў, ваеннай маёмасці і гаручага, вывелі са строю сістэму гідраторфу, спалілі дом адпачынку фашысцкіх афіцэраў. У кастрычніку 1943 г. ўліліся ў 16-ю Смаленскую партызанскую брыгаду.

У барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі загінулі: В. Ф. Агурцоў, Л. К. Букацік, Я. У. Вільсоўскі, Я. І. Гароднікаў, А. І. Жэнікаў, П. І. Клімовіч, М. Д. Малаховіч, Н. А. Нольберт, М. М. Пахоменка, Н. П. Пракапенка, І. І. і Г. І. Тращцяковы, Я. І. і М. І. Цяленчанкі, І. П. Яроменка. Многія падпольшчыкі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. На аўтамагістралі Мінск—Масква, непадалёку ад рабочага пасёлку «Асінторф», у гонар герояў падполля пастаўлены манумент (1966, скульптар Г. І. Мурамцаў, архітэктары В. Занковіч, Л. Левін).

А. Петрашкевіч.

Жанчына з легенды

З успамінаў Я. Крыштаповіча, былога юнага партызана

У час вайны на станцыі Асінаўка была створана падпольная група, на чале якой стаяла Яўгенія Няфёдава, былая студэнтка Мінскага педінстытута. Група наладзіла сувязь з партызанскай брыгадай К. С. Заслонава і па парадзе камбрыга арганізацыйна аб'ядналася з камсамольскай падпольнай арганізацыяй Асінторфа. Як сведчыць былы кіраўнік асінторфскага камсамольскага падполля С. П. Шмуглеўскі, Яўгенія Няфёдава была ўведзена ў штаб гэтай арганізацыі. Ад групы асінаўскіх падпольшчыкаў паступала вельмі каштоўная інфармацыя аб руху варожых эшалонаў на участку чыгункі Орша—Смаленск, аб характары перавозімых грузаў, аб выніках партызанскіх дыверсій. Я хачу расказаць толькі пра два эпізоды з яе баявой біяграфіі.

Па заданню партызанскага камандавання Жэня Няфёдава прымала актыўны ўдзел у разлажэнні часцей уласаўскай арміі і паліцэйскіх гарнізонаў.

Аднойчы яна прыйшла на прыём да начальніка мясцовай паліцыі і настойліва прапанавала яму перайсці на бок партызан разам са сваімі падначаленымі, каб загладзіць віну перад Радзімай. Начальнік паліцыі дзяўчыну адпусціў, але перайсці да партызан пабаяўся, дабіўся пераводу ў іншую мясцовасць. А Няфёдавай усё ж удалося пераманіць і вывезці да партызан цэлую групу паліцэйскіх.

Другі эпізод быў звязаны з разведкай ёю вайсковых абставін на станцыі Орша, дзе сабралася шмат эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. Патрабавалася тэрмінова паведаміць убачанае партызанскаму камандаванню, каб яно магло радыраваць аб гэтым у Маскву.

Заслонаўская брыгада, з якой у той час падтрымлівала сувязь асінторфскае падполле, знаходзілася за сорак кіламетраў ад Оршы.

Жэні прыйшла думка, што паскорыць шлях з Оршы да партызан можна толькі цягніком, даехаўшы да Асінаўкі, інакш звесткі для Масквы ўстарэюць. І яна, не раздумваючы, ускочыла на падножку адыходзячага з Оршы эшалона.

Дзверы тамбура адчыніліся, перад ёй з'явіўся немец з карабінам у руках. Падэшва кованага бота аказалася перад дзявочым тварам. Паказаўшы пропуск і пасведчанне перакладчыцы каменданта станцыі Асінаўка, Няфёдава патрабавала давезці яе да станцыі, таму што выконвае асабістае даручэнне свайго начальніка, аб якім ёй гаварыць забаронена.

А праз некаторы час наша авіяцыя наносіла бомбавы ўдар па скопішчу эшалонаў на станцыі Орша.

...Пасля вайны заслужаная настаўніца БССР Яўгенія Віктараўна Няфёдава (Кляноўская) працавала загадчыцай Акцябрскага райаддзела народнай адукацыі горада Мінска.

У 1985 годзе яна была удзельніцай юбілейнага парада Перамогі ў Маскве.

Яе ўжо няма сярод нас. Але не сціраецца з гадамі вобраз жанчыны з легенды.

Жылі ў вёсцы два браты

У адзін з цёплых жнівеньскіх дзён 1942 года ў вёску Міхееўка прыехалі чатыры паліцаі. Увайшоўшы ў хату братоў Грышчанковых (абодва браты Валодзя і Міша былі дома), яны патрабавалі, каб Валодзя аддаў лістоўкі, якія хаваў. На падлетка Мішу (хлапчуку было 16 гадоў) фашысцкія прыслужнікі не звярталі ніякай увагі. Валодзя казаў, што пра лістоўкі нічога не ведае. Звар'яцелыя паліцаі пачалі збіваць хлопца. Валодзя, сабраўшы ўсю сваю сілу, вырваўся ад іх, выскачыў у агарод і імкліва падаўся да стога сена, пад якім у яго быў схаваны ручны кулямёт.

Паліцаі выскачылі за ім на вуліцу. Міша тым часам, дастаўшы з пуні вінтоўку, адкрыў па іх агонь.

Дабегчы да невялічкага стажка і дабрацца да свайго кулямёта Валодзю не ўдалося. Паліцай, што застаўся ля коней, кінуўся наперарэз хлопцу і стрэліў ва ўпор.

...Ноччу Міша і іншыя падпольшчыкі вёскі аднеслі цела Валодзі на могілкі і там пахавалі. Затым юнак падаўся да партызан, дзе ён дзейнічаў смела, быў агульным любімцам. Аднойчы, вяртаючыся з задання па падрыву чыгуначнага палатна, іх група з сямі чалавек трапіла ў засаду гітлераўцаў. Хлопцы вырашылі лепш загінуць, але не здацца ворагу.

Так два браты-патрыёты аддалі свае маладыя жыцці, але не сталі на калені, не скарыліся.

В. Кавалёў.

На алтар перамогі

Ад Расіі нас аддзяляе Дняпро, на беразе якога размешчана наша вёска Міхееўка.

Пасля рэвалюцыі ў доме Мухіна на іх сядзібе Качаны была адкрыта школа II ступені, рэарганізаваная прыкладна ў 1925 годзе ў сямігадовую школу. Уся наша міхееўская моладзь вучылася ў гэтай школе. А летам усе працавалі ў родным калгасе «Хваля рэвалюцыі». Там і заспела вайна вясковую моладзь.

Апынуўшыся пад пятой акупанта, міхееўскія юнакі не захацелі змірыцца з рабскай доляй. Уладзімір Ісачанка, Васіль Аўралёў, Іван Ганчароў, Аляксандр Грамыка, Іван Грышчанкоў, браты Міхаіл і Уладзімір Грышчанковы, Фёдар Пасіевіч, Барыс Шчамялёў пачалі збіраць зброю, звязаліся з партызанамі Смаленшчыны. Яны ж перацягнулі на свой бок Васіля Грышчанкова, які служыў у паліцыі. Старэйшымі па ўзросту былі Валодзя Ісачанка і Барыс Шчамялёў, які практычна і ўзначальваў групу. Астатнія толькі скончылі сем класаў.

Па заданню партызан і разам з імі юныя міхееўскія патрыёты ўдзельнічалі ў падрыве малочнага завода ў в. Усвяты, у шэрагу аперацый на чыгункы, збіралі зброю і боепрыпасы, хаваючы ўсё гэта да перадачы партызанам у суседніх лясах.

Асноўнай базай юных патрыётаў у Міхееўцы была хата Пятра Іларыёнавіча і Ганны Рыгораўны Грамыкаў — наша бацькоўская хата. У гэтай жа хаце жылі члены групы, мае брат і сястра Аляксандр і Ніна Грамыкі.

А потым маладыя патрыёты перайшлі ў Смаленскі партызанскі полк І. Ф. Садчыкава, з якім увесь час трымалі сувязь. Штуршком для ўходу стала забойства паліцаямі Валодзі Грышчанкова. Яго брат Міхаіл з боем прарваўся за Днепр, астатнім заставацца ў вёсцы было таксама немагчыма, бо можна было паплаціцца жыццём.

З групы юнакоў жывымі засталіся толькі Фёдар Прохаравіч Пасіевіч, Іван Паўлавіч Грышчанкоў і Аляксандр Грамыка — мой брат. Усе яны ўзнагароджаны медалямі.

Яшчэ раз хачу вярнуцца да сваёй маці, да нашай сям'і. Падчас апісваемых падзей маёй маці было 65 гадоў, але яна актыўна дапамагала партызанам і была потым узнагароджана партызанскім медалём. Яе дачка, мая сястра Ніна, была адзначана ордэнам Чырвонай Зоркі.

Усяго нас у маці было васьмёра дзяцей — пяць сыноў і тры дачкі. Я назваў дваіх — Аляксандра і Ніну. А мы, трое братоў: я, Рыгор, Іван з першых дзён вайны былі на фронце. Наша сястра Марыя добраахвотна пайшла на фронт з Масквы.

Такім чынам, калі ўключаць маці, з адной сям'і ў вайне ўдзельнічалі сем чалавек.

Пасля вайны лёс маіх братоў і сясцёр склаўся па-рознаму. А маці Ганну Рыгораўну ў 1954 годзе забіла маланка. Гэтая зусім непісьменная жанчына-патрыётка заслужыла таго, каб сказаць пра яе добрае слова.

З. Грамыка.

У шэрагах народных мсціўцаў

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Дубровенскага раёна не было буйных партызанскіх атрадаў, тым больш брыгад ці злучэнняў. Тлумачыцца гэта тым, што Дубровеншчына знаходзілася на важнейшым стратэгічным напрамку, па яе тэрыторыі праходзілі аўтамабільныя і чыгуначныя магістралі Мінск—Масква, у зоне якіх было шмат варожых войск. А восенню 1943 года раён падзяліла франтавая паласа, па абодва бакі якой былі магутныя армейскія сілы. Слабая лясістасць раёна таксама не дазваляла развярнуцца тут народным мсціўцам.

Але гэта не азначае, што Дубровеншчына выпадае з усенароднага партызанскага руху на Беларусі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі. Тут дастаткова моцна адчуваўся ўплыў партызанскіх брыгад К. С. Заслонава, А. Ф. Данукалава, І. Р. Шлапакова, М. І. Кітаева, партызанскага палка І. Ф. Садчыкава. Тут створаны быў і дзейнічаў невялікі партызанскі атрад «Мсціўца», тут праводзілі баявыя аперацыі перакінутыя з-за лініі фронту ў варожы тыл партызанскія атрады «Грозны» і «Сокал».

У гэтых партызанскіх фарміраваннях змагаліся з ворагам і ўраджэнцы Дубровеншчыны.

Вясной 1942 года на тэрыторыі Віцебскай вобласці ўзніклі партызанскія атрады і групы атрадаў: атрады Лявонава, Данукалава («Баці»), Буланава, атрад, а затым брыгада К. С. Заслонава. Яны размяшчаліся ў лясах Аршаншчыны, Сенненшчыны, на граніцы Віцебскай і Смаленскай абласцей. І сталі цэнтрамі, куды збіраліся ўсе, хто вырашыў стаць на шлях барацьбы з акупантамі. Зразумела, што былі такія і ў Дубровенскім раёне.

У партызанскай брыгадзе К.С. Заслонава змагаліся Шаланда і Агеева з в. Заполле, І. М. Казлоў з в. Ганчарова, дубровенцы Пётр Спругіс, Сяргей Каравіка, Фёдар Іваноў, Рыгор Валчкоў, Антон Бабкоў, Аляксей Малчанаў, Васіль Шупаеў, Барыс Фефелаў.

Пад клічкай «Дуброўскі» быў вядомы сярод заслонаўцаў бясстрашны Пётр Спругіс. Ён нарадзіўся ў 1923 годзе ў Віцебску. Перад вайной працаваў на дубровенскай фабрыцы «Дняпроўская мануфактура». Упачатку вайны, калі цераз наш раён перакаціўся вогненны шквал, збіраў зброю і хаваў яе каля вёскі Бурая. З рызыкай для жыцця вывез потым на падводзе ўзбраенне ў стан заслонаўцаў, дзе быў камандзірам узвода ў 2-й брыгадзе. Ён удзельнічаў у многіх баявых аперацыях і геройскі загінуў 7 верасня 1943 года. Пётр Іванавіч Спругіс пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Яшчэ раней, у сакавіку сорак трэцяга, смерцю храбрых загінуў партызан атрада «Перамога» 1-й заслонаўскай брыгады камсамолец Антон Бабкоў.

Цяжка параненым быў вывезены самалётам ў савецкі тыл Сяргей Каравіка, які і сёння жыве ў родным Дуброўне.

А хто заставаўся ў страі, помсціў ворагу за загінуўшых таварышаў, за родную Беларусь. Праз усё жыццё пранеслі яны гордае імя «партызан-заслонавец».

Вясной 1942 года ў нашых мясцінах з'явіліся з-за лініі фронту дыверсійна-разведвальныя атрады «Грозны» і «Сокал». Камандзірам «Грознага» быў лейтэнант-пагранічнік Ф. Ф. Азміцель, камандзірам «Сокала» — старшына Н. В. Сокалаў. Гэтыя невялікія па колькасці, але выдатна ўзбро-

еныя і абучаныя атрады, сфарміраваныя з воінаў-чэкістаў, вельмі здорава дапякалі ворагу. Для паспяховай дзейнасці гэтыя атрады шукалі апору ў мясцовага насельніцтва і знаходзілі яе.

Разведчыцай ў атрадзе «Грозны» была васемнаццацігадовая Галя Меяровіч, дачка лесніка Шчэрбінскага лясніцтва, што ў раёне Асінторфа. Спачатку адна, а потым з разведчыцамі атрада «Сокал» Нінай і Надзеяй Мядзведзевымі, яна выконвала вельмі цяжкія і вельмі небяспечныя заданні ў Дубровенскім і Аршанскім раёнах.

Пазней Галіна Іванаўна Меяровіч працавала ў варожым тыле па заданнях аддзела контрразведкі 43-й арміі, аддзела разведкі 3-га Беларускага фронту і загінула ў верасні 1944 года на тэрыторыі Літвы, калі іх групу з 8 чалавек пры высадцы выявіў вораг. Сёння партрэт Галіны Меяровіч можна ўбачыць у Беларускім Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Байцом партызанскага атрада «Грозны» быў і кадравы ваенны Аляксей Апанасавіч Чаканаў з в. Калінаўка Дубровенскага раёна. Змагаючыся з ворагам, ён праяўляў мужнасць і выключную вытрымку ў самыя напружаныя мінуты.

Ва ўсіх дзеяннях партызан ім дапамагала мясцовае насельніцтва. Дзесяткі сувязных, разведчыкаў, правадніковў з вёсак Сенцюры, Якіменкі, Трафіменкі і іншых, рызыкуючы жыццём, выконвалі іх заданні.

У 1990 годзе наша газета друкавала дакументальную аповесць Л. Капліна «Мсціўцы». У ёй размова ішла пра партызанскі атрад «Мсціўца» («Мсціцель»), які быў створаны ў раёне Асінторфа адступаючымі чэкістамі. Атрад дзейнічаў на Дубровеншчыне і ў суседніх раёнах Смаленскай вобласці, а потым уліўся ў Смаленскі партызанскі полк І. Ф. Садчыкава, стаўшы яго 6-м атрадам. Камандаваў атрадам лейтэнант дзяржбяспекі Нікандр Іванавіч Талерка. У гэтым атрадзе змагаліся ці былі яго разведчыкамі і сувязнымі многія жыхары Дубровеншчыны, сярод іх муж і жонка Канстанцін і Настасся Юрчышкі, Трафім Жыганаў, Уладзімір Бабарыкін, Сцяпан Новікаў, Рыгор Якуцёнак, Арсеній Жыганаў, Еўдакім Панкраценкаў, якія загінулі ад рук акупантаў, і зусім юныя народныя мсціўцы гэтага атрада — Міхаіл Капелька і Віктар Рачынскі.

Парторгам у гэтым атрадзе пэўны час быў добра вядомы на Дубровеншчыне Сямён Савельевіч Максіменка, які па праву лічыцца адным з арганізатараў падпольнай барацьбы ў Дуброўне і навакольных населеных пунктах. Тут жа прымалі ўдзел ў барацьбе з ворагам і яго паплечнікі Іван Мінаевіч Леўчанка і Кудрашоў. С. С. Максіменка і яго таварышы былі схоплены і расстраляны гітлераўцамі ў маі 1942 года.

Атрад «Мсціўца» ўзаемадзейнічаў са спецатрадамі «Грозны» і «Сокал».

Так, адной з праведзеных сумесна аперацый быў смелы налёт 1 мая 1942 года на недабітую кавалерыйскую часць — звыш 400 коннікаў, адведзеную з фронту на адпачынак у в. Ольша.

Некалькі пазней яны разам правялі буйную аперацыю па разгрому нямецкага гарнізона ў Любавічах. Там яны захапілі такія багатыя трафеі боепрыпасаў і харчавання, што нават змаглі падзяліцца імі з брыгадай Канстанціна Заслонава ў цяжкі для яе час.

Хутка пасля гэтай аперацыі ў час варожай карнай акцыі супраць партызан пад назвай «Грыф» атрад «Мсціўца» ўліўся ў партызанскі полк Садчыкава. А спецатрады «Грозны» і «Сокал» працягвалі выконваць пастаўленыя перад імі задачы.

У Смаленскім партызанскім палку

мужна біліся з ворагам ураджэнцы Дубровеншчыны.

Сярод партызан-заслонаўцаў змагаўся Рыгор Валчкоў. Ваенны лёс закінуў дубровенца, ваеннага лётчыка, збітага ў няроўным баі з гітлераўцамі, спачатку ў партызанскі атрад, які пазней увайшоў у састаў брыгады К. С. Заслонава. Тут ён удзельнічаў у многіх аперацыях, акрамя таго ўваходзіў у склад разведвальна-дыверсійнай групы Міхаіла Лушчына, перакінутай з-за лініі фронту, быў яго намеснікам.

У час карнай экспедыцыі адважны партызан Рыгор Валчкоў быў паранены. Падабралі яго партызаны з палка Садчыкава. Тут ён стаў камандзірам узвода і ўвайшоў у гісторыю партызанскай барацьбы на Беларусі тым, што ў сакавіку 1944 года ў славутай бітве партызан Полацка-Лепельскай зоны з рэгулярнымі войскамі ворага, трапіўшы са сваім узводам у акружэнне, 13 гадзін утрымліваў захоплены паўразбураны дзот, але не здаўся. Аб гэтым тады было расказана ў палкавой партызанскай газеце, а пазней гэты гераічскі эпізод увайшоў у кнігу кіраўніка зоны Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка «Партызаны прымаюць бой».

У час прарыву наступнай блакады Р. Валчкоў быў цяжка паранены і з партызанскага аэрадрома вывезены на Вялікую Зямлю, дзе доўга лячыўся. Пасля вайны Рыгор Захаравіч жыў у г. Чаркаск.

Пётр Рыгоравіч Матарыкін, які жыве ў Асінторфе, родам з Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. Партызаніў з лета сорак першага года. У 9-м атрадзе 3-га батальёна палка Садчыкава быў стралком, кулямётчыкам. Прымаў удзел у засадах, разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, «рэйкавай вайне». Удзельнік штурмаў Варшавы і Берліна. Сярод яго баявых узнагарод ёсць і медаль «Партызану Айчыннай вайны». Да 1982 года, да выхаду на пенсію, быў рабочым, загадчыкам склада. Прымае ўдзел у ваенна-патрыятычнай рабоце.

Родам з Руднянскага раёна і другі сённяшні жыхар Асінторфа Аляксей Елісеевіч Прохараў. У час вайны ён спачатку збіраў для партызан зброю і боепрыпасы. А з верасня 1943 года стаў байцом 1-га атрада 1-га батальёна палка Садчыкава. І было яму тады 16 гадоў. Але на яго долю выпала ўсё, што давялося перанесці партызанам, у тым ліку і шырока вядомы прарыў ва Ушацкім раёне ў маі 1944 года.

Пасля вайны А. Е. Прохараў працаваў на торфапрадпрыемстве, цяпер на заслужаным адпачынку.

Мы ўспаміналі ўжо Мішу Капельку і Віктара Рачынскага, юных партызан атрада «Мсціўца».

Міша родам з вёскі Лабаны. Гэта быў да адчайнасці адважны юнак — партызанскі падрыўнік, кулямётчык, а затым разведчык. У палку Садчыкава ён удзельнічаў у спуску пад адхон 6 эшалонаў, у 48 баявых аперацыях, у тым ліку 12 разоў у падрыве падземнага кабеля сувязі Берлін—фронт. Быў цяжка паранены ў партызанах, а затым і на фронце, пасля чаго быў камісаваны. Падарваўся ў роднай вёсцы на міне ў маі 1945 года. А пры жыцці паспеў заслужыць ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, медалі.

Яго сябруку з суседняй вёскі Жабыкі Віктару Рачынскаму пашанцавала. У атрадзе «Мсціўца», затым у палку ён быў мінёрам, браў удзел у 21 баявой аперацыі і ў сямі дыверсіях па падрыву варожых эшалонаў. Летам 43-га года страціў нагу. Пасля вайны здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю і займаў адказныя пасады ў праваахоўных органах. Віктар Пятровіч узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, васьмю медалямі. Жыве ў Гродне.

У 3-м батальёне неслі нялёгкую службу трое ўраджэнцаў вёскі Шэкі: Мікіта Васілевіч Нізохін, Ягор Васілевіч Нізохін і Іван Данілавіч Мураўёў. У кожнага на рахунку не адна баявая аперацыя. Мікіта Нізохін вызначыўся ў баях пад вёскай Усамля, што пад Полацкам (той самай вёскай, дзе ўтрымліваў дзот Рыгор Валчкоў).

Ягор Нізохін, кулямётчык, быў паранены ў баі. Цяпер жыве ў Цвярской вобласці, двое другіх — у родных мясцінах.

Да вайны Аня Фінько з вёскі Сазонаўка скончыла медвучылішча. Летам яна стала медсястрой у 14-м атрадзе 4-га батальёна палка. У час баёў перавязала больш за 20 параненых партызан, 15 вынесла з поля бою. Узнагароджана многімі медалямі. Жыве цяпер Ганна Раманаўна ў Кустанаі.

Яе аднасяльчанка Мацвейкіна (Федасеева) Алена Раманаўна да вайны працавала землеўпарадкавальнікам (скончыла тэхнікум). У полк Садчыкава прыйшла летам 1943 года. Была поварам. Пасля вайны працавала па спецыяльнасці, не раз выбіралася дэпутатам мясцовых саветаў. Жыве ў г. Паставы Віцебскай вобласці.

Партызанамі палка Садчыкава, затым байцамі Чырвонай Арміі былі Фёдар Ігнатавіч Якіменка родам з вёскі Бель Дубровенскага раёна і Мінай Васілевіч Уласенкаў з вёскі Расасна. Абодва цяпер жывуць на Смаленшчыне.

Ураджэнец в. Міхееўка, удзельнік вайны Ф.Пасіевіч пісаў у раённую газету, што ўраджэнец суседняй вёскі Бель, палітрук-акружэнец Васіль Усцінавіч Какошын, вярнуўшыся ў родную вёску, стварыў баявую групу з адзінаццаці чалавек, наладзіў сувязь з палком Садчыкава і ноччу з 7 на 8 студзеня 1943 года вывеў яе ў гэты партызанскі полк. Усе былі добра ўзброены.

Байцом палка Садчыкава был і Сямён Капусцін з Асінторфа, які потым у саставе дэсантнай разведвальна-дыверсійнай групы «Максім» быў закінуты ва Усходнюю Прусію і там геройскі загінуў, прыкрываючы прарыў трапіўшай у акружэнне групы.

Смаленская партызанская брыгада, якой камандаваў І. Р. Шлапакоў, свае баявыя дзеянні пераносіла і на тэрыторыю Дубровенскага раёна. З брыгадай падтрымлівалі цесныя сувязі падпольшчыкі Асінторфа, разам з партызанамі яны ажыццяўлялі дзёрзкія аперацыі супраць акупантаў. Калі над падпольшчыкамі навісла пагроза арышту, па распараджэнню І. Р. Шлапакова яны пакінулі Асінторф і ўліліся ў яго брыгаду.

Вось што пісала зімой 1990 года аднаму з аўтараў гэтага нарыса былы член падпольнай камсамольскай арганізацыі ў Асінторфе, ураджэнка в. Судзілавічы, а цяпер мінчанка Марыя Рыгораўна Макаранка:

«Дзейнасцю камсамольскага падполля ў Асінторфе кіраваў камандзір партызанскай брыгады К. С. Заслонаў. А пасля яго гібелі камандзір 16-й Смаленскай брыгады Шлапакоў Іван Раманавіч... З кастрычніка 1943 г. І. Р. Шлапакоў атрымаў загад Беларускага штаба партызанскага руху тэрмінова арганізаваць перавод членаў камсамольскага падполля Асінторфа ў партызанскую зону. Падпольшчыкі ўліліся ў рады брыгады.

...У жывых нас засталося вельмі мала, адны загінулі ў вайну, іншыя не дажылі да нашых дзён, але абавязкова трэба назваць іх імёны.

Былі расстраляны немцамі:

ЦЯЛЕНЧАНКА Яўген
ЦЯЛЕНЧАНКА Міхаіл
БЕЛАНЕНКА Марыя

Загінулі ў партызанах:

ВІЛЬСОЎСКІ Яўген
ПРАКАПЕНКА Надзея
БУКАЦІК Людміла
МАЛАХОВІЧ Мікалай
НОЛЬБЕРТ Наталля
АГУРЦОЎ Васіль
ЖЭНІКАЎ Аляксей
КЛІМОВІЧ Пётр
ТРАЦЦЯКОЎ Георгій
ТРАЦЦЯКОЎ Іван
ЯРОМЕНКА Іван
ПАХОМЕНКА Міхаіл
СЦЕПАНЕНКА Рыгор

Памерлі пасля вайны:

СІНЕЛЬНІКАЎ Дзмітрый
ВЕЛІКАСЕЛЬСКІ Мікалай
ПРУДНІКАЎ Міхаіл
МАЛАХОВІЧ Аляксей
ПАЦЯГОЎ Дзям'ян
НІКІЦЕНКА Мікалай
НЯФЁДАВА Яўгенія
ПЯЧКУРОЎ Іван
ШАЛАНДА Ніна
БУГАЁВА Валянціна
САМАЦВЕТАВА Надзея
ЯНОВІЧ Валянціна

25 чэрвеня 1989 года адбылася сустрэча застаўшыхся ў жывых падпольшчыкаў Асінторфа, а затым партызан. На ёй прысутнічалі: Агурцова-Кубракова Марыя, Беразоўскі Віталь, Варламава Зінаіда, Крупеня Міхаіл, Макаранка Марыя і Шмуглеўскі Станіслаў.

Пра сябе Марыя Рыгораўна скупа паведаміла, што пасля вайны настаўнічала, была ўзнагароджана ганаровым знакам «Выдатнік народнай адукацыі». Сярод узнагарод — ордэн Айчыннай вайны II ступені, 15 баявых, працоўных і юбілейных медалёў. А яшчэ — знак таварыства германа-савецкай дружбы (у золаце) за работу з антыфашыстамі ў гады вайны.

У 16-й Смаленскай партызанскай брыгадзе былі таксама падпольшчыкі з Асінторфа муж і жонка Нікадзім Калько і Ефрасіння Калько (загінула), іх дачка Валянціна Калько, Гароднікаў Якаў і Ярмолін Іван (абодва загінулі), Мітрафан Катляроў і Тацяна Цімошчанка.

Пра падпольшчыкаў Асінторфа напісана нямала, таму мы абмежаваліся тут толькі пералікам тых, хто прадоўжыў потым барацьбу з ворагам у партызанскіх атрадах.

(Дададзім, што члены гэтай падпольнай арганізацыі Пётр Паўлавіч Пракапенка і Якаў Гаўрылавіч Лебедзь змагаліся потым у радах заслонаўцаў.)

У радах народных мсціўцаў падпольшчыкі таксама праявілі сябе сапраўднымі пытрыётамі Радзімы.

У лясах Магілёўшчыны

Некаторыя ўраджэнцы Дубровеншчыны знаходзілі дарогу ў партызанскія палкі, якія дыслакаваліся ў асноўным на Магілёўшчыне. Так, настаўнік-пенсіянер Іван Аляксеевіч Емяльянаў родам з вёскі Пасуддзева (цяпер жыве ў Сваташыцах) расказвае, як трапіў ён у 15-ы партызанскі полк, якім камандаваў А. С. Дзямідаў. Разам з ім у гэтым палку былі Аляксей Сямёнавіч Кабуш са Сваташыц, які загінуў у барацьбе з ворагам. Называе І. А. Емяльянаў таксама Рыгора Тацянкова, Аляксея Малчанава, Мікалая Кротава і іншых, хто не мог змірыцца з акупантамі.

Былі дубровенцы і ў магілёўскай партызанскай брыгадзе М. І. Кітаева, і ў партызанскім палку «Трынаццаць», якім камандаваў маёр С. У. Грышын (пазней — палкоўнік, Герой Савецкага Саюза).

У гэтым палку ў смяротнай бітве з ворагам прымалі ўдзел Сцяпан Архіпавіч Нікодаў з в. Дзяругі, семнаццацігадовы Уладзімір Іванавіч Платонаў з вёскі Барадзіно, Іван Паўлавіч Далжанкоў з вёскі

Займішча, Ісак Рыгоравіч Борыкаў з вёскі Вячэрына. Пра першых двух у нашай газеце неяк расказвалася.

Стойкім і мужным байцом праявіў сябе, будучы ў Боўкінскай блакадзе, І. П. Далжанкоў. Удзельнічаў у адкрытых баях і многіх баявых разведках. Івану Паўлавічу давялося пабываць і ў дзеючай арміі, папрацаваць на розных пасадах. Цяпер на пенсіі. Жыве ў Оршы.

Палітруком 3-й роты 3-га батальёна палка Грышына быў І. Р. Борыкаў. А да гэтага Ісак Рыгоравіч займаўся на Дубровеншчыне падпольнай дзейнасцю, падрыхтоўкай і пераводам да партызан нашых камандзіраў і чырвонаармейцаў, мясцовай моладзі. Захавалася пісьмо, напісанае рукой Борыкава 23 студзеня 1966 года. У ім размова ідзе менавіта аб разгортванні падпольнай барацьбы на Дубровеншчыне. А пра тых, хто пайшоў да партызан магілёўскай зоны, Борыкаў піша:

«Тады з Чубакова і Станіславова прыйшлі: Маісеенка Фелікс, Емяльянаў Фама, Брагін Віктар, Ціцянкоў Грыша, жонка былога дырэктара саўгаса Кудзінава з двума дачкамі — Аленай і Тамарай, Ніна Лунькова і інш... З Барадзіна прыйшлі Платонава Таня, Старавойтава Таня, Івашкевіч Віктар і інш. З Барсукоў: дзве сястры Макаравы — Феня і Аня і інш. З Дзяруг: Шутаў Пётр, Жабкін Васіль і інш.»

Гэтыя радкі сведчаць аб пэўнай масавасці партызанскага руху на Дубровеншчыне.

Ісак Рыгоравіч Борыкаў пасля вайны аддаваў усяго сябе мірнай працы і ўжо ў 1949 годзе быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Ульяна Антонаўна Мухіна да вайны скончыла 9 класаў Дубровенскай СШ №1 і вучылася на бухгалтара. Лёс закінуў яе ў Ружанскі раён Брэсцкай вобласці. Там яна стала сувязной, а затым партызанкай атрада імя Дзмітрава брыгады Панамарэнкі. Прымала ўдзел у баявых аперацыях, была сакратаром камсамольскай арганізацыі атрада. Пасля вайны стала настаўніцай. Мае ўзнагароды. Жыве ў Дуброўне.

У Налібокскай пушчы партызаніў Мікіта Іванавіч Траццякоў, быў падрыўніком. Пасля вайны быў сувязістам, электрамеханікам. Цяпер на пенсіі. Жыве на ст. Асінаўка.

Іван Рыгоравіч Казлоў, які жыве ў Сіпішчаве, прайшоў савецка-фінляндскую вайну, у час Вялікай Айчыннай вайны ўцёк з палону і быў партызанам 115-й Горацкай брыгады. Цяжка параненага, яго пераправілі на Вялікую Зямлю. Пасля вайны быў сельскім медработнікам.

Ф. Кулакоў.

У тыле ворага

У гады вайны ў трохкутніку Орша—Віцебск—Смаленск адважна дзейнічаў па заданню НКУС СССР партызанскі атрад асобага прызначэння «Грозны», якім камандаваў Фёдар Фёдаравіч . 5 лістапада 1944 года Ф. Ф. Азміцелю было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна...

Згодна задання Цэнтра атрад Азміцеля абасноўваўся на мяжы дзвюх абласцей: Смаленскай і Віцебскай, у лясным масіве каля вёскі Азёры Дубровенскага раёна.

...На Віцебшчыне, уздоўж узлесся Шчэрбінскага лясніцтва раскінуліся вёскі Новая Зямля і Гічы. З паўднёвых ускраін гэтых вёсак, у раёне чыгуначнага раз'езда Шухаўцы добра праглядваліся аўтамагістраль Масква—Мінск і чыгунка Орша—

Ф. Ф. Азміцель.

Смаленск. Менавіта тут партызаны часцей за ўсё наладжвалі засады.

У другой палове ліпеня 1942 года для ліквідацыі партызанскіх дзеянняў сюды прыбыла рота першага батальёна гарнізона «Масква» так званай «Рускай народнай нацыянальнай арміі». Камандаваў ротай хтосьці Грыгор'еў.

Фёдар Азміцель, параіўшыся з камандзірамі атрадаў Нікандрам Талеркам і Мікалаем Сакаловым, прыняў рашэнне схіліць роту «РННА» на пераход да партызан. У нашым атрадзе ваяваў партызан Марчанка. Яго жонка была ў вёсцы Новая Зямля. Нітачку сувязі з вёскай мы выкарысталі для вывучэння людзей гэтай роты. Хутка запіска Фёдара Азміцеля цераз трэція рукі трапіла да камандзіра роты Грыгор'ева. У запісцы была прапанова аб бескантактным спосабе сувязі і ўмовах пераходу роты на бок партызан.

Грыгор'еў прапанову не прыняў. Партызаны сталі шукаць іншых шляхоў збліжэння і дабіліся свайго.

...Пагрузіўшы на падводы 12 кулямётаў, 3 мінамёты, боепрыпасы, радыёстанцыю, харчаванне і іншую ротную маёмасць, 69 чалавек выйшлі з вёскі Новая Зямля. Пад вечар перабежчыкі прыбылі ў вёску Маркава...

Фёдар Азміцель уважліва абышоў строй. Затым жорстка сказаў:

— Вось хутка маюць адбыцца баі з карнікамі. Зможаце крывёю акупіць сваю віну перад Радзімай. Што датычыцца зброі, то яна застаецца пры вас...

Азміцель невыпадкова гаварыў аб маючых адбыцца баях.

Разведка ўстанавіла, што аператыўны аддзел генштаба сухапутных сіл і штаб цэнтральнай групоўкі гітлераўскіх войск рыхтавалі цэлую серыю карных аперацый супраць партызан у Беларусі і на Смаленшчыне. Па яго ініцыятыве ў тыя дні ў вёсцы Завалішча Руднянскага раёна сабраліся партызанскія камандзіры.

Нарада прыняла рашэнне аб сумесных дзеяннях супраць карнікаў. Каля 120 партызан на чале з Азміцелем занялі абарону ўздоўж лесу ў раёне беларускіх вёсак Новая Зямля, Гічы, Шчэрбінскае лясніцтва.

З боку Асінторфа каля вёсак Азёры—Шэкі абарону занялі былыя салдаты «РННА» на чале з Максюціным.

Наступіла 16 жніўня. Дзень быў сонечны, цёплы. Паветра празрыстае і ціхае. Партызанская застава своечасова заўважыла праціўніка. Чароды аўтамашын з гітлераўцамі імчалі па мінскай аўтамагістралі. Па звестках конных партызанскіх разведчыкаў карнікі таксама рухаліся і з поўначы па бальшаку, ахопліваючы ў гэтым раёне партызан з двух бакоў.

Баі працягваліся два тыдні. Карнікі прымянілі танкі, танкеткі, бронемашыны, самалёты...

Але знішчыць партызан фашысты ўсё ж не змаглі. Атрад «Грозны» застаўся на сваім участку і працягваў дзейнічаць. У разгар карнай аперацыі група падрыўнікоў спусціла пад адхон чарговы варожы эшалон, дзевяты па ліку.

А. Казіцкі,
г. Масква.

Апаленая маладосць

Да вайны ўся наша сям'я Капусціных жыла на Асінторфе. Шасцёра дзяцей вучыліся ў тутэйшай школе. Калі пачалася вайна, старэйшы брат Пётр служыў у Чырвонай Арміі, а Сямён перайшоў у дзесяты клас. Я была ў шостым класе.

Фашысцкія войскі набліжаліся вельмі хутка. Многія старшакласнікі і юнакі дапрызыўнога ўзросту былі сфарміраваны ў дружыну, якая выконвала розныя даручэнні штаба абароны пасёлка: тушыла пажары, ахоўвала важнейшыя аб'екты. Сямён атрымаў вінтоўку, шынель і каску і вельмі ганарыўся гэтым.

Але вось пасёлак занялі акупанты, і ўсё гэта яму давялося надзейна схаваць. Да таго ж наша сястра Паліна перад вайной па камсамольскай пуцёўцы была накіравана працаваць сакратаром пасялковага савета. А цяпер у пасёлку з'явіліся здрадні-

кі і такой сям'і, як наша, заставацца тут было небяспечна. Маці схадзіла на Смаленшчыну, на радзіму бацькі, дзе яго родзічы параілі пераехаць нашай сям'і да іх. Раздабылі яны і каня, каб перавезці дзяцей і сякія-такія нажыткі.

...У верасні 1942 года Сямён стаў сувязным партызанскага Смаленскага палка І. Ф. Садчыкава, які дзейнічаў і на тэрыторыі Беларусі. Пазней стаў партызанам.

Жывы, вясёлы характар Сямёна спалучаўся з выключнай адвагай і знаходлівасцю, высокай вернасцю абавязку і таварышам. Я доўга займалася пошукамі і сабрала багаты матэрыял пра майго брата. Аб ім у свой час расказвалі смаленскія газеты «Рабочий путь» і «Смена», свярдлоўскі «Уральский следопыт», «Калининградский комсомолец» і іншыя.

Сямён быў залічаны ў састаў дэсантнай разведвальна-дыверсійнай групы «Максім» Уладзіміра Іванавіча Максімава.

Уладзімір Іванавіч (цяпер яго няма сярод нас) так пісаў пра Сеню: «У час выканання баявога задання Сямён быў выключна сабраным, сур'ёзным і мужным, словам, сапраўдным воінам-разведчыкам. А ў гадзіну адпачынку, якім бы стомленым ні быў, усіх стараўся развесяліць, быў гарэзлівым па-хлапечы. Хутка ён стаў старшым разведчыкам і маім ад'ютантам, быў незаменным памочнікам на ўсіх заданнях, якія даручала камандаванне.

...У Заходняй Беларусі Капусцін устанавіў сувязь з польскім ксяндзом, які забяспечваў нас каштоўнай інфармацыяй. А ў цяжкія дні Ушацкай блакады Сямён з таварышамі прабраліся ў размяшчэнне штаба 252-й нямецкай пяхотнай дывізіі і дзейнічалі там з вялікай карысцю для нашай агульнай справы».

Дакументы нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь сведчаць, што С.Капусцін спусціў пад адхон чатыры нямецкія эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага.

Так змагаўся з ненавісным ворагам мой брат Сямён Капусцін на роднай савецкай зямлі. А загінуў ён гераічнай смерцю ў лістападзе 1944 года ў час рэйду групы «Максіма» ва Усходнюю Прусію.

Л. Капусціна.

З успамінаў былога партызана атрада «Сокал» Я. Тоблера

У 1942—1943 гадах у Дубровенскім раёне дзейнічаў спецатрад «Сокал» пад камандаваннем Мікалая Васілевіча Сакалова. Пяцьсот дзён і начэй партызаны атрада наносілі адчувальныя ўдары па чыгункі Масква—Мінск на ўчастках станцый Шухаўцы, Кіраёва, Асінаўка. І нямала ваенных эшалонаў ворага з жывой сілай і ваеннай тэхнікай не даходзіла да лініі фронту.

Сакалоўцы самі навучыліся выраблять міны ў драўлянай форме. Іх не ўлаўлівалі мінашукальнікі, што для дыверсійнай справы было вельмі важна.

У вёсках, прылягаючых да лясоў, дзе дыслакаваўся атрад — у Трафіменках, Якіменках, Сенцюрах, Гічах, Новай Зямлі, Шэках — мы мелі надзейных памочнікаў. А Соф'я Сыраквашына з Якіменак, Канстанцін Аўчыннікаў з Трафіменак, Соф'я Шчарбакова з Буды ўладкаваліся працаваць на чыгункі і аўтамагістралі і забяспечвалі атрад каштоўнымі звесткамі, якія патрэбны былі і нам, і цэнтру.

Атрад быў невялікі — 60 чалавек. Але дыверсійнымі аперацыямі, разведвальнай і прапагандысцкай дзейнасцю так дапякаў фашыстам, што тыя раз-пораз прадпрыймалі супраць яго карныя экспедыцыі.

У час адной такой экспедыцыі ў лесе пад Новай Зямлёй у забітага нямецкага афіцэра мы знайшлі карту, якая моцна зацікавіла Беларускі штаб партызанскага руху.

У 1943 годзе да нас прыбыла група ваенных мінёраў з дваццаці чалавек на чале са старшым лейтэнантам Андрыянавым. Пазней тут стали дзейнічаць і партызаны са Смаленшчыны — полк І. Садчыкава і 16-я брыгада Р. Шлапакова. Жыццё акупантаў у трохкутніку Орша—Віцебск—Смаленск стала да таго нязносным, што яны вымушаны былі спыніць рух чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту ў начны час. Так было і на тэрыторыі Дубровенскага раёна, пакуль сюды не дакаціўся фронт. Гэта была вялікая перамога партызан.

Але тады нам не паменшыла, а прыбавілася работы. Пад нашскам нашых войск фашысты патокамі хлынулі па ўсіх дарогах на захад, і мы мініравалі гэтыя дарогі — шляхі адходу гітлераўцаў.

Так ішоў атрад «Сокал» перад адступаючымі фашысцкімі войскамі, яшчэ доўга дапякаючы ім у Віцебскай, Мінскай, Маладзечанскай абласцях. З Чырвонай Арміяй мы злучыліся ў Бягомльскім раёне.

З успамінаў І. Емяльянава, былога партызана, жыхара в. Сваташыцы

У ліпені сорак першага мы, хлопцы з вёскі Пасуддзева, звярнуліся да начальніка разведкі аднаго з палкоў абараняўшайся тут 18-й дывізіі з просьбай узяць нас добраахвотнікамі ў дзеючую армію. Нам адмовілі, але параілі збіраць зброю, боепрыпасы і рыхтавацца стаць партызанамі.

Так мы і дзейнічалі. Пасля бою пад в. Барадзіно мы зрабілі туды два паходы і падабралі два ручныя кулямёты, 10 вінтовак, шмат патронаў і гранат. Усё надзейна схавалі.

Пазней і да правалу дубровенскай падпольнай арганізацыі мы падтрымлівалі сувязь з яе кіраўнікамі С. С. Максіменкам і А. П. Кудрашовым, якія мелі ў Пасуддзеве явачныя кватэры, выконвалі розныя даручэнні падпольшчыкаў. Мы — гэта я і мой брат Фама, Мікалай Раскоша, Мікалай Петрачэнка і Барыс Петрачэнка. У 1943 годзе мы ўсе пайшлі ў партызаны, я трапіў у 124-ы атрад брыгады М. І. Кітаева: якая ў асноўным дзейнічала на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Але лясныя байцы гэтай брыгады заходзілі і ў нашу мясцовасць, разганяючы паліцэйскія гарнізоны, чым і тлумачыцца тое, як аказаўся я ў іх радах. Дадам, што там было нямала моладзі з Цівіліцкага (цяпер Малабахаўскага), Дабрынскага, Зарубскага сельсаветаў.

Дубровеншчына стала для іх родным домам

У 1942 г. Андрэя Іванавіча Белесава пасля спецыяльнай падрыхтоўкі накіравалі за лінію фронту. Так ён, даваенны старшыня калгаса, стаў інструктарам Мінскага падпольнага абкома партыі. Агітатарскім словам ён узнімаў людзей на барацьбу, умацоўваў веру ў перамогу.

Пасля вайны ў ліку 30-тысячнікаў ён быў пасланы на ўмацаванне калгасаў і трапіў у наш раён. Яму дастаўся калгас «Праўда», які ён здолеў паставіць на ногі. Так і застаўся на Дубровеншчыне Андрэй Іванавіч, хоць яго радзіма — вёска Лескавічы Шумілінскага раёна. Напамінак аб пражытым і перажытым — узнагароды ваенных і мірных дзён.

Нядаўна памёр Міхаіл Тарасавіч Піменаў, былы камісар партызанскага атрада «Прагрэс» брыгады Аляксея Данукалава. У адным з баёў, у час разгрому нямецкага гарнізона, камісар быў цяжка паранены і адпраўлены за лінію фронту. Ураджэнца в. Лобачы Віцебскага раёна ў нашым раёне ўсе запомнілі як выдатнага педагога.

Дваццаць пяць гадоў адпрацаваў лясніцтвам Дубровенскага лясніцтва Аляксандр Мікітавіч Касцюковіч, родам з в. Унтальянка Барысаўскага раёна. А ў час вайны ён, чырвонаармеец-акружэнец, быў спачатку сувязным атрада нашых дэсантнікаў, затым партызанам у атрадзе імя Варашылава брыгады імя Шчорса. Камандаваў узводам.

Вось яшчэ адзін баец партызанскага палка Грышына — Міхаіл Сямёнавіч Засценскі, родам з в. Крапіўна, што на мяжы з Дубровенскім раёнам. Потым ён добраахвольцам пайшоў на фронт і ў саставе 331-й дывізіі дайшоў да Балтыйскага мора. Цяпер жыве ў Асінторфе.

Жыве ў вёсцы Зарубы ўсімі паважаны чалавек Мікалай Фаміч Рандарэвіч, ураджэнец г. Докшыцы Віцебскай вобласці. Дзесяткі гадоў прысвяціў ён шафёрскай прафесіі. А ў час вайны Мікалай Рандарэвіч быў партызанам 1-й Антыфашысцкай брыгады. Гэта — у 14 гадоў. Але ў Полацка-Лепельскай партызанскай зоне такіх было нямала. І яму не раз даводзілася рызыкаваць сваім жыццём. Таму медалі

«Партызану Вялікай Айчыннай вайны» і «За адвагу» трэба лічыць цалкам заслужанымі.

Надзея Захараўна Крыкс, якая жыве цяпер на Дубровеншчыне, родам з Пскоўскай вобласці. Маладой дзяўчынай стала партызанкай атрада імя Фрунзе Сталінскай брыгады № 1, якая дзейнічала на мяжы РСФСР, Беларусі і Латвіі. Была ў спецпадрыўной групе. У лютым 43-га стала партызанкай атрада імя Чкалава. У час блакады была паранена, пасля лячэння працавала пісарам, радысткай. Пасля вызвалення ўсходняй часткі Дубровенскага раёна ўдзельнічала ў стварэнні раённых органаў кіравання. Часовы цэнтр раёна быў тады ў в. Салаўі. Надзея Захараўна мае баявыя і мірныя ўзнагароды.

Са снежня 1942 па ліпень 1944 года прайшоў баявы шлях з партызанскай брыгадай імя Варашылава Павел Васілевіч Герасімаў з Гарадокскага раёна. Быў надавым, затым палітруком узвода. Брыгада вызначалася дзёрзкасцю ў налётах на вражыя гарнізоны, дыверсіях, і Павел Герасімаў удзельнічаў у многіх аперацыях, быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У 1946 годзе пераехаў на Асінторф, дзе жыве і цяпер. Працаваў на торфапрадпрыемстве.

У Дуброўне многія ведаюць Ядвігу Браніславаўну Гаўрылаву. А родам яна з вёскі Пляшкі Лепельскага раёна. У час вайны ўся іх сям'я — яна, два браты, бацька і маці — былі ў партызанах.

Акружэнне, палон, уцёкі — усё зведаў юнак з вёскі Мяхінічы Талачынскага раёна Андрэй Кулеш. А потым быў партызанскі атрад «Навальніца», у якім Андрэй быў актыўным байцом. Пасля вызвалення раёна нейкі час працаваў старшынёй калгаса ў роднай вёсцы, затым быў прызваны ў дзеючую армію. З 1954 года асеў у Асінторфе, дзе жыве і цяпер.

Ганна Трафімаўна Мінаева з Талачыншчыны на Асінторф прыехала ў 1933 годзе і працавала тут брыгадзірам на сушцы торфу. Затым з мужам паехалі ў нанава ўтвораную Беластоцкую вобласць. Вайна змусіла вярнуцца яе з двума маленькімі дзецьмі ў родныя мясціны. Дзяцей схавала ў родзічаў, а сама стала партызанкай брыгады Гудкова. Яна выконвала спецыфічныя разведвальныя заданні. Пасля вайны працавала тэлефаністкай, на іншай рабоце. Жыве ў Асінторфе.

...І зноў мы вяртаемся да партызанскай брыгады К. С. Заслонава. У яе саставе мужна змагаўся з ворагам ураджэнец в. Рубашкіна Аршанскага раёна Мікалай Прохаравіч Кавалеўскі. Ён быў разведчыкам, падтрымліваў сувязь з падпольшчыкамі, распаўсюджваў лістоўкі, агітаваў насельніцтва ісці ў партызаны. Адна цікавая дэталь: маладому і адважнаму Мікалаю Кавалеўскаму даручылі прыводзіць у выкананне партызанскі прысуд над прыслужнікамі ворага, якія вызначыліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да мірнага насельніцтва. І Мікалай выконваў гэтыя заданні.

У пасляваенныя гады Мікалай Прохаравіч доўга працаваў на Дубровеншчыне дырэктарам саўгаса імя Ю. Смірнова, на іншых пасадах і да баявых узнагарод прыбавіў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. М. П. Кавалеўскага ўжо няма сярод жывых, але дубровенцы добра памятаюць яго.

Ф. Кулакоў.

Пачатак вызвалення

...Ішоў 1943 год — год карэннага пералому на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Адначасова з наступленнем на Украіне савецкія войскі разгарнулі наступальныя аперацыі на цэнтральным участку савецка-германскага фронту.

Ушчэнт разграміўшы адну танкавую, адну матарызаваную і 5 пяхотных дывізій, нанёсшы паражэнне яшчэ 3 танкавым і 11 пяхотным дывізіям ворага, войскі Заходняга і Калінінскага франтоў у пачатку кастрычніка 1943 года выйшлі на ўсходнія граніцы Беларусі.

БАІ ЗА ЛЯДЫ

Перад войскамі правага крыла Заходняга фронту была пастаўлена задача: прарваць магутную абарону праціўніка, выйсці да Дняпра, разграміць варожую групоўку ў раёне Дуброўна—Орша, адкрыць шлях Чырвонай Арміі ў цэнтральныя раёны Беларусі.

Для выканання гэтай задачы камандаванне Заходняга фронту стварыла ўдарную групоўку ў складзе 10-й гвардзейскай, 21-й і 33-й армій, якая павінна была наступаць з рубяжа Ляды—Леніна—Дрыбін у напрамку на Дуброўна—Горкі і разграміць нямецка-фашысцкія войскі ў раёне Оршы.

Сур'ёзнай перашкодай на гэтым шляху была не шырокая, але з глеістым дном і забалочанай поймай рака Мярэя. Тут вораг стварыў сістэму абароны ў некалькі эшалонаў, з безліччу дотаў і дзотаў, самых розных умацаванняў. Кожны нават самы невялікі населены пункт быў ператвораны ў моцны вузел супраціўлення.

Адной з першых уступіла на тэрыторыю Дубровенскага раёна 10-я гвардзейская армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта А. В. Сухамліна. 28 верасня яе 65-я і 85-я гвардзейскія дывізіі прарвалі рубеж абароны ворага і ноччу авалодалі пасёлкам Красны. Да канца дня наступаючыя войскі арміі падышлі да ракі Мярэя. Лявей, на стыку Дубровенскага і Горацкага раёнаў наступалі 21-я і 33-я арміі, правей — 31-я.

Найбольш упартае супраціўленне аказваў праціўнік войскам 10-й арміі, наступаўшым на Ляды. Вось выпіска з журнала баявых дзеянняў яе 30-й гвардзейскай дывізіі: «Наступленне пачалося ноччу на 30 верасня сіламі 96-га і 94-га гв. палкоў 30-й гв. дывізіі, якія, пераадольваючы варожы заграджальны агонь, пераправіліся праз рэчку Мярэю і павялі наступленне на паўднёвую ўскраіну мястэчка Ляды. Завязаўся кровапралітны бой. Раніцой наступнага дня пасля магутнай артпадрыхтоўкі праціўнік прадпрыняў контратаку з паўднёва-ўсходняй ускраіны м. Ляды. Не маючы сродкаў падавіць агонь гітлераўскіх артылерыйскіх батарэй, наша пяхота 94-га, 96-га гв. стр. палкоў, панёсшы вялікія страты, не здолела адбіць атаку ворага і пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка адышла назад на ўсходні бераг ракі Мярэі».

Між тым, у аператыўнай зводцы Саўінфармбюро 30 верасня Ляды былі названы ў ліку ўжо вызваленых населеных пунктаў.

Пасля такога паведамлення камандаванне арміі, не лічачыся з абставінамі, зноў кінула 1 кастрычніка часці 30-й дывізіі ў наступленне, якія цаной вялізных страт фарсіравалі Мярэю. Вораг двойчы атакаваў, стараючыся адкінуць нашу пяхоту, назад за раку, але яго контратакі былі адбіты, нашы ўтрымлівалі адваяваны плацдарм.

У наступныя дні паўтаралася прыкладна тая ж гісторыя: нашы падымаліся ў

Наступленне на м. Ляды.

атаку, але поспехі былі нязначныя. Толькі ноччу з 7 па 8 кастрычніка праціўнік пад ударамі нашых часцей пачаў адыходзіць з Лядоў на захад. Праследуючы ворага і знішчаючы яго ар'ергардныя групы, 98-ы полк авалодаў паўночнай часткай мястэчка і в. Кроцікі, 96-ы полк выбіў гітлераўцаў з паўночна-ўсходняй ускраіны в. Страхі, а 94-ы полк авалодаў паўднёвай часткай Лядоў і выйшаў у раён в. Холбні.

Але на рубяжы вёсак Буда — Холбня — Страхі праціўнік замацаваўся і затрымаў рух нашых часцей. Спробы сходу выбіць яго скончыліся ня ўдачай. Баі за Ляды насілі выключна жорсткі характар.

Усё ж фашысты не вытрымалі, пакінулі мястэчка. У Лядах гітлераўскія вылюдкі закатавалі і расстралялі каля 1200 мірных жыхароў. І савецкія воіны кляліся бязлітасна помсціць ворагу, нішчыць і гнаць яго з нашай зямлі.

НА ЦЭНТРАЛЬНЫМ НАПРАМКУ

Акрамя войск 10-й гвардзейскай арміі, у кастрычніку — лістападзе на тэрыторыі Дубровенскага раёна гераічна змагаліся воіны 68-й, 31-й, 21-й і 33-й армій.

30 верасня Ваенны Савет Заходняга фронту дакладваў у Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання сваё рашэнне аб далейшым вядзенні наступлення. У ім падкрэслівалася, што праціўнік прымае ўсе меры, каб спыніць войскі фронту на загадзя падрыхтаваным рубяжы на заходнім плацдарме Мярэі і на правым беразе Дняпра. Ваенны Савет намячаў у першай палове кастрычніка фарсіраваць Днепр і прыступіў да ажыццяўлення задуманага.

З кастрычніка пасля кароткай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі галоўная групоўка фронту ў складзе 31-й, 21-й, 68-й і 33-й армій павяла наступленне ў напрамку Оршы. Баі насілі крайне жорсткі характар. Каб стрымаць савецкія войскі, гітлераўскае камандаванне паспешна перакінула на аршанскі напрамак пяхотныя і танкавыя злучэнні з іншых участкаў усходняга фронту, усімі сіламі стараючыся ўтрымліваць аўтамагістраль і чыгунку Мінск — Масква і раку Днепр.

Уздоўж Дняпра наступала 68-я армія. Часці яе 159-й дывізіі пераправіліся цераз Мярэю, нечаканым ударам выбілі немцаў з некалькіх населеных пунктаў і замацаваліся там.

Аднак, апамятаўшыся, немцы перайшлі ў контрнаступленне, і на беразе Дняпра разгарнуліся жорсткія баі. У ярасных паядынках з фашыстамі нашы байцы і камандзіры праявілі ўзоры адвагі і мужнасці. Аб гэтых баях праўдзіва і цікава расказвае былы камандзір 159-й стралковай дывізіі генерал-маёр Н. В. Калінін у кнізе «Гэта ў сэрцы маім назаўсёды».

Бессмяротны подзвіг здзейсніў тут старшы лейтэнант Міхаіл Весялоў. У час адной варожай контратакі выйшаў са строю ўвесь разлік супрацьтанкавай гарматы. Але яна не змоўкла. Застаўшыся адзін, паранены Весялоў працягваў весці агонь, ва ўпор расстрэльваючы варожую пяхоту, якая ў чацвёрты ўжо раз падымалася ў контратаку. Немцам удалося ўварвацца на нашы пазіцыі, яны імкнуліся захапіць афіцэра жывым. Да Весялова падскочыў здаравенны фашыст і, схапіўшыся, яны паваліліся на зямлю. У гэты час другі гітлеравец ударыў Весялова нажом у спіну. Смяртэльна паранены, старшы лейтэнант сабраў апошнія сілы і зубамі ўчапіўся ў глотку фашыста. Так, паміраючы, Міхаіл Весялоў знішчыў яшчэ аднаго гітлераўца.

У баях за вызваленне нашага раёна і Беларусі геройскі праявілі сябе дзяўчаты-снайперы. Яны прыбылі з падмаскоўнага горада Падольска і ў баявых справах ні ў чым не ўступалі воінам-юнакам. Найбольшы асабісты рахунак быў у Веры Шарснёвай, Валі Саламонавай і Дусі Аленінай. Пазней многія з іх былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Але і іх не мінавала цяжкая доля вайны. Так, па сцвярджэнню камандзіра дывізіі Н. В. Калініна, з 25 дзяўчат, якія прыбылі ў дывізію ў пачатку наступальных баёў у Беларусі, да Усходняй Прусіі дайшлі толькі сямёра.

Цяжкія кровапралітныя баі ўдарнай групоўкі на цэнтральным напрамку Заходняга фронту ў кастрычніку 1943 года не прынеслі жаданых вынікаў. Кожны кіламетр вызваленай беларускай зямлі даваўся з неймавернымі цяжкасцямі, цаной вялікіх страт.



1-ы стралковы батальён 254-га сп імя А. Матросава. Загад на наступленне. 14 лістапада 1943 г.

НА ПРАВЫМ ФЛАНГУ ЦЭНТРАЛЬНАГА НАПРАМКУ

У кастрычніку 1943 года да межаў Дубровенскага раёна на правы фланг цэнтральнага напрамку Заходняга фронту падышлі злучэнні 31-й арміі і завязалі баі на правым беразе Дняпра і ўздоўж чыгункі і аўтамагістралі Мінск—Масква. 16 кастрычніка пасля аднагадзіннай артылерыйскай падрыхтоўкі і бомбавага ўдару штурмавой авіяцыі дывізіі арміі перайшлі ў наступленне ў раёне Засценкі—Шухаўцы—Карумны. Войскі арміі былі зняслены шматдзённымі і бесперапыннымі наступальнымі баямі на тэрыторыі Смаленшчыны. 20 кастрычніка на дапамогу ім падышло падмацаванне — другі гвардзейскі Тацынскі танкавы корпус.

Уздоўж чыгункі і аўтамагістралі наступала 88-я стралковая дывізія. Вораг падцягнуў сюды свежыя сілы і ўпарта супраціўляўся на кожнай вышыні, на кожным выгадным рубяжы ў населеных пунктах. Асабліва добра быў умацаваны апорны пункт на вышыні 202 каля вёскі Засценкі. Толькі 21 кастрычніка пасля моцнай артпадрыхтоўкі і ўдара авіяцыі па вышыні нашы войскі здолелі прарваць тут умацаваны абарончы рубеж праціўніка. Было захоплена ў палон больш сотні варожых салдат і афіцэраў. Аднак і нашы часці панеслі вялікія страты.

У паласе наступлення дывізіі праціўнік увёў у дзеянне 26-ю пяхотную, а затым 25-ю матарызаваную дывізію, якая вызначалася вялікай упартасцю, жорсткасцю ў абароне і неаднаразова пераходзіла ў контрнаступленне.

У час адбіцця адной з чарговых контратак быў паранены камандзір дывізіі палкоўнік Буланаў. У самы разгар ярасных контратак гітлераўцаў камандаванне дывізіяй прыняў палкоўнік Калтуноў.

На працягу кастрычніка часці дывізіі неаднаразова аднаўлялі наступленне і, пераадольваючы ўпартае супраціўленне праціўніка, ва ўзаемадзеянні з іншымі злучэннямі 31-й арміі наносілі ворагу адчувальныя ўдары, выцясняючы яго з займаемых рубяжоў.

Асабовы склад дывізіі паказваў цуды гераізму ў гэтых баях. Рашуча і храбра біліся з ворагам воіны падраздзяленняў капітанаў Рудыкіна і Касумава.

Побач з мужчынамі змагаліся і воіны-дзяўчаты. Вялікай павагай і славай карысталася ў дывізіі лейтэнант Ганна Нікандрава. Пра гэты перыяд яе жыцця з цеплынёй расказвае былы камандзір узвода 758-га стралковага палка, у якім служыла Нікандрава, С. П. Мінін: «Калі Ганна ішла па пярэдняму краю абароны, усе салдаты падцягваліся, нібы пераўтвараліся і гаварылі адзін другому: «Наша Аня ідзе». Гэта была смелая да дзёрзкасці, адважная і храбрая камсамолка. За баявыя подзвігі яна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені».

Санітарка, камсамолка Таццяна Абрамава за дзень аказала першую медыцынскую дапамогу 32 байцам і вынесла іх з поля бою са зброяй. А калі ствараласа напружаная абстаноўка, яна з аўтаматам у руках дапамагала байцам адбіваць контратакі фашыстаў. Бясстрашная дзяўчына-санітарка была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

За паўмесяца цяжкіх баёў у кастрычніку 1943 года 88-я дывізія ў саставе 31-й арміі вызваліла некалькі населеных пунктаў Дубровенскага раёна і замацавалася на рубяжы Кіраёва—Германы, перайшоўшы да абароны.

НА МІНСКАЙ ШАШЫ

Пасля вызвалення Лядоў 30-я гвардзейская дывізія 10-й гвардзейскай арміі не змагла далёка прасунуцца наперад, зняслеяная наступальнымі баямі. Яе змянілі іншыя дывізіі, але і яны дайшлі толькі да в. Каз'яны. Тут вораг заняў загадзя падрыхтаваную абарону і наша далейшае наступленне на гэтым участку фронту наогул захліснулася. Савецкія войскі замацаваліся на дасягнутых рубяжах.

Камандаванне прыняло рашэнне прарваць нямецкую абарону на поўнач ад Мінскай магістралі. Тут чыгунка Смаленск—Шухаўцы і Мінская шаша пры ўмове іх аднаўлення забяспечвалі падвоз да фронту ўсяго неабходнага.

Ударную групоўку для выканання задуманага павінны былі скласці 10-я гвардзейская армія, якая разгарнулася на поўнач ад чыгункі і шашы, і 31-я армія, заняўшая пазіцыі з паўднёвага боку шашы.

І зноў нашым ударным сілам трэба было вырашыць задачу неверагоднай цяжкасці: вораг, што стаяў перад імі, меў 11—14 ліній траншэй, эшаланіраваных у глыбіню на 20—25 кіламетраў, прыкрытых 6—7 радамі дротавых загараджэнняў рознага тыпу і амаль суцэльнымі супрацьтанкавымі рвамі і міннымі палямі. Камунікацыі праціўніка дазвалялі не толькі добра забяспечваць войскі, а нават выкарыстаць бронепаязды. Найбольш важныя ўчасткі ўтрымлівала 78-я штурмавая пяхотная дывізія любімага генерала Гітлера, «майстра абароны» генерал-лейтэнанта Траута. 16 000 галаварэзаў гэтай дывізіі былі ўзброены да зубоў і гарэлі жаданнем апраўдаць надзеі і выканаць загад фюрэра: раз і назаўсёды спыніць тут наступленне рускіх. Яшчэ моцнымі і не вельмі бітымі былі і іншыя злучэнні ворага.

Вось чаму баі 10-й арміі тут прынялі адразу такі жорсткі і кровапралітны характар, які дагэтуль быў невядомы нават бывалым воінам.

Раніцой 14 лістапада 1943 года пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі 30-я, 85-я і 56-я гвардзейскія стралковыя дывізіі гэтай арміі атакавалі праціўніка. У суправаджэнні вогненнага вала нашы батальёны авалодалі першай траншэяй гітлераўцаў, але далейшы іх шлях перагарадзіў супрацьтанкавы роў шырынёй да 6 і глыбінёй да 4 метраў, запоўнены вадой. Да таго ж старанна замаскіраваны сеткамі, жардзінамі і голлем, парослы травой і прыстраляны варожай артылерыяй, ён стаў каварнай пасткай не толькі для нашых танкаў, але і для пяхоты, хоць наступальны парыў быў вельмі моцны.

Толькі ў тры гадзіны апоўдні ўдалося пераадолець перашкоду і авалодаць буйным апорным пунктам праціўніка ў в. Новае Сяло.

Аб жорсткіх баях тых дзён успамінаюць многія, каму давялося ў іх удзельнічаць.

У сваёй кнізе «Храбрыя сэрцы аднапалчан» былы камандзір батальёна, затым вядомы военачальнік І. М. Трацяк піша: «Цяжкімі былі баі на аршанскім напрамку на магістралі Масква—Мінск у лістападзе—студзені 1943 года ...Атакі змяняліся контратакамі немцаў, невялікія сёлы і хутары па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі, у стралковых ротах заставалася па 10—12 чалавек асабовага складу».

А само змаганне на ўсім гэтым участку фронту можна было назваць сапраўдным пабоішчам і па жорсткасці, і па маштабнасці. Безліч трупаў валялася на палях, плавала ў азёрах і рэках. Фашысты дайшлі да таго, што ўзводзілі на траншэях брустверы... з трупаў.

Так, гітлераўцы абаранялiся з адчайнасцю асуджаных. Прарваць глыбока эшаланіраваную абарону немцаў на аршанскім напрамку 10-я гвардзейская армія так і не здолела, прасунуўшыся цаной вялікіх страт усяго на 6—8 кіламетраў. Па рашэнню камандавання Заходняга фронту 5 снежня 1943 года 10-я армія спыніла баявыя дзеянні і была перададзена 2-му Прыбалтыйскаму фронту.

ЗА КОЖНЫ НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ

У канцы кастрычніка Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання правяла перагрупоўку сіл. 24 кастрычніка камандаванне 5-й арміі прыняў генерал-лейтэнант Мікалай Іванавіч Крылоў. У гэты час большая частка войск 68-й арміі была перададзена ў 5-ю армію, састаў якой у сувязі з гэтым амаль поўнасцю абнавіўся. Яна мела два стралковыя корпусы — 72-і і 81-ы.

72-м корпусам камандаваў генерал-маёр Ю. М. Пракоф'еў (159-я, 174-я і 192-я стралковыя дывізіі), 81-м корпусам — генерал-маёр А. К. Іваноў (95-я і 199-я стралковыя дывізіі).

Часці 72-га стралковага корпуса наступалі ўздоўж Дняпра ў напрамку Дуброўны. 159-я дывізія гэтага корпуса, фарсіраваўшы раку Расасенку, авалодала вёскай Расасна і адагнала непрыяцеля кіламетра на паўтара ад яе. Як і ўсюды, баі тут насілі жорсткі характар. Выключны гераізм у баях пад Расасна праявілі воіны 491-га стралковага палка — камандзір мінамётнага разліку Аўрам Ярмілавіч Кажаеў і яго сын Іван. Аўрам Кажаеў абараняў Маскву, змагаўся пад Сталінградам, дзе загінуў яго старэйшы сын Мікалай. Цяпер наводчыкам у яго разліку быў малодшы сын Іван.

Пры адбіцці жорсткай контратакі гітлераўцаў пад вёскай Расасна ў разгар бою перарвалася сувязь з назіральным пунктам. Каб аднавіць пашкоджаную лінію, адзін за другім пайшлі наперад два сувязісты, але абодва загінулі пад разрывамі снарадаў. Тады Аўрам Ярмілавіч паслаў на лінію сына. Каля таго месца, дзе кабель быў перабіты, Іван тварам у твар сутыкнуўся з фашысцкім аўтаматчыкам. Націснуўшы на курок свайго аўтамата, Кажаеў апярэдзіў гітлераўца на нейкую долю секунды. Злучыўшы кабель, воін вярнуўся на пазіцыю. Сувязь зноў дзейнічала. Пазней за гэты мужны ўчынак бацька і сын Кажаевы былі ўзнагароджаны медалямі «За адвагу».

А тады, пад Расасна, ім давялося вытрымаць яшчэ адно выпрабаванне. Немцы, страціўшы выгадную вышыню, перайшлі ў контрнаступленне. Яны пацяснілі першы батальён палка, кулямётным агнём прыціснулі яго да зямлі. Але тут загаварыў Кажаеўскі мінамёт, і кулямёт фашыстаў змоўк. Тым часам да мінамёта наблізілася група нямецкіх аўтаматчыкаў. Бацька і сын гранатамі адбіліся ад фашыстаў. Дзесьці заскрыпеў шасціствольны нямецкі мінамёт. Да Кажаевых прыбег сувязны ад камбата:

— Дапамажы, сяржант, задушы праклятую «скрыпку»... Квадрат — 20-32.

І Кажаеў ужо дае каманду. Не стала яшчэ адной агнявой кропкі праціўніка. Яна была знішчана трэцяй мінай. Нашы падраздзяленні рынуліся ў атаку. Да вечара вышыня 198,5 была ўзята. За гэты бой абодва Кажаевы былі ўдастоены ордэнаў Славы III ступені.

Камандуючы 5-й арміяй М. І. Крылоў сказаў пра Кажаевых: «Старшы сяржант Аўрам Ярмілавіч Кажаеў, высокі статны рускі волат, быў ветэранам палка, кавалерам ордэна Славы. Мінамётчыкам, як і бацька, стаў таксама Іван Аўрамавіч Кажаеў. Ён быў такога ж волатаўскага складу і таксама паспеў удастоіцца ордэна Славы».

У баях на заходнім беразе Расасенкі 17 лістапада 1943 года бессмяротны подзвіг здзейсніў наводчык гарматы 1330-га знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка Аляксей Рыгоравіч Махнёў са Свярдлоўскай вобласці.

Байцы разліку гарматы стрымлівалі атаку 200 салдат праціўніка з танкамі. Усе загінулі ці былі паранены. Застаўшыся адзін, таксама паранены, Аляксей Махнёў працягваў весці агонь з гарматы і знішчыў дзесяткі гітлераўцаў. За гэты подзвіг Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 сакавіка 1944 года яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

А баі прымалі зацяжны характар з выматваннем ваюючымі бакамі адзін аднаго, з атакамі і контратакамі.

БОЙ ЗА ПЕРАПРАВУ І ВЫШЫНЮ 180,8

Нашы войскі вызвалілі вёску Расасна. Але далей на шляху наступаючых стала вышыня 180,8, якая была ператворана праціўнікам ва ўмацаваны пункт і панавала над усім гэтым раёнам. Сканцэнтраваўшы на ёй значныя агнявыя сродкі, гітлераўцы трымалі бераг Дняпра і пераправы пад агнём сваёй артылерыі, мінамётаў і кулямётаў.

Перад камандзірам 72-га стралковага корпуса генерал-маёрам Ю. М. Пракоф'евым паўстала неадкладная задача — збіць праціўніка з вышыні 180,8 і адкінуць яго як мага далей ад пераправ цераз Днепр. Для выканання гэтай задачы была ўведзена ў бой 174-я стралковая дывізія з задачай звароткна пераправіцца на левы бераг Дняпра, штурмам з поўначы авалодаць вышынёй і адкінуць праціўніка ад пераправы.

Карыстаючыся цемнатой, часці дывізіі рушылі ўздоўж Дняпра і к зыходу 24 кастрычніка былі ўжо ў пяці кіламетрах к захаду ад Расасна. Начальнік артылерыі 72-га стралковага корпуса палкоўнік В. А. Чарнета за ноч падцягнуў на гэты напрамак усе агнявыя сродкі.

У поўдзень 25 кастрычніка корпусная артылерыя адкрыла агонь па вышыні 180,8 і варожых пазіцыях за Дняпром. З супрацьлеглага берага ярасна адстрэльваўся праціўнік. А праз гадзіну ў гумавых лодках і на плытах пачало пераправу цераз Днепр адно з падраздзяленняў 174-й стралковай дывізіі. Гітлераўцы імкнуліся знішчыць жменьку смельчакоў, але пад градам куль і снарадаў нашы воіны плылі наперад. Многія з іх знайшлі смерць у халодных водах Дняпра, але тыя, хто дасягнуў процілеглага берага, імклівым ударам выбілі праціўніка з яго першых акопаў і занялі абарону. Пад прыкрыццём першай дэсантнай групы батальён, узмоцнены супрацьтанкавымі гарматамі, пераправіўся на процілеглы бераг і ў штыкавой атацы адкінуў гітлераўцаў да вышыні 180,8.

Вораг адзінаццаць разоў контратакаваў батальёны, якія пераправіліся, стараючыся скінуць іх назад у Дняпро. Цэлы тыдзень тут не спыняліся жорсткія баі. Зыход іх вырашыўся ноччу на 2 лістапада, калі падаспеўшыя 508-ы і 628-ы стралковыя палкі сумесна з 179-м асобным знішчальна-супрацьтанкавым дывізіёнам і 597-м артылерыйскім палком атакавалі вышыню.

У тыя дні стаяла непагадзь, дарогі ператварыліся ў суцэльнае месіва. Усё гэта, аднак, не перашкодзіла часцям 174-й стралковай дывізіі разам з 76-й стралковай дывізіяй суседняй арміі атакаваць 1 снежня ўмацаваны пункт немцаў пад вёскай Баброва, размешчаны ў двух кіламетрах на поўдзень ад вышыні 180,8. Каля гэтай вёскі баі ішлі ўжо не адзін дзень. Вораг аказваў упартае супраціўленне, наступаючыя войскі нашай 5-й арміі моцна парадзелі. Колькасць асабовага саставу ў дывізіях на канец лістапада далёка не адпавядала таму, што было прызначана па штату. Гэта намнога ўскладняла вырашэнне пастаўленай камандаванем задачы — узяць надзвычай старанна ўмацаваную вёску Баброва.

ЗА ВЁСКУ БАБРОВА

Вёскі, уласна, не было. На подступах да яе праціўнік стварыў шэсць ліній траншэй поўнага профілю, звязаных шматлікімі хадамі злучэнняў. Было таксама пабудавана шмат бліндажоў, на што пайшлі сялянскія хаты. Перад кожнай траншэяй немцы ўзвялі дротавыя загароды, перад імі размясцілі супрацьпяхотныя і супрацьтанкавыя мінныя палі. Уся мясцовасць прастрэльвалася нямецкімі кулямётамі, артылерыяй і мінамётамі.

Так, на паўночнай ускраіне вёскі немцы

абсталявалі 5 дзотаў, з поўдня — чатыры. У цэнтры — бетанаваныя, пакрытыя плітамі 120-міліметровай брані, сховішчы. Усе дзоты і доты былі таксама звязаны хадамі злучэння. На поўдзень ад вёскі знаходзіліся агнявыя пазіцыі 5—6 рэактыўных установак, танкі. Гарнізон варожага апорнага пункта складаўся з падраздзяленняў 18-й танкавай грэнадзёрскай дывізіі, 252-й пяхотнай дывізіі і 1-й мотабрыгады СС.

Храбра змагаліся нашы воіны. Адчайна супраціўляліся і гітлераўцы. Яны кідалі ў бой усё новыя і новыя падраздзяленні пры падтрымцы танкаў.

Нашы часці на асобных участках падтрымлівала самаходная артылерыя. У барацьбе з контратакуючымі танкамі і штурмавымі гарматамі праціўніка вялікую ролю адыгралі нашы бранябойшчыкі.

У цяжкіх баях, адціскаючы праціўніка і замацоўваючыся на займаемых рубяжах, нашы 1313-ы і 1315-ы стралковыя палкі да 17 лістапада авалодалі трыма лініямі варожых траншэй і ўварваліся на паўночную ўскраіну в. Баброва.

Праціўнік увёў у бой свежы пяхотны полк і асобныя падраздзяленні яшчэ аднаго палка. Але і гэта не дапамагло.

Надзейна ўтрымліваючы адваяваныя пазіцыі, нашы байцы па загаду камандавання часова спынілі наступальныя дзеянні і перайшлі да абароны, рыхтуючыся да новага наступлення.

30 лістапада пасля гадзіннай артпадрыхтоўкі 1313-ы і 1315-ы стралковыя палкі атакавалі цэнтральную частку Баброва. Першай уварвалася ў варожую траншэю стралковая рота старшага лейтэнанта Фралова. Вышыня была ўзята. Цяпер вораг ужо не мог утрымаць і вёску. 1313-ы і 1315-ы стралковыя палкі выйшлі на паўднёвую ўскраіну Баброва і замацаваліся. Але поспех дастаўся цаной вялікіх страт: баі за гэту вёску працягваліся амаль цэлы месяц.

З той жа жорсткасцю працягваліся баі ў раёне вёсак Казьяны, Валкулакава, Чырвоная Слабада.

Асабліва жорсткімі яны былі за авалоданне вёскай Чырвоная Слабада. Атакі і контратакі з абодвух бакоў следавалі адна за другой. Абодва бакі неслі вялікія страты.

ШЛА ДЫВІЗІЯ НАПЕРАД

У баях за вызваленне нашага раёна восенню 1943 года актыўны ўдзел прымала 220-я стралковая дывізія, якая, дарэчы, летам 1944 года першай увайшла ў Дуброўну.

А тады, 17 кастрычніка, раніцой, пасля артпадрыхтоўкі, дывізія трыма палкамі перайшла ў наступленне ў раёне аўтамагістралі Масква—Мінск і чыгункі. Моцным агнём праціўніка з боку станцыі Тухінь наступленне было прыпынена, але палкам дывізіі ўдалося замацавацца на ўсходніх схілах вышыні 199,0. Перад фронтам дывізіі абаранялася 197-я пяхотная дывізія ворага, вядомая звярынымі расправамі над мірным насельніцтвам і ваеннапалоннымі.

21 кастрычніка 220-я стралковая ўсё-такі прарвала варожую абарону на ўчастку вышыня 199,0 — Тухінь — Кіраёва і працягвала наступленне на фронце 800 метраў, адбіваючы па 8—10 контратак праціўніка за дзень. Кожны крок наперад патрабаваў ад нашых байцоў і камандзіраў мужнасці і сапраўднага гераізму.

Вось што успамінае маёр у адстаўцы В. І. Рагулін. Напярэдадні свята — 25-годдзя ВЛКСМ — быў моцны бой. У разгар яго ў варонку да Рагуліна ўскочылі два баявыя сябры — камсоргі Анатоль Крашаніннікаў і Барыс Глозман. Барыс сказаў: «Тут нас тры члены бюро камітэта камсамола палка. Давайце зацвердзім тэкст «Камсамольскай клятвы». Такая клятва была падрыхтавана і падпісана на полі бою больш чым 100 воінамі палка.

Камсамольцы і камуністы, усе воіны дывізіі з гонарам выканалі прысягу на вернасць Радзіме. У канцы кастрычніка дывізія дадаткова заняла і баявы ўчастак 251-й стралковай дывізіі. Цяпер перад яе фронтам знаходзіліся 119-я пяхотная і 25-я матарызаваная дывізіі праціўніка. Авіяцыя гітлераўцаў групамі па 10—15 самалётаў некалькі разоў штодня бамбіла вышыню 199,0, аўтамагістраль, вёскі Новая Зямля і Гічы. У жорсткіх баях многія нашы байцы і камандзіры загінулі смерцю храбрых. Сярод іх камандзір батальёна капітан А. Е. Паўленка, яго намеснік па палітчасці капітан М. Ф. Даніленка, сакратар камсамольскага бюро палка, кавалер ордэна Леніна капітан С. М. Сараканпуд, камандзір стралковай роты старшы лейтэнант Я. А. Глотаў. Усе яны былі пахаваны з воінскімі ўшанаваннямі ў брацкай магіле каля вёскі Кіраёва. Цяпер іх астанкі перапахаваны на мемарыяльным комплексе «Рыленкі», дзе знайшлі вечны спакой дзесяць тысяч нашых воінаў...

У канцы лістапада 1943 года на ўсіх участках баёў на тэрыторыі Дубровенскага раёна склалася такое становішча, што сіл для працягу наступлення нашых войск, у тым ліку і 220-й стралковай дывізіі, ужо не мелася, яны былі вымушаны ў пачатку снежня перайсці да абароны.

ЗІМА. ПАЗІЦЫЙНАЯ ВАЙНА

Такім чынам, у пачатку снежня 1943 года наступленне нашых войск на ўсім участку фронту, пралягаючаму па тэрыторыі Дубровенскага раёна, было прыпынена. Праціўнік замацаваўся на доўга дзеючым умацаваным рубяжы па лініі: Асінторф—Сляпні — на захад ад вёсак Пушчаі, Кіраёва — адзнакі 188,1 і 188,4 — заходнія ўскраіны вёсак Германы, Загваздзіна, Чырвоная Слабада, Каз'яны — заходні бераг р. Расасенка — Коршыкава — Лапіроўшчына — заходні бераг р. Мярэі.

За тры месяцы бесперапынных кровапралітных баёў савецкія войскі вызвалілі значную частку нашага раёна, захапілі больш выгадныя рубяжы.

Бліндаж 3-га батальёна 220-й дывізіі. Вясна 1944 г. Фотамантаж.

Былы камандзір 123-га стралковага палка 62-й стралковай дывізіі палкоўнік В. П. Слаўноў успамінае, што пачалася барацьба з новым ворагам: з лютай сцюжай, снежнай стыхіяй. Замяло дарогі. Падвод хапала толькі на тое, каб падвозіць боепрыпасы, прадукты і паліва для кухняў. Зямлянкі ж абагравалі торфам, дастаўляючы яго ноччу з нейтральнай паласы на плашч-накідках, а то нават і толам. Цяжка было салдатам на баявых пастах. Для іх ствараліпункты абагрэву, але іх не хапала, бо ў многіх населеных пунктах не ўцалела ніводнага будынка.

Але нашы мужныя воіны не давалі ворагу спакою. Артылерысты білі па нямецкіх зямлянках, а начамі нашы сапёры сістэмай прыстасаванняў падкатвалі да нямецкіх акопаў і траншэй мінныя ўзрыўныя зарады і рвалі ўсё, што траплялася на шляху.

Паспяхова дзейнічалі і снайперы. У іх рады падбіралі самых выносліВых, знаходлівых, смелых байцоў. Так, толькі на дубровенскай зямлі Павел Лыткін знішчыў больш за 90, а Мікалай Епішын — больш за 40 гітлераўцаў.

Займаліся сваімі справамі разведчыкі. Днём яны назіралі, выбіралі аб'екты пошуку, а ноччу дзейнічалі, утрымліваючы немцаў у страху, на холадзе. Пазіцыйная вайна была зацятая, упартая. Гэта была вайна на выпрабаванне волі, вытрымкі, загартоўкі.

СПРОБА СІЛ

5 сакавіка 1944 года пачалося наступленне войск 31-й арміі. У раёне вёскі Пятрыкі пасля прарыву нямецкай абароны ў бой былі ўведзены часці першага эшалона 220-й стралковай дывізіі. Другая і трэцяя лініі траншэй ворага пераходзілі некалькі разоў з рук у рукі, батальёны неслі вялікія страты... Напрыклад, у роце старшага лейтэнанта Афанасьева засталося ўсяго некалькі байцоў.

Да 12 сакавіка воіны 220-й стралковай дывізіі працягвалі жорсткія баі за ўтрыманне раней захопленых варожых траншэй. Даходзіла да таго, што нашым камандзірам даводзілася выклікаць агонь на сябе нашай артылерыі, рэактыўных мінамётаў. За час сакавіцкіх баёў дывізіяй было знішчана 700 гітлераўцаў, разбіта і захоплена значная колькасць баявой тэхнікі.

Дарога на перадавую. Вясна 1944 г.

Адначасова з 220-й 5 сакавіка перайшла ў наступленне 331-я стралковая дывізія. Яе 1108-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка М. М. Каралеўскага атакаваў гітлераўцаў у раёне в. Новае Сяло і пасля цяжкіх баёў здолеў заняць толькі першую і другую лініі траншэй праціўніка. У суседзяў наступленне развівалася яшчэ менш паспяхова. У гэтых баях геройскай смерцю загінуў камандзір палка, які пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Яго імя выбіта на мармуровай пліце ля сцен Смаленскага крамля.

Вялікую адвагу праявілі многія воіны гэтай дывізіі. Так, кулямётчыкі Самандараў і Блынскі пад падбітымі на нейтральнай паласе варожымі танкамі абсталявалі агнявыя пазіцыі, у час баёў вялі прыцэльны кулямётны агонь і садзейнічалі нашым падраздзяленням у заняцці трох нямецкіх траншэй. За час баёў 8—10 сакавіка яны знішчылі да сотні гітлераўцаў.

УДАРЫ З ПАВЕТРА

Актыўна падтрымлівалі наступленне савецкіх войск на Заходнім, а затым на 3-м Беларускім франтах лётчыкі 1-й паветранай арміі, наносячы удары па чыгуначных станцыях, артылерыйскіх пазіцыях, аэрадромах, танкавых часцях, скапленнях жывой сілы праціўніка. 167 лётчыкам і штурманам гэтай арміі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а 17 з іх удастоіліся гэтага звання двойчы. Служылі і змагаліся у гэтай арміі і нашы дубровенцы-землякі — лётчык Сцяпан Васілевіч Свойнікаў, механік самалётаў Сяргей Ільіч Ротманаў, браты Васіль, Аляксандр і Вячаслаў Зверавы з в. Парфенкава. Старэйшы, Васіль, быў лётчыкам-знішчальнікам, малодшыя — авіяцыйнымі спецыялістамі.

Васіль Глебавіч Звераў скончыў вайну камандзірам эскадрыллі. Ён зрабіў 170 баявых вылетаў. Асабіста і ў групавых баях збіў 9 варожых самалётаў, быў узнагароджаны чатырма ордэнамі і шасцю медалямі.

30 лістапада 1943 года ў раёне вёскі Шабаны подзвіг капітана Гастэлы паўтарыў лётчык Віктар Харламаў. Вось што ўспамінае Я. А. Залозны, які быў сведкам гераічнага ўчынку В. П. Харламава: «Мне давялося быць з ім разам у гэтым баі. Нашы «ІЛ-2» вялі штурмоўку вялікага скаплення фашысцкіх танкаў і аўтамашын з боепрыпасамі, гаручым, а таксама жывой сілай праціўніка. Мы паўтаралі адну атаку за другой, як раптам з-за воблакаў на нас нечакана зваліліся шэсць варожых знішчальнікаў. Завязаўся жорсткі паветраны бой на малой вышыні. Сілы былі няроўныя, манеўранасць фашысцкіх знішчальнікаў пераўзыходзіла нашы магчымасці. У гэтым баі яны падпалілі штурмавік Віктара Харламава. Рэзкім слізганнем пілот спрабаваў збіць полымя са свайго самалёта, але не змог. Тады, выканаўшы разварот, Віктар крыкнуў па рацыі: «Іду на таран. Бывайце, сябры!» — і накіраваў свой самалёт на варожыя цыстэрны з гаручым...».

Цяпер у пасёлку Асінторф стаіць помнік лётчыку-герою, адна з вуліц носіць яго імя.

У саставе 1-й паветранай арміі ў небе Дубровеншчыны змагаўся славуты полк «Нармандыя-Ньёман».

У адным самалёце на дубровенскай зямлі загінулі савецкі і французскі лётчыкі гэтага палка С. М. Астахаў і Бруна дэ Фальтана. Іх подзвіг увекавечаны на плітах мемарыяльнага комплексу «Рыленкі».

М. Шкадаў, Ф. Кулакоў.

Дакументы сведчаць

СА ЗВАРОТУ ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ ДА ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК, ДА ЎСЯГО БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ

К тебе, народ наш, народ-богатырь, обращаются сыны твои — белорусские воины. Шлем мы сыновний поклон родной земле. Посылаем боевой привет матерям и отцам, братьям и сестрам, женам и детям нашим. Посылаем мы наш братский привет героическим партизанам и партизанкам.

...День и ночь мы живём одной мыслью о вас, о родимой земле. В жестоком плену белорусская земля. Сожжено и разрушено всё, что строили мы годами, тысячи близких и кровных угнаны в рабство, тысячи замучены фашистским зверьём, тысячи томятся в кровавых застенках. Разрушены и поруганы наши очаги, тысячи детей осиротели, тысячи семей лишились пристанища и крова!

...Но не сломила вас вражья неволя. Не склонили вы колен перед немцами. Захвачена Беларусь, но не покорён народ её, не сломлена воля её к борьбе и победе...

...Вместе с братьями своими, русскими и украинцами, вместе с воинами всех народов Советского Союза мы принесём освобождение родной земле, возвратим свободу и радость родному и многострадальному нашему белорусскому народу.

...Вперёд же, братья, в решающий бой! В бой за нашу землю, за нашу жизнь и свободу!*

Обращение подписали 25 тысяч воинов-белорусов, среди них уроженец д. Пищики Дубровенского района ефрейтор Виктор Михайлович Сулимов.

Камандзір дывізіі

У ліпені 1941 года Мікіта Іванавіч Дзёмін скончыў ваенную акадэмію ў Маскве. Пачаў вайну пад Паўлаградам на поўдні, змагаўся пад Растовам, быў паранены, вылечыўся, удзельнічаў у баях на Ізюм-Барвенкаўскім напрамку, пад Сталінградам, у іншых аперацыях. На Заходнім фронце пад Ельняй палкоўнік Дзёмін быў паранены трэці раз.

Камандзірам 174-й стралковай дывізіі ён стаў у кастрычніку 1943 года, калі дывізія пачынала баі на беларускай зямлі. Палкі яго дывізіі двойчы фарсіравалі Днепр, вызвалілі частку тэрыторыі Дубровенскага раёна, праявілі выключную мужнасць і стойкасць пры захопе і ўтрыманні плацдармаў і апорных пунктаў ворага. Гэтым якасцям салдаты і афіцэры дывізіі вучыліся ў свайго камандзіра дывізіі. Адзін з афіцэраў дывізіі — А. Д. Боня, які добра ведаў Дзёміна, пісаў пра яго:

«У ім было штосьці ад палкаводца-самародка, умеўшага падпарадкаваць масы сваёй волі, прымусіць выконваць задуму камандзіра і запаліць іх энтузіязмам для дасягнення перамогі над праціўнікам... А вера ў камандзіра — палова поспеху на полі змагання».

...За заслугі перад Радзімай камдыў Дзёмін быў узнагароджаны ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, а таксама ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў.

Рашэннем Барысаўскага гарсавета народных дэпутатаў адна з вуліц г. Барысава названа імем Дзёміна. У лютым 1962 года ва ўзросце 56 гадоў Мікіты Іванавіча не стала. Пахаваны ён у Маскве на Новадзявочых могілках.

174-я стралковая дывізія ўнесла вялікі ўклад у вызваленне Дубровеншчыны. Несумненная заслуга ў гэтым яе камандзіра Мікіты Іванавіча Дзёміна. Дубровенцам трэба ведаць гэта імя.

М. Шкадаў.

* Правда, 1943, 8 августа.

Сын чэха — чырвонаармеец

У. Ф. Дняпроўскі, чэх па нацыянальнасці, удзельнічаў у вызваленні нашага раёна. Яго бацька, Фердынанд Іосіфавіч Дняпроўскі, у час першай сусветнай вайны трапіў у палон да рускіх і Кастрычніцкая рэвалюцыя заспела яго ў горадзе Чыце. Разам з іншымі салдатамі Фердынанд перайшоў на бок Чырвонай Арміі і вырашыў назаўсёды застацца ў Расіі. Пазней да яго прыехала жонка Людзвіга Іосіфаўна, а ў снежні 1922 года ў іх нарадзіўся сын Ульян.

Бацька Ульяна ў 1929 годзе загінуў ад рук японскіх самураяў у час канфлікту на КВЖД. Маці, не перанёсшы гібелі мужа, у хуткім часе памерла. Сямігадовы Ульян разам з сястрой Таісай трапляе ў дзіцячы дом, там пазней вучыцца ў школе ФЗА па спецыяльнасці рамонтнік паравозаў.

Калі пачалася вайна, ён служыў у пагранічных войсках, якія першымі прынялі на сябе ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адступалі пад бесперапыннай бамбёжкай. А потым ваенны лёс кідаў Ульяна Дняпроўскага па многіх франтах вайны туды, дзе іх асобны аўтамабільны батальён быў пазарэз патрэбны для падвозу боепрыпасаў, вывазкі раненых з франтавой паласы.

...Восенню 1943 года іх асобны батальён трапіў на тэрыторыю Дубровенскага раёна. Ульяну Фёдаравічу на ўсё жыццё запомніліся вёскі Пятрыкі і Рэдзькі, ад якіх, праўда, на той час заставаліся адны папялішчы ды абгарэлыя печы былых хат.

— Аднойчы, — успамінае Ульян Фёдаравіч, — на грузавіку ЗІС-5 у раёне гэтых вёсак я вёз на перадавую снарады. Раптам наперадзе маёй машыны разарваліся дзве міны, а дзве наступныя — злева ад мяне. Немцы прыстрэльваліся і няцяжка было уявіць, што здарылася б, калі б у мой грузавік трапіў хоць адзін снарад. У мяне былі дымавыя шашкі. Я тут жа спыніў машыну і наладзіў дымавую заслону. Стральба спынілася, напэўна, немцы рашылі, што гэта загарэлася мая машына. А я тым часам газануў на ўсю магутнасць матора і вырваўся з зоны абстрэлу.

У адным з баёў, калі вадзіцелям аўтабата давялося біцца з фашыстамі са зброяй у руках, Ульян Дняпроўскі быў цяжка паранены. Ён праляжаў у шпіталях да канца вайны, а ў лістападзе 1945 года яго камісавалі. Пасля гэтага жыў і працаваў у розных гарадах краіны.

...Памяць аб той зямлі, на якой праліў кроў чэх Ульян Фёдаравіч (Фердынандавіч) Дняпроўскі, прывяла яго пасля ўходу на пенсію сюды, дзе змагаўся ў 1943—1944 гадах. Цяпер ён жыве ў Оршы і час ад часу наведваецца ў тыя мясціны, пра якія тут сказана.

М. Шкадаў.

Віцебска-Аршанская аперацыя 1944 года

Наступальная аперацыя войск 1-га Прыбалтыйскага (генерал арміі І. Х. Баграмян) і 3-га Беларускага (генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі) франтоў 23—28 чэрвеня — састаўная частка Беларускай аперацыі 1944. Мэта — разгром левага крыла (3-я танкавая і 4-я палявая арміі) нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр» (генерал-фельдмаршал Э. Буш).

Удзельнічалі арміі: 6-я гв. (ген.-лейт. І. М. Чысцякоў), 43-я (ген.-лейт. А. П. Белабародаў), 39-я (ген.-лейт. І. І. Людніка ў), 5-я (ген.-лейт. М. І. Крылоў), 11-я гв. (ген.-лейт. К. М. Галіцкі), 31-я (ген.-лейт. В. В. Глаголеў), 5-я гв. танк. (маршал бранятанк. войск П. А. Ротмістраў), 1-ы танк. корпус (ген.-лейт. В. В. Буткоў). Дзеянні сухапутных войск пад-

трымлівалі 3-я (ген.-лейт. М. П. Папівін) і 1-я (ген.-лейт. М. М. Громаў) паветраныя арміі. Каардынаваў дзеянні франтоў Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі. Войскам ставілася задача разграміць групоўкі праціўніка: віцебска-лепельскую і аваладаць раёнам Лепель—Чашнікі; віцебскую і вызваліць Віцебск; аршанскую, вызваліць Оршу і выйсці да р. Бярэзіна. Нямецкае камандаванне надавала выключнае значэнне абароне Віцебска-Аршанскага раёна. Тут быў створаны магутны абарончы рубеж глыбінёю 20—45 км пад умоўнай назвай «Пантэра» (ч. «Усходняга вала») з выкарыстаннем умоў лясіста-балоцістай мясцовасці і шматлікіх рэк з шырокімі забалочанымі поймамі, у вузлы абароны былі ператвораны Віцебск, Орша, іншыя населеныя пункты. Напярэдадні наступлення галоўных сіл франтоў 22 чэрвеня праведзена разведка боем, у ноч на 23 чэрвеня — папярэдняя авіяцыйная падрыхтоўка.

Раніцай 23 чэрвеня пасля артылерыйскай падрыхтоўкі пачалося наступленне. Войскі 6-й гвардзейскай і 43-й армій 1-га Прыбалтыйскага фронту прарвалі абарону праціўніка на паўночным захадзе ад Віцебска... 26 чэрвеня вызвалены Віцебск.

Адначасова войскі левага крыла 3-га Беларускага фронту — 11-я гвардзейская і 31-я арміі — пераадольвалі ўпартае супраціўленне ворага на аршанскім напрамку, у ходзе наступлення 26 чэрвеня вызвалілі Дуброўна...

У. Вышынскі.

Вызваленне раёна

Да пачатку летняга наступлення нашых войск у 1944 годзе нямецка-фашысцкія войскі займалі ў Беларусі загадзя падрыхтаваную і добра арганізаваную абарону. Канфігурацыя фронту тут уяўлялася ў выглядзе вялізнага выступу на ўсход, што выклікала зразумелы неспакой савецкага камандавання. Стаўка вырашыла разграміць групоўку праціўніка ў Беларусі, каб ліквідаваць небяспечны ў стратэгічных адносінах выступ і шырокім фронтам павесці далейшае наступленне. Для выканання задачы прыцягваліся войскі 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў, якія былі значна ўзмоцнены войскамі і баявой тэхнікай.

Камандуючы 3-м Беларускім франтам І. Д. Чарняхоўскі.

На апісваемым намі напрамку канцэнтраваліся войскі 3-га Беларускага фронту пад камандаваннем маладога здольнага военачальніка генерал-палкоўніка І. Д. Чарняхоўскага. Гэта аб ім прадстаўнік Стаўкі Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі ў данясенні Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму ад 10 чэрвеня 1944 года пісаў, што першае ўражанне аб Чарнове (псеўданім Чарняхоўскага) добрае, працуе многа, умела, упэўнена.

Войскі фронту павінны былі нанесці ўдар па самаму выпукламу ўчастку абароны праціўніка, узламаць найбольш умацаваную частку «Усходняга вала» і наступаць на Барысаў, Мінск. Баявыя сілы фронту ў гэты час складалі 39-я армія (камандуючы генерал-лейтэ-

нант І. І. Людніка ў), 5-я армія (камандуючы генерал-лейтэнант М. І. Крылоў), 11-я гвардзейская армія (камандуючы генерал-лейтэнант В. В. Глаголеў), 5-я гвардзейская танкавая армія (камандуючы маршал бранятанкавых войск П. А. Ротмістраў), 1-я паветраная армія (камандуючы генерал-лейтэнант авіяцыі М. М. Громаў).

Як і іншыя франты, 3-ці Беларускі фронт быў значна ўзмоцнены жывой сілай і тэхнікай і да пачатку наступальных дзеянняў войскі фронту мелі 1169 танкаў, 641 самаходна-артылерыйскую ўстаноўку, 1175 супрацьтанкавых гармат, 2893 гарматы іншага прызначэння, 3552 мінамёты, 689 установак рэактыўнай артылерыі, 792 зенітныя гарматы. У распараджэнні 1-й паветранай арміі было 1864 самалёты, у тым ліку 767 знішчальнікаў, 547 штурмавікоў, 481 бамбардзіроўшчык. Войскі фронту налічвалі 390 тысяч салдат і афіцэраў.

Канцэнтрацыя сіл — гэтай вялізнай масы людзей і тэхнікі — ішла пры найвялікшай засакрэчанасці. Разам з тым вялася напружаная падрыхтоўка да наступлення прыфрантавых камунікацый і баявая вучоба.

Так, для падрыхтоўкі дарожнай сеткі ў прыфрантавой паласе было праверана на размініраванне і адрамантавана некалькі соцень кіламетраў старых дарог, пракладзены і пабудаваны дзесяткі кіламетраў новых. Неабходна было падвезці да фронту сотні тысяч тон боепрыпасаў, гаручага, прадуктаў харчавання і г. д., перакінуць папаўненне жывой сілы і тэхнікі, бо прыбывалі цэлыя арміі. І гэтыя задачы вырашаліся з франтавой аператыўнасцю. У гэтым вялікую дапамогу камандуючаму фронтам аказаў прадстаўнік Стаўкі А. М. Васілеўскі.

А сам камандуючы І. Д. Чарняхоўскі ўдзяляў вялікую ўвагу засваенню будучымі ўдзельнікамі наступлення тактыкі вядзення наступальнага бою і стралкова-артылерыйскага ўзаемадзеяння. Вучэбныя палігоны фронту, размешчаныя ў тыле, былі ператвораны ў сапраўдныя палі бою. На іх былі створаны пазіцыі, падобныя да варожых. Стралковыя роты і батальёны вучыліся штурмаваць іх, наступаць у высокім тэмпе, не адставаць ад агнявога вала



Карта-схема прарыву варожай абароны і вызвалення Оршы 31-й арміяй.

больш, чым на 250 метраў. Як толькі пачыналася атака, пяхота вяла агонь усімі сродкамі і вучылася даваць сігналы пераносу агню. Стральба баявымі снарадамі і патронамі дысцыплінавала людзей, павышала адказнасць, а маладыя воіны прывыкалі да выбухаў снарадаў, кулямётнага агню і адчувалі сябе абстраляным байцамі. Мэтанакіраваная падрыхтоўка нашых войск да наступлення вялася і ў ідэйна-палітычным напрамку. Іншымі словамі, баявая і палітычная падрыхтоўка была звеннямі аднаго ланцуга.

Вось некалькі фактаў выхавання воінаў на высокіх узорах савецкага патрыятызму. 2-гі гвардзейскі Тацынскі корпус атрымаў танкавую калону «Сібірак», пабудаваную на сродкі працоўных Іркуцкай вобласці, перад разгорнутым гвардзейскім сцягам баявыя машыны перадаваліся навічкам. І якім гонарам, якой рашучасцю дастойна выкарыстаць грозную зброю свяціліся твары маладых воінаў-танкістаў!

Асабліва значэнне надавалася перадачы баявых машын, на якіх раней ваявалі героі-танкісты, загінуўшыя ў баях. Так, танк «Баявая сяброўка» Героя Савецкага Саюза Марыі Акцябрскай, незадоўга да гэтага смяртэльна параненай у баях, атрымаў малады механік-вадзіцель Галкін. Яго франтавыя таварышы атрымалі баявыя машыны Герояў Савецкага Саюза М. Е. Нячаева, Ю. Н. Малахава, Н. С. Палянжаева і далі клятву з гонарам выканаць свой абавязак.

Ва ўсіх падраздзяленнях праходзілі партыйныя і камсамольскія сходы. Сотні, тысячы байцоў уступалі ў рады бальшавіцкай партыі і Ленінскага камсамола, абяцаючы змагацца з ненавісным ворагам да апошняга дыхання.

Падрыхтоўка да наступлення завяршылася ў дзень трэцяй гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны. За 2 гадзіны да артылерыйскай падрыхтоўкі ноччу 23 чэрвеня 1944 года ва ўсіх ротах быў зачытаны зварот Ваеннага Савета фронту.

На працягу двух начэй перад агульным наступленнем (21 і 22 чэрвеня) лётчыкі 1-й паветранай арміі абрушылі магутныя бомбавыя ўдары на пярэдні край праціўніка, яго апорныя пункты і вузлы, якія знаходзіліся ў глыбіні абароны. Пад гэты гром стралковыя дывізіі, часці 2-га гвардзейскага танкавага корпуса выходзілі на зыходныя пазіцыі, сапёры інтэнсіўна рабілі праходы ў мінных палях — нашых і праціўніка, здымалі дротавыя загароджы.

22 чэрвеня ў паласе прадстаячага прарыву чатыры ўзмоцненыя батальёны правялі разведку боем. Задача заключалася ў тым, каб праверыць і ўдакладніць на пярэднім краі і ў глыбіні абароны праціўніка агнявую сістэму інжынерных перашкод, а таксама захапіць палонных. Батальёны з пастаўленай задачай паспяхова справіліся.

Такім чынам, усё было гатова да пачатку наступлення. Артпадрыхтоўка, якая папярэднічала яму, была назначана на шэсць гадзін раніцы 23 чэрвеня, пачатак агульнай атакі — на 8 гадзін 50 мінут.

З вечара актыўнасць нашай авіяцыі значна ўзрасла. У паветра ўзнялося звыш 250 бамбардзіроўшчыкаў, якія наносілі ўдары па першай паласе абароны праціўніка на ўчастку прарыву.

Нечакана ў чатыры гадзіны ночы немцы адкрылі па нашых траншэях і артылерыйскіх батарэях інтэнсіўны артылерыйскі агонь. З нашага боку меліся страты, было выведзена са строю некалькі артылерыйскіх батарэй. І толькі наша цяжкая артылерыя магутным агнём з глыбіні фронту прымусіла немцаў змоўкнуць.

Ацаніўшы становішча, І. Д. Чарняхоўскі выказаў меркаванне, што ворагу стала вядома аб нашым наступленні. Аднак час для наступлення нашых войск не быў перанесены.

Роўна ў шэсць гадзін раніцы па сігналу чырвоных ракет залпы «кацюш» паведамілі аб пачатку артылерыйскай падрыхтоўкі. Больш за 1800 гармат і мінамётаў адкрылі агонь па варожай абароне. Зямля застагнала ад грому соцень батарэй. Пазіцыі праціўніка па фронту больш трыццаці і ў глыбіню да сямі кіламетраў зацягнула суцэльнай хмарай агню і дыму.

Артылерыйская падрыхтоўка праводзілася па такому графіку: 5-мінутны агнявы налёт усёй артылерыі; 30-мінутная паўза; 35-мінутны прыцэльны агонь з закрытых пазіцый на разбурэнне абаронных збудаванняў ворага; 20 мінут стральбы прамой наводкай на знішчэнне агнявых кропак праціўніка, яшчэ сорак мінут на падаўленне яго абароны на пярэднім краі і бліжэйшай глыбіні на ўчастку прарыву. Большым паўтары гадзіны бесперапыннага артылерыйскага агню па ўмацаваннях праціўніка аслабілі яго абарону і нанеслі яму сур'ёзныя страты.

У 8 гадзін 20 мінут каля трохсот бамбардзіроўшчыкаў, а праз некалькі мінут 250 штурмавікоў 1-й паветранай арміі нанеслі ўдары па першай пазіцыі і бліжэйшай глыбіні абароны ворага. Хваля за хваляй ішлі на варожыя пазіцыі нашы самалёты. Актыўнасць жа авіяцыі праціўніка ў параўнанні з летам і восенню 1943 года прыкметна знізілася.

У 8 гадзін 50 мінут пяхота з танкамі, прыкрываемыя з паветра штурмавікамі, пайшлі ў атаку.

Тут размова ідзе аб дзеяннях злучэнняў толькі 11-й гвардзейскай арміі. На працягу першай гадзіны бою былі заняты перадавыя траншэі першай пазіцыі абароны праціўніка.

Аднак рухацца далей стала цяжка. Асабліва яраснае супраціўленне ворага сустрэлі воіны нашых 36-га і 8-га гвардзейскіх стралковых карпусоў, якія наносілі галоўны ўдар у цэнтры аршанскага напрамку. Тут у немцаў было многа мінных палёў, супрацьтанкавых і штурмавых гармат, схаваных у спецыяльна падрыхтаваных траншэях. Давялося пад агнём праціўніка рабіць праходы ў мінным полі, усімі відамі зброі дапамагаць пяхоце, манеўруючы на абмежаванай прасторы. У выніку шалёнага абстрэлу нашы 35-ы танкавы і 345-ы самаходна-артылерыйскі палкі, якія ўзаемадзейнічалі на гэтым участку прарыву, страцілі большую частку танкаў і самаходных гармат. З-за гэтага на ўчастку 36-га і 8-га гвардзейскіх стралковых карпусоў тэмп атакі замарудзіўся, бой прыняў зацяжны характар. 16-я гвардзейская дывізія 36-га корпуса, якая заняла моцны апорны пункт Кіраёва, таксама была прыпынена. Пры ўзяцці Кіраёва часцямі гэтай дывізіі камандзір цяжкага танка 63-га танкавага палка прарыву камуніст Антонаў першым уварваўся ў размяшчэнне праціўніка, падпаліў варожы «фердынанд», задушыў мінамётную батарэю і знішчыў да ўзвода гітлераўцаў.

На вышыні 191,6 у гэты ж дзень — 23 чэрвеня 1944 года — подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў гвардыі радавы 247-га гвардзейскага палка 84-й гвардзейскай стралковай дывізіі 36-га гвардзейскага стралковага корпуса Аляксандр Мікалаевіч Васільеў, узнагароджаны пасмяротна ордэнам Леніна.

Але калі гаварыць аб агульных выніках першага дня наступлення, то часці 8-га і 36-га гвардзейскіх стралковых карпусоў пастаўленых задач не выканалі, перамясціўшыся за дзень усяго на два-тры кіламетры.

Зусім інакш развіваліся падзеі на напрамку ўздапаможнага ўдара часцей 16-га гвардзейскага стралковага корпуса і 152-га ўмацаванага раёна, якія прарвалі абарону праціўніка на двух участках. Асабліва паспяхова развівалася наступленне 31-й гвардзейскай стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра І. К. Шчарбіны. Ужо да дзесяці гадзін раніцы часці дывізіі прайшлі наперад на 2,5 — 3 кіламетры, авалодалі апорным пунктам абароны Востраў Юр'еў і выйшлі да Пятага пасёлка Асінторфа. І толькі тут сустрэлі ўпартае супраціўленне гітлераўцаў.

У баях за вызваленне Асінторфа мужнасць і гераізм праявіў камандзір стралковай роты гвардыі старшы лейтэнант Суфій Суф'янаў. 23 чэрвеня, калі гвардзейская рота штурмавала ўмацаваныя пазіцыі ворага, камандзір першым кінуўся ў атаку, а за ім узняліся ўсе байцы. У кароткім рукапашным паядынку рота Суф'янава знішчыла больш за сотню фашыстаў і заняла пярэднюю траншэю. Трыццаць варожых салдат было ўзята і палон. Сам камандзір у гэтым баі знішчыў шэсць гітле-

раўцаў. І ў далейшым гэты адважны воін змагаўся з той жа непахіснай рашучасцю, умела кіраваў ротай, за што быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

У час бою за Цэнтральны пасёлак бессмяротны подзвіг здзейснілі камандзір узвода пятай роты 95-га стралковага палка 31-й гвардзейскай стралковай дывізіі малодшы лейтэнант Васіль Анопрыевіч Ільчанка і сяржант Барый Галіевіч Шаваліеў. Удвух яны закрылі амбразуру варожага дзота і забяспечылі паспяховую атаку сваёй роты. Абодва героі ўзнагароджаны ордэнамі Вялікай Айчыннай вайны пасмяротна. Яны пахаваны ў брацкай магіле ў пасёлку Асінторф.

Высокую вывучку, воінскую хітрасць праявіў камандзір 99-га стралковага палка К. Г. Кузняцоў. Калі ў раёне пятага пасёлка полк сустрэў упартае супраціўленне праціўніка, камандзір вырашыў не ісці ў лабавую атаку. Не ўвязваючыся ў бой за пасёлак, полк выйшаў на вузкакалейку к захаду ад пасёлка, абышоў праціўніка і паспяхова рухаўся ў напрамку хутара Брухаўскія. Пяхота на руках перацягнула батальённыя і палкавыя гарматы праз балота, і артылерыя ўвесь час знаходзілася ў баявых парадках палка. Страляючы прамой наводкай, артылерысты вельмі хутка знішчылі агнявыя кропкі праціўніка. Наступленне падраздзяленняў падтрымлівала таксама артылерыя 64-га гвардзейскага артылерыйскага палка, якім камандаваў палкоўнік І. С. Бурдэнка.

У сувязі з тым, што на правым фланзе 11-й гвардзейскай арміі намеціўся найбольшы поспех наступлення, камандуючы арміяй генерал-лейтэнант К. М. Галіцкі прымае рашэнне перанесці напрамак галоўнага ўдара ў паласу наступлення 31-й стралковай дывізіі.

Задума далейшых дзеянняў арміі заключалася ў тым, каб з раніцы 24 чэрвеня нанесці галоўны ўдар у паласе 16-га гвардзейскага стралковага корпуса ў агульным напрамку Клюкаўка—Смальяны з мэтай прарыву ўсёй тактычнай глыбіні абароны праціўніка і выхаду да яго тылавых рубяжоў па рацэ Аршыцы.

Ноччу на 24 чэрвеня злучэнні 11-й гвардзейскай арміі вялі разведку боем, частка яе сіл працягвала наступленне. Мэта заключалася ў тым, каб развіць поспех прарыву першага дня. Для гэтага маршалу Ротмістраву было загадана вывесці танкавыя карпусы ў зыходны раён і набліэіць іх да баявых парадкаў злучэння арміі генерала Галіцкага.

З надыходам цемры лавіна танкаў 5-й гвардзейскай арміі рушыла па Мінскай шашы і ўжо на світанні пачала выходзіць у паласу дзеянняў стралковых злучэнняў.

Выхад танкавай арміі ўстрывожыў нямецкае камандаванне. Не марудзячы, яно стала ўмацоўваць аршанскі напрамак. У паласу аўтастрады была выведзена на прамую наводку цэлая зенітна-артылерыйская дывізія з задачай паставіць заслон нашым танкам.

З раніцы 24 чэрвеня на аршанскім напрамку разгарнуліся жорсткія баі. У трэцяй гадзіне дня пасля кароткага, але магутнага артылерыйскага налёту і ўдару бамбардзіровачнай авіяцыі на правым флангу арміі былі ўведзены ў бой дывізіі іншых эшалонаў 16-га і 8-га гвардзейскіх стралковых карпусоў.

11-я гвардзейская стралковая дывізія 16-га гвардзейскага стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Н. Г. Цыганава наступала ў напрамку вёсак Горбава, Балтуны, Заазер'е з задачай развіць поспех часцей 152-га палявога ўмацаванага раёна, разграміць праціўніка паўднёвей Бабінавіч. К зыходу дня дывізія заняла раён Заазер'я. Другім раёнам, дзе на працягу ўсяго дня ішлі жорсткія баі, быў умацаваны раён Выдрыцы. Тут наступала 1-я гвардзейская стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка П. Ф. Тоўсцікава. Наступаючы паўночней вузкакалейкі Асінторф—БелДРЭС цераз тарфяныя балоты, яна к зыходу дня выйшла двума палкамі на заходні бераг рэчкі Выдрэйкі.

8-ы гвардзейскі стралковы корпус, прарваўшы абарону праціўніка, выйшаў у тыл яго групоўкі, што абаранялася ў паласе Мінскай шашы.

Вораг, безумоўна, разумеў небяспеку,

узнікшую для яго ў напрамку наступлення 16-га гвардзейскага стралковага корпуса, і спрабаваў ліквідаваць прарыў. У 17 гадзін гітлераўцы чатырма батальёнамі пяхоты з дзвюма групамі танкаў па 15 машын у кожнай контратакавалі часці 1-й гвардзейскай стралковай дывізіі і выйшлі ў тыл двум яе палкам. Але камандзір дывізіі, ведаючы, што ззаду наступаюць часці 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі 8-га корпуса, дзейнічаў упэўнена і рашуча. Палкі гэтай дывізіі працягвалі настойліва рухацца наперад. А сілы праціўніка, што прарваліся ў тыл, ужо да 19 гадзін былі разгромлены 5-й гвардзейскай стралковай дывізіяй пад камандаваннем палкоўніка Н. Л. Волкава.

У гэтых баях гвардзейцы праявілі высокую мужнасць і самаахвярнасць.

Так, камандзір роты, камуніст, старшы лейтэнант Н. А. Гутэрман у самы напружаны момант, калі наступаючыя былі спынены масіраваным агнём праціўніка, кінуўся наперад і павёў роту ў атаку. Ён быў забіты. Камандаванне ротай узяў на сябе парторг старшына Палятаеў і гвардзейцы паспяхова ішлі наперад, знішчаючы ворага.

Такім чынам, укліниўшыся ў абарону праціўніка, дывізіі 16-га і 8-га стралковых карпусоў расшырылі участак прарыву па фронту да 30 кіламетраў і ў глыбіню да 15 кіламетраў. Стала трашчаць уся сістэма абароны праціўніка паўночна-ўсходней Оршы. Ворагу былі нанесены вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Была акружана і знішчана частка сіл 78-й і 14-й дывізій праціўніка. Нашы войскі занялі больш за 50 населеных пунктаў.

Але на левым флангу арміі часці 36-га гвардзейскага стралковага корпуса працягвалі весці ўпартыя, кровапралітныя баі. Каб змяніць становішча, трэба было ўводзіць у бой танкавыя карпусы 5-й танкавай арміі. Аднак праціўнік аказваў надзвычай моцнае супраціўленне і нашы танкавыя сілы маглі панесці тут неапраўдана вялікія страты, не прынёсшы пры гэтым належнай карысці.

Параіўшыся наконт гэтага з камандуючымі радамі войск, І. Д. Чарняхоўскі вырашыў перавесці танкавую армію па другому варыянту плана ў паласу наступлення 5-й арміі, якая паспяхова развівала наступленне на Багушэўскім напрамку.

Наступае 31-я

У выніку трохдзённых баёў войскі 11-й гвардзейскай арміі прарвалі абарону праціўніка на ўсю тактычную глыбіню. У выніку да зыходу 25 чэрвеня стварыліся спрыяльныя ўмовы для развіцця аператыўнага праследавання праціўніка.

31-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В. В. Глаголева наступала лявей 11-й гвардзейскай арміі — ад аўтамагістралі Масква—Мінск да в. Баева — і рухалася непасрэдна на Дуброўну. У яе склад уваходзілі 71-ы, 113-ы і 36-ы стралковыя карпусы, якімі ў гэты час камандавалі генерал-лейтэнант П. К. Кашавой, генерал-маёры К. І. Правалаў і М. М. Алешаў. У першы дзень прарыву абароны праціўнік аказаў надзвычай упартае супраціўленне ў раёне вёскі Кіраёва, дзе наступалі палкі 88-й стралковай дывізіі 71-га стралковага корпуса. Тут пры штурме апорнага пункта здзейсніла гераічны подзвіг камсорг 426-га стралковага палка гэтай дывізіі Ганна Нікандрава. Яна ўзняла ў атаку залёгшую пад моцным агнём праціўніка пяхоту. Цаной свайго жыцця яна забяспечыла выкананне баявой задачы. Ганне Нікандравай пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ноччу на 24 чэрвеня войскі арміі дывізіямі першага эшалона працягвалі бой у сваіх палосах, але сустрэлі моцнае агнявое супраціўленне праціўніка і поспеху ў руху наперад не мелі.

Раніцай 24 чэрвеня злучэнні 71-га і 36-га стралковых карпусоў пасля паўгадзіннай артылерыйскай падрыхтоўкі ад-

навілі наступленне. Дывізіі арміі марудна прасоўваліся наперад.

Пасля ўпартых дзённых баёў войскі 71-га корпуса (88-я, 331-я, 192-я стралковыя дывізіі) з уведзенай у бой 213-й танкавай брыгадай зламалі супраціўленне праціўніка на рубяжы в. Лабаны, Барадзінцы і к зыходу дня авалодалі в. Гуры, вышынёй 186,4, вёскамі Батракоўцы, Барадзінцы, Лапыры.

Надзвычай упартае супраціўленне аказалі фашысты ў паласе наступлення 36-га стралковага корпуса (220-я і 352-я стралковыя дывізіі). 352-я дывізія цэлы дзень вяла напружаныя баі за вёску Загваздзіна і вышыню 215,2. Мінамётная рота старшага лейтэнанта Бугранкова ўзмоцнена апрацоўвала вёску, літаральна выкурваючы адтуль немцаў. Да вечара першая лінія траншэй была ўзята. Але па загаду камандзіра дывізіі яна была пакінута, так як пры малалікасці сіл і адкрытым левым флангу ўтрымліваць яе было немэтазгодна.

174-я стралковая дывізія 113-га стралковага корпуса вяла ў гэты дзень наступальныя баі ў раёне вёскі Засценак Юр'еў. Але ўжо ў 7 гадзін 20 мінут у выніку трэцяй контратакі праціўніка, падтрыманай масіраваным агнём артылерыі, вымушана была пакінуць занятую першую траншэю і адысці на зыходнае становішча.

Не дабілася поспеху і 62-я стралковая дывізія гэтага корпуса, безвынікова атакуючы гітлераўцаў у напрамку паўночна-заходніх схілаў вышыні 218,4, хоць астатнія часці корпуса трывала ўтрымлівалі занятыя рубяжы. Аднак поспех 11-й гвардзейскай арміі выклікаў адыход праціўніка з надыходам цемнаты і перад фронтам 31-й арміі.

Чырвоны сцяг над Дуброўнай

На раённы цэнтр Дуброўну непасрэдна наступалі войскі 220-й і 331-й стралковых дывізій, якімі камандавалі адпаведна палкоўнік В. А. Палявік і генерал-маёр П. Ф. Берастаў. Першыя два дні баёў адчувальных поспехаў 220-й дывізіі не прынеслі. Толькі на суседнім участку, дзе наступаў 71-ы корпус арміі, удалося адкінуць ворага на два кіламетры і тым самым разбурыць маналітнасць нямецкай абароны. На стыку 36-га і 71-га карпусоў утварыўся выступ у абароне праціўніка. І тады генерал-маёр М. М. Алешаў — камандзір 36-га корпуса — вырашыў выкарыстаць гэты выступ для ўдару ў тыл фашыстам. Начальніку палітаддзела корпуса палкоўніку В. І. Вароніну і начальніку штаба аператыўнага аддзела корпуса падпалкоўніку Р. Ф. Кабылкіну было загадана сфарміраваць і ўзначаліць ударны атрад, у які ўвайшлі вучэбная рота 220-й стралковай дывізіі, карпусныя і армейскія сапёрныя часці.

Сапёры зрабілі праход у нашых мінных палях і драцяных загародах, затым пераправіліся на надзіманых лодках цераз Днепр, зрабілі такія ж праходы на нямецкім баку. Прыкрываючыся цемрай, атрад абышоў умацаваную вышыню 178,8 і на світанні нечакана атакаваў праціўніка з тылу.

Адначасова палкі дывізіі атакавалі гітлераўцаў з фронту. Разгарэўся апошні рашаючы бой на подступах да Дуброўны. У гэтым баі воіны 220-й дывізіі праявілі беспрыкладную мужнасць і гераізм.

Развіваючы поспех з фронту і тылу, часці дывізіі завяршылі прарыў тактычнай абароны праціўніка, занялі в. Бурая і к зыходу дня 25 чэрвеня зламалі арганізаванае супраціўленне ворага, выканаўшы тым самым самую цяжкую частку задачы першых дзён наступлення.

Гітлераўцы, адчуваючы пагрозу акружэння часцям 25-й механізаванай і 260-й пяхотнай дывізій, пачалі адводзіць свае войскі ў напрамку в. Крапіўна, каб замацавацца на заходнім беразе р. Крапівенкі на раней падрыхтаваным абарончым рубяжы.

Каля двух гадзін ночы 26 чэрвеня наша разведка і падраздзяленні наступаючых

Камандзір 331-й сд генерал-маёр П. Ф. Берастаў уручае ўзнагароду камандзіру 896-га арт. палка палкоўніку П. М. Прыходзьку.

батальёнаў выявілі адыход галоўных сіл праціўніка. Камандаваннем дывізіі былі прыняты меры для неадкладнага праследавання ворага.

У той жа час, калі часці 220-й стралковай дывізіі з баямі падышлі да Дуброўны з усходу з боку в. Бурая, падраздзяленні 331-й стралковай дывізіі наступалі па праваму берагу Дняпра і адначасова з воінамі 220-й уступілі ў бой за Дуброўну.

Зацiснутыя з двух бакоў, праз гадзіну вулічных баёў уцалелыя часці немцаў вымушаны былі паспешліва адступіць у паўднёва-заходнім напрамку.

26 чэрвеня да 6 гадзін раніцы Дуброўна была поўнасцю ачышчана ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Але сустракаць вызваліцеляў не было каму, горад быў зусім бязлюдны і разбураны дашчэнту.

Дывізіі першага эшалона, не спыняючыся ў горадзе, праследавалі праціўніка, які, падцягнуўшы рэзервы з глыбіні, зноў арганізаваў упартае супраціўленне на знешнім абарончым рубяжы г. Оршы па рацэ Крапівенцы. Але ўжо ніякія ўмацаванні не маглі стрымаць наступальны парыў Чырвонай Арміі...

...Прайшлі дзесяцігоддзі. З руін і папялішчаў зноў вырас гарадок на Дняпры. Выраслі і растуць новыя пакаленні яго жыхароў. І ўсе яны прыходзяць да стэлы са скупым надпісам:

«Горад Дуброўна вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў 26 чэрвеня 1944 года войскамі 220-й стралковай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка В. А. Палявіка і 331-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра П. Ф. Берастава».

М. Шкадаў, Ф. Кулакоў.

З успамінаў В. П. Слаўнова, былога камандзіра 123-га стралковага палка 62-й стралковай дывізіі

...Увесь 3-ці Беларускі фронт прыйшоў у рух, а ў ім — і наш самы левафланговы 123-ці стралковы полк. Прасторы для манеўра самыя спрыяльныя, смеласці нам было не пазычаць, злосці на ворага — таксама.

І мы рынуліся ў тыл грэнадзёрам, якія стаялі перад намі зімой і вясной. Маршрут палка пралёг праз вёскі Валкулакава, Бяскі, Негаціна, Барадзіно, Сваташыцы.

Праціўнік адступаў.

Адна яго калона з'явілася на маршруце Міхалінава — Волева, рухалася па левым флангу нашага палка.

Мы развярнуліся к бою. Немцы ішлі вольна, нас тут, бачна, не чакалі. А ў нас залеглі ў засаду батальёны В. П. Булаенкі і А. С. Гурскага. Кулямётныя роты І. Н. Ярошкіна і В. І. Качаткова заправілі стужкі «максімаў». На прамую наводку развярнуўся артдывізіён А. Калашнікава, падрыхтаваліся мінамётчыкі К. Размахава і І. Уласава...

Па сігналу шквал агню абрынуўся на нямецкую калону... Роты Г. Бондара, Г. Левашова, А. Мартынава, А. Вайдакова перайшлі ў атаку і завяршылі разгром фашыстаў. Прагрымеў гэты бой на рубяжы вёсак Вячэрына — Волева...

У атаку ішлі танкі

Восенню 1943 года і летам 1944-га ў баях за вызваленне Дубровенскага раёна актыўны ўдзел прымалі танкісты і мотастралкі 213-й танкавай брыгады...

...Раніцай 23 чэрвеня 1944 года танкі нашай брыгады выйшлі да вёскі Германы і рушылі ў атаку на важны апорны пункт у абароне праціўніка — в. Батракоўцы. Гітлераўцы аказвалі ўпартае супраціўленне, і дзве нашы атакі былі адбіты са значнымі стратамі для нас. 24 чэрвеня танкісты і мотастралкі брыгады працягвалі наступаць на Батракоўцы. Пасля паўторнай атакі да 17 гадзін яны ўварваліся ў вёску, пераадолеўшы супрацьтанкавы роў, два рады траншэй і моцнае агнявое супраціўленне праціўніка. Далей авалодалі вёскай Цеалін. 25 чэрвеня, праследуючы адыходзячага праціўніка, вызвалілі вёскі Пірагі, Якубава і працягвалі паспяхова прасоўвацца ў напрамку вёсак Солаўе, Андрэеўшчына з задачай перарэзаць шашу Віцебск — Орша.

У наступальных баях на Дубровеншчыне рашуча і смела дзейнічалі многія танкавыя экіпажы і мотастралковыя падраздзяленні брыгады.

Экіпаж танка Т-34 пад камандаваннем лейтэнанта А. І. Міхейкіна першым уварваўся ў вёску Батракоўцы, знішчаючы праціўніка агнём і гусеніцамі.

Высокую мужнасць, адвагу і ўменне паказаў камандзір танкавага ўзвода старшы лейтэнант В. Ю. Чжан. У баі за Батракоўцы ён прыняў на сябе камандаванне танкавай ротай, якая першай уварвалася ў баявыя парадкі праціўніка. Экіпаж танка камандзіра знішчыў 5 гармат, 6 агнявых кропак і многа салдат праціўніка.

Смела і рашуча дзейнічаў у баі экіпаж, дзе камандзірам танка Т-34 быў старшына Кудраўцаў — камсорг танкавага батальёна. Сваімі смелымі дзеяннямі ён дапамог мотапяхоце авалодаць апорным пунктам Батракоўцы. У баі танк быў падбіты, старшына Кудраўцаў паранены. Але ў шпіталь ён ехаць адмовіўся і 24 чэрвеня зноў сеў у танк і павёў яго ў атаку.

Такіх прыкладаў у тыя дні было нямала.

Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага 213-й танкавай брыгадзе за прарыў абароны немцаў на Дубровеншчыне і Аршанскім напрамку і паспяховыя наступальныя дзеянні была прысвоена назва «Аршанская».

С. Бялоў,
удзельнік баёў за вызваленне Дубровеншчыны, дацэнт Віцебскага медінстытута.

Ганаровы грамадзянін успамінае

23 чэрвеня 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя савецкіх войск пад кодавай назвай «Баграціён». У гэты дзень наша 331-я стралковая дывізія пачала наступальныя дзеянні ў дзевяць гадзін раніцы. Яна атакавала праціўніка сумесна з двума самаходна-артылерыйскімі палкамі, прыдадзенымі ёй на перыяд прарыву, і к зыходу дня авалодала першай пазіцыяй гітлераўцаў.

З раніцы 24 чэрвеня часці дывізіі пасля 5-мінутнага артналёту ўзнавілі наступленне трыма палкамі ў першым эшалоне пры падтрымцы танкаў і самаходнай артыле-

рыі. Справа, на Барадзінцы, наступаў 1106-ы стралковы полк, паміж імі, па дарозе, 1104-ы стралковы полк.

Пераадольваючы ўпартае супраціўленне праціўніка, часці марудна прасоўваліся наперад. Супраць нашай дывізіі абараняласа славутая 78-я штурмавая дывізія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Траута. З паказанняў захопленых палонных мы даведаліся, што ў гэты дзень, адчуўшы пагрозу абходу справа, Траут кінуў у бой на нашым участку наступлення свой адзіны рэзерв — 78-ы штурмавы батальён з танкамі.

...Наступленне на в. Цеалін стрымлівала вышыня 188,8, дзе замацаваўся праціўнік. Аддзяленне сяржанта Ярмошына ўварвалася ў нямецкую траншэю на паўднёвым схіле вышыні і рашучай атакай выбіла адтуль гітлераўцаў. Вёска Цеалін была вызвалена назаўтра раніцай, два палкі дывізіі працягвалі бой у напрамку Чыжоўкі, а 1108-ы полк пад моцным агнём з левага берага Дняпра авалодаў вёскай Лапыры і з баямі прасоўваўся да паўночна-ўсходняй ускраіны Дуброўны.

З боем, з ахвярамі даводзілася браць у праціўніка кожную вышыню, кожны крок Дубровенскай зямлі, не гаворачы пра вёскі, якія ўсе былі ператвораны ва ўмацаваныя пункты.

У дзевяць гадзін вечара 25 чэрвеня два палкі дывізіі, нашы танкі і самаходныя гарматы нанеслі канцэнтраваны ўдар па правабярэжнай частцы Дуброўны і зламалі супраціўленне праціўніка. Прыціснутыя да ракі, гітлераўцы ў паніцы кінуліся на левы бераг. Большасць з іх так і не дасягнула яго. А падраздзяленні 1108-га палка з ходу на падручных сродках фарсіравалі Днепр і завязалі баі за паўднёвую частку мястэчка. Да гэтага часу падаспелі падраздзяленні 220-й стралковай дывізіі. Да раніцы 26 чэрвеня 1944 г. Дуброўна была поўнасцю ачышчана ад гітлераўцаў.

В. Марамзін,
палкоўнік у адстаўцы,
ганаровы грамадзянін г. Дуброўна.

Званні герояў — за подзвігі на Дубровеншчыне

БУКАНАЎ ІВАН АЛЯКСАНДРАВІЧ

Нарадзіўся ў студзені 1918 г. ў вёсцы Новаказачча Казельскага раёна Калужскай вобласці. З сялянскай сям'і. Рускі. Закончыў рамеснае вучылішча, працаваў на прадпрыемствах Масквы і Казельска. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з чэрвеня 1941 г.

Камандзір узвода ўпраўлення лейтэнант І. А. Буканаў вызначыўся 15 лістапада 1943 г. пры вызваленні Дубровенскага раёна. Карэкціруючы агонь артылерыйскай батарэі ў ходзе бою, знішчыў 5 кулямётных кропак праціўніка. Пры адбіцці варожай контратакі разам з двума байцамі знішчыў гарматны разлік ворага, захапіў гармату і вёў з яе агонь па пяхоце і танках праціўніка, пакуль не расстраляў усе снарады, затым узарваў гармату, падабраў забітага і параненага сваіх баявых сяброў і вынес іх да сваіх.

Загінуў у баі 3 снежня 1943 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 3 чэрвеня 1944 г.

І. А. Буканаў.

Р. П. Вітчынкін.

ВІТЧЫНКІН РЫГОР ПЯТРОВІЧ

Нарадзіўся 25 жніўня 1922 г. ў вёсцы Шчэрбова Савінскага раёна Іванаўскай вобласці. З сялянскай сям'і. Рускі. Працаваў у МТС. На фронце з 1942 г.

Наводчык гарматы яфрэйтар Р. П. Вітчынкін вызначыўся ў канцы снежня 1943 г. ў баі за вышыню ў Дубровенскім раёне.

Гітлераўцы кінулі супраць савецкіх воінаў танкі і штурмавыя гарматы. Атаку адбілі, але з разліку гарматы ў жывых засталіся толькі Р. П. Вітчынкін і заражаючы.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29 сакавіка 1944 г.

КЛЕПАЧ ПРАКОП ФЁДАРАВІЧ

Нарадзіўся 21 лютага 1919 г. ў вёсцы Клепачы Харольскага раёна Палтаўскай вобласці. З сялянскай сям'і. Украінец. Член КПСС з 1943 г. Закончыў Палтаўскі педінстытут у 1954 г. ўЧырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг. На фронце з чэрвеня 1941 г.

Камандзір стралковага батальёна капітан П. Ф. Клепач вызначыўся пры вызваленні Дубровенскага раёна, фарсіраванні Бярэзіны і вызваленні г. Барысава. Яго батальён першым з баямі ўвайшоў у г. Дуброўна.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24 снежня 1945 г. Жыве ў г. Харол Палтаўскай вобласці.

Ганаровы грамадзянін гарадоў Смаленск і Дуброўна*.

П. Ф. Клепач.

А. Р. Махнёў.

Г. А. Нікандрава.

У. П. Падзігун.

МАХНЁЎ АЛЯКСЕЙ РЫГОРАВІЧ

Нарадзіўся 23 лютага 1921 г. ў горадзе Азбест Свярдлоўскай вобласці. З рабочай сям'і. Рускі. Член КПСС з 1944 г. З 1938 г. працаваў слесарам на фабрыцы. У Чырвонай Арміі з 1940 г., на фронце з сакавіка 1943 г.

Наводчык гарматы сяржант А. Р. Махнёў вызначыўся пры вызваленні Дубровенскага раёна. 17 лістапада 1943 г. ў ходзе бою на заходнім беразе ракі Расасенка байцы разліку стрымлівалі атаку 200 салдат праціўніка, якіх падтрымлівалі танкі. Застаўшыся адзін паранены, А. Р. Махнёў працягваў весці агонь з гарматы і знішчыў каля 150 гітлераўцаў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29 сакавіка 1944 г.

НІКАНДРАВА ГАННА АЛЯКСЕЕЎНА

Нарадзілася ў 1920 г. ў в. Барашкіна Краснагародскага раёна Пскоўскай вобласці. З сялянскай сям'і. Руская. Член КПСС з 1942 г.

На фронце з 1943 г. Камсорг стралковага палка, старшы лейтэнант Г. А. Нікандрава вызначылася ў баях за вызваленне Дубровенскага раёна. 23 чэрвеня 1944 г. ў час наступлення палка каля в. Кіраёва пяхота трапіла пад моцны агонь праціўніка і залягла. Ганна Нікандрава першая падняласяў атаку. Загінула ў гэтым жа баі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 24 жніўня 1945 г. Пахавана ў брацкай магіле ў г. Дуброўна**.

ПАДЗІГУН УЛАДЗІМІР ПЛІПАВІЧ

Нарадзіўся 11 красавіка 1923 г. ў с. Бярозіна Жашкаўскага раёна Чаркаскай вобласці. З рабочай сям'і. Украінец. Член КПСС з 1943 г. Удзельнічаў у Айчыннай вайне з сакавіка 1942 г. — на Заходнім і 3-м Беларускім франтах.

* Успаміны П. Ф. Клепача гл. ў 2-й кнізе Хронікі Памяці раёна.

** Больш падрабязна аб Г. А. Нікандравай гл. ў 2-й кнізе Хронікі Памяці раёна.

Камандзір аддзялення разведкі артылерыйскага палка, старшы сяржант У. П. Падзігун вызначыўся ў баях каля в. Казьяны Дубровенскага раёна. 14 лістапада 1943 г. знішчыў дзот, а асабовы склад другога дзота узяў у палон. Пры адбіцці контратакі прыняў на сябе камандаванне стралковым батальёнам, падняў яго ў атаку і адкінуў ворага.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22 жніўня 1944 г. Жыве ў г. Белая Царква Кіеўскай вобласці.

У. А. Сапрыкін.

Ю. В. Смірноў.

САПРЫКІН УЛАДЗІМІР АЛЯКСЕЕВІЧ

Нарадзіўся 24.8.1916 г. ў в. Сухадол Краснінскага раёна Ліпецкай вобласці. Рускі. Член КПСС з 1943 г.

Закончыў рабфак ў г. Варонеж у 1937 г. і працаваў настаўнікам. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Камандзір батальёна, капітан У. А. Сапрыкін вызначыўся ў баях за в. Чырвоная Слабада Дубровенскага раёна. У снежні 1943 г. з групай воінаў стрымліваў націск ворага, адбіваючы па 10—12 контратак у дзень. 3.12.1943 г. батальён гітлераўцаў пры падтрымцы 15 танкаў акружыў воінаў. Калі вораг наблізіўся да іх, У. А. Сапрыкін выклікаў на сябе агонь нашай артылерыі. Быў цяжка паранены ў гэтым баі, трапіў у палон. Доўгі час лічыўся загінуўшым. Памёр у Канадзе ў 1990 г.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.6.1944 г.*

СМІРНОЎ ЮРЫЙ ВАСІЛЕВІЧ

Нарадзіўся 2.9.1925 г. ў г. Макар'еў Кастрамской вобласці. Рускі. Член ВЛКСМ.

Працаваў электразваршчыкам. На фронце з 1943 г. Стралок гвардыі радавы Ю. В. Смірноў вызначыўся ў баі за вызваленне Віцебскай вобласці 24.6.1944 г. Каля в. Шалашына ў складзе танкавага дэсанту ён прарваўся ў тыл ворага. Быў цяжка паранены, трапіў у палон. Закатаваны гітлераўцамі 25.6.1944 г. Пахаваны ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна. На магіле пастаўлены абеліск. На месцы расправы гітлераўцаў з патрыётам у в. Шалашына і ў цэнтры саўгаса імя Ю. Смірнова ў в. Буда Дубровенскага раёна пастаўлены помнікі. Імем Ю. В. Смірнова названы вуліцы ў шматлікіх гарадах.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 6.10.1944 г.

Першым уварваўся ў Дуброўну

Поспех савецкіх войск складваўся з цяжкай ратнай працы, подзвігаў соцень тысяч байцоў і камандзіраў, удзельнікаў аперацыі «Баграціён». Быў сярод іх і капітан Васіль Цімафеевіч Прудніkаў, камбат 3-га стралковага батальёна 1108-га стралковага палка 331-й Смаленскай Чырвонасцяжнай ордэна Суворава II ступені стралковай дывізіі.

...Прарыў варожай абароны ў Беларускай аперацыі 1108-ы полк пачаў у раёне вёскі Германы Дубровенскага раёна. У першых ланцугах наступаючых ішоў батальён капітана Прудніkава.

Ва ўзнагародным лісце камбата запісана: «Таварыш Прудніkаў, камандуючы батальёнам пры прарыве варожай абароны на Аршанскім напрамку, праявіў мужнасць і адвагу... Яго батальён смела і

* Больш падрабязна аб подзвігах У. А. Сапрыкіна і Ю. В. Смірнова гл. ў 2-й кнізе Хронікі Памяці раёна.

рашуча атакаваў праціўніка. Капітан Прудніка ў, знаходзячыся ў баявых парадках свайго батальёна, сваёй прысутнасцю натхняў асабовы склад падраздзяленняў на гераічныя подзвігі. Добра былі арганізаваны сувязь і ўзаемадзеянні 3-га батальёна з артылерыйскімі падраздзяленнямі. У выніку чаго батальён паспяхова выканаў баявую задачу, прарваўшы абарону праціўніка, і першым уварваўся ў горад Дуброўна».

Б. Шалуха.

Камандарм Глаголеў

На тэрыторыі нашага раёна на працягу дзесяці месяцаў праходзілі жорсткія баі. У выніку наступлення 31-й і 11-й гвардзейскай армій 23—26 чэрвеня г. Дуброўна і раён былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Вялікая заслуга ў вызваленні раёна належыць 31-й арміі, якой камандаваў Васіль Васілевіч Глаголеў.

Нарадзіўся В.В.Глаголеў у 1898 годзе ў г. Калуга ў сям'і ўрача. У гады першай сусветнай вайны спазнаў усе жахі акопнага жыцця. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў жніўні 1920 года 20-гадовы Глаголеў добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях на Уральскім і Паўднёва-Каўказскім франтах.

У гады Вялікай Айчыннай вайны генерал Глаголеў удзельнічаў у абароне Крыма, змагаўся з ворагам на Паўднёвым Каўказе і на Украіне. У верасні — кастрычніку 1943 года 31-я армія пад камандаваннем Глаголева фарсіравала Днепр і рашучым штурмам завалодала Днепрадзяржынскам і Днепрапятроўскам. 1 лістапада 1943 года Васілю Васілевічу Глаголеву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

За ратныя подзвігі генерал-палкоўнік В. В. Глаголеў быў узнагароджаны таксама двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Суворава I ступені, ордэнам Кутузава I ступені і 5 медалямі, а таксама французскім ордэнам Ганаровага Легіёна і крыжам.

21 верасня 1947 года В.В.Глаголеў загінуў пры выкананні службовых абавязкаў, пахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках. Імем В. В. Глаголева названы вуліца і завулак у Мінску.

М. Шкадаў.



Аднапалчане ля магілы камандарма В. В. Глаголева. Новадзявочыя могілкі ў Маскве.

У баях за Новае Сяло

У сваіх успамінах камандуючы 11-й гвардзейскай арміі генерал-лейтэнант Кузьма Мікітавіч Галіцкі пісаў: «...Мы былі на парозе чацвёртага года вайны. Шлях наш ясны. На досвітку авіяцыя заканчвала бамбёжку, яе грозны гул заціхаў дзесьці на ўсход ад нашага назіральнага пункта. Толькі што атрымана данясенне аб тым, што на працягу дзвюх гадзін больш ста бамбардзіроўшчыкаў наносілі ўдары па артылерыі і апорных пунктах праціўніка ў раёнах востраваў Юр'еў, Ласыршчыкі, Лабаны і Кіраёва.

У восем гадзін 50 мінут пяхота з танкамі пад прыкрыццём штурмавікоў пайшла ў атаку. На ўсіх участках наступлення яна пачалася ў добрым тэмпе».

Актыўны ўдзел у гэтых баях прымала дзевятая рота 245-га гвардзейскага палка 84-й стралковай дывізіі, якой камандаваў старшы лейтэнант Іван Афанасьевіч Волкаў. Рота наносіла ўдар па ворагу пад вёскай Новае Сяло. Праціўнік няспынна абстрэльваў гэты ўчастак фронту. Аднак, нягледзячы на моцны артылерыйскі агонь, рота старшага лейтэнанта І. А. Волкава ўварвалася ў першую, а затым у другую траншэю і замацавалася на занятым рубяжы. Гітлераўцы неаднаразова пераходзілі ў контратакі, але выбіць роту Волкава не здолелі.

24 чэрвеня рота адважных воінаў прасунулася яшчэ некалькі наперад і адбіла ў ворага вышыню. У гэты адказны момант сувязь з камандным пунктам палка была згублена. Аднавіць яе было цяжка, а фрыцы ўзмацнілі агонь па вышыні і пайшлі ў контратаку. Старшы лейтэнант І. А. Волкаў звязаўся з суседняй артылерыйскай часцю і вызваў агонь на сябе.

У баях за г. Орша рота І. А. Волкава знішчыла 50 гітлераўцаў і захапіла ў палон 17. Будучы параненым, яе камандзір не пакінуў поля бою да поўнага выканання загаду камандавання. За подзвігі, праяўленыя ў час вызвалення Дубровенскага раёна і г. Орша, загадам камандавання па 11-й гвардзейскай арміі ад 27 ліпеня 1944 года Іван Афанасьевіч Волкаў быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага.

У баях за вёску Новае Сяло вызначыўся таксама ўраджэнец Чэлябінскай вобласці — кулямётчык Іван Аляксеевіч Букін. У яго ўзнагародавых дакументах гаворыцца, што ў час прарыву абароны ворага 23 чэрвеня 1944 года ў раёне вёскі Новае Сяло кулямётчык паказаў прыклад мужнасці і адвагі. Нягледзячы на моцны агонь праціўніка, ён умела мяняў пазіцыю і агнём свайго кулямёта ўвесь час падтрымліваў наступленне нашай пяхоты. За што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Тым жа загадам ад 1 ліпеня 1944 года ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга гвардыі чырвонаармеец наводчык ручнога кулямёта трэцяга стралковага батальёна 245-га палка армянін Эрванд Бакрадавіч Езініян, які ўдзельнічаў у прарыве абароны ворага пад вёскай Новае Сяло. Яго задачай было знішчэнне варожых снайпераў. Размясціўшыся ў бліндажах, яны наносілі вялікую шкоду наступаючай пяхоце. З рызыкай для жыцця Э. Б. Езініян непрыкметна для ворага падпоўз да бліндажа і закінуў у яго гранату. Калі раздаўся выбух, адважны баец ускочыў у бліндаж. Трое гітлераўцаў былі забіты, а дваіх ён прымусіў здацца ў палон. Рашучыя дзеянні і ініцыятыва кулямётчыка Э. Б. Езініяна садзейнічалі паспяховаму наступленню нашых войск у раёне торфапрадпрыемства «Асінторф» і вызваленню вёскі Новае Сяло.

Ва ўзнагародным лісце гвардыі радавога 245-га палка 84-й гвардзейскай стралковай дывізіі, члена партыі, татарына Халіла Зінатулавіча Хайруліна ёсць такі запіс: «У баях за вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў ручны кулямётчык Хайрулін Халіл праявіў сябе выключна адважным, ініцыятыўным байцом.

Пры прарыве ўмацаванай паласы абароны немцаў у раёне в. Новае Сяло 23 чэрвеня 1944 года таварыш Хайрулін умела выбраў агнявы рубеж і, добра маскіру-

ючыся, здолеў вывесці са строю некалькі разлікаў агнявых кулямётных кропак праціўніка. Тым самым дапамагаючы гвардзейцам рухацца наперад.

Первым уварваўся ў траншэю праціўніка, трапным агнём ачысціў ад ворага шлях сабе і сваім таварышам. У гэтых баях ім знішчана шмат немцаў».

За праяўленую ў гэтым баю адвагу Х. З. Хайрулін быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. А пазней, за фарсіраванне ракі Нёман у Літве ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Да баёў у Беларусі ў камбата 77-га гвардзейскага палка 26-й гвардзейскай стралковай дывізіі гвардыі маёра Анатоля Андрэевіча Сяргеева ўжо былі два баявыя ордэны: Айчыннай вайны II ступені і Чырвонай Зоркі.

23 чэрвеня 1944 года, у першы дзень аперацыі «Багратіён», маёр Сяргееў умела камандаваў батальёнам у баі пад в. Новае Сяло. Батальён разграміў да трох рот гітлераўцаў, знішчыў нямала агнявых кропак. У гэтым батальёне змагаўся і Юрый Смірноў.

За мужнасць і адвагу, умелае кіраўніцтва баямі за вызваленне вёсак Ласыршчыкі, Заградна, Шалашына А. А. Сяргееў быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага. Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена за фарсіраванне ракі Нёман. Пад Кёнігсбергам Герой загінуў.

У той жа дзень, 23 чэрвеня 1944 года, стралковая рота 79-га гвардзейскага стралковага палка 26-й гвардзейскай стралковай дывізіі пад камандаваннем старшага лейтэнанта Суфея Хазіевіча Суф'янава, башкіра па нацыянальнасці, у баі пры штурме ўмацаванняў ворага ўварвалася ў траншэі праціўніка, у якіх знішчыла да сотні нямецкіх салдат і афіцэраў, а 26 узяла ў палон. Асабіста Суф'янаў знішчыў у гэтым баі шэсць гітлераўцаў. Потым яго рота вызначылася ў баях на Аршаншчыне і пры фарсіраванні Нёмана. За здзейсненыя подзвігі гвардыі капітан С. Х. Суф'янаў быў удастоены звання Героя Савецкга Саюза. Цяпер Герой жыве ў роднай Башкірыі.

Б. Шалуха.

Яго смерць стала подзвігам

...Ішоў камсамольскі сход, на якім прысутнічаў і камандзір батальёна. Прымалі ў камсамол маладога байца. Той, некалькі бянтэжачыся агульнай увагай да яго, злёгку блытаўся ў адказах. Слова папрасіў камбат.

— Не глядзіце, таварышы, што ён,— павёў вачыма камандзір у бок байца,— тут збянтэжыўся: на сходзе, ды ў такі адказны момант, як прыём у камсамол, гэта з кожным здарыцца можа. Але я бачыў яго ў баі і скажу вам, як салдат салдатам: ён смелы чалавек і камсамольцам будзе сапраўдным.

Гаварыў гвардыі маёр Анатоль Андрэевіч Сяргееў, камандзір батальёна 77-га гвардзейскага стралковага палка 26-й гвардзейскай стралковай дывізіі. У камсамол прымалі малодшага сержанта Юрыя Смірнова. Было гэта ў 1944 годзе ў раёне Асінторфа, дзе, вярнуўшыся пасля шпіталя, гвардыі маёр А. А. Сяргееў рыхтаваў свой батальён да рашаючага наступлення. Ён ведаў, што перад імі стаіць у абароне добра падрыхтаваная гітлераўская 78-я штурмавая дывізія, якой камандаваў любімец фюрэра генерал-лейтэнант Траут. Упершыню «пазнаёміўся» з ёй Сяргееў пад Жыздрай Калужскай вобласці і вось новая «сустрэча» — на беларускай зямлі.

Камбат гаварыў байцам і камандзірам, указваючы на пазіцыі фашыстаў:

— Гэтыя без яраснага супраціўлення не адступяць. Спадзяванні на лёгкасць прарыву трэба пакінуць раз і назаўсёды.

Так яно і было, асабліва ў першыя дні Беларускай наступальнай аперацыі «Багратіён». 26-я гвардзейская стралковая дывізія ў складзе 11-й гвардзейскай арміі прарывала абарону праціўніка ўздоўж аўтамагістралі Масква—Мінск.

Вызвалены вёскі Новае Сяло, Ласыршчыкі, Заградна. Вёсак, як такіх, няма, засталіся толькі назвы. У гэтых баях гвар-

дыі маёр А. А. Сяргееў дзейнічаў умела, напорыста, вынікова. Раніцай 25 чэрвеня 1944 года гвардзейцы батальёна вызвалілі размешчаную на аўтамагістралі вёску Шалашына. Непадалёку ад яе знайшлі штабны бліндаж, а ў ім — распятага на крыжы Юрыя Смірнова. На стале ляжаў яго камсамольскі білет...

Напярэдадні ноччу на аўтамагістраль Мінск—Масква ў тыл ворага прарываўся танкавы дэсант. На брані баявых машын у няроўны бой ішлі 200 добраахвотнікаў з батальёна маёра Сяргеева. Сярод іх быў і Юрый Смірноў. Ён толькі нядаўна вярнуўся са шпіталя, яго не хацелі браць у дэсантную групу, але Юрый быў настойлівы і дабіўся свайго.

У начной танкавай атацы ён, ранены, звалiўся з брані, без прытомнасці быў узяты ў палон. У безвыходнай ярасці, не дабіўшыся ад Ю. Смірнова ні слова, гітлераўцы распялі яго на крыжы...

Батальён ішоў наперад. У імклівым наступленні дагнала вестка: за баявыя дзеянні ў дні прарыву на тэрыторыі Дубровенскага раёна камбат узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, гвардыі старшы лейтэнант Вячаслаў Сілавіч Зелянюк, які рыхтаваў пяхотную групу дэсанта, — ордэнам Чырвонага Сцяга пасмяротна, гвардыі малодшаму сяржанту Юрыю Смірнову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна.

Б. Шалуха, Ф. Кулакоў.

Адзіным лёсам знітаваныя

На ўчастку фронту торфапрадпрыемства «Асінторф» — вёска Буда наступала 26-я гвардзейская стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра Р. І. Чарнова. У дывізіі ў той час было каля пяці тысяч воінаў чатырнаццаці нацыянальнасцей.

Татарын — камуніст гвардыі капітан Зарыф Аўхадзеевіч Аўхадзееў у момант прарыву нямецкай абароны пад Асінбудам усклікнуў: «За шматпакутную Беларусь, наперад, на разгром захопнікаў!». Ён першы ўварваўся ў траншэю праціўніка, дзе ў рукапашным паядынку знішчыў двух гітлераўцаў, а трох узяў у палон.

Воіны 6-й роты 75-га гвардзейскага стралковага палка, якой камандаваў гвардыі старшы лейтэнант камуніст Паўлаў, уварваліся ў вёску Ласыршчыкі і ў кароткім, жорсткім баі поўнасцю авалодалі ёю, захапіўшы ў палон 85 салдат і афіцэраў праціўніка. Сам Паўлаў у гэтым баі загінуў смерцю героя.

У сярэдзіне дня 23 чэрвеня вораг пайшоў у контратаку супраць 7-й роты таго ж палка. Контратака была адбіта з вялікімі стратамі для праціўніка. Храбра змагаліся нашы воіны. Гвардыі радавыя Валій Джакараў і Віктар Скорыкаў былі паранены. Ім прапанавалі пакінуць поле бою. Яны адмовіліся і засталіся ў страі.

Асабісты прыклад гераізму і адвагі паказаў у баі парторг 5-й роты 75-га палка старшына Аляксей Аб'едкаў. Ён хутчэй за ўсіх дабег да нямецкай траншэі і ўбачыў, што злева ад яго вядзе агонь па нашых атакуючых байцах станковы кулямёт. Аб'едкаў з ходу пераскочыў траншэю, забег у тыл кулямётчыкам і расстраляў іх з аўтамата. Затым кінуўся ў траншэю і, расчышчаючы сабе шлях гранатамі, моцна дапамог нашым воінам. Асабіста старшына захапіў у палон чатырох нямецкіх ваякаў.

Асабліва паспяхова дзейнічаў пры прарыве абароны праціўніка 2-і батальён 79-га палка дывізіі. Камандаваў батальёнам гвардыі маёр Азізаў, яго намеснікам па палітчастцы быў гвардыі капітан Федулаў. Як толькі быў пададзены сігнал атакі, першымі падняліся камуністы і камсамольцы батальёна. Увесь батальён імкліва ўварваўся ў першую траншэю праціўніка і не спыняючыся, кінуўся да другой. Пераадолеўшы і яе, захапіў населены пункт, акапаўся і выклікаў загараджальны агонь нашай артылерыі. Ідучы за вогненным валам, батальён уварваўся ў трэцюю траншэю.

У час бою за вёску Шабаны першымі туды ўварваліся чатыры гвардзейцы. Іх баявыя таварышы адсталі. Праціўнік скарыстаўся гэтым і сілай да роты атакаваў чатырох смельчакоў. Нашы байцы сустрэлі іх гранатамі і дружным аўтаматным агнём. Атака была адбіта, а вёска ўтрымана да падыходу асноўных сіл батальёна. Увесь полк даведаўся аб гэтым паядынку са спецыяльна выпушчанай лістоўкі.

А ў баі за вёску Буда вызначыўся памочнік камандзіра ўзвода 8-й роты татарын з Пензенскай вобласці Жафір Жалілаў. З групай байцоў ён дабраўся да трох нямецкіх бліндажоў, з якіх гітлераўцы вялі агонь. Дабегшы да першага бліндажа, Жалілаў кінуў туды дзве гранаты, знішчыўшы сем гітлераўцаў. Калі падбег да другога бліндажа, над уваходам у яго ўжо матляўся белы флаг. Байцы Жалілава ўзялі ў двух бліндажах у палон каля 20 немцаў...

Прыкладаў выключнай мужнасці воінаў было шмат. Тым жа чэрвеньскім днём камандзір агнявога ўзвода гвардыі малодшы сяржант Іван Плыс, умела мяняючы агнявыя пазіцыі пад вёскай Галяшы, выявіў браняпоезд ворага, які вёў знішчальны агонь па нашых наступаючых танках. Артылерысты Івана Плыса ўступілі ў паядынак з браняпоездам і прымусілі яго змоўкнуць. У той жа дзень яны агнём прамой наводкай дапамаглі нашай пяхоце адбіць варожую контратаку, знішчыўшы пры гэтым да ўзвода гітлераўцаў і самаходку «фердынанд». Гвардыі малодшы сяржант Іван Плыс за адвагу ў гэтых баях быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

25 чэрвеня батальён гвардыі капітана Дзмітрыя Вавілава 83-й гвардзейскай стралковай дывізіі адбіваў бесперапынныя контратакі праціўніка, які імкнуўся вярнуць страчаныя пазіцыі пад вёскай Ступакі. Тут фашысты пакінулі каля паўтары сотні трупаў. Не адступалі нашы байцы і тады, калі ў наступную контратаку гітлераўцы пайшлі пад прыкрыццём танкаў.

Подзвіг камбата быў адзначаны ордэнам Аляксандра Неўскага.

Б. Шалуха.

Ганаровы грамадзянін Асінторфа

У дэпутацкім пакоі Асінторфскага пасялковага Савета вісіць плакат. На яго занесены імёны ганаровых грамадзян пасёлка. Гэтага гонару яны заслужылі шматгадовай і плённай працай на торфапрадпрыемстве ці мужнасцю і гераізмам у баях за вызваленне пасёлка ад нямецкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сярод ганаровых грамадзян — Юрый Іосіфавіч Анусайціс. Калі пачалася знакамітая аперацыя «Баграціён», ён камандаваў батальёнам 95-га стралковага палка 31-й дывізіі. Воіны батальёна пад умелым яго камандаваннем прынялі непасрэдны ўдзел у баях за вызваленне Асінторфа.

І не толькі ў баях за Дубровеншчыну вызначыўся адважны камандзір. У перыяд фарсіравання Нёмана Юрый Іосіфавіч Анусайціс разам з воінамі батальёна нечакана для ворага пераправіўся цераз раку і захапіў вельмі важны плацдарм. За мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі яму было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза... А потым былі баі ў Прыбалтыцы і ў Берліне.

Пасля перамогі над ворагам Ю. І. Анусайціс закончыў ваенную акадэмію, быў на розных камандных пастах у Савецкай Арміі. Цяпер генерал-маёр у адстаўцы жыве ў Маскве. Падтрымлівае цесныя сувязі з асінторфцамі, чырвонымі следапытамі тутэйшай сярэдняй школы.

К. Крук,
настаўнік-краязнаўца.

У баях за Бацькаўшчыну

За вызваленне нашага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў змагаліся тысячы савецкіх воінаў з розных куткоў нашай неабсяжнай Радзімы. Былі сярод іх і ўраджэнцы Дубровеншчыны, для якіх баі за родную зямлю набывалі асаблівы сэнс. Адзін з іх — Аляксандр Арцёмавіч Бажкоў.

У калгасе «Усход» Аляксандр праславіўся як жывёлавод, а воінам Чырвонай Арміі стаў у апошні перадваенны год. Служыў у Маскве ў войсках супрацьпаветранай абароны — у зенітнай артылерыі. 251-ы полк больш за ўсё знаходзіўся на танканебяспечных участках, змагаўся пры патрэбе і супраць авіяцыі. Ён утрымліваў абарону ў раёне горада Таржок, прыкрываў чыгуначны мост на лініі Масква—Ленінград.

Налёты варожай авіяцыі на мост паўтараліся адзін за другім. У час аднаго з такіх налётаў Аляксандр асабіста збіў фашысцкага сцярвятніка і быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

...Ішоў 1943 год. На адным з участкаў фронту немцы рыхтавалі прарыў нашай абароны. Падцягнулі сюды свае танкавыя часці.

Бой быў выключна жорсткі, асобныя танкі прарваліся да нашых рубяжоў. З адным з іх уступіў у паядынак разлік Аляксандра Бажкова. Сталёвая махіна набліжалася. Яшчэ хвіліна — і яна ўварвецца на пазіцыі батарэі. І тут яе спыніў бранябойны снарад, трапна выпушчаны з гарматы Аляксандра Бажкова. Стойка трымаліся ўсе нашы разлікі, фашысты поспеху не дабіліся. За гэты бой Аляксандра ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

У палку адбылася замена матэрыяльнай часткі — цяпер яго асноўнай зброяй сталі пушкі калібру 76 міліметраў, а часць стала называцца 529-ы знішчальны супрацьтанкавы полк рэзерву Галоўнага камандавання. Яго кідалі па ўсім фронце. Вораг адступаў, і разам з фронтам 529-ы знішчальны набліжаўся па Смаленскім напрамку да беларускай зямлі. Полк прызначылі для падтрымкі 42-й танкавай брыгады, якая наступала па тэрыторыі нашага раёна.

У раёне вёскі Новая Тухінь праціўнік заняў выгадныя пазіцыі. Была пастаўлена задача — выбіць яго з займаемых рубяжоў. Баі пачаліся 4 сакавіка 1944 года. 529-ы полк заняў абарону ў в. Засценкі, ад якой уцалела адна хата.

Атакі змяняліся контратакамі, байцы і камандзіры падалі ад знямогі, але трэба было выканаць пастаўленую задачу. Аляксандра Бажкова параніла. Але ён, камандзір гарматы, застаўся са сваім разлікам да канца бою і толькі пасля яго быў адпраўлены ў шпіталь. Гэта была горкая няўдача — выбыць са строю ў такі час. Не суцяшала нават тое, што за мужнасць, праяўленую ў тым баі, яго зноў узнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Пасля шпіталю Аляксандра накіравалі на курсы палітсаставу, потым ён стаў парторгам батальёна стралковага палка. Да гэтага часу Беларусь ужо была ачышчана ад фашысцкай погані.

Потым былі баі ва Усходняй Прусіі. Там за асабістую адвагу і мужнасць, умелую палітработу ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

А скончыўся баявы шлях нашага земляка пад Прагай.

С. Свойнікаў,
настаўнік,
ветэран вайны, в. Н. Тухінь.

Вызваляў свой раён

Жыве ў вёсцы Фесеўка ветэран вайны і працы Васіль Макаравіч Лукашоў. Цяпер ён на пенсіі, а да гэтага часу працаваў у калгасе імя XXI з'езда КПСС. Старанным быў працаўніком, а жыў і жыве заўсёды па сумленню.

Васіль Макаравіч — былы франтавік. І ёсць у яго біяграфіі адна цікавая дэталь: у саставе 220-й стралковай дывізіі ён прымаў удзел у вызваленні роднай Дубровеншчыны. Баі насілі выключна жорсткі характар, нашы войскі неслі вялікія страты.

Вось і Васіль Лукашоў дайшоў з баямі толькі да вёскі Бурая. І тут салдата цяжка параніла. Крыўдна было выбываць са строю ў такі гарачы час, але ж магло быць і горш.

Ц. Куляшоў,
удзельнік вайны, в. Расасна.

За родны дом

Ён быў хлебаробам. А калі ў невялікую вёску Чарнаручча Засценкаўскага сельскага Савета прыйшла трывожная вестка аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны, Якаў Цярэнцьевіч Шакура добраахвотнікам пайшоў на фронт. Ваяваў пад Вязьмай і Смаленскам, Гусінам і Красным. З баямі дайшоў салдат да сваёй роднай вёскі.

І вось так знаёмыя з дзяцінства мясціны. Рукой падаць да вёскі, дзе ён рос, дзе жывуць жонка і дзеці. Ці жывыя яшчэ?

Але не так проста было ўзяць вёску, якую гітлераўцы ператварылі ў моцны апорны пункт. Трэба было перахітрыць ворага.

Група салдат, сярод якіх быў і Я. Шакура, завязала бой, у ходзе якога быў цяжка паранены Якаў Шакура. На вялікі жаль, рана аказалася смяртэльнай.

...Мемарыяльны комплекс «Рыленкі» — помнік загінуўшым воінам. Сярод тысяч пахаваных тут патрыётаў Айчыны і Якаў Цярэнцьевіч Шакура. Часта прыходзяць сюды жонка загінуўшага салдата-вызваліцеля Ульяна Сяргееўна, дачка Кацярына і сын Аляксандр, прыходзяць унукі і землякі слаўнага воіна, каб нізка пакланіцца блізкаму і роднаму чалавеку, успомніць яго добрым словам...

А. Галяцкі, настаўнік.

З успамінаў жыхара в. Русаны старшага сяржанта Я. Шалатоніна

Я быў пісарам батальёна сувязі, які ўваходзіў у склад 220-й стралковай дывізіі. Як ураджэнца Дубровенскага раёна мяне выклікаў начальнік штаба дывізіі палкоўнік Кабышкін і загадаў быць правадніком аператыўнай групы, паказваць, дзе на рэчках мелкаводдзе, дзе былі масты, як лепш прайсці ў горад.

Яго загад абрадаваў мяне. На сваёй зямлі мне знаёмы быў кожны кусцік, а ў вёсках і горадзе — кожны дом.

Пасля артпадрыхтоўкі і бамбёжкі перадавых пазіцый праціўніка нашы часці пайшлі ў наступленне. 376-ы полк, у якім я знаходзіўся, вызваліў вёскі Холаўе, Бурая і выйшаў на ўскраіну горада. Многія дамы гарэлі, іх ніхто не тушыў. Здавалася, горад вымер. Праходзячы па Чырвонаармейскай вуліцы, мы заўважылі нямецкую аўтамашыну, якая стаяла на двары маслазавода. Байцы хутка акружылі двор. І хтосьці з іх даў аўтаматную чаргу па вокнах падвальнага памяшкання. Пасля гэтага праз дзверы паказалася белае палотнішча і са склепа пачалі выходзіць з узнятымі рукамі гітлераўцы. Іх было 23, у тым ліку два афіцэры.

Затым аднекуль з развалін выскачыў абарваны і знясілены ад голаду хлопчык, якому было не больш пяці гадоў. Ён бег па вуліцы і крычаў:

— Мама, мама!

Але нідзе ніякай мамы не было. Мы паклікалі хлопчыка, далі хлеба, цукру і ён кудысьці знік так непрыкметна, як і з'явіўся.

У Лугавецкім гаі нам дасталіся багатыя трафеі: многа аўтамашын і павозак з боепрыпасамі, харчаваннем і гаручым. Тут жа мы і заначавалі. Раніцой да нас пачалі падыходзіць застаўшыеся ў жывых жыхары горада Дуброўна. Яны кідаліся ў абдымкі, расказвалі аб пакутах, перажытых у прыфрантавым горадзе.

Надзяліўшы іх трафейнымі прадуктамі, мы развіталіся з дубровенцамі і пайшлі далей, на захад.

Я ВЯРНУЎСЯ ДАМОЎ З ПЕРАМОГАЙ

У 1944 годзе нашу 308-ю штурмавую ордэна Суворава і Кутузава дывізію перакінулі з 1-га Прыбалтыйскага на 3-ці Беларускі фронт. Мой родны 624-ы ШАП (штурмавы авіяцыйны полк) вёў баі ў напрамку Дуброўны, Оршы, Аршанскага скрыжавання і па шашы на Віцебск.

Што ж я ўбачыў на роднай зямлі? Па ўсёй тэрыторыі ад Краснога да Пірагоўскага сельсавета мясцовасць была зусім пустая — ніводнай вёскі, ніводнай хаты. Палын, дзядоўнік — вось усё, што расло на зямлі. А ў зямлі былі схаваны бліндажы, зямлянкі, траншэі, доты, дзоты. І як вялізныя шрамы цягнуліся супрацьтанкавыя рвы — вораг надзейна падрыхтаваўся да абароны.

Мы павінны былі зрабіць пасадку на аэрадроме паміж Станіслававам і Дуброўнай, але нас перанацэлілі на Малыя Якаўлевічы каля Оршы. Там жа базіравалася эскадрылля «Нармандыя-Нёман». А ў Дуброўне прызямліўся полк на самалётах ПЕ-2.

З дазволу камандзіра палка я атрымаў магчымасць заехаць да сваёй хаты, адшукаць застаўшыхся ў жывых родных. Гэта было адразу пасля вызвалення нашых мясцін. Прабыў я ў сваёй вёсцы ўсяго трыццаць мінут. Знайшоў тры сям'і аднавяскоўцаў, сваіх двух братоў, сястру. Сустрэча была кароткая і цяжкая. Я ведаў, што мае родныя былі расстраляны за дыверсійную падпольную дзейнасць. Аб гэтым паведамілі са штаба партызанскага руху. Але дзе і як яны былі пахаваны, аб гэтым мне не вядома.

С. Свойнікаў.

Нашы землякі — героі

АВЕКАЎ Іван Аўдзеевіч, нарадзіўся 19.5.1919 года на ст. Асінаўка Дубровенскага раёна. Герой Савецкага Саюза (24.8.1943). З рабочых. Беларус. Кандыдат у члены КПСС. У Чырвонай Арміі з 1937 г. Скончыў ваеннае авіяцыйнае вучылішча. З чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Заходнім і Цэнтральным франтах. Удзельнік абароны Масквы, Тулы. Камандзір знішчальнай эскадрыллі капітан І. А. Авекаў здзейсніў 178 баявых вылетаў, з іх 45 на штурмоўку войск і аэрадромаў праціўніка, збіў 15 варожых самалётаў, 1 тараніў, 23 знішчыў на аэрадромах. Загінуў 17.4.1943 г. Пахаваны ў г. Данкоў Ліпецкай вобласці, у брацкай магіле, на якой пастаўлены помнік.

...20 марта 1942 г. бойцы 201-й стрелковой дивизии, стоявшие в обороне вдоль берега реки Вори, у села Воскресенского, были свидетелями воздушного боя советского истребителя с пятью «мессершмиттами». В этом бою И. А. Авеков сбил два мессера, одного из них таранил ударом.

...Это был не первый бой и не первые сбитые фашистские самолеты у командира эскадрильи 510-го истребительного авиаполка капитана Ивана Авекова. Еще в первый день Великой Отечественной войны 22 июня 1941 г., сопровождая бомбардировщиков на Юго-Западном фронте, он со своим звеном вступил в бой с семёркой «мессершмиттов». Несмотря на более чем двукратное численное превосходство врага, советские лётчики одержали победу. Они сбили четыре и повредили один вражеский истребитель. Два Ме-109 в том бою лично уничтожил Иван Авеков. Бомбардировщики, выполнившие боевое задание, вернулись на свой аэродром. Не имело потерь и звено Авекова.

...Но война не бывает без жертв. Капитан Авеков Иван Авдеевич погиб в бою в апреле 1943 года, когда на Смоленской земле шло наступление войск Западного и Калининского фронтов.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Воробьёв М. В., Храпченков А. В. В боях на Смоленской земле. М., 1975. С. 119—121.

І. А. Авекаў.

А. К. Габрусеў.

І. Дз. Кандрацьеў.

М. І. Смарчкоў.

ГАБРУСЕЎ Аляксей Канстанцінавіч, нарадзіўся 1.1.1922 года ў в. Гарошкава Дубровенскага раёна. Герой Савецкага Саюза (10.1.1944). З сялян. Член КПСС з 1964 г. У Чырвонай Арміі з верасня 1941 г. Удзельнік абароны Масквы, баёў на Варонежскім і 1-м Украінскім франтах, вызвалення Польшчы, Чэхаславакіі.

Старшы сяржант А. К. Габрусеў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на поўнач ад Кіева ў верасні 1943 г. Ноччу з групай разведчыкаў пераправіўся цераз раку каля в. Вышгарад і разведаў абарончыя ўмацаванні ворага. Калі ў сутычцы з фашыстамі загінуў камандзір, Габрусеў узначаліў узвод, які ў баях за плацдарм адбіў 10 варожых атак. Пасля вайны да вясны 1964 г. служыў ва Узброеных Сілах, падпалкоўнік запасу. Жыве ў Феадосіі.

* * *

Мне двойчы давялося фарсіраваць Днепр.

Першы раз наш узвод разведкі фарсіраваў раку на поўнач ад Кіева. Мэта пераправы: прашчупаць абарону праціўніка, захапіць плацдарм і стварыць бачнасць, што іменна тут будуць пераправіцца і наносіць удар асноўныя нашы сілы. Узвод выканаў заданне паспяхова, але давялося нам вельмі і вельмі цяжка...

Нас знялі з плацдарма пад Вышгарадам, вярнулі на правы бераг, перакінулі ў іншае месца. А праз тыдзень узвод атрымаў загад зноў пераправіцца цераз Днепр, на гэты раз каля населенага пункта Пятрыйцы. Трэба было глыбей прабрацца ў абарону праціўніка і дасканала разведаць яе.

Маючы вопыт, пераправіліся мы паспяхова, але ў размяшчэнні ворага нарваліся на яго танкі і пяхоту. І зноў заставалася адно: прымаць бой. Кулямётным і аўтаматным агнём мы адсеклі пяхоту ад танкаў, занялі зручную для абароны пазіцыю. Мае таварышы былі храбрымі, абстраляным воінамі і не пахіснуліся перад тварам смяртэльнай небяспекі. Гэта выратавала нас. Мы адбіваліся, пакуль не прыйшла дапамога.

Фарсіраваннем Дняпра каля Пятрыйцаў быў створаны так званы Люцяжскі плацдарм, з якога войскі 1-га Украінскага фронту 3 лістапада 1943 г. пачалі наступленне і 6 лістапада пасля ўпартых баёў штурмам вызвалілі Кіеў ад гітлераўцаў.

За ўдзел у фарсіраванні Дняпра мне было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

КАНДРАЦЬЕЎ Іван Дзімітрыевіч, нарадзіўся 29.8(11.9).1917 г. ў в. Гарошкава Дубровенскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. Член КПСС з 1943 г. У Чырвонай Арміі з 1941 г., на фронце з ліпеня 1942 г. — камандзір разліку станковага кулямёта. Вызначыўся пры фарсіраванні Буга і Прута. 15 і 26.3.1944 г. знішчыў 5 варожых агнявых кропак, гэтым забяспечыў пераправу падраздзяленняў. Пасля вайны працаваў старшынёй Засценкаўскага сельсавета, затым на чыгунцы. Памёр 8.6.1955 г. Яго імя прысвоена Засценкаўскай сярэдняй школе Дубровенскага раёна.

СМАРЧКОЎ Мікіта Іванавіч, нарадзіўся 17(30).4.1916 года ў в. Трафіменкі Дубровенскага раёна. Герой Саваецкага Саюза (1945). З сялян. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Балашоўскую школу ваенных лётчыкаў (1941). У Айчынную вайну з 1941 г. на Калінінскім, Варонежскім, 1-м, 2-м, 3-м Украінскіх франтах, камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік баёў пад Масквой, Варонежам, на Курскай дузе, Украіне, у Румыніі, Югаславіі, Венгрыі. Зрабіў 196 баявых вылетаў.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, югаслаўскім ордэнам Партызанскай Зоркі, медалямі.

Пасля вайны працаваў у Чарнігаве на савецкай і гаспадарчых пасадах.

— Сярод баявых узнагарод, — расказвае Мі-

кіта Іванавіч,— свята берагу я югаслаўскі ордэн «Партызанская Зорка». За што ж я ўдастоены гэтай узнагароды?

Нашы лётчыкі ў складзе выдзеленай авіягрупы рыхтавалі кадры для народна-вызваленчай арміі Югаславіі, і я быў у ліку інструктараў. За кароткі час мы падрыхтавалі 88 лётчыкаў-штурмавікоў і 96 знішчальнікаў, а ўсяго каля 300 лётчыкаў і многа іншых авіяспецыялістаў. Пры абучэнні мы, інструктары, рабілі па 10 баявых вылетаў з югаслаўскімі сябрамі. Так былі падрыхтаваны тры штурмавыя і тры знішчальныя палкі для югаслаўскіх ваенна-паветраных сіл. У выніку закладзена аснова развіцця ў гэтай вызваленай ад фашызму краіне аднаго з асноўных радоў войск.

Я. Г. Салаў з жонкай.

РАДУТА Фёдар Міхайлавіч, нарадзіўся 5(17).6.1890 года ў мястэчку Дуброўна, памёр 15.5.1966 года. Удзельнік грамадзянскай вайны, генерал-маёр інтэндантскай службы (1943). З рабочых. Член КПСС з 1941 г. У Чырвонай Арміі з верасня 1918 года на Заходнім, Усходнім, Паўднёвым, Каўказскім франтах, начальнік штаба брыгады. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну на Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах, удзельнік Чарнігава-Прыпяцкай, Гомельска-Рэчыцкай, Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай аперацый. З 1944 года намеснік начальніка ваеннай акадэміі. З 1946 г. ў адстаўцы. Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі.

ТРУТКА Іван Іванавіч, нарадзіўся 14(26).9.1888 года ў мястэчку Дуброўна, памёр 21.9.1941 года. Удзельнік грамадзянскай вайны. Генерал-маёр (1940). З сялян. Член КПСС з 1920 г. Скончыў ваеннае вучылішча (1916), ваенную акадэмію РККА (1933). З 1915 г. ў арміі, з 1918 г. ў Чырвонай Арміі на Паўднёвым фронце, удзельнік барацьбы на Тамбоўшчыне, камандзір роты, батальёна. З 1924 г. начальнік сектара, намеснік начальніка аддзела штаба РСЧА, выкладчык ваеннай акадэміі. У Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім фронце, начальнік тыла 26-й арміі. Выходзячы з акружэння, смяротна паранены.

У сяле Бадакова Палтаўскай вобласці воіну-генералу пастаўлены помнік, мясцовая школа носіць яго імя.

САЛАЎ Яфрэм Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1912 годзе ў вёсцы Чырвоная Слабада Дубровенскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1931 года. У Чырвонай Арміі з 1932 года. На фронце з ліпеня 1941 года. Удзельнік абароны Смаленска і Масквы, баёў за вызваленне Калужскай і іншых абласцей Расіі, Магілёўскай вобласці Беларусі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга і пасмяротна — ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Загінуў камандзір 718-га стралковага палка Я. Г. Салаў 28 чэрвеня 1944 года пад Магілёвам. Імя яго носіць піянерскі атрад СШ № 2 г. Новасібірска.

Калі паклікала вайна

У той нядзельны дзень, 22 чэрвеня 1941 года, мы з жонкай пераехалі цераз Дняпро, пайшлі на гарадскі рынак. Па дарозе і пачулі страшэнную вестку.

А назаўтра я ўжо быў у райваенкамаце. Тут было многа знаёмых, таварышаў. Нас накіравалі на зборны пункт у Лугавецкі гай, адкуль наступнай раніцай паходным маршам адправілі на Віцебск. Адтуль адыходзілі на ўсход пакуль не спыніліся пад Масквой. Я стаў тэлефаністам 528-га артылерыйскагна палка, у якім прайшоў праз усю вайну. А прайсці давялося вельмі многа, аж да нямецкай ракі Эльбы.

За смелыя дзеянні на Арлоўска-Курскай дузе быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Чырвонай Зоркі, які, дарэчы, атрымаў пасля вайны.

І вось вяртанне пасля перамогі дамоў, пра якое марылася, снілі ў трывожных салдацкіх снах. Сям'ю знайшоў у чужых людзей — родную хату змяло вайной. Але гэта тады не палохала. Верылася: калі мы справіліся з такой фашысцкай навалай, то зможам пабудаваць жыццё яшчэ больш заможнае і светлае.

І. Несцераў.

Яны абаранялі Айчыну

Мужна змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі былыя вучні Ляднянскай сямігадовай школы. Вось імёны некаторых з іх.

Ягор Кручкоў скончыў школу ў 1930 годзе. Па пуцёўцы райкома камсамола быў накіраваны ў школу ваенных лётчыкаў, якую скончыў з адзнакай. У хуткім часе ён стаў камуністам.

З першых дзён вайны Ягор Кручкоў смела біўся з ворагам. На яго рахунку пяць збітых варожых самалётаў, шмат знішчанай на зямлі варожай тэхнікі і жывой сілы ворага, за што быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, медалём «За адвагу». Адважны сокал загінуў у няроўным баі.

Такая ж доля напаткала братоў Аляксандра і Івана Цягловых. Нямнога звестак аб іх засталося, але вядома, што яны сумленна выканалі свой абавязак перад Радзімай.

Актыўнымі ўдзельнікамі вайны былі і браты Ландарскія. Сяргей да вайны скончыў тэхнікум ільнаводства ў Вязьме. Перад вайной працаваў у апараце ЦК КП Беларусі. Пасля вайны скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію і доўгі час працаваў у сельгасаддзеле ЦК КПБ.

Яго брат Аляксандр скончыў аўтамабільны тэхнікум у Ленінградзе. Потым яму давялося абараняць горад-герой на Няве, вытрымаць найвялікшае выпрабаванне блакадай.

Яшчэ адзін лёс — гвардыі лейтэнанта, кавалера ордэнаў Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, медаля «За адвагу» Данііла Еўсцігнеевіча Нікіціна з вёскі Масліно. Ён таксама вучыўся ў Ляднянскай школе. Пазней сям'я Нікіціных пераехала ў Маскву. Там Данііл скончыў аэраклуб, затым авіяцыйнае вучылішча. З першых дзён вайны камсамолец-лётчык на фронце. Ён змагаўся ў гвардзейскім знішчальным авіяпалку на Украіне, лётаў на разведку сіл праціўніка, у паветраных баях асабіста збіў чатыры самалёты ворага.

5 мая 1942 года ў баі над горадам Шахты Данііл Нікіцін, калі ў яго скончыліся боепрыпасы, пайшоў на таран і збіў фашысцкага сцярвятніка. Але і яго знішчальнік быў вельмі моцна пашкоджаны. Адважны пілот загінуў.

Добрай памяці землякоў заслугоўвае і Максім Капцюраў, выпускнік школы 1930 года, даваенны сакратар былога Фесеўскага сельсавета. Спачатку ён быў партызанам, затым стаў воінам Чырвонай Арміі, прайшоў баявы шлях да Берліна. У баях за сталіцу Германіі ў красавіку 1945 года абарвалася яго жыццё.

...Толькі некалькі прозвішчаў воінаў-выхаванцаў адной школы-сямігодкі. А іх было куды больш.

Усім вядома імя савецкага ваеннага дзеяча, Маршала Савецкага Саюза, двойчы Героя Савецкага Саюза Івана Ігнатавіча Якубоўскага. Але, бадай, не ўсе ведаюць, што ў 1930—1931 гадах ён працаваў упаўнаважаным па нарыхтоўках камітэта нарыхтовак земляробства БССР па існаваўшаму тады Ляднянскаму раёну. Аб гэтым Іван Ігнатавіч сам расказваў, калі прыязджаў у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Л. Чванаў.

Танкіст з вёскі Барсукі

Андрэй Міхайлавіч Усаў нарадзіўся ў вёсцы Барсукі Дубровенскага раёна. Да прызыву ў Чырвоную Армію закончыў дзевяць класаў. Камандзірам гарматы ўдзельнічаў у верасні 1939 года ў вызваленні Заходняй Беларусі, а затым у савецка-фінляндскай вайне. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў якасці камандзіра вежы 76-міліметровай гарматы танка «КВ-1» удзельнічаў у абароне Ленінграда.

18 жніўня гітлераўцы танкавым клінам спрабавалі прабіцца на Гатчыну, а ад-

туль — прамы шлях на Ленінград. Паступіў загад: шлях ворагу павінна перагарадзіць рота старшага лейтэнанта Калабанава, у складзе якой знаходзіўся і экіпаж танка Усава. Супраць аднаго «КВ» ламілася 43 варожых танка. Усяго за трыццаць мінут экіпаж «КВ» № 864 падбіў 22 нямецкія танкі. Усе члены гераічнага экіпажа былі адзначаны баявымі ордэнамі. А Андрэю Міхайлавічу Усаву ў Смольным уручылі ордэн Леніна. Пасля таго векапомнага бою наш зямляк яшчэ доўга ваяваў пад Ленінградам, двойчы гарэў і дайшоў да Берліна. Быў узнагароджаны яшчэ трыма баявымі ордэнамі, многімі медалямі.

Пасля вайны Андрэй Міхайлавіч Усаў жыў у г. Талачын, працаваў на савецкай і гаспадарчай рабоце. Памёр у 1987 годзе.

Л. Сузін.

Бессмяроцце

У студзені 1942 года ў бітве за горад Сухінічы Калужскай вобласці гераічны подзвіг здзейсніў адказны сакратар бюро ВЛКСМ 604-га асобнага стралковага батальёна малодшы палітрук Пётр Сямёнавіч Федарцоў.

У вайсковую часць ён прыбыў 4 ліпеня 1941 года з горада Дуброўна. Непадалёку ад гэтага ж горада, у вёсцы Ерамееўшчына, у 1916 годзе ён нарадзіўся. Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, а потым у савецка-фінляндскай вайне.

За мужнасць і гераізм быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У час савецка-фінляндскай вайны быў цяжка паранены. Пасля выздараўлення, у 1940 годзе, дэмабілізаваўся ў званні малодшага палітрука і працаваў у Дубровенскім райваенкамаце. І зноў вайна, на гэты раз Вялікая Айчынная.

...Напярэдадні таго дня, 4 студзеня, у камбата адбылася нарада афіцэрскага саставу. Абмяркоўвалі план маючага быць наступлення на подступах да горада Сунічы. П. С. Федарцоў папрасіў накіраваць яго ў першую сапёрную роту.

На досвітку баявыя парадкі сапёраў рушылі на ворага. Але сілы былі няроўнымі. Немцы пачалі абыходзіць баявыя парадкі роты з правага флангу, наперадзе якога знаходзіўся Федарцоў. У самы разгар бою скончыліся патроны. Аддаўшы свой ППШ раненаму байцу, Пётр схапіў яго вінтоўку, абоймы з патронамі і працягваў трапнымі стрэламі біць ворага. Калі становішча воінаў-сапёраў стала крытычным, бывалы воін Федарцоў не страціў вытрымкі. Ён загадаў сапёрам забраць усіх параненых і адыходзіць назад, а сам з невялікай групай байцоў застаўся прыкрываць агнём адыходзячых.

Немцы працягвалі насядаць, аднак агонь смельчакоў перагароджваў ім шлях. Будучы параненым у левую руку, Федарцоў працягваў адстрэльвацца з рэвальвера. Спрабуючы перабрацца бліжэй да сваіх таварышаў, ён прыўстаў, але ў тую ж мінуту варожы аўтаматчык доўгай чаргой літаральна прашыў яму абедзве нагі.

Да месца, дзе ляжаў Пётр Федарцоў, наблізілася некалькі гітлераўцаў. Цяжка паранены Пётр, сабраўшы апошнія сілы, прыўзняўся, вырваў чэку з гранаты і ўзняў яе над галавой. Раздаўся аглушальны выбух.

Калі заціх бой, сябры знайшлі ў варонцы мёртвага Пятра Федарцова, а па яе краях валяліся трупы варожых салдат.

Пахавалі П. С. Федарцова ў сяле Стрэльна, паблізу г. Сухінічы, з усімі воінскімі ўшанаваннямі.

Дывізіённая газета «Вперёд, к победе» падрабязна расказала пра подзвіг П. С. Федарцова. А неўзабаве прыйшло паведамленне аб тым, што ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Пётр Сямёнавіч Федарцоў за здзейснены подзвіг узнагароджаны ордэнам Леніна пасмяротна.

Л. Дудараў.

Мікалай Шаранда паўтарыў подзвіг Гастэлы

У Мардашэвіцкай сямігодцы вучыўся Мікалай Шаранда з вёскі Няроды. Быў ён дапытлівым, а ў вучобе — старанным і ўпартым. Яго цягнула неба, а калі бачыў самалёт, забываўся на ўсё. Хлапечая мара прывяла Міколу пасля сямігодкі ў аэраклуб, затым — у авіяцыйнае вучылішча.

...Летам сорак першага года ад Смаленскам ішла кровапралітная бітва. У ёй у саставе 31-га знішчальнага авіяцыйнага палка 256-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі прыняў баявое хрышчэнне і Мікалай Шаранда.

Смаленск давялося пакінуць. А потым на карту баявога шляху палка былі нанесены Масква і Тула, Керч і Арлоўска-Курская дуга, Кіеў і Львоў.

І вось польская зямля. Да гэтага часу на рахунку штурмана палка маёра Мікалая Мікалаевіча Шаранды было 200 баявых вылетаў. 10 збітых асабіста фашысцкіх сцярвятнікаў і 18 — у групавых баях. Полк атрымліваў перамогі і нёс страты, не далічваўся лётчыкаў і самалётаў. Мікалаю Шаранду пакуль што шанцавала. Не раз яго самалёт вяртаўся на аэрадром, зрашэчаны кулямі і снарадамі.

Прыкладна так было і ў той дзень, 12 студзеня 1945 года. Нашы войскі вялі баі за вызваленне Польшчы. Знішчальнікі і штурмавікі прыкрывалі наземныя часці. Маёр Шаранда разам з вядомым капітанам Кісялёвым вылецелі «на свабоднае паляванне». З першага баявога вылету ў гэты дзень яны вярнуліся ўдала. Шаранда загадаў механіку рыхтаваць самалёт да новага вылету.

Праз нейкі час два смельчакі ўжо ішлі ў бок Кракава. Не сустрэўшы праціўніка, узялі курс на Дзевін. Унізе ўбачылі калону пяхоты і тэхнікі.

— Атакуем! — перадаў па радыё Шаранда свайму вядомаму.

Самалёты спікіравалі і пачалі расстрэльваць гітлераўцаў, якім на адкрытай мясцовасці не было куды дзецца ад згубнага агню двух савецкіх знішчальнікаў...

Прамое пападанне зянітнага снарада было ракавым: самалёт маёра загарэўся, дацягнуць на ім да сваёй тэрыторыі няма чаго было і думаць. Але і не выкідвацца ж з парашутам прама ў стан гітлераўцаў. І тады цвёрдай рукой лётчык накіраваў палаючы самалёт на варожую калону. Гэта быў яго апошні вылет.

Так загінуў камуніст, бясстрашны лётчык-знішчальнік маёр Мікалай Шаранда. Яшчэ пры жыцці ён быў узнагароджаны многімі баявымі ўзнагародамі, у тым ліку ордэнам Аляксандра Неўскага.

У Польшчы на месцы яго гібелі ў памяць пра яго подзвіг стаіць помнік, школа суседняй вёскі носіць імя савецкага лётчыка М. М. Шаранды.

М. Шкадаў.

З неба ў бессмяроцце

Сярод шматлікіх подзвігаў савецкіх лётчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны шырока вядомы бессмяротны подзвіг выхаванца Ленінскага камсамола, ураджэнца горада Дуброўна Ісака Капілевіча.

Нарадзіўся І. Капілевіч 21 студзеня 1923 года ў сям'і патомных дубровенскіх ткачоў. Хутка бацькі яго пераехалі ў Віцебск. У чатырнаццаць год Ісак стаў майстрам спорту і заняў па скачках у ваду другое месца на рэспубліканскіх спаборніцтвах у Мінску.

А потым яго паклікала неба. Выдатнага спартсмена і актыўнага камсамольца прынялі ў Віцебскі аэраклуб, які Ісак скончыў у 1939 годзе на «выдатна». Яму яшчэ і не было васемнаццаці, але прадстаўнікі Адэскага ваеннага вучылішча лётчыкаў уключылі яго ў спісы кандыдатаў у будучыя курсанты. А ў васемнаццаць ён ужо быў лётчыкам-бамбардзіроўшчыкам.

Калі пачалася вайна, Ісак Капілевіч перавучыўся на знішчальніка і ў складзе 525-га знішчальнага палка быў накіраваны

на Ленінградскі фронт. У баях за горад на Няве раскрыліся высокія байцоўскія якасці маладога сокала.

7 лістапада 1941 года, у гадавіну Вялікага Кастрычніка, звяно знішчальнікаў узнялося ў паветра. Вёў групу камісар палка старшы палітрук А. Данілаў, правым вядомым у яго быў старшы лейтэнант С. Івахненка, а левым — старшы сяржант І. Капілевіч. Па дарозе на Ленінград рухалася матарызаваная калона немцаў. Звяно кінулася ў атаку, пасля чатырох заходаў яна была разгромлена. Удзельнікаў палёту выклікаў да сябе камандуючы войскамі фронту генерал І. І. Фядзюнінскі і аб'явіў ім падзяку.

І зноў удзел у баях. Капілевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і павышаны ў званні да лейтэнанта з прызначэннем на пасаду камандзіра звяна. Адважны воін стараўся апраўдаць аказаны яму давер. Ён быў там, дзе найбольш цяжка і небяспечна. Камандзір палка падпалкоўнік Голубаў выбраў яго вядомым, і яны сталі лятаць разам.

У студзені 1942 года 523-ці полк быў перакінуты на Заходні фронт. У баях пад Сухінічамі Калужскай вобласці Капілевіч збіў два самалёты праціўніка.

7 чэрвеня таго ж года палку было загадана разбамбіць штаб нямецкага армейскага корпуса, які размяшчаўся ў памяшканні школы ў сяле Салонаўка.

На заданне вылецелі 12 экіпажаў ЛААГ-3 са стокілаграмовымі бомбамі. Голубаў з Капілевічам ішлі збоку і вышэй асноўнага строю, прыкрываючы яго. Голубаў бачыў, як спікіравалі на цэль знішчальнікі, але ў памяшканне школы не патрапілі. Тады ён скамандаваў вядомаму: «Ісак! Цяпер наша чарга!». Абодва самалёты адначасова пайшлі ў піке. Раптам на самалёце Капілевіча ўзнікла ўспышка. Голубаў зразумеў, што гэта прамое пападанне зенітнага снарада, а затым пачуў па радыё слабы голас вядомага: «Бывайце, таварышы! Паміраю за...».

Самалёт з бомбамі ўрэзаўся ў нямецкі штаб. Памяшканне ўзляцела ў паветра...

Подзвіг Капілевіча ўвайшоў у гісторыю арміі.

Я. Каяндзер,
палкоўнік у адстаўцы, г. Масква.

Так загінуў наш зямляк

7 студзеня 1942 года. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі войскі ўдарнай групоўкі, у якую ўваходзіў і гарматны разлік сяржанта Уладзіміра Салянкова (наш зямляк з вёскі Лаўкі), пайшлі на штурм варожых рубяжоў пад г. Ноўгарад. Пад агнём варожай артылерыі, па глыбокаму снегу савецкія воіны прасоўваліся на поўнач ад горада, знішчаючы адна за другой агнявыя кропкі праціўніка. Вораг аказваў лютае супраціўленне. І вось ля в. Спаская Палісць нашы войскі прабілі калідор. Немцы вырашылі чаго б ні каштавала закрыць яго і кінулі ў бой свае танкі. Сяржант Уладзімір Салянкоў загадаў развярнуць гармату.

Раздаўся выстрал, і варожы танк загарэўся. Але ў гэты час другі танк адкрыў агонь па гармаце Салянкова. Насмерць быў забіты наводчык. Яго змяніў Уладзімір, які другім выстралам знішчыў «Тыгр». Танкі ж і пяхота ўсё ішлі і ішлі, страляючы на хаду. Хутка выйшлі са строю падносчык і зараджаючы. Ля гарматы засталіся толькі двое параненых байцоў, якія працягвалі пасылаць снарад за снарадам у ворага.

Увечары, калі скончыўся бой, баявыя сябры знайшлі Салянкова, нерухома ляжаўшага на лафеце. Там жа, на ўзлессі, паблізу непераможнай гарматы, і быў пахаваны адважны герой з Дубровеншчыны.

В. Сяржанаў,
афіцэр запаса.

Нязломныя духам

В. Г. Звераў.

У жніўні 1943 года войскі Заходняга фронту праводзілі Смаленскую наступальную аперацыю.

Лётчыкі 1-й паветранай арміі вялі актыўныя баявыя дзеянні, прыкрываючы і падтрымліваючы наступаючыя войскі. 19 жніўня група штурмавікоў «ІЛ-2» наносіла ўдар па станцыі Паўлікава, дзе была выяўлена выгрузка жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Штурмавікоў суправаджалі знішчальнікі 18-га гвардзейскага палка пад камандай старшага лейтэнанта Васіля Глебавіча Зверава.

Падышоўшы да цэлі, Звераў убачыў, што яна прыкрываецца з паветра дзесяццю знішчальнікамі «МЕ-109».

Колькасная перавага ворага не спыніла нашых лётчыкаў. Яны смела пайшлі на цэль, скінулі бомбы, а затым, стаўшы ў круг, працягвалі апрацоўку цэлі кулямётна-гарматным агнём.

Васіль Звераў са сваім вядомым С. Даўгалёвым з адчайнай смеласцю адбівалі атакі фашысцкіх знішчальнікаў і, збіўшы адзін з іх, забяспечылі выкананне задачы, пастаўленай штурмавікам. У самы апошні момант, калі ўжо была пададзена каманда аб звароце на базу, у самалёт Зверава трапіў зенітны снарад. Быў пашкоджаны матор і перабіты цягі кіравання рулямі. Убачыўшы гэта, гітлераўцы накінуліся на пакалечаны самалёт. Пасля чарговай атакі машына Зверава загарэлася, а сам ён быў паранены ў нагу і руку. Нармальна выкінуцца з парашутам не дазваляла невялікая вышыня. Тады ён рашыў выкінуцца з палаючага самалёта метадам зрыву, гэта значыць, адкрыць парашут у кабіне. Раскрыўшыйся купал парашута пацягнуў яго за сабой. Але, ударыўшыся галавой аб хваставы стабілізатар, Васіль страціў прытомнасць.

А калі ачнуўся, пачуў нямецкую размову. Звераў зразумеў, што ён у палоне. Вакол яго былі ворагі.

Звераву з некалькімі таварышамі ўдалося ўцячы з лагера ваеннапалонных у Смаленску, перайсці лінію фронту. А праз некаторы час ён зноў апынуўся ў сваім гвардзейскім палку. Паўтара месяца прабыў у шпіталі і вярнуўся ў свой полк, які ўжо стаяў на палявым аэрадроме непадалёку ад яго роднай вёскі Парфенкава Дубровенскага раёна.

Храбра змагаўся Звераў у небе Беларусі і ва Усходняй Прусіі. Вайну скончыў камандзірам эскадрыллі. На яго рахунку 170 баявых вылетаў. Асабіста і ў групе збіў 9 самалётаў ворага. Радзіма ўзнагародзіла яго трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны і многімі медалямі.

Разам з ім у 18-м гвардзейскім палку служылі яго браты Аляксандр і Вячаслаў. Яны былі малодшымі авіяспецыялістамі...

Я. Каяндзер.

Браты з вёскі Кулакоўшчына

Сутычку з лютымі чужынцамі вялі чатыры браты Бугаёвы з вёскі Кулакоўшчына. Першым прыслаў доўгачаканы трохкутнік Дзмітрый, за ім — Фёдар. Міхаіл маўчаў. Толькі пасля вайны даведалася матуля, што прапаў яе сын без вестак у спякотныя ліпеньскія дні 41-га, сустрэўшы ворага на граніцы.

Фёдар і Васіль сталі камандзірамі.

Старшы сяржант Ф. Бугаёў служыў у пяхоце. Да вайны жыў у Мурманску, плаваў матросам на пасажырскім цеплаходзе «Лермантаў». З першых дзён вайны — на фронце. Закончыў кароткатэрміновыя курсы малодшых камандзіраў. Ваяваў у Запаляр'і, быў паранены. Пасля ўдзельнічаў у баях па прарыву блакады Ленінграда, вызваляў Польшчу. Штурмаваў і логава фашысцкага звера — Берлін. Узнімаючы байцоў у атаку, быў цяжка паранены асколкам варожага снарада ў галаву. Лячыўся доўга. Стаў інвалідам другой групы. За мужнасць і адвагу быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны першай ступені, медалём «За адвагу».

Другі моцны парастак роду Бугаёвых — Васіль — камандаваў разлікам гарматы. Прайшоў са сваімі таварышамі-артылерыстамі Румынію і Чэхаславакію. На грудзях храбрага воіна зззялі ордэны Айчыннай вайны другой ступені, Славы трэцяй ступені, медаль «За адвагу».

Дзмітрый, узнагароджаны двума баявымі ордэнамі і многімі медалямі, вярнуўся з фронту параненым. У званні капітана працаваў у ваенкамаце г. Ржэва. Але цяжкія раненні, інваліднасць забіралі сілы. Лёс адпусціў афіцэру толькі дзесяць пасляваенных гадоў.

Фёдар і Васіль не шукалі шчасця ў іншых мясцінах. Зямля продкаў уладарна цягнула да сябе. Вярнуліся на бацькаўшчыну, працавалі ў калгасе. Васіль — даглядчыкам жывёлы, Фёдар — брыгадзірам, а калі здароўе моцна пачало падводзіць, стаў фуражырам.

П. Мінчанка,
маёр у адстаўцы.

Снайпер з Казьян

Пётр Кузьмянкоў родам з Казьян Дубровенскага раёна, перад вайной скончыў у Ленінградзе школу ФЗН, стаў слесарам. Першы ваенны год ён самаадданa, забываючы пра стомленасць, працаваў за станком, а ў ліпені 1942 года добраахвотна ўступіў у адзін з батальёнаў народнага апалчэння.

Байцы батальёна занялі агнявы рубеж у 14-м умацаваным раёне на беразе Нявы. Тут Пётр стаў старшым сяржантам, камандзірам разліку станковага кулямёта, а пазней авалодаў майстэрствам снайпера. Ужо да верасня таго ж года ён запісаў на свой асабісты снайперскі рахунак 50 знішчаных захопнікаў і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У студзені 1943 года войскі Ленінградскага і Волхаўскага франтоў прарвалі варожую блакаду, але фашысты стаялі яшчэ вельмі блізка ад горада. За гэты час рахунак Пятра Кузьмянкова ўзрос да 204 знішчаных ім гітлераўскіх галаварэзаў. Да таго ж ён падрыхтаваў дзевяць маладых снайпераў, якія таксама адправілі на той свет па 10—15 немцаў.

Слава пра Кузьмянкова выйшла за межы яго часці.

Аднойчы камандаванне даручыла старшаму сяржанту Кузьмянкову ліквідаваць варожых снайпераў, якія некаторы час беспакарана дзейнічалі на пярэднім краі. Ён пачаў няроўны паядынак з ворагам і, праявіўшы высокае майстэрства, мужнасць і выключную вытрымку, у той жа дзень знішчыў шэсць фашысцкіх снайпераў.

Выдатнага воіна прынялі кандыдатам у члены партыі, узнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За абарону Ленінграда», знакам «Выдатны снайпер».

Так біў ненавісных ворагаў беларускі юнак Пётр Кузьмянкоў. Але 19 сакавіка 1944 года абарвалася жыццё адважнага сына Радзімы.

У Беларускім музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў раздзеле «Гераічная абарона Ленінграда» змешчаны фотапартрэт Пятра Харытонавіча Кузьмянкова, тут жа — яго баявыя ўзнагароды.

Л. Чванаў.

Лёс юнага партызана

У кнігу баявой і працоўнай славы вёскі Слаўнае Талачынскага раёна занесена імя Віктара Міхайлавіча Мілюціна — нашага земляка.

Нарадзіўся ён у 1925 годзе ў вёсцы Бурая. А калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, пятнаццацігадовы юнак разам з бацькам эвакуіраваўся на ўсход. Але каля Смаленска шлях бежанцам перарэзалі гітлераўцы, і сям'я Мілюціных вымушана была вярнуцца назад. Толькі не ў родную вёску, а ў Слаўнае...

У канцы лета 1942 года ўся сям'я Мілюціных пайшла ў лес, бо пасля разгрому станцыі партызанамі атрада С. Г. Жуніна акупанты спаганялі сваю злосць на мірным насельніцтве.

Віця стаў падрыўніком у партызанскім атрадзе і ў адным з баёў быў паранены ў нагу. Яго хацелі адправіць на Вялікую Зямлю, але Мілюцін адмовіўся і папраўляўся ў атрадзе.

У 1943 годзе Віктар не раз хадзіў з баявымі заданнямі ў Оршу. У чэрвені яго схапілі гітлераўцы і разам з іншымі юнакамі і дзяўчатамі адправілі ў Германію. Але па дарозе яму ўдалося ўцячы і вярнуцца да народных мсціўцаў. Віктар зноў стаў падрыўніком атрада, якім камандаваў І. Г. Ільін.

20 чэрвеня 1944 года Віктар Мілюцін у час аперацыі на чыгунцы загінуў смерцю храбрых.

Аб подзвігу нашага земляка расказваецца ў кнізе «Памяць» Талачынскага раёна.

М. Міхайлаў.

У бой вёў камісар

Напэўна, не знойдзецца ў Дуброўне дарослага чалавека, хто б не ведаў Міхаіла Тарасавіча Піменава. Байцом Чырвонай Арміі Міхаіл стаў у кастрычніку 1939-га. Служыў у артылерыйскім палку.

У чэрвені сорак першага полк пачаў баявыя дзеянні на Паўднёва-Заходнім фронце. Ён раздзяліў лёс многіх нашых часцей і злучэнняў таго часу. А разам з ім — памочнік камандзіра ўзвода сяржант Піменаў.

— Адступалі з баямі, чапляючыся за кожны рубеж, — успамінае Міхаіл Тарасавіч. — Мужна біўся полк пад украінскім горадам Броды, у іншых раёнах, але ваенная ўдача была не на яго баку.

Зведаўшы горыч адступлення і акружэння, прайшоўшы праз многія няўзгоды, вясной сорак другога стаў франтавік Міхаіл Піменаў баявым партызанам, камісарам партызанскага атрада «Прагрэс» брыгады Аляксея Данукалава, якая дзейнічала на Віцебшчыне паблізу ад нашых мясцін.

У жніўні сорак трэцяга камандаванне атрада распрацавала аперацыю па разгрому батальёна немцаў і так называемых «народнікаў» на рацэ Обаль каля в. Новая Обаль цяпер Сенненскага раёна. Увесь план будаваўся на нечаканасці і імклівасці ўдару.

Адну роту вёў камісар, астатнія — начальнік штаба атрада. Выбралі час, калі вораг менш за ўсё чакаў нападу, і ўдарылі з розных бакоў. Рота Міхаіла Піменава з пастаўленай задачай справілася выдатна. Гэтак жа дзейнічалі іншыя роты. І вораг не здолеў арганізаваць сапраўднае супраціўленне. Больш паўсотні гітлераўцаў, іх памагатых — паліцаяў і «народнікаў» — паляглі касцьмі пад партызанскімі кулямі і гранатамі, 70 здаліся ў палон. У гэтым баі атрад захапіў 7 гармат, 7 кулямётаў, шмат вінтовак, боепрыпасаў. Была ў ліку трафеяў і 122-міліметровая гаўбіца. З яе потым партызаны вялі абстрэл Багушэўска, а пасля падарвалі: не было ў лясных мсціўцаў магчымасцей вазіць з сабой такую махіну. А больш дробныя гарматы былі вельмі дарэчы...

М. Шкадаў.

З дазволу наркома

Да Вялікай Айчыннай вайны ў пасёлку Асінторф жыла вялікая і дружная сям'я Пляшковых. Бацька Панкрат Якаўлевіч працаваў інспектарам па якасці торфу. Маці Еўдакія Германаўна вяла дамашнюю гаспадарку, займалася выхаваннем дзяцей.

У сям'і раслі сыны Аляксей, Іван і Міхаіл. Выхоўваліся яны ў патрыятычным духу, рыхтуючыся да абароны Радзімы, бо час быў вельмі трывожны.

У 1938 годзе па парадзе бацькі браты звярнуліся з пісьмом да Маршала Савецкага Саюза К. Я. Варашылава, у той час народнага камісара абароны, каб ім дазволілі скласці танкавы экіпаж.

Дазвол Клімента Яфрэмавіча Варашылава быў атрыманы. У клубе торфапрадпрыемства адбыліся ўрачыстыя провады братоў Пляшковых у Чырвоную Армію. Затым у Оршы на гарадскім стадыёне (у той час Асінторф уваходзіў у склад Аршанскага раёна) адбыўся мітынг. Выступілі работнікі райкома партыі, ваенкамата, Іван Пляшкоў.

Спачатку браты служылі ў Лепелі. У верасні 1939 года танкавы экіпаж братоў Пляшковых удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, пазней — у савецка-фінляндскай вайне. Так прайшлі браты баявую загартоўку.

У 1940 годзе камандаванне 22-й танкавай брыгады накіроўвае братоў Пляшковых на вучобу ў Харкаўскае бронетанкавае вучылішча. А закончылі яны вучобу ў Сярэдняй Азіі. Там атрымалі афіцэрскія званні і былі накіраваны ў дзеючую армію на пасады камандзіраў танкавых рот. Абаранялі Маскву, змагаліся на Сталінградскім, Ленінградскім, Бранскім, Варонежскім і іншых франтах. Іх баявы шлях быў адзначаны многімі ўзнагародамі. Не раз былі браты паранены, але на шчасце ўсе засталіся жывымі.

Удзельнікам вайны быў іх малодшы брат Уладзімір.

К. Крук,
ветэран вайны і працы.

Дзеля міру

У вёсцы Якубава прайшло ўсё жыццё селяніна Аляксандра Маркавіча Бязножанкі. У 1918 годзе, не задумваючыся, ён стаў на абарону заваёў Кастрычніка, быў актыўным удзельнікам грамадзянскай вайны, а ў 1929 годзе адным з першых уступіў у калгас «Чырвонае Якубава». Да апошняга дня жыцця працаваў у родным калгасе А. М. Бязножанка, выконваючы рымарскія работы. Разам з жонкай выхаваў адзінаццаць дзяцей.

Восем яго сыноў абаранялі заваёвы сацыялістычнай рэвалюцыі на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З васьмі абаронцаў Радзімы цяпер жывы толькі адзін — Фёдар Аляксандравіч Бязножанка, які зараз пражывае ў роднай вёсцы.

— Нас у сям'і было восем братоў,— расказвае Фёдар Аляксандравіч,— Яфім, Іван, Аляксей, Сцяпан, Лазар, я, Мікалай і Арцём. Старэйшыя, Яфім з Іванам, удзельнічалі ў абароне маладой Савецкай рэспублікі на франтах грамадзянскай вайны. Пасля абодва працавалі ў калгасе, тут жа ў Якубаве і пахаваны.

Сцяпан прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Ён удзельнічаў у вызваленні Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. Апошнія гады жыцця падпалкоўнік С. А. Бязножанка аддаў службе ў Савецкай Арміі. Пахаваны ў г. Каўнасе.

Чацвёрты брат Фёдара Аляксандравіча — Лазар — да вайны і ў пачатку яе працаваў на Волхаўскай электрастанцыі пад Ленінградам. Ён загінуў у адным з баёў пад Петразаводскам.

Ф. А. Бязножанка.

З 1939 года служыў у Чырвонай Арміі Мікалай Бязножанка. Яму таксама не давялося дажыць да Перамогі: загінуў смерцю храбрых пад Растовам.

Аляксея Бязножанку, шостага з сям'і, прызвалі ў рады Чырвонай Арміі, калі яна вызваліла Дубровенскі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Служыў ён у сапёрных войсках, удзельнічаў у вызваленні многіх краін Заходняй Еўропы.

Самы малодшы з сям'і — Арцём, знаходзячыся на часова акупіраванай тэрыторыі, быў звязаны з партызанамі, дзейнічаўшымі на тэрыторыі Аршанскага і Дубровенскага раёнаў, выконваў іх заданні. Незадоўга да вызвалення раёна, па даносу здрадніцы, яго схапілі гітлераўцы. Доўга і жорстка катавалі. Не дабіўшыся звестак аб месцазнаходжанні партызанскіх атрадаў і явачных кватэр, Арцёма расстралялі прама за вёскай.

Фёдара Бязножанку прызвалі ў армію ў 1940 годзе. Служыў у інжынерных войсках на паўвостраве Ханка (Гангут). У першыя дні вайны ўдзельнічаў у вызваленні нейтральных астравоў, якія захапілі фіны. У адным з баёў Фёдара Бязножанку цяжка параніла. Пасля выздараўлення, інвалідам другой групы, Фёдар Аляксандравіч працаваў загадчыкам шавецка-пашывачнай майстэрні.

Толькі ў жніўні 1944 года ён вярнуўся ў родную вёску, працаваў старшынёй тутэйшага калгаса, намеснікам старшыні сельвыканкома, быў на іншых пасадах. Праз два гады пасля заканчэння вайны яго знайшла ўзнагарода — ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Восем чалавек з простай савецкай сям'і змагаліся за свабоду і незалежнасць свайго народа, любімай Радзімы.

Л. Дудараў.

Подзвіг разведчыка

СТРАЛЬЦОЎ Раман Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1917 годзе, скончыў сярэднюю школу № 1 г. Дуброўна, Магілёўскі палітыка-асветніцкі тэхнікум, Горкаўскае артылерыйскае вучылішча. З кастрычніка 1939 года па жнівень 1941 года камандзір узвода, затым камандзір батарэі. З снежня 1943 года.— камандзір узвода, дыверсійнай роты ў злучэнні партызанскіх атрадаў А. Ф. Фёдарава, камісар і камандзір партызанскага атрада «За Радзіму», выконваў адказнае заданне ў тыле ворага. У лістападзе 1944 года ў баі з гітлераўцамі на тэрыторыі Чэхаславакіі быў цяжка паранены і памёр ад ран.

Загінуў і малодшы брат Рамана — юны Вікенцій Стральцоў, які змагаўся ў радах народных мсціўцаў.

Ф. Кулакоў.

Балада пры чырвоны сцяг

У Беларускім Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца даваенны пераходны Чырвоны сцяг торфапрадпрыемства «Асінторф» Дубровенскага раёна. Ён прысуджаўся калектывам перадавых участкаў — пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве па здабычы торфу. Варта зазначыць, што тады гэтым

былі заняты тут тысячы людзей, і заслужыць права на пераходны сцяг было нялёгка.

Незвычайны лёс гэтага сцяга.

Перад вайной на пятым пасёлку Асінторфа жыла сям'я Вуглікаў. Майстар участка Сямён Назаравіч Вуглік узначальваў дружны калектыў. Ён сам укладваў у працу ўсю душу, таму і ўчастак працаваў па-стаханаўску. І ў пачатку сезона торфаздабычы 1941 г. гэты ўчастак заваяваў пераходны Чырвоны сцяг прадпрыемства. Сцяг красаваўся ў чырвоным кутку невялікай канторкі ўчастка.

Грымнула вайна. У першыя яе дні Сямён Назаравіч быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Перад тым, як развітацца з сям'ёй, Сямён Назаравіч перадаў жонцы, Алене Радзівонаўне, невялікі пакунак і даў строгі наказ берагчы сцяг.

Сямён Назаравіч абараняў Ленінград, удзельнічаў у выгнанні ворага з роднай савецкай зямлі. Але да перамогі не дажыў: у кастрычніку сорак чацвёртага памёр ад франтавых ран.

Алена Радзівонаўна наказ мужа выканала. Праз усе бедствы ў час фашысцкай акупацыі яна зберагла сцяг.

7 лістапада 1944 г. на торфапрадпрыемстве, як і па ўсё краіне, урачыста адзначылі 27-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. У пасёлку Асінторф вялікае свята сустракалі з чырвонымі сцягамі, у тым ліку — з выратаваным Сямёнам Назаравічам Вуглікам, яго жонкай — Аленай Радзівонаўнай, іх дачкой-камсамолкай Евай.

Б. Шалуха, Ф. Кулакоў.

Майскія святы 1945-га...

Аб тым, што войскі 3-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка І. Д. Чарняхоўскага вызвалілі г. Оршу ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, я даведаўся ў шпіталі. Сам сабе падумаў: раз вызвалілі Оршу, значыць свабоднай стала і Дубровеншчына, дзе я нарадзіўся і вырас. Пачаў прасіцца ў начальніка шпіталя, каб мяне выпісалі і накіравалі дамоў, бо пасля цяжкага ранення мяне на фронт не возьмуць. Прыехаў у Оршу, дзе сустрэў знаёмага земляка, капітана А. Кавалёва, які ехаў у Дуброўну праведаць сваю сям'ю.

...І вось ён, райцэнтр. Я не пазнаў горад. Суцэльныя руіны і толькі дзе-нідзе стаяць уцалелыя драўляныя дамы. Больш пашанцавала Бярозкаўскай вуліцы, дзе ўцалела каля 40 дамоў і кантора брыгады саўгаса «1 Мая». Гэты дом і зараз стаіць ля калгаснага базара, што па вуліцы Нікандравай. Не пацярпеў у час вызвалення райцэнтра і будынак райкома КПБ, дзе зараз размешчана рэдакцыя раённай газеты.

Маючы сярэднюю адукацыю, я ўладкаваўся на работу ў райком партыі памочнікам першага сакратара А. Д. Казака.

Надышла вясна 1945 года. Нашы войскі рашуча набліжаліся да Берліна. Тым часам дубровенцы на выслабаніўшыхся з-пад мін і снарадаў палях вялі сяўбу збожжавых, бульбы, іншых сельгаскультур, уздымалі разбураныя гаспадаркі, будавалі жыллё. У той далёкі і разам з тым блізкі і вельмі памятны год вясна была ранняй, надвор'е цёплым і сухім.

Напярэдадні 1 Мая ў парткабінеце райкома КПБ, які тады размяшчаўся ў памяшканні Дома піянераў, адбыўся ўрачысты сход, дзе прысутнічалі 50—60 чалавек. Першы сакратар А. Д. Казак расказаў аб становішчы на фронце, аб тым, як ідуць справы на веснавым полі. Ён падкрэсліў, што людзі гараць жаданнем як мага хутчэй правесці пасяўную. І гэта нягледзячы на тое, што насеннае зерне даводзіцца на плячах насіць са станцыі Асінаўка, а іншы раз і з Оршы.

А перад гэтым сакратар даручыў мне

ўпрыгожыць будынак райкома. А чым упрыгожваць — чырвонай тканіны няма, фарбы — таксама. Стаю ў разгубленасці, паглядаючы ў бакі. Нечакана мой позірк спыніўся на кучы бітай чырвонай цэглы, якой багата ляжала навокал. З яе ўздоўж будынка райкома, па зялёнаму газону, я і выклаў заклік: «Няхай жыве 1 Мая — Дзень Міжнароднай салідарнасці працоўных!». Вось і ўся наглядная агітацыя.

У дзень 1 Мая мітынгу і дэманстрацыі ў горадзе не было. Па-першае, не было добрага месца, каб іх правесці, усё ў руінах і папялішчах. І людзей было мала.

Па-другое, час быў строгі, ваенны, і людзі працавалі да самазабыцця. Асабліва цяжкай была работа ў вёсцы, дзе з усёй цяглавай сілы на калгас прыпадала з паўдзесятка коней ды некалькі кароў. Так што асноўныя работы па пасяўной выконвалі ўручную. Даставалася і работнікам апарата райкома КПБ. Напрыклад, рабочы дзень сакратара райкома заканчваўся бліжэй да раніцы. І я трапляў дамоў у 3—4 гадзіны.

9 мая 1945 года быў выхадны дзень, таму я вырашыў выспацца як след. Але раніцой прачнуўся ад нейкага моцнага шуму. Расплюшчыў вочы, а мая маці, уся ў слязах, плача і з усёй сілы тузае мяне за плечы.

— Сыночак, уставай! Вайна скончылася! Перамога!

Ускочыў я з ложка, хуценька апрануўся і паімчаўся ў райком. А на вуліцах і стары, і малы. Людзі мітынгуюць, плачуць і смяюцца, віншуюць адзін аднаго з перамогай. І ў мяне слёзы з вачэй так і цякуць. У той дзень ніхто іх не саромеўся.

На плошчы, дзе зараз стаіць помнік У. І. Леніну, размяшчаўся калгасны базар. Тут было поўна народу, радасць перапаўняла сэрца і душу кожнага чалавека. Бліжэй да абеду ў цэнтры горада былі развешаны гучнагаварыцелі, з якіх неслі ся мелодыі пераможных маршаў, час ад часу паўтараліся заява ўрада краіны аб перамозе Савецкай Арміі над гітлераўскай Германіяй і загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

...Прайшлі гады, але майскія дні 1945-га мне помняцца так, нібы гэта было толькі ўчора.

А. Байкоў,
інвалід Вялікай Айчыннай вайны

Вернасць

Для многіх ветэранаў Вялікай Айчыннй вайны і больш маладзейшых дубровенцаў Ганна Васілеўна Пячорская — сціплая, невысокага росту жанчына з задуменнымі вачыма і стомленым тварам добрая знаёмая, хаця і жыве яна ў далёкім Варонежы.

Я. І. Пячорскі з жонкай Ганнай Васілеўнай.

Вясной 1940 года ў педагагічным тэхнікуме ў Куйбышаве, дзе вучылася Ганна, праводзілі літаратурны вечар. Са сцэны яна ўбачыла ў сярэдзіне залы маладога, высокага, белакурага з хударлявым тварам ваеннага. Пасля вечара на танцах яны пазнаёміліся. Каханне ўспыхнула адразу...

Год іх сумеснага жыцця праляцеў як сон, як адзін дзень. Іх мары былі бязмежныя. Праз дзень пасля нараджэння дачушкі воінскую часць, дзе служыў Яўген П-

чорскі, вывелі на вучэнні. З таго дня Ганна Васілеўна больш не ўбачыла свайго мужа.

Прайшло шмат месяцаў. Ішла цяжкая, кровапралітная вайна. І вось аднойчы паштальёнка ўручыла ёй салдацкі трохвугольнік. Рукі маладой жанчыны дрыжалі...

«Аня, милая, здравствуй! Шлю тебе, подруга дней счастливых, Аня, голубка милая моя, свой сердечный привет и крепко целую тебя... Не жалей Аня о несостоявшейся встрече, а лучше всего питай надежду о будущей встрече. Тебя, милая жена, я никогда не забывал при самых тяжёлых положениях нашего странствования по вражеским тылам, не забывал и тогда, когда смерти смотрел в лицо...»

Гэты адзіны ліст ад каханага Ганна Васілеўна захоўвае як самае дарагое, што ёсць у яе жыцці. Больш яна ніякіх вестак ад мужа не атрымлівала. Толькі ў 1946 годзе ёй упершыню паведамілі, што яе муж, старшы лейтэнант Яўген Іванавіч Пячорскі загінуў смерцю героя непадалёку ад вёскі Судзілавічы Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці, і што пахаваны ён на брацкіх могілках у вёсцы Пятрыкі.

З тае пары Ганна Васілеўна кожны год 9 мая, нягледзячы на вялікую адлегласць, невялікую зарплату настаўніцы, гады і хваробы прыязджае на «спатканне» да мужа. Прытуліўшыся да помніка, яна нетаропка расказвае яму аб жыцці ў школе, якой аддала ледзь не ўсё жыццё, аб справах дачкі, якую малады бацька не паспеў панасіць на руках.

Л. Дудараў.

Пра тых, хто прапаў без вестак

Як многа на Беларусі сямей, дзе боль страты пячэ да гэтае пары... У гэтыя сем'і прыйшлі не пахаронкі, а ўсяго толькі паведамленні, што «прапаў без вестак». І такіх сотні тысяч. У першыя гады ваеннага ліхалецця, 1941—1942 іх, прапаўшых без вестак, загінула болей, чым тых, каго пахавалі пасля бою, пасля смерці ў медсанбаце, у тылавым шпіталі, чыя канчына засведчана па ўсіх правілах у спісу беззваротных страт.

Невядомымі гінулі салдаты, што прынялі на сябе першы агнявы шквал. Яны палеглі ў прыграніччы, пры адступленні і акружэнні, у «катлах» цэлымі палкамі і дывізіямі. Ніхто не бачыў іх мёртвымі: лётчыкаў, што не вярталіся з баявых заданняў, разведчыкаў, якія гінулі ў тыле ворага без сведкаў, пехацінцаў, ад якіх не заставалася і следу пры пападанні снарадаў і бомб, ці якіх жывымі засыпала ў траншэях. Гінулі ў партызанскіх атрадах і ў антыфашысцкім падполлі, на сваёй зямлі і на чужыне.

Цаной свайго жыцця яны вымотвалі і абяскроўлівалі ворага, каб выйграць час для Айчыны. Без іх не было б Перамогі. Проста ім не пашанцавала ў смерці.

Асобным радком у гэтым пераліку — палон, лагеры, дзе бясследна знікалі паланёныя ў баях воіны.

Удовам і маці ваенкаматы давалі афіцыйныя тлумачэнні: прапаўшыя без вестак — гэта тыя, хто ў ходзе баявых дзеянняў не вярнуўся ў свае падраздзяленні. Хаця большасць з іх загінула, але баявыя абставіны не дазволілі ўстанавіць гэта.

Не ведаючы пра месца пахавання роднага чалавека, немагчыма пахаваць яго ў сваім сэрцы. Людзі працягваюць шукаць і ў шэрагу выпадкаў знаходзяць сведкаў — аднапалчан, якія аднаўляюць падрабязнасці гібелі. Бывае, што знаходзяцца і магілы.

На помніках у вёсках, райцэнтрах, адкуль людзі ішлі на вайну, не заўсёды сустракаюцца імёны прапаўшых без вестак, расстраляных, памёршых ад голаду і здзекаў у канцлагерах. Іх стараліся ў свой час выкрэсліць з нашай роднай гісторыі.

Гэтую несправядлівасць, хоць і са спазненнем, выпраўляюць гісторыка-дакументальныя Хронікі Памяці.

У. І. Лемяшонак.

БЕЛЫЯ БЯРОЗЫ БЕЛАРУСІ

Плакалі матулі над сынамі,
Што ў баях няроўных паляглі.
У палях, парослых палынамі,
Белыя бярозы ўзышлі.

Плакалі дзяўчаты па каханых,
Што з вайны дадому не прыйшлі.
У палях, вясною не ўзараных,
Белыя бярозы ўзышлі.

Плыў над імі вырай жураўліны,
У сухмень, калі згарэў язмін, —
Не дажджы паілі іх, — жанчыны
Палівалі горкімі слязьмі.

Боль вайны не ўляжацца з гадамі.
Ты забыць яго не нараві,
Бо шумяць трывожна над вятрамі
Тых бяроз самотныя гаі.

Там гняздо не ладзіць сівы бусел.
Цішыню не будзіць звонкі птах.
Белыя бярозы Беларусі —
Памяць аб загінуўшых сынах.

Леанід Пранчак.

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да нашай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас назаўсёды,
як неўміруча наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх фарміраваннях, антыфашысцкім падполлі, а таксама мірныя жыхары, якія загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх акупантаў*

г. ДУБРОЎНА

АГАРОДНІКАЎ Канстанцін Панцеляймонавіч, н. ў 1921 , старш., прапаў без вестак у жн. 1944.

АЛЕЙНІКАЎ Сяргей Сідаравіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

АЛЬШЭЎСКІ Саламон Залманавіч, н. ў 1911, мал. палітрук, памёр ад ран 21.2.1942 у в. Гарбатава Ізносінскага р-на Смаленскай вобл.

АНДРЭЕЎ Фёдар Мікалаевіч, н. ў 1919, рад., загінуў 9.10.1944 у в. Слiскі Пултускага павета Варшаўскага ваяводства, Польшча.

АНШЫН Абрам Сямёнавіч, н. ў 1904, лейт., палітрук, прапаў без вестак у 1941.

АНШЫН Леў Сямёнавіч, н. ў 1914, гв. сярж., загінуў 15.7.1944 у в. Перванча Гарохаўскага р-на Валынскай вобл.

АПЕТ Аляксей Іванавіч, н. ў 1902, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

АПЕТ Фёдар Максімавіч, рад., памёр ад ран 1.1.1942, пахаваны на ст. Дорлава.

АПЕТ Фёдар Пятровіч, н. ў 1919, памёр ад ран у 1943, пахаваны ў г. Ташкент.

АПЕТ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у студз. 1942.

АПЕТ Ягор Іванавіч, н. ў 1918, рад., загінуў у 1944 у г. Адэса.

АПЕТ Ягор Сцяпанавіч, рад., загінуў у 1941, пахаваны на ст. Вадзяная Нікалаеўскай вобл.

АПЕТ Ягор Фёдаравіч, рад., загінуў 15.8.1941, пахаваны на ст. Вадзяная Нікалаеўскай вобл.

АРДЗІН Зільман Саламонавіч, рад., загінуў 12.8.1943.

АСЯПЦОЎ Іван Кандратавіч, загінуў у 1943.

АЎЛАСЕНКА Ягор Фёдаравіч, загінуў 19.9.1942.

АЎЧЫННІКАЎ Іван Паўлавіч, н. ў 1919, рад., загінуў 16.9.1944 у в. Готлаўск Варшаўскага ваяводства, Польшча.

БАБКОЎ Адам Паўлавіч, н. ў 1923, партызан атрада «Перамога» 1-й партызанскай брыгады К. С. Заслонава, загінуў 26.3.1943.

БАБРАВІЦКІ Аляксандр Осіпавіч, н. ў 1907, кап., нач. сувязі авіяпалка Паўночнага флоту, загінуў 4.5.1943.

БАГДАНАЎ Елісей Міхайлавіч, н. ў 1902, рад., загінуў 17.9.1944, пахаваны ў м. Зяленка Варшаўскага ваяводства, Польшча.

БАЗЯ Анатоль Лазаравіч, н. ў 1924, загінуў у 1941.

БАЗЯ Іван Іванавіч, н. ў 1878, загінуў у 1944, пахаваны ў Магілёўскай вобл.

БАЗЯ Мікалай Іванавіч, н. ў 1922, загінуў у 1945 ва Усх. Прусіі.

БАЙКОЎ Самуіл Паўлавіч, н. ў 1910.

БАКЛАНАЎ Гаўрыла Мітрафанавіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944.

БАЛАБОСАЎ Пётр Ісакавіч, н. ў 1900, гв. рад., памёр ад ран 1.5.1945 у г. Берлін.

БАЛАШОЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1928, вывезены на прымусовыя работы, прапаў без вестак.

БАЛБІРАР Барыс Ісакавіч, н. ў 1897, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

БАНАДЫСЕЎ Мацвей Парфенавіч, н. ў 1903, рад., загінуў у 1944 у п. Жалез, Літва.

БАНАДЫСЕЎ Павел Фёдаравіч, н. ў 1909, прапаў без вестак у 1944.

БАНДУЕЎ Павел Фёдаравіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

---

* З прычыны таго, што пасля вайны прайшло больш за паўстагоддзя, што Дубровеншчына была амаль ушчэнт разбурана ў ходзе ваенных дзеянняў, а асобныя населеныя пункты зніклі наогул разам з жыхарамі, раённая камісія па стварэнні Хронікі Памяці не здолела даць поўныя звесткі аб ахвярах вайны і ў шэрагу выпадкаў давялося абмежавацца толькі ўпамінаннем прозвішчаў загінуўшых.

БАРАДАЎКІН Уладзімір Нікіфаравіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

БАРАНОЎСКІ Віктар Пятровіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак 13.8.1942 у в. Ляцы Арлоўскай вобл.

БАРАЎНЕЎ Мікалай Навумавіч, н. ў 1925, рад.

БАРДЗІКАЎ Пётр Платонавіч, н. ў 1903, прапаў без вестак у студз. 1945.

БАРДЗІКАЎ Рыгор Цімафеевіч, н. ў 1918, сярж., загінуў 4.1.1942, пахаваны ў в. Замыцкае Маскоўскай вобл.

БАРЫЛАЎ Дзмітрый Панкратавіч, рад., загінуў у ліп. 1941.

БАРЫСЕНКА Пётр Максімавіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

БАСІН Зальман Львовіч, н. ў 1908, рад., загінуў у студз. 1942.

БАХОРАЎ Мікалай Герасімавіч, н. ў 1920, загінуў 10.3.1942.

БЕЛАБРУДАЎ Апанас Васілевіч, н. ў 1899, рад., памёр ад ран 17.9.1944 у м. Зяленка Варшаўскага ваяводства.

БЕЛАБРУДАЎ Гаўрыла Іванавіч, рад., загінуў 18.7.1943.

БЕЛАБРУДАЎ Міхаіл Кірылавіч, н. ў 1914, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944.

БЕЛАХВОСТАЎ Віктар Тарасавіч, н. ў 1919, ст. сярж., прапаў без вестак 22.6.1941.

БЕЛАХВОСТАЎ Кузьма Іванавіч, н. ў 1903, рад., загінуў 28.7.1944.

БЕЛЕНЬКІ Навум Саламонавіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак у снеж. 1941.

БЕРКЕНБЛІТ Ілья Міхайлавіч, н. ў 1905, мал. лейт., загінуў 11.12.1941, пахаваны на могілках каля Валагодска-Ямскай слабады Ленінградскай вобл.

БЕРКЕНБЛІТ Маісей Якаўлевіч, н. ў 1918, сярж., загінуў 4.1.1943, пахаваны ў в. Цэміна Залучскага р-на Ленінградскай вобл.

БІРУЛЁЎ Іван Іванавіч, н. ў 1908, рад., загінуў 19.3.1943.

БІРУЛЁЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1901, рад., прапаў без вестак у кастр. 1942.

БОЛДЫШАЎ Аляксей Паўлавіч, н. ў 1925, прапаў без вестак у 1944.

БОЛДЫШАЎ Іван Яфрэмавіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

БРУК Шчавель Рыгоравіч, н. ў 1898, рад., прапаў без вестак 22.6.1941.

БУДАЕЎ Іван Карнеевіч, рад., загінуў у 1941.

БУЕЎ Міхаіл Апанасавіч, н. ў 1920, сярж., загінуў 13.2.1942, пахаваны ў в. Вязічня Масальскага р-на Смаленскай вобл.

БУЛАЕЎ Васіль Яўсеевіч, лейт., прапаў без вестак у чэрв. 1941.

БУЛАНАЎ Уладзімір Захаравіч, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

БУРНОСЕНКА Парфіл Цімафеевіч, рад., прапаў без вестак у ліп. 1941.

БЯЛОЎ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1913, лейт., кам. узвода, загінуў 14.2.1943.

БЯРКОЗАЎ Мітрафан Іванавіч, рад., загінуў 5.5.1943, пахаваны ў в. Караветчына Наўгародскай вобл.

ВАВА Даніла Фёдаравіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ВАЗЬМІЦЕЛЬ Рыгор Васілевіч, рад., загінуў 10.1.1942, пахаваны ў в. Расудава Старафамінскага р-на Маскоўскай вобл.

ВАЛЬКОВІЧ Іван Аляксеевіч, н. ў 1926, рад., памёр ад ран 16.1.1945 на ст. Тракенен, Усх. Прусія.

ВАСІЛЬЕЎ Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1905, расстраляны ў 1941 у г. Дуброўна.

ВАСІЛЬЕЎ Валянцін Міхайлавіч, рад., загінуў у 1945.

ВАСІЛЬКОЎ Парфен Пятровіч, н. ў 1909, загінуў у 1941, пахаваны на ст. Ярцава.

ВАШЧЫЛАЎ Мікалай Пятровіч, гв. лейт., кам. узвода, загінуў 4.12.1944 у в. Букін, Югаславія.

ВЛАСАЎ Аляксандр Савельевіч, рад.

ВОЛКАЎ Сямён Міхайлавіч, н. ў 1911, ст. сярж., прапаў без вестак у лютым 1945.

ВОРАНАЎ Евель Пейсахавіч, н. ў 1912, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ВЫДРАНКОЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ВЫДРАНКОЎ Сямён Ціханавіч, н. ў 1912, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ГАЛАВІЧАР Яфім Данілавіч, н. ў 1915, ст. лейт., кам. узвода, загінуў 24.4.1945 у Фюстервальдэ.

ГАЛАПУПКІН Пётр Іванавіч, н. ў 1915, рад., загінуў 21.4.1945 у м. Розэнталь, Германія.

ГАЛЕХ Аляксандр Маісеевіч, н. ў 1916, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ГАЛЕХ Сяргей Маісеевіч, н. ў 1922, загінуў 18.8.1942.

ГАЛУБЦОЎ Андрэй Сямёнавіч, н. ў 1912, сярж., прапаў без вестак у крас. 1943.

ГАПЕЕНКА Іван Архіпавіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак.

ГАПЕЕНКА Іосіф Архіпавіч, прапаў без вестак у чэрв. 1944.

ГАРБАЧОЎ Аляксандр Іванавіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ГАРБАЧОЎ Даніла Лук'янавіч, н. ў 1906, рад., загінуў у студз. 1942 у Маскоўскай вобл.

ГАРЭЛІК Іван Мацвеевіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ГАРЭЙКА Пётр Мітрафанавіч, сярж., прапаў без вестак 30.9.1941.

ГАЎРЫЛЕНКА Сяргей Лявонавіч, н. ў 1912, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ГЕЛЬМАН Рыгор Іванавіч, н. ў 1916, мал. лейт., кам. узвода, прапаў без вестак 11.7.1941.

ГЕНКІН Альд Маісеевіч, н. ў 1921, прапаў без вестак у лют. 1942.

ГЕНКІН Саламон Барысавіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ГІЛЬКІН Абрам Лейбавіч, н. ў 1921, мал. сярж., загінуў 2.8.1941 у г. Рослаўль.

ГІСАЎ Дзяніс Раманавіч, н. ў 1904, загінуў у 1941 у Вінніцкай вобл.

ГЛЕБАЎ Павел Андрэевіч, лейт.

ГЛЕЙЗЕР Ісак Хаімавіч, н. ў 1916, сярж., загінуў 31.12.1943 у в. Свярчкі Віцебскай вобл.

ГЛЕЙЗЕР Меір Селавіч, н. ў 1919, рад., прапаў без вестак 28.6.1942.

ГЛУШАКОЎ Дзмітрый Пятровіч, н. ў 1903, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944.

ГОЗ Яфім Еўнавіч, н. ў 1901, рад., прапаў без вестак.

ГОСДАНКЕР Вальмін Данілавіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак у снеж. 1941.

ГОФМАН Навум Ісакавіч, н. ў 1919, рад., прапаў без вестак у 1941.

ГРУЦА Арсеній Андрэевіч, н. ў 1909, рад., загінуў 6.9.1943 у в. Рысакі Зенькаўскага р-на Палтаўскай вобл.

ГРУЦА Сяргей Іванавіч, н. ў 1920, маёр, загінуў у 1945.

ГРУЦА Фёдар Іванавіч, н. ў 1921, загінуў у 1944 на Украіне.

ГРЫБКОЎ Ягор Марц'янавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у снеж. 1942.

ГРЫНЕЎ Емяльян Гаўрылавіч, рад., прапаў без вестак у сак. 1942.

ГРЫНЕЎ Еўдакім Захаравіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак у ліп. 1944.

ГРЫНЕЎ Патап Кандратавіч, н. ў 1918, рад., прапаў без вестак у ліст. 1944.

ГРЫНЕЎ Пётр Гаўрылавіч, н. ў 1922, прапаў без вестак у ліп. 1944.

ГРЫНЕЎ Тарас Гаўрылавіч, н. ў 1910, загінуў 1.8.1944 у в. Ладзіяй, Літва.

ГУРЭВІЧ Леў Веніамінавіч, н. ў 1922, лейт., кам. узвода, загінуў 10.3.1943, пахаваны ў в. Камена Ізюмскага р-на Харкаўскай вобл.

ГУРЭВІЧ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ГУТАРАЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1916, ст. сярж., памёр ад ран 17.4.1942.

ГУТАРАЎ Купрыян Ульянавіч, н. ў 1921, старш., памёр ад ран 19.2.1945, пахаваны ў г. Кібартай, Літва.

ГУТАРАЎ Міхаіл Піліпавіч, н. ў 1900, рад., загінуў 17.4.1945.

ГУТАРАЎ Назар Архіпавіч, рад., памёр ад ран 19.12.1943.

ГУТАРАЎ Пётр Азаравіч, н. ў 1899, рад., загінуў 26.11.1944.

ГУТАРАЎ Сямён Рыгоравіч, н. ў 1915, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ГУТАРАЎ Фёдар Піліпавіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ГУТАРАЎ Ціт Аляксандравіч, н. ў 1907, рад., загінуў у вер. 1944.

ГУЦІН Давыд Захаравіч, н. ў 1916, сярж., прапаў без вестак у жн. 1944.

ДАВЫДЗЬКА Васіль Фёдаравіч, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944.

ДАРАФЕЕЎ Яфім Іларыёнавіч, н. ў 1918, рад., загінуў 1.2.1945 у в. Бархенздорф, Усх. Прусія.

ДВОРКІН Іосіф Гіршавіч, прапаў без вестак у 1944.

ДЗЕМЧАНКА Іван Міхайлавіч, мал. лейт., загінуў 19.9.1944.

ДЗЮБАНАЎ Андрэй Уладзіміравіч, н. ў 1920, рад., загінуў 15.8.1941, пахаваны на мысе Мішукова, раён Цітаўка.

ДЗЮБАНАЎ Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ДЗЯДКОЎ Міхаіл Іванавіч, гл. бухг. гарторгa, сувязны партызанскага атрада, памёр ад ран у 1944.

ДЗЯДКОЎ Жэня.

ДЗЯМІДОВІЧ Сяргей Уладзіміравіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ДУБАЎ Гаўрыла Фёдаравіч, лейт., кам. узвода, загінуў 16.2.1943 на ст. Северская Краснадарскага краю.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Максім Дзянісавіч, н. ў 1912, загінуў у 1945.

ЕЎДАКІМАЎ Ерафей Іванавіч, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЕЎДАКІМАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1919, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ЕЎЗЛІН Саламон Канстанцінавіч, н. ў 1903, рад., прапаў без вестак у кастр. 1941.

ЖАЛЯЗОЎСКІ Віктар Іванавіч, н. ў 1917, санінструктар, памёр ад ран 8.3.1942 у Мурманскай вобл., вышыня 314,9

ЖНОЎ Герасім Васілевіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак 31.7.1944.

ЖОЛУДЗЕЎ Несцер Рыгоравіч, н. ў 1904, ст. лейт., кам. узвода, загінуў 16.4.1944 у в. Редзіў-Мітраполій, Румынія.

ЗАРЭМБА Мікалай Архіпавіч, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЗАРЭМБА Пётр Е., н. ў 1919, рад., прапаў без вестак у ліп. 1941.

ЗАХАРАЎ Осіп Ісакавіч, н. ў 1913, загінуў у 1941 пад Масквой.

ЗВЕРАЎ Аляксандр Архіпавіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЗВЕРАЎ Ілья Раманавіч, н. ў 1916, рад., памёр ад ран 28.8.1944.

ЗЕМЛЯНЫ Мікалай Нікіфаравіч, рад., прапаў без вестак 14.7.1941.

ЗОБІН Іосіф Самуйлавіч, н. ў 1921, лейт., загінуў 23.6.1944 у в. Іваноўшчына Дубровенскага р-на.

ЗЫКАЎ Антон Іванавіч, н. ў 1918, рад., прапаў без вестак у ліст. 1944.

ЗЫКАЎ Васіль Іларыёнавіч, н. ў 1924, мал. сярж., памёр ад ран 20.2.1945 у в. Грост-Заманрынскі Шубінскага павета, Польшча.

ЗЫКАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1906, рад., загінуў 5.4.1942, пахаваны ў в. Рылькава Гжацкага р-на Смаленскай вобл.

ЗЫКАЎ Іван Маркавіч, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЗЫКАЎ Лукерый Іванавіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ЗЯНКОЎ Мікалай Архіпавіч.

ІВАНОЎ Аляксандр Осіпавіч, н. ў 1914, лейт., загінуў 24.10.1944.

ІВАНОЎ Аляксандр Сяргеевіч, рад.

ІВАНОЎ Аляксей Осіпавіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у снеж. 1942, пахаваны ў г. Ельня.

ІВАНОЎ Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1916, рад., прапаў без вестак у ліст. 1944.

ІВАНОЎ Канстанцін Платонавіч, н. ў 1918, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ІВАНОЎ Пётр Платонавіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ІВАНОЎ Севасцьян Сяргеевіч, н. ў 1908, ст. сярж., прапаў без вестак у вер. 1944.

ІВЕЛЕЎ Рыгор Архіпавіч, н. ў 1923, рад., расстраляны за сувязь з партызанамі, або загінуў 8.1.1944.

ІГАЛАЎ Кірыл Севасцьянавіч, н. ў 1917, сярж., загінуў 16.1.1945, пахаваны ў н. п. Селюнь каля г. Ружан, Польшча.

ІОФЕ Леў Абрамавіч, н. ў 1914, рад., загінуў 30.1.1942, пахаваны ў в. Цэпавае Сухініцкага р-на Калужскай вобл.

ІОФЕ Яфім Маісеевіч, н. ў 1901, рад., загінуў 15.8.1943 у в. Вава, Спас-Дземенскага р-на Смаленскай вобл.

ІЎКІН Аркадзь Дзянісавіч, н. ў 1918, ст. сярж., прапаў без вестак у ліп. 1941.

ІЎКІН Павел Аляксеевіч, н. ў 1924, рад., загінуў 7.3.1945 у в. Колаў каля г. Альтдам, Германія.

ІЎКІН Рыгор Васілевіч, н. ў 1906, рад., загінуў у вер. 1941, пахаваны ў в. Ясінава Падчэрынскага р-на Магілёўскай вобл.

КАВАЛЁЎ Сяргей Васілевіч, н. ў 1921, рад., загінуў 14.10.1941 у п. Пясочнае.

КАВАЛЕЎСКІ Васіль Іванавіч, памёр ад ран 19.1.1941.

КАВАЛЕЎСКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. ў 1924, загінуў у 1944 у Польшчы.

КАВІТАЎ Іван Маісеевіч, н. ў 1916, партызан, загінуў у студз. 1944.

КАВІТАЎ Кузьма Пятровіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

КАДЫШ Канстанцін Ігнатавіч, н. ў 1920, рад., загінуў у ліп. 1941, або прапаў без вестак у вер. 1944.

КАДЫШ Уладзімір Аляксандравіч, н. ў 1924, рад., памёр ад ран 15.3.1945, пахаваны ў м. Струміна Кракаўскага ваяводства.

КАЖЭЎНІКАЎ Зяма Саламонавіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

КІНДЗЯНКОЎ Мацвей Архіпавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

КІРЫЛАЎ Іван Захаравіч, н. ў 1919, лейт., кам. узвода, прапаў без вестак на рубяжы ракі Муйжа, Літва.

КІРЫЛАЎ Іван Іванавіч, рад.

КІРЭЕЎ Аляксандр Цімафеевіч, н. ў 1925, рад., загінуў 23.3.1945 на ст. Эспенкруг, Польшча.

КІРЭЕЎ Ціхан Гаўрылавіч, н. ў 1902, рад., загінуў 25.8.1944 каля Сенвозера ў Карэліі.

КІРЭЕЎ Яфім Гаўрылавіч, н. ў 1911, мал. лейт., кам. узвода, прапаў без вестак у 1941.

КІСЯЛЁЎ Міхаіл Паўлавіч, рад.

КІСЯЛЁЎ Сямён Андрэевіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

КЛІМАЎ Андрэй Калінавіч, н. ў 1890, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

КЛЯЎЗАЎ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1902, рад., прапаў без вестак 13.2.1942.

КЛЯЦКОЎ Павел Мікітавіч, н. ў 1915, кам. узвода, прапаў без вестак 13.2.1942.

КНЯЗЕЎ Павел Цімафеевіч, загінуў 21.3.1945.

КОНЕНКАЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1904, рад., загінуў 8.2.1945 у г. Кройцбург, Усх. Прусія.

КОРЗНІКАЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак 25.7.1942.

КРАЙКО Пётр Якаўлевіч, н. ў 1905, кап., прапаў без вестак у жн. 1941.

КРАСНІКАЎ Павел Ціханавіч, рад., прапаў без вестак 23.2.1942 на Зах. фронце.

КРАЎЦОЎ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1925, рад., загінуў 28.9.1944 у в. Межакі, Латвія.

КРАЎЦОЎ Осіп Іларыёнавіч, мал. лейт., загінуў 12.9.1943.

КРАЎЦОЎ Станіслаў Васілевіч, памёр ад ран 6.7.1945.

КРУГЛОЎ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1909, рад., загінуў 29.4.1942.

КУБРОЎ Аркадзь Васілевіч, н. ў 1920, мал. сярж., прапаў без вестак 26.9.1942.

КУЗЬМЯНКОЎ Міхаіл Якаўлевіч, рад.

КУЗЬМЯНКОЎ Іван Ягоравіч, н. ў 1908 у в. Засценкі, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944.

КУЗЬМЯНКОЎ Пімон Ягоравіч, рад.

КУЖЭЛЬНЫ Сцяпан Осіпавіч, н. ў 1917, палітрук, памёр ад ран 13.10.1941.

КУЛІТАЎ Дзмітрый Рыгоравіч, н. ў 1902, рад., загінуў 12.11.1942 каля в. Анастасіеўка Туапсінскага р-на Краснадарскага краю.

КУЛЯШОЎ Дзям'ян Рыгоравіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

КУЛЯШОЎ Кірыла Міхайлавіч, н. ў 1914, рад., памёр ад ран 26.1.1944, пахаваны на тэр. Дзяржынскага шклозавода ў Жытомірскай вобл.

КУЛЯШОЎ Павел Рыгоравіч, рад.

КУРАЕДАЎ Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1911, старш., загінуў 25.7.1944 у в. Бундзіна Палкінскага р-на Ленінградскай вобл.

ЛАБКОЎСКІ Міхаіл Ягоравіч, рад.

ЛАЗОЎСКІ Міхаіл Віктаравіч, н. ў 1919 у Іскозскім сельсавеце, ваентэхнік 1-га рангу, прапаў без вестак у кастр. 1941.

ЛАРЧАНКА Захар Сцяпанавіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ЛАНДАРЭНКА Іван Дзянісавіч, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ЛЕВЯР'ЯНАЎ Яўген Васілевіч, рад.

ЛЕСНІКОЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1908, рад., загінуў 29.10.1943 у в. Расасна Дубровенскага р-на.

ЛІСТАПАДАЎ Віктар Кандратавіч, н. ў 1917, ст. лейт., загінуў 18.10.1944.

ЛІСІЧОНАК Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1905, рад., прапаў без вестак у снеж. 1944.

ЛОСЕЎ Лазар Сцяпанавіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у крас. 1944.

ЛЫСЕНКА Андрэй Аляксеевіч, н. ў 1914, сярж., прапаў без вестак 28.11.1941.

ЛЮХЦЕНКА Андрэй Парфіравіч, н. ў 1914, сярж., памёр ад ран 3.9.1942 у п. Вішэрка Ленінградскай вобл.

ЛЯГАЙСКІ Канстанцін Іванавіч, загінуў 16.4.1945.

ЛЯЛІКАЎ Уладзімір Цімафеевіч, рад.

ЛЯСНІЧЫ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1895, рад., загінуў 10.3.1945 у в. Карклі, Латвія.

МАГЕР Валянцін Іванавіч, н. ў 1924, рад., загінуў 26.9.1943 у Чорным моры.

МАІСЕЕНКА Астап Мікалаевіч, н. ў 1915, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

МАІСЕЕНКА Рыгор Данілавіч, н. ў 1920, прапаў без вестак 28.9.1942.

МАЙСТРАНКА Канстанцін Сяргеевіч, рад.

МАКАРАНКА Аляксей К., гв. лейт., загінуў 10.10.1944.

МАКАРАНКА Якаў Фаміч, н. ў 1903, рад., загінуў 19.1.1945 у в. Дамброўка Макуўскага р-на Варшаўскага ваяводства, Польшча.

МАКАРЭВІЧ Андрэй Фаміч, рад.

МАКЕЕЎ Мацвей Мікалаевіч, н. ў 1908, сярж.

МАКЕЕЎ Мацвей Мікалаевіч, н. ў 1908, сярж., загінуў 27.1.1942 у в. Варанеты Сухініцкага р-на Калужскай вобл.

МАКУЛЬКІН Міхаіл Ізотавіч, рад.

МАЛАНУХІН Пракоп Фядотавіч, рад.

МАЛАХАЎ Андрэй Міхайлавіч, рад.

МАЛАШЭНКА Пётр Паўлавіч, н. ў 1922, яфр., памёр ад ран 22.1.1943 у в. Пятрова Кіраваградскай вобл.

МАЛІНОЎСКІ Сяргей Іванавіч, н. ў 1914, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

МАР'ІН Рыгор Якаўлевіч, рад., загінуў 19.1.1942 у в. Каляснічы Смаленскай вобл.

МАРМЫЛЁЎ Іван Трафімавіч, н. ў 1905, мал. лейт., прапаў без вестак у ліп. 1943.

МАРТЫНАЎ Сяргей Сцяпанавіч, рад.

МАРЧАНКА Андрэй Парфіравіч, рад.

МАРЧАНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1921, мал. сярж., прапаў без вестак 3.7.1942.

МАРШАЛАЎ Іван Давыдавіч, н. ў 1912, рад.

МАРШАЛАЎ Іван Фёдаравіч, рад.

МАСКАЛЁЎ Іван Уладзіміравіч, рад.

МАТКІН Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1914, рад., памёр ад ран 30.10.1942 на х. Валгастрой Сталінградскай вобл.

МАТУШКІН Ягор Трафімавіч, н. ў 1921, рад., загінуў 2.3.1944 у Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл.

МАХНАЧ Іван Осіпавіч, рад.

МАХЛАЕЎ Пракоп Еўдакімавіч, н. ў 1910, сярж., загінуў 19.3.1943 у в. Шаглунова Ленінградскай вобл.

МЕШУЛКОЎ Кузьма Ягоравіч, н. ў 1895, прапаў без вестак у сак. 1942.

МІКРУКОЎ Сяргей Іванавіч, н. ў 1908, мал. лейт., загінуў 17.10.1943 у в. Ужар Чавускага р-на Магілёўскай вобл.

МІНІН Прохар Піліпавіч, рад., прапаў без вестак у 1941.

МІНІН Рыгор Савельевіч, н. ў 1915, тэхнік-інтэндант 1-га рангу, загінуў 8.3.1942 у в. Фралова Ржэўскага р-на Цвярской вобл.

МІНЧАНКА Парфір Цімафеевіч, рад.

МІНЯНКОЎ Арсен Кузьміч, лейт., загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 29.6.1944.

МІХАЙЛАЎ Піліп Рыгоравіч, н. ў 1908, рад., загінуў 5.2.1942.

МІХЕЕНКА Сцяпан Цімафеевіч, н. ў 1904, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

МІЦКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч, н. ў 1915, рад., загінуў 14.8.1941 у в. Гарохаўка Цвярской вобл.

МІШЫН Іван Іванавіч, н. ў 1923, рад., загінуў 25.3.1944 у в. Гразявец Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.

МУСІНСКІ Анатоль Аляксеевіч, рад., прапаў без вестак 18.10.1944 у Латвіі.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Аляксей Сафронавіч, н. ў 1918, старш., загінуў 6.4.1943 у в. Казлова Старускага р-на Ленінградскай вобл.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Патап Гаўрылавіч, рад.

МЯЛЕШКІН Рыгор Якаўлевіч, рад.

МЯСНІКОЎ Пётр Міхайлавіч, рад.

МЯЦЕЛІЦА Цярэнцій Ефстратавіч, н. ў 1898, рад., загінуў 19.2.1945.

НАВУМАЎ Дзмітрый Сямёнавіч, н. ў 1909, маёр, зам. кам. па палітчастцы, памёр ад ран 29.11.1942 у в. Лутавініна Зубцоўскага р-на Цвярской вобл.

НАВУМАЎ Рыгор Васілевіч, рад.

НАРУЦІН Ігнат Уладзіміравіч, лейт., загінуў 9.12.1942.

НАСТАЯШЧЫ Фёдар Фёдаравіч, рад.

НАЧКОЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1918, мал. сярж., памёр ад ран 9.12.1941 у в. Сіняўка Нікалінаўскага р-на Растоўскай вобл.

НІКАЛАЕЎ Іван Маісеевіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у снеж. 1944.

НІКІЦІН Аляксей Яўсеевіч, н. ў 1922, лейт., кам. узвода, загінуў 18.3.1943 у в. Аніканава Смаленскай вобл.

НОВІКАЎ Аркадзь Іванавіч, рад., загінуў 26.3.1945 у г. Гдыня, Польшча.

НОВІКАЎ Іван Мікалаевіч, н. ў 1910 у Дабрынскім сельсавеце, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

НОВІКАЎ Іван Уласавіч, н. ў 1919, рад., памёр ад ран 1.6.1944 у в. Асінаўка Лёзненскага р-на Віцебскай вобл.

НОВІКАЎ Міхаіл Фёдаравіч.

НОВІКАЎ Яўген Андрэевіч, н. ў 1919, рад., загінуў 23.1.1945 у в. Паўперн каля г. Інстэрбурга.

НЯМІРАЎ Ігнат Давыдавіч, н. ў 1925, загінуў 4.2.1945 каля хаты лесніка кв. 6979, Латвія.

ПАДУЛАЎ Канстанцін Пракопавіч, н. ў 1908, рад., загінуў 22.7.1942 у в. Врагава Малавіцкага р-на Ленінградскай вобл.

ПАЗНЯКОЎ Іван Іванавіч, н. ў 1924, яфр., загінуў 30.4.1944, калгас «Дуброва» Тужыйскага р-на Валынскай вобл.

ПАЛЯКОЎ Васіль Фёдаравіч, рад.

ПАПОЎ Сямён Мікалаевіч, н. ў 1910, ст. лейт., штурман звяна, загінуў 24.7.1941 каля в. Міхайлаўка, раён г. Ельня.

ПАРФЁНАЎ Іван Ігнатавіч, рад.

ПАСТАРНАК Міхаіл Панкратавіч, н. ў 1897, рад., загінуў 23.8.1941 у в. Заўражжа Ярцаўскага р-на Смаленскай вобл.

ПАЦКАЛЁЎ Мікалай Максімавіч, н. ў 1922, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ПАШКОЎ Аляксандр Гаўрылавіч, н. ў 1910, рад.

ПАШКОЎСКІ Антон Сцяпанавіч, н. ў 1918, ст. сярж., загінуў 30.6.1941.

ПЕТРАЧЭНКА Сцяпан Васілевіч, н. ў 1918, лейт.

ПІЛЬКІН Емяльян Дзмітрыевіч, рад.

ПІЛЮШЧАНКА Фёдар Дарафеевіч, рад.

ПІХАНСКІ Міхаіл Раманавіч, рад.

ПЛОТКІН Анатоль Давыдавіч, н. ў 1919, зам. кам. па палітчасці ў партыз. атрадзе, загінуў 21.1.1943, пахаваны на ст. Шафранава каля г. Гомель.

ПЛЮШЧАЎ Ерафей Цімафеевіч, рад.

ПОРЦІКАЎ Ціхан Міхайлавіч, н. ў 1918, ст. лейт., памёр ад ран 13.2.1945 у г. Таўраге, Літва.

ПРАВАШЫРЫНСКІ Піліп Акцісавіч, н. ў 1921, мал. лейт., прапаў без вестак 5.9.1943 у в. Капусцінцы Ржышчанскага р-на Кіеўскай вобл.

ПРОХАРАЎ Васіль Апанасавіч, н. ў 1901, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ПРАСКУРАЎ Аляксандр Карпавіч, рад.

ПУЗІКАЎ Іван Іванавіч, рад.

ПУЗЫРОЎ Фёдар Ісакавіч, рад.

ПУЧКОЎ Павел Данілавіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ПЫНЬКІН Іван Васілевіч, рад.

ПЫНЬКІН Сцяфан Дзмітрыевіч, н. ў 1898, рад., прапаў без вестак 21.11.1941 у в. Ядроміна Пятроўскага р-на Маскоўскай вобл.

ПЯТРОЎ Міхаіл Пятровіч, рад.

РАБЦАЎ Аляксей Дзмітрыевіч, н. ў 1921, сярж., загінуў 4.9.1942 каля в. Броўкіна Гжацкага р-на Смаленскай вобл.

РАБЦАЎ Антон Сцяфанавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

РАДЗІВОНАЎ Архіп Андрэевіч, н. ў 1898, рад., прапаў без вестак у лют. 1943.

РАДЗЬКОЎ Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1916, рад., загінуў 16.10.1944 у Вілкавішскім р-не, Літва.

РАДКЕВІЧ Міхаіл Нікіфаравіч, н. ў 1895, калгаснік, памёр ад ран 21.7.1944, пахаваны ў г. Смаленск на Пакроўскіх могілках.

РАДКЕВІЧ Рыгор Адамавіч, рад.

РАЖКОЎ Васіль Максімавіч, н. ў 1914, рад., прапаў без вестак у лют. 1945.

РАКАЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1921, рад., загінуў 22.8.1944 у в. Воля Замбруўскага р-на Беластоцкай вобл., Польшча.

РАМАНЕНКА Іван Ермалаевіч, н. ў 1915, рад., загінуў у в. Кіева, Старарускага р-на Ленінградскай вобл.

РОГБНІНЦАЎ Мітрафан Мітрафанавіч, н. ў 1919, рад., загінуў 20.4.1945 у в. Пілтш, Германія.

РОСЕ Хайм Шлінавіч, н. ў 1912, рад., прапаў без вестак у маі 1943.

РУБАНЕНКА Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1904, рад., загінуў 7.2.1945 у в. Сарочын, Венгрыя.

РЫЖАЕЎ Аляксей Фёдаравіч, н. ў 1926, рад., загінуў 26.6.1944 у в. Андронаўка Віцебскага р-на.

РЫЖКОЎ Дзмітрый Васілевіч, н. ў 1924, мал. лейт., загінуў 12.12.1943.

РЫЖЫКАЎ Сцяпан Нікіфаравіч, рад., прапаў без вестак 1.3.1942.

РЭЙЗМАН Пётр Міхайлавіч, н. ў 1900, загінуў 17.10.1944.

САВІЦКІ Адам Сямёнавіч, ст. сярж.

САКАЛОЎСКІ Сцяпан Уладзіміравіч, н. ў 1912, тэхнік-інтэндант 2-га рангу, прапаў без вестак у вер. 1941.

САЛЯНКОЎ Леанід Пракопавіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак 5.9.1942.

САРАТОКІН Кірыла Аляксеевіч, н. ў 1918, рад., прапаў без вестак у лютым 1945.

САЎЧАНКА Іван Фёдаравіч, рад., прапаў без вестак 14.9.1941.

САЎЧАНКА Канстанцін Фёдаравіч, рад.

СВІКЛІС Осіп Восіпавіч, партызан.

СЕМЯНКОЎ Віктар Рыгоравіч, н. ў 1913, старш., памёр ад ран 18.1.1942, пахаваны на Новых могілках у г. Сталінград.

СЕМЯНЦОЎ Цімафей Уладзіміравіч, н. ў 1908, прапаў без вестак у 1945.

СІДАРЭНКА Ягор Піліпавіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак 8.10.1941.

СІЛКОЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1923, рад., прапаў без вестак у студз. 1944.

СІНЕЛЬНІКАЎ Савелій Сямёнавіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак 3.5.1942.

СІНІЦА Міхаіл Раманавіч, рад.

СІРОТКІН Іван Астаф'евіч, н. ў 1907, рад., загінуў 7.8.1943 у в. Нікольскае Туманаўскага р-на Смаленскай вобл.

СІРОТКІН Мікалай Васілевіч, рад., загінуў 2.11.1944 на ст. Авіхне, Латвія.

СІЎЦОЎ Андрэй Сцяпанавіч, н. ў 1901, ст. лейт., загінуў 4.12.1942.

СКАРБОЎСКІ Сямён Іванавіч, н. ў 1921 у Мардашэвіцкім сельсавеце, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

СКОБЕЛЕЎ Васіль Парфіравіч, н. ў 1910, сярж., загінуў 17.9.1941.

СОТЧАНКА Аркадзь Дзмітрыевіч, рад.

СПІРЫДЗЕНКАЎ Сямён Іванавіч, н. ў 1926, рад., прапаў без вестак 7.2.1945.

СТАЛЯРОЎ Мяфодзій Ягоравіч, н. ў 1910, рад., загінуў 1.4.1945 у в. Штабельвіц каля г. Брэслаў, Германія.

СТАРАВОЙТАЎ Якаў Ягоравіч, лейт., камбат, загінуў 26.2.1942 у в. Лукіна Старарускага р-на Ленінградскай вобл.

СТАСЬКОЎ Міхаіл Усцінавіч, н. ў 1925, рад., прапаў без вестак у снеж. 1943.

СТОМА Іван Сямёнавіч, н. ў 1915, лейт., загінуў 1.7.1944 у в. Селішча Баранавіцкай вобл.

СУСЛЯНОК Іван Міхайлавіч, н. ў 1920, рад., загінуў 2.8.1941.

СУХОРСКІ Альфанс Паўлавіч, рад.

СЦЯПАНЕНКА Аляксей Пятровіч, н. ў 1903, рад., загінуў 4.8.1944 у в. Ракітня Марыямпольскага павета, Літва.

СЦЯПАНЕНКА Маісей Іванавіч, н. ў 1903 у Іскозскім сельсавеце, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

СЦЯПАНАЎ Віктар Лаўрэнавіч, н. ў 1926, рэпатрыянт, загінуў у 1945 у г. Аленіца, Польшча.

СЦЯПАНАЎ Лаўрэн Ерафеевіч, н. ў 1897, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

СЦЯПАНАЎ Васіль Кузьміч.

СЫТНІКАЎ Кузьма Якаўлевіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак 3.9.1941.

СЫЧОЎ Іван Аляксеевіч, н. ў 1920, лейт., прапаў без вестак у снеж. 1941.

СЫЧОЎ Канстанцін Міхайлавіч, н. ў 1918, у Баеўскім сельсавеце, ст. сярж., загінуў 1.3.1945 у г. Гарбнікен Цынеенскага р-на, Усх. Прусія.

СЯМЁНАЎ Аляксей Ягоравіч, рад.

СЯМЁНАЎ Васіль Няфёдавіч, н. ў 1910, рад., загінуў 12.7.1943 у в. Самадураўка Любашскага р-на Курскай вобл.

СЯМЁНАЎ Віктар Рыгоравіч, старш., памёр ад ран 18.1.1942.

СЯМЁНАЎ Іван Лявонавіч, рад.

СЯМКОВІЧ Осіп Іванавіч, н. ў 1905, прапаў без вестак у кастр. 1944.

ТАРОПІН Аляксандр Кірылавіч, н. ў 1915, рад., загінуў 16.8.1943 у в. Красты Арлоўскай вобл.

ТКАЧОЎ Аляксей Іванавіч, н.ў 1912, рад., прапаў без вестак у жн. 1941.

ТОКАРАЎ Аляксандр Арцёмавіч, н. ў 1926, яфр., загінуў 28.3.1945 у г. Праўст, Польшча.

ТРАЯКОЎ Аляксандр Дарафеевіч, н. ў 1918, ст. лейт., загінуў 29.5.1944 у в. Шапчыцы Журавельскага р-на Гомельскай вобл.

ТРАЯКОЎ Кузьма Ягоравіч.

ТРАЯНАЎ Мікалай Уладзіміравіч, н. ў 1917, рад., загінуў 31.8.1941.

ТРУДА(?) Ціхан Іванавіч.

ТРУТКА Даніла Арцёмавіч, рад.

ТРЭБНІКАЎ Мітрафан Кузьміч, н. ў 1911, рад., загінуў 23.8.1943 на х. Пралетарскі Зміеўскага р-на Харкаўскай вобл.

ТУРАЎ Васіль Кузьміч, н. ў 1922, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

УЛАСЕНКА Аляксандр Андрэевіч.

УЛАСАЎ Якаў Іванавіч, н. ў 1908, рад., загінуў 31.10.1944 у в. Буджэдзелен, Усх. Прусія.

УТКІН Яфім Мікалаевіч, рад.

УСЦІНАЎ Усцін Ягоравіч, н. ў 1904, рад., загінуў 10.2.1943 у в. Крашчатае Харкаўскай вобл.

УШАНІН Міхаіл Пятровіч, н. ў 1922, яфр., прапаў без вестак 15.9.1942.

ХВЕДЗЯНІН Васіль Віктаравіч, н. ў 1913, ваенны юрыст, загінуў 20.5.1942.

ФЁДАРАЎ Іларыён Якаўлевіч, рад.

ФІЛАЦЕНКА Уладзімір Аляксеевіч, рад.

ФІЛІПАЎ Аляксандр Феакцістаўіч, н. ў 1917, курсант, прапаў без вестак 13.6.1942 у в. Краўцова.

ФРАЛОЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1924, рад., загінуў 3.8.1944 у в. Буароле, Літва.

ФРАНКОЎ Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1905, сярж., загінуў 8.10.1943 у в. Арцюхі Віцебскай вобл.

ФЯДОРЧАНКА Васіль Савельевіч, рад.

ФЯДОСАЎ Антон Іванавіч, н. ў 1894 у Расткоўскім сельсавеце, памёр ад ран 3.3.1943 у г. Камышын Сталінградскай вобл.

ХАДКЕВІЧ Віктар Васілевіч, сярж.

ХРАБРЫ Тарас Галакціёнавіч, рад.

ЦІМОШЧАНКА Аляксей Якімавіч, рад.

ЦІМОШЧАНКА Уладзімір Дзмітрыевіч, н. ў Баеўскім сельсавеце, загінуў у крас. 1942 у в. Сукаўкі Юхнаўскага р-на Смаленскай вобл.

ЦІМОШЧАНКА Фядот Гаўрылавіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ЦУРГАЕЎ Мікалай Пракопавіч, рад.

ЦУРГАЕЎ Пракоп Васілевіч, рад.

ЦУРКОЎ Мінай Васілевіч.

ЦЫГАЛАЎ Рыгор Ісакавіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ЦЭЛІК Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1921, рад., прапаў без вестак у снеж. 1943.

ЦЯРЭШЧАНКА Клім Міхайлавіч, н. ў 1907, мал. лейт., кам. узвода, прапаў без вестак у снеж. 1941.

ЧАЙКОЎСКІ Яўген Паўлавіч, мал. сярж.

ЧАПЯЛОЎ Іван Андрэевіч, рад., памёр ад ран.

ЧАПЯЛОЎ Іван Рыгоравіч, прапаў без вестак 29.8.1942.

ЧАРНЫШЭВІЧ Лука Сямёнавіч, рад.

ЧАРНЯКОЎ Мікіта Палікарпавіч, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЧАРНЯКОЎ Яўген Ерафеевіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у кастр. 1941.

ЧАРТКОЎ Кузьма Мяркулавіч, лейт., загінуў 9.3.1943.

ЧАЧКОЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1918, мал. сярж., памёр ад ран 9.12.1941 у в. Сіняўка Няклінаўскага р-на Растоўскай вобл.

ЧАЧКОЎ Андрэй Міхайлавіч, рад., загінуў 4.8.1944.

ЧЫЧЫКАЎ Павел Іванавіч, рад.

ЧЫЧЫКАЎ Піліп Васілевіч, рад.

ЧЫЧЫН(?) Мікалай Сямёнавіч, рад.

ШАБЕКА Сямён Сцяпанавіч, рад.

ШАЛАТОНІН Аляксандр Мікалаевіч, н. ў 1923, прапаў без вестак у лютым 1944.

ШАЛАТОНІН Мікалай Восіпавіч, н. ў 1942.

ШАПАЙЛАЎ Рыгор Самуйлавіч, рад., загінуў 12.8.1943.

ШАРАБІН Максім Парфенавіч, н. ў 1910, рад., загінуў 10.1.1945 на х. Цэрцень Мемельскай вобл.

ШАРАЙ Антон Ігнатавіч, н. ў 1906, рад., памёр ад ран 28.8.1942 каля в. Валынцы Ізначаўскага р-на Смаленскай вобл.

ШАТРОЎ Мікалай Андрэевіч, н. ў 1917, рад., загінуў 21.12.1941 у г. Севастопаль.

ШАЎЦОЎ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1893, рад., памёр ад ран 22.11.1942 у г. Тарапа Цвярской вобл.

ШАЧЫКАЎ Трафім Макаравіч, н. ў 1908, лейт., кам. узвода, загінуў 10.2.1944.

ШКРАБА Пётр Аляксеевіч, н. ў 1902, рад., памёр ад ран 16.9.1944 у в. Бокша Сувальскага ваяводства, Польшча.

ШЛЯПАЎ Фёдар Севасцеевіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у ліст. 1944.

ШОЛЬЦАЎ Мікіта Абрамавіч, н. ў 1914, рад., прапаў без вестак.

ШОРНІКАЎ Васіль Клімавіч, н. ў 1896, рад., прапаў без вестак 26.11.1941 у г. Істра Маскоўскай вобл.

ШУКАЙЛАЎ Пётр Платонавіч, рад.

ШУЛЁЎ Пётр Мікалаевіч, партызан, забіты гітлераўцамі ў 1942, пахаваны каля в. Плоскаш Суражскага р-на Віцебскай вобл.

ШУМКІН Іван Кузьміч, загінуў 2.2.1944.

ШУЛЬКОЎ Яфім Фёдаравіч, н. ў 1914, рад., загінуў 21.3.1945.

ШУРПАКОЎ Навум Ігнатавіч, рад.

ШУСЕЎ Міхаіл Піліпавіч, рад.

ШУТАЎ Фёдар Макаравіч, н. ў 1902, рад., прапаў без вестак у жн. 1944.

ШЧАРБАКОЎ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1918, мал. лейт., загінуў 14.3.1943 у в. В. Аніканава Смаленскай вобл.

ШЧАРБЯНОК Аляксандр Маісеевіч, рад.

ШЫБАНАЎ Веніямін Пятровіч, н. ў 1913, кап., нам. камбата, загінуў 19.9.1944 у в. Рацыя, Латвія.

ШЫЛАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1906, рад., загінуў 13.5.1944 у в. Расасна Дубровенскага р-на.

ШЫТНЕЎ Міхаіл Іванавіч, рад.

ШЫЦІКАЎ Піліп Рыгоравіч, загінуў 17.1.1945.

ЭВІН Маісей Аронавіч, н. ў 1911, лейт., кам. узвода, загінуў 7.11.1943 у в. Разамы Віцебскай вобл.

ЮРЧАНКА Мацвей Артамонавіч.

ЮХНАВЕЦ Міхаіл Ільіч.

ЮШЧУК Сава Данілавіч, н. ў 1897, рад., загінуў 9.11.1944 у в. Арлоўка.

ЯКАБЕЦ Раман Самуйлавіч, рад.

ЯКАЎЛЕЎ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1918, ст. сярж.

ЯКІМЕНКА Сяргей Пракопавіч, н. ў 1916, рад., прапаў без вестак у снеж. 1944.

ЯКІМЕНКА Фёдар Сцяпанавіч.

ЯКУТОЎСКІ Іван Трафімавіч, рад.

ЯЛАГІН Аляксей Андрэевіч, н. ў 1911, рад., загінуў 28.8.1944 у м. Кіргулі, Эстонія.

ЯЛАЖАНКАЎ Міхаіл Якаўлевіч, н. ў 1921, прапаў без вестак у крас. 1942.

ЯРОМЕНКА Трыфан Дзямідавіч, н. ў 1916, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЯРОШКІН Мікалай Сцяпанавіч, рад.

ЯЎСЕЕНКА Фёдар Елісеевіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак 16.10.1944 у в. Каіры, Літва.

ЯФІМЕНКА Мікалай Піліпавіч, рад.

ЯФРЭМЕНКА Кузьма Сямёнавіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1941.

ЯШЧАНКА Уладзімір Пятровіч, рад.

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у вайне з Японіяй у 1945 г.

ГАРБАНОСАЎ Ілья Кандратавіч, н. ў в. Дзям'янкава, рад., прапаў без вестак у вер. 1945.

ГОЛІКАЎ Апанас Фаміч, н. ў в. Лаўкі, рад., загінуў у жн. 1945.

ІВАНОЎ Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1917, лейт., кам. узвода, загінуў 15.8.1945, пахаваны за 150 км на поўдзень ад Сідарліцзы, Маньчжурыя.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

АДРАДЖЭННЕ

1130 дзён Дубровеншчына знаходзілася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй. На дзень вызвалення мірнага насельніцтва тут па сутнасці не было. Падчас вайны людзі былі выгнаны немцамі на захад, а тыя, што ацалелі, эвакуіраваліся на Смаленшчыну. За перыяд, калі праз Дубровеншчыну праходзіў фронт, зямля была спустошана, зрэзана абарончымі збудаваннямі, дарогамі і на значных плошчах стала непрыгоднай для карыстання. З абароту было выведзена 11 тысяч гектараў сельгасугоддзяў, знішчана дзве трэці лугоў, асабліва ў поймах рэк. Вялікія тэрыторыі займалі мінныя палі. Усе дарогі былі ўсланы накатамі з бярвенняў. Для гэтага гітлераўцы разбіралі вясковыя збудаванні — хаты, школы, клубы, свірны і інш. Зрубы хат закапваліся ў зямлю пад зямлянкі і агнявыя кропкі. Гэтай драўніны не хапала, таму вялася суцэльная высечка лясоў. Калісьці людная рабочага гарадка Дуброўна цяпер, па сутнасці, не было. Ад фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» не засталося нават сцен вытворчых памяшканняў. Адступаючы, гітлераўцы ўзарвалі электрападстанцыю. Не існвала больш ні прыстані, ні суднабудаўнічай верфі. У руінах ляжалі кінатэатр, школы,

Былая фабрыка «Дняпроўская мануфактура». 1944 г.



Гэта ўсё, што засталося ад мястэчка Ляды.

Яны вярнуліся дамоў.

іншыя грамадскія будынкі. Было спалена ці разбурана 90 працэнтаў жылля. Цэлыя вуліцы згубілі свае ранейшыя абрысы.

Цяжка было паверыць, што тут адродзіцца жыццё. Здавалася, што спатрэбяцца дзесяцігоддзі. Але людзі не маглі і не хацелі чакаць. Яны бачылі свой гарадок квітнеючым садам і не шкадавалі сіл для дасягнення гэтай мэты. Капалі зямлянкі пад жыллё і тут жа браліся за будаўніцтва жылых дамоў, аднаўленне прадпрыемстваў, калгасаў.

Пасля вызвалення ў раён пачалі вяртацца яго былыя жыхары. На 1 студзеня 1945 г. ў родныя мясціны вярнуліся 8 828 сем'яў. Колькасць сельскага насельніцтва склала 31 124 чалавекі. У горадзе ў гэты час жылі 942 сям'і — 3328 чалавек, а ўсяго ў раёне — 34 452 чалавекі.

Каб уявіць, з чаго даводзілася пачынаць, прывядзем некаторыя звесткі. На 1 студзеня 1941 г. ў раёне пражывалі 45s чалавек. Агульная зямельная плошча складала 97 гектараў, уся пасяўная плошча ў 1940 г. займала 41 597 гектараў. Працавала тры МТС — Дубровенская, Зарубскаяі Арловіцкая. У перадваенны год у іх меліся 40 колавых трактараў, 10 збожжаўборачных камбайнаў, 7 малатарняў, 15 аўтамашын. Аснову глебаапрацоўчых прылад складаў конны сельгасінвентар. Усё гэта было знішчана або разрабавана. Калгасы пачалі аднаўляцца фактычна на голым месцы. Гэта быў нялёгкі працэс. Падзеяй станавіўся кожны раздабыты трактар. Не лягчэй было з трактарыстамі — здаровыя мужчыны былі на фронце. Адначасова з аднаўленнем гаспадаркі вялося размініраванне зямель. За першыя чатыры гады пасля вызвалення мінёрамі было абясшкоджана каля 2 мільёнаў мін, снарадаў і іншых выбухованебяспечных прадметаў. У раёне за гэты час загінула шмат мірных жыхароў, у асноўным — падлеткаў. Многія засталіся інвалідамі. Атрад па размініраванню быў створаны ў пачатку ліпеня 1944 г., узначаліў яго ўраджэнец в.Гладкія, старшыня ДТСААФ лейтэнант Серафім Ісакавіч Жарыкаў. З-за ранення на фронце ў 1943 г. ён быў накіраваны ў свой раён. Падарваўся на міне 2 ліпеня 1944 г.

Ураджэнец в.Хаетчына Кузьма Сафонавіч Куляшоў, механік-вадзіцель танка Т-34, гвардыі старшына, прайшоў праз вайну і закончыў яе ў Берліне. Дэмабілізаваўся ў 1945 г. і ў родным калгасе быў выбраны намеснікам старшыні. А смерць напаткала яго на грэблі каля моста цераз рэчку Чырынка, калі вяртаўся з райцэнтра дамоў: яго конь наступіў на міну.

Складанай была жыллёвая праблема: вярталіся тысячы сем'яў і вярталі-

ся на папяліщчы. Вайна для іх працягвалася яшчэ з большым напружаннем, боллю і горам. Усе ваеннаабавязаныя мужчыны ў ліпені – жніўні 1944 г. былі мабілізаваны на дзеючы фронт, неваеннаабавязаных мужчын адмабілізавалі на працоўны фронт для аднаўлення стратэгічных аб'ектаў. Аднаўленне ж свайго кутка клалася на плечы жанчын, дзяцей, старых і інвалідаў. Не было насення, не было коней, наогул не было ніякай жывёлы, на чым заўсёды трымалася сельская гаспадарка. І ўсё ж да пачатку 1945 г. ў раёне налічвалася ўжо 960 рабочых коней. Праўда, старых, слабых, а ўсё ж – рабочая сіла, надзея і апора селяніна. Сем'і вярталіся тысячамі, а прывялі з сабой для асабістага карыстання не больш як 200 кароў.

У канцы 1944 г. з усходніх раёнаў краіны паступіла каля 1750 галоў буйной рагатай жывёлы, 2300 авечак, каля сотні коней, акрамя таго 280 коней было прынята ад воінскіх часцей. Тады ж у саўгас «1 Мая» было завезена каля паўсотні галоў маладняку свіней. Пагалоўе паміж калгасамі размяркоўвалі невялікімі групамі – па 15–20 галоў. Для ўтрымання яго ладзілі часовыя буданы. Раскошай лічыліся глінабітныя памяшканні. Зімой цяжка было з вадапоем жывёлы. У гэты перыяд яе трэба было ўзмоцнена ахоўваць ад адзічэлых, кінутых нямецкіх аўчарак і ваўкоў, якіх за час вайны распладзілася безліч. Гэта тады ў в.Пуцяціна ваўкі ноччу забраліся на авечкагадоўчую ферму, загрызлі 50 авечак і моцна пакусалі вартаўніка, які застаўся інвалідам. У в.Салаўі шэрыя драпежнікі знішчылі ўсё ферму, на якой было 70 авечак.

Да сяўбы 1945 г. ў трох адноўленых МТС мелася каля 40 колавых трактароў (гусенічныя цягалі на фронце гаўбіцы), у калгасах – коні, акрамя таго былі прывучаны да работы і каровы. Для абмену на насенне яравых культур неабходна было занесці, а не завезці (!) з калгасаў у Оршу на элеватар 64 тысячы пудоў азімага жыта. І прыкладна столькі ж збожжа прынесці назад. Насілі яго ў асноўным жанчыны. І гэта ўжо трэба назваць не патрыятызмам, а рабствам. Нават у вайну можна было штосьці прыдумаць, калі б высокая ўлада думала аб простых людзях. Той жа вясной з падсобных вайсковых гаспадарак, раз-

Першая пасляваенная малацьба.

мешчаных у Краснінскім і Руднянскім раёнах, было перанесена каля 20 тысяч пудоў насеннай бульбы. Гэтыя ж жанчыны зараўноўвалі акопы, траншэі, варонкі ад снарадаў і пад рыдлёўку садзілі бульбу.

Пасля Перамогі, асабліва ў другой палавіне 1945 г., пачала паступаць буйная рагатая жывёла з Германіі. Вельмі добрая жывёла, пароды «Остфрыз». Дапамагала і наша краіа, а ў 1946 г. калгасы сталі атрымліваць коней з вайсковых часцей.

Аднаўляліся і прамысловыя прадпрыемствы. Ужо ў ліпені 1944 г. пачалося будаўніцтва льнозавода. Вырашана было будаваць яго на месцы тэкстыльнай фабрыкі «Дняпроўская мануфактура». Першыя будаўнікі льнозавода выбіралі з руінаў цэглу, дошкі, цвікі, кавалкі дахавага жалеза, тут жа пускалі ўсё ў справу.

У 1946 г. была ўведзена ў строй першая чарга завода. Працаваць тут было нялёгка: устарэлае абсталяванне, адсутнасць вентыляцыі, дрэннае асвятленне. Але патрабавалася валакно, каб саткаць тканіны і хоць як апрануць людзей, каб гаспадвні маглі паслаць на стол абрусы, павесіць на вокны фіранкі. І людзі працавалі ў тых умовах, якія склаліся. У ліпені 1947 г. раённая газета «За сацыялістычнае будаўніцтва» пісала: «Калектыў Дубровенскага льнозавода на 25 чэрвеня паўгадавую вытворчую праграму выканаў на 135 працэнтаў... Добрых вынікаў дабілася брыгада кудзельнай машыны (брыгадзір тав. Кляўзо). Вытворчы план работніцамі брыгады выкананы на 190 працэнтаў».

Адначасова з льнозаводам у горадзе аднаўляліся ці будаваліся іншыя прадпрыемствы. Хутка пачаў дзейнічаць маслазавод, на якім узвялі новы цэх па выпрацоўцы 300 кілаграмаў масла ў суткі. Прадпрыемства, гісторыя якога вядзецца з дарэвалюцыйнага часу, пачынала сваё другое жыццё.

Пашыралася арцель «Чырвоны Кастрычнік». Тут да абутковага і швейнага прыбавіўся ткацкі цэх. Лепшыя работніцы арцелі Ганна Ваво, Марыя Малчанава, Валянціна Адзі-ночкіна і іншыя зменныя заданні як правіла выконвалі на 140—150 працэнтаў. Швачка Настасся Пурышкіна за год выпрацавала больш за дзве асабістыя гадавыя нормы.

Развіваўся райпрамкамбінат. У першыя пасляваенныя гады тут была пабудавана гофманская печ на цагельным заводзе, рэканструяваны вапнавы завод, пушчана піларама. Гэта дазволіла значна паскорыць тэмпы прамыслова-гаспадарчага і культурна-бытавога будаўніцтва, што мела першаступеннае значэнне для раёна.

У 1947 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову аб дапамозе тым раёнам Беларусі, якія асабліва жорстка пацярпелі ад акупацыі. У ліку іх быў і Дубровенскі раён. У Дуброўну паступала абсталяванне для прамысловасці, тэхніка для МТС, насенне і прадукцыйная жывёла для калгасаў і саўгасаў. Зноў была створана Дубровенская МТС, машынна-трактарны парк якой паступова павялічваўся. Так, вядома, што ў 1947 г. ён папоўніўся двума айчыннымі трактарамі маркі «ЧТЗ» і адным замежным трактарам. МТС аказвала вялікую дапамогу гаспадаркам раёна ў апрацоўцы зямлі, уборцы ўраджаю. Дапамога гэта была неабходнай. З карыстання было выведзена 11 гектараў сельгасугоддзяў, поўнасцю знішчана 113 населеных пунктаў. Насельніцтва зменшылася больш чым на 10 000 чалавек. Цяпер рабочыя і сяляне Дубровеншчыны разам пераадольвалі цяжкасці, разам залечвалі страшныя раны вайны. Да 1948 г. на сяле было пабудавана больш за 5 000 дамоў. Абнаві-

лася сетка школ. У трох МТС ужо налічвалася амаль даваенная колькасць трактароў. Раён меў даваеннае пагалоўе авечак і 80 працэнтаў буйной рагатай жывёлы. Пасяўная плошча складала к даваеннаму ўзроўню 98,2 працэнта.

Аднаўляліся дашчэнту разбураны пасёлак Асінторф і аднаіменнае торфапрадпрыемства. Ужо ў 1945 г. было здабыта 35 тысяч тон торфу, у 1950 г. — 310 тысяч тон. Адначасова з развіццём вытворчасці ўзводзіліся жылыя дамы, аб'екты культурнага і сацыяльна-бытавога прызначэння.

Гідраўлічны спосаб здабычы торфу быў значна механізаваны, але заставалася яшчэ многа ручных аперацый. У цэлым працэс быў вельмі энергаёмкім і працаёмкім, умовы працы — цяжкія. Штогод вербавалася каля 10 000 сезонных рабочых. Але прадпрыемства ў поўнай меры забяспечвала палівам БелДРЭС, якая жывіла сваёй электраэнергіяй цэлы край.

За два пасляваенныя гады ва ўсіх калгасах раёна былі створаны фермы па відах жывёлы. Развіццё грамадскай жывёлагадоўлі дазволіла выдзеліць з калгасных фермаў каля 800 кароў і цялушак для бясплатнай перадачы сем'ям загінуўшых воінаў і іншым збяднелым людзям. У 1945—1946 гг. з Канады і ЗША, у парадку дапамогі, паступала для пасеву насенне канюшыны. Дык у калгасах яго тайком ад уладаў дзялілі паміж галоднымі людзьмі і тыя пяклі з яго «хлеб». Але каралі і за гэта. Так, за раздачу такога насення старшыню калгаса в. Стражава Мікіту Іванавіча Мамыкіна знялі з работы, выключылі з партыі і асудзілі на 2 гады.

...А ў сем'і ўсё прыходзілі запозненыя пахаванкі. Пачалі вяртацца дамоў воіны-інваліды, а затым — і здаровыя. І людзі пілі. Пілі з адчаю, гора і радасці. Самагонаварэнне і п'янства рабілася сапраўдным бедствам. Падкідвала спірту-сырцу і родная дзяржава. У народзе гэту атруту называлі «чэмергэсам». Відаць ад слова чэмер? Каго не прыкончыла вайна, паміралі ад сівой атруты.

Так, з песні слова не выкінеш. І не трэба гэтага рабіць. Была страшная вайна, былі страшэнныя спусташэнні, як матэрыяльныя, так і духоўныя. А галоўнымі былі незлічоныя чалавечыя ахвяры. Сёння спяваюць: «Мы за ценой не постоми». Заплацілі ў поўніцу. У асноўным была вынішчана самая здаровая, самая працаздольная частка насельніцтва — мужчыны. І калі цвяроза глядзець на рэчы, то хіба можна дапусціць, што аднавіць разбуранае, знішчанае, спаленае можна было хутка і лёгка? Вядома, не. І ўсё ж як бы цяжка ні было, а раён паднімаўся на ногі, залечваў раны, адбудоўваўся. Для гэтага не шкадавалі сіл ні простыя працаўнікі, якія нярэдка самі ўпрагаліся ў плуг, ні іх кіраўнікі, што цягнулі не меншы груз. Справядліва будзе назваць сярод многіх першага сакратара райкома партыі Антона Данілавіча Казака. Гэта быў вопытны кіраўнік, сялянскі сын, які добра ведаў, чым жывуць людзі. Паплечнікам яго быў старшыня райвыканкама Сцяпан Трафімавіч Воранаў. Да вайны ён працаваў дырэктарам ільнозавода, у вайну камандаваў партызанскай брыгадай у Віцебскай вобласці. Земаддзел узначальваў Ісак Рыгоравіч Борыкаў, спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, настаўнік з душой хлебароба, партызанскі палітработнік. Выдатна праявіў сябе дырэктар Дубровенскай МТС Аўгуст Іванавіч Цыба, эстонец па нацыянальнасці. У час вайны ён знаходзіўся ў армейскай разведцы, шмат разоў пераходзіў лінію фронту. За гады дырэктарства ў МТС (1944—1954) вывеў яе ў лік перадавых у вобласці. Быў узнагароджаны ўрадавымі ўзнагародамі.

Самааддана працавалі многія кіраўнікі калгасаў. Калгас «На варце» Пірагоўскага сельсавета ўзначальваў украінец Пахом Васільевіч Ветраной; калгас «Гігант» Кляноўскага сельсавета — Агаф'я Трафімаўна Куляшова. Умела гаспадарыў Панфіл Мікалаевіч Ладысеў, старшыня калгаса «Зялёны сад» Кляноўскага сельсавета. Літаральна на папялішчы — там якраз праходзіла лінія фронту — аднаўляў калгас «Трудовик» Баеўскага сельсавета Ягор Лявонавіч Яўсеенка. У Баевскім сельсавеце быў і калгас «Гігант». Аднаўляць яго давялося на мініраванай у вайну тэрыторыі. Аднаўленне гаспадаркі звязана з імем яго старшыні Васіля Свірыдавіча Зубкоўскага. Інвалідам вярнуўся з вайны Павел Ціханавіч Рыжанкоў. Магчыма, яму і хацелася ціхага пасляваеннага жыцця. А на яго ўзвалілі дашчэнту разбураны калгас «Чырвоны Чырынец» Кляноўскага сельсавета. І франтавік не пахіснуўся, з гонарам справіўся з адказнай работай.

Пры такой энергіі, пры такой самаадданасці, нават самаахвярнасці, з якой працавалі тыя, хто выжыў пасля бязлітаснай крывавай бойні, задачы адраджэння краю, нягледзячы на звышцяжкасці і перашкоды, былі ў асноўным вырашаны.

Прыкметны след у пасляваенным развіцці Дуброўны пакінулі 50-я гады. Да канца гэтага дзесяцігоддзя была праведзена мадэрнізацыя абсталявання на льнозаводзе і вытворчая магутнасць яго павялічылася амаль удвая. У калектыве завода знаходзілі падтрымку пачынанні перадавікоў і навататараў вытворчасці — лепшых прадстаўнікоў рабочага класа краіны. Першай на родным прадпрыемстве авалодала некалькімі сумежнымі прафесіямі Настасся Рабчанка. Яе прыкладу паследавалі іншыя работніцы завода. Брыгадзір мяльна-трапальнага агрэгата Ніна Бабакова адгукнулася на пачын знакамітай тэкстыльшчыцы Валянціны Гаганавай і перайшла ў адстаючую брыгаду. Менш чым за год жанчына-энтузіястка вывела гэту брыгаду ў перадавыя. У яе таксама знайшліся паслядоўніцы. Як лепшыя працаўнікі вызначыліся: Таццяна Захараўна Буланава, Фёдар Іванавіч Барысенка, Мікалай Аляксандравіч Буры, Клаўдзія Дзмітрыеўна Стулава, Аляксандр Мікалаевіч Загарэльскі, Марыя Васілеўна Савасцеева, Яўгенія Піліпаўна Рыбакова і многія іншыя.

Перадавым прадпрыемствам горада ў той час лічылася і прамарцель «Ударнік». У 1957 г. тут былі пабудаваны новыя вытворчыя памяшканні, дзе размясціліся швейны цэх і павільён бытавога абслугоўвання. У выніку павялічыўся выпуск вырабаў і аб'ём бытавых паслуг насельніцтву, узрасла прадукцыйнасць працы.

Па-ранейшаму адно з вядучых месцаў у прамысловасці раёна займаў райпрамкамбінат. У 50-я гады ён выпускаў штогод да 3 млн. штук цэглы, асвоіў выраб таннай чарапіцы, шыферу, грунтаблокаў з адходаў цэглы, пачаў асваенне вытворчасці шлакаблокаў. Акрамя таго, ён займаўся размолам зерня і пілаваннем лесу, рамонтам металавырабаў, выкананнем сталярных работ. На гэтым жа прадпрыемстве ў сярэдзіне 50-х гадоў уступіў у строй дзеючых шчэбневы завод. Паспяхова працавалі іншыя прадпрыемствы і арганізацыі горада.

Прыемна змяніўся і сам горад. На яго карце з'явіліся дзесяць нанава адбудаваных вуліц, раённы Дом культуры, трохпавярховая сярэдняя школа, паліклініка і бальніца з трыма аддзяленнямі, некалькі магазінаў, у тым ліку — кнігарня, а таксама сталовая, пякарня, іншыя аб'екты сацкультбыту. Дакладна абрысоўваўся цэнтр горада: малады парк, плошча ў абрам-

ленні адміністрацыйна-культурных і гандлёвых будынкаў у перспектыве. Новы жалезабетонны мост звязаў берагі Дняпра — дзве часткі горада. Завяршылася яго электрыфікацыя. Па пачыну жыхароў вуліцы Вакзальнай усё насельніцтва актыўна ўключылася ў добраўпарадкаванне і азеляненне сваіх вуліц, двароў, прадпрыемстваў. Усё менш заставалася слядоў вайны, толькі колькасць насельніцтва Дуброўны яшчэ не дасягала даваеннага ўзроўню.

Як і раней, непарыўнымі былі сувязі горада і вёскі. Развіццю сельскай гаспадаркі ў раёне надавалася першаступеннае значэнне. Але нанесеныя страты былі вельмі вялікія, і толькі ў 1954 г. яна дасягнула даваеннага ўзроўню.

Шмат было зроблена па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў. Вялікую работу на сяле праводзіла Дубровенская МТС. Так, у 1957 г. з 13 трактарных брыгад МТС 11 перавыканалі заданне. Выпрацоўка па МТС за год на 15-сільны трактар склала 437 гектараў пры планавых 363 гектарах. За ўдарную працу камбайнер-механік Я. П. Карпанаў быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, машыніст А. Ф. Гаўруцікаў — ордэнам «Знак Пашаны».

Больш увагі стала ўдзяляцца сельскаму будаўніцтву. Так, у 1958 г. ў Дуброўне на паявых пачатках калгасаў была створана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя. У калгасах з'явіліся новыя фермы, збожжатакі, майстэрні, школы, клубы, жылыя дамы. Хоць і вельмі марудна, але вёска пакрысе мяняла сваё аблічча.

У 60-я гады прыкметнымі сталі зрухі ў сельскай гаспадарцы. Выдатных вынікаў дабіліся льнаводы.

Па выніках работы за 1964 г. і папярэднія гады 120 перадавікоў раёна былі адзначаны дзяржаўнымі ўзна-

Дзеці вайны на полі вайны. М. Панцялееў (злева), П. Навумаў. 1954 г.

гародамі. А звеннявыя па льну калгасаў «Прагрэс» і імя XX з'езда КПСС К. З. Рубіцель і Е. Я. Маршалава былі ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Ордэнам Леніна былі ўзнагароджаны А. Е. Булаева, Т. Я. Матынава, М. Д. Сідараў, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — І. А. Бяркозаў, М. І. Вароніна, А. В. Гурава, М. І. Капцераў, Р. К. Новікаў і многія іншыя, ордэнам «Знак Пашаны» — М. П. Андрэеў, М. К. Аўсеенка, В. П. Багданава, В. П. Маісеенка; дзесяткі іншых працаўнікоў горада і вёскі — медалямі «За працоўную доблесць».

Уздымалася жывёлагадоўля. У вытворчасці малака добрых вынікаў дасягнулі саўгасы імя Ю. Смірнова, імя Чарняхоўскага, «1 Мая», калгасы «Праўда», «Іскра Ільіча», «Кастрычнік».

Вялікая работа разгарнулася па асушэнню і меліярацыі зямель.

Добрыя змены адбываліся не толькі ў эканоміцы, але і ў культур- нажыллёвым будаўніцтве. Толькі ў 1966 г. на Дубровеншчыне пабудавана 520 новых і адрамантавана 364 дамы, узведзены чатыры школы, пяць клубаў, 60 лазняў, 52 калодзежы, дзве сталовыя, новыя магазіны, медыцынскія і дзіцячыя ўстановы, пракладзена 40 кіламетраў дарог, большай часткай з цвёрдым пакрыццём.



На адроджанай ніве.

Раённы цэнтр нагадваў будаўнічую пляцоўку. У ім вырас вучэбны корпус сельскага прафтэхвучылішча на 420 месцаў у комплексе са спартыўным корпусам, інтэрнатам, корпусам для лабараторных і практычных заняткаў. У рыштаваннях былі двухпавярховы універмаг, камбінат бытавога абслугоўвання, аўтастанцыя, завод жалезабетонных вырабаў праектнай магутнасцю каля 12 тысяч кубаметраў у год. Цэнтральныя вуліцы горада пакрыліся асфальтам. Інтэнсіўна вялося жыллёвае будаўніцтва.



А. Худзіцкі, А, Кавалёва. Калгас «Прамень». 1962 г.

У 1967 г. ў асноўным была завершана электрыфікацыя калгасаў і саўгасаў, у дамах калгаснікаў гарэлі электрычныя лямпачкі і святіліся экраны тэлевізараў, у сельскіх клубах дзейнічала 15 стацыянарных кінаўстановак.

У вёсцы выраслі дзесяткі наватараў сельскагаспадарчай вытворчасці, сярод іх звеннявыя Е. Я. Маршалава, К. З. Рубіцель, В. П. Трусава, свінаркі Е. Ф. Гаўруцікава, Н. І. Куракова і іншыя. Умелымі арганізатарамі праявілі сябе кіраўнікі калгасаў і саўгасаў Р. К. Новікаў, В. А. Пачатоўскі, Д. П. Красоўскі, К. А. Міхасенка, М. Ф. Рабцаў, Н. К. Кавалеўскі, В. І. Попель, М. М. Саўкін, Л. Г. Раманава, В. П. Жызнеўскі. Гэтыя людзі асабістым прыкладам вялі за сабой іншых. За працоўныя поспехі Ордэна Кас-

трычніцкай рэвалюцыі была ўдастоена звеннявая па льну калгаса «Прагрэс» Н. Я. Вакунава, ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга — даярка калгаса імя XX з'езда КПСС Е. І. Камарова і старшыня калгаса «На варце» Г. А. Ладычын, ордэна «Знак Пашаны» — даярка калгаса «На варце» А. Т. Аляксеенка, даярка калгаса імя XX з'езда КПСС А. М. Вырвіч, камбайнер калгаса «Праўда» Н. А. Куракоў, цялятніца саўгаса «Зарубы» О. Н. Машэда, старшыня «Міжкалгасбуда» В. М. Шумейка, бульдазерыст ПМК-39 П. Ф. Пруднікаў, ордэна Працоўнай Славы III ступені — даярка калгаса імя Дзяржынскага М. М. Бацалёва, трактарыст калгаса «Герой працы» В. М. Кабуш, даярка саўгаса імя Ю. Смірнова А. Ф. Чаркасава.

Значныя поспехі прынеслі раёну 70-я гады. Аб'ём вытворчасці 1975 г. ў параўнанні з 1970 г. павялічыўся на 22,8, рэалізацыі — на 28 працэнтаў. Прадукцыйнасць працы за пяць гадоў узрасла на 27 працэнтаў. Асабліва вызначыліся будаўнікі раёна. Яны здалі ў эксплуатацыю звыш 40 000 квадратных метраў жылля, на 15 000 месцаў жывёлагадоўчых памяшканняў, больш трыццаці збожжатакоў і кармацэхаў, а ўсяго 200 аб'ектаў. Па выніках дзевятай пяцігодкі вытворчасць зерня ў раёне павялічылася на 45, мяса — на 54, малака — на 30 працэнтаў. Амаль удвая ўзраслі асноўныя вытворчыя фонды гаспадарак.

Самаадданая праца перадавых рабочых, калгаснікаў, кіраўнікоў была адзначана высокімі ўзнагародамі. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ўдастоіўся старшыня «Міжкалгасбуда» В. М. Шумейка, медаля «За працоўную доблесць» — муляр М. І. Шапавалава. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга быў узнагароджан машыніст бульдозера ПМК-39 меліяратараў П. Ф. Пруднікаў. Ордэнамі былі адзначаны заслугі звеннявой па лёну калгаса «Прагрэс» Н. Я. Вакунава, старшыні калгаса «На варце» Г. А. Ладычына, даяра гэтай жа гаспадаркі А. Ц. Аляксеенкі, камбайнера калгаса «Праўда» Н. А. Куракова і многіх іншых.

Па выніках работы ў першым годзе дзесятай пяцігодкі 75 рабочых, калгаснікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, кіраўнікоў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Вышэйшай узнагароды — ордэна Леніна і Залатой Зоркі Героя Сацыялістычнай Працы быў удастоены камбайнер саўгаса імя Чарняхоўскага Міхаіл Іванавіч Капцераў, які намалаціў за ўборачны перыяд 680 тон збожжа. Ордэнам Леніна былі ўзнагароджаны К. З. Рубіцель, Е. Я. Маршалава, А. Е. Булаева, Т. Е. Мартынава, М. Д. Сідараў, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі — Г. М. Хахлоў, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — М. Л. Бабакоў, Т. І. Жолабава, П. К. Жураў, П. М. Навумаў і іншыя, ордэнам «Знак Пашаны» — П. А. Атрошкін, Н. В. Власаў, Т. Я. Дзенісенка, Н. С. Запрагаева і іншыя.

Усяго за 1966—1976 гады ў раёне былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі 360 чалавек.

Ф. Кулакоў, Ф. Куляшоў

Дакументы сведчаць

ПРАТАКОЛ

агульнага сходу к/алга/са «Луч»* 1 ад 26.XI.43 года.

Прысутнічала 18 чалавек

Павестка дня: 1. Выбар/ы/ праўлення к/алга/са.
3. Арганізацыя работы ў к/алга/се і захав/анне/ конск/ага/ пагалоўя.
2. Закуп хлеба для Краснай Арміі.

Слухалі па першаму пытаннют. Самуйлава. Каб падняць с/ельскае/ гас/падарства/ ў нашым разрушаным к/алга/се, мы павінны выбраць праўленне к/алга/са, бо за час акупацыі меснасці калгас распаўся. Выбіраць мы павінны больш актыўных калгаснікаў, каб падняць на высокую ступень работу ў калгасе.

Пастанавілі: 1. Выбраць у праўленне калгаса 5 чалавек:
1. Бялугін Ягор
2. Пынькіна Ф.
3. Якубоўская Л.
4. Самуйлаў С.
5. Жарыкаў П.
2. Выбраць рэвізійную камісію, у склад якой павінны ўвайсці людзі, якія маюць опыт у рабоце. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі наступныя:
1. Белугіна Екацерына
2. Самуйлаў С.
3. Мініна Ольга

Слухалі па другому пытанню т. Самуйлава аб прадажы хлеба Краснай Арміі. Красная Армія вызваліла нас і пайшла далей у наступленне. Дарогі зараз папсаваныя, хлеб і прадукты арміі даставіць цяжка, а пагэтаму арміі трэба дапамагчы. Правіцельства праявіла вялікую заботу аб людзях вызваленых вобласцей. Мы ўжо палучылі некаторыя тавары як соль, запалкі і г. д. Бачачы заботу партыі і ўрада аб людзях вызваленых вобласцей, мы павінны дапамагчы Краснай Арміі хлебам.

Слухалі па трэцяму пытанню т. Самуйлава аб захаванні конскага пагалоўя і загатоўкі для іх корму.

Пастанавілі: Выбраць конюхаў, якія будуць глядзець за коньмі:
1. Жарыкава Аксіння
2. Мінін Ягор
Плаціць кожнаму конюху па 1,5 працадня.
Слухалі аб зборы корму для коняў.
1. Сабраць хлеба для коняў па 20 фунтаў з душы і па 1 пуду бульбы.
2. Загатовіць па возу сена кожнаму трудаспасобнаму.

Подпісалі: Белугіна
Старшыня Белугін

ФГА у г. Орша, ф. 609, оп. 1, д. 1, лл. 5—6, подлинник, рукопись

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

ПРОТОКОЛ

общего собрания ко/лхизников/ к/олхо/за «Волна революции» Сазоновского с/ельсовета/ Дубровенского района

30/XI.1943 г.

Повестка дня,

1. О заготовке корму для лошадей.
2. Избрание штатного конюха.
3. О дисциплине колхозников.

* Колхоз «Луч» Сазоновского сельсовета Дубровенского района.

4. Общественная охрана.
5. Открытие школы.
6. О пропаже жеребят.
7. Разные.

По первому вопросу общее собрание постановляет: Собрать с каждого хозяйства по два пуда зерновых и по три пуда картофеля, учитывая положение некоторых семей.

По второму вопросу общее собрание постановило: старшим конюхом избрать Воробьева Филиппа и вторым Чучаева Адама — заместитель.

По третьему вопросу общее собрание постановило: все трудоспособные граждане должны выполнять все работы по восстановлению сельского хозяйства, а также помощи Красной Армии.

По четвертому вопросу выступил председатель НКВД (фамилия неразборчиво), который указал на важность общественной охраны революционного порядка.

Общее собрание постановило: Избрать граждан для охраны общественного порядка. Поручить председателю колхоза написать список и передать в НКВД.

По пятому вопросу общее собрание постановило: Открыть школу в дер. Михеевка в доме Чучаева Адама, на что хозяин дома не против.

По шестому вопросу из выступления колхозников видно, что жеребят похитили красноармейцы.

По первому вопросу*: /В/ состав правления колхоза избрали: Воробьева Филиппа, Гончарова Иван/а/, Авралёва, Громыко, Громыко Поликарпа в качестве председателя колхоза.

По второму вопросу выступал тов. Клищко, который отметил, чтобы население, у которого имеется оружие, сдавали /его/ в НКВД. Также о сдаче военного обмундирования и военных вещей, трофейного имущества (часы, сумки и т. д.), а также указал на массовое самогоноварение.

Постановили: Если у кого имеются вышеуказанные вещи, сдать в органы НКВД. Запретить самогоноварение.

Общее собрание иобратилось в с/ельсовет/ по снабжению населения солью, спичками и друг. продуктами.

Президиум: Сименкова Е.
Подпись неразборчива
Чучаев

ФГА в г. Орша, ф. 991, оп. 1, д. 1 лл. 2—3, оригинал, рукопись

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

ПРОТОКОЛ № 1

Собрания к/олхо/за /им/ М. Горьк/ого/ от 2.XII.43 г.

Повестка дня:

1. Выборы правления к/олхо/за.
2. Сохранение конского поголовья.
3. Создание строительной бригады.
4. Разные.

В состав правления колхоза вошли следующие товарищи: Хрипачев Стефан Л., Корсаков Дмитрий М., Панулина Грипина.

В состав ревизионной комиссии вошли: Коржаев Федор Л., Чванова Мария С., Чванова Анастасия Ив.

По второму вопросу выступал тов. Корнев, который указал на то, чтобы колхоз приобрёл себе лошадей от воинских частей. По вопросам корма указал на то, чтобы использовать всё возможное, а именно: использование отходов картофельной шелухи, вносить оставшуюся траву и доброврольный сбор зерна.

По вышеуказанному вопросу постановили: приобрести три лошади и их прокормить.

По третьему вопросу решили поручить правлению колхоза составить списки рабочих.

Председатель собрания подпись неразборчива
Члены /президиума/: 1. Шекин, 2. подпись неразборчива.

ФГА в г. Орша, ф. 644, оп. 1, д. 1, л. 25, оригинал, рукопись

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

* Это первый вопрос седьмого пункта повестки дня «Разное».

ПРОТОКОЛ №1
общего собрания колхозников кол/хо/за имени «Завет Ильича»*
от 2/XII/43 г.

Присут/ствовало/ 25 ко/лхознико/в

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Орг. вопросы.
2. О трудовой дисциплине.

По первому вопросу слушали доклад представителя от райкома партии тов. Трусова.

Постановили: Избрать правление колхоза. В правление входят Предколхоза Хозяинов Аксён Алексеевич, счетоводом Ермалаева Мария и члены правления Папков Иван Данилович.

Ревкомиссия: Пред. ревкомиссии Птанкин Иван Яковлевич.

Члены: Ермалаева Татьяна, Гришукова Марья Борисовна.

Слушали: выступление тов. Трусова о труд. дисциплине.

Постановили: ...все/м/ колхозникам неуклонно выполнять все приказания председателя колхоза и всеми силами восстанавливать колхозное хохяйство с помощью Советского Правительства.

Председатель колхоза Хозяинов
Секретарь Птанкин

ФГА в г. Орша, ф. 699, оа. 1, д. 1, л. 1, подлинник, рукопись

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

ПРОТОКОЛ № 3
Собрания колхоза «М. Горький» (Сазоновского сельсовета)

15.XII-43 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Проведение закупа овощей для Крсной Армии.

По первому вопросу выступил тов. Бирюков, представитель от воинской части № 48622.

В своем выступлении Бирюков указал на то, что для воинских частей нужно заготовить овощи.

Вынесли предложение заготовить воинским частям каждому колхознику по 50 кг.

Предложение подтверждено.

Председатель С. Хрипачёв.

ФГА в г. Орша, ф. 644, оп. 1. д. 1, л. 27, оригинал, рукопись.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

* Колхоз «Заветы Ильича» Чернорученского сельсовета Дубровенского района.

Не адразу колас зашумеў

Як вядома, наша Дубровеншчына была поўнасцю вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 года. Многа палёў у той радасны і горкі год засталіся незасеянымі, ляжалі здзірванелыя, знявечаныя, узараныя снарадамі ды мінамі. Не прыйшоў на іх сейбіт і вясной наступнага года, а на некаторыя — і праз два гады пасля вызвалення. А чаму? Ды таму, што ўся тэрыторыя нашага раёна была густа начынена баявымі рэшткамі вайны, а многія плошчы — замініраваны. Дастаткова сказаць, што за перыяд 1944—1947 гадоў тут было выяўлена, знята і абясшкоджана больш за паўмільёна выбуховых прадметаў.

Але ж, як кажуць, па парадку. Вырас я без бацькоў, у дзетдоме. На час вызвалення Віцебшчыны мне было дзевятнаццаць гадоў. Мог трапіць на фронт, але начальства распарадзілася так, што стаў я курсантам 40-дзённых курсаў інструктараў-размінёраў пры Віцебскім абласным савеце Асаавіяхіма. Пасля іх некалькі месяцаў быў начальнікам каманды па разміраванню тэрыторыі Лёзненскага раёна. А ў пачатку чэрвеня сорак пятага прыняў каманду байцоў-размінёраў, якая размяшчалася ў в. Вусце Дубровенскага раёна. Было камандзе 138 чалавек. Служылі тут юнакі прызыўнога і дапрызыўнога ўзросту, якія прайшлі падрыхтоўку на курсах размінёраў. Смяртэльна небяспечная іх служба працягвалася сезонамі — ад снегу да снегу. Зімой байцы працавалі ў народнай гаспадарцы, вясной іх збіралі зноў. Парадак быў армейскі і даволі строгі.

Сельсаветаў тады было больш, чым цяпер. І ў кожным пуставала не менш 300—400 гектараў ворнай зямлі, да якой нельга было падступіцца, пакуль там не прайшлі размінёры — нашы ці з воінскіх часцей. Асабліва густа была засеяна мінамі зямля Расасненскага, Маласавінскага, Новатухінскага, Расткоўскага, Іскозскага, Баеўскага сельсаветаў.

Абясшкодзіць мінnае поле не так проста. Нялёгка звычайным мінашукальнікам выявіць усе міны. Але выявіць — яшчэ не ўсё. Вось выяўлена нямецкая супрацьтанкавая міна. А які ў яе ўзрывальнік — галаўны, бакавы, ці донны — пастаўлены на выбух? Здымаць такую міну, як кажуць, голымі рукамі нельга. На яе асцярожна накідваецца «кошка», ад якой цягнецца шнур ва ўкрыццё. З укрыцця размінёр і цягне «кошкай» міну. Узарвецца — значыць, з ёй усё скончана. Не ўзарвецца — яе асцярожна трэба даставіць у агульную кучу, якая за дзень вырастае даволі вялікая. Куча, дзённы, так сказаць, здабытак групы размінёраў, будзе ўзарвана вечарам па ўсіх правілах перасцярогі.

Часта прымянялі гітлераўцы трох'яруснае мініраванне: закапвалі ў зямлю адну пад другой тры міны, злучаючы іх вертыкальнымі ўзрывальнікамі. Такую і падобныя ёй хітрасці мог разгадаць толькі вопытны размінёр. Нявопытны ж мог зняць верхнюю міну, а дзве пакінуць, што таіла потым смяротную небяспеку для людзей.

Некалькі лягчэй было з нямецкімі міннымі палямі, на якія меўся фармуляр, іншымі словамі, схема мініравання. Такія фармуляры перадаваў мне ў той час райваенком падпалкоўнік П. Ф. Басаў. З удзячнасцю хачу сказаць, што Пётр Фёдаравіч ва ўсім дапамагаў мне, заўсёды клапаціўся аб камандзе. А па перададзеных ім фармулярах мы паспяхова, з высокай якасцю размініравалі супрацьтанкавыя мінныя палі пад вёскамі Валкулакава, Казьяны, Русаны, Лаўкі, Літвінава, Жалезкава, Казарынава, Коршыкава, Лапыроўшчына, Ірвяніца, Баева, Казлы і інш. Знішчалі мы і склады боепрыпасаў. Запомніліся склады каля рэчкі ў в. Расасна, у Кіраёўскім гаі, пад вёскай Копці, каля царквы ў в. Ланенка. Там былі надзейна схаваны і замаскіраваны не сотні, а тысячы мін і снарадаў.

Як вядома, сапёр памыляецца адзін раз. І ў нашай справе не магло быць паспешлівасці, абыякавасці. Таму кожную раніцу на пастраенні праводзіўся інструктаж, абавязковым было азнаямленне байцоў з правіламі паводзін на мінным полі. І ўсё ж непрыемныя здарэнні былі. Яшчэ да майго прыходу сюды, 18 красавіка 1945 года, у час разміравання тэрыторыі калгаса «Савет» Новатухінскага сельсавета было ранена трынаццаць байцоў-размінёраў, сярод іх Васіль Івашкевіч, Уладзімір Сасноўскі і іншыя. 8 ліпеня 1945 года пад вёскай Русаны наступіў на міну і быў паранены баец-размінёр з маёй каманды Уладзімір Гаўрылавіч Шаргаёў. Давялося яму развітацца са службай.

Нямала няшчасных выпадкаў было з мірным насельніцтвам. Па неасцярожнасці на мінных палях у час забаў з выбуховымі прадметамі за некалькі пасляваенных гадоў у раёне загінулі прыкладна 350 мірных жыхароў. Мы вялі інструктыўную і растлумачальную работу, але вайна ўсё ж забірала новыя ахвяры.

У маі 1947 года размінёр нашай каманды Л. А. Платонаў здзейсніў смелы ўчынак, выратаваўшы ад гібелі на мінным полі трох калгасніц калгаса «Прамень». Яму аб'явілі падзяку, а мяне папярэдзілі аб неабходнасці выстаўляць ачапленне і выконваць падрыўныя работы толькі пасля пільнага агляду мясцовасці.

Дарагія мае аднапалчане! Вас не называлі і не называюць франтавікамі. Але хадзіць з дня ў дзень па мінных палях, побач са смерцю — гэта таксама фронт, дый яшчэ які! Тут трэба было мець і вытрымку, і мужнасць, і цярпенне. Усё гэта вы мелі — маладыя, юныя байцы-размінёры.

Жывуць у саўгасе імя Чарняхоўскага Леанід Андрэевіч Платонаў і Уладзімір Андронавіч Фёдараў, а ў саўгасе «1 Мая» — Канстанцін Васілевіч Аўсянкін і Міхаіл Рыгоравіч Гомелеў, у райцэнтры — Міхаіл Каралёў і Алена Мацвееўна Анішчанка. Некалі яны былі ў маёй камандзе: хлопцы — інструктарамі ці размінёрамі, Алена — медсястрой. Я сустракаюся з імі як з роднымі мне людзьмі. Дарогі многіх маіх аднапалчан разышліся па ўсёй краіне. І ўсюды яны помняць мінныя палі сваёй роднай Дубровеншчыны, якія пасля іх работы сталі мірнымі палямі.

З 10 лістапада 1946 года я стаў старшынёй раённага Савета Асаавіяхіма. Важнейшым маім клопатам з'яўлялася па-ранейшаму завяршэнне разміравання мінных палёў.

Толькі пасля гэтага туды прыходзіў араты і сейбіт, пачынаў шумець пад ветрам спелы колас.

І. Салаўёў,
былы начальнік каманды
па разміраванню Дубровенскага
раёна, пенсіянер.

Цаной жыцця

Зямля Дубровеншчыны. Колькі трывожных і балючых ран пакінула на тваім целе апошняя вайны! Колькі бясстрашных сыноў Радзімы загінула за тваю свабоду, твой росквіт, колькі навечна ўступіла ў бессмяротнасць! І хоць даўно ўжо адгрымелі баі, хоць гарматы і танкі занялі сваё пачэснае месца ў музеях, на тваіх неабсяжных гонях працавітымі хлебаробскімі рукамі вырашчана і сабрана не адзін дзесятак багатых і важкіх ураджаеў, не-не ды і адгукнецца злое і жорсткае рэха старым іржавым снарадам або гранатай. Не-не ды і напомніць яно пра страшнае мінулае...

Мерна і рытмічна рухаўся ў той дзень па бульбяным полі бульбаўборачны агрэгат механізатараў калгаса «Прагрэс» Уладзіміра Звяркова і Васіля Вераб'ёва. Буйныя клубні па транспарцёры скочваліся ў трактарны прычэп, які трактар адвозіў да буртоў. І так загон за загонам.

Дакладна, па-студэнцку працаваў і «баявы разлік» бульбаўборачнага камбайна — чацвёра хлопцаў-навучэнцаў Аршан-

скага педагагічнага вучылішча, сярод якіх быў і Міхаіл Мароз. Не першы дзень і нават не першы год прыходзілася працаваць навучэнцам на ўюорцы бульбы. Таму звыкліся рукі з работай. Кожны рабіў тое, што было патрэбна.

І раптам...

Бывае, пражывае чалавек амаль усё жыццё і не зведае да канца сваёй вартасці. Жыве, як усе, нічым не вызначаецца. І толькі адно імгненне, кароткае, як бляск маланкі ўначы, праверыць, да канца вызначыць, на што здатны ён, чым жыве.

Адно імгненне на развагу было і ў Міхаіла Мароза, калі ён убачыў на транспарцёрнай стужцы бульбакамбайна паржавелы, аблеплены зямлёй снарад. А можа і імгненння не заставалася, бо транспарцёр нёс смяртэльны груз у барабан агрэгата. Гэта ж азначала верны выбух, ад якога маглі загінуцб яго таварышы, экіпаж.

Падобна электраімпульсам пранесліся ў галаве хлопца гэтыя думкі. І тое, што агрэгат ужо не спыніць. Позна. І Міхаіл прыняў рашэнне. Такое, на якое здатны толькі чалавек чыстай, багатай душы, камсамольскага сумлення, па-сапраўднаму гераічнага характару. Ён падхапіў цяжкі снарад на рукі, скочыў з падножкі камбайна і пабег па полі. «Далей, далей ад камбайна, ад таварышаў. Толькі б паспець...»

Ён паспеў, гэты сціплы юнак з Гродзеншчыны, які марыў стаць настаўнікам і якому заставалася зусім нямнога да ажыццяўлення сваёй мары. Выбух грымнуў, калі і таварышы, і экіпаж бульбакамбайна былі недасягальныя для яго...

33 ураджаі прынесла гэтае поле хлебаробам пасля жорсткіх баёў з фашыстамі. 33 разы вытрымлівалі на ім людзі цяжкі экзамен на працу, на майстэрства. Хто б мог падумаць, што на зямлі, якая, здавалася б, прасеена праз сіта, затаілася смерць. А яна сапраўды затаілася і чакала зручнага моманту. Яна замахнулася на чатырох юнакоў, што былі на камбайне, на двух механізатараў. Толькі подзвіг мог адвесці няўмольную руку смерці. І камсамолец Міхаіл Мароз здзейсніў яго. Цаной свайго жыцця ён выратаваў жыццё таварышаў.

І. Яфімаў.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР
аб узнагароджанні навучэнца Аршанскага педагагічнага вучылішча Віцебскай вобласці Мароза М. М. ордэнам Чырвонай Зоркі

За мужнасць і самаадданасць, праяўленыя пры абяскошкоджванні снарада, які заставаўся з часоў Вялікай Айчыннай вайны, і выратаванне жыцця калгаснікаў і навучэнцаў узнагародзіць навучэнца Аршанскага педагагічнага вучылішча Віцебскай вобласці Мароза Міхаіла Міхайлавіча ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

Старшыня Прэзідыума
Вярхоўнага Савета СССР *Л. Брэжнеў*

Сакратар Прэзідыума
Вярхоўнага Савета СССР *М. Геаргадзе*

Масква, Крэмль.

20 кастрычніка 1977 г.

Год за годам

1944 год

На вытворчыя затраты калгасам выдзелены крэдыт у памеры 100 тыс. руб., калгаснікам на аднаўленне ўласных гаспадарак — 65 тыс. руб., на жыллёвае будаўніцтва — 110 тыс. руб., інвалідам Айчыннай вайны на набыццё жывёлы — 10 тыс. руб.

Калгасы засеялі 8692 га зямлі.

З 109 падлеткаў выпрацавалі 227 500 працадзён.

1471 мужчына-калгаснік выпрацавалі 250 559 працадзён.

8000 жанчын выпрацавалі 1 169 967 працадзён.

34 падлеткі выпрацавалі па 200—300 працадзён.

15 жніўня пачаў працаваць прыют на 55 дзяцей-сірат.

1945 год

У раёне адноўлена 159 калгасаў са 159 даваенных.

У раёне пражывала 31 356 чалавек, з іх 10 968 мужчын (працаздольных было толькі 2723). Дзеці да 15 гадоў склалі 13 975 чалавек.

У гэтым годзе нарадзілася 336 дзяцей, памерла — 596 грамадзян. Заключана 55 шлюбаў.

У Дубровенскай, Зарубскай і Арловіцкай МТС мелася 30 трактароў.

Каманда размініравання ачысціла ад мін і выбуховых прадметаў 588,7 км^2. Сабрала і знішчыла 35 467 мін, 97 691 артснарад і інш.

17 школ раёна размяшчаліся ў зямлянках.

Рашэннем Дубровенскага райвыканкама ад 14.8.45 г. забаранялася калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам прадаваць і абменьваць збожжа, муку, печаны хлеб на іншыя неабходныя людзям рэчы да поўнага выканання здачы збожжа дзяржаве. Парушальнікі гэтай установкі прыцягваліся да крымінальнай адказнасці.

1946 год

Згодна пастанове ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 4.6.46 г. «Ад неадкладных мерах дапамогі пацярпеўшым ад нямецкай акупацыі раёнам БССР» на Дубровеншчыне павінна было быць пабудавана 2679 жылых дамоў. На гэтыя работы было накіравана 100 нямецкіх ваеннапалонных, 4 аўтамашыны, гаручае і 113 тыс. м^3 лесу і іншыя будматэрыялы.

У Калінінградскую вобласць (Усходняя Прусія) з Дубровеншчыны перасялілася 44 сям'і (179 чалавек).

Ад ЮНРРА у раён паступіла 14 463 прадметы дапамогі сем'ям загінуўшых чырвонаармейцаў.

Рашэннем Дубровенскага райвыканкама ад 14.10.46 г. 591 былі зацверджаны нормы выдачы хлеба на кастрычнік:

рабочым горада і сяла — 500 г
інвалідам — 500 г
служачым — 200 г
спец. дзіцячаму дому — 600 г
дзіцячаму садку — 300 г
яслям — 250 г

Усе іншыя асобы і ўстановы знятыя з забеспячэння.

1947 год

На дапамогу асабліва пацярпелым сем'ям воінаў, партызан, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны райвыканкам выдатка ваў на будаўніцтва 70 хат 1 050 000 руб.; на аднаўленне помніка Леніну — 15 000 руб.

1948 год

26 студзеня адкрылася першая пасляваенная сесія раённага Савета дэпутатаў працоўных.

Масавае перасяленне жыхароў раёна па аргнабору на прадпрыемствы топліўнай, лясной, вугальнай прамысловасці, прамысловасці будматэрыялаў, ваеннае будаўніцтва і інш.

1949 год

Па Усесаюзнаму гандлёваму перапісу ў раёне налічвалася 57 магазінаў і 1 сталовая. У іх працавалі 83 работнікі. Рознічны таваразварот складаў 5 382 000 руб.

1950 год

150 калгасаў узбуйнены ў 43.

1951 год

Трохгадовы план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі (19491951) не выкананы ні па аднаму віду жывёлы і птушкі, акрамя коней: буйная рагатая жывёла — выкананы 67,1%, свінні — 58,8%, авечкі — 66,1%, птушка — 19%.

1952 год

Пагалоўе грамадскага статку жывёлы дасягнула даваеннага ўзроўню.

У 1950—1952 гадах раён атрымаў 136 трактароў, 45 самаходных камбайнаў і значную колькасць іншых сельгасмашын.

1953 год

У раёне было 67 школ, у якіх навучаліся 6517 дзяцей. 26 школ працавалі ў наёмных памяшканнях.

З 334 настаўнікаў 31 меў вышэйшую адукацыю і 96 — незакончаную вышэйшую.

1954 год

Працягласць вуліц г. Дуброўна складала 25,5 км, з іх 4,9 км з цвёрдым пакрыццём. Асвятлялася толькі 300 метраў вуліц. Тэрыторыя горада складала 4,6 м^2. Аўтобусных зносінаў не было. Планавалася да 1965 года набыць 3 аўтобусы.

Дакументы сведчаць

СВОДНЫЕ ДАННЫЕ О РАЗВИТИИ СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА КОЛХОЗОВ ДУБРОВЕНСКОГО РАЙОНА ЗА 1951 г.

(из сводного годового отчёта колхозов района за 1951 г.)

Всего наличных дворов в колхозах района на 01.01.52 — 7590
В них населения, всего — 25976
в том числе:

трудоспособных в возрасте 16 лет и старше — 9896
а) мужчин — 2987
б) женщин — 6909

Продукция животноводства в 1951 г.	Получено	Сдано государству	Выдано колхозникам, комбайн. и трактористам
Мясо (ц)	432	-	27,4
Молоко (тыс. л.)	1426,9	706,6	10,0
Ср. удой (л)	723 (план 2200)		

Поставки скота за 1951 г.: сдано государству 1389 голов КРС фактическим весом 3230 ц, свиней — 204 головы фактическим весом 157 ц, овец и коз — 309 голов весом 604 ц, птицы 365 штук весом 344 кг.

На 01.01.52 в колхозах было:
КРС (голов) — 8098
Свиней — 4295
Овец и коз — 8046
Лошадей — 3892

Продукция растениеводства:	Зерновые	Лен	Картофель	Овощи
Площадь (га)	26142	3965	2607	50
Валовый сбор (ц)	150127,4	2721 (сем) 3273 (вол)	84672	1217
Урожайность	5,7	0,6 (сем) 0,8 (вол)	32	19
Сдано государству по обязательным поставкам			-	
Выдано колхозникам, комбайнёрам и трактористам	26,4	-	2,0	0,1

Всего денежные доходы составили 3305,9 тыс. руб., определено и выплачено на трудодни 96,4.

На трудодень к выдаче определено:

	колхозникам	работникам тракторных бригад
деньгами (руб.)	0,03	-
зерном (кг)	1,01	2,6
картофелем (кг)	0,08	-
сеном (кг)	1,2	1,2
соломой (кг)	0,04	0,04

В колхозах на 01.01.52 имелась следующая техника и сельскохозяйственное оборудование:

автомашины	— 27
плуги конные	— 1396
повозки (на деревянном и железном ходу)	— 1181
сани	— 1386
конные грабли	— 28
сенокосилки	— 30
молотилки простые и сложные	— 128
картофелекопалки	— 3
и др.	

В колхозах имелись подсобные предприятия: 2 мельницы, 63 кузницы, 3 вовночески, 1 ободная мастерская.

Кадры руководящих работников и специалистов в 48 колхозах района: всего 388 чел., в т. ч. 53 женщины (председатели, зам. председателей, бригадиры, зав. фермами, ветврачи, бухгалтеры). Из них: 1 с высшим образованием, 5 со средним специальным и 2 окончили сельскохозяйственные школы.

В штате колхозов не было агрономов и зоотехников, так как они входили в штат отдела сельского хозяйства райисполкома.

ФГА в г. Орша, ф. 782, оп. 1, д. 835, лл. 2, 3, 7, 6, 9, 12, 13.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Численность наличного населения и хозяйств в сельском местности Дубровенского района по группам населения по состоянию на 31 декабря 1944, 1946, 1950, 1953 гг. (составлено Дубровенской районной инспектурой госстатистики примерно в 1955 г.)

Годы	Колхозники		Рабочие и служащие		Единоличн.		Прочие хоз.		Всего	
	хозяйств	населения	хозяйств	населения	хозяйств	населения	хозяйств	населения	хозяйств	населения
на 31.12. 1944 г.	7964	28401	700	2231	42	148	115	576	8821	31356
на 31.12. 1946 г.	7447	27239	335	1030	89	231	-	-	7862	28590
на 31.12. 1950 г.	7378	26954	485	1618	13	40	6	126	7882	28738
на 31.12. 1953 г.	7237	24977	474	1780	16	45	3	12	7730	26817

ФГА в г. Орша, ф. 664, оп. 1, д. 59, л. 62.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Наличие населения в Дубровенском районе по годам по состоянию на 31 декабря 1944, 1945, 1946, 1950, 1953 гг. и по переписи населения 1939 г.

(составлено Дубровенской районной инспектурой госстатистики примерно в 1955 г.)

Годы	Городское		Сельское		Всего	
	к-во хозяйств	к-во населения	к-во хозяйств	к-во населения	к-во хозяйств н	к-во аселения
Перепись 1939 г.	-	-	-	-	-	57576
на 31.12.44 г.	-	3328	8821	31356	-	34684
на 31.12.45 г.	942	3328	8828	31124	9770	34452
на 31.12.46 г.	734	3833	8315	29411	9049	34244
на 31.12.50 г.	1376	4228	7882	28738	9258	32966
на 31.12.53 г.	-	4343	7730	26817	-	31160

ФГА в г. Орша, ф. 664, оп. 1, д. 59, л. 61.

Директор филиала Госархива Витебской обл. в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Данные о наличии сельского населения Дубровенского района по возрастному и половому составу по состоянию на 31 декабря 1944, 1950, 1953 гг. (составлены Дубровенской районной инспектурой госстатистики примерно в 1955 г.)

Годы	Всего	мужчин			женщин		
		всего	в том числе:		всего	в том числе	
			до 16 лет	16 лет и старше		до 16 лет	16 лет и старше
31.12.44 г.	31356	10968	6038	4930	20388	5943	14445
31.12.50 г.	28738	11822	5133	6689	16916	4862	12054
31.12.53 г.	27450	11300	4826	6474	16150	4708	11442

ФГА в г. Орша, ф. 664, оп. 1, д. 59, л. 63.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Данные о размерах посевных площадей под урожай 1940, 1945, 1946, 1950, 1953 гг. (из сводных материалов о посевных площадях, составленных Дубровенской районной инспектурой госстатистики)

Годы	Всего посеяно площадей под урожай текущего года	Размеры посевных площадей			
		В том числе			
		сохранилось озимых весной	яровых зерновых	лен	картофель
1940	46050	10460	12329	5550	6740
1945	23367	7119	12779	808	2107
1946	29702	8943	14862	1503	3518
1950	27927	10265	16313	4748	4472
1953	28566	10458	17953	1352	3733

ФГА в г. Орша, ф. 664, оп. 1, т. 59, л. 57.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Данные о выпуске валовой продукции предприятиям Дубровенского района за 1945, 1946, 1950, 1953 гг.

(Из сведений о выполнении плана по выпуску валовой продукции промышленными предприятиями района за 1945—1953 гг. составленными Дубровенской районной инспектурой госстатистики)

	1945 г.	1946 г.	1950 г.	1953 г.
Выпуск валовой продукции промышленными предприятиями района (тыс. руб.)	5369,0	22022,4	9611,9	10168,6

ФГА в г. Орша, ф. 664, оп. 1, д. 59, л. 27.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

СПРАВКА

роста показателей развития сельского хозяйства Дубровенского района (по колхозам) за 1953, 1957 гг.).

Показатели	1953 г.	1957 г.
Денежные доходы, всего (тыс. руб.)	4136	24660
в том числе:		
от растениеводства	1664	13378
от льна	1152	11936
от картофеля	50	633
от овощей	4,6	130
от животноводства	2276	5649
КРС	1050	4230
свиноводство	863	1115
овцеводство	211	198
птицеводство	40	62
Рост неделимого фонда (тыс. руб.)	12562	28268
Оплата на трудодни:		
хлеб (кг)	0,35	1,12
картофель (кг)	0,01	0,23
деньги (руб.)	0,30	2,24
Механизация сельского хозяйства:		
тракторов	-	15
грузовых автомобилей	30	111
комбайнов	-	-

ФГА в г. Орша, ф. 781, оп. 1, д. 10, л. 16.

Директор филиала Госархива Витебской области в г. Орша
В. М. Самуйлова.

Год за годом

1960 год

З 3247 двароў калгаснікаў электраэнергіяй забяспечваўся 2401 двор. Толькі ў калгасе імя Дзяржынскага была ўласная электрастанцыя магутнасцю 40 тыс. квт у гадзіну.

1962 год

Дубровенскі раён быў ліквідаваны, а яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Аршанскага раёна.

1965 год

Дубровенскі раён быў адноўлены. На яго тэрыторыі працавала 1 раённая бальніца на 125 ложкаў, 1 пасялковая, 5 урачэбна-амбулаторных участкаў, 15 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 пункты здароўя, аддзяленне хуткай дапамогі, 3 аптэкі, 20 сельскіх клубаў, 14 бібліятэк, 12 калгасных і 2 саўгасных клубы, 1 раённы Дом культуры.

Пабудавана на вёсцы 350 дамоў, адрамантавана 368. Навасе́лле справілі 756 сямей.

1966 год

У г. Дуброўна пачалося будаўніцтва універмага, аўтобуснай станцыі, комплекса школы механізацыі, шматпавярховых жылых дамоў.

Упершыню прададзена насельніцтву 4 аўтамабілі.

1967 год

Рашэннем райвыканкама ад 17.8.67 г. № 217 была зацверджана схема раённай планіроўкі, якой прадугледжвалася будаўніцтва і добраўпарадкаванне толькі ў так званых перспектыўных населеных пунктах. Да ліку перспектыўных былі аднесены 64 вёскі, г. Дуброўна, пас. Асінторф з пасёлкам № 7, станцыя Шухаўцы і Асінаўка. Да неперспектыўных былі аднесены 112 вёсак і 7 пасёлкаў Асінторфа. Жыхары вёсак, аднесеных да неперспектыўных, павінны былі адсяляцца толькі ў перспектыўныя населеныя пункты. У 16 вёсках, аднесеных да першай чаргі адсялення, забаранялася хоць якое-небудзь будаўніцтва і капітальны рамонт жылых, культурна-бытавых і вытворчых памяшканняў.

Бязглуздае, пражэкцёрскае патрабаванне вышэйшай улады рэспублікі, якая меркавала з 33 тысячаў населеных пунктаў Беларусі пакінуць толькі 3 тысячы «перспектыўных», нанесла непаправімую шкоду ўсяму народу і прывяло тысячы вёсак да поўнага разору, дэградацыі і вымірання. (Як выглядаюць вёскі Дубровеншчыны сёння, чытач даведаецца, калі пазнаёміцца з апошнім раздзелам гэтай кнігі «З гісторыі населеных пунктаў Дубровеншчыны».)

Адміністрацыйна-каманднае кіраўніцтва эканомікай, культурай, народнай асветай і ўсім астатнім, прымусовая праца пры ўраўніцельнай форме яе аплаты, адступленне ад законнасці сеялі ў душах людзей крыўду, выклікалі незадаволенасць, зніжалі ініцыятыўнасць і зацікаўленасць у працы. Эканоміка краіны, а тым самым і раёна, фактычна гадамі тапталася на месцы. Набліжалася стагнацыя і заняпад. Вёска гінула, культура дэградавала, валявым парадкам ліквідоўваліся нацыянальныя школы, губіліся помнікі культуры, гістарычная памяць стала ўспрымацца як нешта непатрэбнае і нават шкоднае.

Гэта прывяло да таго, што ў 70-я і на пачатку 80-х гадоў мнагалюдны раён стала пакідаць моладзь, маладыя сем'і. Вёскі штогод пусцелі. Нараджальнасць зменшалася, а смяротнасць павялічвалася. Да 1996 года смяротнасць па раёну ў два разы перавысіла нараджальнасць. У 1941 годзе ў раёне пражывала 45 000 чалавек, у 1945 — 34 452, у 1980 — 27 900, у 1985 — 26 800, у 1990 — 25 100, у 1995 — 24 300, у тым ліку на вёсцы — 14 500 чалавек. За апошнія 30 гадоў з карты раёна і з твару зямлі знікла 40 вёсак. У многіх з тых, што яшчэ лічацца жывымі, засталося па 1—2, а часам 3—4 двары, у якіх дажываюць свой гаротны век адзінокія пенсіянеры, якія аддалі дзяржаве усё, не атрымаўшы ад яе самага неабходнага, каб не памерці неспадзяванай смерцю.

На крутым павароце

Да 80-х гадоў наспела сур'ёзная неабходнасць глыбокіх эканамічных і палітычных рэформаў у краіне. Узяты ж курс на перабудову і рэфармаванне ўсіх бакоў эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця грамадства праводзіўся не паслядоўна і без пэўных канцэптуальных распрацовак далейшага курсу дзяржавы. Разлажэнне камандна-бюракратычнай сістэмы таталітарнай дзяржавы паставіла перад грамадствам пытанне выбару далейшага шляху развіцця грамадства і ў першую чаргу ў сферы эканомікі.

З распадам СССР парушыліся традыцыйныя эканамічныя сувязі з былымі партнёрамі, узмацніліся крызісныя з'явы, пачаліся абвальныя інфляцыі, падзенне вытворчасці, збядненне людзей, рост злачыннасці і іншых адмоўных з'яў у грамадстве. Усё гэта не абмінула і Дубровеншчыну.

Адмоўныя з'явы ў эканоміцы прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, у сацыяльна-культурнай сферы лепш за ўсё прасачыць па таліцы, якая дадаецца да артыкула.

Табліца эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця Дубровенскага раёна (1980—1995)

№№ пп	1980 г.	1985 г.	1990 г.	1995 г.
1. Колькасць працаздольных у сельскай гаспадарцы	6631	5760	5047	4023
2. Колькасць трактароў	875	948	924	758
уборачных камбайнаў	209	338	218	135
аўтамабіляў	348	415	419	393
3. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі (млн. руб.)	31,7	38,0	52,6	31,2
4. Валавая прадукцыя на працаздольнага (руб.)	4787	6435	10429	7755
5. Валавая прадукцыя на 100 га сельгасугоддзяў (тыс. руб.)	41,0	49,1	70,6	47,9
6. Вытворчасць збожжа (тыс. тон)	31,2	37,0	73,5	48,5
льновалакна (тон)	544	803	1426	1570
бульбы (тон)	22407	9097	27264	3948
мяса (тон)	3628	5159	7123	382
малака (тон)	25419	26536	31358	17631
7. Рэалізацыя збожжа (тыс. тон)	6,4	15,5	9,7	18,5
льновалакна (тон)	544	803	1426	1570
бульбы (тон)	5692	1377	11910	1024
малака (тон)	24533	26403	35017	16638
8. Кап. укладанні, усяго (млн. руб.)	7,6	13,8	28,2	5774,1
9. Мелася клубаў	32	32	32	28
бібліятэк	38	38	33	28
кінаустановак	34	34	30	21
10. Калектываў маст. самадзейнасці	51	51	54	53
11. Народных калектываў	1	1	1	2
12. Кніжны фонд	-	395326		319343
13. Школ (у іх вучняў)	-	39/3601	31/3556	27/3584
14. Дзіцячых садкоў (у іх месц)	-	23/1406	26/1500	18/837
15. Бальніц	5	5	5	3
16. Фельдшарска-акушэрскіх пунктаў	16	16	16	19
17. Ложкаў у бальніцах і ФАП	345	345	345	255
18. Прадпрымальнікаў	-	-	-	119
фермеры	-	-	2	15
кааператывы	-	-	25	12
19. Колькасць насельніцтва				
ўсяго (тыс.)	27,9	26,8	25,1	24,3
нарадзілася	404	369	318	232
памерла	376	270	413	411

Адраджэнне

Асінторф працуе.

Ніва родзіць.

І ўсё ж, не гледзячы на вельмі сур'ёзныя цяжкасці, амаль ва ўсіх сферах эканомікі, будаўніцтва, культуры, асветы, аховы здароўя жыццё працягваецца, а людзі самаадданa і цярпліва працуюць у надзеі на лепшы лёс.

Адраджаюцца добрыя народныя традыцыі, ладзяцца цікавыя святы і мастацкія фестывалі, ушаноўваецца памяць продкаў і ахвяр апошняй вайны, адраджаецца гістарычная памяць жыхароў Дубровеншчыны. Сведчаннем гэтага з'яўляецца шматгадовая праца многіх і многіх прафесійных вучоных і энтузіястаў-краязнаўцаў для гісторыка-дакументальнай Хронікі Памяці Дубровенскага раёна. Невядомыя раней старонкі гісторыі адкрыліся ў выніку археалагічных даследванняў 19941996 гг. на месцах старажытных паселішчаў Дубровеншчыны, у тым ліку і на замчышчы Дуброўны, якія правялі вучоныя інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Упершыню напісана і змешчана у Хроніцы Памяці гісторыя населеных пунктаў Дубровенскага раёна. Годна ўпарадкаваны магілы і масавыя пахаванні воінаў і ахвяр фашызму. Велічным помнікам героям з'яўляецца мемарыяльны комплекс «Ры-

Дарога да святыняў.

ленкі». Вялікую і святую справу робяць пошукавыя атрады па вяўленні і перазахаванні воінаў, што загінулі на Дубровеншчыне ў 19411944 гг.

Традыцыйнымі на Дубровеншчыне сталі Вахты памяці, якія праводзяцца сумесна з Краснінскім раёнам Смаленскай вобласці. У іх прымаюць удзел ветэраны вайны і працы, моладзь, настаўнікі і вучні. Героіка і трагедыя вайны становяцца для людзей свяшчэннымі.

У 1996 г. ў Дуброўне прайшоў III



У спортзале Дубровенскай школы № 2.

У Дубровенскім ПТВ.



рэгіянальны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы». У ім прымалі ўдзел многія творчыя калектывы з прыдняпроўскіх раёнаў Беларусі, Украіны, а таксама са Смаленскай і Калінінградскай абласцей Расіі. Мір і дружба з братамі-суседзямі непарушныя.

Не згасне народная культура і яе здабыткі. Узорнымі можна назваць многія мастацкія калектывы, найперш фальклорны калектыў Ляднянскага Дома культуры і Будскі народны хор, народны ансамбль музыкі і песьні «Крыніца» раённага Дома культуры.

Жывуць і развіваюцца народныя промыслы. Вынікі гэтай цікавай і патрэбнай работы падводзяцца на рэспубліканскім свяце «Ганчарны круг».

У Дубровенскім дзіцячым садку.

Удасканальваюць сваё майстэрства фізкультурнікі і спартсмены нашага краю. У прыклад ім — дасягненні чатырох майстроў спорту, дасягненні якіх увекавечаны ў гэтай кнізе.

Галоўнае ж у сённяшні нялёгкі час у тым, што людзі гадуюць і вучаць дзяцей, вырошчваюць хлеб і жывёлу, будуюць хаты і, як могуць, мацуюць гаспадарку. У гэтым надзея на паратунак ад цяжкасцяў. За гэта ім нізкі паклон і глыбокая павага. Яны будуць пісаць працяг Хронікі Памяці...

М. Ляшчынскі,
Старшыня Дубровенскага раённага выканаўчага камітэта.

Імі ганарыцца Дубровеншчына

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

ДЗЕНІСЕНКА Тамара Ягораўна нарадзілася 9.1.1931 г. ў вёсцы Бель Дубровенскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1971), дэлегат XXV з'езда КПСС. У 1949—1959 гг. калгасніца калгаса «Звязда», затым палявод, даярка саўгаса «Арловічы». Цяпер на пенсіі.

Т. Я. Дзенісенка.

М. І. Капцераў.

КАПЦЕРАЎ Міхаіл Іванавіч нарадзіўся 12.7.1938 г. ў вёсцы Міхалінава Дубровенскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1976). З 1952 г. па 1954 г. — калгаснік калгаса «Чырвоны сцяг», затым курсант Высокскага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. У 1955—1957 гг. — камбайнер Арловіцкай МТС. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў (з 1960) механізатарам у саўгасе імя Чарняхоўскага, у апошнія гады — брыгадзірам. Дэлегат XXIV з'езда КПСС. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Памёр у 1990 г.

МАРШАЛАВА Ефрасіння Яфрэмаўна нарадзілася 3.3.1919 г. ў вёсцы Каўровая Дубровенскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Калгасніца калгасаў «Наперад», імя XX з'езда КПСС. У 1963—1975 гг. — звеннявая па вырошчванню лёну ў калгасе імя XX з'езда КПСС. Узнагароджана медалямі «Мацярынская слава» I, II, III ступеняў. Цяпер на заслужаным адпачынку.

Е. Я. Маршалава.

С. Ф. Рубанаў.

РУБАНАЎ Сяргей Фёдаравіч нарадзіўся 7.10.1931 г. ў в. Жабыкі Дубровенскага раёна, Герой Сацыялістычнай працы (1968). Заслужаны настаўнік БССР (1957), кандыдат педагагічных навук (1969). Скончыў Маскоўскі педагагічны інстытут (1948). З 1948 г. дырэктар сярэдняй школы №10 у Слуцку. Званне Героя прысвоена за заслугі ў навучанні і камуністычным выхаванні вучняў.

РУБІЦЕЛЬ Кацярына Захараўна нарадзілася 5.12.1924 г. ў вёсцы Чырвоныя Засценкі Дубровенскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 7-га і 8-га склікання. Удзельнік ВДНГ 1967 г. Калгасніца калгаса «Прагрэс», у 1959—1972 гг. звеннявая па вырошчванні лёну. Цяпер на пенсіі.

ЧУЙКІН Міхаіл Фаміч нарадзіўся 2.10.1933 г. ў вёсцы Міхалінава Дубровенскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1965). Пасля службы ў арміі ў 1956 г. пачаў працаваць на Кіраўскім рудніку ў Мурманскай вобл., спачатку насыншчыкам, затым праходчыкам, а пасля заканчэння курсаў (1964) — майстрам-узрыўніком. У 1961 г. ён у ліку першых гарнякоў прыйшоў на цяжкі участак — будаўніцтва другой чаргі рудніка і працаваў там у складзе хуткаснай горнапраходчай брыгады. Унёс вялікі ўклад у справу своечасовага ўводa новых магутнасцей руднай базы. За выдатныя вытворчыя дасягненні пры будаўніцтве і асваенні вытворчых магутнасцей горнарудnай базы Міхалу Фамічу Чуйкіну Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30.3.1965 г. было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

К. З. Рубіцель.

М. Ф. Чуйкін.

12.1.1967 г. пры выкананні службовых абавязкаў яго жыццё трагічна абарвалася. У горадзе Кіраўск адна з вуліц носіць імя М. Ф. Чуйкіна.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сельскай гаспадаркі

БЕЛАВУСАЎ Дзмітрый Пятровіч нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Слатаўшчына Дубровенскага раёна. У 1955 г. скончыў Лідскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1956 г. працаваў механікам Зарубскай МТС, з 1958 г. — інспектарам Дубровенскай РТС. З 1960 г. — галоўны інжынер саўгаса «Зарубы». У 1965 г. завочна скончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію. З 1973 г. — дырэктар таго ж саўгаса. Памёр у 1975 г. Званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі» прысвоена ў 1973 г. Памёр 18.12.1975 г.

ЧАРКАСАЎ Міхаіл Мікалаевіч нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Копці Дубровенскага раёна. У 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Цяжка паранены. З 1948 г. — трактарыст калгаса «На варце». Званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР» прысвоена ў 1975 г. Памёр у 1992 г.

Дз. П. Белавусаў.

М. М. Чаркасаў.

В. М. Гутараў.

Р. А. Сапега.

Н. А. Анішчанка.

В. М. Бабакова.

Бытавога абслугоўвання насельніцтва

ГУТАРАЎ Васіль Міхайлавіч нарадзіўся ў 1930 г. Усё працоўнае жыццё (1944—1990) В. М. Гутарава прайшло ў адной арганізацыі — райбыткамбінаце. І прафесія ў яго была самая празаічная — абутнік па пашыву і рамонту. Але рабіў ён сваю справу так, што яго ведаў увесь раён. Званне «Заслужаны работнік бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР» прысвоена ў 1970 г. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр у 1997 г.

Медыцыны

САПЕГА Раіса Аўрамаўна нарадзілася ў 1932 г. Скончыла Смаленскі медыцынскі інстытут у 1958 г. У 19581961 гг. працавала ўрачом-тэрапеўтам у Вакінскай раённай бальніцы, з 1961 г. — урач-тэрапеўт Дубровенскай раённай бальніцы. Званне «Заслужаны работнік медыцыны БССР» прысвоена ў 1973 г.

НАРОДНАЯ НАСТАЎНІЦА СССР

АНІШЧАНКА Надзея Аляксандраўна нарадзілася ў 1942 г. ў вёсцы Строхава Слуцкага раёна Мінскай вобласці. У 1964 г. скончыла Мінскі Дзяржаўны педагагічны інстытут і працавала настаўніцай фізікі Прудніпскай школы Гарадокскага раёна, Смальянскай школы Аршанскага раёна. З 1966 г. працуе настаўніцай фізікі СШ № 1 г. Дуброўна. Надзея Аляксандраўна вызначылася высокім прафесіяналізмам, грамадскай актыўнасцю. Званне «Народны настаўнік СССР» прысвоена ў 1987 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

БАБАКОВА Вольга Максімаўна нарадзілася ў 1936 г. ў г. Орша Віцебскай вобласці. У 1959 г. скончыла матэматычны факультэт Віцебскага педінстытута. З так пары настаўнічае на Дубровеншчыне: у 1959—1961 гг. — у Ляднянскай сярэдняй, у 1961—1970 гг. — у Чырвонаслабадской васьмігадовай школе, з 1970 г. і да гэтага часу — у Будскай СШ. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1976 г.

КАРАЛЁВА Еўдакія Трафімаўна нарадзілася ў жніўні 1929 г. ў вёсцы Гарошкава Бельскага сельсавета Дубровенскага раёна. У 1949 г. скончыла Аршанскае педвучылішча. У 1950—1952 гг. настаўнічала ў Дзямідаўскай пачатковай, Мальцаўскай НСШ Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці. З 1952 г. да выхаду на пенсію працавала настаўніцай Чырвонаслабадской васьмігадовай школы Дубровенскага раёна. Тут жа ў 1970 г. ёй было прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР». Памерла ў 1994 г.

ЛАПАНЬКОЎ Анатоль Рыгоравіч нарадзіўся ў 1929 г. ў г. Магілёў. У 1950 г. скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Да 1959 г. працаваў настаўнікам рускай мовы

і літаратуры СШ № 2 г. Дуброўна, затым дырэктарам гэтай школы. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г. Памёр 3 лютага 1978 г. Вуліца, на якой дыў Анатоль Рыгоравіч, носіць яго імя.

ЛАРЫЁНАВА Марыя Фёдараўна нарадзілася ў 1919 г. ў вёсцы Жабыкі Дубровенскага раёна. У 1937 г. скончыла Аршанскае педвучылішча. Да вайны і ў першы год пасля вызвалення Беларусі працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў школах Аршанскага раёна. Са жніўня 1945 г. стала працаваць у Асінторфскай сярэдняй школе — настаўніцай, завучам пачатковых класаў. Вызначалася не толькі высокім прафесіяналізмам, але і сапраўды мацярынскай любоўю да дзяцей. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1966 г. З 1974 г. Марыя Фёдараўна на пенсіі.

ПАНАМАРОВА Любоў Мікалаеўна нарадзілася ў 1918 г. ў вю М. Самавец Тэбярдзееўскага раёна Тамбоўскай вобласці. Скончыла рабфак, Варонежскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1946 г. ў Беларусі на выкладчыцкай і іншай рабоце, у 1963—1973 г.г. — выкладчык сельскага прафтэхвучылішча № 35 г. Дуброўна. За заслугі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Л. М. Панамаровай прысвоена званне «Заслужаная настаўніца прафтэхадукацыі БССР». Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

СЕЛІВЕРСТАВА Марыя Сяргееўна нарадзілася ў 1922 г. ў вёсцы Гольшына Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Настаўнічаць пачала ў апошні перадваенны год на Лепельшчыне, пасля вайны была настаўніцай Бабініцкай пачатковай школы Аршанскага раёна. З канца 1945 г. стала працаваць у Асінторфскай сярэдняй школе — настаўніцай, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце (1972—1978), дырэктарам (сакавікліпень 1978 г.). Без адрыву ад працы скончыла Лепельскае педвучылішча (1954) і геаграфічны факультэт Смаленскага педвучылішча (1970). У 1966 г. ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», у 1967 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР». З 1978 г. Марыя Сяргееўна на пенсіі. Жыве ў Асінторфе.

Е. Т. Каралёва.

А. Р. Лапанькоў.

М. Ф. Ларыёнава.

Л. М. Панамарова.

М. С. Селівестрава.

З. І. Студнева.

СТУДНЕВА Зінаіда Іванаўна нарадзілася ў 1919 г. ў сяле Усесвяцку Белахалу-

М. Ц. Шабураў.

М. М. Шабурава.

С. Я. Шарупіч.

А. Л. Шатраўка.

ніцкага раёна Кіраўскай вобласці. У 1938 г. скончыла Белахалуніцкае педвучылішча і да 1946 г. працавала настаўніцай прыродазнаўства, хіміі, геаграфіі Пышанскай сямігадовай школы ў Кіраўскай вобласці. У 1946 г. пераехала ў Дубровенскі раён і два гады была загадчыцай Пішчыкаўскай пачатковай школы, затым (1948—1965) — настаўніцай пачатковых класаў Дабрынскай сярэдняй школы. У 1949 г. ўзнагароджана медалём «За працоўную адзнаку». У 1963 г. ёй было прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР». З 1965 г. Зінаіда Іванаўна на пенсіі. Жыве ў в. Дабрынь.

ШАБУРАЎ Мікалай Цімафеевіч нарадзіўся ў 1876 г. ў в. Барадзіно Аршанскага павета. У 1894 г. скончыў Шылаўскую настаўніцкую школу Аршанскага павета, пасля чаго па 1900 г. працаваў настаўнікам царкоўна-прыходскай школы ў в. Новая Тухінь. Потым былі 20 гадоў настаўніцтва ў Няклюдаўскай пачатковай школе Талачынскага раёна. З 1920 г. ён зноў настаўнік Новатухінскай, але ўжо васьмігадовай школы. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1947 г. У 1957 г. Мікалай Цімафеевіч пайшоў на пенсію. Памёр у 1974 г.

ШАБУРАВА Марыя Мікалаеўна нарадзілася ў 1913 г. ў вёсцы Няклюдава Талачынскага раёна ў сям'і настаўніка. У 1932 г. скончыла Аршанскі педтэхнікум, у 1934 — курсы хімікаў-біёлагаў пры Гомельскім педінстытуце. У 1932—1969 гг. працавала настаўніцай Новатухінскай няпоўнай сярэдняй школы. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1965 г. Узнагароджана двума медалямі і двума Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

ШАРУПІЧ Сяргей Яфімавіч нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Леніна Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Да вайны быў калгаснікам, шафёрам, студэнтам інстытута ў г. Ленінград. У гады вайны — радавы на Сталінградскім фронце, партызан Палескага злучэння, малодшы камандзір дывізійнай разведкі 2-га Беларускага фронту. У 1945—1975 гг. — выкладчык, намеснік дырэктара Дубровенскага сельскага прафтэхвучылішча. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, трыма медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. За заслугі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных механізатарскіх кадраў удастоены звання «Заслужаны настаўнік прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі БССР» (1967).

ШАТРАЎКА Аляксандра Лявонаўна нарадзілася ў 1933 г. Скончыла Віцебскі Дзяржаўны педагагічны інстытут і працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў школах Гарадоцкага раёна, гарадоў Талачын, Лепель, Дуброўна. Як педагог вызначалася наватарскім падыходам да справы выхавання, вялікай любоўю да дзяцей і выбранай прафесіі. Некалькі разоў выбіралася дэпутатам Дубровенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1975 г. З 1993 г. на пенсіі.

ЯРОМІНА Анастасія Аляксандраўна нарадзілася ў 1922 г. ў горадзе Рэўда Свярдлоўскай вобласці. З 22 красавіка 1942 г. па 3 ліпеня 1945 г. — на службе ў Чырвонай Арміі. Сяржант, камандзір зенітна-кулямётнага разліку. З 1948 г. на Дубровеншчыне. Працавала старшай піянерважатай і настаўніцай гісторыі СШ № 1 г. Дуброўна. У 1951 г. завочна скончыла Смаленскі настаўніцкі інстытут, аддзяленне гісторыі. Пасля гэтага адзін год была выкладчыцай гісторыі і інспектарам школ Акцябрскага раёна г. Віцебск. Зноў вярнулася ў Дуброўну і да 1971 г. працавала настаўніцай гісторыі СШ № 1. За гэты час завочна скончыла гістарычны факультэт Віцебскага педінстытута імя С. М. Кірава. У 1971—1972 гг. — дырэктар СШ №1 г. Дуброўна, затым, да выхада на пенсію (1975), — настаўніца гэтай школы. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» А. А. Яромінай прысвоена ў 1967 г. Як удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, Анастасія Аляксандраўна шмат увагі ўдзяляла ваенна-патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Памерла ў 1985 г.

А. А. Яроміна

Працаўнікі Дубровенскага раёна, адзначаныя ўрадавымі ўзнагародамі

АНДРЭЕЎ Міхаіл Платонавіч нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Холаўе Дубровенскага раёна. Скончыў Бабініцкае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. У 195557 гг. трактарыст Дубровенскай МТС, у 1957—1960 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. З 1960 г. — шафёр, брыгадзір, намеснік старшыні, зноў брыгадзір калгаса «Прагрэс». Брыгада М. П. Андрэева стабільна атрымлівала высокія ўраджаі, вызначалася культурай земляробства. Ордэнам Леніна М. П. Андрэеў узнагароджаны ў 1973 г. Памёр 7.1.1966 г.

М. П. Андрэеў.

Н. Я. Булаева.

БУЛАЕВА Настасся Ягораўна нарадзілася ў 1912 г. ў в. Быстрыёўка Дубровенскага раёна. Увесь час працавала ў жывёлагадоўлі: у саўгасе «Дзёмкіна» Горацкага раёна (1928—1934), у саўгасе «1 Мая» Дубровенскага раёна, у Тамбоўскай вобласці (падчас эвакуацыі), з 1945 г. па 1967 г. зноў у саўгасе «1 Мая». Узнагароджана ордэнам Леніна ў 1966 г.

ГУСЯНЦОЎ Сяргей Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Чубакова Дубровенскага раёна. Да службы ў Савецкай Арміі працаваў трактарыстам у саўгасе «1 Мая», вучыўся ў Высокаўскім СПТВ, потым зноў механізатар у гэтым жа саўгасе, з 1957 г. да гэтага часу. За ўдарную работу ўзнагароджаны ордэнам Леніна ў 1971 г.

С. У. Гусянцоў.

І. К. Лабусаў.

А. Дз. Лігароў.

Т. М. Лукашэвіч.

В. М. Лявонаў.

Р. І. Матросаў.

ЛАБУСАЎ Іван Кузьміч нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Вішні Лёзненскага раёна. У 1949—1953 гг. — у радах Савецкай Арміі, удзельнічаў у Карэйскай вайне. З 1953 г. на торфапрадпрыемстве «Асінторф» — электраманцёр, брыгадзір электрыкаў, майстар, старшы майстар участка здабычы торфу (1965—1971), старшыня прафсаюзнага камітэта (1971—1981), інжынер, арганізатар вытворчасці. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 6 медалямі, у тым ліку «За баявыя заслугі», Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ЛІГАРАЎ Анатоль Дзмітрыевіч нарадзіўся ў 1932 г. З 1946 г. па 1951 г. працаваў калгаснікам калгаса «Герой працы» Дубровенскага раёна. У 1951—1954 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. У 1954—1956 гг. калгаснік калгаса «Радзіма». З 1956 г. працаваў трактарыстам у калгасе «Герой працы». Узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1973 г.

ЛУКАШЭВІЧ Таццяна Мітрафанаўна нарадзілася ў 1938 г. З 1957 г. па 1966 г. — калгасніца калгаса «Праўда», з 1966 г. па 1968 г. — цялятніца калгаса «Праўда», з 1968 г. па 1978 г. — звеннявая калгаса «Праўда», з 1978 г. — калгасніца калгаса «Праўда». Узнагароджана ордэнам Леніна ў 1976 г.

ЛЯВОНАЎ Васіль Мікітавіч нарадзіўся ў 1927 г. З 1944 г. па 1951 г. служыў у Савецкай Арміі. У 1951 г. паступіў у Высоцкае СПТВ-12, працаваў камбайнерам, брыгадзірам трактарнай брыгады. З 1954 г. працаваў майстрам Бабініцкага СПТВ-35 Аршанскага раёна, затым майстрам Дубровенскага СПТВ-35. Узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1964 г.

МАРТЫНАВА Таццяна Ягораўна нарадзілася ў 1924 г. З 1951 г. па 1965 г. — калгасніца калгаса «Праўда». З 1965 г. па 1970 г. — звеннявая калгаса «Праўда», з 1970 г. — калгасніца гэтага ж калгаса. Узнагароджана ордэнам Леніна ў 1966 г.

МАТРОСАЎ Рыгор Ігнатавіч нарадзіўся ў 1936 г. Звыш 37 гадоў адпрацаваў трактарыстам у калгасе імя Кутузава, у саўгасах «Арловічы» і «Прыдняпроўскі». Узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1959 г. Памёр у 1992 г.

НОВІКАЎ Рыгор Карнеевіч нарадзіўся ў 1919 г. У 1936—1938 гг. — слесар Кіраўскага завода ў г. Ленінград, у 1938—1940 гг. — брыгадзір Высачанскай МТС Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці.

ці. У 1940—1946 гг. — служыў у радах Савецкай Арміі, у 1946—1950 гг. — механік, загадчык нафтабазы, механік-кантралёр Высачанскай МТС. У 1950—1958 гг. — старшы механік, галоўны інжынер Зарубскай МТС. У 1958—1959 гг. — інжынер Дубровенскай РТС. У 1959 г. ўзначаліў адстаючы калгас імя XX з'езда КПСС Дубровенскага раёна і вывеў яго ў перадавыя. Шмат увагі ўдзяляў сацыяльнаму развіццю вёскі, паляпшэнню дабрабыту калгаснікаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, чатырма медалямі ВДНГ і двума ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Памёр у 1983 г.

САДОЎНІКАЎ Мікалай Сафонавіч нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Мардахі Дубровенскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1958—1987 гг. — калгаснік, затым, пасля вучобы, будаўнік і інжынер, прараб, старшы прараб Дубровенскага міжкалгасбуда. За гэты час Мікалай Сафонавіч узвёў на Дубровеншчыне дзесяткі важнейшых аб'ектаў, школ, фермаў, жылых дамоў. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1975), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), ордэнам Айчыннай вайны і 5 медалямі.

СІДАРАЎ Міхаіл Дзянісавіч нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Русаны Дубровенскага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў авіямеханікам. Пасля вайны — калгаснік, учотчык трактарнай брыгады, брыгадзір саўгаса імя Чарняхоўскага на Дубровеншчыне. Пад яго кіраўніцтвам брыгада дабілася высокіх вынікаў у раслінаводстве. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

СІНЯКОЎ Аляксей Сцяпанавіч нарадзіўся ў м. Ляды. Удзельнік грамадзянскай вайны, афіцэр Чырвонай Арміі, быў цяжка паранены. Пасля грамадзянскай вайны да 1941 г. і пасля Вялікай Айчыннай вайны — настаўнік Ляднянскай школы. Яго любілі і паважалі і дзеці і дарослыя. Адным з першых у раёне быў узнагароджан ордэнам Леніна (1954).

Р. К. Новікаў.

М. С. Садоўнікаў.

М. Дз. Сідараў.

А. С. Сінякоў.

В. П. Трусава.

М. Дз. Шабека.

ТРУСАВА Валянціна Прохараўна нарадзілася ў 1924 г. ў в. Чырвоная Слабада Дубровенскага раёна. У 1938 г. паступіла вучыцца ў Лужаснянскі сельгастэхнікум. Да вайны закончыла 3 курсы. У 1945—1947 гг. — бухгалтар калгаса «Герой пра-

М. А. Апіёк.

А. Ф. Шачанок.

цы», у 1947—1954 гг. — разнарабочая калгаса «Прагрэс», у 1954—1967 гг. — звеннявая па лёну, у 1967—1978 гг. — брыгадзір. Узнагароджана ордэнам Леніна (1958), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966), ордэнам «Знак пашаны» (1971).

ШАБЕКА Марыя Дзянісаўна нарадзілася ў 1930 г. У 1944—1945 гг. — рабочая прамкамбіната Ішымскага раёна Цюменскай вобласці, у 1945—1947 гг. — калгасніца калгаса «Авангард» Дубровенскага раёна, у 1947—1950 гг. — загадчыца Расасенскай хаты-чытальні, з 1950 г. — калгасніца, звеннявая па лёну калгаса «Прагрэс». Узнагароджана ордэнам Леніна ў 1958 г.

ШАЧАНОК Аляксей Фёдаравіч нарадзіўся ў 1929 г. З 1945 г. па 1949 г. — калгаснік калгаса «Прамень сацыялізма» Аршанскага раёна, 1949—1952 гг. служыў у радах Савецкай Арміі, 1952—1954 гг. — рабочы торфапрадпрыемства «Асінторф», з 1954 — трактарыст-машыніст торфапрадпрыемства «Асінторф». Узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1971 г.

Яны нарадзіліся на Дубровеншчыне

АПЁК Мікалай Апанасавіч нарадзіўся 20.11.1935 г. ў в. Макараўка Дубровенскага раёна ў сям'і селяніна. Скончыў Пірагоўскую сямігадовую школу. У 1951—1955 гг. вучыўся у Віцебскім мастацка-графічным вучылішчы, а ў 1956—1957 гг. — на пятым курсе Мінскага мастацкага вучылішча. Некаторы час працаваў у сістэме Мастацкага Фонда БССР г. Віцебск. У 1964 г, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. З 1966 г. — член Саюза мастакоў БССР. З 1964 г. да 1973 г. працаваў мастаком-пастаноўшчыкам Гродзенскага абласнога драмтэатра. Ім былі зроблены сцэнаграфіі і больш за трыццаць пастановак спектакляў у розных тэатрах Беларусі. Сярод іх: «Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцева, «Дамы і гусары» А, Фрэдры, «Варвары» М. Горкага, «Паміж ліўнямі» А. Штэйна, «Камедыя памылак» У. Шэкспіра, «Трыбунал» А. Макаёнка, «Адкуль грэх?» А. Петрашкевіча, «Амністыя» М. Матукоўскага і іншыя.

У гэты час М. А. Апіёк з'яўляўся сакратаром Гродзенскага аддзялення Саюза мастакоў Беларусі. Ён удзельнік усіх буйных рэспубліканскіх мастацкіх выставак (з 1966), а таксама некаторых усесаюзных і замежных. Персанальныя выстаўкі жывапісу наладжваў у Беларусі, Польшчы і Германіі.

Працуе ў жанры фігуратыўнай карціны, партрэта, пейзажа і нацюрморта. Яго творы знаходзяцца у мастацкіх музеях Беларусі, у тым ліку ў Нацыянальным мастацкім музеі, у дырэкцыі выставак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у Мастацкім Фондзе Саюза мастакоў, а таксама ў прыватных калекцыях Расіі, Польшчы, Германіі, Галандыі і інш. краін.

Да роднай крыніцы

Незабыўныя ўспаміны дзяцінства... Ва ўсіх яны аднолькавыя і ў кожнага — свае.

Мае першыя ўспаміны звязаны з маляўнічай дубровенскай вёскай Макараўкай. Гэта там шэсцьдзесят гадоў назад у сялянскай сям'і Настассі Ягораўны і Апанаса Сідаравіча Апіёкаў я з'явіўся на свет. Там вымавіў першыя словы, зрабіў першыя крокі. Дзяцінства майго пакалення апалена вайной, якая на маёй роднай зямлі, на маёй малой радзіме лютавала асабліва жорстка.

Але ўсё ў жыцці мінае, мінула і вайна, пакінуўшы ў памяці яркі і горкі след.

Я быў звычайным вясковым хлапчуком і хто мог сказаць, што перада мной адчыніцца такі шырокі, проста неабсяжны свет? А ўсё ад таго, што яшчэ ў дзяцінстве адчуў я неадольную цягу да малявання. Ужо калі вучыўся ў Пірагоўскай сямігодцы, то па маляванню меў толькі адны пяцёркі.

Гэта і вызначыла мой шлях, мой лёс — пасля школы я паступіў у Віцебскае мастацка-графічнае педвучылішча. А потым з дыпломам настаўніка паехаў на Гомельшчыну, у гарадскі пасёлак Ельск.

Палессе глыбока ўразіла мяне. Там і краявіды іншыя, чым у нас, і гаворка, і ў нечым нават побыт людзей. Адным словам, багаты матэрыял для мастацкай натуры. Гэта ж той край натхніў Якуба Коласа на «Дрыгву», а Івана Мележа — на «Палескую хроніку...».

І ўсё ж адчуў я, што не магу замкнуцца на ролі школьнага настаўніка — душа прасіла большага прастору, размаху. Так я стаў студэнтам пятага курса Мінскага мастацкага вучылішча.

Я ўжо трывала стаяў на нагах, меў пэўны багаж ведаў і вопыту, а ўнутраны голас настойліва шаптаў і шаптаў: «Не спыняйся, не супакойвайся». Я прыслухаўся да яго і ў дваццаць тры гады зноў пачаў студэнцкае жыццё — на гэты раз у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Мне ўжо было пад трыццаць...

Але, як кажуць, ахвяра не была дарэмнай. Я спасціг глыбокія таямніцы свайго мастацкага рамяства і раскрыў іх у сваіх работах: выканаў больш за трыццаць сцэнаграфій для беларускіх тэатраў. А для выканання кожнай работы трэба пранікнуць у сэнс і змест твора, дух і эпоху яго аўтара. Гэта і ёсць той «такі шырокі, проста неабсяжны свет», які адкрывае мастацтва. І я шчаслівы гэтым, хоць, вядома, творчай працы не бывае без горычы і расчараванняў. Але гэта і ёсць паўната жыцця. Не зведаўшы смутку, не зведаеш і сапраўднай радасці.

А яшчэ, што сілкуе творчае ўяўленне мастака — гэта ўспаміны аб родным краі, сувязь часоў і пакаленняў.

Шмат чужых ботаў таптала нашу зялёную Дубровеншчыну. Шмат заваёўнікаў знайшло тут бясслаўны канец. Яны спусташалі і спусташалі нашу зямлю, а мы адраджалі і адраджалі яе да жыцця і сёння жывем на ёй, дарагой і любай.

Падзеі, што пранесліся над маёй зямлёй, і мае ўспаміны пераходзяць у карціны, партрэты, пейзажы...

Вось карціна «Аднасяльчане, год 29-ы». У аснову леглі падзеі, што адбываліся ў нашай вёсцы. Сельскі сход. Агітацыя ў калгас. Сход праходзіць у хаце майго дзеда Сідара. Агітацыя за светлае будучае. А на тварах людзей — у каго разгубленасць, у каго — радасць. А у цэнтры палатна — прыгожая маладая жанчына з дзіцем на руках. Гэта мая маці з маёй старэйшай сястрой Жэняй. Аб чым яна тады думала? Як спраўдзіліся яе надзеі?

Яшчэ адна карціна — «Май, 45 год».

Так і стаіць перад маімі вачамі тое, што бачыў я паўстагоддзя назад. З захаду ў бок Масквы праз нашу станцыю Хлюсціна ідуць і ідуць эшалоны-цяплушкі. Да праходзячых цягнікоў з навакольных вёсак бягуць жанчыны з надзеяй сустрэць свайго... Гукі музыкі, бліскучыя веласіпеды на дахах вагонаў, чамаданы... Жарты і смех, песні. Але цягнікі праносяцца міма, а жанчыны застаюцца стаяць з акамянелымі,

нібы абвугленымі тварамі, з нявыплаканымі слязамі, недакаханыя, недацалаваныя...

Хіба можна забыць такое? І хіба можна, калі бог табе даў такі дар, не перанесці гэта на палатно карціны, каб па ёй нашы дзеці і ўнукі мелі ўяўленне аб той вайне.

...Родны край, родны кут! Ты — невычэрпная крыніца маёй творчасці, майго натхнення. Я імкнуся да цябе ўсім сэрцам. Цяпер да гэтай жыватворнай крыніцы прыязджае пастаянна і мая дачка Наташа — яна скульптар.

І так будзе заўсёды.

М. Апіёк.

БЫХОЎСКІ Абрам Ісаевіч нарадзіўся ў 1895 г. ў г. Дуброўна. Працаваць пачаў у 16 гадоў. Здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю. Пасля заканчэння інстытуцкага курса ў 1924 г. меў спецыяльнасць інжынера-механіка. Працаваў на машынабудаўнічых прадпрыемствах Іжэўска і іншых гарадоў. 13 гадоў узначальваў Пермскі абаронны завод. Асноўная яго дзейнасць на гэтым прадпрыемстве прыйшлася на ваенныя і першыя пасляваенныя гады. За поспехі ў рабоце на абарону краіны ў чэрвені 1942 г. па прадстаўленню Дзяржаўнага Камітэта Абароны А. І. Быхоўскаму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Яго імя было ў кароткім, але прыярытэтным спісе вучоных, канструктараў, вынаходнікаў.

За развіццё савецкай ваеннай індустрыі А. І. Быхоўскі быў узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Суворава I ступені, Айчыннай вайны I ступені. Яму было прысвоена званне генерал-лейтэнанта інжынерна-тэхнічнай службы. Памёр у 1972 г. ў Маскве.

ГАРУЛЁЎ Мікола (Мікалай Аляксандравіч) нарадзіўся 6.11.1919 г. ў вёсцы Баева Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута (1941). Напачатку Вялікай Айчыннай вайны — баец 1-га камуністычнага знішчальнага батальёна пры ЦК КП Беларусі, потым — баец, афіцэр-палітработнік у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі (1947) — адказны сакратар рэдакцыі магілёўскай абласной газеты «За Радзіму». У 1949 г. пераехаў у Мінск, працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, у рэдакцыі часопіса «Советская Отчизна», загадчыкам літаратурнай часткі Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, на кінастудыі «Беларусьфільм», у 1970—1979 гг. — адказны сакратар часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Член СП СССР з 1947 г. Узнагароджаны медалямі. Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1979). Памёр 7.5.1980 г.

Першы верш апублікаваў у 1938 г. (газета «Камунар Магілёўшчыны»). Пісаў на рускай і беларускай мовах. У 1949 г. надрукаваў нарыс «Шлях рацыяналізатара». Выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Друзья-товарищи» (1954), «Новы настаўнік» (1974), «Прощайте, любимые» (1977), «Кібернетычная жонка» (1979), раманы «Прощайте, любимые» (1979), «После разлуки» (1981). Зрабіў літаратурны запіс кнігі М. Каралёва «Сыновья народа» (1955). Выдаў зборнікі вершаў «Сверстники» (1950), «В пути» (1956), «Признание» (1976). Выступаў і як драматург. Аўтар п'ес «Выбух» (з М. Алтуховым, 1959, пастаўлена ў 1958), «Второе знакомство» (1961, пастаўлена ў 1962), «Моя дочь» (1966, пастаўлена ў 1965), «Друг или враг» («Кровью скреплённая», 1967, пастаўлена ў 1966), «Месть Половинкина» (пастаўлена ў 1968), «Москвич-408» (1971), тры апошнія п'есы ўвайшлі ў зборнік «Наследники» (1971). Напісаў кінааповесць «Наследники Матвея Марковича» (1963) і сцэнарыі трох дакументальных фільмаў. Пераклаў на рускую мову раманы М. Паслядовіча «Святло над Ліпскам» (1950) і М. Зарэцкага «Вязьмо» (1965), а таксама паасобныя творы Я. Коласа, Э. Самуйлёнка, П. Галавача, М. Танка, П. Панчанкі, А. Бялевіча, У. Краўчанкі, Я. Скрыгана, І. Мележа і інш.

ГЕРАІМЕНКА Уладзімір Аляксандравіч нарадзіўся 18.10.1955 г. ў в. Зарубы Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі філосаф. Навуковы супрацоўнік Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Доктар філасофскіх навук. Скончыў фізіка-матэматычны факультэт Віцебскага педінстытута (1978), філасофскае аддзяленне аспірантуры Акадэміі навук Беларусі (1982).

Творы: Змест і формы прыродазнаўчанавуковай тэорыі//Весці Ан Беларусі. Сер. грамад. навук. 1981. № 3; Змястоўнае і фармальнае на розных этапах развіцця ведаў//Тамсама. № 6; Внутренняя организация понятия и структура объекта. Мн., 1982; Диалектическая концепция понятия. Активная роль формы знания в развитии наук. Автореферат. Мн., 1982; Прынцыпы адзінства ў навуковым пазнанні: аспекты і формы праўлення//Весці АН Беларусі. Сер. грамад. навук. 1983. № 6; Адзінства адпаведнасці, дапаўняльнасці і эквівалентнасці ў дынаміцы фізічных тэорый//Тамсама. 1984. № 1; Философско-методологические аспекты генезиса и функционирования эквивалентных физических теорий//Тамсама. № 6; Активность формы физического знания. Личностное знание и научное творчество. Мн., 1989; Знание, компьютер, общество. Мн., 1992.

ГРУЦА Аляксей Пятровіч нарадзіўся 9.5.1924 г. ў вёсцы Пішчыкі Дубровенскага раёна. Пасля заканчэння ў 1941 г. Дубровенскай СШ № 1 пражываў у роднай вёсцы. У лютым 1944 г. разам з бацькамі і сястрой быў вывезены ў Германію на прымусовыя работы. Пасля вызвалення ў красавіку 1945 г. прызваны ў Савецкую Армію. Дэмабілізаваўшыся ў 1947 г. паступіў у Мінскі педінстытут імя М. Горкага. Пасля сканчэння вучобы з 1951 г. да 1954 г. працаваў у сярэдніх школах Мінска, з 1957 г. да 1969 г. — у інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР у якасці малодшага, а затым старшага навуковага супрацоўніка. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1958 г., доктарскую — у 1969 г. У гэтым жа годзе быў абраны на пасаду прафесара Мінскага педінстытута імя М. Горкага па спецыяльнасці гістарычная граматыка рускай мовы. У 1971 г. за калектыўную працу па беларускай лінгвагеаграфіі ў ліку іншых сааўтараў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. З 1972 г. да 1983 г. загадваў кафедрай рускай мовы ў педінстытуце імя М. Горкага. Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік народнай асветы» Міністэрства асветы БССР.

ГРЫБКОЎСКІ Віктар Паўлавіч нарадзіўся 30.4.1932 г. ў в. Асташкавічы Дубровенскага раёна. Беларускі фізік. Член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь (1977), доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1979). Скончыў БДУ (1956). З 1959 г. навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі оптыкі паўправаднікоў інстытута фізікі АН БССР. З 1975 г. намеснік старшыні Савета па каардынацыі навуковай дзейнасці пры Прэзідыуме АН БССР і загадчык лабараторыі інстытута фізікі. Навуковыя даследванні па праблемах люмінісцэнцыі, оптыкі паўправаднікоў. Мае 260 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфіі і 29 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі БССР (1976). Узнагароджан ордэнам Знак Пашаны.

Творы: Введение в теорию люминисценции. Мн., 1963 (разам з Б. І. Сцяпанавым); Методы расчёта оптических квантовых генераторов. Т. 12. Мн., 1966—68 (у сааўт.); Теория поглощения и испускания света в полупроводниках. Мн., 1975; Полупроводниковые лазеры. Мн., 1988.

ДУДАРАЎ АляксейАнуфрыевіч нарадзіўся 6.6.1950 н. ў вёсцы Кляны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1968 г. скончыў Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў. Працаваў слесарам на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе. Служыў у Савецкай Арміі (1968—1970), зноў працаваў на нафтаперапрацоўчым заводзе (1970—1972). У 1976 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Быў акцёрам, загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (1976—1979). У 1979—1983 гг. член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі «Тэлефільма» (Мінск). Сакратар Саюза тэатральных дзеячаў БССР (з 1987). Старшыня Беларускага Саюза тэатральных дзеячаў, галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва». Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1979 г. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Друкуецца з 1973 г. Выдаў зборнік апавяданняў «Святая птушка» (1979), казку для дзяцей «Сінявочка» (1981). Найбольш вядомы як драматург і сцэнарыст. Па яго сцэнарыях зняты кароткаметражныя фільмы «Кола» (1977), «Дэбют» (1978), «Буслянё» (1980) і мастацкія — «Суседзі» (1979), «Купальская ноч» (1982), «Белыя росы» (1984), «Восеньскія сны» (1986). Аўтар п'ес «Выбар» (пастаўлена ў 1979), «Парог» (пастаўлена ў 1981), «Апошні ўзлёт» (пастаўлена ў 1982), «Вечар» (пастаўлена ў 1983), «Радавыя» (пастаўлена ў 1988), «Вежа» (з У. Някляевым, пастаўлена ў 1990). Інсцэніраваў раманы М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (пастаўлена ў 1980) і М. Булгакава «Майстар і Маргарыта» (пастаўлена ў 1987). У 1987 г. выйшаў зборнік п'ес «Дыялог».

У. А. Гераіменка.

А. П. Груца.

В. П. Грыбкоўскі

А. А. Дудараў.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1982) за зборнік апавяданняў «Святая птушка» і п'есу «Выбар», Ленінскага камсамола (1984) за творы апошніх гадоў, Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) за спектакль «Радавыя».

Фільм «Белыя Росы» быў прызнаны кінагледачамі лепшай кінакамедыяй у 1985 г. За «Белыя Росы» ў 1984 г. на XVII кінафестывалі ў Кіеве атрымаў прыз за лепшы сцэнарый.

У 1993 г. напісаў гістарычную трагедыю «Купала» пра беларускае сярэдневякоўе часоў росквіту Вялікага княства Літоўскага. Пастаўлена ў Гомельскім абласным драмтэатры (1994).

* * *

«Ідуць гады... І чым больш сталым робішся, чым па часе далей ад дзяцінства, тым большая ўпэўненасць і пачуццё, што ты родам з дзяцінства... Я нарадзіўся праз пяць гадоў пасля таго як адгрымеў святочны салют Вялікай Перамогі. Бацька — гвардыі старшына Ануфрый Дудараў — прайшоў праз чатыры гады крывавага і вогненнага пекла і выжыў. Маці Анастасія Дударава з маленькімі сёстрамі Дзінай і Надзяй перажыла акупацыйнае пекла, бежанцы і здзекі, змагла выжыць і ўратаваць сястрычак. Страшная статыстыка кожнага чацвёртага (а мо і трэцяга?) беларуса абмінула нашу сям'ю. У нейкай іншай сям'і яна забрала кожнага другога, а мо і кожнага першага. Светлая вам памяць пакутнікі... Страшную даніну плоціць заўсёды наш беларускі народ за вар'яцтва чалавецтва. Наша родная Дубровеншчына з вякоў сівой даўніны і ў навейшую гісторыю атрымлівала ў часы ліхалецця глыбокія і балючыя раны, якія загойваюцца не адным пакаленнем. Абеліскі, помнікі... Помнікі... абеліскі... Памяць...

Калі мне сніцца наша маленькая рачулка, што падзяляе мае Кляны на дзве паловы, Крутая гара ў лесе Караснік, вяскоўцы, багата якіх яшчэ жывуць у Клянах і тыя, якія ўжо ў сваім вечным прытулку за вёскай. Іх жыццём і характарамі я карыстаюся да гэтага часу. Багата хто з іх жыве ў маіх п'есах... Дык вось калі мне гэта сніцца светла і сонечна, першае, што я шапчу, калі прачнуся: «Божа літасцівы, уратуй маю Радзіму, уратуй мой народ...».

А. Дудараў,
Мінск.

ЛУКАШОЎ Сяргей Апанасавіч нарадзіўся 1.2.1921 г. ў вёсцы Малое Савіна Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Закончыў рэспубліканскую партыйную школу, Беларускі дзяржаўны універсітэт і аспірантуру. У 1972 г. абараніў кандыдацкую, а ў 1981 г. — доктарскую дысертацыі. Працоўную дзейнасць пачаў у 1939 г. загадчыкам аддзела Дубровенскага райкома камсамола. З кастрычніка 1940 г. па сакавік 1946 г. служыў у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Працаваў сакратаром райкома партыі ў Дубровенскім і Лёзненскім раёнах. У 19571971 гг. на педагагічнай працы, з 1971 г. — на навуковай. Яго навуковыя інтарэсы канцэнтраваліся на ідэалагічнай рабоце і культурным будаўніцтве. Ён прымаў удзел у падрыхтоўцы к выданню 3-га тома «Гісторыя Беларускай ССР», з'яўляецца рэдактарам некалькіх зборнікаў дакументаў. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені і Чырвонай зоркі, ганаровым знакам «Выдатнік народнай асветы». З 1991 г. С. А. Лукашоў на пенсіі. Жыве ў Мінску.

МАІСЕЕНКА Сяргей Цімафеевіч нарадзіўся 10.3.1920 г. ў в. Чубакова Горацкага павета Магілёўскай губерніі. Дзярж. дзеяч Беларусі. Заслужаны лесавод БССР (1970). З сялян. Скончыў Уральскі лесатэхнічны інстытут (1942). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 ляснічы Чырвонабродскага лясніцтва (Магілёўскай вобл.), дырэктар Бабруйскага лясгаса. У 1960—66 гг. нач. Гал. ўпраўлення лясной гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР, з 1966 г. — міністр лясной гаспадаркі БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 8-га склікання. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыіі, 3 інш. ордэнамі.

МІНКОВІЧ Міхаіл Аляксандравіч нарадзіўся 24.8(6.9) 1914 г. ў в. Кіраёва Горацкага

С. А. Лукашоў.

С. Ц. Маісеенка.

павета Магілёўскай губерні. Дзярж. дзеяч БССР. Кандыдат педагагічных навук (1954). З рабочых. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1935). З 1935 г. выкладчык Мінскага ваеннага вучылішча. У 193637 гг. — у Чырвонай Арміі. З 1939 г. намеснік загадчыка аддзела студэнцкай моладзі, з 1946 г. сакратар ЦК ЛКСМБ, старшыня калгаса культасветустаноў СМ БССР, у 1953—56 гг. першы сакратар Бягомльскага РК КПБ. З кастрычніка 1956 г. намеснік, першы намеснік міністра, з красавіка 1964 г. міністр культуры БССР. Узнагароджан ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 3 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 17.8.1971 г.

НАЗАРАЎ Сяргей Іванавіч нарадзіўся 14.10.1928 г. ў в. Барадзіно Дубровенскага раёна. У 1947 г. скончыў Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў механікам Добрушскай МТС Гомельскай вобл. У 1948—1953 гг. вучыўся і на выдатна скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Выкладаў у Лідскім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі. У 1958 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю і да 1964 г. загадваў аддзелам механізацыі Магілёўскай сельскагаспадарчай вопытнай станцыі. З 1961 г. загадчык лабараторыі, а з 1968 г. намеснік дырэктара Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1971 г. прысвоена вучоная ступень доктара тэхнічных навук, у 1974 г. — званне прафесара. З 1980 г. Сергей Іванавіч — рэктар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1982 г. абраны членам-карэспандэнтам Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук. З 1988 г. — сапраўдны член (акадэмік) гэтай акадэміі.

Акадэмік С. І. Назараў — заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі (1981). Яго навуковая дзейнасць звязана са стварэннем і ўкараненнем у вытворчасць шырокага комплекса машын для падрыхтоўкі і ўнясення арганічных і мінеральных угнаенняў, вапнавання глебы і аховы раслін. Пад яго кіраўніцтвам распрацоўваецца тэхналогія і комплекс прынцыпова новых машын для пасеваў, уборкі і пасляўборачнай апрацоўкі насеннікаў канюшыны, лубіну злакавых траў і іншых кармавых культур метадам ачасу раслін на карані. С. І. Назараў узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

ПРАСКУРАЎ Васіль Фёдаравіч нарадзіўся 25.8.1926 г. ў вёсцы Негаціна Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны скончыў Сваташыцкую няпоўную сярэднюю школу. У 1945 г. прызваны ў Савецкую Армію. Да 1950 г. служыў карэспандэнтам армейскай газеты «За честь Родины» ў Аўстрыі, Венгрыі і Германіі. У 1950—1958 гг. — старшыня Ганцавіцкага райспажыўсаюза, экстэрнам скончыў Брэсцкую гандлёва-кааператыўную школу. У 1963 г. завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1958—1962 гг. — супрацоўнік ганцавіцкай раённай газеты «Савецкае Палессе», у 1962—1966 гг. працаваў у ляхавіцкай раённай газеце «Будаўнік камунізму», а з 1966 г. — рэдактар газеты «Савецкае Палессе». Член СП СССР з 1987 г. Узнагароджаны медалямі. Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968). Памёр 22.5.1987 г.

В. Ф. Праскураў.

Сяргей Ракіта.

Першы літаратурна-крытычны артыкул апублікаваў у 1950 г. Аўтар кніг публіцыстыкі «Святая сівізна» (1966), «Трое з-за Лані» (1967), «Людзі-суседзі» (1974), «Пакажы чалавеку дарогу» (1979), «Пакланіся зямлі-карміцельцы» (1982), «Чорны хлеб» (1984). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя П. М. Лепяшынскага (1986) за кнігу «Пакланіся зямлі-карміцельцы».

РАКІТА Сяргей (Сяргей Васілевіч ЗАКОННІКАЎ) нарадзіўся 15.10.1909 г. ў вёсцы Ліцвінава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў Новатухіньскую школу другой ступені (1925). Будучы вучнем, пісаў допісы ў аршанскую акруговую газету «Камуністычны шлях». У 1929 г. накіраваны на работу ў рэдакцыю гомельскай абласной газеты «Палеская праўда». З 1930 г. з'яўляўся кіраўніком Гомельскай філіі БелАПП. Служыў у Чырвонай Арміі (1932—1933). Працаваў у Мінску ў рэдакцыях газет, на Беларускім радыё, у Дзяржаўным выдавецтве БССР, адначасова вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі імя С. М. Кірава. 19.10.1936 г. рэпрэсіраваны. Прыгавораны да 10 гадоў зняволення ў лагерах. Працаваў на лесапавале ў Горкаўскай вобласці. Рэабілітаваны пасмяротна. Памёр у лагеры 23.3.1942 г.

Першы верш апублікаваў у 1928 г. (часопіс «Аршанскі маладняк»). У 1930 г. ў калектыўным зборніку «Разгон» (Гомель) змешчана нізка яго вершаў. Выдаў зборнік паэзіі «Я агітую за пяцігодку» (1934).

ЯНЧАНКА Сцяпан Яфімавіч нарадзіўся 17.2.1924 г. ў в. Анціпенкі Дубровенскага раёна. З сялян. Скончыў Віцебскае педвучылішча (1941), Цэнтральную камсамольскую школу (1946), Гомельскі пединстытут (1950). З ліпеня 1941 г. выхавацель Ляднянскага ў Дубровенскім раёне і Інжавінскага ў Тамбоўскай вобласці дзіцячых дамоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1944 г. — на камсамольскай рабоце. З 1954 г. на навукова-педагагічнай — дацэнт, доктар эканамічных навук (1975), загадчык кафедры палітэканоміі Белдзяржуніверсітэта, з 1990 г. прафесар гэтай кафедры. Надрукаваў каля 90 навуковых прац, 9 манаграфій па фундаментальных праблемах палітэканоміі, у тым ліку «Ступени развития рынка: Генетический код капитализма» (Мн., 1995). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, «Знак Пашаны», медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» і інш. Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларускай ССР.

С. Я. Янчанка.

Спартыўная слава і гонар Дубровеншчыны

Усю спартыўна-масавую работу ў Дуброўне і ў сельскай мясцовасці накіроўвае створаны ў 1952 г. камітэт па фізічнай культуры і спорту Дубровенскага райвыканкама. З 1956 г. дзейнічае дабравольнае спартыўнае таварыства «Ураджай».

Лепшым спартсменам у 50-я гады быў М. Ф. Чыкуноў, які з 1953 да 1961 г. уваходзіў у склад зборнай каманды Віцебскай вобласці па спартыўнай гімнастыцы, удзельнічаў у абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтвах.

У 1963 г. у раёне была адкрыта дзіця-ча-юнацкая спартыўная школа (першы дырэктар А. А. Шурпакоў). Сярод падрыхтаваных у сценах ДЮСШ спартсменаў высокага класа Ала Міранкова, майстар спорту СССР, удзельніца IX спартакіяды народаў СССР у марафонскім бегу (г. Ташкент) — 4 месца; Анжэла Шумейка, майстар спорту СССР, удзельніца чэмпіяната міру сярод юніёраў (г. Афіны, 1986 г.) у бегу на 3000 м — 9 месца; бронзавы прызёр першынства Еўропы сярод юніёраў (г Бірмінгем, 1987 г.) у бегу на 1000 м; Жана Гарбаткіна, майстар спорту СССР, удзельніца Усесаюзных гульняў моладзі (1989 г.) у марафонскім бегу — 4 месца; Анжэла Калачова, кандыдат у майстры спорту, бронзавы прызёр першынства СССР у бегу на 3000 м (1989 г.); Людміла Ананенка, першаразрадніца, бронзавы прызёр першынства СССР у бегу на 1500 м (г. Краснадар, 1987 г.), чэмпіёнка першынства БССР у бегу на 1500 м (1984 г.); пераможца матчавай сустрэчы па лёгкай атлетыцы Украіна — Беларусь (1993 г.) у скачках у вышыню (200 см) Павел Цублянок, першаразраднік і інш.

М. Ф. Чыкуноў.

В. А. Лерман.

У 1972 г. у Дуброўне адкрыта секцыя барацьбы «самба». Майстрамі спорту СССР па гэтаму віду спорту сталі Аляксандр Тураў, Мікалай Катаржэўскі, Андрэй Трэбнікаў, Валерый Лерман, Міхаіл Лерман, Уладзімір Цітарэнка, Уладзімір Вашчылаў, Аляксандр Жукоўскі, Уладзімір Жукоўскі, Уладзімір Панкрацьеў, Генадзь Кускоў, Андрэй Рыбакоў. Майстар спорту Андрэй Віткоўскі на першынстве свету па барацьбе самба ў 1993 г. заняў 2-е месца, а Юрый Лавейкін, майстар спорту — 3 месца. Майстар спорту Канстанцін Сямёнаў на першынстве Еўропы заняў 3-е месца у г. Панявежысе (1994 г.) і ў Мінску (1995 г.). У першыню ў гісторыі Дубровеншчыны чэмпіёнам міру па барацьбе «самба» сярод моладзі майстрам спорту міжнароднага класу стаў Валерый Лерман (1992 г., г. Мінск), першае месца на першынстве Еўропы сярод моладзі (1993 г., Італія).

Такія высокія дасягненні спартсменаў сталі магчымымі дзякуючы трэнерам Ю. У. і В. М. Максак (лёгкая атлетыка), А. В. Жукоўскага (барацьба «самба» і «дзю-до»). Першым і адзіным у Беларусі трэнерам , якому прысвоена ганаровае званне «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» з'яўляецца Уладзімір Віктаравіч Жукоўскі. Нарадзіўся ён у 1954 г. у г. Дуброўна. Цяпер працуе ў г. Гродна.

Першым майстрам спорту з Дубровеншчыны стаў В. А. Адэснікаў. Двухразовы пераможца першынства БССР па лёгкай атлетыцы ў кіданні молата (1964, 1965 г.), пераможца матчавай сустрэчы БССР — Польшча. Уваходзіў у дзесятку лепшых

В. А. Адэснікаў.

М. І. Ісакаў.

кідальнікаў молата ў СССР (62 м 64 см — 1963 г.).

Першым майстрам спорту міжнароднага класу стала Валянціна Абразова, неаднаразовая чэмпіёнка і прызёр абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных спаборніцтваў па біятлону.

Высокія дасягненні маюць дубровенскія спартсмены і ў другіх відах спорту. Гэтаму садзейнічаюць розныя спартыўныя мерапрыемствы і развітая матэрыяльна-спартыўная база. У раёне маецца 18 спартыўных залаў, 13 стралковых ціраў, 20 футбольных палёў. У 1989 г. уведзены ў строй у г. Дуброўна стадыён з трыбунамі на 3000 месц, футбольным полем і спартыўнымі пляцоўкамі, з 1985 г. працуе шахматна-шашачны, а з 1992 г. — фізкультурна-спартыўны клубы.

А. Кундзікаў,
старшыня камітэта
па фізічнай культуры і спорту.

Ахвяра чужой вайны

ІСАКАЎ Мікалай Іванавіч нарадзіўся 31.1.1964 г., радавы. Вучыўся ў Валяўкоўскай васьмігадовай школе. Затым закончыў Смаленскае ГПТВ па спецыяльнасці слесар-мантажнік. З 1 красавіка 1983 г. служыў у паветрана-дэсантных войсках у г. Рукле (Літва). 29 красавіка 1984 г. загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Пахаваны ў в. Каробкі Валяўкоўскага сельскага Савета. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалем «Воину-интернационалисту от благодарного афганского народа».

Дубровенскі летапісец

Трыццаць тры гады Мікалай Аляксеевіч Шкадаў пражыў на Дубровеншчыне. Скончыўшы ў 1953 г. Баранавіцкі настаўніцкі інстытут і Маскоўскі універсітэт імя М. В. Ламаносава (завочна) ён усё жыццё выкладаў гісторыю. Менавіта ў гэты перыяд у яго нараджаецца думка стварыць у Дуброўне гісторыка-краязнаўчы музей. І энтузіяст пачынае збіраць неабходныя матэрыялы. У першую чаргу яго цікавіць, хто ў 1943—1944 гадах прымаў удзел у вызваленні Дубровеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сабраныя матэрыялы даюць магчымасць стварыць музей баявой славы 31-й арміі. Апошнія гады жыцця Мікалай Аляксандравіч працаваў у Расасненскай СШ, дзе шмат сіл і старання аддаў справе стварэння ў гэтай школе музея баявой і працоўнай славы. Многія сотні дакументаў (пісьмаў, фотаздымкаў, даведак, успамінаў і інш.) ён перадаў рэдакцыі раённай газеты «Дняпроўская праўда», многія з якіх пабачылі свет на яе старонках і ўвайшлі ў Хроніку Памяці.

М. А. Шкадаў.

М. А. Шкадаў быў сапраўдным летапісцам Дубровеншчыны.

Памёр у 1991 г.

ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА ДУБРОВЕНШЧЫНЫ

ТРАДЫЦЫЙНАЯ АБРАДНАСЦЬ І ФАЛЬКЛОР ДУБРОВЕНШЧЫНЫ

Пра традыцыйную абраднасць і фальклор Дубровеншчыны пачалі гаварыць і пісаць пераважна ў савецкі час, калі гэты рэгіён вылучылі ў асобную адміністрацыйную адзінку. Як вядома, да 1924 г. тэрыторыя сучаснага Дубровенскага раёна ўваходзіла ў склад Аршанскага павета. З канца ж XIX — пачатку XX ст. пэўным чынам ужо вывучалася культурная спадчына гэтага рэгіёна. Шматлікія запісы гэтага часу нярэдка сустракаюцца ў зборніках У. М. Дабравольскага, А. С. Дэмбавецкага, Е. Р. Раманава, П. В. Шэйна і іншых вучоных этнолагаў.

У апошнія гады этнаграфічна-фальклорныя матэрыялы Дубровенскага раёна даволі грунтоўна даследаваліся і занатоўваліся амаль у кожным сельскім савеце, часта з запісам на магнітную стужку.

Так, у 1965 г. фальклярыстам Васілём Скіданам часткова абследаваны вёскі Ляды, Салаўі (Котаўшчына), Рэдзькі, Кліменкі (Лазараўка). У гэтым жа годзе ў вёсцы Ляды працавалі ўдзельнікі Паўночна-усходняй навуковай экспедыцыі інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі Галіна Барташэвіч, Міхась Гваздёў і Антон Гурскі.

1976 г. фальклярыстка Галіна Таўлай абследавала і запісала мясцовыя абрады і песні ў вёсках Загваздзіна, Лапыроўшчына, Шабаны.

У 1991 г. ў творчай камандзіроўцы на Дубровеншчыне пабываў і аўтар гэтых радкоў; запісы абрадаў і фальклорных твораў зроблены ў вёсках Станіславова і Чубакова.

У 1992 г. была арганізавана комплексная навукова-вучэбная экспедыцыя інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі і Мінскага дзяржаўнага педінстытута, якая працавала ў вёсках Баева, Валькава і Панізоўе.

Значную колькасць запісаў у Дубровенскім раёне зрабілі мясцовыя аматары вусна-паэтычнай творчасці і студэнты-філолагі з розных навучальных устаноў Віцебска, Магілёва, Мінска ў час праходжання фальклорнай практыкі. Сярод іх найбольш цікавыя запісы занатаваны ў вёсцы Кляны (запісаў А. С. Емяльянаў з групай студэнтаў у 1979 г.), у горадзе Дуброўна і навакольных вёсках Бурая, Ерамееўшчына, Пірагі, Хлюсціна (зап. Д. І. Шыцік у 1961 г.), у вёсцы Гудава (зап. Т. С. Земянцова ў 1971 г.) і многія іншыя.

Матэрыялы пазначаных населеных пунктаў захоўваюцца зараз у Архіве інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Архіве навукова-даследчай лабараторыі Белдзяржуніверсітэта, а таксама ў вучэбных фальклорных лабараторыях розных педінстытутаў рэспублікі.

Сведчаннем значнасці этнаграфічна-фальклорнай спадчыны Дубровенскага краю з'яўляецца ўжо тое, што апісанні абрадаў, звычаяў, а таксама прыказкі, прымаўкі, песні, паданні, казкі, замовы, галашэнні, выслоўі і іншыя жанры фальклорных твораў, якія бытавалі і функцыянавалі ў побыце мясцовага насельніцтва, уключаны больш чым у 20 тамоў шматтомнага акадэмічнага выдання «Беларуская народная творчасць».

СВЯТЫ І АБРАДЫ ПАЧАТКУ КАЛЯНДАРНАГА ГОДА

У беларусаў, як і ў большасці народаў свету, народны каляндар пачынаецца з калядак — язычніцкага свята, рытуалы якога былі накіраваны на ўхваленне Сонца (Даждзьбога) як першакрыніцы жыцця і цяпла на зямлі. На Каляду (6 студзеня) вечарам у кожнай хаце рабілі рытуальны стол з вялікай колькасцю страў, але абавязкова з куццёю — кашай з яшных або грэцкіх круп. Дарэчы, гэта абрадавая страва дала назву не толькі першаму каляднаму застоллю — Першая або Вялікая куцця, але і наступным, што праводзяцца 13 студзеня — Шчодрая або Багатая куцця і 18 студзеня — Трэцяя ці Вадапосная куцця.

Беларускі селянін, з яго клопатамі аб будучым ураджаі, багацці і дабрабыце ўласнай гаспадаркі і здароўі членаў сям'і і роду прымяркоўваў да гэтага свята шматлікія магічныя дзеянні і заклінанні да Багоў і добрых Духаў, з надзеяйі, што яны будуць садзейнічаць яму ў паўсядзённых справах. Перш-наперш да Каляд прыносілі ў ахвяру Багам і Духам жывёлу: рэзалі свіней, птушку — «пускалі кроў». На святочным стале абавязкова стаяла засмажаная галава такой ахвяры. Гэты звычай хоць і страціў у этнічнай памяці сваё першапачатковае значэнне, але па часе строга захаваўся да нашых дзён.

На ўсе тры калядныя вячэры пяклі бліны. Прычым першы спечаны блін з кожнай вячэры адкладваўся і захоўваўся да канца Каляд. Як расказваюць сяляне вёскі Баева: «...на Хрышчэнне ўжо ўстаём рана ўтрам. Даёш на ташчак карові блін, аўцам ламаеш, каб было па два кусочка каждаму, а курям даёш уже мелкімі кусочкамі. ...Карові адзін блін, штоб аднаго цяляці дала, аўцы, штоб двое акаціла ягнятак, а курям многа кусочкаў, штоб многа яічак няслі»[1].

У першы ж калядны вечар дзяўчаты пачыналі гадаць аб будучым замужжы, бо кожная вельмі ж ужо хацела ведаць: хто

будзе яе каханы, як яго будуць зваць, з якога боку ён прыйдзе, каму першай з сябровак выпадзе выйсці замуж. Калядных гаданняў дубровенскія дзяўчаты і сёння ведаюць, як гавораць у народзе, «не адзін туз».

З даўніх часоў на Дубровеншчыне ў першы калядны дзень бацькі ездзілі зранку запрашаць да сябе ў госці замужніх дачок і зяцёў. А ў другой палове дня наладжвалі з сваімі дзецьмі сямейнае застолле.

З 7 студзеня — першага каляднага дня — вечарам пачыналі хадзіць калядоўшчыкі, якія абыходзілі двары і зычылі гаспадарам дабра, здароўя і багацця. Калядоўшчыкі вадзілі з сабой ражаных: у масках казы, ваўка, старога дзеда, цыгана. Гурт дзяўчат і хлопцаў, якія хадзілі калядаваць, называўся ў гэтым краі Каліда.

Падыходзячы на двара таго ці іншага гаспадара, спявалі:

Ехала Каліда
З канца ў канец,
Заехыла Каліда
К пану Івану.

Пасля такога ўступу спявалі віншавальныя песні з добрымі зычэннямі гаспадару, гаспадыні і іх дзеткам. Песні калядоўшчыкаў звычайна заканчваліся напамінам-прашэннем:

А, Ванечка, а, хазяін,
Дай Калядзіцы:
Пуд пушаніцы,

Хлеба бухатку,
Мяса бухатку,
Мяса лапатку,
Парасят з хвастом,
Калбас з шастом —
Во та Каляда!
За сваю Ніначку![2]

(в. Станіславова)

Калядныя вячоркі ў Станіславоўскім СДК.

Абышоўшы ўсе двары ў сваёй вёсцы, калядоўшчыкі, папярэдне дамовіўшыся з гаспадарамі, збіраліся ў адной з хат, дзе наладжвалі застолле і гулянне.

Найбольш выразным гульнёвым элементам такіх вечароў у моладзі Дубровеншчыны было ваджэнне карагодаў, якія ўключалі ў сябе песню, гульню і танец. Нават у цяперашні час іх добра помняць, а фальклярыстамі запісана да некалькіх дзесяткаў: «Ты, заінька, ты, мой шэранькі...», «У карагодзе мы былі...», «А што з-пад лесу, лесу цёмнага...», «Пасеялі дзеўкі лён...», «Васіль, Васіль, Васілёчак...», «Што з-пад белаю, пад бярозаю...», «Пайшлі дзевачкі ў ягодачкі...». І многія іншыя. Карагодная традыцыя тут не толькі актыўная, але і творча прадуктыўная, асабліва ў сэнсе гульнёва-тэатралізаванай распрацоўкі.

З прыняццем хрысціянства новая рэлігія ўнесла сваё адценне ў каляднае свята. У хрысціянскім каляндары на перыяд зімовага сонцастаяння прыпадае нараджэнне (Раждзяство) Ісуса Хрыста (7 студзеня), а затым пачатак Новага года (14 студзеня) і Водахрышча (19 студзеня). Таму адначасова з калядоўшчыкамі ў некаторых вёсках Дубровеншчыны, дзе, відаць, былі больш моцныя праваслаўныя прыходы, пачыналі хадзіць звездары, якія насілі «звязду» з вобразам якога-небудзь святога ўсярэдзіне. Хаджэнні звездароў абмяжоўваліся толькі адным тыднем да 14 студзеня. Як правіла, звездары, падыходзячы да двара, спявалі святыя песні, звязаныя сваёй тэматыкай з уяўленнямі аб нараджэнні Ісуса Хрыста.

Паўсюдна дубровенскія праваслаўныя прыхаджане адзначалі ў гэтыя дні царкоўны абрад Хрышчэнне, які святкаваўся ў гонар хрышчэння Ісуса Хрыста ў рацэ Іардан Іаанам Прадцечам. Зранку разам са свяшчэннікам хадзілі на раку, прабівалі палонку і, пасля малення, набіралі з сабой вады, якую неслі дадому і захоўвалі як сродак ад розных хвароб і няшчасцяў у гаспадарцы. У гэты ж дзень у кожнай хаце наладжвалася застолле.

Масленіца ў народным календары канчвала зіму і пачынала вясну. У аснове гэтага свята, як адзначаюць даследчыкі, ляжаць «...аграрныя і любоўна-сямейныя клопаты чалавека»[3]. Яно не мае прымеркаванасці да канкрэтнай даты: масленічны тыдзень працягваецца з панядзелка па нядзелю напярэдадні Вялікага посту.

Змест масленічных рытуалаў і звычаяў зводзіўся да развітання з зімой — спальвалі яе чучала, праганялі зіму і заклікалі вясенняе цяпло: «А зіма нам надакучыла, надакучыла, па вясенцы мы саскучылі, саскучылі...» (в. Хлюсціна).

У гэты ж час аб'язджалі маладых каней, рыхтавалі іх да веснавых работ, што заключалася ў верхавой яздзе «на маладняку» і «аб'ездцы маладняка ў вупражы».

Амаль усю Масленку дубровенскія сяляне і гараджане гасцявалі: запрашалі ў госці сваякоў ці хадзілі на застолле да суседзяў, родзічаў, знаёмых.

Для моладзі гэта быў час гулянняў і весялосці. Як расказваюць мясцовыя бабулькі: «Раньше на Масленіцу сабіраліся. От так хадзілі адна к адной. Слажаімся на бутылку, ну, бярём закуску і сабіраімся ў адну хату. Прыгатаўліваем стол. Песні спявалі масленічныя, а бывала і розныя. Гулялі весела з музыкаю»[4]. Забавамі моладзі пасля калектыўнай вячэры былі танцы і карагоды, «гулялі ў фанта і бутылачку».

Асабліва «звінела» ў гэтыя дні вуліца і навакольле. «Бралі сані, ...каторыя ездзяюць на конях, бальшыя. Зацягнуць на гару і каатліся так цэлую нядзелю Масленіцы»[5]. Шырока бытаваў у Дуброўне і навакольных вёсках звычай калыхацца на арэлях.

У гэтых, здавалася б, звычайных гуляннях моладзі праглядваюцца элементы старажытнай магіі: чым з вышэйшай горкі з'едуць санкі, тым вышэйшы вырасце лён; аб'езд на конях па вёсцы ці вакол яе, па ўяўленнях продкаў, зганяў «нячыстую сілу», чаму саддзейнічаў «звон бубенчыкаў на дузе», і засцерагаў у вясенне-летні перыяд вёску ад розных няшчасцяў; гушканне на арэлях таксама садзейнічала росту лёну і іншых раслін («хто вышэй рас-

качаецца, у таго лён будзе большы»). Паветра ж, якое абвявала чалавека у час гушкання (дарэчы, як і таго, хто шпарка катаўся на конях), зыходзячы са старажытных вераванняў, здольна было зняць з яго ўсе хваробы, садзейнічаць здароўю[6].

Вясёлыя масленічныя дні завяршалі ў жыцці сялян больш вольны зімовы час. З панядзелка наступнага тыдня пачынаўся сямітыднёвы Вялікі пост. Гэта хрысціянская традыцыя ўносіла свае карэктывы ў жыццё людзей: жанчыны стаўлялі кросны — трэба было наткаць тканіну і пашыць з яе адзенне для ўсёй сям'і; мужчыны дбайна правяралі сваю гаспадарку — ладзілі вупраж, земляробчы інвентар, займаліся рыбалкай. Рыба з Дняпра, Расасёнкі ці іншых невялічкіх рачулак і азёрцаў у пост была жаданай і дазволенай ежай на стале мясцовых рамеснікаў, сялян і панства. І вясеннія дні часам патрабавалі ўвагі да сябе — то «равок» пракапаць, то снег падрыхліць. Не забывалі наведаць у нядзельныя дні і царкву, каб памаліцца Богу, паспавядацца.

ВЕСНАВАЯ АБРАДНАСЦЬ

З язычніцкіх часоў нашы продкі з 1 сакавіка пачыналі гукаць Вясну. А практычна заклікалі Сонца сагрэць зямлю сваім цяплом, абудзіць жыватворную моц зямлі:

Хадзі, Вясна, у двору,
Нясі ключ з сабою
Зіму замыкаці,
Вясну атмыкаці.
А йдзець Вясна ў свеце
Зіму замкнём у клеці[7].

(в. Станіславова)

Вясеннімі рытуаламі, песнямі, заклінаннямі, зазываннямі, карагодамі чалавек, з уласцівай яму наіўнай свядомасцю, імкнуўся дапамагчы і пасадзейнічаць набліжэнню цёплых вясенніх дзён і пачатку пасяўных работ.

Нашы продкі-язычнікі гукалі Вясну ад сакавіка да пачатку ворыва. Пазней хрысціянства аказала значны ўплыў на гэты звычай. Настаўленні духоўных айцоў і забароны на ўвесяленні, звязаныя з паставымі днямі, з цягам часу аднеслі пачатак гэтай традыцыі на Благавешчанне. Менавіта так і захаваўся пачатак гукання Вясны ў народным каляндары Дубровенскага раёна. Ураджэнка вёскі Валькава Лідзія Міхайлаўна Сычова ўспамінае: «У празнік Благавешчання бабушка нас сабіраіць. Мы збіраемся, дзяўчаты, хлопцы, ідзём, дзе саломы стог ілі сена стог. На той стог садзімся, песні спяваем, Вясну гукаем»[8].

У іншых вёсках моладзь збіралася на пагорках, каля лесу, дзе вадзілі карагоды, вілі вяночкі, праводзілі розныя гульні[9]. Часцей выбар месца правядзення рытуалаў гукання Вясны залежыў ад мясцовага ландшафту.

Нашы продкі ўяўлялі сабе Вясну ў выглядзе прыгодай дзяўчыны і таму падобнымі гуляннямі і забавамі моладзь імкнулася імітаваць вясенні настрой прыроды, уяўляючы, што нябачна ў іхніх забавах прымае ўдзел Багіня Лада, якая ўвасабляла сабой вобраз Вясны.

Мы ўжо адзначалі, што карагодная традыцыя на Дубровеншчыне мела шырокі дыяпазон і актыўны пачатак. Для вясенніх дубровенскіх карагодаў характэрна перапляценне рытуальна-гульнёвых элементаў з баладным зместам песень, варыянты якіх, відаць, з'яўляюцца вынікам асіміляцыі пазнейшай пастановай песнятворчасці. Магчыма, што гэта праяўленне больш ранняй і моцнай традыцыі над культурнай навацыяй апошняга тысячагоддзя.

У добра вядомых у раёне карагодных песнях «Ох, Сенечка, Семіёнічка...», «Із-за лесу, лесу сонейка іграець... » і іншых апавядаецца пра каханне, хваляванні і турботы закаханых, якія перадаюцца праз прызму пэўнага драматызму, але ў адрозненне ад большасці поставых песень, як правіла, маюць шчаслівыю сюжэтную развязку.

У кантэксце гукання Вясны адзначаліся і такія святы, як Саракі, Пасха, Юр'е, Мікола, якія хоць і маюць на сёння ў мясцовай мове назвы хрысціянскага паходжання, але выразна захавалі ў сабе рэлікты язычніцкіх рытуалаў.

Юр'е (6 мая), Мікола (22 мая) у народным календары характарызаваліся першым выганам кароў і коней на пашу, назіраннем за ўсходамі на палях, абыходамі двароў і жытнёвай нівы, «пікавым часам» пасяўной. У гэтыя дні праводзілі шматлікія магічныя дзеянні, асабліва звязаныя з выганам у поле жывёлы: абносілі кароў і коней чырвоным яйкам, каб былі здаровымі і дужымі («краснымі, як яйка»), пры выгане праз вароты на вуліцу пад ногі жывёле клалі замок, пояс, сякеру, каб засцерагчы ад ваўкоў і розных «нячысцікаў», замаўлялі іх. Для прыкладу прывядзем падобную замову, запісаную ў вёсцы Кляны:

Як тапару ў печы не ляжаці,
Так шэраму зверу
Скаціну не відаці:
Здайся пнём і агнём![10]

Як расказваюць жыхары вёскі Станіслава, першы выган кароў «на травіцу» робяць так: «Пастух рана ходзіць, заказваіць, што будзе выганяць кароў. Стукаіць пад акно і гаворыць: «Хадзяін (ці ходзяйка), разрышыця Вашу кароўку выгнуць на Ю'еву расу, на Нікольскую траву і благаславіце». А хадзяін атвечае: «Бог Вас благаславіць»... (Пастуху) давалі за гэта вугонныя: хлеб, сала, калбасу, яйца...»[11].

Мікольскае свята характарызавалася яшчэ маленнямі і прашэннямі да Багоў аб добрым ураджаі і дастатку. Сярод нешматлікіх рытуальных песень гэтага свята, што вядомы на Беларусі, адна з іх запісана ад Таццяны Прохараўны Макаравай, 1922 года нараджэння, з вёскі Станіславова:

А хвала табе, Божа,
Што Міколу даждалі.

Што Міколу даждалі
Свячу насукалі...

А радзі, Божа, авёс,
Да ну тонкай сцябліны.

А радзі, Божа, пшонку,
Да на белу праскурку.

А радзі, Божа, ячмень,
Ды на п'яныя піва.

А радзі, Божа, збожжа,
Каб жыць было можна![12]

Вянцом вясенняй абраднасці была Тройца, якая адзначаецца на пяцідзесяты дзень пасля Вялікдня. Свята звязана з ушанаваннем Багоў і Духаў расліннасці. Амаль увесь траечны тыдзень ці, як яго яшчэ называюць на Дубровеншчыне — Крывы тыдзень, суправаджаўся ў жыцці чалавека пэўнымі рытуаламі — маленнямі Багам, асвячэннем рознай расліннасці, упрыгожваннем хаты і падворка галінкамі клёну, бярозы, ліпы, ясеню і інш., што атрымала ў народзе назву «вешаць май».

Гэты ж тыдзень вядомы таксама як русальны. Лічылі, што менавіта ў гэтыя дні выходзяць да людзей і бавяцца русалкі. Пад русалкамі наш народ разумее душы тапельцаў, якія памерлі нехрышчонымі, а таксама загінуўшых на русальным тыдні.

На Тройцу дзяўчаты хадзілі куміцца. Звычай заключаўся ў тым, што на першы ці другі траечны дзень пасля абуде моладзь ішла ў лес, дзе звязвалі вяршыні дзвюх бярозак, вакол якіх наладжвалі гулянне. Нярэдка да дзяўчат прымыкалі і хлопцы. Разбіўшыся на пары, моладзь праходзіла з песнямі паміж гэтымі бярозкамі. Такія бярозкі мелі парогавае значэнне, бо кожны, хто прайшоў між імі, лічыўся кумам ці кумою свайму напарніку, затым такая пара павінна была зацвердзіць сваё кумаўство пацалункам.

Пасля абраду кумлення нярэдка каля бярозак смажылі яешню, да якой прыносілі з дому бліны, гарэлку і іншыя стравы. Рабілі агульны стол і частаваліся.

Сэнс такога абраду заключае ў сабе найбольш старажытныя гульнёвыя элементы з русалкамі. Кумленне праводзілася ў першую чаргу дзеля русалак. Як

адзначае Д. К. Зяленін: «Кумаўство... з русалкамі працягваецца тры дні. ...Такі кароткачасовы саюз заключаецца з канкрэтнай мэтай, а менавіта: а) каб даведацца ў русалак пра свой лёс; вяночак, на якім пакачалася кума-русалка, кідаюць у ваду і па тым, усплыве ён ці патоне, прадказваюць будучае; б) каб даставіць русалцы забаву, звязаную з эратычным кумаўствам, ці ўвогуле, каб яе заспакоіць і задаволіць, «дабы» яна ў будучым не помсціла чалавеку, а дапамагала»[13].

У панядзелак на наступным тыдні зранку дзяўчаты спяшаліся ў лес паглядзець свае вяночкі: завяўшы вяночак прадказваў няшчасце, а зялёны і свежы — спаўненне жаданняў. Гэтыя ж вяночкі пускалі на ваду і калі яны плылі, азначала таксама спаўненне загаданага, а калі вяночак патанаў, гэта быў нядобры знак.

Цікава праходзіў на Дубровеншчыне і абрад Провадаў русалкі, які тут мае назву Розгары. У панядзелак пасля траечнага тыдня паабедаўшы, мужчыны топяць лазню. Мыюцца ж у ёй толькі жанчыны. Памыўшыся, апранаюцца ў святочнае адзенне і ідуць да жытняга поля, дзе разаслаўшы абрус на траве, раскладваюць пачастункі, што прыносяць з сабою і наладжваюць своеасаблівае гулянне. Зразумела, што па ўяўленнях рытуальніц, на такім застоллі павінна была прысутнічаць і русалка. «Калі гулялі на лугу, жанчыны абдымаліся і качаліся ў жыце, каб не было пустазелля, штоб добра жыта каласілася»[14].

Пагуляўшы і паспяваўшы песні, удзельніцы абрада звівалі вянок з крапівы, які надзявалі адной з жанчын на галаву і разам з ёю ішлі ў вёску. Па дарозе лавілі мужчын і прымушалі такога небараку пацалавацца з жанчынай у вянку з крапівы. Зразумела, каб не абстрыкацца, той павінен быў адкупіцца грашыма ці пачастункам («даць выкуп»). Заканчваецца ж гулянне вечарынкай у адной з хат[15].

Няма сумнення, што ў больш даўнія часы ў падобным абрадзе ўдзельнічалі дзяўчаткі дашлюбнага ўзросту. Гулянне каля жыта было развітаннем з русалкамі, якіх звычайна і выводзілі ў жыта альбо на могілкі. Жанчына ж у вянку з крапівы, відаць, выконвала ролю жрыцы, якая пасля развітання з русалкамі здольна была засцерагаць і ахоўваць удзельнікаў рытуала ад рознай «нечысці», у тым ліку і ад русалкі, якая, пасля развітання з ёю, пераходзіла за зямную мяжу жыцця і магла быць шкоднай чалавеку.

Траечная абраднасць заканчвала ў народным жыцці вясенні песенны цыкл.

ЛЕТНІЯ І ІНШЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ ГОДА

Абрадавы комплекс летняга часу вызначаецца больш вузка ў народным жыцці, а менавіта, Купаллем, да якога блізка прымыкае Пятроўка, і жніўнай абраднасцю. Гэтага нельга сказаць пра песенную творчасць летняга часу, якая суправаджала шматгаліновую дзейнасць чалавека і яго штодзённае жыццё: песні баравыя, на сенажаці, што спявалі ў полі і г. д.

Купалле (7 ліпеня) 22 язычніцкае свята, якое адзначаецца ў гонар летняга сонцастаяння і росквіту прыроды. У хрысціянскай рэлігіі на гэты дзень прыпадае нараджэнне Івана Хрысціцеля, але яно не набыло таго рэзанансу ў народным жыцці, які маюць да нашых дзён купальскія традыцыі.

Святкаванне Купалля пачынаецца вечарам 6 ліпеня. На «крыжовыя дарогі» за вёску зносілі май, якім упрыгожвалі на Тройцу хаты. Хлопцы прыносілі туды ж раз'езджанае, добрапрамасленае кола з калёс, якое замацоўвалі на шасту і, падняўшы ўверх, закопвалі шост у зямлю. Дзяўчаты з захадам сонца хадзілі ў жыта збіраць кветкі: васількі, рамонкі, браткі, любісцік, гарошак і іншыя, з якіх вілі вянкі.

З надыходам змроку запальвалі кола, якое сімвалізавала сабой сонца. Практычна ў гонар сонца, «макушкі лета» і цяпла праводзіліся купальскія абрадавыя ўрачыстасці. Да вогнішча збіралася ўся вёска. Моладзь вадзіла вакол агня карагоды, спявала песні, танцавала.

Купальская ноч, па вераваннях нашых продкаў, уяўляла сабой час разгулу розных сіл прыроды, добрых і варожых чалавеку Духаў. Таму вечарам 6 ліпеня рабілі розныя засцярогі ад ведзьмаў, каб тыя не зрабілі заломы ў жыце, не шкодзілі жывёле і інш. Напрыклад, каб ведзьма не прабралася ў хлеў да жывёлы, вечарам перад Іванам Купалам, як расказваюць жыхары вёскі Панізоўе, «...рвём крапівы і дзед калючы і торкаем яго каля клямкі, пад нагамі, штобы ведзьма не прашла. ...Наложым етого ўсяго, штоб яна пакалолася»[16].

Актыўна праявілася ў дубровенскай моладзі традыцыя купальскіх гаданняў. Як вядома, каля кожнай вёскі былі палі мясцовых сялян. Дык вось на раёне з даўніх часоў бытуе павер'е: з колькіх палёў дзяўчына заўе ў свой купальскі вянок кветкі, са столькіх вёсак да яе будуць заляцацца жаніхі,ў. Часам замест кветак «...сабіралі жыта з каждага поля, з каждай дзярэўні стараліся, каб хлопцы з чужых дзеравень да нас прыходзілі гуляць»[17].

З усходам сонца дзяўчаты і хлопцы, як і ў траечных гаданнях, пускалі свае вянкі на ваду. Цікава апавядаюць пра гэта дубровенскія бабулькі — колішнія прыгажуні: «У нас была сажалка вырыта, там пускалі вянкі. У каторы бок вянок паплывець — у той бок і замуж дзеўка пойдзець. Як патонець вянок, значыць памрэць і замуж не пойдзець. Хлопцы вілі з дзеўкамі вянкі, калі дружылі. Дружым, а ці пажэнімся? Калі вянкі разам плывуць, тады пажэнімся, а не — дык урозь тады астанешся»[18].

Шмат бытуе да сёння ў Дубровенскім рэгіёне купальскіх песень, якія маюць цікавыя варыянты да агульнавядомай купальскай паэзіі «На Йвана Купала...», «Сягоння Купала, заўтра Ян...», «Купаленька, ноч маленька...», «Ішло Купала сялом...»[19] і многія іншыя. Мясцовыя варыянты купальскіх песень заслугоўваюць у першую чаргу ўвагі тым, што яны адлюстроўваюць у бесперапынным працэсе навацый вуснапаэтычнай творчасці тыпы інварыянтаў і лакальныя асаблівасці народнай песеннай спадчыны Дубровенскага краю. Канкрэтным пацверджаннем такому вываду можа быць купальская песня «А ў Дуброўне на рыначку...»:

А ў Дуброўне на рыначку
П'юць казакі гарэлачку.
— Шынкарычка малада,
Падай піва і віна.
— А я піва не падам,
А скінь жа мне свой жупан.
— На што табе мой жупан,
У мяне ёсць грошай жбан.
— Калі ў цябе грошай жбан
Я за цябе дачку аддам.
У суботу сказалі,
А ў скрысення звінчалі.
А ў скрысення звінчалі,
У камору спаць паклалі.
Пытаецца хлапчына:
— Якога роду, дзяўчына?..[20]

(в. Станіславова)

Далей у песні апавядаецца пра тое, што ў час размовы маладыя даведаліся, што яны брат і сястра. Але паколькі іх «звінчалі», што пярэчыла законам продкаў, яны пайшлі «у лясок», дзе «скінулісь травою, як брахнейка з сястрою...». І хоць сюжэт гэтай баладнай купальскай песні добра вядомы на Беларусі, але не менш арыгінальны ў сваёй рэдакцыі і распрацоўцы сюжэта і дубровенскі варыянт.

З летніх песень найбольш вядомыя на Дубровеншчыне баравыя, што спявалі, калі збіралі ў лесе грыбы і ягады. Яны распавядаюць аб адносінах маладых людзей, аб каханні, вернасці, няшчырасці ва ўзаемаадносінах і, зразумела ж, аб будучых вяселлях, што заўсёды хвалявала сэрца маладых.

Жніво пачынала летне-асеннія працы, звязаныя з уборкай ураджаю. Гэта быў час, які падсумоўваў вынікі сялянскага працоўнага года. Новы хлеб даваў і новы

віток жыцця чалавеку. Бо чым шчадравала жнівеньская ніва гаспадара, тым ён і мусіў жыць ад ураджаю да ўраджаю, альбо, як слушна заўважылі ў народзе, «ад хлеба да хлеба». Таму і людская павага да новага хлеба была вельмі вялікая.

На Дубровеншчыне ў большасці мясцовасцей жніво пачыналася ад Ільі (2 жніўня), што зафіксавана і ў мясцовай прымаўцы: «На Ілью хлеба малю, а на Барыса (6 жніўня) — еш, хоць распрысся»[21].

Перш чым выйсці на поле, каб зажаць першы сноп, чыста вымывалі ў хаце, пяклі каравай і рабілі рытуальны стол у падзяку Багам «за багаты ўраджай». «Што Бог даў, за тое і дзякуй», — гавораць мясцовыя сяляне. Памаліўшыся «Багам і святым святцам» і прыняўшы рытуальную трапезу, пасля абеда з кожнай сям'і адна з жанчын, «убраўшыся» у святочнае адзенне ішла «зажынаць сваю палоску». Звычайна такую справу давяралі жанчыне, якая была «больш лёгкая на руку». Як тлумачаць дубровенскія сяляне, гэта рабілася для таго, «...штобы рукі не балелі і, штоб спіна не ламіла ў жніво»[22]. У час зажынак нажыналі сноп жыта, які прыносілі да дому і ставілі на куце пад абразамі.

Пачынаючы з раніцы наступнага дня жнівеньская пара вызначалася самаадданай руплівай сялянскай працай. І толькі песні жнеек, што разлівaліся голасна над усім жытнёвым полем, ёмка ўкладаліся ў гэты працоўны рытм.

Завяршалася жніво абрадам дажынак. Пакінуўшы на полі некалькі сцяблінак з каласкамі, жанчыны абвязвалі іх чырвонай стужкаю ці поясам і, стаўшы ў круг, спявалі, прытанцоўваючы, жніўныя карагодныя песні.

У гэтым рытуале закладзены старажытны магічны сэнс. Нязжатыя каласкі, а нярэдка да іх прыносілі і пакідалі каравай, выпечаны з новага хлеба, хутчэй за ўсё былі ахвярай Духу поля. Як зазначае вядомы даследчык жніўнай паэзіі А. С. Ліс: «Паводле міфалагічных уяўленняў старажытнага чалавека, збіраючы ўраджай, дажынаючы ніву, трэба было прыняць магічныя захады для захавання ўрадлівасці поля на будучы год».

У дажынкавых абрадах Дубровенскага краю актыўна бытаваў звычай падносіць апошні зжаты сноп, альбо вянок, завіты з апошніх каласкоў, пану ці, як гэта практыкавалася ў савецкі час, старшыні калгаса. Падзёншчыцы ці, пазней, група жанчын, што дажыналі поле, апошні сноп абвязвалі поясам і ўпрыгожвалі кветкамі. Падыходзячы да гаспадара, яны прытанцоўвалі і спявалі:

А ў нас сягоння абжыначкі,
Дай, Стахванька, нам гарэлачкі,
А мы жнеечкі ня гордыя,
Вып'ем гарэлачкі мы горкія[24].

(в. Лядцы)

Гаспадар запрашаў «жнеек» за стол, за якім шчодра частаваў іх і дзякаваў за зробленую справу.

Выразна праявіліся ў народным каляндары Дубровеншчыны і піліпаўскія вечарынкі. Вечарамі жанчыны, моладзь збіраліся ў адной з хат, дзе апрацоўвалі лён: пралі кудзелю, сукалі ніткі, фарбавалі іх. З даўніх часоў падобная праца набыла ў беларусаў калектыўны характар. Нярэдка ў такую кампанію прыходзіў і мясцовы музыка. Таму падобныя зборы-вечарынкі звычайна заканчваліся танцамі, песнямі, жартамі, да якіх вельмі ахвоча была моладзь. У маладзёжным асяродку нават змест піліпаўскіх песень набываў жартаўлівы характар:

Праду, праду, ды кудзеліцу,
А галоўка баліць.
Як кіну я ды кудзеліцу
Усю й пад караваць.
А сама пайду маладзюсенька
Ў карчомку гуляць...[25]

(в. Станіславова)

Старэйшыя людзі больш прытрымліваліся ў гэты час традыцый хрысціянскага перадкаляднага посту.

СЯМЕЙНАЯ АБРАДНАСЦЬ

Цесна звязаны сваімі генетычнымі каранямі з каляндарнай абраднасцю і сямейныя абрады і звычаі. Калі Каляды, Масленка, Гуканне вясны, Вялікдзень і іншыя каляндарныя святы суправаджалі асноўныя рытмы земляробчай і гаспадарчай дзейнасці чалавека, то акцэнт сямейнай абраднасці быў скіраваны на важнейшыя вехі ў яго асабістым і сямейным жыцці: нараджэнне дзіцяці, стварэнне новай сям'і, провады хлопца у войска, развітанне з нябожчыкам і некаторыя іншыя.

РАДЗІННЫЯ РЫТУАЛЬНЫЯ ЗВЫЧАІ І ВЕРАВАННІ

У кожнай вёсачцы ў адносінах да цяжарнай маці, калі яна яшчэ толькі выношвала ў сабе плод будучага дзіцяці, бытавалі шматлікія вераванні — забароны. Такая жанчына карысталася асаблівым статусам у сваім родава-сацыяльным калектыве: да яе абавязкова ставіліся з павагай, імкнуліся ні ў чым не адказваць, нават голас павысіць на яе забаранялася. Падобныя адносіны да будучай маці былі не выпадковымі — уся ўвага скіроўвалася на тое, каб дзіцятка нарадзілася «лёгка і здаровенькім».

Яшяэ больш забарон адносілася да самой зацяжаранай жанчыны:

— нельга ваду пераліваць праз парог, бо народзіцца нежывое дзіця;

— нельга, калі палошчыш на рэчцы бялізну, выкручваць яе, бо ў дзіцяткі пупавіна абаўецца вакол шыі;

— нельга ні з кім сварыцца, бо дзіця так будзе лаяцца з маці, калі вырасце;

— нельга пляваць на чалавека ці яму ўслед, бо ў дзіцяці «абязацельна будзець іза рта ісці падліна, цяжолы дух»;

— «нельзя лгаць, патаму што ребёнок будзіт красць всегда, будзіт лют і злодзей»[26].

Такія забароны «бяременнай жанчіне» бытуюць у вёсцы Баева. Але амаль у кожным населеным пункце Дубровеншчыны можна запісаць не адзін дзесятак і іншых, якія жорстка рэгламентавалі паводзіны цяжарнай жанчыны. Гэтыя правілы перадаваліся з пакалення ў пакаленне, як законы продкаў, адступленне ад якіх магло пагражаць непапраўнай бядой чалавеку.

У кожнай дубровенскай вёсцы яшчэ да нядаўняга часу была бабулька, якая прымала роды. Такая бабулька ведала і рабіла шматлікія магічныя захады, каб аблегчыць пакуты маці пры родах, асабліва, калі роды былі цяжкія. У такім выпадку бабуля тройчы праводзіла рожаніцу ля кута пад абразамі. Калі гэта не дапамагала, «стол ставілі пасредзі хаты, ну і водзяць тры разы кругом стала»[27]. Часам рожаніцу тройчы праводзілі праз парог хаты (туды — назад). Падобныя дзеянні, як тлумачаць мясцовыя старажылы, дапамагалі хутчэй выклікаць схваткі ў маці, чым скарачалі час родаў. «Бабуля прынімаець роды. Патом содзяць бабулю за стол, частуюць. Ну вот бабуля выпіваіць, нясець рожэніцы палрюмкі... І яду, угасціць сваю рожэніцу»[28].

Калі ўжо роды распачаліся, у хату запрашалі і другую бабулю, «якая пуп абразае». Гэты момант зафіксаваны ў мясцовай песні, дзе даецца і функцыянальнае значэнне другой бабулі:

А па вуліцы мяцель мяцець,
А мой Грышачка за бабулькай ідзець.
А ён тростачкай упіраецца,
Бабулі ў ножкі пакланяецца:
— А, бабулечка, ты, галубачка,
Ой, хадзі ка мне ды і ў хатэчку,
Перабаб майго ты й дзіцятачку[29]

(в. Станіславова)

Праз дзень — два ў хату да жанчыны, якая нарадзіла, папярэдне змовіўшыся паміж сабою, збіраліся сваячкі і сяброўкі на радзіны. Кожная несла з сабою аладкі, бублікі, мачаныя ў варэнне, мёд ці смятану, пячэнне, абаранкі, цукеркі і іншыя прысмакі. Калектыўна грамадою рабілі «салодкі стол». З такога выпадку бацька народжанага дзіцяці частаваў жанчын настойкай, наліўкай і іншымі смачнымі гарэ-

лачнымі вырабамі. Гэта было чыста жаноцкае застолле. Мужчынам і дзяўчаткам дашлюбнага ўзросту прысутнічаць на ім не дазвалялася. Трэба зазначыць, што на працягу апошняга стагоддзя такое спрадвечнае табу было адхілена і на сённяшніх радзінах прысутнасць удзельнікаў не мае полавых ці ўзроставых абмежаванняў.

Старажытны сэнс абрада радзіны зразумелы: трэба было дапамагчы рожаніцы слушнай парадай, падзяліцца вопытам па догляду дзіцяці, а часам нават даць выказацца маці, «зняць з душы» той стрэсавы стан, які ўзнікаў у жанчыны ад уражанняў і болю ў час родаў.

Многа павучальных саветаў «парадзісе» заключылі ў сабе і радзінныя песні:

Пасярод двара ды й іванкавага,
А стаіць пяром да падрублены,
А ў том церамі да Іванычка,
Ён па цераму ды пахажываіць,
Ён Кулінушку ды пагуківаіць:
— Ты хадзі, хадзі, ды Кулінушка,
Ты хадзі, хадзі, ды Андрэеўна.
Буду цябе ўчыць, як падвор'е вадзіць,
Буду цябе ўчыць, як дзяцей гадаваць,
Буду цябе ўчыць, як цялятак дзяржаць,
Буду цябе ўчыць, як замчужку насіць.
Падвор'я вадзіць — не разіня рот хадзіць,
Дзяцей гадаваць — не санлівай быць,
Цялятак дзяржаць — не лянівай быць,
Замчужку насіць — а ўсё строгай быць,
Замчужку насіць — ды ні стаць-пабяжаць,
А стаць-пабяжаць ды замчужок цяраць[30].

(г. Дуброўна)

Дарэчы, гэта песня запісана яшчэ ў XIX ст. Паўлам Васілевічам Шэйнам, які асабіста рабіў запісы ў тагачасным мястэчку Дуброўна[31].

Працягам радзіннай абраднасці былі хрэсьбіны, у час якіх праводзіліся рытуалы, звязаныя з прыняцеем дзіцяці «у Божую веру» ці, як адзначае сучасная даследчыца сямейнай абраднасці Т. І. Кухаронак: «Правядзенне хрэсьбін з'яўляецца цэнтральным момантам той часткі комплексу радзіннай абраднасці, якая сімвалізавала ідэю прыняцця нованароджанага ў сям'ю і грамадства...»[32].

Кум, кума, бабуля — былі на хрсьбінах ганаровымі гасцямі. Менавіта яны і сядзелі на куце. Да іх была звернута ўся ўвага на застоллі. У шматлікіх хрэсьбіннных песнях, што спяваюць на Дубровеншчыне, бабулю і кумоў велічаюць добрымі словамі, у якіх выказваецца вялікая пашана да гэтых асоб: «А бабка на куце, як галубка на гняздзе...», «Ай кум на куце, як галубчык на гнязьдзе...»[33]. У радзіннай песні «А ў бару дуб'е» падобныя велічанні ўздымаюцца да гіпербалічнага пераасэнсавання:

А ў бару дуб'е
Ялаватае,
У Іванькі кум'е
Усё й багатае.
У бабулькі хвартух
Сто рублей стоіць,
А ў кумы саян
Усю й тысячу,
А ў кума штаны
І няма цаны[34].

(в. Ляды)

Падобныя велічанні кумоў і бабулі не былі выпадковасцю. Са старажытных часоў яны лічыліся выбранымі асобамі ад людзей да Бога змовіцца аб лёсе дзіцяці. Менавіта кум і кума ўносілі першы раз у Божы храм дзіця і прадстаўлялі яго святару для хрышчэння. Бабуля ж увогуле выступала ад сям'і, у якой нарадзілася дзіця, ахвяравальніцай — рыхтавала для Багоў рытуальную ежу (кашу), якую падавалі на застоллі. Незнарок, перад тым як разбіць гаршчок з бабінай кашай, у песні «А ў каго й вінаград на дварэ...», спяваюць:

...Ты гуляй ды, бабулька, у мяне,
Зьвелічай ды дзіцятка маё,
Каб яно ды шчасліва было,
Каб яму ды Бог долечку даў[35].

(в. Валькава)

ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ

Не менш важным момантам у жыцці чалавека, чым нараджэнне дзіцяці, было ўступленне маладых у шлюб. Вясельная абраднасць самая працяглая па часе і шматгранная па сваёй жанравай структуры. Сватанне, заручыны, зборная субота, выпяканне караваю, вяселле, перазовы — вось асноўныя звенні беларускай вясельнай абраднасці.

З даўніх часоў па заканчэнні палявых работ перад Пакровамі (14 кастрычніка) нашы продкі засылалі сватоў да дзяўчат. Згодна дубровенскай традыцыі, у сваты ехалі дзядзька, старэйшы брат будучага жаніха, бацька хросны, часам да іх далучаўся і родны бацька. У нядзелю, радзей у суботу, надвячоркам, сватняя дружына разам з жаніхом выязджала са двара. З сабой бралі хлеб, соль і гарэлку. Маці хлопца ўслед ад'язджаючым рабіла рукою знак крыжа, «каб Бог памагаў ім у задуманым дзеле».

Прыйшоўшы ў хату да дзяўчыны, віталіся і ўручалі яе бацькам хлеб-соль і бутэльку з гарэлкай. Гасцей запрашалі за стол, дзе размову вялі сваты, бацька і маці будучай нявесты. Маладыя ў такой бяседзе ўдзелу не прымалі. Толькі калі выпівалі сватнюю гарэлку і бацька дзяўчыны даваў згоду на яе выданне, ён ставіў на стол «жорава» — графін з гарэлкай — і клікаў «дзяцей на размову».

У гэты ж вечар склікалі ў хату блізкіх сваякоў як з роду дзяўчыны, так і з роду хлопца, на заручыны, і дамаўляліся аб дні вяселля, пасадзе, колькасці ўдзельнікаў будучай «свадзьбы» і г. д.

Напярэдадні вяселля ў суботу да дзяўчыны «збіраліся яе сяброўкі» на развітальны вечар, які ў мясцовай лексіцы атрымаў назву — субор:

Танечка субор сабрала,
Сабрала субор на ўвесь двор.
Пасадзіла падружак усіх за стол,
А сыма села вышэй усех,
Скланіла галоўку ніжэй усех...[36]

(в. Панізоўе)

Дзяўчыну-нявесту садзілі на дзяжу, у якой месяць хлеб, каб яе жыццёбыло багатым і пышным, падобна таму, як хлеб падыходзіць у дзяжы.

Сяброўкі «шылі ёй вяночак», першы раз апраналі нявесту ў вясельнае плацце, вадзілі вакол яе карагоды, спявалі песні.

Значная ўвага ў зборную суботу была звернута на дзявочую касу, якая ўвасабляла дзявоцкую прыгажосць і сведчыла пра яе сацыяльны (грамадскі) статус. Традыцыйна ў беларусаў пасля першай шлюбнай ночы, калі дзяўчына станавілася жанчынай ці, дакладней, пераходзіла ў новую ўзроставую групу, заплятаць касу ёй больш не дазвалялася. «Каса — дзявоцкая краса», — спрадвечна гавораць у нашым краі. Таму і завітанне з «касіцаю» адзін з галоўных сюжэтаў у песнях «субору»:

Касіца мая русая,
Ці не дзень я цябе часала.
...За адну ж капеечку прадала,
За адну нядзелечку прапіла[37].

У гшэты ж вечар у хату да маладой, як і да маладога, бліжэй да поўначы збіраліся каравайніцы — сёстры бацькоў і хросная маці, якая звычайна выконвала ролю галоўнай каравайніцы. За ноч перад вяселлем ім трэба было замясіць, аздобіць і выпекчы каравай.

Зранку наступнага дня ў нядзелю ў хату да маладога збіраліся сваякі, паджанішнік (старшы дружок), блізкія сябры, запрошаны музыка (гарманіст). Бацькі маладога рабілі для ўсіх агульнае застолле («трэба разам паснедаць»). Затым старшы дружок разам з моладдзю ўпрыгожваў збрую коней і павозкі, на якіх збіраліся ехаць да дзяўчыны: дугу абмотвалі рознакаляровымі стужкамі, прымацоўвалі да яе тры званочкі, у вазок насцілалі сена ці салому і пакрывалі посцілкамі.

Перад выездам са двара ўсю дружыну маладога, а менавіта так называлі з гэтага дня яго гасцей, бацькі запрашалі зайсці ў

хату. Садзілі ўсіх за стол, налівалі па чарцы гарэлкі. Маці і бацька падыходзілі да маладога і бласлаўлялі яго на добры шлях. Выпівалі стоячы і адразу выходзілі ў двор.

Выязджалі ў дарогу з песнямі і музыкай:

...Бяжы мой, кося, усё рыссю
Да на старыю граніцу,
Да на краснаю дзявіцу...[38]

(в. Баева)

У хату да маладой бліжэй да поўдня таксама збіраліся госці, каб сустрэць дружыну маладога. Дзяўчаты адводзілі нявесту ў якую-небудзь суседнюю хату, дзе апраналі маладой вянчальнае плацце, «прыбіралі яе».

Прыезд маладога сустракалі песнямі-дражнілкамі альбо жартоўнага зместу:

Спазніўся, Сашачка, спазніўся,
Пакуля ў бані памыўся,
...На сваю Наташу забыўся[39].

(в. Баева)

Жаніх павінен быў адшукаць сваю «княгіню», а адшукаўшы — выкупіць, бо дзяўчаты проста так не аддавалі сяброўку-нявесту. Актыўна дапамагаў яму ў гэтым і паджанішнік. Як сведчаць жыхары вёскі Баева: «Ну малады прыехаў, разыскаў, дзе нявеста. ...Дзеўкі таргуюцца, каторыя прыбіралі яе: ставяць стол у парога, у дзвярэй, ...штобы яны ўжо не прайшлі. Ну, яны (У. С. — дружына маладога) там і канфет, і бутылку шампанскага ставяць, гэтага ім яшчэ мала. Значыць яны яшчэ таргуюцца. І вот на чатыры рога стала ставяць ужо бутылкі, ... канфет пасредзі стала паложуць, тады яны ...прыбіраюць еты стол і ён — жаніх нявесту знаходзіць»[40].

На заканчэнне першага застолля бацькі бласлаўлялі маладых ехаць да вянца. Праводзячы «дзяцей» з хаты у двор, маці «абсявала іх услед жытам на добрую долю». Прашэннямі аб добрай долі прасякнуты ў гэты час і песенныя матывы: «А хадзі, Божухна, у хату, (Нясі долю сіраце Манечцы...», «Манечка да вянца едзе, (Яе доля ўперад ідзе...» і г. д.

Пасля вянчання маладыя вярталіся зноў да маладой. Сустракалі іх бацька і маці з хлебам-соллю.

У варотах, што выходзілі на вуліцу, ставілі стол, на які клалі круглы хлеб, соль і ставілі бутэльку гарэлкі. Як толькі «вясельны поезд» пад'язджаў к двару госці песняю давалі знак бацькам:

Запалі, матка, свечку
Выйдзі на сустрэчку,
Сустракаць свайго чада
Первыго нараждзёныга,
А другога ды суджоныга...[41]

(в. Баева)

Марыя Парфенаўна Парфененка з вёскі Чубакова так апісвае гэты момант «Ацец з мацер'ю пераварочваюць абыкваненныя шубы і адзяваюць іх на сябе. Так устрачаюць... Наліваюць выпіць маладым і хлеб даюць укусіць. Жаніх і нявеста панямножку выпіваюць і назад выліваюць... А тады брасаюць румкі, штоб пабіліся для шчасця. А патом прыглашаюць іх у хату»[42].

Першы дзень вяселля заканчваўся ад'ездам маладых у хату жаніха. У вясельных песнях, што суправаджалі іх ад'езд перадаюцца крыху сумныя ноты расставання маладой з бацькоўскай хатай і яе сям'ёю:

Ці ня конь капытом зызваніў,
Брахненька сястрыцу прывадзіў:
— Едзь, мая сястрыца, здарова,
Прыбывай у госці ўзнова...

На другі дзень вяселля ў панядзелак над маладой праводзілі розныя розыгрышы, якія падкрэслівалі, што з гэтага дня яна стала данчынаю, жонкай мужа і нявесткай у яго сям'і. Напрыклад, у вёсках Баева і Валькава, як расказвае Лідзія Міхайлаўна Сычова, «раніцай», як маладая яшчэ спіць, у тую хату заходзім, дроў нясём, печ затапліваем і, хто бліны калоціць, а хто мусару бросая. Нявестка

устаёць, у хаце гразна — нада месці. Нявеста мяцець... Тады ўжо хто-та памагае. А яна ходзіць і дзеньгі брасаяць... у мусар, як плаціць»[43].

Падобныразыгрыш мае па свайму зместу працяг. Справа ў тым, што на Дубровеншчыне бытаваў звычай, каб нявеста да пачатку вясельнага застолля напякла бліноў і накарміла імі сваю і жаніхову радзіну: «Назаўтрага маць сабіраіць гасцей, радню, саседзяў, запрагаюць коней і едуць ужо да нявесты, адведываюць нявестку. Маць вязець салхветкі, набожнікі і ўваходзіць сама первая ў хату і хасцілаіць сталы, абвешываіць іконы палаценкамі-набожнікамі. Ну, патом прыходзяць з іхняй дзярэўні, аткуда маладуха прыехала, на бліны. Нявеста далжна ў свякрухі напекчы ўсім бліноў»[44].

Паспытаўшы бліноў, нявестку таксама пасылалі за вадой: «Нявесце даюць два вядры на карамысле... абвязваюць ручнікамі вёдры і нявеста нясець ваду да самага парога». Каля калодзежа ці крыніцы, адкуль бралі ваду, «шуткавалі», абліваючы адзін аднаго вадою[45].

У нашых продкаў надавалася вялікая ўвага цнатлівасці дзяўчыны, яе непарочнасці да першай шлюбнай ночы. Для бацькоў і сваякоў маладой гэта была справа гонару за сваю нявесту. Таму, калі па прыезду радзіны маладой да жаніха, маці маладога дзякавала бацькоў дзяўчыны за непарочнасць нявесткі і «добрае гадаванейка», яе радзіна спявала:

Добры нашы марозы
Не змарозілі нам рожы:
Пусцілі квеці па клеці,
В зялёны лісток пад масток,
А чырвоную рожаньку ды на падалок,
Не то ж нам чэсна, што на рукаве,
А то нам чэсна, што на падале[46].

(г. Дуброўна)

Заканчвалася дубровенскае вяселле пераазовамі, якія, пачынаючы з аўторка, працягваліся з тыдзень, а то і два. Звычай «перазоў» паходзіць яшчэ з традыцый родавай абшчыны і сёння вызначаецца тым, што сваякі маладой наведвалі сем'і з роду маладога і наадварот. Парадніўшыся з чужым родам, стаўшы сваякамі паміж сабою, трэба было ведаць, хто як і дзе жыве, чым займаецца, на каго і на якую дапамогу і падтрымку ў патрэбны момант можна разлічваць.

Дубровенскае вяселле — гэта шматграннае тэатралізаванае прадстаўленне з глыбока сакральным зместам. Яно вызначаецца высокаідэйнай паэтыкай, мелодыкай, рытмікай, своеасаблівымі мастацкімі сродкамі стварэння вобразаў. Зразумела, што ў кароткім артыкуле немагчыма перадаць усе вясельныя дзеі, апісаць фальклорныя жанры, вераванні, забароны, выслоўі і г. д., таму асноўны акцэнт мы зрабілі толькі на найбольш важныя і актыўна бытуючыя сёння на Дубровеншчыне вясельныя рытуалы і суправаджаючы іх фальклор.

ПРАВАДЫ Ў ВОЙСКА

Абрад провадаў у войска мае значна пазнейшае паходжанне ў параўнанні з іншымі сямейнымі абрадамі. На Беларусі ён узнік прыкладна на рубяжы XVIII—XIX ст. пасля таго, як землі беларусаў далучылі да Расіі, дзе на гэты момант была ўведзена і дзейнічала «рэкрутская повинность». Першы рекруцкі набор на Беларусі праводзіўся ў 1794 г. пераважна з усходняй яе часткі, якую складалі Віцебская, Смаленская і Магілёўская губерні. У складзе апошніх была і тэрыторыя сучаснага Дубровенскага раёна.

Зразумела, што кожная сям'я, выпраўляючы сына, брата ці нават мужа на небяспечную ваенную службу. імкнулася ўсімі сродкамі паўплываць на яго захаванне і паспрыяць, каб ён жывым і здаровым вярнуўся да роднага парога.

Непасрэдна за дзень да адпраўлення прызыўніка на зборны пункт бацькі рабілі яму вечар провадажў, які ўяўляў сабой рытуальнае застолле.

Заканчваўся вечар провадаў звычайна вячоркамі, на якіх спявалі, танцавалі, весяліліся.

Ярка выражаных песень, прымеркаваных да гэтага абрада на Дубровеншчыне не адзначана. Але ў песнях, што спяваюць на такіх вечарах, вылучаецца пераважна салдацкая тэматыка. Для «праводных вечароў« тут характэрны песні «Паследні нонешні дзнёчак...», «Ехалі салдаты са службы дамоў...», «Вот поезд мчыцца, тарапіцца...», а таксама адпаведныя аўтарскія песні.

ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ

Смерць чалавека ва ўяўленнях нашых продкаў заўсёды была мяжой паміж яго зямным і пасмяротным існаваннем, мяжой, якая падзяляла свет на дзве часткі — «белы свет», у якім кожны з нас пражывае сваё свядомае, зямное жыццё, і «той свет», які ўзнік як адлюстраванне замагільнага чалавечага быцця.

Традыцыйна на Дубровеншчыне «хароняць» чалавека на трэці дзень. Падрабязнае апісанне мясцовага пахавальнага араду зрабіў у XIX ст. ў Святошыцкай воласці настаўнік народнага вучылішча М. Ф. Нікалаевіч: «Пакладзенаму ў труну свяшчэннік чытае адпугчальную малітву, напісаную на аркушы паперы, пасля прачытання якой аркуш даюць у рукі памёршаму. Затым труну выносяць з хаты так, каб ногі нябожчыка былі наперад, супраць дзвярэй. Летам труну ставяць на воз, а зімой на сані і вязуць на могільнік. У вёсках Гараны, Бахава, Чырына, Пуцяціна, Быстрыёўка, Пневічы, Барсукі і Бяскі нябожчыкаў носяць. У час шэсця пахавальнай працэсіі свяшчэннік служыць «провад». ...Прыбыўшы на могільнік родныя, браты, сёстры і знаёмыя старэйшыя цалуюць нябожчыка ў лоб, шчаку і вусны, а дзеці, унукі і знаёмыя малодшага ўзросту цалуюць толькі ў руку. У гэты час галашэнні ўзнаўляюцца з новай сілай. Па заканчэнні развітальнага абраду труну закрываюць векам, апускаюць на вяроўках у магілу і, паставіўшы яе там, вяроўкі выцягваюць наверх. Тады свяшчэннік робіць лапатаю па баках магілы крыжы і затым кідае тры разы ў магілу па жмені зямлі. Яго прыклад паўтараюць усе прысутныя. Пасля гэтага пахавальная працэсія накіроўваецца ў зваротны шлях, а труну закопваюць тыя ж людзі, што капалі магілу. Хаваюць звычайна нагамі на ўсход. У вёсках Пішчыкі, Пасуддзева, Гудава, Барадзіно, Карабанавічы, Кляны, Дабрынь, Цыбульскія і Радзякі прысутныя пры пахаванні кідаюць у магілу грошы, пярсцёнкі і г. д., калі ж у іх нічога няма пры сабе, то частку адзежы, напрыклад, хусткі, шарфы, паясы і інш. На пытанне мае: «Чаму гэта так робіцца?» — я атрымліваў звычайны ў такіх выпадках адказ: «Так дзелалі нашы дзяды і атцы, так і мы дзелаім»[47].

Родныя запрашалі ўсіх, хто прымаў удзел у пахаванні да сябе ў хату на памінальны стол, які тут называюць «хаўтуры».

Ад пачатку і да канца пахавальны абрад суправаджаўся галашэннямі. Гора, смутак і любоў да памёршага ў гэтых песнях-некралогах дасягае высокага мастацкага і эмацыянальнага рэзанансу:

Мая ж ты матулечка,
К каму ж я цяпер прыйду?
З кім я парадуюсь?
Хто ж мяне цяперанькі вернае слова
скажаць?
Мая ж ты матулечка!
Цяпер жа і дарожкі пазарастуць,
Якімі я к табе хадзіла,
Да мяне цяпер ніхто і абедаць не дасць,
А хто ж цяпер сустрэнець?
Да хто ж маіх дзетухнаў панянчыць?[48]

(в. Сваташыцы)

Згодна мясцовага веравання, калі па нябожчыку галосяць, то ён атрымлівае «адпушчэнне грахоў на тым свеце...».

Таму, калі здаралася, што ў чалавека не было родных, «па ім плача абыякая спагадлівая старэнькая з прычытваннем»[49].

Да пахавальнай абраднасці дубровенцаў цесна прымыкаюць па свайму ідэйнаму зместу памінальныя дні першага года пасля смерці: сарачыны, паўгодкі і штогадовыя дні памінання продкаў: Радаўніца, траечныя і змітраўскія дзяды.

* * *

На Дубровеншчыне вельмі часта можна пачуць прыказку «Што ні дзярэўня — вера, што ні дом — толк». Так слушна ахарактарызавалі мясцовыя жыхары свае абрады, звычаі, павер'і, прывычкі — увогуле усё, што тычыцца ўкладу іх жыцця. І не толькі ахарактарызавалі, але свята верылі ў гэту «веру» і данеслі яе да сённяшняга дня ў спадчыну сваім дзецям і ўнукам, захавалі яе, як непаўторную і самабытную старонку ў нацыянальнай скарбонцы нашай агульнай культурнай спадчыны. Няхай жа ніколі не згасне Ваша спрадвечная вера, людзі Дубровенскага краю!

У. Сысоеў.

Крыніцы

[1] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэкст №40.

[2] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 3.

[3] Ліс А. С. Вясна. Земляробчы каляндар (абрады і звычаі). Мн., 1990. С. 41.

[4] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэкст №46.

[5] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэкст №46.

[6] Зеленин Д. К. Восточнославянская этнография. М., 1991. С. 380.

[7] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 7.

[8] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4. тэкст №24.

[9] Там жа, тэкст № 8.

[10] Замовы. / Уклад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1992. С. 78.

[11] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 11.

[12] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 12.

[13] Зеленин Д. К. Восточнославянская этнография. М., 1991. С. 394—395.

[14] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэкст №68.

[15] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэксты № 68, 69; там жа, сш. 4, тэкст № 27; там жа, воп. 94, спр. 280, сш. 1, тэкст № 1.

[16] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 1, тэкст № 41.

[17] Там жа, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст №13.

[18] Там жа.

[19] Купальскія і пятроўскія песні. / Уклад. А. С. Ліс і С. Т. Асташэвіч. Мн., 1985. Тэксты № 3, 67—69, 85, 108, 175, 57.

[20] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 14.

[21] Прыказкі і прымаўкі, кн. 1. / Уклад. М. Я. Грынблат. Мн., 1976. С. 107.

[22] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №35.

[23] АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 99, сш. 3, л. 32.

[24] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 21.

[25] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэксты №№14, 30.

[26] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №15.

[27] Там жа, сш. 1, тэкст № 38.

[28] Там жа, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3. тэкст №23.

[29] Радзінная паэзія. / Уклад. М. Я. Грынблат. М., 1971. С. 85.

[30] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1, ч. 1. СПб., 1887. С. 20.

[31] Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. Мн., 1993, С. 55.

[32] АІМЭФ, ф. 8, воп. 91, спр. 258-А, сш. 3, тэкст № 22; там жа, воп. 1, спр. 99, сш. 3, л. 34.

[33] Радзінная паэзія. / Уклад. М. Я. Грынблат. Мн., 1971. С. 234.

[34] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №28.

[35] Там жа, сш. 2, тэкст № 24.

[36] АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 99, сш. 3, л. 29.

[37] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №25.

[38] АІМЭФ, ф. 8, воп.92, спр. 265, сш. 3, л. 63.

[39] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №17.

[40] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст № 32.

[41] Там жа, воп. 91, спр. 258-А, сш. 4, тэкст №24.

[42] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №20.
[43] Там жа.
[44] АІМЭФ, ф. 8, воп. 92, спр. 265, сш. 4, тэкст №20.
[45] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1890. Т. 1, ч. 2. С. 327, № 3.
[46] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. / Уклад. У. А. Васілевіч. Мн., 1986. С. 131—132.
[47] Пахаванні. Памінкі. Галашэннію / Укоал. У. А. Васілевіч. М., 1986. С. 244, тэкст №115.
[48] Там жа. С. 133.

Як апраналіся ў Малым Бахаве і Краснай Горцы у 30-я гады

Красная Горка і Малое Бахава знаходзяцца км за 12 ад м. Дуброўны першая і каля 10 — другое. У Дуброўне ёсць ткацкая фабрыка. Красная Горка — пасёлак з былой вёскі Вялікага Бахава, заселены сялянамі. Малое Махава — невялікі засценак заселены шляхтай. Мястэчка зрабіла і робіць значны уплыў на ўвесь быт наогул, і адзежу прыватна гэтах абедзьвюх вёсак. Насельнікі Малога Бахава паддаліся гэтаму ўплыву ў непараўнальна большай ступені, чым насельнікі Краснай Горкі. Асабліва гэта можна сказаць пра адзежу бахаўскіх, якая, паміж іншым, спрадвеку пераймала гарадзкія формы адзежы са спазненьнем у модзе на год дзесяць. Разам з тым, гарадскому ўплыву больш паддалася сьвяточная адзежа, як бахаўскіх, так і краснагорскіх. Пры гэтым адзежа бахаўскіх у пэўнай меры ўспрыняла на сябе ўплыў ня толькі матар'ялаў, але і краю, у той час як у адзежы краснагорскіх гарадзкі крой пераймаецца непараўнальна павольней.

Галоўным матар'ялам для вырабу адзежы ў абедзьвюх вёсках зьяўляецца льняная тканіна — порт, суконная — сукно і мяшаная з суконных і парцяных нітак — шарачок. І порт, і сукно і шарачок бываюць або танейшымі або грубейшымі, ды аднакаляровымі або шматкаляровымі. З часьцей ужываных колераў трэба адзначыць шэры, чорны, сіні і чырвоны. Колер тканіны атрымліваецца ад ужываньня натуральных ці фарбаваных нітак пры тканьні, ці ад фарбаваньня ўжо гатовай тканіны. І аднакаляровая і шматкаляровая тканіны могуць быць гладкімі, без узору і ўзорыстымі, з пэўным орнаментам. Арнамент на ўзорыстай тканіне амаль выключна геометрычны, і толькі на пасьцілках ды вышыўках сустракаецца расьлінны. Гурток краязнаўства Дубровенскай сямігодкі сабраў колекцыю сялянскай тканіны раёну з самымі рознастайнымі ўзорамі; якія ёсьць і ў Краснай Горцы і ў Малым Бахаве. Для лепшага ўяўленьня прыводзім тутака дзьве фотографіі з часткі гэтай колекцыі, што зьмяшчаецца ў кольным музэі Дубровенскай сямігодкі. Усе адмены мясцовай тканіны выраблюцца самімі насельнікамі Краснай Горкі і Малога Бахава. Поле ўрабляюць і лён сеюць мужчыны. Лён рвуць, адбіваюць, мочаць ці сьцелюць, мнуць, трэплюць, прадуць ніткі, снуюць, ткуць і беляць жанчыны. Жанчыны-ж стрыгуць авец, скубуць, чэшуць і прадуць воўну, ды ткуць сукно. На шарачок ідзе аснова парцяная і ўток суконны. Сукно, а часта і шарачок валяць жанчыны, часамі з мужчынамі, дома. Радзей вязуць валіць у сукнавальню.

Шыюць бялізну, андаракі і д. т. п. таксама самі жанчыны дома. Кажухі, армякі і д. т. п. аддаюць шыць часьцей за ўсё тутэйшым краўцом-мужчынам, спэцыяльная падрыхтоўка якіх мала выперадзіла ўмецтва гаспадынь.

«Наш край», №3, 1930. С. 51—53.

Пра гаворкі Дубровеншчыны

Дубровенскія гворкі (па Дняпру яны дзеляцца на правабярэжныя і левабярэжныя) згодна сучаснаму дыялектнаму падзелу адносяцца да віцебска-магілёўскай групы паўночна-ўсходняга беларускага дыялекта (гл. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак. Мн., 1969, карты на стар. 72, 75). Па сваіх асаблівасцях на ўзроўні лексікі, фанетыкі і граматыкі яны істотна не адрозніваюцца як паміж сабой, так і ад сумежных акаляючых гаворак Віцебскай і Магілёўскай абласцей Беларусі, Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі, што перш за ўсе тлумачыцца адзінствам іх паходжання і шэрагам унутрымоўных і экстралінгвістычных фактараў. У генетычных адносінах гаворкі гэтага значнага па сваіх памерах дыялектнага арэала ўзыходзяць да племяннога дыялекту віцебскіх, полацкіх і смаленскіх крывічоў. У далейшым, трансфармаваўшыся ў тэрытарыяльныя, яны развіваліся пад уздзеяннем эканамічных, палітычных і культурных абставін, што складвался спачатку ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай, а затым пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў межах апошняй.

Як вядома, адной з найбольш істотных адразняльных рыс беларускай літаратурнай і дыялектнай мовы з'яўляецца аканне, сутнасць якога ў шырокім сэнсе зводзілася да неадрознівання галосных фанем няверхняга пад'ёму а, о, е, ў ненаціскных складах пасля цвёрдых і мяккіх зычных. Розныя тыпы яго, паводле меркаванняў некаторых даследчыкаў, хутчэй за ўсе, развіліся ўэпоху балта-славянскай супольнасці і як субстратная з'ява ўяўляюць сабой сляды (адбіткі) пераможанных моў балтыйскіх народнасцей у складзе перамогшай славянскай моўнай стыхіі.

Дубровенскім як і іншым (не толькі суседнім з імі) віцебскім, магілёўскім і смаленскім гаворкам уласціва дысімілятыўнае аканне. Гэта такая сістэма ненаціскнога вакалізма, калі пры націскным а ў першым складзе перад націскам на месцы этымалагічных о, а вымаўляецца гук у акустычных і артыкуляцыйных адносінах блізкі да аслабленага ы (асыка́, выда́, кыза́, кынза́, кыса́, ныга́, пчыла́, рыдня́, сысна́, сыха́, трыва́), тады як перад астатнімі націскнымі галоснымі ў гэтай пазіцыі гучыць а (асаку́, ваду́, казу́, казну́, касу́, нагу, пчалу, радню, сасну, траву; асако́й, вадо́й, казо́й, касо́й, нагó́й, пчало́й, раднёй, сасно́й, сахо́й, травó́й; асацэ́, вадзе́, казе́, касе́, казне́, назе́, пчале́, сасне́, сасе́, траве́).

Вымаўленне з рознага паходжання як гука рэдукаванага, набліжанага да ы, мае месца таксама пасля спрадвечна мяккіх, а затым з цягам часу ацвярдзеўшых, што фіксуецца ўжо помнікамі старославянскай пісьменнасці IXXI ст., шыпячых ж, ш, ч, і свісцячага ц (жена — жона — жана — жына, желна — жолна — жовна — жаўна — жыўна, жевать — жаваць — жываць, чесать — часаць — чысаць, шагать — шагаць — шыгаць, шептать — шаптаць — шыптаць, шабаш — шыбаш, цена — цане — цына) і інш.

Аднак калі пад націскам знаходзіцца любы галосны верхняга і сярэдняга пад'ёму ў першым пераднаціскным складзе і пасля вышэйпералічаных зацвярдзелых зычных а зноў-такі вымаўляецца як гук ніжняга пад'ёму сярэдняга раду поўнага ўтварэння (жану́, жауну́, цану́; жано́й, жауно́й, цано́й; жане́, жацне́, цане́; шаптун, Шажо́к, шапчу́, чашу́ і інш.).

Ненаціскны вакалізм гаворак адзначанага дыялектнага масіву характарызуецца, акрамя таго, наяўнасцю розных тыпаў дысімілятыўнага якання. Пры гэтым гаворкам Дубровеншчыны ўласціва дысімілятыўнае яканне беларускага або жыздрынскага тыпу, сутнасць якога зводзіцца да таго, што пасля мяккіх зычных галосны е рознага паходжання вымаўляецца як а (я) у першым пераднаціскным складзе толькі перад націскнымі галоснымі сярэдняга (е, о) і верхняга (а, ы, у) пад'ёму

(бяду́, вясну́, дзяжу́, зямлю́, пяту́, раку́, сястру́, страху́; бяды́, вясны́, дзяжы́, зямлі́, пяты́, рякі́, сястры́, сцяны́, стрялы́; бядо́й, вясно́й, дзяжо́й, зямлёй, пято́й, рако́й, сястро́й, сцяно́й, стряло́й; бядзе́, вясне́, дзяжэ́, пяце́, ряцэ́, сястре́, сцяне́, стрялі́ і г. д.). Калі ж а пад націскам, прынцып дысіміляцыі рэалізуецца ў тым, што ў першым пераднаціскным складзе вымаўляецца гук, блізкі да аслабленага і (бідá, Вісна́, зімля́, дзіжа́, рыка́, пітá, сістра́, сціна́, стріла́ і т. п.).

Выпадкі недысімілятыўнага акання, для якога характэрна вымаўленне ў першым пераднаціскным складзе галосных о, а як гука а рознай якасці незалежна ад таго, які галосны знаходзіцца пад націскам (асака́, вада́, каза́, каса́, нага́, пчала́, радня́, сасна́, саха́, трава́; асаку́, ваду́, казу́, касу́, нагу́, пчалу́, радню́, сасну́, саху́, траву́; асако́й, вадо́й, казо́й, касо́й, нагó́й, пчало́й, асано́й, сахо́й, травó́й; асацэ́, вадзе́, казе́, касе́, назе́, пчале́, сасне́, сасе́, траве́) назіраюцца пераважна ў мове малодшага пакалення і тлумачыцца нівеліроўкай традыцыйных сялянскіх гаворак, асабліва ў паслярэвалюцыйныя часы пад уплывам рускай і беларускай літаратурых моў, пашырэнню якіх у якасці сродкаў зносін, перадачы інфармацыі, ведаў навуковага і вытворчага вопыту актыўна садзейнічаюць школа, друк, радыё, а ў апошнія дзесяцігоддзі — тэлебачанне. Тое ж самае трэба сказаць і аб пашырэнні недысімілятыўнага якання, якое ў матэрыялах, сабраных для ўкладання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы (Мінск, 1963, гл. карты № 1, 4) адзначаецца спарадычна. Побач з бідá, вісна́, зімля́, дзіжа́, пітá, рыка́, сістра́, сціна́, стріла́ як і ў літаратурнай мове ў гэтай пазіцыі вымаўляецца а(я) незалежна ад таго, які галосны знаходзіцца пад націскам (бяда́, вясна́, зімля́, дзяжа́, пята́, сястра́, сцяна́, стрялá і т. д.).

У іншых пераднаціскных складах ступень рэдукцыі галосных а, о, е рознага паходжання павялічваецца па меры аддалення ад націску: у другім яна большая, чым у першым, а ў трэцім узрастае ў параўнанні з другім. Для перадачы на пісьме такіх аслабленых галосных гукаў побач з ы, і ўжываюцца літары ъ, ь (апошняя толькі для абазначэння аслабленага а): бірвяно́, ворябе́й, гълыва́, зыбіра́ць, клікыта́ць, лібіда́, мълыдня́к, пірякрёстык, пірямéнка, сірідá, стрікыта́ць, сыла́дзіць, тъпы́ра, цімныта́, ціплыта́, інцірісыва́цца, пытчарёвык, чірыспало́сіца, чірысядзе́льнік). Тое ж самае назіраецца і ў запазычаннях пазнейшых часоў (нігрітóска, фътыгра́фія, пірями́да).

У другім складзе перад націскам пераважна па суседству з губнымі зычнымі і ў (нескладовым) іншы раз на месцы о вымаўляецца у (вуучанёнык, гулубе́ц, кувале́ўна, пуиыга́ць, пупыла́м), скураспе́лка (сорт бульбы).

Вымаўленне галосных а, о, е рознага паходжання ў адкрытых і закрытых складах пасля націску істотна не адрозніваецца ад таго, як яны гучаць у пераднаціскных складах (во́лыс, ву́тычка, жа́вырънък, жа́урынък, за́рыснік, куро́сыдня, ма́чыхін, хо́лыдна і інш.). Аднак характар ненаціскнога вакалізму пасля націскных складоў пры дысімілятыўным аканні і яканні да пэўнай ступені абумоўлены не толькі рэдукцыяй як фанетычнай з'явай, але і шэрагам марфалагічных фактараў, а таксама апалогіяй, у сувязі з чым дэталёвае даследаванне і апісанне яго ў публікацыях, разлічаных на масавага чытача, уяўляецца немэтазгодным.

З асаблівасцей націскнога вакалізму заслугоўвае ўвагі вымаўленне о (ё) на месцы этымалагічнага е і е з ь (ерь) у моцным становішчы пасля мяккага і перад цвёрдым зычным, што назіраецца і ў ватворах пазнейшых часоў на месцы былога ѣ (яць); бярёза, вёска, дзёгыць, дзёрін, жóнка, зёрны, клён, кулямёт, лёд, лён, мёд, памёт, сымалёт, цёмны, цёпла, цётка, чóрт, чацвёртый, шóпыт, шóўк і інш.).

Сістэма зычных у гаворках апісваемага арэала (дубровенскіх у тым ліку) перш за ўсё вызначаецца такімі адметнымі асаблі-

васцямі, як пераходнае памякчэнне д, т у дз', ц' (так званае дзеканне і цеканне) перад галоснымі а(я), е і рознага паходжання нават пры наяўнасці паміж д і адзначанымі галоснымі білабіяльнага губнагубнага в (дзве́, дзве́сця, дзябёдый, дзяду́ля, дзве́ры, дзе́жка, дзе́ла, дзе́нь, дзярю́га, дзісна́, дзе́сіць, дзіва, дзі́кій, дзіля́нка, дзя́ціл, дзяці́ніцца, дзя́тліна; це́ла, це́мя, це́нь, це́рці, ціра́біць, цімныта́, ціплыта́, ці́снуць, ці́ха), адрозніванне ў вымаўленні цвёрдасці мяккасці р (го́рыд, гро́м, збро́дныя, збрадлівыя, работа́, ра́дыніца, ра́дый, ра́дысць, раздзе́тый, распу́снік, але ахвіце́рь, брюха́тыя, бярёза, бяре́знік, крича́ць, бряуно́, кря́каць, тхо́рь і інш.), пашыранасць пратэтычнага (прыстаўнога) в (вока́, вакно́, во́бласць, во́зера, во́сень, во́рса, во́уцы, ву́ліца, вучо́ба, вуха́, ву́пряж), а таксама ў тапонімах (Во́рша) і атрапонімах (Во́льга, Во́сіп, Вулля́на). З іншых асаблівасцей канканантызму варта адзначыць адсутнасць аглушэння звонкіх зычных перад глухімі (ска́зка, зыга́дка, но́жка, ло́жка, за́гвыздка, цітра́дка) і на канцы слова (го́рыд, го́луб, гу́ж, дзе́д, лу́г, плу́г, паро́г, сто́г, но́ж, гыра́ж, сяро́д), што характэрна для прымыкаючых да дубровенскіх суседніх магілёўскіх гаворак і не адзначаецца (гл. ДАБМ, карты 45, 46) у сумежных віцебскіх гаворках; падаўжэнне мяккіх зубных і цвёрдых шыпячых ж, ч, ш і свісцячага ц перад і (йод) у інтэрвакальным становішчы (бы́лля, галле́, ве́цее, суддзя́, каме́ння, пале́ння, пячэ́ння, ляче́ння, пало́ззя, суглі́ння, мыццё, шыццё). На месцы глухога губнога ф як гука спрадвечна неўласцівага славянскім мовам у гаворках раёна назіраецца вымаўленне спалучэння хв (хвартук, хво́та, хвына́рь, хва́бріка, хве́рма, Хвядо́т, Хвядуріха, Хвама́) або блізкіх да яго па артыкуляцыі гукаў х, п (ко́хта, штоб цябе пра́нцы ад фра́нцы, францу́зы).

З найбольш істотных адрозненняў на ўзроўні марфалогіі ў галіне скланяемых слоў належыць адзначаць націскныя канчаткі ы(і) у назоўным склоне множнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду з цвёрдай, мяккай і зацвярдзелай асновай (баки́, гады́, дубы́, жукі́, звяры́, кавалі́, кулакі́, лемяшы́, лугі́, мяшкі́, нажы́, плугі́, панажы́, стагі́, сталы́, стаўбы́, тыпары́, хутары́), нулявы канчатак роднага склону множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з цвёрдай асновай (даро́г, дачо́к, кыбыліц, мыладзіц, нібыліц, ру́к, ре́к, но́г, со́х, стре́х, сясцёр, ха́т), ненаціскны канчатак -ый (-ій) назоўнага склону адзіночнага ліку прыметнікаў мужчынскага роду (бага́тый, вялікій, до́брый, но́вый, п'я́ный, ро́дный, сізый, сіній, чо́рный, харо́шый) пры наяўнасці канчаткаў -эй (-ей) пад націскам (мыладэ́й, ліхе́й, удалэ́й), а таксама ў некаторых займеннікаў (е́тый, йіхній, але тэ́й, інэ́й) і парадкавых лічэбнікаў (пе́рвый, але другі́й).

Дзеяслоў як часціна мовы, найбольш ёмстая і развітая ў адносінах словазмянення, вызначаецца наяўнасцю шэрагу граматычных катэгорый і форм, якія ў гаворках вышэй названага рэгіёна не адрозніваюцца ад іх літаратурных адпаведнікаў. Для прыкладу можна спаслацца на форму будучага складанага часу тыпу буду рабіць, якая з'яўляючыся літаратурнай нормай супрацьпастаўляецца пашыраным на захадзе і поўдні Беларусі аналітычнай (маю рабіць) і сінтэтычнай (рабіцьму) формам будучага часу дзеясловаў незакончанага трывання. Аднак па асаблівасцях дзеяслоўнага словазмянення дубровенскія як і сумежныя з імі гаворкі характарызуюцца неўласцівымі для літаратурнай мовы націскным -эць і ненаціскным -іць (-ыць) канчаткамі 2-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў першага спражэння (ідзе́ць, бярэ́ць, нясе́ць; ка́жыць, ме́ліць, грэ́іць), ненаціскным канчаткам 3-й асобы множнага ліку -уць дзеясловаў другога спражэння (хо́дзіць, во́зюць, но́сюць, ко́рмюць).

Пэўную цікавасць уяўляе сабой форма 2-й асобы адзіночнага ліку хаціш ад рознаспрагаемага дзеяслова хаце́ць, афармленне і бытаванне якой, хутчэй за ўсё, абумоўлена падтрымкай з боку аналагічных па ўтварэнні і паходжанні форм 1-й і

2-й асобы множнага ліку (хоти́м, хоти́те) ад гэтага дзеяслова ў рускай мове.

Асобна трэба спыніцца на ваганні пры вызначэнні родавай прыналежнасці паасобных слоў. Так, апелятыў дзяцел — назоўнік мужчынскага роду, а слова дзяціль як кампанент тапоніма Вялікая Дзяцель несумненна адносіцца да жаночага роду, аб чым яскрава сведчаць дапасаваныя да яго прыметнікі вялі́кая, малы́я, мужы́чыя, зімя́нскыя. Не выключана магчымасць, што разглядаемае слова ў мясцовай гаворцы ўжывалася для абазначэння самкі дзятла або як назва пэўнага падвіда дзятлавых. Адначасна трэба зазначыць, што наяўнасць значных лясных масіваў абумовіла пашырэнне ў дубровенскіх і прымыкаючых непасрэдна да іх гаворках Аршанскага, Горацкага раёнаў выкарыстанне для абазначэння населеных месцаў назваў звяроў і птушак. Акрамя Вялікай Дзяцелі да ліку іх адносяцца Барсукі́, Ко́ршыкава (ад Ко́ршак), Сыва́, Ло́сіўка, Зубрі́, Казлы́, Пугляі́ (пугачы́, пуга́ч).

З асаблівасцей словаўтварэння як спецыфічную рысу варта адзначыць пераважна паралельнае бытаванне дзвюх назваў недарослыў істот, утвораных пры дапамозе суфіксаў -онак- (-ёнак), -анёнак- (-янёнак-) ад аднаго і таго ж кораня (дзяцёнак — дзіцянёнак, ваўчо́нык — выучанёнык, вуцёнык — вуцянёнык, казлёнык — казлянёнык, гусёнык — гусянёнык, кацёнык — кыцянёнык, шпачо́нык — шпычанёнык). Аднак паралельныя варыянты такіх назваў як буцянёнык, пырасёнык, цялёнык, сыбачо́нык нехарактэрны, ужыванне іх не назіраецца.

На ўзроўні лексікі дубровенскія гаворкі перш за ўсе характарызуюцца тым, што побач з даўно вядомым, традыцыйным словам у тым жа значэнні пад уплывам беларускай і рускай літаратурных моў пашыраюцца яго семантычныя дублеты, эквіваленты і вытворныя ад іх: ба́нька — кальцо́ (у касе), бо́ты — сыпагі́, ву́ткі — ка́чкі, дзесяці́на — гікта́р (паугекта́ра), дзяре́ўня — вёска, гырла́ч — крынка, інцірысыва́цца — ціка́віцца, кру́пны — бу́йны, лыпа́та (лыпа́тка) — рыдлёўка, спаси́ба — дзя́куй, спасі́бкываць — дзя́кываць, уса́дзьба — сядзі́ба, цяпло́ — во́гнішча (касцёр) і іншыя. Некаторыя мясцовыя словы і ўстойлівыя выразы як не ўласцівыя літаратурнай мове або пашыраныя ў іншых значэннях незразумелы без тлумачэння. Гэта такія словы і словазлучэнні, як апо́ка, гульта́й, зыда́ць, уда́рыць, выця́ць; пыйда́ць, пад'е́сці, нае́сціся, куса́нік, надкусаны кавалак хлеба, хуртаві́на, заве́я, дабры́нскае гумно́, дурны́ чалаве́к, дурны як іцкаў бот з левай нагі, дубіна стыеросавая (ад стоя расці) у тым жа значэнні, дурнейшы за ўсе і за ўсіх.

Пры распаўсюджанасці адных і тых жа імёнаў, прозвішчаў, што ў межах адной вёскі не з'яўляецца рэдкасцю, у мэтах ідэнтыфікацыі асобы, аб якой ідзе размова, пры яе адсутнасці і па іншых прычынах выкарыстоўваюцца розныя празванні, мянушкі і т. п. Так, замужніх жанчын звычайна называюць па імені мужа (Андрэ́іха, Аўласі́ха, Петрачы́ха, Пана́сіха, Хвядзу́ріха, Хлімо́ніха) або па роду яго заняткаў: (кавалі́ха, ахвіцэ́рыха). Мужчын і падлеткаў у такой сітуацыі як правіла называюць па імені бацькі ці роду яго заняткаў з дабаўленем суфікса -онак- (ёнак-): Іва́н Аўдашчо́нык, Лігор Аліксяёнык, Паулю́к Максімёнык, Ля́ксей Нісцярёнык, Ля́ксей Ахвіцарёнык. У аснову такога празвання можа быць пакладзена нозва мясцовасці: выхадцам з якой з'яўляецца сам чалавек ці яго продкі (Ляксей Гусянёнак ад Гусіна Смаленскай вобласці). Дзяцей, якія гадаваліся без бацькі іншы раз называюць па імені маткі, ці з дабаўленнем імені маткі (Іван Хадо́рін, Наста Лёксічкіна, Прэса Хо́нічкіна), або празванню маткі ад імя яе мужа (Коля Міхо́дзіхіе, Сара Тыманіхіна). Назіраюцца выпадкі, калі наданае ў дзяцінстве пяшчотнае імя, утворанае ад поўнага, захоўваецца за чалавекам да самай смерці (Аўда́шка, Ульянка, Піліпушка, Мікала́йчык, Лёксычка, Хо́нічка, Пылагейка). У аснову мянушкі звычайна кладзецца якая-небудзь адметная індывідуальная прыкмета.

Гэта могуць быць асаблівасці вымаўлення, знешні выгляд, малы рост, падабенства да чаго-небудзь у тых ці іншых адносінах (ге́рчык, гу́рчык, гры́г, дзю́бачка, куртý-зік, пшы́ш, шо́т і т. п.). Зрэдку ад такіх мянушак выкарыстоўваюцца вытворныя словы (пшы́шаў Ада́м), Шо́цікаў Пятро́к.

Аб іншых асаблівасцях дубровенскіх гаворак гл. ў кн. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы (скарочана ДАМБ). Мн., 1963; Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх народных гаворак, Мн., 1968; Н. Т. Вайтовіч. Ненацiскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968.

А. Груца,
доктар філалагічных навук, прафесар.

Дубровенскае ганчарства

Як і любы іншы куток Беларусі, дубровенская зямля не абдзелена майстрамі ў галіне дрэваапрацоўкі, пляцення, кавальства, ткацтва і іншых традыцыйных рамёстваў і промыслаў. Бытавалі яны і як вясковыя заняткі для задавальнення ўласных бытавых патрэб, і як высокаразвітыя гарадскія і местачковыя рамёствы, што арынетаваліся на агульнаеўрапейскія дасягненні ў галіне тэхналогіі і мастацкіх стыляў. Пераканаўчае сведчанне гэтага — прозвішчы канкрэтных майстроў з Дуброўны, якія ў другой палове XVII ст. у выніку руска-польскай вайны апынуліся ў Маскоўскай дзяржаве, дзе выконвалі заказы царскага двара. Несумненна, што гэта былі выдатныя майстры, яеія з годнасцю прадстаўлялі рамёствы ўсходняй часткі Беларусі. Сярод іх — сталяры разьбяры Фёдар Мкалаеў і Герасім Акулаў, якія прымалі ўдзел у будаўніцтве і аздабленні славутага Каломенскага палаца, майстры-металаапрацоўшчыкі Фёдар Гаўрылаў, Купрыян Пятроў і інш.[1] Толькі ў Мяшчаснкай слабадзе Масквы пражывала больш за 20 майстроў з Дуброўны, сярод іх — кавалі, сярэбранікі, пераплётчыкі, печнікі, кушняры, патныя і інш.[2] Пераняўшы і перапрацаваўшы на мясцовы лад заходнееўрапейскія дасягненні ў галіне тых ці іншых рамёстваў, яны прынеслі іх у Маскоўскую дзяржаву.

Традыцыйныя народныя рамёствы і промыслы мелі характар, тыповы для Верхняга Падняпроўя. Народныя майстры — сталяры, цесляры, разьбяры, бондары, токары, кавалі, пляцельшчыкі, ткачыхі і ін. — з недарагіх, шырокадаступных матэрыялаў стваралі самы розныя бытавыя рэчы, прылады працы, транспартныя сродкі і іншыя неабходныя ў паўсядзённым ужытку вырабы, якія ў большасці выпадкаў вызначаліся характэрнымі не толькі для Дубровеншчыны, колькі для ўсяго Падняпроўя, а нярэдка — і ўсёй Беларусі асаблівасцямі. Пэўнай адметнасцю вызначаецца хіба што ганчарства, на якім і варта спыніцца больш падрабязна.

Як і ў цэлым па Беларусі, ганчарства, якое бытавала ў выглядзе шырокаразвітага промыслу, канцэнтравалася ў асобных ганчарных цэнтрах, паблізу якіх былі залежы прыдатнай для заняткаў рамяством гліны. На Дубровеншчыне гэта былі Дуброўна і Ляды.

Найбольш ранняе дакументальнае ўпамінанне пра Дуброўна як ганчарны цэнтр адносіцца зноў жа да сярэдзіны XVII ст. ў сувязі з дзейнасцю беларускіх майстроў у Маскоўскай дзяржаве. Сярод пасяленцаў Ганчарнай слабады ў Маскве згадваюцца ганчары Кірыла Паўлаў і Ігнат Іваноў з Дуброўны[3]. Відаць, ужо тады горад быў досыць значным ганчарным цэнтрам. Праўда, канкрэтных звестак пра характар вырабаў няма, але можна меркаваць, што гэта была перш за ўсё паліхромная рэльефная кафля, якой праславіліся беларускія майстры ў Маскоўскай дзяржаве.

У канцы XIX ст. Дуброўна падзяліла лёс іншых гарадскіх ганчарных цэнтраў,

керамічная вытворчасць у якіх значна знізіла свой узровень. Да таго ж, з пракладкай новых шляхоў зносін страціў сваё былое значэнне важны шлях праз паселішча. Не дзіва, што Дубровна як ганчарны цэнтр нават не згадваецца ў дарэвалюцыйных выданнях. І толькі статыстычныя звесткі за 1926 г. называюць лік мясцовых ганчароў — 20 чалавек[4].

Відаць, усё гэта і прывяло да своеасаблівай «кансервацыі» старадаўніх мясцовых традыцый рамяства. Нават у сярэдзіне XX ст. дубровенскія ганчары, хоць і карысталіся нажным ганчарным кругам, выраблялі пераважна архаічны чорназа-дымлены і гартаваны посуд. Надзвычай старажытныя рысы захоўвала і мастацтва мясцовай глінянай цацкі.

У пасляваенны час у Дубровне ганчарствам займалася ўсяго некалькі майстроў: Міхаіл Пацецька, Міхаіл і Вера Парфяновічы. Даўжэй за ўсіх, да канца 70-х гг., працаваў лепшы мясцовы ганчар Мікалай Сіманькоў (1896—1980). Яго творы захоўвалі лепшыя традыцыі мясцовага рамяства. Каленцыі яго посуду не раз дэманстраваліся на выстаўках, закуплены музеямі рэспублікі.

На продаж Мікалай Іванавіч выраблял нешырокі асартымент неабходнага ў побыце посуду: гаршкі з накрыўкамі, гладышы, цёрлы, вазоны, радзей — глякі, міскі, кубкі і інш. Формы выраба гранічна спрошчаныя, але дасканалыя: стройныя танкасценныя гладыша, амаль шарападобныя маленькія гаршчочкі, часам з двума вушкамі. Формы вазонаў падкрэслены характэрнымі для Падняпроўя выціснутымі хвалістымі паяскамі. Амаль увесь посуд апрацоўваўся ў тэхніцы чорнага дымлення, і толькі гаршкі майстар загартоўваў. Але паколькі мясцовыя ганчары ў абвару дадавалі вугаль ці сажу, загартаваныя вырабы не мелі характэрнага плямістага дэкору, а пакрываліся суцэльным шэрым налётам і мала чым адрозніваліся ад чорназадымленых.

У 60-я гг. М. Сіманькоў некаторы час супрацоўнічаў з Аршанскай фабрыкай мастацкіх вырабаў, што дало новы штуршок яго творчасці, выявіла талент імправізатара. З'яўляюцца розныя дэкаратыўныя вазы накшталт графіна з гаршкападобным тулавам, нейкія адмысловыя слоікападобныя сасуды з ручкамі, букетнікі складаных форм. У формах адчуваецца нейкае аддаленае падабенства са старажытным шкляным і металічным посудам, але яно хутчэй за ўсё чыста выпадковае. Відаць, тут больш сказаўся ўплыў патрабаванняў Аршанскай фабрыкі, асабліва прыкметны ў дэкору: вырабы па ўсім тулаве аперазаны выціснутымі паяскамі з буйных, размашыстых зігзагаў, што чаргуецца з трацўдыцыйнымі. Але ні такія формы, ні дэкор у творчасці майстра не прыжыліся, у далейшым ён зноў вярнуўся да традыцыйных вырабаў.

Найбольш цікавую старонку Дубровенскага ганчарства складае гліняная цацка, якая захоўвала сваю самабытнасць да

М. І. Сіманькоў са сваімі вырабамі.

60-х гг. XX ст. Па ўспамінах старажылаў, у пачатку стагоддзя промысел па вырабу цацак быў развіты досыць шырока, іх цэлымі партыямі сплаўлялі па Дняпры ў Оршу, Смаленск, некаторыя майстры са сваім таварам траплялі нават у Пецярбург.

У пасляваенны час промыслам займалася толькі Ганна Марачова (1887–1976). У творчасці яе праявіліся лепшыя і надзвычай даўнія традыцыі гэтага рамяства.

Цацкі Ганны Марачовай уражваюць надзвычайнай архаічнасцю, нібы гэта не сучасныя вырабы, а знаходкі з курганаў першабытных часоў. Ляпіла іх майстрыха на аснове адной загатоўкі — корпуса на чатырох выступах-ножках, і толькі асобныя характэрныя дэталі надаюць цацкам некаторыя адрозненні, але высветліць правобраз гэтых фантастычных птушкаконей немагчыма. У птушкі — невялікі, плоскі, нахілены ўперад грэбень, конь адрозніваецца ад яе толькі вушамі, да якіх прылеплены характэрна цыгнутыя рукі конніка. Яго злітае з канём тулава пазбеўлена ўсялякай дэталізацыі, нават на твары няма ніякага намёку на характэрныя рысы. Ад масіўных, статычных, грубавата вылепленых фігурак павявае подыхам глыбокай старажытнасці.

У даваенны час, калі вырабам падобных цацак займаліся многія майстры Дуброўны, Г. Марачова размалёўвала цацкі ў характэрным мясцовым стылі. Спачатку іх бяліла, затым падмалёўвала зялёным, сінім, чорным колерам. Пазмалёўка вельмі ўмоўная, простая, у адзіным стылі з іх агульным архаічным абліччам. У апошні перыяд жыцця, з заняпадам промыслу, майстрыха фарбавала цацкі бронзавай ці алюмініевай фарбай або пакідала натуральны чорны колер, набыты ў працэсе абпалу разам з чорназадымленым посудам.

Цікавая калекцыя падобных цацак, сабраная ў пачатку XX ст. на ўсходзе Беларусі, захоўваецца ў Дзяржаўным музеі этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу. Мастацкае аблічча іх такое ж, як і ў творах Г. Марачовай. Тулавы паненак і кавалераў масіўныя, статычныя, рысы твараў вельмі ўмоўныя. Вылучае іх і характэрная дэталь, якая захавалася ў вырабах Г. Марачовай: замест ног — своеасаблівыя дугападобныя падстаўкі, кароценькія ў жанчын, непамерна масіўныя — у мужчын. Усё гэта дае падставы меркаваць, што калекцыя, хутчэй за ўсё, прадстаўляе творчасць дубровенскіх майстроў — захавальнікаў традыцый рамяства яшчэ тых часоў, калі гліняная цацка была не столькі дзіцячай забаўкай, колькі прадметам рытуальнага прызначэння.

Свістулька-певень. Аўтар Г. Марачова.

Другім значным ганчарным цэнтрам на Дубровеншчыне з'яўляюцца Ляды — сёння звычайная вёска на самым ускрайку Дубровенскага раёна, каля рэчкі Мярэі, за якой пачынаецца Смаленская вобласць. Але ў свой час гэта было буйное мястэчка, праз яго праходзіў адзіны шлях на Смаленск. Асноўны прыбытак жыхарам мястэчка даваў гандаль ганчарнымі вырабамі.

Час пачатку ганчарнага промыслу ў Лядах немагчыма назваць нават прыблізна, археолагі пакуль не далі адпаведных звестак. Але нават і ў канцы XIX ст., калі мястэчка прыкметна заняпала, гэта быў досыць буйны ганчарны цэнтр. Па статыстычных дадзеных, у той час ганчарствам у Лядах займаліся 15 двароў[5], але, відаць, звесткі заніжаныя, паколькі такая ж лічба названа і па Копысі — буйнейшым ганчар-

ным цэнтры Усходу Беларусі. У даваенны час у Лядах налічвалася больш за паўсотню ганчароў[6], працавала невялікая арцель, дзе выраблялі цэглу, чарапіцу і ганчарны посуд. Вырабы звычайна прадавалі на месцы і ў наваколлі, вазілі таксама ў суседняе мястэчка Краснае (Смаленская вобл.), па Мярэі і Дняпры сплаўлялі ў Оршу, Смаленск.

У пасляваенны час з дзесятак майстроў, што вярнуліся з вайны, займаліся ганчарствам да канца 50-х гг. Сярод іх Васіль Шэкін, Кузьма Пракапцоў, Іван і Ігнат Матросавы, Васіль Клінавой, Павел Мацвейкін. Даўжэй за ўсіх займаўся рамяством Міхаіл Шэкін (1933 г. н.).

Асартымент вырабаў абмяжоўваўся галоўным чынам гаспадарчым посудам, які ўключаў гаршкі, гарлачы, збанкі (кушыны), слоікі, глякі, міскі (латушкі), вазоны, спарышы, кубкі (кухлікі), цёрлы (чаропкі) для расцірання маку і выпечкі бульбянай дранкі, а таксама вушнікі — слоікападобныя пасудзіны з двума маленькімі вушкамі каля венчыка, за якія чаплялі вяроўку. У вушніках насілі на поле ежу.

Да апошняга часу ў Лядах паралельна бытавалі ўсе асноўныя віды ўтылітарна-дэкаратыўнай апрацоўкі посуду: гартаванне, дымленне, глазураванне. Гартавалі звычайна посуд, прызначаны для гатавання ежы: гаршкі, латушкі, чаропкі, гарлачы. У гліну дадавалі павышаны працэнт пяску, абварванне выконвалі ў рошчыне з мукі і льняной мякіны. Да вайны выраблялі і чорназадымлены посуд таго ж асартыменту. І тыя, і другія вырабы ніякага спецыяльнага дэкору не мелі, мастацкае аблічча посуду стваралася за кошт пластычнасці форм і чорна-карычневых плям на чырванаватай паверхні чарапка.

Асноўная ж частка посуду глазуравалася. Падсушаныя вырабы змазвалі дзёгцем і пасыпалі парашком палівы з адной часткі свінцу і дзвюх частак «белай зямлі». Як сведчаць ганчары, у залежнасці ад якасці абпалу паліва набывала розныя колеры, але ў асноўным залёных адценняў, якія ад нераўнамернага ўздзеяння агню мянялі сваю насычанасць на адным і тым жа вырабе.

Мастацкія якасці глазураванага посуду нярэдка падкрэсліваліся нескладаным роспісам. Разведзеным у вадзе «сінім каменем» (медным купаросам) на посудзе, там дзе ён быў пасыпаны парашком палівы, наводзілі хвалістыя і прамыя палосы, стылізаваныя кветкі і інш. Пасля абпалу малюнак набываў сіне-зялёны колер, блізкі да колеры палівы, але досыць выразны на яе фоне. Часцей за ўсё аздаблялі латушкі. На дно наносілі адно-два канцэнтрычныя кольцы, на шырока расхіленыя берагі — хвалістую лінію з буйнымі зігзагамі. Падобны дэкор аздабляў таксама верхнія часткі слоікаў і вазонаў.

Мяркуючы па знойдзеных узорах посуду, значнага пашырэння дэкор не меў. Ганчары, відаць, не паспелі выпрацаваць арыгінальных і дасканалых яго відаў. У большасці выпадкаў лініі і стылізаваныя раслінныя матывы нанесены не надта ахайна і не заўсёды спалучаюцца з формамі посуду. Праўда, адшуканыя вырабы адносяцца да пасляваеннага часу, іх дэкор можа і не адпавядаць колішняму, як, дарэчы, і формы посуду, яўна здрабнелыя ў параўнанні з ранейшымі.

Цацка «Пара». Пачатак XX стагоддзя.

Промысел па вырабу дзіцячых цацак (свісткоў) асаблівага пашырэння не меў, у даваенны час ім займаўся пераважна Васіль Клінавой (1927 г. н.). Ніводнага ўзору такіх вырабаў адшукаць не ўдалося, але, мяркуючы па ўсім, трактаваліся яны ў характэрным для бліжэйшых ганчарных цэнтраў (Дуброўна, Дрыбін) архаічным стылі.

Яшчэ нядаўна лічылася, што ганчарны промысел на Дубровеншчыне, як і іншыя старажытныя народныя промыслы і рамёствы, канчаткова заняпаў. Аднак апошнім часам на хвалі адраджэння традыцыйнай народнай культуры і дзякуючы пахвальным намаганням мясцовых культработнікаў з'явіліся падставы для адраджэння ганчарнага промыслу ў Лядах. Так, на Рэспубліканскай выстаўцы народнай творчасці ў 1988 г. з'явіўся гартаваны посуд В. Шэкіна. Зграбныя, дасканалыя формы, выразны плямісты дэкор звярнулі ўвагу ўсіх прыхільнікаў народнай культуры. Думаецца, бліжэйшая задача — не толькі падтрымаць мясцовых майстроў-ганчароў старэйшага пакалення, але і стварыць маральныя і матэрыяльныя ўмовы для пераемнасці традыцый моладдзю.

Я. Сахута,
кандыдат мастацтвазнаўства.

Крыніцы

1. Абецедарский Л. С. Белорусы в Москве XVII в. Мн., 1957. С. 17, 20, 43, 60.
2. Там жа. С. 23.
3. Там жа. С. 43.
4. Рак Р. Да пытання аб геаграфічным размеркаванні дробнарамесніцкай прамысловасці. Мн., 1932. С. 80.
5. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев-на-Днепре. Ч. 2. 1882. С. 462.
6. Рак Р. Да пытання аб геаграфічным размеркаванні дробнарамесніцкай прамысловасці. С. 70.

Ганчар з вёскі Ляды

Жыццё па рознаму складаецца ў кожнага з нас. Бачна, па гэтай прычыне ў народзе трапна падмечана, што жыццё пражыць — не поле перайсці. Для адным жыццё праходзіць неяк непрыкметна, чалавек нічым сябе не праяўляе, не вызначаецца. Ён жыве будзённа, адасоблена, імкнучыся нікога не чапаць і нікому не дапамагаць. Такія людзі пасля сябе нічога не пакідаюць нашчадкам. Ніякай памяці, ніякіх добрых спраў. Але вельмі многа сярод нас і людзей на першы погляд звычайных, непрыкметных, простых. І ўсё ж карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам, павагай. З поўнай упэўненасцю магу сказаць, што да такіх адносіцца мой аднавяскавец Міхаіл Васілевіч Шэкін, якому нядаўна споўнілася 60 гадоў. Яго юбілей адзначала ўся наша вёска. Я, напэўна, не памылюся, калі скажу, што ў Лядах, шматлікіх навакольных вёсках, расійскіх сёлах імя гэтага чалавека ведаюць вельмі многія. Шырокую вядомасць прынеслі Міхаілу Васілевічу яго залатыя, умелыя і працавітыя рукі. У Лядах і далёка за межамі вёскі, бадай, не знойдзецца такой хаціны, дзе б гаспадыні не карысталіся яго вырабамі — жбанамі, гарлачамі, вазонамі, спарышамі (злучаныя разам два гаршкі з ручкай для першых і другіх страў).

...Бацька М. В. Шэкіна — Васіль Лазаравіч — нарадзіўся ў 1901 годзе ў сям'і селяніна-ганчара. У сям'і Шэкіных было пяцёра дзяцей, а таму гаспадыні Дар'і Макараўне даводзілася зранку да вечара завіхацца па хатніх справах. Нягледзячы на тое, што ганчарныя вырабы карысталіся попытам у вяскоўцаў, ледзь-ледзь зводзілі канцы з канцамі. Міша рос кемлівым і паслухмянмы хлапчуком, як мог дапамагаў бацьку. Шукаў з ім гліну, мясіў яе, а потым пільна назіраў, як бацька лепіць гліняны посуд, пераймаў яго прыёмы, спрабаваў самастойна што-небудзь вырабіць. Праўда, жбаны не заўсёды атрымліваліся такімі, як у бацькі, але апошні неяк

адзначыў, што ў сына ёсць здольнасці. Паступова Васіль Лазаравіч перадае сыну сакрэты ганчарнай справы. А ў нядзелю бацька з сынам накіроўваліся на рынак, каб перадаць сваю прадукцыю. Калі шанцавала і яны прадавалі ўсё, талы сям'я ганчара «балявала». Але такія сытыя святы ў доме рэдка здараліся.

Пачалася вайна з Фінляндыяй і В. Л. Шэкіна прызвалі ў армію. З фінскай вярнуўся з адмарожанымі пальцамі ног. А тут прыспела вайна з гітлераўскай Германіяй і Шэкіна-старэйшага зноў прызвалі ў армію. Пад Магілёвам ён трап у палон. Нейкім чынам Дар'я Макараўна даведалася аб месцы знаходжання мужа, паехала ў Магілёў і за аднаго пеўня выкупіла мужа ў варты.

Жыццёвыя нягоды ўсё часцей і часцей праследавалі сям'ю Шэкіных. Аднойчы ў хату пастукалі гітлераўцы і загадалі ўсім сабрацца ў цэнтры вёскі. Больш свайго дома Шэкіны ўжо не ўбачылі. Усю сям'ю вывезлі ў Германію. У родныя мясціны сялянская сям'я вярнулася пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Аб усім гэтыя ляднянцы, якія прысутнічалі на вечары, прысвечаным 60-годдзю Міхаіла Васілевіча Шэкіна, даведаліся з вуснаў знакамітага ў наваколлі аднавяскоўца. Міхаіл Васілевіч расказаў, што ў шасцідзесятых гадах на тых, хто займаўся прыватным рамяством, накладалі вялікія падаткі. Лічылі, што ганчары маюць значныя прыбыткі, хоць сапраўды было зусім не так. Сутыкнуўшыся з цяжкасцямі, многія кінулі свой занятак. Паступова ганчарства пайшло на спад. Народныя майстры перасталі вучыць сваіх дзяцей, іншых здольных маладых людзей. Тым не менш, Міхаіл Васілевіч паціху працягваў тое-сёе выраблять. Мо гэтыя практыкаванні і дазволілі яму захаваць сваё майстэрства.

Даўні сябар М. Шэкіна Мікалай Палугін прыгадаў, што вырабы Мішы (так ён ласкава называў ганчара) — гарлачы, гаршкі, вазоны, спарышы, вазы для кветак, міскі-канаўкі — ішлі нарасхват і на рускім баку. Імя беларускага майстра-ганчара расіяне называлі з удзячнасцю.

...У той памятны дзень Міхаіла Васілевіча ад ўсёй душы віншавалі яго жонка Ніна Піменаўна, дзеці — Рыгор, Мікалай, Уладзімір, чацвёра ўнукаў. Шчырыя словы ўдзячнасці ў адрас юбіляра выказаў дырэктар саўгаса «Прыдняпроўскі» А. В. Парахневіч. М. В. Шэкін працуе ў саўгасе рабочым, яго адносінам да працы можа пазайздросціць кожны ляднянец.

Майстар М. В. Шэкін за работай.

Вырабы М. В. Шэкіна.

Ну, а што тады для Шэкіна ганчарства? Гэта яго самае вялікае захапленне, якому майстар аддае ўвесь вольны час. Цяпер такое захапленне называюць мудрагелістым словам заходняга паходжання «хобі». Тушачы запаленыя свечкі, юбіляр успамінаў і сумныя і радасныя падзеі ў сваім 60-гадовым жыцці. Парадаваўся, што растуць унукі, а будуць жа і праўнукі. Добра было б, каб яны не далі памерці майстэрству, старой як свет народнай традыцыі. Бо без традыцый, без памяці — хто ты на гэтай зямлі?..

Н. Галубцова.

Крыніца прыгажосці і пачуцця

Ансамбль народнай музыкі «Крыніца» створаны пры Дубровенскай музычнай школе ў сакавіку 1993 г., у той год, калі быў праведзены рэспубліканскі конкурс метадычнай і творчай працы сярод выкладчыкаў музычных школ.

У нястомнай і натхнёнай працы гэты калектыў за кароткі час дабіўся вялікіх поспехаў і пралажыў сабе шлях ад раённага да рэспубліканскага конкурсу, які адбыўся 9 снежня 1993 г. ў г. Салігорск. За гэтыя выступленні ансамбль узнагароджан Ганаровай граматай Упраўлення культуры і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь.

Узначальваюць ансамбль народнай музыкі «Крыніца» дырэктар музычнай школы У. Е. Волах і выкладчык па класу баяна М. В. Шлег, якія выконваюць не толькі народныя песні і танцы, але і адшукваюць новыя ўзоры народнага мастацтва і прапагандуюць яго.

За свой невялікі творчы шлях калектыў з вялікім поспехам выступаў на фальклорным фестывалі ў г. Орша, на абласным свяце «Грай гармонік» у г. Сянно, у музычным вучылішчы ў г. Віцебск, перад удзельнікамі «Славянскага базару», перад працаўнікамі горада і вёсак Дубровеншчыны і Краснінскага раёна Смаленскай вобласці. Разам з артыстамі Славеніі, Польшчы, Балгарыі, Расіі, Грузіі, Украіны ансамбль «Крыніца» прадстаўляў Рэспубліку Беларусь у сумесным канцэрце, прысвечаным адкрыццю Дзён нацыянальных культур у час правядзення «Славянскага базару» у г. Віцебск у 1994 г.

За творчае развіццё нацыянальных культурных традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць пастановай Міністэрства культуры і друку ад 26.1.1995 г. ансамблю прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

У пачатку чэрвеня 1995 г. ансамбль «Крыніца» прымаў удзел у рэспубліканскім фестывалі народнай музыкі «Звіняць гармонік і цымбалы» ў г. Паставы. Там ён атрымаў дыплом і каштоўныя падарункі. Дыпломам таксама ўзнагароджана інструментальнае трыо ансамбля ў складзе: гармонік — Шлег М. В., цымбалы — Стома А. А., Скрыпка — Бабіч В. В.

Цяпер ансамбль працуе над расшырэннем сваёй канцэртнай праграмы.

У. О. Волах, мастацкі кіраўнік,
М. О. Шлег, музычны кіраўнік.

Будскі народны...

Хор Будскага СДК створаны ў 1960 г. Кіраўнікі хора У. Фандзееў (1960—69), В. Шавялёва (1969—73). З 1974 г. кіраўніком хора з'яўляецца У. Волах, дырэктар музычнай школы г. Дуброўна. У 1978 г. за высокае выканаўчае майстэрства хору прысвоена званне народнага. Народны хор з'яўляецца пераможцам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў харавых калектываў і дыпламантам Рэспубліканскага фестывалю песні і танца імя Г. І. Цітовіча.

У рэпертуары хора апрацоўкі бел. нар. песень — «Чаму ж мне не пець», «Ой, у полі тры крынічанькі», «А у полі крыніца», «Туман ярам», «Цераз сад-вінаград» і інш.



Будскі народны хор. 1991 г.

Песні беларускіх кампазіратаў «Беларусь мая сінявокая» У. Карызны, «Край ты наш чароўны» М. Корсака, «Вясёлая стараначка» М. Сіраты, «Мой край беларускі» і «Пяе народны хор» І. Кузняцова і інш.

Песні самадзейных кампазітараў — «Не прыходзьце хлопцы, рана» і «Гарошынка» Л. Ячнева, «Песня пра Ю. Сміронова», «Прывітальная», «Памяць» У. Волаха і інш.

Песні ўкраінскіх кампазітараў — «Над Шушай сосны векавыя» А. Новікава, «Наш край героямі багаты» Г. Гранкіна, «Родная зямля» І. Літвінава, «Іван ды Мар'я» М. Палікарпава, «А маты ходзіць на курган», «Песня пра хлеб» А. Пашкевіча, « Зачараваная рака» І. Шамо і інш.

У цяперашні час Будскі народны хор прадаўжае працу па ўдасканаленні выканаўчага майстэрства і стварэнні новага рэпертуару.

У. Волах, кіраўнік хору.

Крыніца — жывая вадзіца

На дубровенскай зямлі ёсць унікальныя мясціны, з якімі непарыўна звязана гісторыя краю, яго люду. Адна з такіх мясцін — славуты Грутаў роў.

Знаходзіцца ён там, дзе лясны масіў кіраёўскага гаю амаль ушчыльную падступае да Дняпра. На схілах яго растуць сосны побач з маладымі дубамі і брозамі, а ўнізе ў акружэнні вольхі і вярбы знаходзіцца жамчужына прыроды — крыніца з яе шматлікімі падземнымі ключамі, якія выносяць на паверхню ваду не проста халодную і выключна чыстую, але і гаючую, жыватворную, лекавую.

Многа цікавага і незабыўнага расказваюць пра крыніцу старыя людзі — Ульяна Мікалаеўна Шайкова з вёскі Бурая, Праскоўя Якаўлеўна Троцкая і Марфа Міронаўна Івуліна з Лапыроў, Марыя Пятроўна Гуляева і крыху маладзейшая Вольга Міхайлаўна Іванова з Цеаліна, Пелагея Раманаўна Пурышкіна з Дуброўны і іншыя. Калі звесці іх аповеды ў адно, то атрымліваецца непарыўная повязь легендарнага; фантастычнага з рэальным, далёкага мінулага з сённяшнім.

Расказваюць, што тое месца, дзе цяпер б'е крыніца, прыснілася маладому невідушчаму чалавеку. Да таго ж чыйсці голас прасіў: «Знайдзі, адкрый мяне». І адправіўся гэты чалавек з надзеяй адшукаць зазыўную мясціну. Доўгі ці кароткі быў яго шлях, але натыкнуўся ён на халодную ваду, што выбівала з-пад зямлі. Умыўся ёю. І здарыўся цуд — упершыню ў жыцці ён убачыў белы свет. З той пары крыніцу сталі звать святой, гаючай.

А гавораць, што ўсё пачалося са з'яўлення тут у пятніцу святой пакутніцы Параскевы. З той пары ў адзінаццатую пятніцу пасля Вялікдня штогод ля крыніцы збіралася мноства народу. Прыходзілі з навакольных вёсак, прыязджалі з розных мястэчак і гарадоў, нават з Кіева дабіраліся. Начавалі ў лесе ці суседніх вёсках, а хто прыязджаў пастаянна, то спыняўся ў адных і тых жа тутэйшых жыхароў.

Сама крыніца была дагледжана, асветлена. Над ёй стаялі кольцы, ад іх адыходзілі латкі, па якіх і сцякала жывая вада. Святасць і цудадзейнасць крыніцы падкрэслівала ўзведзеная побач капліца з распяццем Ісуса Хрыста звонку і мноства ікон знутры. Людзі з вераў у Бога і з надзеяй на вылячэнне ад хваробы ішлі ад капліцы да крыніцы. З'язджаліся сюды і настаяцелі з цэркваў, якія асвячалі ваду, чыталі малітвы, пеўчыя спявалі духоўныя песні. І над усім вітаў дух ачышчэння, прыўзнятасці над будзённасцю жыцця, спадзявання на лепшае. Тут не магло прагучаць непрыстойнае слова, тут людзі жылі спагадай адзін да аднаго.

Якімі ж сродкамі шукалі людзі вылячэння гаючай вадой? Ля крыніцы стаяў вялікі крыж. На яго вешалі ручнікі, хусціны, тканіну, рабілі аброкі. А ў сцякаючую з латкоў ваду кідалі вопратку з надзеяй пазбавіцца ад хваробы, якую ўносіла ў воды Дняпра. Умываліся халоднай вадой, а з самой крыніцы ваду везлі да дому, каб ужываць яе працяглы час. Усё гэта лёгка тлумачыцца і сёння: узятыя разам надзея на выздараўленне і лекавыя якасці крынічнай вады давалі пэўны станоўчы вынік. Адзін расказваў аб гэтым другому і вядомасць крыніцы ў Грутовым рове расла.

А яшчэ прыцягвалі сюды людзей кірмашы, якімі заўсёды суправаджалася пакланенне святыні. Прывозілі сюды на продаж мёд, павідла, патаку, усемагчымыя самаробныя — з дрэва і гліны — цацкі, тканіны і асабліва многа палотнаў. Вышэй над крыніцай, на палянцы, устанаўлівалі арэлі, ігралі музыкі-самавучкі. Гэта было любімым месцам моладзі. А наогул народу збіралася так многа, што цяжка было прайсці. І кожны, па павер'ю, на шчасце, ці каб вярнуцца сюды яшчэ, кідаў у крыніцу манету, хто большай, хто меншай вартасці. Манеты не губляліся проста так: напярэдадні святочнага дня ў крыніцу апускалі спецыяльную сетку, у якой і затрымліваліся грошы. Потым яны ішлі на богаўгодныя мэты.

Так, ці прыкладна так, было да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. А потым аб вялікім зборышчы народу ў адным месцы не магло быць і размовы, хоць мясцовы люд не забываў сваю крыніцу. Ходу сюды не стала, калі апынулася гэта мясцовасць у франтавой паласе. Пасля вызвалення, як была размініравана гэта зямля, людзі зноў пачалі збірацца каля краыніцы. Тады было шмат абяздоленага, хворага, пакалечанага народу і многія верылі, што крыніца ім дапаможа.

Але ў хуткім часе пачаліся незразумелыя і неразумныя забароны. Перш за ўсё настаяцелям цэркваў забаранілі адпраўляць абрады і службы каля крыніцы. А людзі ў вызначаны дзень усё роўна збіраліся тут. Прыязджалі з манастыроў

манашкі і як маглі здзяйснялі абрад. Вядома, на людзей гэта ўплывала не так, кожны ж з нас ведае, што хваробу лечаць не толькі лекамі. А потым стала і яшчэ горш. Адзін са старшыняў тутэйшага калгаса загадаў засыпаць крыніцу пяском і заваліць каменнем, маўляў, каб не адрывала людзей у гарачую сенакосную пару. Тоны каменння і пяску звалілі ў святыню, каб яна назаўсёды знікла з твару зямлі. Але адны хацелі яе знішчыць, а другія тайком прыходзілі і выкідвалі, далёка адносілі каменне, а пясок падземныя ключы вымывалі самі. Крыніца выжыла, выстаяла і аказалася мацней за сваіх дурных губіцеляў.

Прайшло нямала гадоў. Нарэшце настаў час, калі кожны можа не тоячыся прыйсці на гэта святое месца. Напіцца і ўзяць з сабой чароўнай крынічнай вады. Проста пастаяць і падумаць аб вечнасці і магутнасці прыроды і скарацечнасці, неперываласці чалавечага жыцця. І яго зменлівасці.

Цяпер зноў ля крыніцы праходзяць святы, хоць і не вельмі шматлікія, якія тут у прамым сэнсе слова звязваюцца са святасцю. Пачаліся работы па абнаўленні і добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол крыніцы і самой крыніцы. Трэба, каб ідэя аднаўлення святыні знайшла водгук у сэрцы кожнага з нас. Мы — хто з заробку, хто з пенсіі — можам сабраць патрэбныя для гэтага грошы. Мы — і дужэйшыя, і слабейшыя — можам працаваць тут на добраўпарадкаванні тэрыторыі.

У рэшце рэшт у гэтую ідэю не трэба прыўносіць нічога містычнага. Калі вучоныя на падставе аналізаваў саставу і запасаў крынічнай вады яшчэ ў 30-я гады рэкамендавалі пабудаваць тут лячэбную ўстанову, то яны звязвалі гэта з чыста практычным, лекавым значэннем крыніцы. І не толькі для Дубровеншчыны. Напэўна разумелі гэта і тыя, хто ехаў сюды з Кіева і іншых няблізкіх месцаў. Чаму ж нам сёння адмаўляцца ад таго, што падаравала нам маці-прырода? Ну а калі мы сваім удзелам вернем нашай жыватворнай крыніцы аблічча і змест святыні, то толькі зробім вялікую справу дзеля ўмацавання нашага духу і духоўнасці і пакінем нашчадкам тое, што пакінулі нам нашы продкі, якія ўмелі бачыць далёка наперад. Святая крыніца, па народнаму павер'ю, адкрыла свет невідушчаму, давайце ж мы наноў адкрыем яе, дадзім ёй волю і абаронім ад дурноты ліхадзеяў.

Ф. Кулакоў.

Аб Барадзінскім гаі

Шмат легендаў складзена пра ўрочышча Бараддзінцы на Дубровеншчыне. А яшчэ больш пра яго крыніцу. З даўніх часоў ваду гэтай крыніцы лічаць святой. Да нашага часу старыя людзі штогод на адзінаццатую пятніцу пасля Вялікадня збіраюцца ва ўрочышчы, спраўляюць набажэнства (апошнім часам з удзелам святара), п'юць ваду з крыніцы, абмываюць ёй твары, хворыя мясціны, набіраюць з сабою, каб хапіла на ўвесь год «лекаў» ад усялякай немачы.

Трэба думаць, што асаблівыя адносіны людзей да крыніцы ва ўрочышчы Барадзінцы не выпадковыя. Вада яе сапраўды гаючая. Вось што пісаў пра яе ў 1932 г. доктар П. В. Астапенка (часопіс «Савецкая краіна», № 11, с. 110—111):

«Урочышча Барадзінцы Дубровенскага раёну магчыма прыгодна для санаторыя. Апрача вядомага ўжо на тэрыторыі БССР месца для санаторыя каля в. Баркаўшчыны Вушацкага раёну на месцы выхаду мінэральнай крыніцы, зьвязанай з старадаўнімі дэвонскімі адкладамі, заслугоўвае ўвагі мною папярэдне агледжаная крыніца каля былога фальварка Барадзінцы. Апошняя знаходзіцца на правым узвышаным беразе р. Дняпра за 7 км́ ад г. Дуброўна і за 6 км ад ст. Асінаўка.

Знаходзячаяся тут на дне глыбокага раўка (глыб. да 16 м) крыніца мае ваду з надзвычайна добрымі фізічнымі ўласьцівасьцямі і, як відаць, моцна мінэралізаваную (жалезістую і пэўна сярчаністую). Навокал крыніцы па каменьнях назіраюцца моцныя адклады паўтаравокіснага жалеза. Як і Баркаўшчына, трэба думаць, гэтая крыніца таксама зьвязана з няглыбокім заляганьнем пород так званага дэвонскага часу. Падставай для гэтай думкі зьяўляюцца выхады недалёка ад гэтага месца пород гэтага ўзросту (Кабелякі і Ворша) ніжэй па цячэньню і паміж в. Гарманы і Іванаўшчына, у 4 км вышэй па р. Дняпру. Апрача таго, гэтыя-ж пароды сустракаліся на глыб. 8 м, ніжэй узроўню р. Дняпра, калі рабілася прабоіна № 27 сьвідравальным атрадам нашай геолегічнай партыі ў мінулым годзе, на бічаўніку ракі побач з крыніцай, супраць дому аб'ездчыка. Пры сьвідраваньні былі пройдзены наступныя пароды:

1. Супесь шэрая з жаўтаватым адценьнем 0,50 см
2. Пясок шэра-жоўты, вельмі гліністы тонка зярнёвы 2,50 м
3. Суглінак жоўта-буры пяшчаны, шчыльны, які з глыб. 4,50 м пераходзіць у суглінак шэры з шызаватым адценьнем і моцна карбанатны 4,0
4. Гліна чакаляднага колеру, вязкая з галькай, моцна карбанатная 4,0
5. Вапняк шэры доёмітызаваны, пройдзена 0,15 м

агульная глыбіня 11,15

Усе адклады, уключна да № 4, па ўзросту адносяцца да чацьвярцёвых, а апошні трэба залічыць да адкладаў старадаўняга мора — так званага дэвонскага часу.

Судзячы па таму, што такога-ж характару крыніца, толькі меншых разьмераў, маецца і крыху вышэй (км на 3) каля парому ў Гарманы-Холаўе, трэба думаць, што крыніца каля Барадзінцы ўяўляе сабой не адзіночны выхад, а, магчыма, цэлы рад іх, па шчылінах у дэвонскіх адкладах.

Паміж іншым, трэба адзначыць, што сярод вакольнага насельніцтва вада гэтай крыніцы была вядома як лекавая і нават як «сьвятая».

Зроблены хэмічны аналіз (у лябораторыі Беларускай Акадэміі Навук т. Бялевіч) дастаўленай пробы вады з гэтай крыніцы выявіў наступнае:

1. Колер	бяз колеру
2. Пах	звычайны
3. Смак	нармальны
4. Празрыстасць	празрысты
5. Ападак	24,6
6. Рэакцыя	4,2 ° шчолачная
78. Жорсткасьць (у нямецк. градусах)	
а) агульная	11,2
б) сталая	3,6
9. CO_2 агульная	184,0
10. вольная	96,0
11. паўзьвязаная	-
12. зьвязаная	88,0
13. N_2O_5	ня знойдзена
14. N_2O_3	0,015
15. NH_2	0,61
16. H_2S	няма
17. SO_2	40,0
18. Сухая астача фільтраванай вады пры 110° С	386,4
19. Сухая астача фільтраванай вады пасьля пракалу	299
20. Страта ад прапальваньня	86,6
21. CO_2 з сухой астачы	13,2
22. Органічнай матэрыі	72,4
23. SiO_2	13,4
24. Fe_2O_3	сьляды
25. Al_3O_3	1,0
26. C_2O_5	1,24
27. K_2O_7	7,3
28. CaO	ня знойдзена
29. K_2O	23,9
30. Хлёр (Ci)	7,0
31. Na_2O	16,4
32. Акісьляльнасьць на холадзе у mg O	0,16
33. Акісьляльнасць на холадзе пры награваньні	1,36
34. Адносная вага пры 15° С	1000
35. Аналіз асадку (10% HCi) Fe_2O_8	1,2 mg

У даным аналізе зварачае на сябе ўвагу сапраўдная некалькі павышаная мінералізацыя (павышаная колькасць SO_3).

Таксама зварачае на сябе ўвагу выяўленая прысутнасць азоцістай кіслаты, аміяку і фосфарнага ангідрыду, але гэта трэба лічыць за выпадковы ўплыў аднаго з хэмічных компонэнтаў. Гэта магчыма пры такой малой колькасці хлёру.

Але для канчатковай ацэнкі якасьці гэтай вады трэба зрабіць паўторны аналіз і ўжо ў спэцыяльнай лябораторыі Санітарна-гігіенічнага ін-ту, а ўлічваючы важнасьць гэтага пытаньня для курортнай справы БССР, пажадана гэта зрабіць на самым месцы знаходжаньня абедзьвюх крыніц.

Дадаючы да гэтага яшчэ, што: 1. гэтая мінералізаваная крыніца знаходзіцца сярод дубовага гаю навокал раўку, а таксама што 2. амаль уся тэрыторыя б. ф. Барадзінцы занята лесам, пераважна хваевым і што, як гаварылася З. яна знаходзіцца на самым беразе Дняпра, трэба адзначыць, што гэты раён зьяўляецца адным з найбольш маляўнічых куткоў, якія даводзілася назіраць на тэрыторыі БССР.

Калі яшчэ прыняць пад увагу нязначную адлегласць ад станцыі такой бойкай чыгункі, як МБЧ, ад Дуброўны і такога значнага чыгуначнага вузла, як Ворша, то ў выпадку спрыяючай санітарна-гігіенічнай ацэнкі Барадзінцы могуць і бліжайшым будучым зрабіцца санаторыем значнага маштабу».

P.S. Вярнуцца да добрай, нават забытай, справы ніколі не позна У асноўным гэтым і выклікана перадрук даўняй публікацыі доктара П. В. Астапенкі.

Падрыхтаваў да друку
А. Петрашкевіч.

Назвы, з якімі жывем

Назвы акружаюць нас. Людзі даюць назву акаляючым іх аб'ектам, і даюць па тых прыкметах, якія здаюцца ім у момант называння самымі важнымі, самымі характэрнымі.

Большасць вёсак нашага раёна з'яўляецца па назве паронімамі — назвамі, утворанымі ад імя ці прозвішча першапасяленцаў, заснавальнікаў пасяленняў ці пераважаючых у вёсцы прозвішчаў. У рабоце па тапаніміцы Беларусі В. А. Жучкевіча адзначана такая большасць назваў населеных пунктаў нашага раёна. Прыкладамі служаць: Антоненкі — ад імя Антон, Александрыя — Аляксандр, Аляксейкі — Аляксей, Анціпенкі — Анціп, Баева — Баеў, Андрыянава — Андрэй і г. д.; Коршыкава — назва ўтворана ад прозвішча і слова коршун; Казьяны — у аснове назвы ляжыць слова каза; Кулакоўшчына — кулак, Кулакоў; Карабанавічы — вытворнае ад прозвішча Карабан, што выходзіць з высновы рабы, васпаваты; Ляхаўка — назва ўтворана ад прозвішча, у аснове якога ляжыць слова ляхі, якое бытавала ў мінулым (даўняя назва палякаў). Калі гаварыць праз назву вёскі Мамонькі, то яна ідзе ад прозвішча цюркскага паходжання з сэнсавым значэннем асновы «маўклівы», «глухі»; Пацэнькі — дэмінутыўная форма — пацук; Хлюсцін — уладальнік зямель, па якіх прайшла чыгунка, жыў у Выдрыцы цяперашняга Аршанскага раёна.

Сустракаюцца назвы населеных пунктаў, якія паходзяць ад назваў жывёл і раслін: Дзяцель, Ланенка, Баброва, Барсукі, Калінаўка, Асінаўка і г. д.

Многія населеныя пункты адлюстроўваюць у сваіх назвах адносіны іх да прыроднага асяроддзя: Бель — у аснове назвы тэрмін бель (верхавое балота з белымі мхамі, крывалессе); Быстрыёўка — магчыма ў аснове ляжыць тэрмін быстрыца, участак быстрага цячэння ракі, ручая; Гічы — буйныя і жорсткія сцябліны травяністай расліннасці, бур'ян (параўнальна — беларускае: якое там сена, адны гічы); Галяшы — у аснове ляжыць тэрмін галец — галынь, галынец — пустыр, неаблесенае месца, часам выпаленае.

У гэтым сэнсе Жарнеўка азначае месца першапачатковай расчысткі лясоў для земляробства шляхам выпальвання; Зарубы — назва ад асновы рубе, рубеж. Найбольш часта сустракаецца заруб — адзнака граніцы землявалодання ў лесе, прасека; Ірвяніца — назвы вёскі і ракі Ірвяніца ўтвораны ад славянскай асновы, дзе пачатак ідзе ад слова Іржаўка, магчыма — прарыў, прамоіна; Калатоўкі — неўраджайная зямля; Ляды — участак з-пад лесу, падрыхтаваны пад ворыва ці луг; Расасна — рака Расасенка, найбольш верагодна паходжанне назвы ад тэрміну рассоха, раздваенне ракі, дарогі.

Некалькі пасяленняў у нашым раёне носяць назву Слабада. Вялікая Слабодка — вуліца г. Дуброўна — тып пасяленцаў, якія з'явіліся ў XIV ст. і карысталіся часовым вызваленнем ад выплаты падаткаў і іншых павіннасцей. Насельніцтва слабады займалася рамяством ці выконвала нейкую іншую службу.

Два населеных пункты насілі назву Засценкі (цяпер засталося адно). Гэта — невялікія пасяленні ў некалькі дамоў, якія ўзніклі за межамі (сценамі) зямельных участкаў асноўных пасяленняў.

Назвы-арыенціры: Стражава — месца ля вартавога паста ў мінулым; Вежкі — у аснове ляжыць назва вежа; Валяўкі — пасяленне каля вала, завал; назва Буда ўзнікла ад тэрміна «буда» — невялікая пабудова ў XVIXVIII ст., будамі называлі аддаленыя лясныя пабудовы, у якіх жылі буднікі, што выпальвалі паташ, здабывалі дзёгаць, смалу.

Спрэчная назва — Сваташыцы. Многія звязваюць яе са словам «святы», думаецца, аднак, што тэрмін Сват, Сарвіры (варыянт — саро) — назва балтыйская, ад асновы сартос — бурае, рыжае; Ступакі — назва ўтворана ад паўзабытага слова ступа — прымітыўная прылада для грубай апрацоўкі зерня і круп.

Іскозы — характарыстыка ад асновы «искатель», магчыма, перасечаная мясцовасць. Дапускаецца, што назва Кобызева — цюркскага паходжання, кобыз — струнны смычковы інструмент. Русаны — назва патранімічная ад энтонімаў рускі, русін.

Сістэма геаграфічных назваў служыць важным сродкам адлюстравання дзяржаўнай прыналежнасці, грамадсткага ладу краіны, пануючай у ёй ідэалогіі. Так, многія гаспадаркі раёна носяць назвы, якія адлюстроўваюць рэвалюцыйную сімволіку паслякастрычніцкага перыяду: «Шлях да камунізму», «Герой працы», «Іскра Ільіча», «Прагрэс», «Гігант», «40 год Кастрычніка», імя партыйных з'ездаў. Пасля перамогі Савейкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне з'явіліся назвы гаспадарак: «Перамога», імя Ю. Смірнова, імя Чарняхоўскага, «Багаціёнаўскі».

У Дуброўне, як і ва ўсіх гарадах, вуліцы атрымалі назвы па асноўных чатырох прынцыпах: па імёнах, прозвішчах славутых людзей, па аб'ектах, размешчаных на вуліцы ці паблізу ад яе, па знешніх асаблівасцях ці гістарычнаму мінуламу. Імёны славутых людзей носяць у нашым горадзе вуліцы М. Горкага, І. Крылова, Пушкінская, Ю. Смірнова, А. Нікандравай. У гонар вядомых землякоў названы вуліцы Гарулёва — пісьменніка, Ландарскага — удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, І. Кандрацьева — Героя Савецкага Саюза, А. Лапанькова — заслужанага настаўніка рэспублікі. Ад цэнтра горада вялі дарогі ў іншыя гарады і сёлы. Так з'явіліся вуліцы Аршанская, Горацкая, Шклоўская, Вакзальная, Віцебская. А калі гаварыць пр вуліцу Барадзінскую, то яна атрымала сваю назву ад гаю Барадзінцы, у які ішла дарога з Дуброўны. Цяпер таго гаю няма.

А вось вуліцы, названыя па блізкапрылягаючых аб'ектах: Паштовая, Старапаштовая, Дняпроўская, Школьная, Фабрычная, завулкі Заволскі, Мельнічны, Садовы і г. д.

Важныя перамены паслякастрычніцкага перыяду адлюстраваны ў назвах вуліц Камсамольская, Чырвонаармейская, Чырвонафлоцкая, Кастрычніцкая, Першамайская, Піянерская, Пралетарская, Савецкая. Ёсць вуліцы, назвы якіх адлю-

строўваюць былы асноўны занятак іх жыхароў: Ганчарная, Рыбная, Кузнечны завулак і сённяшніх — Меліяратараў. Паспяваючы за падзеямі, далі вуліцам назвы: Касманаўтаў, Юбілейная, 30 год Перамогі, Маладзёжная.

Многія вёскі і вуліцы былі перайменаваны, зыходзячы з іх несугучнасці, або па недасведчанасці тых, хто іх перайменоўваў, і іншых прычын: Дзяругі — Каўровая, Малая Дзяцель — Лугавая, Старая Тухінь — Дарожная. Па гэтай прычыне вуліца Аптэчная стала Камсамольскай, Парыжская — Пушкінскай. Хоць, здавалася, што дрэннага ў старых назвах?.. Калі чытач пазнаёміцца з раздзелам «З гісторыі населеных пунктаў Дубровеншчыны», то пабачыць, колькі бязглуздзіцы і палітыканства і халуйства было дапушчана ў найменнях калгасаў і саўгасаў. Шэдэўрам дурноты ў гісторыі застанецца назва калгаса: «Свежы прамень у Сукіна».

Перайменне будзе, напэўна, практыкавацца і ў далейшым, але да гэтага трэба адносіцца вельмі асцярожна, захоўваючы гістарычную выснову назвы, не захапляючыся штучнай палітызацыяй. І наогул не спяшацца за бягучымі падзеямі і іх увекавечаннем, асабліва за кошт старых, традыцыйных, гістарычнах назваў.

М. Кляцкоў, настаўнік.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ДУБРОВЕНШЧЫНЫ

ДУБРОЎНА, горад, цэнтр Дубровенскага раёна. Размешчаны на Дняпры пры ўпадзенні ў яго рэчак Дубровенка (Задубровенка) і Свінка, за 92 км на паўднёвы ўсход ад Віцебска, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асінаўка на лініі Орша — Смаленск. Аўтадарогамі злучана з Оршай і Горкамі. 9,8 тыс. жыхароў (1995).

У пачатку XV ст. Дуброўна — цэнтр буйной воласці на мяжы Віцебскага і Смаленскага ваяводстваў, якая ахоплівала амаль увесь сучасны Дубровенскі раён і прылеглую частку Смаленскай вобласці. У гэты час вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Аляксандр падараваў Дуброўну разам з воласцю смаленскаму ваяводзе Юрыю Глябовічу. У 1514 г. пры заняцці рускімі войскамі Смаленска была захоплена і Дуброўна, аднак пасля Аршанскай бітвы 1514 г., якая адбылася на тэрыторыі Дубровенскай воласці, вызвалена. Паводле мірнага пагаднення 1522 г. засталося ў складзе Вялікага княства Літоўскага, у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. Пазней неаднаразова (1535, 1562, 1580 і г. д.) Дуброўну захоплівалі рускія войскі. Пасля Юрыя Глябовіча належала яго сыну, віленскаму ваяводзе Яну Глябовічу (каля 1490—1549), ад якога перайшла да яго непаўналетняга сына ад апошняга шлюбу Яна Янавіча (1544—1591). Да дасягнення ім паўналецця заставалася ўладаннем яго маці Ганны (дачка князя Фёдара Іванавіча Заслаўскага), якая паўторна выйшла замуж за польскага пана Ераніма Сяняўскага. Ян Янавіч Глябовіч, што тытулаваўся графам на Дуброўне і Заслаўі, у 1567 г. выстаўляў з Дуброўны і воласці 30 коннікаў (адпавядае прыкладна 600 мяшчанскім і сялянскім дварам). Потым Дуброўнай валодалі яго сын Мікалай і сын апошняга Ежы Караль (1610—1669), апошні прадстаўнік роду Глябовічаў. У 1630 у Дуброўне заснаваны касцёл і кляштар бернардзінцаў. У 1654 г. пасля працяглай аблогі занята войскам цара Аляксе Міхайлавіча і моцна пацярпела, паводле Андрусаўскага перамір'я ў 1667 г. вернута ў склад Вялікага княства Літоўскага. У 1677 г. радавыя маёнткі згаслага роду Гябові-

чаў былі падзелены паміж дочкамі Ежы Караля — Марцыбелай (1641—1681, жонка князя Марцыяна Агінскага) і Крысцінай (1645—1695, жонка пазнейшага віленскага ваяводы Казіміра Сапегі). Паміж імі была падзелена і Дуброўна з воласцю (Дубровенскім графствам). Пасля смерці М. Агінскага (1690) К. Сапега купіў (па іншых звестках узяў у заклад) частку Дуброўны, што пазней было аспрэчана сынам сястры Агінскага Людвігам Пацеем. У канцы XVII ст. пачаўся працяглы ўзброены канфлікт паміж дзвюма магнацкімі групоўкамі Вялікага княства Літоўскага, на чале адной з якіх стаяў К. Сапега. Войскі антысапегаўскай канфедэрацыі, да якой прымкнуў і Л. Пацей, у 1698 г. разрабавалі Дуброўну, а ў верасні 1701 г. разбілі ў яе ваколіцаў шляхецка-сялянскі атрад, узброены Сапегамі. У 1702 г. Л. Пацей захапіў Дуброўну. Пазней К. Сапега ў ходзе Паўночнай вайны 1700—1721 гг. перайшоў на бок шведаў, у выніку чаго Дуброўна была яшчэ раз спалена калмыкамі з рускага атрада капітана Салаўёва. Пасля эміграцыі Сапегі разам са шведамі Дуброўна засталася ва ўладанні Л. Пацея, які ў 1715 г. прадаў яго разам з воласцю за 150 тыс. бітых талераў рускаму князю А. Д. Меншыкаву. Аднак К. Сапега, які ўжо ў 1713 г. атрымаў каралеўскі дэкрэт аб амністыі і зваротце маёнткаў, пасля працяглага судовага працэсу ў 1719 г. адсудзіў Дуброўну. Праз год пасля смерці яго Дуброўну падзялілі сыны Сапегі Ежы Станіслаў (1688—1732) і Аляксандр Павел (1671—1734), прычым апошні хутка аддаў Дубровенскі замак і частку мястэчка, што прыпалі на яго долю, у заклад Яну Лендорфу. Ежы Станіслаў Сапега сваю частку таксама аддаў у 1725 г. у заклад Ежы Тышкевічу. У далейшым браты Сапегі з-за хранічнай патрэбы ў грошах неаднаразова закладвалі і перазакладвалі Дуброўну. Частка Ежы Станіслава пазней перайшла спачатку да яго сына Антонія Казіміра (каля 1700—1739), потым да сястры апошняга Крысціны (з 1745 г. жонка князя Казіміра Масальскага). Доля Аляксандра Паўла, у якую ўваходзілі замак і асноўная частка мястэчка, дасталася яго сынам Казіміру Леану (1697—1738) і Міхаілу Антонію (1711—1760), якія ў 1733 г. выкупілі яе з закладу. У 1750 г. ў Дуброўне заснавана суконная мануфактура. Аднак унук князя Меншыкава Сяргей працягваў прэтэндаваць на тую частку Дуброўны, што некалі складала долю М. Агінскага, а потым належала Ежы Станіславу Сапегу. Толькі ў 1765 г. адбылося канчатковае пагадненне паміж Меншыкавым і тагачаснай уладальніцай гэтай долі Крысцінай Масальскай, якая выплаціла яму 21,5 тысяч злотых за адмову да яго прэтэнзій. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Дуброўна, якой у той час валодаў сын Казіміра Леана, будучы канцлер Вялікага княства Літоўскага Аляксандр Сапега, апынулася ў складзе Расійскай імперыі, у Аршанскай правінцыі, з 1777 г. — у Аршанскім павеце Магілёўскага намесніцтва. У той час у Дуброўне меліся 4 праваслаўныя царквы, бернардзінскі кляштар з касцёлам, сінагога, паштовы дом, праводзіліся 3 кірмашы на год. Мястэчка ляжала на абодвух берагах Дняпра. У 1780 г. яго наведала імператрыца Кацярына II. У 1782 г. канцлер А. Сапега за 5,8 мільёнаў злотых прадаў свае правы на Дуброўну фаварыту Кацярыны II князю Рыгору Аляксандравічу Пацёмкіну. У гэты час бернардзінскі кляштар быў зачынены, замест яго з Віцебска пераведзены кляштар піяраў. У канцы жыцця князь Пацёмкін абмяняў Дуброўну на маёнтак Смела ў Кіеўскім ваяводстве з князем Ф. К.

Любамірскім (1747—1819). З гэтага часу да 1917 г. Дуброўна была ўласнасцю Любамірскіх. Ф. К. Любамірскі ў 1809 г. пабудаваў тут новы касцёл. Ён жа дамогся закрыцця кляштара піяраў, якія патаемна без згоды Любамірскага абвянчалі яго дачку. У ліпені 1812 г. Дуброўна была занята войскамі Напалеона, 9.11.1812 г. вызвалена авангардам генерала А. П. Ярмолава. У 1819 г. перайшла ў спадчыну да другога сына Ф. К. Любамірскага — Яўгенія (1789—1834), потым да сына апошняга — Яўгенія Адольфа, якія акрамя таго валодалі вялікімі маёнткамі ў Польшчы і Каліцыі. У 1846 г. насельніцтва Дуброўны складала 3441, у 1867 — 4522, у 1897 — 7974 жыхары. У 1860 г. мела 811 дамоў, 8 прамысловых прадпрыемстваў, 2 вучылішчы, бальніцу, аптэку. З 1861 г. — цэнтр воласці новаўтворанага Горацкага павета Магілёўскай губерніі.

У пачатку XX ст. заснавана ткацкая фабрыка — Дняпроўская мануфактура (у 1910 г. налічвалася 488 рабочых). У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 г. дзейнічала група РСДРП, адбыліся выступленні працоўных. На 1.1.1909 г. было 9469 жыхароў, 869 жылых дамоў (у т. л. 10 цагляных), 5 млыноў. У 1-ю сусветную вайну колькасць жыхароў скарацілася. Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. было 5294 жыхары. У лістападзе 1917 г. ўстаноўлена савецкая ўлада. З 1924 г. Дуброўна — раённы цэнтр, з 3.7.1925 — горад. У 1926 г. было 7920 жыхароў, у 1939 — 9,9 тыс. жыхароў. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў ліпені 1941 г. ў раёне Дуброўны жорсткія баі з гітлераўцамі вялі 18-я і 73-я стралковыя дывізіі 20-й арміі, 16.7.1941 г. горад акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў гарадзе Дуброўна знішчылі каля 3 тыс. чалавек. На тэрыторыі раёна дзейнічалі Дубровенскія падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгады 115-я Горацкая, «Звязда», асобныя атрады 112-ы Горацкі, «Трэція». 26.6.1944 г. Дуброўна вызвалена войскамі 71-га і 36-га стралковага карпусоў 31-й арміі пры падтрымцы авіяцыі 20-га знішчальнага авіякорпуса 1-й паветранай аміі 3-га Беларускага фронту ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944 г. У 1959 г. ў г. Дуброўна 4,9 тыс. жыхароў. У 1962—65 гг. Дуброўна ў складзе Аршанскага раёна, 6,4 тыс. жыхароў (1971). Працуюць маслазавод, льнозавод, кммбінат прамысловых тавараў, раённае аграпрамысловае аб'яднанне, камбінат бытавога абслугоўвання. У горадзе СПТВ № 171 механізацыі сельскай гаспадаркі, 2 сярэднія школы, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, дапаможная школа-інтэрнат, 5 дашкольных устаноў, Дом Піянераў і школьнікаў, 2 бібліятэкі, бальніца. Выдаецца раённая газета «Дняпроўская праўда». Брацкія магілы барацьбітоў за савецкую ўладу, савецкіх воінаў і партызан (сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза Г. А. Нікандрава), магіла ахвяр фашызму. Помнік Вызвалення. Помнікі архітэктуры: кляштар бернардзінцаў (1809), Пакроўская царква (XIX ст.). Горад захаваў планіровачную структуру, якая сфарміравалася ў XVI—XVII ст. За 100 м на ўсход ад упадзення р. Дубровенка ў Дняпро захаваўся археалагічны помнік-гарадзішча.

В. Насевіч.

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобл. Мн., 1985. С. 260.

Мой горад

Мы, пажылыя, часта ўспамінаем сваю маладосць. У мяне гэтыя ўспаміны заўсёды звязаны з Дуброўнай. Тут прайшло амаль ці не ўсё маё жыццё. Толькі час вучобы ў інстытуце, вайна і некалькі пасляваенных гадоў разлучылі мяне з маім горадам.

Да вайны гэта быў прыгоды і ўтульны гарадок. І людзям тут жылося нядрэнна. Для гэтага былі ўсе зручнасці. Руская, яўрэйская, тры беларускія школы. Кінатэатр, вялікі фабрычны клуб з танцавальнай пляцоўкай, некалькі рабочых клубаў, яшчэ адна прасторная танцпляцоўка ў былым княскім парку, велічныя прыгожыя цэрквы. І на ўсю акругу вядомы рынак.

Кожнаму было куды пайсці, з кім сустрэцца.

Асобая прыкмета маёй Дубрны той пары — дружба людзей розных нацыянальнасцей. Тут жылі і беларусы (мы размаўлялі на беларускай мове з прымессю дубровенскага дыялекту), і яўрэі, і палякі, і рускія. Былі дзеці іншых нарождаў, але — менш. Асабліва многа дыло яўрэяў. У канцы мінулага стагоддзя яўрэі былі выселены з Расіі. Для іх быў уведзены цэнз аседласці. Мяжа гэтага цэнзу праходзіла па нашым раёне. І не было амаль ні адной вёскі, не кажучы аб горадзе, дзе б ні жылі яўрэі.

А пра Дуброўну — дык і наогул размова асобая. Тут у пачатку нашага стагоддзя было заснавана магутнае акцыянернае таварыства — тэкстыльная фабрыка «Дняпроўская мануфактура». Спачатку на работу туды бралі толькі яўрэяў, затым — усіх жадаючых. І ніхто нічога не аддзяляў, не адрозніваў, ніхто нікога не чужаўся, што, на глыбокі жаль, востра адчуваецца цяпер. Сярод большасці людзей добрых ёсць і дрэнныя, ва ўсіх народаў і нацый, а кожнага ацэньвалі па яго ўчынках. Мы, беларусы, ведалі многія яўрэйскія словы, спявалі яўрэйскія песні, а яўрэі, вядома, валодалі і нашай беларускай мовай.

Але перанясемся зноў у даваенную Дуброўну. Тут мне перш за ўсё ўспаміна-ецца кінатэатр, які размяшчаўся па вуліцы Аршанскай, побач з двухпавярховым будынкам былой школы. Кінатэатр быў створаны ў 30-я гады. Да гэтага тут быў касцёл, а побач з ім, літаральна метрах у двух, — дом ксяндза і пеўчых. Гэта якраз той будынак, які захаваўся да нашых дзён. А той, што не захаваўся, быў па маім паняцці, проста велічны. Там меліся вялікі партрэт, дзве ложы, балкон. Уваход быў з вуліцы Аршанскай. За прыгожай агароджай абсталявана пляцоўка з лаўкамі для адпачынку. Адсюль шырокая лесвіца вяла непасрэдна да будынку тэатра. Над пляцоўкай і над гэтай маршавай лесвіцай навісалі густыя шаты векавых ліп.

І касцёл, і двухпавярховы дом былі пабудаваны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя (на адным з будынкаў было азначана «1860 г.»).

На Дубровеншчыне шмат садоў, прынамсі, так было некалі. І як гаварылі мне старэйшыя родзічы, у гэтым заслуга Любамірскага. Ён ва ўсіх сваіх сёлах патрабаваў ад сялян, каб яны саджалі каля сваіх хат яблыні і грушы. І калі яму дакладвалі, што хтосьці не выконвае яго волю, ён сам ехаў туды і непаслухмянца білі бізунамі. А князь прыгаворваў: «Будуць свае фрукты, дзеці ў іншых красці не стануць».

І ў князя ў Дуброўне быў фруктовы сад па Шклаўскай вуліцы, прыкладна там, дзе цяпер лясніцтва. Ён часткова вымерз у 1939 годзе, астатнія дрэвы загінулі ў час вайны.

Незабыўныя ўражанні пакінуў рабфак, які размяшчаўся ў былым доме ксяндза. Тры дзённыя, чатыры вячэрнія курсы. Добрыя настаўнікі: Зязюлін, Ясноўскі, Вальт, Жукавец і іншыя. Асабліва запомніўся дырэктар рабфака, настаўнік рускай мовы і літаратуры Жукавец. Малады, прыгожы, ён толькі што скончыў педін-

Дуброўна. 1996 г.

стытут імя А. М. Горкага і прыехаў у Дуброўну, на радзіму яго каханай дзяўчыны Волкавай, з якой разам вучыліся.

У 1936 г. Волкаву арыштавалі, а яшчэ раней — яе двух братоў. Канешне, «ворагі народа». Арыштавалі і Жукаўца. Выклікалі з урока і на вачах усіх павезлі. Невядома куды. А ў 1939 г. ў Дуброўне быў вялікі судовы працэс. Судзілі 36 чалавек на чале з першым сакратаром райкома партыі Маршалавым (ён скончыў жыццё самагубствам). Гэта — горкая старонка нашай гісторыі і майго горада.

За Дуброўнай — Расія.

Потым была куды больш страшная старонка яго біяграфіі — вайна.

Трэба сказаць, што да вайны ў Дуброўне было значна больш насельніцтва, чым цяпер. Вось прыклад. На месцы цяперашняга гарадскога стадыёна была вялікая яўрэйская сінагога, два магазіны, і дзесяткі два ці больш дамоў. Тут была вуліца Балаголаў (ямшчыкоў). І тут мы, студэнты, заўсёды даведваліся, хто з іх у патрэбны нам час едзе на Асінаўку, каб дабрацца з ім да цягніка.

Пры той кучнасці насельніцтва і будынкаў у тадышняй Дуброўне панавалі парадак і чысціня, што могуць пацвердзіць многія старажылы, і чаму трэба павучыцца сённяшнім яго жыхарам.

Становіцца гісторыяй далёкае і не такое ўжо далёкае мінулае. Але і сёння яно ўплывае на лёс кожнага з нам.

П. Дубава, г. Дуброўна.

АДЗІНЦЫ, в ё с к а . Першыя пісьмовыя звесткі ў інвентары 1782 г. У той час вёска ўваходзіла ў Жабыцкае (тыя Жабыкі цяпер — Фесеўка) паручэнства, затым у Батуроўшчынскае таварыства Холбнянскай воласці. Згодна з усерасійскім перапісам 1897 г. ў вёсцы налічвалася 16 двароў і 90 жыхароў. Пасля 1914 г. пісьмовых звестак аб вёсцы няма. Не існуе.

АЗАРАВА, в ё с к а. Упершыню ўпамінаецца ў інвентары маёнтка Раманава 1647—1648 гг. (31 двор). У 1897 г. вёска адносілася да Баеўскай воласці і належала сялянам. У ёй на той час было 47 двароў, пражывала 294 чалавекі. Не існуе з даваеннага часу.

АЗЁРЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Уваходзіла ў Тухінскае войтаўства. Тады ў вёсцы было 10 двароў і 82 жыхары. Побач, каля рэчкі, стаялі хутар (адзін двор) і леснічоўка. Пражывала 12 жыхароў. У 1898 г. ў вёсцы дзейнічала лесапільнае прадпрыемства. Уладальнікі — Гадзіцкі і яго нашчадкі. У 1900 г. на лесапільні працавалі 20 рабочых, а ў 1913 г. на ім мелася паравая машына ў 40 конскіх сіл. З 20 жніўня 1924 г. вёска Азёры — цэнтр Азярэцкага сельсавета. У 1944 г. адкрыта пачатковая школа, адноўлены калгас «VII з'езд Саветаў». З 1950 г. ўваходзіць у калгас «Іскра Ільіча». У 1995 г. у вёсцы 1 двор, 1 жыхар.

АЛЕКСАНДРЫЯ (РЭДЗЬКАЎШЧЫНА), в ё с к а. Узнікла ў выніку злучэння двух вёсак. У судовай справе 1607 г. называецца служба Рэдзькіна. (Служба — надзел зямлі, уладальнік якой павінен быў выконваць пэўныя павіннасці.) У дакуменце 1886 г. вёска мае назву Рэдзькаўшчына. Вёска Александрыя ў інвентар 1782 г. ўнесена як наноў пабудаваная. У ёй пражывала 43 мужчыны і 41 жанчына. У 1897 г. ў вёсцы Александрыя (Рэдзькаўшчына) налічвалася 16 двароў і 100 жыхароў. У 1961 г. адкрыта Рэдзькаўшчынская пачатковая школа. У 1995 г. ў вёсцы 7 двароў і 14 жыхароў. Брацкая магіла (увекавечана памяць 100 савецкіх воінаў). Вёска знаходзіцца ў складзе саўгаса «Прыдняпроўскі».

АЛЬХОЎКА, в ё с к а. У інвентар 1782 г. ўключана пад назвай Альховая Слабада, у спіс населеных пунктаў канца XVII ст. — пад назвай Альхоўка. У 1897 г. адносілася да Судзілавіцкага таварыства Новатухінскай воласці. У вёсцы ў той час было 8 двароў і 56 жыхароў. З 1931 г. пісьмовых звестак пра вёску няма.

АЛЯКСЕЙКІ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. праходзіць пад назвай Аляксейкі або Сільчкі. Уваходзіла ў склад Холбянскай воласці, належала сялянам. У анкету 1897 г. ўключана пад назвай Аляксейкі (Чарткі). У вёсцы тады было 19 двароў і 138 жыхароў. Цяпер у складзе саўгаса «Пры-дняпроўскі». У 1995 г. ў вёсцы 22 двары, 38 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

АНДРЫЯНАВА, в ё с к а. Вядома са спіса населеных пунктаў 1886 г. Адносілася да Высокаўскай воласці. У 1897 г. ў вёсцы было 38 двароў, 248 жыхароў. Да 1950 г. тут быў калгас Б174БелДРЭС», затым імя Молатава, цяпер брыгада калгаса «40 год Кастрычніка». З 1945 г. па 1954 г. у вёсцы працавала пачатковая школа. Цяпер тут 43 двары, 81 жыхар і ферма буйной рагатай жывёлы.

АНТОНЕНКІ, в ё с к а. У інвентар 1672 г. ўключана вёска Багданаўшчына, а ў інвентар 1782 г. — Багданаўшчына або Антоненкі. Адносілася да Холбянскай воласці і належала сялянам. У вёсцы жылі 73 жыхары. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска спалена. У 1944—1959 гг. тутэйшы калгас насіў імя Сталіна, затым увайшоў у саўгас «Арловічы». у 1984 г. ў вёсцы было 6 двароў, 9 жыхароў. Не існуе.

АНЦІПЕНКІ, в ё с к а. Вядома са спіса населеных пунктаў канца XVIII ст. Адно-

сілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1897 г. тут было 12 двароў, 94 жыхары. У 1933 г. арганізаваўся калгас «Чырвоны пераможца», які ў 1950 г. ўвайшоў у калгас «Беларусь». У 1995 г. ў вёсцы 15 двароў, 21 жыхар.

АРЛОВІЧЫ, в ё с к а. Вядома з судовай справы 1607 г. У 1875 г. вёску, 993 дзесяціны зямлі, у тым ліку 860 дзесяцін лесу, паром і вадзяны млын атрымаў у спадчыну генерал-лейтэнант Іван Аляксеевіч Андрыянаў. У 1897 г. ў цэнтры маёнтка быў адзін двор (6 дамоў, 35 жыхароў). У 1903, 1905—1907 гг. у Арловічах адбываліся рэвалюцыйныя выступленні батракоў. У 30-х гг. дзейнічаў саўгас «Арловічы», а ў 1943—1958 гг. — Арловіцкая МТС. У 1954 г. адкрыта пачатковая школа. У сакавіку 1959 г. створаны саўгас «Арловічы». У 1995 г. у вёсцы 128 двароў, 352 жыхары, будынак Валякоўскага сельсавета, кантора саўгаса, майстэрня, свіна-ферма, магазін, сталовая, сельскі Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, дзіцячы садок, парк. Брацкая магіла (увекавечана памяць 700 савецкіх воінаў).

АСІНАЎКА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Знаходзілася прыкладна за 2 км на захад ад цяперашняй чыгуначнай станцыі. У 1897 г. было 7 двароў, 52 жыхары.

16.11.1871 г. адкрыўся рух на Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Станцыя на Дубровеншчыне атрымала назву па блізляжачай вёсцы Асінаўка. У 1897 г. тут было 4 дамы, 33 жыхары. Вада падавалася з вадакачкі. Каля чыгункі — пасёлак (6 двароў, 30 жыхароў). У 1917 г. працаваў паравы млын, уладальнікам якога была Марыяна Іванаўна Сухаржэўская. Да Вялікай Айчыннай вайны была праложана вузкакалейка Асінторф — Асінаўка для перавозкі торфу. У 1935 г. жыхары арганізавалі калгас «Ленінец», які затым увайшоў у саўгас імя Ю. Смірнова. У 1995 г. ў Асінаўцы 76 двароў, 195 жыхароў, два магазіны, чыгуначны вакзал, аптова-гандлёвая база райпа, склады Дубровенскай сельгасхіміі.

Асінаўка — радзіма Героя Савецкага Саюза Івана Аўдзеевіча Ваекава (1919—1943). У гады Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічала падпольная камсамольская група, якая ўваходзіла ў склад Асінторфскага камсамольскага падполля.

АСІНТОРФ, п а с ё л а к. Паселішча вядома з 1672 г. як урочышча Востраў, а ў інвентары 1782 г. — Востраў Юр'еў. Паводле падання, названы ў гонар беглага селяніна Юркі і яго сыноў, знайшоўшых прытулак сярод непраходных тарфяных балот, а затым сасланых у Сібір за супраціўленне ўладам. У 1897 г. было 20 двароў, 151 жыхар. У 1918 г. Аршанскі чыгуначны вузел пачаў распрацоўку торфу непадалёку ад вёскі для патрэб чыгункі і Дубровенскай тэкстыльнай фабрыкі. У 1927 г. пачалося будаўніцтва БелДРЭС. Пуск першай чаргі — 8.11.1930 г. На здабычы торфу працавала пастаянна ці сезонна звыш 10 000 рабочых, якія жылі ў 11 пабудаваных пасёлках і навакольных вёсках. Добраўпарадкоўваўся і цэнтральны пасё-лак Асінторф (Асінторф) — былая вёска Востраў Юр'еў. З 1933 г. ў пасёлку меліся сярэдняя школа, бальніца, магазіны, сталовая. У гады вайны на Асінторфе дзейнічала падпольная камсамольская арганізацыя на чале са Станіславам Пятровічам Шмуглеўскім. У гонар падпольшчыкаў у 1966 г. на аўтамагістралі Мінск — Масква ўстаноўлены манумент. У 1995 г. ў пасёлку Асінторф 350 дамоў, 1700 жыхароў, сярэдняя школа, участковая бальніца, 6 магазінаў, сталовая, ляснічтва, пошта, філіялы ашчадбанка і камбіната бытавога абслугоўвання, клуб, бібліятэка, музей прадпрыемства, музе школы. Брацкая магіла.

АСТАШКАВІЧЫ, в ё с к а. Упершыню названа ў інвентары 1647—1648 гг. маёнтка Раманава. На той час было 44 двары. У 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці і належала сялянам. Сядзіба Асташкавічы належала графу Гайдэну. У вёсцы былі два млыны: вадзяны на рэчцы Ірвянічанцы і вятрак. У 1897 г. 58 двароў, 390 жыхароў, карчма. У 1915 г. дзейнічала

земскае аднакласнае вучылішча. Пасля вайны ў вёсцы працавала пачатковая, а з 1949 г. — няпоўная сярэдняя школа. У час калектывізацыі тут арганізаваны калгас «Чырвоная Ніва», затым калгас называўся «Бальшавік», з 1950 г. — імя Варашылава, які ў 1958 г. ўвайшоў у калгас імя Дзяржынскага. У 1995 г. 26 дамоў, 37 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Асташкавічы — радзіма Віктара Паўлавіча Грыбкоўскага (нарадзіўся 30.4.1932 г.), члена-карэспандэнта Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара.

АЎСЯНКІ, в ё с к а. Першыя звесткі аб ёй знойдзены ў інвентары 1782 г. У 1886 г. фальварак землеўладальніка Дзянісава ў Холбнянскай воласці, пры ім — млын-вятрак. Па анкеце ўсе — расійскага перапісу 1897 г. ў фальварку пры ручаі Каробкі — 1 двор (2 дамы, 7 жыхароў). Апошнія пісьмовыя звесткі адносяцца да 1908 г. Не існуе.

БАБІЧЫ, в ё с к а. Упершыню ўнесена ў спіс населеных пунктаў 1782 г. Стаяла пры ручаі Чыжоўка на поўнач ад вёскі Мардахі і адносілася да Мардашэвіцкага таварыства. У 1897 г. было 16 двароў, 94 жыхары. У 1939 г. пераселены ў іншыя вёскі.

БАБРОВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Пражывалі 171 мужчына і 140 жанчын. У 1897 г. 77 двароў, 536 жыхароў, школа пісьменнасці ў наёмнай сялянскай хаце, хлебазапасны магазін. У 1915 г. — земскае пачатковае вучылішча. У гады Вялікай Айчыннай вайны амаль поў-насцю знішчана. Але ўжо са снежня 1944 г. тут дзейнічала пачатковая школа, з 1961 г. — няпоўная сярэдняя школа. У 1944 г. адноўлены калгас «Авангард». з 1950 г. ў складзе калгаса імя Молатава, з 1956 — у калгасе імя Хрушчова, з 1964 г. — цэнтр калгаса «Прагрэс». У 1995 г. 136 двароў, 390 жыхароў, базавая 8-гадовая школа, сельскі клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, жывёлагадоўчы комплекс. Брацкая магіла (увекавечана памяць 1710 савецкіх воінаў). Каля вёскі — гарадзішча.

БАЕВА, в ё с к а. Вядома з 1560 г. У 1609 г. была пагранічным мястэчкам, дзе польская Рада сустракала рускіх паслоў. У той час праз Баева праходзіла дарога з Оршы. Тут быў млын. У 1718 г. Сапегамі пабудавана царква. У 1785 г. прыхажане пабудавалі другую царкву. У 1792 г. ў мястэчку было 78 сялянскіх двароў, у тым ліку яўрэйскіх — 17, стаяў вадзяны млын, пры ім — вінакурны завод (4 катлы — 1700 вёдраў віна ў год), хлебазапасны магазін. У 1869 г. адкрыта народнае вучылішча. Праз мястэчка праходзіў паштовы тракт з Лядоў у Горкі. У 1897 г. — цэнтр воласці і фальварак (належалі князю Любамірскаму). У мястэчку на той час было 145 двароў, 892 жыхары, 2 праваслаўныя царквы, капліца, яўрэйская малітоўная школа, царкоўная багадзельня, царкоўна-прыходская школа, фельчарскі ўчастак, валасное ўпраўленне, конскі двор, 2 хлебныя магазіны, вадзяны млын, тры млыны-ветракі, сукнавальня, крупадзёрня, 6 гандлёвых лавак, 6 кузняў, карчма. Праводзілася ярмарка ў 12-ю пятніцу пасля Вялікдня і таржкі па нядзелях.

Цяпер Баева — цэнтр Баеўскага сельсавета і калгаса імя Дзяржынскага. У 1995 г. 99 двароў, 291 жыхар, будынкі канторы калгаса і сельсавета, 8-гадовая школа, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, сельскі клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі і ашчадбанка, ферма буйной рагатай жывёлы, зернеток, майстэрня, сталовая. Брацкая магіла (увекавечана памяць 700 савецкіх воінаў).

Баева — радзіма Мікалая Аляксандравіча Гарулёва (1919—1980), беларускага пісьменніка.

БАЛОТНЯ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. як вёска Балотнікі Мардашэвіцкага войтаўства. У дакуменце канца XVIII ст. праходзіць пад назвай Балоціна, у 1886 г. — Балотня. Не існуе.

БАРАДЗІНО, в ё с к а. Вядома з інвентара канца XVIII — пачатку XIX ст. Згодна са звесткамі 1886 г. адносілася да

Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1896 г. налічвалася 13 двароў, 102 жыхары. Да 1950 г. ў вёсцы быў калгас «Новае Барадзіно», у 1950—1957 гг. у складзе калгаса «Звязда», з 1957 г. ў калгасе «Радзіма». Цяпер уваходзіць у калгас «Герой працы». У 1995 н. 21 двор, 35 жыхароў.

Барадзіно — радзіма Сяргея Іванавіча Назарава (нарадзіўся 14.10.1928 г.), акадэміка Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, доктара тэхнічных навук, прафесара.

БАРАДЗІНЦЫ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. называецца засценак Барадзінцы, у дакуменце 1886 г. — фальварак Барадзінцы. У 1897 г. ў фальварку Барадзінцы пры Дняпры быў адзін двор, пражывала 14 жыхароў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны паселішча не існуе. Ва ўрочышчы Барадзінцы да гэтага часу існуе «святая крыніца», якой людзі не толькі пакланяюцца, але і лечацца яе вадою.

БАРСТВІНАВА, в ё с к а. У інвентары 1782 г. праходзіць пад назвай Барсквінава. На той час пражывалі 41 мужчына і 31 жанчына. У анкеце 1897 г. значыцца сядзіба і фальварак Берасцянёва пры рацэ Днепр Холбнянскай воласці (1 двор, 2 дамы, 19 жыхароў), паромная пераправа. У 1995 г. ў вёсцы Барствінава 5 двароў, 8 жыхароў. Уваходзіць у саўгас «Арловічы».

БАРСУКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1886 г. адносілася да Дубровенскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. праз вёску праходзіў гандлёвы тракт Дуброўна — Баева. Было 67 двароў, 477 жыхароў. Царкоўна-прыходская школа, пастаялы двор. За 1950 г. ў складзе калгаса імя Суворава, з 1957 г. адносіцца да калгаса «Шлях да камунізму». З 1944 г. па 1961 г. у вёсцы была пачатковая школа. У 1995 г. 49 двароў, 89 жыхароў, магазін, жывёлагадоўчы комплекс.

БАТРАКОЎЦЫ, в ё с к а. Вядома з 1782 г. У анкеце 1897 г. праходзіць пад назвай Батракоўшчына каля ракі Днепр пры ручаі Чыжоўка. Двароў — 7, жыхароў — 51. Не існуе.

БАТУРОЎШЧЫНА, в ё с к а. У інвентары 1795 г. значыцца 35 мужчын і 30 жанчын. У 1886 г. адносілася да Холбнянскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. — 12 двароў, 93 жыхары. Існавала да 60-х гадоў.

БАЯРШЧЫНА-КСЦІШЧАВА, ф а л ь в а р а к. На карце Аршанскага павета канца XVIII — пачатку XIX ст. абазначана на дарозе паміж вёскамі Пішчыкі і Чырына. Не існуе.

БЕЛЬ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. На той час пражывалі 129 мужчын і 106 жанчын. У анкеце 1897 г. ўказана, што ў вёсцы 52 двары і 403 жыхары. У 1914 г. тут працаваў млын, які належаў селяніну Сямёну Мікітавічу Каслакову (магчыма Касмакову). У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. З 1944 г працавала пачатковая школа, аднавіўся калгас «Звязда» Бельскага сельсавета, з 1950 г. — у складзе калгаса імя Сталіна, а з 1959 г. ў саўгасе «Арловічы». У 1995 г. ў вёсцы 34 двары, 51 жыхар. Ферма буйной рагатай жывёлы.

Бель — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Тамары Ягораўны Дзенісенка (нарадзілася 9.1.1931 г.).

БЕРАЖАНЫ, в ё с к а. Упамінаецца ў дакументах пад 1794 г. Знаходзілася на левым беразе Дняпра паміж вёскамі Холаўе і Расасна. Дзейнічала ў той час гадзіннікавая мануфактура. У сувязі з вывазам мануфактуры ў вёску Купаўна пад Маскву, лёс вёскі Беражаны невядомы.

БЕРАСНІ, з а с ц е н а к. У 1782 г. тут жыло 32 чалавекі. Знаходзіўся засценак паміж вёскамі Лабаны і Кіраёва. Не існуе.

БОХАТАВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1897 г. адносілася да Андрыянаўскага таварыства Высокаўскай воласці (11 двароў, 63 жыхары). Арганізаваны ў 1930 г. калгас называўся «Чырвоны Гарадзец». У 1939 г. жыхароў перасялілі ў суседнюю вёску Новыя Галяшы (калгас «Парыжская камуна»).

БРУХАЎЦЫ, в ё с к а. У інвентары 1721 г. ўпамінаецца як засценак. Па перапісу 1897 г. было 38 двароў, 218 жыхароў. У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае

вучылішча. У красавіку 1931 года сяляне аб'ядналіся ў калгас «Чырвоныя горы», з 1950 г. — у складзе калгаса імя Будзённага, з 1960 г. — у складзе саўгаса «1 мая», а з 1964 г. ўваходзіць у саўгас імя Ю. Смірнова. У 1995 г. 12 двароў, 28 жыхароў.

БУДА Валяўкоўскага сельсавета, в ё с к а. Вядома з інвентара 1721 г. У 1782 г. пражывалі 47 мужчын і 41 жанчына. У 1886 г. адносілася да Холбнянскай воласці і належала сялянам. Па перапісу 1897 г. налічвалася 26 двароў і 173 жыхары. У 1944—1959 гг. вёскі Буда і Зазер'е былі аб'яднаны ў калгас імя Варашылава Бельскага сельсавета, затым увайшлі ў саўгас «Арловічы». З канца 60-х гадоў не існуе.

БУДА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. як засценак Буда-Петрытоўская. У інвентары 1722 г. значыцца вёска Буда. У 1897 г. 36 двароў, 266 жыхароў. Хлебазапасны магазін. З 1935 г. па 1956 г. у вёсцы — калгас «Ленінец» Арэхаўскага раёна, затым аддзяленне саўгаса «Межава» Аршанскага раёна. З 1964 г. — цэнтр саўгаса імя Ю. Смірнова. У 1944 г. ў вёсцы размяшчаліся ваеннапалонныя немцы (на будаўніцтве аўтамагістралі). З 1948 г. ў бараках працавала пачатковая школа, у 1955 г. пабудавана няпоўная сярэдняя школа. У 1995 г. ў вёсцы 157 двароў, 408 жыхароў, 2 малочна-таварныя фермы, 2 магазіны, клуб, бібліятэка, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок. Брацкая магіла (увекавечана памяць 2250 савецкіх воінаў). Помнікі: героям Асінторфскага камсамольскага падполля на аўтамагістралі Мінск — Масква, Герою Савецкага Саюза Юрыю Смірнову.

БУДЗІШЧА, з а с ц е н а к. Названы ў інвентары 1672 г. (паміж вёскамі Гарэлькі і Іскозы). Апошнія звесткі пра засценак выяўлены ў спісе населеных пунктаў Аршанскага павета канца XVIII ст. Згодна з інвентаром 1672 г. засценак Будзішча быў таксама каля вёскі Ерамееўшчына.

БУРАЯ, в ё с к а. У інвентары 1672 г. названа вёска Бурае. Уладальнік — пан ваявода Троцкі. У спісах населеных пунктаў Аршанскага павета канца XVIII ст. названа Бурае Сяло. У 1886 г. вёска адносілася да Дубровенскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 57 двароў, 356 жыхароў, школа пісьменнасці ў сялянскай хаце, хлебазапасны магазін. Да 1950 г. ў вёсцы быў калгас «2-я пяцігодка». Да 1964 г. — у складзе калгаса імя Хрушчова. Цяпер уваходзіць у калгас «Прагрэс». У 1995 г. 83 двары, 161 жыхар, жывёлагадоўчая ферма.

БЫСТРЫЁЎКА, в ё с к а. Упершыню названа ў судовай справе 1607 г. як Быстроўка. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1896 г. 44 двары, 292 жыхары, царкоўна-прыходская школа, пастаялы двор каля рэчкі Расасенка (1 дом на 10 чалавек). Да 1950 г. тут быў калгас «Бальшавік», затым вёска ўваходзіла ў склад калгаса імя Леніна, а з 1963 г. ў калгасе «Усход». У 1995 г. 52 двары, 104 жыхары, ферма буйной рагатай жывёлы.

БЯЛЯЕЎШЧЫНА, в ё с к а. Першыя пісьмовыя звесткі ў інвентары 1782 г. На той час ў вёсцы жылі 20 мужчын і 17 жанчын. Па звестках 1886 г. адносілася да Холбнянскай воласці і належала сялянам. Па перапісу 1897 г. 8 двароў, 56 жыхароў. Перастала існаваць у пасляваенны час.

БЯСКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 21 двор, 177 жыхароў. Да 1950 г. тутэйшы калгас насіў імя Будзённага, затым вёска ў складзе калгаса імя Суворава, а з 1957 г. у калгасе «Шлях да камунізму». У 1995 г. 19 двароў, 26 жыхароў.

ВАЛКАЛАКАВА, в ё с к а. Вядома з 1670 г. У 1886 г. адносілася да Дубровенскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 30 двароў, 208 жыхароў. З 1944 г. да 1961 г. дзейнічала пачатковая школа. Да 1956 г. — калгас «Камунар», затым у складзе калгаса імя Хрушчова, а з 1964 г. ў калгасе «Прагрэс». У 1995 г. 3 двары, 5 жыхароў.

ВАЛЬКАВА, в ё с к а. Вядома з 1755 г. у 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці і належала сялянам. Па перапісу 1897 г. знаходзілася пры ручаі Іватэ, у ёй было

25 двароў, 163 жыхары. Да 1950 г. — калгас «Ударнік», затым у калгасе імя Дзяржынскага. З канца 80-х гг. не існуе.

ВАЛЬКАЎШЧЫНА, ф а л ь в а р а к. Вядомы з інвентара 1731 г. У 1886 г. адносіўся да Дубровенскай воласці, належаў князю Любамірскаму. Па перапісу 1897 г. ўказана месца знаходжання фальварка — пры ручаі прасёлкавага тракта Дуброўна—Расасна (1 двор, 19 жыхароў). Не існуе.

ВАЛЯЎКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У 1886 г. адносілася да Холбнянскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 25 двароў, 164 жыхары. З 1944 г. да 1985 г. ў вёсцы дзейнічала няпоўная сярэдняя школа. Да 1950 г. — калгас «Чырвоны араты», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Варашылава. З 1959 г. — у складзе саўгаса «Арловічы». У 1995 г. 52 двары, 98 жыхароў, сельскі клуб, ферма буйной рагатай жывёлы.

ВЕЖКІ, в ё с к а. Упершыню называецца ў 1507 г. ў грамаце Вялікага князя Літоўскага Сігізмунда. Вёска падорана княгіні Еўпраксіі Мязецкай. У 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці, сядзіба належала князю Любамірскаму. У 1897 г. 38 двароў, 284 жыхары. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Барацьба за новае жыц-цё» З 1950 г. — цэнтр калгаса «Хваля рэвалюцыі», у 1957—1959 гг. — цэнтр калгаса «Дружба», затым уваходзіла ў калгас імя Фрунзе, а з 1960 г. — у складзе саўгаса «Зарубы» У 1995 г. 33 двары, 51 жыхар. Каля вёскі — старажытнае гарадзішча.

ВОЛЕВА, в ё с к а. Вядома з канца XVIII ст. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. Па перапісу 1897 г. 39 двароў, 270 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. 28.2.1931 г. тут быў арганізаваны калгас «Сталінскі прыліў», у 1950 г. ўвайшла ў калгас «Радзіма». Цяпер — у складзе калгаса «Герой працы». У 1944 г. адкрыта пачатковая школа. У 1995 г. 41 двор, 62 жыхары, свінагадоўчы комплекс.

ВОЎКАЎСКІ, з а с ц е н а к. Вядомы з канца XVIII ст. Знаходзіўся паміж г. Дуброўна і вёскай Загваздзіна. Не існуе.

ВУСЦЕ, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называецца абруб Вусцейскі. У інвентары 1782 г. ў засценку Вусце пражывалі 8 мужчын і 6 жанчын, а ў вёсцы Вусце — 140 мужчын і 144 жанчыны. У 1886 г. вёска адносілася да Холбнянскай воласці. У 1897 г. 69 двароў, 477 жыхароў. Да 1950 г. тут калгас «Чырвоны пераможца», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Чапаева, а з 1959 г. у калгас імя XXI з'езда КПСС. У 1995 г. 21 двор, 31 жыхар.

ВЯЛІКАЕ БАХАВА, в ё с к а. Вядома з 1886 г. Адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У анкеце 1897 г. указана месца знаходжання — пры ручаі Міластаўцы. На той час 53 двары, 350 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. З 1944 г. дзейнічала пачатковая школа. Да 1950 г. — калгас «Вольная праца». З 1950 г. па 1964 г. — цэнтр калгаса імя Свярдлова, затым — калгаса «Звязда», а з 1978 г. ўваходзіць у калгас «Праўда». У 1995 г. 59 двароў, 176 жыхароў, магазін мехток, ферма буйной рагатай жывёлы, жывёлагадоўчы комплекс, майстэрня. Помнік землякам, што загінулі пад час Вялікай Айчыннай вайны.

Радзіма Пятра Лявонавіча Чарвінскага (1911—1979), былога камандзіра партызанскай брыгады, сакратара Маскоўскага абкома КПСС, намесніка міністра геалогіі СССР, дэкана шахтна-будаўнічага факультэта Маскоўскага горнага інстытута, доктара навук, прафесара.

ВЯЛІКАЯ ДЗЯЦЕЛЬ,, в ё с к а (гл. в. Дзяцель).

ВЯЛІКАЯ ЛЫСКАЎКА, в ё с к а (гл. в. Лыскаўка).

ВЯЛІКАЕ САВІНА, в ё с к а (гл. в. М. Савіна).

ВЯЛІКІЯ САЛЕНІКІ, в ё с к а. Нанесена на карту канца XVIII ст. на паўднёвы захад ад вёскі Каўровая, каля ручая, і пазначана ў спісе населеных пунктаў таго часу. Не існуе.

ВЯЛІКАЕ ТХОРЫНА (ЗАМОСЬКІ), в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. як вёска Тхорына (95 жыхароў). У інвентары 1870 г. называецца вёска Замоскі, а ў

інвентары 1897 г. — вёска Вялікае Тхорына (Замоськi). 15 двароў, 103 жыхары, хлебазапасны магазін. 17.2.1931 г. Вялікае Тхорына і Малое Тхорына аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная змена». Цяпер у вёсцы Вялікае Тхорына, якая ўваходзіць у калгас «Іскра Ільіча», 8 двароў, 13 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

ВЯЧЭРЫНА, в ё с к а. Вядома з 1607 г. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 33 двары, 181 жыхар, царкоўна-прыходская школа. У 1915 г. земскае пачатковае вучылішча. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Чырвоны вячэрынец», затым вёска ў складзе калгаса «Радзіма», а з 1963 г. ўваходзіць у калгас «Герой працы». У вёсцы 22 двары, 45 жыхароў.

ГАГОКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1731 г. У 1886 г. адносілася да Холбянскай воласці і належала сялянам. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска знаходзіцца каля рэчкі Кабыліца, у ёй 17 двароў, 128 жыхароў. Да 1950 г. тут быў калгас імя Варашылава, затым калгас імя Сталіна Іскозскага сельсавета. Не існуе з канца 40-х гадоў.

ГАЛЯШЫ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. названы дзве вёскі — Галяшы Вялікія і Галяшы Малыя. У 1897 г. адносілася да Высокаўскай воласці Андрыянаўскага таварыства. У ёй было 22 двары, 168 жыхароў. Да 1950 г. тут быў калгас «Парыжская камуна», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Кагановіча, а з 1957 г. ў складзе калгаса «На варце» Пірагоўскага сельсавета. У 1995 г. 22 двары, 76 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

ГАНЧАРОВА, в ё с к а. Вядома з 1670 г. У 1795 г. ў вёсцы налічвалася 50 сем'яў. У 1884 г. ў вёсцы быў хлебазапасны магазін. У 1897 г. ў вёсцы Нова-Ганчарова (Наваселлі) пры рацэ Днепр — 28 двароў, 167 жыхароў. Сяляне займаліся калесніцтвам, рабілі колы. У вёсцы Старое Ганчарова пры рацэ Днепр — 67 двароў, 468 жыхароў, капліца, школа Пісьменнасці, хлебазапасны магазін. Сяляне займаліся бандарным промыслам, выраблялі лодкі, бочкі, вёдры, цэбры і г. д. Да 1954 г. мясцовы калгас называўся «Новы шлях», затым вёска ў складзе калгаса «Рассвет», з 1963 г. ў калгасе «Перамога» (з 1969 г. — саўгас «Перамога»). З 1994 г. ўваходзіць у саўгас-камбінат «Багратіёнаўскі». У 1995 г. 25 двароў, 44 жыхары.

ГАНЧАРОЎСКІ, з а с ц е н а к. Вядомы з інвентара 1795 г. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што засценак адносіцца да Карунnага таварыства (Карунны цяпер Карумны) і знаходзіцца каля чыгункі. У ім 42 двары, 307 жыхароў, хлебазапасны магазін. Засценак Ганчароўскі ўказваецца ў спісе населеных пунктаў 1918 г. Зараз не існуе. Хоць магчыма, што цяпер гэта вёска Засценкі.

ГАРАНЫ, в ё с к а. Называецца ў інвентары 1731 г. У 1795 г. пражывалі 63 мужчыны і 60 жанчын. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска размешчана каля ракі Днепр і адносіцца да Карунnага таварыства. У ёй 24 двары і 217 жыхароў. Не існуе з 70-х гадоў.

ГАРОШКАВА (Яланы), в ё с к а. У інвентары 1672 г. называецца займішча Гарошкава. У 1782 г. пражывалі 79 мужчын і 70 жанчын. У спісе населеных пунктаў 1872 г. названы вёскі Гарошкава і Яланы (належалі сялянам і адносіліся да Холбнянскай воласці). У анкеце 1897 г. адзначана адна вёска з двайной назвай Гарошкава (Яланы). У вёсцы 33 двары, 241 жыхар. У 1915 г. — земскае пачатковае вучылішча. З 1928 г. тут быў вапнавы завод, з 1944 г. па 1954 г. дзейнічала пачатковая школа. З 1944 г. ў вёсцы быў калгас «Наша перамога», з 1950 г. калгас насіў імя Сталіна, затым вёска ўваходзіла ў саўгас «Арловічы». Не існуе з 70-х гадоў.

ГАРЭЛЬКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1795 г. ў вёсцы жылі 76 мужчын, 72 жанчыны. У дакуменце 1886 г. адзначана, што вёска адносіцца да Холбнінскай воласці і належыць сялянам. У 1897 г. 29 двароў, пражывала 232 чалавекі. Да 1958 г. тутэйшы калгас называўся імя Сталіна, затым ўваходзіў ў калгас імя Суворава, з 1959 г. — у саўгас «Арловічы», а з 1964 г. — у саўгас імя Чарня-

хоўскага. У 1995 г. 16 двароў, 25 жыхароў.

ГІЧЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У вёсцы на той час жылі 47 мужчын і 43 жанчыны. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска знаходзіцца пры ручаі Вязаўка, у ёй 17 двароў, 136 жыхароў, карчма. З 1944 г. па 1960 г. дзейнічала пачатковая школа. Вёска паслядоўна ўваходзіла ў склад калгасаў «Запаветы Ільіча» і «Дружба», саўгаса «Перамога». З 1994 г. ў складзе саўгаса «Баграціёнаўскі». У 1995 г. 15 двароў, 22 жыхары, ферма буйной рагатай жывёлы.

ГЛАДКІЯ, в ё с к а. Вядома з карты Аршанскага павета канца XVIII ст. У 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці і належала сялянам. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска знаходзіцца каля рэчкі Любкінай, у ёй 12 двароў, 83 жыхары. Да 1959 г. — цэнтр калгаса «Гігант», затым у складзе гэтага калгаса. У 1995 г. 16 двароў, 22 жыхары, ферма буйной рагатай жывёлы, свінаферма.

ГЛАСАВА КАРПЕНІН, з а с ц е н а к. Указаны ў інвентары 1672 г. Мяркуецца, што знаходзіўся каля вёскі Русаны. Не існуе.

ГЛЕБАВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1722 г. З дакументаў 1886—1887 гг. вядома, што вёска адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У ёй тады быў млын-вяртак. У 1897 г. 39 двароў, 247 жыхароў, царкоўна-прыходская школа, пастаялы двор. 4.7.1931 г. тут быў створаны калгас «Майскі прыліў». З 1950 г. ў складзе калгаса «Радзіма», цяпер увахо-дзіла ў калгас «Герой працы». У 1995 г. 38 двароў, 45 жыхароў. Каля вёскі — курганны могільнік.

ГЛУШКОВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. як вёска Глухава. У спісе населеных пунктаў 1870 г. ўказваецца вёска Глушкова. Размяшчалася, па меркаванню, за 1 кіламетр на поўнач ад вёскі Русаны. Не існуе.

ГРАБЕНІКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска адносілася да Тхорынскага таварыства, у ёй 9 двароў, 53 жыхары. Праходзіць таксама па дакументу 1918 г. Не існуе.

ГУДАВА-ЗЕМЯНСКАЕ, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называецца вёска Гудава. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 23 двары, 128 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. З 1944 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. тут быў калгас «Аснова» Цілівіцкага сельсавета, затым вёска ў складзе калгаса імя Кірава. З 1963 г. ўваходзіць ў калгас «Праўда». У 1995 г. 30 дамоў, 53 жыхары, ферма буйной рагатай жывёлы, магазін.

ГУДАВА НОВАЕ, в ё с к а. Са спіса населеных пунктаў 1886 г. вядома, што вёска адносілася да Сваташыцкай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 22 двары, 138 жыхароў. Вёска тады называлася Гудава Мужычак. Да 1950 г. — калгас «Новае Гудава», затым у складзе калгаса імя Кірава, а з 1963 г. у калгасе «Праўда». У 1995 г. 28 двароў, 57 жыхароў, піларама.

ГУРАКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1731 г. У 1886 г. адносілася да Дубровенскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 43 двары, 322 жыхары, хлебазапасны магазін, сядзіба землеўладальніка, пастаялы двор. Пасля вайны тут была пачатковая школа. Да 1950 г. калгас «Чырвоны пуцілавец», затым імя Суворава. Цяпер уваходзіць у калгас «Шлях да камуніму». У 1995 г. 33 двары, 58 жыхароў, магазін, жывёлагадоўчая ферма.

ГУРЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1870 г., знаходзілася каля ручая Чыжоўка, паўднёвей вёскі Лабаны. У 1897 г. 13 двароў, 81 жыхар. Да Вялікай Айчыннай вайны вёска ўваходзіла ў калгас «Актывіст». Не існуе.

ДАБРЫНО, в ё с к а. У інвентары 1782 г. называецца вёска Дабрынец, у дакументах 1870 і 1897 гг. вёска Добрына каля ручая Дабранка, на ўсход ад вёскі Азёры. У вёсцы ў той час было 9 двароў, 64 жыхары. У 1882 г. маёнтак належаў Рэйнгольду, майстру-пчалаводу. Вёска ўказана таксама ў спісе. Не існуе.

ДАБРЫНЬ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1722 г. У спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. абазначана пад назвай Дабрыня. У 1897 г. адносілася да Сваташыцкай воласці. У ёй 37 двароў, 231 жыхар, царкоўна-прыходская школа і пастаялы двор. 1.1.1932 г. ў вёсцы быў арганізаваны калгас «Чырвоны барэц». З 1950 г. в. Дабрынь — цэнтральная сядзіба калгаса «Беларусь». З 1944 г. тут існавала пачатковая школа. У 1995 г. 11 шматкватэрных дамоў і 50 двароў, 281 жыхар, магазін, клуб, бібліятэка, сярэдняя школа, фельдшарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад. Помнік і брацкая магіла (увекавечана памяць 58 савецкіх воінаў).

ДАРОЖНАЯ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1721 г. як вёска Старая Тухінь. У інвентары 1795 г. называецца вёска Старая Тухінь, злучанаяз займішчам Плюшчына, у якой пражывалі 121 мужчына і 106 жанчын. У анкеце 1897 г. ў вёсцы Старая Тухінь пры ручаі Тухінка — 47 двароў, 347 жыхароў. Сядзіба землеўладальніка (2 двары, 14 жыхароў). Да 1950 г. тут быў калгас «Камінтэрн» Новатухінскага сельсавета, затым паслядоўна ўваходзіла ў калгасы імя Заслонава, «Іскра Ільіча», калгас і саўгас «Перамога». Цяпер у складзе саўгаса-камбіната «Багратіёнаўскі». У 1995 г. 19 двароў, 38 жыхароў.

ДЗЁМКІНА, в ё с к а. Вядома са спіса населеных пунктаў 1870 г. У анкеце 1897 г. абазначана як выселак, у якім 5 двароў, 39 жыхароў. У 1930 г. былі раскулачаны ўсе 30 сем'яў. У 30-я гг. трагічны лёс вёскі завяршыўся. Не існуе.

ДЗЯМ'ЯНКАВА, в ё с к а. Вядома з 1607 г. У 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска знаходзіцца каля рэчкі Перавалачка, у ёй 46 двароў, 341 жыхар. З 1944 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. тутэйшы калгас назывся «VI з'езд Саветаў». Затым вёска ўвайшла ў калгас імя Варашылава, з 1960 г. ў складзе саўгаса «Зарубы». У 1995 г. 20 двароў, 36 жыхароў.

ДЗЯЦЕЛЬ, в ё с к а. Пад такой назвай вёска ўпершыню ўпамінаецца ў судовай справе 1607 г. На карце Аршанскага павета канца XVIII ст. нанесены вёскі: Дзяцель Мужычая, Меншая Дзяцель Зямянская і Вялікая Дзяцель. У 1886 г. вёскі адносіліся да Сваташыцкай воласці. Згодна з перапісам 1897 г. ў Дзяцелі Мужычай было 35 двароў, 233 жыхары, царкоўна-прыходская школа, пастаялы двор каля вёскі. У фальварку каля рэчкі — 2 двары, 12 чалавек. У вёсцы Вялікая Дзяцель было 29 двароў, 184 жыхары, царкоўна-прыходская школа. У 1915 г. дзейнічала Дзяцельскае земскае вучылішча, з 1944 г. — пачатковая, з 1949 г. — няпоўная сярэдняя школа. Да 1956 г. ў вёсцы Дзяцель Мужычая дзейнічаў калгас «Уперад». У вёсцы Вялікая Дзяцель да 1950 г. быў калгас «Пераможца», затым імя Чкалава. З 1956 г. вёска Дзяцель — цэнтральная сядзіба калгаса імя XX з'езда КПСС. У 1995 г. 11 дамоў і 50 двароў, 2 жывёлагадоўчыя памяшканні, магазін, Дом культуры, бібліятэка, няпоўная сярэдняя школа, фельдчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок, сталовая. Помнік землякам, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ДНЯПРОЎКА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1721 г. як вёска Германы У 1782 г. пражывалі 99 мужчын і 107 жанчын. У анкеце 1897 г. ўказана, што вёска адносілася да Кіраёўскага таварыства, у ёй было 37 двароў і 198 жыхароў. З 1944 г. існавала пачатковая школа. Да 1950 г. тут быў калгас «Савет», затым вёска ўвайшла ў калгас імя К. Маркса, з 1963 г. ў складзе калгаса і саўгаса «Перамога». З 70-х гадоў не існуе. Каля былой вёскі — гарадзішча.

ЕРАМЕЕЎШЧЫНА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. названы адруб Верамееўскі і вёска Верамеева. У 1886 г. вёска адносілася да Сваташыцкай воласці. У 1897 г. 61 двор, 421 жыхар, хлебазапасны магазін. У 1915 г. — земскае пачатковае вучылішча, а з 1944 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. ў вёсцы дзейнічаў калгас «Чырвоны шлях», затым цэнтральная сядзіба калгаса «Шлях да камунізму». У 1995 г. 107 двароў, 332 жыхары, пачатковая школа, фельдчарска-акушэрскі пункт,

сельскі Дом культуры, бібліятэка, магазін, дзіцячы садок, жывёлагадоўчая ферма. Помнік землякам, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, брацкая магіла (увекавечана памяць трох савецкіх воінаў).

ЖЫБЫКІ, в ё с к а. Вядома з 1782 г. У 1897 г. 19 двароў, 146 жыхароў. У савецкі час уваходзіла ў калгас «Актывіст», цяпер — у саўгас імя Ю. Смірнова. У 1995 г. 65 двароў, 117 жыхароў.

ЖАЛЕЗКАВА, в ё с к а. Вядома з 1672 г. У 1867 г. Казлінская Юлія Сігізмундаўна па спадчыннасці атрымала вёску, 436 гектараў зямлі, у тым ліку 245 гектараў лесу і 2 карчмы. Вёска адносілася да Баеўскай воласці. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што яна знаходзілася каля ручая Бахараўка, 40 двароў, 241 жыхар. Сядзіба ўладальніцы і фальварак каля рэчкі Перавалачка (1 двор, 4 жылыя памяшканні, 21 чалавек, рымска-каталіцкая капліца, крупадзёрка, карчма. Да 1955 г. ў вёсцы была пачатковая школа. Да 1950 г. тут быў калгас імя Калініна, затым вёска ў складзе калгаса «Ударнік», а з 1965 г. ў саўгасе «Зарубы». У 1995 г. вёска перастала існаваць.

ЖАРНЕЎКА, в ё с к а. Упершыню нанесена на карту ў 1783 г. У 1886 г. адносілася да Саўскай воласці. З 1944 г. ў вёсцы была пачатковая школа. Да 1950 г. калгас «Багатыр», затым у складзе калгаса «Іскра», а з 1959 г. ў складзе калгаса «Гігант». У 1995 г. 10 двароў, 18 жыхароў.

ЖЫВАДЗЁРКІ (ЗАЛАТАВІЦКІ), ф а л ь в а р а к. Вядомы з 1795 г., знаходзіўся за 1,5 км на захад ад вёскі Страхі. З 1852 г. ўладальнік маёнтка Адамовіч Канстанцін, з 1886 г. — Казлінская Юлія Сігізмундаўна. У перапісе 1897 г. паселішча не названа.

ЗАБЕЖКІ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. названа як уноў населеная. У спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. называецца Засценак Забярэзніца-Забежкі, які адносіўся да Мардашэвіцкага войтаўства. У 1843 г. пражывалі 10 мужчын, аб жанчынах звестак няма. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што сядзіба Забежніца знаходзілася каля балота і чорнага ручая, у ёй адзін двор і пяць жыхароў. У вёсцы Забежкі, якая знаходзілася на поўнач ад в. Ступакі, латышы варылі піва. Перастала існаваць перад Вялікай Айчыннай вайной.

ЗАВОЛНЫ, в ё с к а. У 1782 г. адносілася да Мардашэвіцкага войтаўства. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска размешчана за 2 вярсты на поўнач ад чыгункі, каля ручая Заволынка і адносіцца да Ласыршчынскага таварыства. У ёй 15 двароў, 101 жыхар, кузня, карчма. Да Вялікай Айчыннай вайны тут была пачатковая школа, з 1944 г. пераведзена ў вёску Шалашына. Не існуе.

ЗАГВАЗДЗІНА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1886 г. адносілася да Дубровенскай воласці і належала сялянам. У 1897 г. 52 двары, 365 жыхароў, школа пісьменнасці ў сялянскай хаце, хлебазапасны магазін і піцейны дом. З 1944 г. да 1955 г. і з 1959 г. тут існавала пачатковая школа. Да 1950 г. мясцовы калгас называўся «Сталёвы», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Молатава, а з 1964 г. ў складзе калгаса «Прагрэс». У 1995 г. 31 двор, 69 жыхароў, жывёлагадоўчая ферма. Брацкая магіла (увекавечана памяць 206 савецкіх воінаў).

ЗАГРАДНА, в ё с к а. У інвентары 1782 г. называецца засценак Заградіца. У 1870 г. — вёска Заградна. Па анкеце 1897 г. знаходзілася за 2 км на паўночны захад ад вёскі Буда і адносілася да Парчавіцкага таварыства. У ёй на той час 2 двары і 21 жыхар. Пасля Вялікай Айчыннай вайны не існуе.

ЗАЗЕР'Е, в ё с к а. У інвентары 1782 г. праходзіць пад назвай Зазер'е або Куралі, у ёй 64 мужчыны і 69 жанчын. У 1886 г. адносілася да Холбнінскай воласці. У 1897 г. 29 двароў, 184 жанчыны. Да 1959 г. ў вёсках Буда і Зазер'е быў калгас імя Варашылава Бельскага сельсавета. Затым вёскі ўвайшлі ў саўгас «Арловічы». Не існуе з 70-х гг.

ЗАЙМІШЧА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1647—1648 гг. У ёй тады было 6 двароў. У 1886 г. адносілася да Баеўскай

воласці і знаходзілася на рэчцы Пераваlачка. Побач была сядзіба графа Гайдэна. У 1897 г. 29 двароў, 100 жыхароў. У 1915 г. земскае пачатковае вучылішча. Увахо-дзіла ў калгас «Гігант». З 70-х гг. не існуе.

ЗАЛАТАВІЧЫ, в ё с к а. У 1494 г. Вялікі князь Аляксандр падараваў вёску смаленскаму баярыну Сеньку Цераховічу. У судовай справе 1607 г. названа служба Залатавіцкая. У 1886 г. адносілася да Баеўскай воласці. У 1897 г. 27 двароў, 181 жыхар. 25.4.1931 г. ў вёсцы быў арганізаваны калгас «1 Мая», з 1950 г. ў складзе калгаса «Барэц» Іскозскага сельсавета, з 1959 г. ў саўгасе «Арловічы», з 1964 г. ў саўгасе «Прыдняпроўскі». У 1995 г. 6 двароў, 9 жыхароў. Брацкая магіла (увекавечана памяць 37 савецкіх воінаў).

ЗАМОСЬКІ, в ё с к а. (гл. вёска Вялікае Тхорына).

ЗАПОЛЛЕ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У 1897 г. фальварак (2 двары, 15 жыхароў), паравы мукамольны млын, кузня. 28.2.1932 г. створаны калгас «Ударнік» Азярэцкага сельсавета. З 1950 г. ў складзе калгаса «Іскра Ільіча». Не існуе з канца 80-х гг.

ЗАРУБЫ, в ё с к а. 28.11.1534 г. ўладальнік маёнтка Дуброўна Ян Глябовіч разглядаў скаргу сялян Расасенскай воласці на зарубскага папа. У судовай справе 1607 г. паселішча названа сялом, аднак у далейшым праходзіць як фальварак. Вінакурнае прадпрыемства працавала тут у 1750—1884 гг., уладальнікам яго быў князь Яўген Любамірскі. У 1863 г. ў фальварку Зарубы князя Любамірскага адбыўся сход паўстанцаў К. Каліноўскага. У анкеце 1897 г. называюцца ўладальніцкая сядзіба і фальварак на рацэ Расасенка (1 двор, 5 жылых памяшканняў, 66 жыхароў), 2 праваслаўныя капліцы. У 1914 г. ў фальварку працаваў сыраварны завод (80 пудоў у год). У пачатку 20-х гг. XX ст. тут існавала камуна. З 1922 г. дзейнічала няпоўная сярэдняя школа, з 1939 г. — сярэдняя школа. У 1932 г. на льнозаводзе вёскі Зарубы працавала 96 рабочых. З 1934 г. па 1941 г. і 1944 г. па 1958 г. дзейнічала Зарубская МТС. Пасля вайны адкрылася сямігодка, з 1946 — сярэдняя школа. У 30-я і 1944—1950-я гг. тут быў калгас «Перамога», затым калгас імя Фрунзе. З сакавіка 1960 г. — цэнтральная сядзіба саўгаса «Зарубы». У 1995 г. ў вёсцы 180 двароў, 460 жыхароў, будынкі канторы саўгаса і сельскага Савета, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, 3 магазіны, майстэрня, лазня, комплекс складскіх памяшканняў і сушыльнай гаспадаркі, жывёлагадоўчы комплекс, аддзяленні сувязі і ашчадбанка, сталовая, фельдчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок. Брацкая магіла (увекавечана памяць 36 савецкіх воінаў).

Зарубы — радзіма Уладзіміра Аляксандравіча Гераіменкі (н. 18.10.1955) — доктара філасофскіх навук.

ЗАСЦЕНАК ЮР'ЕЎ, в ё с к а. Вядома са спіса населеных пунктаў 1800 г. У 1886 г. адносілася да Дубровенскай воласці. У 1897 г. 15 двароў, 77 жыхароў. Да 1950 г. тут калгас «Чырвоныя Засценкі» Савінскага сельсавета, затым у складзе калгаса імя Молатава, з 1964 г. ў складзе калгаса «Прагрэс». Не існуе з 70-х гг.

Засценак Юр'еў — радзіма Кацярыны Захараўны Рубіцель (н. 5.12.1924 г.), Героя Сацыялістычнай Працы (1966 г.).

ЗАСЦЕНКІ, в ё с к а. Вядома са спіса населеных пунктаў 1870 г. з 5.5.1931 г. тут дзейнічаў калгас «Перадавік» Баеўскага сельсавета, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Жданава, з 1960 г. ў саўгасе «Зарубы». У 1944 г. адкрылася пачатковая школа. Вёска не існуе з анца 80-х гг.

ЗАСЦЕНКІ, в ё с к а. У дакументах дарэвалюцыйнага часу населены пункт не называецца. У 1931 г. 3 двары, тады ж арганізаваўся калгас «Новая вёска». У 1934 г. пачалося перасяленне ў вёску з хутароў. У тым жа годзе паміж вёскамі Засценкі і Карумны была пабудавана пачатковая школа, з 1936 г. — няпоўная сярэдняя (Карумнаўская). З 1950 г. ў складзе калгаса імя Заслонава, з 1954 г. ў калгасе «Рассвет», з 1963 г. — цэнтральная сядзіба калгаса (з 1969 г. — саўгаса) «Перамога» Засценкаўскага сельсавета. З 1994 г. ў складзе саўгаса-камбіната «Баг-

раціёнаўскі». У 1995 г. 80 двароў, 296 жыхароў, сярэдняя школа, будынак сельскага Савета, сельскі Дом культуры, бібліятэка, фельдчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок, ферма буной рагатай жывёлы. Помнік землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ЗАЎЯЛЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара канца XVIII ст. У анкеце 1897 г. ўказана, што вёска знаходзілася за вярсту ад чыгункі (на захад ад вёскі Буда). У ёй 18 двароў, 119 жыхароў. У 1935 г. тут арганізаваны калгас «Ленінец». Да Вялікай Айчыннай вайны была пачатковая, затым сямігадовая школа, у якой працавала заслужаная настаўніца школ БССР Марыя Фёдараўна Ларыёнава. Не існуе.

ІВАНАВІЧЫ, ф а л ь в а р а к. Вядомы з дакумента 1595 г. У 1886 г. адносіўся да Сваташыцкай воласці. Уладальнікам фальварка быў князь Любамірскі. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў фальварку пры ручаі 2 двар і 8 жыхароў (паміж вёскамі Быстрыёўка і Гладкія). 9.11.1907 г. ў фальварку адбылася забастоўка. Цяпер не існуе.

ІВАНОЎШЧЫНА, в ё с к а. У інвентары 1795 г. названа як уноў пабудаваная. У ёй 20 мужчын і 31 жанчына. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Іваноўшчына Новатухінскай воласці (пры рацэ Днепр) 15 двароў, 103 жыхары. Да 1950 г. тут калгас імя Калініна, затым імя Карла Маркса, з 1963 г. — у калгасе, затым саўгасе «Перамога». З 1994 г. ў саўгасе «Багратіёнаўскі». У 1995 г. 1 двор, 3 жыхары.

ІРВЯНІЦА, в ё с к а. У звестках 1607 г. і 1672 г. называецца вёска Арвяніца. У 1897 г. ў вёсцы каля ракі Ірвянічанка — 40 двароў, 287 жыхароў. У 1914 г. ў вёсцы не было калодзежнай вады, яе бралі з балотнай рэчкі. У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча, з 1944 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. мясцовы калгас называўся «Працаўнік», затым цэнтральная сядзіба калгаса «Кастрычнік». З 1977 г. ў складзе калгаса імя Дзяржынскага. У 1995 г. ў вёсцы 52 двары, 137 жыхароў, магазін, сельскі клуб, бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы. Тут выяўлена старажытнае гарадзішча. У вёсцы брацкая магіла (увекавечана памяць 8 савецкіх воінаў) і помнік, які ўшаноўвае памяць воінаў-землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ІСКОЗЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. У 1886 г. адносілася да Холбнянскай воласці, мела ветраны млын. У 1897 г. 53 двары, 334 жыхары. У 1915 г. працавала земскае пачатковае вучылішча. У 1931 г. створаны калгас «Ударнік пяцігодкі». У 1935 годзе тут была торфаарцель (44 чал.). З 1950 г. — цэнтральная сядзіба калгаса імя Калініна, з 1963 г. — калгаса «Ударнік». З 1965 г. ў складзе саўгаса «Зарубы». З 1944 г. — пачатковая, з 1949 г. — няпоўная сярэдняя школа. У 1995 г. 39 двароў, 87 жыхароў, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, клуб, ферма буйной рагатай жывёлы.

КАВАЛЕЎШЧЫНА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Уваходзіла ў Мардашэвіцкае войтаўства. У анкеце 1897 г. ўказана, што вёска знаходзілася за вярсту ад паштовага тракта Асінаўка — Дуброўна, каля ручая Чыжоўка (на захадзе ад вёскі Цеалін). У ёй 13 двароў, 97 жыхароў. У 1939 г. тутэйшыя жыхары пераселены ў навакольныя вёскі. Не існуе.

КАЗАРЫНАВА, в ё с к а. У судовай справе 1534 г. гаворыцца, што Іван Фёдаравіч Казарын прадаў Яну Юр'евічу Глябовічу свой двор Снегіроўшчыну на рацэ Расасенка. Магчыма, што вёска носіць яго імя. У 1607 г. быў вадзяны млын, у 1672 г. млына не было. У 1886 г. вёска і сядзіба землеўладальніка адносіліся да Баеўскай воласці. У 1897 г. 27 двароў, 183 жыхары, вадзяны млын, таварыства сялян. Да 1956 г. тутэйшы калгас насіў імя Варашылава, затым «Новае жыццё». З 1960 г. у складзе саўгаса «Зарубы». У 1995 г. 7 двароў, 13 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

КАЗЛОЎШЧЫНА, в ё с к а. Вядома з карты і спіса населеных пунктаў канца

XVIII ст. Тады ў ёй было 11 двароў, 74 жыхары. Знаходзідася на захад ад вёскі Вялікае Бахава за рэчкай. У 20-х гг. нашага стагоддзя на тым месцы былі хутары. Не існуе.

КАЗЛЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1647—1648 гг. Раманаўскага маёнтка. У вёсцы было 5 двароў. У 1886 г. адносілася да Саўскай воласці. У анкеце 1897 г. называецца Леснічоўка Казлы на зямлі князя Дандукова (1 двор, 2 жыхары). Да 1950 г. калгас «Гігант», затым у складзе калгаса імя Дзяржынскага Баеўскага сельсавета. У 1995 г. 36 двароў, 65 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

КАЗЬЯНЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У вёсцы тады пражывалі 71 мужчыны і 74 жанчыны. У 1861 г. — паштовая станцыя. У інвентары 1886 г. называецца фальварак Казьяны, карчма Піваварава Захара Андрэевіча, другая карчма належала князю Любамірскаму. Вінакурная вытворчасць, заснаваная ў 1915 г. ветраны млын належалі Піваварава Захару. У 1886 г. тут адбыліся сялянскія хваляванні супраць князя Любамірскага. У 1897 г. — уладальніцкая сядзіба, фальварак (1 двор, 7 памяшканняў, 56 жыхароў, кузня, карчма). У вёсцы было 69 двароў, 523 жыхары. З 1930 г. — калгас «Перамога», з 1950 г. — калгас «Ударнік», з 1964 г. — у складзе саўгаса імя Яарняхоўскага. У 1995 г. 55 двароў, 112 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы, комплекс складскіх памяшканняў.

КАЛАТОЎКІ, в ё с к а. У інвентары 1672 г. названы засценак Калатоўка. У спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. называюцца Вялікія і Малыя Калатоўкі. У 1886 г. вёска адносілася да Холбнянскай воласці. У 1897 г. 15 двароў, 123 жыхары. 29.4.1931 г. тут арганізаваны калгас «Іспанскі пралетарыят» Іскозскага сельсавета, з 1950 г. — калгас імя Сталіна. З 1964 г. ў складзе саўгаса імя Чарняхоўскага. З 70-х гг. вёска не існуе.

КАЛІНАЎКА, в ё с к а. У судовай справе 1538 г. называецца Кабылеі — маёнтак пана Івана Сапегі. У 1897 г. — 49 двароў, 323 жыхары. Да 1950 г. тут калгас «Прамень», затым «Чырвоны сцяг». Расткоўскага сельсавета. З 1960 г. у складзе саўгаса «Зарубы». З 13.1.1964 г. — цэнтральная сядзіба саўгаса імя Чарняхоўскага. У 1995 г. 147 двароў, 368 жыхароў, адміністрацыйны будынак саўгаса, сярэдняя школа, сельскі Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, пошта, філіялы ашчадбанка, сталовая, фельчарска-акушэрскі пункт, два магазіны, мехмайстэрня, лазня, комплекс памяшканняў для буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла (увекавечана памяць 793 савецкіх воінаў), помнік землякам, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, помнік генералу арміі І. Д. Чарняхоўскаму.

КАМАРЫ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. называецца вёска Камароўшчына, магчыма, гэта першапачатковая назва. У спісе канца XVIII ст. ўключана пад цяперашняй назвай. Адносілася да Холюнянскай воласці і знаходзілася за 1,5 км на ўсход ад вёскі Валяўкі. У 1897 г. 11 двароў, 61 жыхар. Да 1950 г. — калгас «Перамога», затым імя Варашылава Бельскага сельсавета. З 1959 г. ў складзе саўгаса «Арловічы». Не існуе з 70-х гг.

КАРАБАНАВІЧЫ, в ё с к а. Упамінаецца ў судовай справе 1607 г. У 1897 г. 75 двароў, 564 жыхары. У 1915 г. — земскае пачатковае вучылішча, з 1944 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. — калгас «Рассвет», затым у складзе калгаса «Шлях да камунізма». У 1995 г. 47 двароў, 78 жыхароў, магазін, жывёлагадоўчая ферма. Каля вёскі — два гарадзішчы.

КАРАГІНАВА, х у т а р. У дакументах дарэвалюцыйнага часу паселішча не названа. Хутар знаходзіўся за 0,5 км на поўнач ад в. Старая Тухінь. У Вялікую Айчынную вайну быў знішчаны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вайны не адрадзіўся.

КАРАНЬКОЎШЧЫНА, х у т а р. Вядомы з 1886 г. У анкеце 1897 г. называецца сядзіба каля в. Холбні (1 двор, 7 жыхароў), пасад і піцейны дом. Не існуе.

КАРОБКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Пражывалі 64 мужчыны, 62 жан-

чыны. Згодна з анкетай 1897 г. ў вёсцы Каробкі (Панцялееўшчына) 38 двароў, 215 жыхароў. Да 1950 г. — калгас «Іскра», затым — імя Варашылава Бельскага сельсавета. З 1959 г. ў складзе саўгаса «Арловічы». У 1995 г. 20 двароў, 34 жыхары, ферма байной рагатай жывёлы.

Каробкі — радзіма Мікалая Іванавіча Ісакава (31.1.1964—29.4.1984), які загінуў у Афганістане.

КАРУМНЫ, в ё с к а. У інвентары 1795 г. звесткі пра населены пункт неадназначныя. Называюцца засценак Камароўскі, або Каруннае, засценак Пацеўнскі, злучаны з Карунным, засценак Якушаў, злучаны з Карунным. У 1897 г. ў вёсцы Карунна (так у анкеце) 28 двароў, 213 жыхароў. У 1934 г. паміж вёскамі Засценкі і Карумны пабудавана пачатковая школа, з 1936 г. дзейнічала няпоўная сярэдняя школа. Да 1950 г. — калгас «Дняпроўскае пабярэжжа», затым вёска ўваходзіла ў калгас імя Заслонава, з 1954 г. у складзе калгаса «Рассвет», з 1963 г. ў калгасе, затым у саўгасе «Перамога». З 1994 г. ў саўгасе «Багратыёнаўскі». У 1995 г. 10 двароў, 10 жыхароў.

На мясцовых могілках пахаваны ўраджэнец вёскі Гарошкава Герой Савецкага Саюза Іван Дзмітрыевіч Кандрацьеў.

КАЎРОВАЯ, в ё с к а. Вядома з дакументаў канца XVIII ст. і 1886 г. як вёска Дзяругі Сваташыцкай воласці. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Дзяругі на ручаі Дамініца 33 двары, 216 жыхароў. У 1944 г. ў мясцовым калгасе «Ударнік» было 230 працаздольных. З 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Уперад», а з 13.2.1956 г. ўваходзіць у калгас імя XX з'езда КПСС. У 1995 г. 49 двароў, 92 жыхары, магазін, жывёлагадоўчае памяшканне. Каля вёскі — гарадзішча.

Каўровая — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Ефрасінні Яфрэмаўны Маршалавай (н. 3.3.1919).

КІРАЁВА, в ё с к а. Звесткі пра яе ў дакументе 1721 г. У 1897 г. ў вёсцы пры ручаі Чыжоўка 26 двароў, 190 жыхароў. Тут жа сядзіба князя Любамірскага, хлебазапасны магазін, школа пісьменнасці. Да 1950 г. тут быў калгас «Новы быт», затым калгас імя Заслонава, цяпер увахо-дзіць у калгас «Іскра Ільіча». У 1995 г. 5 двароў, 6 жыхароў. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска знаходзілася на пярэднім краі супрацьстаяння савецкіх і нямецкіх войск.

Кіраёва — радзіма Міхаіла Аляксандравіча Мінковіча (1914—1971), які быў міністрам культуры БССР.

КІСЯЛІ, в ё с к а. Вядома з інвентароў 1672 г. і 1782 г. як вёска Кісялёва. У дакументе 1880 г. называецца вёска Кісялі. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Кісялі пры рэчцы Мярэі Баеўскай воласці 30 двароў, 187 жыхароў, праваслаўная царква Успення Прасвятой Багародзіцы, вадзяны млын і карчма. За 1 км ад вёскі хутар (3 чалавекі) каля рэчкі Мярэі, сукнавальня і вадзяны млын. У фальварку каля рэчкі адзін двор, 13 жыхароў. У 1910 г. замест старой была пабудавана новая драўляная царква (спалена ў гады Вялікай Айчыннай вайны). У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Кастрычнік», з 1950 г. у складзе калгаса «Барэц» Іскозскага сельсавета, з 1959 г. ўваходзіла ў саўгас «Арловічы», з 1964 г. у саўгасе «Прыдняпроўскі». У 1995 г. 2 двары, 2 жыхары.

КЛІМЕНКІ, в ё с к а (гл. в. Лазараўка).

КЛЯНЫ, в ё с к а. Упершыню ўключана ў інвентар 1726 г. У 1897 г. 47 двароў, 309 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. У 1915 г. было земскае пачатковае вучылішча. З 1944 г. пачатковая, з 1946 г. няпоўная сярэдняя школа. Да 1950 г. калгас «Чырвоныя Кляны», затым калгас імя Леніна. З 1963 г. ўваходзіць у калгас «Усход». У 1995 г. 49 двароў, 93 жыхары, будынак Кляноўскага сельскага савета, участковая бальніца, аптэка, няпоўная сярэдняя школа, магазін, пошта. Брацкая магіла (увекавечана памяць 149 савецкіх воінаў).

Кляны — радзіма Аляксея Ануфрыевіча Дударава (н. 6.6.1950 г.), драматурга, члена Саюза пісьменнікаў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, старшыні Беларускага саюза тэатральных дзеячаў.

КОБЫЗЕВА, в ё с к а. Вядома з судовай справы 1607 г. У 1843 г. належала князю Сцяпану Любамірскаму. У 1886 г. адносілася да Сваташыцкай воласці, належала сялянам, а фальварак Козбызаўскі — землеўладальніку Фон-Валю. У анкеце 1897 г. азначана вёска каля ручая Красны Лог (47 двароў, 302 жыхары, капліца, царкоўна-прыходская школа, фальварак Кобызева Валенцілава, у якім 2 двары, 13 жыхароў). Да 1950 г. тут калгас «VII з'езд Саветаў», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Кірава, з 1963 г. у складзе калгаса «Праўда». У 1995 г. 36 двароў, 64 жыхары, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

КОПАНІК, в ё с к а. Да савецкага часу ў дакументах не згадваецца. Да 1950 г. тут калгас «Чырвоны ўдарнік» Бельскага сельсавета, затым у складзе калгаса імя Варашылава. З 1959 г. ў складзе саўгаса «Арловічы». Не існуе з 70-х гг.

КОПЦІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У 1897 г. 20 двароў, 141 жыхар, хлебазапасны магазін. Да 1950 г. разам з вёскай Лапыры ўваходзілі ў калгас імя Калініна Мардашэвіцкага сельсавета. Цяпер у калгасе «На варце». З 1944 г. працавала пачатковая школа. У 1995 г. 36 двароў, 36 жыхароў, малочнатаварная ферма, магазін.

КОРАБАВА, в ё с к а. Вядома з судовай справы 1607 г. На карце канца XVIII ст. нанесена каля вёскі Юкава. Не існуе.

КОРШЫКАВА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называецца вёска Корсакава (у іншых дакументах XVIII—XIX ст. як Коржыкі, Коржыкава). У анкеце 1897 г. ўказваецца, што вёска размешчана каля рэчкі Перавалачнай, у ёй 51 двор, 386 жыхароў. У 1915 г. тут было земскае пачатковае вучылішча, з 1945 г. па 1950 г. і з 1958 г. — пачатковая школа. Да 1950 г. — калгас «Прагрэс» Баеўскага сельсавета, затым калгас імя Жданава. З 1960 г. ў складзе саўгаса «Зарубы». У 1995 г. 67 двароў, 121 жыхар, аддзяленне сувязі, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы, комплекс складскіх памяшканняў.

КОСЦІНА, в ё с к а. Вядома з 1782 г. Тады ў вёсцы пражывалі 3 мужчына і 32 жанчыны. У 1897 г. 10 двароў, 56 жыхароў, непадалёку ад вёскі — капліца. Да 1950 г. сяляне вёсак Косціна і Кіраёва былі аб'яднаны ў калгас «Новы быт», затым увайшлі ў калгас імя Заслонава. Цяпер у складзе калгаса «Іскра Ільіча». У 1995 г. 20 двароў, 32 жыхары, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. У 1944 г. каля гэтай вёскі закрыў амбразуру варожага дзота сваім целам А. М. Васільеў. Непадалёку ад вёскі каля аўтамагістралі Мінск — Масква — Мінск установлены помнік 11 воінам-сапёрам, што загінулі пры размініраванні пасля вызвалення.

КОТАЎШЧЫНА, в ё с к а (гл. вёска Салаўі).

КРАШЫНШЧЫНА, в ё с к а. Згодна з інвентарамі 1731 г. і 1800 г. населены пункт знаходзіўся паміж вёскамі Ірвяніца і Людзінічы. Далейшы лёс вёскі невядомы.

КРОЦІКІ, в ё с к а. Упершыню ўпамінаецца ў інвентары 1731 г. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы 19 двароў, 126 жыхароў. Да 1950 г. — калгас «Іскра» Сазонаўскага сельсавета, з 1950 г. калгас «Прамень». З 1964 г. ўваходзіць у саўгас «Прыдняпроўскі». У 1995 г. 12 двароў, 23 жыхары.

КУЛАКОЎШЧЫНА, в ё с к а. Вядома з карты канца XVIII ст. Дакумент 1886 г. сведчыць, што вёска адносілася да Баеўскай воласці. Фальварак і карчма належалі графу Гейдэну. Па анкеце 1897 г. ў пасёлку Кулакоўшчына пры ручаі Пльхоўка 22 двары, 130 жыхароў, ветраны млын. Вёска ўваходзіць у калгас «Гігант». У ёй 12 двароў, 14 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

ЛАБАНЫ, в ё с к а. Упершыню ўпамінаецца ў інвентары 1782 г. У 1897 г. 31 двор, 176 жыхароў. Побач — рабочая казарма. Да 1950 г. — калгас «Звязда», затым «Ленінец». З 1964 г. ў складзе саўгаса імя Ю. Смірнова. У 1995 г. 19 двароў, 31 жыхар, ферма буйной рагатай жывёлы.

Подзвіг юнака

Шэсць варожых эшалонаў скінулі пад адхон міны, пастаўленыя рукамі юнага партызана Мішы Капелькі. Сотні захопнікаў забітымі і параненымі занесены на баявы рахунак народнага мсціўца, які пакляўся скідваць пад адхон фашысцкія эшалоны ля сваёй роднай вёскі.

Не давялося Мішу дажыць да перамогі над захопнікамі. Але не забыты ратныя подзвігі юнага партызана, разведчыка, падрыўніка і кулямётчыка Смаленскага партызанскага палка Спадчыкава. Вось што запісана ў яго баявой характарыстыцы: «Удзельнічаў у якасці кулямётчыка ў48 баявых аперацыях і забіў 30 немцаў. Асабліва вызначыўся пры разгроме варожых гарнізонаў мястэчка Любавічы, вёскі Расходная 18.7.43 г., вёскі Валосава 21.7.43 г., дзе забіў 6 гітлераўцаў, 12 разоў удзельнічаў у падрыве падземнага кабеля Берлін — фронт...».

Радзіма ўзнагародзіла адважнага партызана ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны, медалямі.

Цяпер у вёсцы Лабаны брыгада саўгаса імя Смірнова. А на яе ўскраіне, у некалькіх метрах ад сталёвых рэек чыгуначнай магістралі, узвышаецца абеліск над магілай партызана. На ім надпіс: «Жывыя табе бязмежна ўдзячны...».

С. Аляксееў.

ЛАЗАРАЎКА (КЛІМЕНКІ), в ё с- к а. У інвентары 1672 г. называецца служба Лазараўская, у інвентары 1782 г. — фальварак Лазараўка. Анкета 1897 г. сведчыць, што ў вёсцы пры рацэ Днепр было 26 двароў, 176 жыхароў. У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Рассвет». Затым вёска ўваходзіць у калгас імя Жданава, з 1959 г. ў саўгас «Арловічы», з 1964 г. — у саўгас «Прыдняпроўскі». У 1984 г. 5 двароў, 6 жыхароў. Не існуе.

ЛАНЕНКА, в ё с к а. У інвентары і на карце канца XVIII ст. — Ланенка. У ліставадзе 1812 г. тут пад час праследавання войск Напалеона адпачываў галоўнакамандуючы рускімі войскамі М. І. Кутузаў. У анкеце 1897 г. ўказана, што ў вёсцы Ланенка пры рацэ Проня 52 двары, 354 жыхары, 2 царквы, царкоўна-прыходская школа, 1 кастрычніка (па старому стылю) тут штогод праводзіўся кірмаш. У снежні 1928 г. ў вёсцы арганізаваўся калгас «Чырвоная ніва». У жніўні 1944 г. адкрыта пачатковая школа. З 1950 г. вёска ўваходзіць у калгас «Беларусь». У 1995 г. 50 двароў, 84 жыхары, магазін.

ЛАПІРОЎШЧЫНА, в ё с к а. У інвентары 1672 г. называецца вёска Лапырова. На карце і ў спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. занесена вёска Лапыроўшчына. Згодна з перапісам 1897 г. ў вёсцы 27 двароў, 188 жыхароў. 6.6.1928 г. тут арганізаваны калгас «Чырвоная ніва». У верасні 1944 г. адкрыта пачатковая школа. Цяпер вёска ў складзе калгаса імя Дзяржынскага. У ёй 20 двароў, 36 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы..

ЛАПЫРЫ, в ё с к а. Звесткі аб ёй знойдзены ў інвентары 1782 г. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Лапыры каля ручая Чыжоўка 6 двароў, 43 жыхары. Да 1950 г. ўваходзіла ў калгас «Чырвонае пабярэжжа» Мардашэвіцкага сельсавета, затым у калгас імя Будзённага. З 1950 г. ў складзе саўгаса «1 Мая», з 1964 г. — у саўгасе імя Ю. Смірнова. У 1995 г. ў вёсцы 23 двары, 39 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

ЛАСЫРШЧЫКІ, в ё с к а. Першыя пісьмовыя звесткі аб ёй знойдзены ў спісе населеных рунктаў 1870 г. У дакуменце 1897 г. азначана, што ў вёсцы было 16 двароў, 109 жыхароў. Знаходзілася вёска за 0,5 км на ўсход ад вёскі Шабаны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска не існуе.

ЛАЎКІ, в ё с к а. Упершыню ўнесена ў інвентар 1672 г. У 1897 г. 40 двароў, 277

жыхароў. З 23.4.1931 г. тут калгас «Перамога» Расткоўскага сельсавета. З 1950 г. вёска ўвайшла ў калгас «Чырвоны сцяг». Цяпер у складзе саўгаса імя Чарняхоўскага. У 1995 г. 18 двароў, 28 жыхароў.

ЛАЎНЫ, в ё с к а. Упамінаецца ў судовай справе 1607 г. і іншых дакументах XVIII—XIX ст. Хутчэй за ўсё знаходзілася ў заходняй частцы цяперашняга Пірагоўскага сельсавета. Іншых звестак не знойдзена.

ЛІПІЦА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1721 г. У спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. праходзіць пад назвай Ліпнае. Знаходзілася паміж вёскамі Пішчыкі і Чырына. У 1832 г. ў вёсцы была Пакроўская царква. Далейшы лёс вёскі невядомы.

ЛІТВІНАВА, в ё с к а. Пісьмовыя звесткі знойдзены ў судовай справе 1607 г. У 1873 г. ад сапраўднага стацкага саветніка Лідовіча перайшлі ў спадчыну яго тром дочкам — Аляксандры, Капіталіне і Зінаідзе — вёска Літвінава, фальварак, карчма, 850 дзесяцін зямлі (у тым ліку 380 дзесяцін лесу). У анкеце 1897 г. называецца сяло (25 двароў, 193 жыхары), уладальніцкая сядзіба і фальварак пры ручаі Бабравец (1 двор, 3 дамы, 22 жыхары), Петрапаўлаўская царква, багадзельня, царкоўна-прыходская школа, піцейны дом. Царкоўныя святы праводзіліся 23 красавіка і 29 чэрвеня па старому стылю. Да 1950 г. ў вёсцы існаваў калгас «13-ы Кастрычнік». Затым у складзе калгаса «Чырвоны сцяг». З 1964 г. ў складзе саўгаса імя Чарняхоўскага. З 70-х гг. вёска не існуе. Літвінава — радзіма паэта Сяргея Ракіты — Сяргея Васілевіча Законнікава (1909—1942).

ЛОСЕЎКА, в ё с к а. У інвентары 1727 г. называецца Лосеўшчына. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы пры рэчцы Проня 15 двароў, 95 жыхароў. У жніўні 1944 г. ў вёсцы адкрыта пачатковая школа. Да 1950 г. — калгас «Чырвоная Проня». З 16.6.1950 г. ў складзе калгаса «Беларусь». У 1995 г. 25 двароў, 40 жыхароў, жывёлагадоўчае памяшканне. Помнік, які ўшаноўвае памяць трыццаці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ЛУГАВАЯ, в ё с к а. Нанесена на карту канца XVIII ст. пад назвай Меншай Дзяцель Зямянская. У 1897 г. ў вёсцы пры рэчцы Пнеўка Сваташыцкай воласці 32 двары, 213 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. Да 1950 г. — калгас «Усход», затым вёска ў складзе калгаса імя Чкалава Кляноўскага сельсавета. З 13.2.1956 г. ўваходзіць у калгас імя XX з'езда КПСС Дабрынскага сельсавета. У ёй 14 двароў, 34 жыхары.

ЛЫСКАЎКА, в ё с к а. Нанесена на карту і ў спіс населеных пунктаў у канцы XVIII ст. У 1897 г. ў вёсцы Лыскаўка (Махнеўка) 15 двароў, 109 жыхароў. На выселках, якія належалі князю Любамірскаму, было 5 двароў, 33 жыхары. З 1944 г. па 1952 г. дзейнічала пачатковая школа. Да 1950 г. Вялікая і Малая Лыскаўкі ўвайшлі ў калгас імя Каманіна, потым — у калгас імя Чкалава. З 13.2.1956 г. ў складзе калгаса імя XX з'езда КПСС. У 1959 г. 12 двароў, 20 жыхароў.

ЛЮДЗІНІЧЫ, в ё с к а. Вядома з судовай справы 1607 г. У дакуменце 1886 г. называецца засценак Людзініцкі Баеўскай воласці і фальварак князя Любамірскага. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы каля ручая Перавалачка 29 двароў, 202 жыхары. У фальварку каля рэчкі адзін двор, 3 дамы, 43 жыхары. У 1915 г.дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. З сакавіка 1930 г. па 1950 г. у калгасе «Перамога» Баеўскага (Асташкавіцкага) сельсавета, затым у складзе калгаса імя Жданава. З 1956 г. ў складзе калгаса «Новае жыццё», а з 1960 г. — у саўгасе «Зарубы». У 1984 г. 3 двары, 3 жыхары. Не існуе.

ЛЯДЫ, в ё с к а. У дакуменце 1607 г. ўпершыню названа сяло Ляды. У інвентары 1672 г. аб Лядах упамінаецца як аб мястэчку. У 1780 г. ў ім было дзве царквы, яўрэйская школа і паштовы дом. Праводзіліся дзве ярмаркі ў год. На другім

беразе Мярэі знаходзілася мытная застава. Па шляху з Магілёва ў Смаленск у мястэчку з 31 мая на 1 чэрвеня 1780 г. заначавалі расійская імператрыца Кацярына II і аўстрыйскі імператар Іосіф. Каля вёскі, на ўсходнім беразе Мярэі, стаіць абеліск, пастаўлены Краснінскім земствам у 1912 г. ў гонар стагоддзя разгрому Напалеона. На абеліску выбіты надпіс: «У 1812 годзе войскі імператара французаў Напалеона перайшлі тут граніцу старой Расіі 2 жніўня, наступаючы пераможна на Маскву, 6 лістапада, адступаючы пасля цяжкага паражэння».

У XIX ст. мястэчка хутка развіваецца, што выклікае рост насельніцтва. Калі ў 1792 г. ў Лядах налічвалася 275 мужчын і 256 жанчын, то ў 1860 г. колькасць жыхароў складае 2741 (2105 яўрэяў). У мястэчку налічвалася 348 двароў, дзве праваслаўныя драўляныя царквы, пабудаваныя ў 1799 г. і 1829 г. і чатыры драўляныя яўрэйскія малітоўныя школы. Тройчы ў год праводзіліся ярмаркі, базары — па нядзелях, серадах і пятніцах, на якіх у шырокім асартыменце былі мясцовыя, польскія, еўрапейскія і расійскія тавары, дзейнічалі паштовая станцыя, этапны дом, вадзяны млын. А ў дакуменце 1880 г. дадаткова называюцца вольная аптэка, тры гарбарныя заводы, чатыры крупадзёркі, 35 крамаў. У мястэчку працавалі ганчары, абутнікі. У канцы XIX ст. развіццё атрымалі пенька-трапальная мануфактура, маслабойня па выцісканню алею з ільнянога і канаплянага семя. Дзейнічалі грунтовыя дарогі на Горкі і Дуброўну і тэлеграфная лінія да Горак. У 1919 г. працавалі ліманадныя прадпрыемствы. Звесткі аб колькасці насельніцтва ў Лядахпа гадах рэзка мяняюцца. Гэта звязана з вымушаным ад'ездам жыхароў — значная частка мястэчка знішчалася ў выніку неадранаразовых пажараў (так у 1893 г. выгарэла палова мястэчка).

У 1900 г. ў Лядах узнік сацыял-дэмакратычны гурток, які да канца года перарос у арганізацыю, якая праводзіла рэвалюцыйную прапаганду, выступала за інтарэсы працоўных мястэчка і навакольных вёсак, узначальвала мітынгі і забастоўкі. Пасля рэвалюцыі ў Лядах развіваецца мясцовая прамысловасць, наладжваецца выраб цэглы, вяровак, спецабутку для металургаў, панчох і інш. У 1924—1931 гг. існаваў Ляднянскі раён з усімі структурамі партыйнага і савецкага кіравання. У гэты перыяд тут быў і Ляднянскі нацыянальны яўрэйскі сельсавет. У 1918 г. адкрыта адзіная працоўная школа другой ступені, пачалі працаваць курсы па падрыхтоўцы да гімназіі. У 1919 г. створана аб'яднанне яўрэяў-агароднікаў, якое пасля перарасло ў адзін з лепшых калгасаў «Новае жыццё» («Нейес Лебен»). Да вайны ў мястэчку было дзве школы — беларуская сямігодка (з 1939 г. — дзесяцігодка) і яўрэйская пачатковая, якая потым стала рускай. З 18.7.1941 г. да 8.10.1943 г. Ляды былі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яўрэйскае гета ў памяшканні школы было месцам страшэнных катаванняў. 2.4.1942 г. ў супрацьтанкавым рове за ракой Мярэяй фашысты расстралялі і закапалі жывымі каля 1200 чалавек. Пасля вайны ў мястэчку засталося 2 дамы. Адноўлены ў 1944 г. калгасы «Светач сацыялізму», «Барэц», імя Горкага, «Бальшавік», імя Кірава ў пачатку 50-х гг. аб'ядналіся ў калгас імя Кутузава. З 1964 г. — саўгас «Прыдняпроўскі». У 1965 г. тут завершана будаўніцтва новай тыпавой школы. У 1995 г. 284 дамы, 707 жыхароў, сярэдняя школа, 3 магазіны, сталовая, лазня, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок, бібліятэка, сельскі Дом культуры, аддзяленні сувязі і ашчадбанка, 3 фермы буйной рагатай жывёлы, майстэрня, зерняток і іншыя пабудовы. Брацкая магіла савецкіх воінаў (увекавечана памяць 131 савецкага воіна). На паўночнай ускраіне вёскі — гарадзішча.

Ляды — радзіма выдатнага жывапісца Сяргея Канстанцінавіча Заранкі (1818—1871).

ЛЯХАЎКА, в ё с к а. У інвентары маёнтка Раманава (1647—1648) называецца вёска Ляхава. У ёй 13 двароў. На карце

канца XVIII ст. — цяперашняя назва вёскі. Згодна з анкетай 1897 г. ў вёсцы Ляхаўка Баеўскай воласці пры ручаі Любкін 20 двароў, 131 жыхар. Да 1959 г. вёска ўваходзіла ў калгас «Іскра». Цяпер яна з'яўляецца цэнтральнай сядзібай перадавога калгаса «Гігант» Кляноўскага сельсавета. У 1995 г. 92 двары, 289 жыхароў, праўленне калгаса, няпоўная сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі, машынны двор, зерняток.

МАКАРАЎКА, в ё с к а. Першапачатковая назва Макарава вядома з інвентара 1672 г. У інвентары 1782 г. ўказваецца засценак Макараўскі, у дакуменце 1870 г. — цяперашняя назва вёскі. Згодна з анкетай 1897 г. ў вёсцы Макараўка Андрыянаўскага таварыства Высоцкай воласці 27 двароў, 190 жыхароў, хлебазапасны магазін, піцейны дом. У 1951 г. адкрыта пачатковая школа. Да 1954 г. тут калгас імя Молатава, затым вёска ў складзе гэтага калгаса з цэнтрам у в. Якубава. З ліпеня 1957 г. ўваходзіць у калгас «40 год Кастрычніка». У 1995 г. 43 двары, 70 жыхароў, малочнатаварная ферма.

МАЛОЕ БАХАВА, в ё с к а. Вядома з судовай справы 1607 г. На карце і ў спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. ўказаны фальварак Бахава Ляхава. Анкета 1897 г. называе вёску Малое Махава пры рацэ Дубровенка (13 двароў, 90 жыхароў), пасёлак Бахаўка пры рацэ Дубровенка (2 дамы, 9 жыхароў, вадзяны млын і сукнавальня, пастаялы двор), фальварак Бахава пры ручаі (22 дамы, 19 жыхароў, каменны рымска-каталіцкі касцёл). У канцы 20-х гг. у вёсцы арганізавана камуна. Затым — калгас «Чырвоная паляна». З 1950 г. ў складзе калгаса імя Свярдлова, з 1964 г. — у калгасе «Звязда». З чэрвеня 1978 г. ўваходзіць у калгас «Праўда». У 1995 г. 14 двароў, 23 жыхары, будынак сельскага савета, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі — гарадзішча.

МАЛАЯ ДЗЯЦЕЛЬ, в ё с к а (гл. в. Лугавая).

МАЛАЯ ЛЫСКАЎКА, в ё с к а (гл. в. Лыскаўка).

МАЛОЕ САВІНА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. названы абруб Савінскі. У інвентары 1672 г. — сяло Савіна. У інвентары 1731 г. — вёскі Вялікае (49 двароў) і Малое Савіна. У ім 54 двары, 356 жыхароў, царква і багадзельня, царкоўна-прыходская школа, магазін. Кожны год праводзіўся кірмаш на Уваскрэсенне Гасподне. У савецкі час у пачатку 30-х гг. царква закрыта. З 1927 г. вёска — цэнтр Маласавінскага сельсавета. 25.3.1931 г. тут быў створаны калгас «Маяк пяцігодкі», з 1950 г. ў складзе калгаса «Ленінскі шлях», з 1965 г. — ў калгасе імя Хрушчова, з 1964 г. — ў калгасе «Прагрэс». У 1995 г. 58 двароў, 100 жыхароў, сельскі савет, жывёлагадоўчая ферма.

МАЛЫЯ САЛЕНІКІ, в ё с к а. Нанесена на карту канца XVIII ст. на р. Проня (за 1 км на поўдзень ад в. Лосеўка) і пазначана ў спісе населеных пунктаў таго часу. Не існуе.

МАМОНЬКІ, в ё с к а. У інвентары 1672 г. называецца засценак Маманкіны. Анкета 1897 г. ўказвае, што ў вёсцы Мамонькі Баеўскай воласці 13 двароў, 95 жыхароў. 13.11.1930 г. ў вёсцы арганізаваўся калгас «Надзея працы», затым калгас называўся «Ударнік пяцігодкі», з 1950 г. — імя Калініна, з 1965 г. вёска ўваходзіць у саўгас «Зарубы». У 1982 г. 3 двары. Не існуе.

МАРДАХІ, в ё с к а. 19.11.1534 г. ўладальнік маёнтка Дуброўна разглядаў канфлікт паміж жыхарамі вёскі Магдашэвічы і мястэчка Дуброўна. Вядома, што ў першай палове XIX ст. вёска належала ўладальніку маёнтка Цеалін графу Струтынскаму. У той час у вёсцы была царква. У 1897 г. ў Мардашэвічах было 44 двары, 264 жыхары, царква, капліца, багадзельня, народнае вучылішча, шынок, хлебазапасны магазін. У гады калектывізацыі царкву закрылі, размясціўшы ў ёй тры класы сямігодкі. Пасля вайны адбылося перайменаванне вёскі. Да 1954 г. дзейнічаў Мардашэвіцкі сельсавет. У пачатку 60-х гг. пабудаваны цагляны будынак школы-васьмігодкі. У 1960 г. калгас імя Будзённага ўвайшоў у саўгас «1 Мая»,

14.1.1964 г. Мардахі і іншыя навакольныя вёскі ўвайшлі ў створаны саўгас імя Ю. Смірнова. У 80-я гг. на адкрыццё ў вёсцы буйнейшага ў вобласці завода грануляванай травяной мукі прыязджала ўрадавая дэлегацыя на чале з першым сакратаром ЦК КПБ П. М. Машэравым. У 1995 г. 72 двары, 176 жыхароў, няпоўная сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін, малочна-таварная ферма.

МАРЧОНКІ, в ё с к а. У інвентары 1795 г. называецца засценак Марчонкі як новае пасяленне. У ім 15 мужчын і 9 жанчын. Анкета 1897 г. сведчыць, што ў вёсцы Марчонкі Сенцюроўскага таварыства Новатухінскай воласці 4 двары, 32 жыхары. Вёска спалена ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

МАРЧОНКІ, в ё с к а. У інвентары 1731 г. называецца вёска Хадыкі. У 1795 г. ў ёй пражывалі 22 мужчыны і 18 жанчын. У анкеце 1897 г. запісана, што ў вёсцы Хадыкі (Марчонкі) Жабыцкага таварыства Холбнянскай воласці 15 двароў, 108 жыхароў. Да 1950 г. ў Хадыках быў калгас «Верны шлях», затым вёска ў складзе калгаса «Бальшавік» Бельскага сельсавета. У 1995 г. ў суседніх вёсках Марчонкі і Янкаўшчына, якія ўваходзяць у калгас імя XXI з'езда КПСС Маласавінскага сельсавета, 5 двароў, 11 жыхароў.

МАСЛІНО, в ё с к а. Вядома з інвентара 1731 г. У 1897 г. ў вёсцы было 30 двароў, 198 жыхароў. У 1930 г. жыхары аб'ядналіся ў калгас «Барацьбіт» Іскозскага (з 1954 г. Расткоўскага) сельсавета. З 1956 г. ў складзе калгаса імя Кутузава, з 1959 г. — саўгаса «Арловічы», а з 1964 г. ўваходзіць у саўгас «Прыдняпроўскі». У 1995 г. 18 двароў, 26 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

МАХНАЧЫ, в ё с к а. Інвентар 1672 г. сведчыць, што на зямлі, якая належала пану Яну Лукінічу, жылі два браты Махначэўскія — Кандрат і Юзэф. Магчыма ад іх прозвішча і пайшла назва вёскі. У 1897 г. ў вёсцы Махначы Дубровенскай воласці было 14 двароў, 109 жыхароў. Да 1950 г. — калгас «За сацыялістычнае будаўніцтва», затым вёска ўваходзіла ў калгас імя Кутузава Цілівіцкага (з 1954 г. Малабахаўскага) сельсавета. З ліпеня 1956 г. ў саўгасе «1 Мая». У 1995 г. 12 двароў, 22 жыхары.

МІКІЦІНА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называецца служба Мікіцінская. У 1897 г. ў вёсцы Мікіціна Баеўскай воласці 26 двароў, 189 жыхароў, побач з вёскай пастаялы двор (адзін дом, 7 жыхароў). У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. Да 1950 г. — калгас «Запаветы Леніна» Іскозскага сельсавета, затым вёска ў складзе калгаса імя Калініна. З 1965 г. ўваходзіць у саўгас «Зарубы». У 1995 г. 3 двары, 4 жыхары.

МІКОЛЬШЧЫНА, х у т а р. У інвентары 1870 г. азначан як фальварак. У саісе населеных пунктаў 1886 г. ўказваецца, што Юльянава-Мікольшчына належыць князю Любамірскаму і адносіцца да Дубровенскай воласці. У фальварку меўся вадзяны млын. У 1897 г. 20 жыхароў, 2 дваровых месцы. Да Вялікай Айчыннай вайны ў Мікольшчыне дзейнічаў чаўгас. Не існуе.

МІХАЛІНАВА, в ё с к а. Упершыню названа ў судовай справе 1607 г. У 1887 г. ў вёсцы Міхалінава Баеўскай воласці былі прыходская праваслаўная царква, вадзяны млын, карчма, якая належала князю Любамірскаму. Анкета 1897 г. сведчыць аб тым, што ў вёсцы 71 двор, 465 жыхароў, Свята-Духаўская царква, пры вёсцы прычтовая сядзіба і царкоўны пагост, царкоўна-прыходская школа, багадзельня. Каля рэчкі Расасенка маёнтак (1 двор, 2 дамы, 6 жыхароў) і вадзяны млын. З 1944 г. працавала пачатковая школа. Да 1950 г. ў вёсцы дзейнічаў калгас «! Мая», затым «Ударнік» Расткоўскага сельсавета. З 1964 г. ўваходзіць у саўгас Чарняхоўскага. У 1995 г. 34 двары, 50 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла 10 савецкіх воінаў.

Міхалінава — радзіма Герояў Сацыялістычнай Працы Міхаіла Фаміча Чуйкіна (1933—1967) і Міхаіла Іванавіча Капцерава (1938—1990).

МІХЕЕЎКА, в ё с к а. Называецца ў спісе населеных пунктаў 1870 г. Анкета

1897 г. ўказвае, што ў вёсцы пры паштовым тракце на рацэ Днепр 28 двароў, 198 жыхароў. Да 1950 г. тут быў калгас «Хваля рэвалюцыі», затым калгас «Прамень» Сазонаўскага сельсавета. З 6.3.1959 г. ўваходзіць у саўгас «Арловічы». У 1995 г. 19 двароў, 24 жыхары, ферма буйной рагатай жывёлы.

НАЙДЗЁНАЎШЧЫНА, з а с ц е н а к. Вядомы з інвентара 1672 г. і спіса населеных пунктаў 1870 г. Знаходзіўся, мяркуецца, непадалёк ад вёскі Кабылле (Калінаўка). Не існуе.

НЕГАЦІНА, в ё с к а. Першапачатковая назва абруб Негацінскі вядома з дакумента 1607 г. У інвентары 1672 г. называецца вёска Негаціна путных Баяр. У 1897 г. ў вёсцы пры гандлёвым тракце Дуброўна — Раманава было 35 двароў, 248 жыхароў, царкоўна-прыходская школа, карчма. Да 1950 г. — калгас «1 Мая» Сваташыцкага сельсавета. З 1950 г. ў складзе калгаса «Шлях да камунізму» Маласавінскага сельсавета. У 1995 г. 31 двор, 58 жыхароў.

НОВАЯ ЗЯМЛЯ, в ё с к а. Упершыню называецца ў інвентары 1672 г. У 1897 г. ў вёсцы было 50 двароў, 364 жыхары. У красавіку 1931 г. арганізаваны калгас «Наперад да сацыялізма», з 1943 г. — калгас «Запаветы Ільіча». З 1963 г. ў складзе калгаса «Дружба», з 19.12.1969 г. ўваходзіць у саўгас «Перамога», з 1994 г. ў саўгасе-камбінаце «Багратіёнаўскі». У вёсцы 10 двароў, 20 жыхароў.

НОВАЕ СЯЛО, в ё с к а. У спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. ўпамінаецца вёска Дубаўка Новае Сяло (18 двароў, 144 жыхары). У анкеце 1897 г. запісана, што ў вёсцы Новае Сяло Судзілавіцкага таварыства Новатухінскай воласці 51 двор, 315 жыхароў, кузня. Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёску перасялялі жыхароў з іншых вёсак. У 1943—1944 гг. вёска і мясцовасць каля яе сталі арэнай жорсткіх кровапралітных баёў. Тут загінула каля 2 тысяч савецкіх воінаў. Пасля вайны вёска, якая знаходзілася каля тэрыторыі цяперашняга жывёлагадоўчага комплексу саўгаса «Багратіёнаўскі», не адрадзілася.

Лёс маёй вёскі і маіх суседзяў

За час нямецка-фашысцкай акупацыі з карты раёна зніклі цэлыя населеныя пункты, некаторыя з якіх так і не аднавіліся.

Такі лёс спасціг і маё роднае Новае Сяло. Гэта даволі багатая, вясёлая і жыццярадасная вёска была размешчана паміж Судзілавічамі, Лабанамі, Жабыкамі і Шабанамі за 2 км ад 2-га пасёлка Асінторфа. Цяпер на навасельскім полі пабудаваны свінагадоўчы комплекс.

Жорстка абышоўся лёс і з жыхарамі роднай вёскі. Першы ўдар быў нанесены сталінскай рэпрэсіўнай палітыкай. Падчас калектывізацыі ўжо ў 1932 г. 14 старажылаў вёскі былі абвінавачаны ў стварэнні контррэвалюцыйнай групы па падрыву калгаснага ладу. Рашэннем «тройкі» ПП ОГПУ па БССР 13 з іх былі прыгавораны да розных тэрмінаў пакарання з адбываннем яго ў канцлагерах, а мой бацька Мішкарудны Васіль Сцяпанавіч — сакратар Будаўскага сельсавета — быў расстраляны.

Мне думаецца, што ў кнізе «Памяць» варта было б назваць цяпер рэабілітаваных маіх землякоў. Акрамя майго бацькі гэта: Мішкарудны Цімафей Сцяпанавіч, у той час старшыня Азярэцкага сельпо, Мішкарудны Цімафей Несцеравіч, Мішкарудны Павел Несцеравіч, Мішкарудны Васіль Паўлавіч, Мішкарудны Піліп Адамавіч, Малаховіч Парфір Іванавіч, Зайцаў Яфім Якімавіч, Зайцаў Апанас Рыгоравіч, Зайцаў Васіль Міхайлавіч, Зайцава Лукер'я Адамаўна і іншыя.

Рэабілітаваны яны пастановамі: прэзідыума абласнога суда ад 19 жніўня 1957 г. і Вярхоўнага суда БССР ад 11 красавіка 1989 г.

Другі, больш жорсткі ўдар нанесла вайна. Перад вайной у Новым Сяле было каля 200 двароў. У першыя дні вайны ўсе

мужчыны прызыўнога ўзросту пайшлі на фронт. З некаторых сем'яў загінулі па некалькі чалавек.

Напрыклад, у сям'і Ладачкіных загінулі 4 сыны: Стафан Сяргеевіч — 1904, Лявон Сяргеевіч — 1910, Іван Сяргеевіч — 1914 і Іосіф Сяргеевіч — 1917 г. нараджэння. З дзяцей у жывых засталася толькі адна іх сястра Хрысціна. Цяпер яна — настаўніца-пенсіянерка, жыве ў в. Ступакі саўгаса імя Ю. Смірнова.

Многае пра аднавяскоўцаў могуць расказаць жыхары Асінторфа Міхаіл Макаравіч Сокалаў, Пётр Архіпавіч Сцепаненка, Аляксей Фёдаравіч Сцепаненка, яго жонка Ефрасіння Мітрафанаўна Сцепаненка (Мішкарудная), Агаф'я Кузьмінічна Курачкіна (Мішкарудная) і іншыя.

Да слова, мой родны брат Мішкарудны Дзмітрый Васілевіч 1925 г. нараджэння таксама загінуў у баях за Радзіму ў лютым 1945 г.

Наш абавязак зрабіць усё магчымае, каб ніхто, хто дастойны гэтага, не аказаўся забытым.

М. В. Мішкарудны.

НОВАЯ ТУХІНЬ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1721 г. Анкета 1897 г. сведчыць, што ў вёсцы было 77 двароў, 467 жыхароў, царква, дзве багадзельні, народнае вучылішча, школа пісьменнасці, валасное ўпраўленне, хлебазапасны магазін, карчма. З 1928 г. ў вёсцы дзейнічаў вапнавы завод. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. дзейнічала Новатухінская падпольная арганізацыя на чале з Васілём Раманавічам Свойнікавым. У снежні 1942 г. пасля жорсткіх катаванняў у Оршы былі расстраляны 12 членаў групы разам са Свойнікавым. Да 1969 г. — калгас імя К. Маркса, затым вёска ўвайшла ў саўгас «Перамога». З 1994 г. ўваходзіць у саўгас-камбінат «Багратіёнаўскі». У 1995 г. 17 двароў, 40 жыхароў, магазін, пошта. У памяць аб загінуўшых падпольшчыках устаноўлена мемарыяльная дошка.

НОВАЕ ХАМІНО, в ё с к а. З інвентара 1795 г. вядома, што ў вёсцы пражывалі 45 мужчын і больш за 50 жанчын. У анкеце 1897 г. замест дзвюх вёсак — Старое і Новае Хаміно — называецца адна вёска Хаміно (гл. вёска Хаміно).

НЯРОДЫ, в ё с к а. У інвентары 1782 г. называецца засценак Няроды. Згодна з анкетай 1897 г. ў вёсцы Няроды Мардашэвіцкага таварыства (знаходзілася непадалёку ад ручая Чыжоўка паміж вёскамі Брухаўцы і Лапыры) было 14 двароў, 93 жыхары. Да Вялікай Айчыннай вайны ўваходзіла ў калгас «Чырвонае пабярэжжа», з 1950 г. ў складзе калгаса імя Будзённага. Не існуе.

ПАГОДЗІНА, (Каровіна), в ё с к а. На карце і ў спісе населеных пунктаў канца XVIII ст. занесена вёска Каровіна, якая адносілася да Баеўскай воласці. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Каровіна (Наваселле) 49 двароў, 338 жыхароў. 22.11.1907 г. сяляне ў выніку забастоўкі дабіліся ад землеўладальніка павышэння зарплаты да аднаго рубля ў дзень. У 1915 г. тут дзейнічала земскае народнае вучылішча, у савецкі час — пачатковая школа. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі была арганізавана камуна, затым калгас «Кастрычнік». У 1949 г. Каровіна перайменавана ў вёску Пагодзіна. 1.3.1960 г. ўвайшла ў склад саўгаса «Зарубы». У 1995 г. 51 двор, 92 жыхары, свінагадоўчая ферма і ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАНІЗОЎЕ (СУКІНА), в ё с к а. Вядома з інвентара 1647—1648 гг. як вёска Сукіна Баеўскай воласці. Тады ў ёй было 19 двароў. У 1897 г. — 46 двароў, 299 жыхароў, працаваў ветраны млын. У савецкі час у вёсцы працавала пачатковая школа. 5.5.1930 г. арганізаваны калгас «Свежы прамень у Сукіна». З 1950 г. —

у складзе калгаса імя Варашылава, з 1958 г. ўваходзіць у калгас імя Дзяржынскага. У 1995 г. 22 двары, 37 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАПОЎШЧЫНА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называецца фальварак Папова ў абрубе Савінскім. У анкеце 1796 г. называецца вёска Янкаўшчына, або Папоўшчына, у якой пражывала 9 сем'яў. Магчыма, у гэтых двух дакументах размова ідзе аб адной і той жа вёсцы. Аднак, так нярэдка ўмоўна называлася мясцовасць, дзе былі царкоўныя пагосты і жылі сем'і служыцеляў царквы (напрыклад, каля вёскі Міхалінава).

ПАРФЕНАЎКА, в ё с к а. Вядома з 1755 г. У анкеце 1897 г. адзначана, што ў вёсцы Парфенаўка каля ручая Перавалачня Баеўскай воласці 23 двары, 155 жыхароў. У канцы 60-х гг. вёска, якая знаходзілася за 1,5 км на поўдзень ад вёскі Ляхаўка, перастала існаваць.

ПАРФЕНКАВА (ПАРФЕНАВА), в ё с к а. Упершыню ўпамінаецца ў дакуменце 1607 г. пад назвай Парфенава, у спісе 1870 г. — пад цяперашняй назвай. Адносілася да Баеўскай воласці. У 1897 г. ў вёсцы было 24 двары, 206 жыхароў. У 1915 г. тут дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. Да 1950 г. ў вёсцы быў калгас «Кастрычнік», затым яна ў складзе калгаса імя Варашылава. З 1960 г. ўваходзіць у саўгас «Зарубы». У 1995 г. 26 двароў, 45 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ПАРЧАВІЧЧА, в ё с к а. Пад назвай Парчавічы ці Парцавічы вёска ўпамінаецца ў інвентарах 1738 г. і 1782 г. Анкета 1897 г. ўказвае, што ў вёсцы пры ручаі Каменка на дарозе Дуброўна — Асінаўка 19 двароў, 141 жыхар. 10.10.1931 г. быў арганізаваны калгас «Тэльман». У 1939 г. жыхароў гэтай вёскі пачалі перасяляць у навакольныя вёскі, у асноўным у Галяшы і Копці. Цяпер вёска, якая знаходзілася паміж вёскамі Пірагі і Копці, не існуе.

ПАСУДДЗЕВА, в ё с к а. Уваходзіць у пералік вёсак у дакуменце 1607 г. У анкеце 1897 г. ўказваецца, што ў вёсцы Пасуддзева Сваташыцкай воласці каля рэчкі Міластаўцы 30 двароў, 171 жыхар, царкоўна-прыходская школа. У гады Вялікай Айчыннай вайны амаль уся вёска была спалена немцамі. З мая 1932 г. ў вёсцы існаваў калгас «Перамога», з 1950 г. ў складзе калгаса імя Свярдлова, з 1964 г. — калгаса «Звязда», з 1978 г. — калгаса «Праўда». У 1995 г. 31 двор, 68 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы, свінаферма, магазін.

Пасуддзева — радзіма Фёдара Кузьміча Каўрова (1912—1937), Героя Савецкага Саюза, які загінуў у Іспаніі.

ПАЦЭНЬКІ, в ё с к а. Вядома з 1782 г. Адносілася да Холбнянскай воласці. Сядзіба землеўладальніка Цэкерта. У канцы XIX ст. праз вёску праходзіў паштовы тракт. У той час тут было 18 двароў, 123 жыхары. З 1928 г. па 1959 г. тут дзейнічаў калгас «Прамень» Сазонаўскага сельсавета. Цяпер вёска ўваходзіць у саўгас «Арловічы». Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы працавала пачатковая школа. У 1995 г. 16 двароў, 30 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы. Брацкая магіла 53 савецкіх воінаў.

ПЕРАМОГА, п а с ё л а к. Да савецкага часу ў дакументах не названы. Знаходзіўся паміж вёскамі Вялікае Бахава і Сваташыцы, каля лесу. Не існуе з 70-х гг.

ПЕЦЬКІ, в ё с к а. Названа ў інвентары 1672 г. Уваходзіла тады ў Савінскае войтаўства. У анкеце 1897 г. запісана, што вёска Пецькі Баеўскай воласці Міхалінаўскага таварыства знаходзіцца каля ручая Жыдаўка, у ёй 32 двары, 248 жыхароў. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Чырвоны сцяг», затым вёска ўвайшла ў калгас імя Суворава, з 1957 г. ў складзе калгаса «Шлях да камунізма». У ёй 23 двары, 49 жыхароў.

ПІРАГІ, в ё с к а. Назва населенага пункта ўпершыню ўпамінаецца ў інвентары 1672 г. У 1897 г. ў вёсцы пры ручаі Пірагоўка было 36 двароў, 238 жыхароў. Да 1950 г. ў вёсцы былі калгасы «Рудзутак», «На варце», затым імя Кагановіча, з 1957 г. цэнтральная сядзіба калгаса «На

варце». Пасля Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала няпоўная сярэдняя школа. У 1995 г. 77 двароў, 196 жыхароў, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін, фельдчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы садок, малочна-таварная ферма.

ПІШЧЫКІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1722 г. У 1896 г. ў вёсцы было 54 двары, 333 жыхары, царкоўна-прыходская школа. У 1932 г. пачала дзейнічаць пачатковая школа. Да 1950 г. ўваходзіла ў калгас «13 год РККА», затым у складзе калгаса «Звязда». Цяпер уваходзіць у калгас «Герой працы». У 1995 г. 42 двары, 74 жыхары, магазін, жывёлагадоўчае памяшканне.

Пішчыкі — радзіма Аляксея Пятровіча Груцы (н. 9.5.1924), доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

ПНЯВІЧЫ, в ё с к а. Занесена ў спіс населеных пунктаў і на карту канца XVIII ст. (на ручаі Панеўка). У 1897 г. ў вёсцы было 47 двароў, 288 жыхароў, царкоўна-прыходская школа. У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Чырвоны партызан». Цяпер у складзе калгаса «Беларусь». У 1995 г. ў вёсцы 52 двары, 139 жыхароў, тры жывёлагадоўчыя памяшканні.

ПРАВАЛЕНШЧЫНА, ф а л ь в а р а к і х у т а р. Упершыню населены пункт названы ў інвентары 1782 г. Адносіўся да Холбнянскай воласці. Пражывалі тут 61 мужчына і 62 жанчыны. Побач была сядзіба мешчаніна Румянцава. У 1897 г. ў фальварку пры ручаі Праваленшчына каля дарогі Горкі — Красное быў 1 двор, у якім жылі 13 чалавек. На хутары, які адносіўся да Пацэнькаўскага таварыства, 1 двор, 10 жыхароў. Перастала існаваць у савецкі час.

ПРАТАСАВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. Знаходзілася за 1 км на поўнач ад вёскі Азёры Рэдзькаўскага сельсавета. Не існуе.

ПУГАЧОВА, в ё с к а. Занесена ў спісы населеных пунктаў і на карту канца XVIII ст. У 1897 г. адносілася да Высоцкай воласці Стражаўскага таварыства і знаходзілася каля гандлёвай дарогі ў Дуброўну (паміж вёскамі Стражава і Якубава). У савецкі час тут дзейнічаў калгас «Чырвонае Пугачова», было больш 20 двароў. У 30-я гг. пачалося прымусовае перасяленне жыхароў у суседнія вёскі Стражава і Якубава. Цяпер на месцы былой вёскі засталіся толькі могілкі.

ПУНІШЧА, в ё с к а. У анкеце 1897 г. значыцца выселак Пунішча (5 двароў, 46 жыхароў) і леснічоўка Пунішча (1 двор, 4 жыхары). Да 1950 г. тутэйшы калгас насіў імя Варашылава Кляноўскага сельсавета, затым вёска ў складзе калгаса «Прагрэс», з 1958 г. вёска ўваходзіць у калгас імя Дзяржынскага Баеўскага сельсавета. З 70-х гг. вёска не існуе.

ПУЦЯЦІНА, в ё с к а. З судовай справы 1607 г. вядомы паны Пуцяты, якія валодалі землямі паміж дубровенскімі і раманаўскімі маёнткамі. Вёска і фальварак нанесены на карту Аршанскага павета 1783 г. У 1813—1814 гг. у маёнтку Пуцяціна працавала талесная мануфактура. Уладальнік — калегіяльны саветнік Кімбар. Мануфактура мела чатыры чаны, на якіх выраблялiся талесы, тут працавалі 24 прыгонныя. Нашчадак маёнтка Вікенцій Вікенцьевіч Кімбар атрымаў у 1852 г. 325 дзесяцін зямлі, у тым ліку 205 дзесяцін лесу. Маёнтак знаходзіўся каля ракі і возера, пры ім — вадзяны млын. У маёнтку ў 1897 г. было 3 двары, 13 жыхароў, а ў вёсцы Пуцяціна — 35 двароў, 263 жыхары. У савецкі час дзейнічала пачатковая школа. Да 1950 г. калгас называўся «Новае жыццё», затым «Хваля рэвалюцыі», імя Фрунзе. З 1960 г. вёска ўваходзіць у саўгас «Зарубы». У 1995 г. 54 двары, 99 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ПУШЧАІ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1782 г. У 1897 г. ў вёсцы, якая знаходзілася каля чыгункі, і адносілася да Кіраёўскага таварыства, налічваліся 21 двор, 121 жыхар. З пасляваеннага часу вёска не існуе.

ПЯТРЫКІ, в ё с к а. Першае ўпамінанне знойдзена ў інвентары 1782 г. У 1897 г. ў вёсцы было 36 двароў, 238 жыхароў, дзейнічала школа пісьменнасці. Да 1950 г. працавала пачатковая, затым няпоўная сярэдняя школа. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска і навакольная мясцовасць сталі арэнай жорсткіх баёў, аб чым цяпер напамінае мемарыяльнае пахаванне, у якім увекавечана памяць каля 4 тысяч савецкіх воінаў. Да 1950 г. ў вёсцы дзейнічаў калгас «Чырвоны будаўнік», затым яна ўвайшла ў склад калгаса «Іскра Ільіча». У 1995 г. 12 двароў, 17 жыхароў, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

ПЯЧОНКІ, в ё с к а. Упершыню занесена на карту Аршанскага павета 1783 г. адносілася да Саўскай воласці. Да 1950 г. тут існаваў калгас «Зялёны сад», затым вёска ў складзе калгаса «Іскра», з 3.10.1959 г. ўваходзіць у калгас «Гігант» Кляноўскага сельсавета. У 1995 г. 25 двароў, 59 жыхароў, ферма буйной рагатай жывёлы.

РАБЦАВА, в ё с к а. Упершыню названа ў інвентары 1721 г. У 1897 г. ў вёсцы Рабцава Кіраёўскага таварыства (знаходзілася па другі бок чыгункі ад вёскі Косціна) было 23 двары, 139 жыхароў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны не існуе.

РАДЗЯКІ, в ё с к а. На карце Аршанскага павета 1783 г. занесены засценак Быкаўскі — Радзякі. У 1897 г. ў вёсцы каля ракі Любкіна было 25 двароў, 162 жыхары, царкоўна-прыходская школа. Вёска ў той час адносілася да Кляноўскага таварыства Сваташыцкай воласці. Да 1961 г. дзейнічала пачатковая школа. Вёска не існуе з 70-х гг.

РАСАСНА, в ё с к а. 28.2.1534 г. ўладальнік маёнтка Дуброўна разглядаў судовую справу паміж зарубскім святаром і сялянамі Расосенскай воласці. Далей вядома, што з 1783 г. ў мястэчку дзейнічала вінакурня князя Любамірскага. У 1782 г. ў Расасне пражывалі 242 мужчыны і 194 жанчыны. У 1812 г. мястэчка часова занялі французы. Тут з разабраных дамоў чны навялі чатыры пераправы праз Дняпро і адну пераправу праз раку Расасенку для пераходу арміі Напалеона. Як сведчыць анкета 1897 г. у мястэчку было 167 двароў, 1023 жыхары. Амаль палову насельніцтва складалі яўрэі. Былі дзве драўляныя царквы і багадзельня, яўрэйскі малітоўны дом, царкоўна-прыходская школа, хлебазапасны магазін, вадзяны мукамольны млын, 3 кузні, 7 гандлёвых лавак, піцейны дом. Кожны год 23 красавіка і 1 кастрычніка (па старому стылю) праводзіліся кірмашы. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «Дняпроўскі ўдарнік», затым — імя Чапаева, з 26.2.1959 г. вёска Расасна — цэнтральная сядзіба калгаса імя XXI з'езда КПСС. Да 1946 г. тут была пачатковая школа, затым няпоўная сярэдняя, з 1950 г. сярэдняя школа. У 1995 г. 122 двары, 333 жыхары, сярэдняя школа, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, жывёлагадоўчая ферма.

Ураджэнец вёскі Расасна Елісей Дзям'янавіч Пекаў (1875—1948) у чэрвені 1905 г. ўдзельнічаў у паўстанні на браняносцы «Пацёмкін».

РАСТКОВА, в ё с к а. Вядома з інвентара 1731 г. У 1795 г. ў вёсцы было 74 мужчыны і 76 жанчын. У 1886 г. яна адносілася да Холбянскай воласці. У ёй мелася карчма мешчаніна Піваварава. У 1897 г. было 23 двары, 179 жыхароў, пастаялы двор (былая карчма). На зямлі памешчыка графа Талстога быў 1 двор, 4 жыхары. У савецкі час дзейнічала пачатковая, затым няпоўная сярэдняя школа. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы дзейнічаў калгас «Чырвоны сцяг», з 1.3.1960 г. яна ўваходзіць у саўгас імя Чарняхоўскага. У вёсцы 6 двароў, 8 жыхароў.

РУДАШКОВА, в ё с к а. Першае ўпамінанне знойдзена ў інвентары 1672 г. Згодна з анкетай 1897 г. ў вёсцы на рацэ Мярэі 28 двароў, 216 жыхароў. У 1915 г. дзейнічала земскае пачатковае вучылішча. У 1995 г. 12 двароў, 19 жыхароў.

РУСАНЫ, в ё с к а. Вядома з інвентара 1672 г. як засценак Русанаў (ад прозвішча землеўладальніка) пры рацэ Расасенка. У

1897 г. ў вёсцы было 36 двароў, 306 жыхароў. 10.4.1931 г. тут арганізаваўся калгас «Ударнік». З 1956 г. вёска ўваходзіць у калгас «Чырвоны сцяг», з 13.1.1964 г. — у саўгас імя Чарняхоўскага. У 1995 г. 11 двароў, 17 жыхароў.

РЫБАЛТОВА, в ё с к а. У судовай справе 1607 г. называюцца Ян і Богуш Рыбалці. Магчыма, іх прозвішча стала назвай паселішча. У 1897 г. ў вёсцы Рыбалтова Чубакоўскага таварыства было 20 двароў, 158 жыхароў, хлебазапасны магазін. Да 1950 г. тутэйшы калгас называўся «За сацыялістычнае будаўніцтва», затым ён у складзе калгаса імя Кутузава, з 1956 г. ў саўгасе «1 Мая». У 1995 г. 11 двароў, 18 жыхароў.

РЫЛЕНКІ, в ё с к а. У дакументах 1782 г. і 1850 г. называецца засценак Рыленкі. У 1897 г. ў вёсцы было 39 двароў, 250 жыхароў. У гады Вялікай Айчыннай вайны непадалёку ад вёскі на другім баку чыгункі на дывізійных могілках хавалі загінуўшых у навакольнай мясцовасці савецкіх воінаў. Цяпер тут узвышаецца мемарыяльны комплекс «Рыленкі», які ўшаноўвае памяць каля 10 тысяч загінуўшых савецкіх салдат і камандзіраў.

Пасля вайны ў вёсцы дзейнічала пачатковая школа. Вёска ўваходзіла ў калгас імя Заслонава, калгас і саўгас «Перамога», з 1994 г. ў складзе саўгаса-камбіната «Багратіёнаўскі». У 1995 г. 2 двары, 2 жыхары.

РЭДЗЬКАЎШЧЫНА, в ё с к а (гл. в. Александрыя).

